Інстытут
Беларускае Культуры

Аддзел мовы і літаратуры

Institut
für weissruthenische Kultur

Abteilung für Sprache und Literatur


ПРАЦЫ

АКАДЭМІЧНАЕ КОНФЭРЭНЦЫІ ПА РЭФОРМЕ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСУ І АЗБУКІ.



ARBEITEN

DER AKADEMISCHEN KONFERENZ ZUR REFORM DER WEISSRUTHENISCHEN ORTHOGRAPHIE UND DES ALPHABETS.



ВЫДАНЬНЕ ІНСТЫТУТУ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ
У МЕНСКУ — 1927

INSTITUT FÜR WEISSRUTHENISCHE KULTUR.

ABTEILUNG FÜR SPRACHE UND LITERATUR

ARBEITEN

DER AKADEMISCHEN KONFERENZ ZUR REFORM DER WEISSRUTHENISCHEN ORTHOGRAPHIE UND DES ALPHABETS.

(14—21 NOVEMBER 1926).

Redaktirt von

S. NIEKRAŠEVIČ

Vorzitzende der Abteilung für Sprache und Literatur

— und —

V. IHNATOVSKI

Präsident des Instituts für weissruthenische Kultur.

VERLAG DES INSTITUTS FÜR WEISSRUTHENISCHE KULTUR.

MIENSK—1927.

ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ

АДДЗЕЛ МОВЫ і ЛІТАРАТУРЫ

ПРАЦЫ

АКАДЭМІЧНАЕ КОНФЭРЭНЦЫІ ПА РЭФОРМЕ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСУ і АЗБУКІ.

(14—21 ЛІСТАПАДА 1926 г.)

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ

Старшыні Аддзелу Мовы і Літаратуры

С. НЕКРАШЭВІЧА

— і —

Старшыні Інстытуту Беларускае Культуры

Ў. ІГНАТОЎСКАГА

ВЫДАНЬНЕ ІНСТЫТУТУ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ.

У МЕНСКУ — 1927.

Надрукавана згодна з пастановаю Акадэмічнае Канфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі ад 20 лістапада 1926 г. ў ліку 1.500 паасобнікаў.

ПРАДМОВА.

Сярод культурных падзей апошняга часу бязумоўна аднэй з найважнейшых трэба лічыць Акадэмічную Конфэрэнцыю па рэформе правапісу і азбукі, скліканую Інстытутам Беларускае Культуры 14-га лістапада 1926 году ў Менску. Конфэрэнцыя гэтая па складу сваіх членаў, што прымалі ў ёй удзел, далёка выходзіць за межы звычайнага тыпу беларускіх навуковых конфэрэнцый і набывае больш шырокі навуковы характар. І запраўды, на гэтай Конфэрэнцыі была прадстаўлена ня толькі Савецкая Беларусь, у асобе лепшых мовазнаўцаў Інстытуту Беларускае Культуры і Унівэрсытэту (проф. П. Бузук, С. Некрашэвіч, Я. Лёсік, доцэнт Воўк-Левановіч, А. Багдановіч, Л. Цьвяткоў), а таксама выкладчыкаў беларускае мовы ў пэдтэхнікумах, але на Конфэрэнцыі былі прадстаўлены і іншыя краіны як рэспублік СССР, гэтак і заграніцы: ад РСФСР на Конфэрэнцыі былі прысутнымі: проф. П. Растаргуеў, проф. Гарчынскі і А. Сержпутоўскі, ад УССР — доц. Німчынаў, ад Нямеччыны — проф. славісты Фасмэр, ад Польшчы—доц. Голомбэк. Былі на гэтай Конфэрэнцыі і прадстаўнікі ад нашых суседніх неславянскіх дзяржаў—літоўцаў і латышоў: ад Літвы—проф. Біржышка і ад Латвіі—вядомы поэт Ян Райніс і доцэнт Блесэ. Таксама прыехалі на Акадэмічную Конфэрэнцыю прадстаўнікі беларускай нацменшасьці Літвы (вядомы дасьледчык па беларускай мове В. Ластоўскі і гр. А. Галавінскі), ад Латвіі (грам. К. Езавітаў і Пігулеўскі) і ад Чэха-Славакіі (пясьняр Жылка).

Большасьць іншых асоб, што былі запрошаны на Акадэмічную Конфэрэнцыю, але па тых ці іншых прычынах не змаглі на яе прыехаць, папрысылалі Конфэрэнцыі свае прывітаньні і ўвагі да беларускага правапісу і азбукі; напрыклад, вядомыя профэсары Адольф Чэрны, Гуер і Ляцкі (усе трое з Чэха-Славакіі), проф. Бодуэн-дэ-Куртэнэ (Польшча), проф. Сьвянціцкі (Галіцыя), акад. Ляпуноў (РСФСР), профэсары Е. Тімчанка і А. Курыла (УССР) і інш.

Такім чынам, на Акадэмічнай Конфэрэнцыі запраўды быў выяўлены погляд па пытаньнях беларускага правапісу і графікі блізка ўсіх выдатнейшых славістаў, што бязумоўна і надае Конфэрэнцыі агульна-славістычны характар.

Акадэмічная Конфэрэнцыя цягнулася цэлы тыдзень, з 14-га па 21-ае лістапада.

Праца Конфэрэнцыі адбывалася як на пленарных пасяджэньнях, гэтак і ў яе камісіях: графічнай, правапіснай і літаратурнай. За тыдзень сваёй працы Конфэрэнцыя разгледзела ня толькі галоўныя пытаньні правапісу і графікі, што стаялі ў програме Конфэрэнцыі, але побач з гэтым заслухала і некалькі іншых дакладаў па беларускай мове і літаратуры.

Па мове ў програму Конфэрэнцыі былі ўключаны наступныя даклады: „Сучасны стан дасьледваньня беларускае мовы“ (дакл. С. Некрашэвіч), „Беларуская-мова сярод іншых славянскіх моваў“ (дакл. П. Бузук) і „Беларускія элемэнты ў польскай мове“ (дакл. Л. Цьвяткоў). Апошні даклад за бракам часу на Конфэрэнцыі ня чытаўся.

У дакладзе „Сучасны стан вывучэньня беларускае мовы“ С. Некрашэвіч зрабіў дэтальны бібліографічны агляд усіх лінгвістычных прац па беларускай мове за апошнія пяць год. Тут былі разгледжаны ўсе друкаваныя і рукапісныя працы, напісаныя як у беларускай мове, гэтак і ў іншых мовах (расійскай, украінскай і інш.). У дакладзе грунтоўна асьветлена была мовазнаўчая праца Інстытуту Беларускае Культуры, а таксама і пэрспэктывы гэтай працы на бліжэйшы час. У выніку падсумаваньня ўсяго зробленага па мовазнаўству за апошнія пяць год выявіліся досыць солідныя вынікі гэтай працы, што не магло не зацікавіць і нават задзівіла чужаземных прадстаўнікоў навукі. Асабліва ўражаньне на іх зрабіла шырока разгорнутая праца нашай Слоўнікавай Камісіі.

Наагул-жа з дакладу С. Некрашэвіча і азнаямленьня з пастаноўкай у нас мовазнаўчай працы для ўсіх членаў Конфэрэнцыі стала ясна, што цяпер, у сувязі з дзяржаўнасьцю Беларусі, беларуская мова зьяўляецца фактарам ня толькі мясцовага значэньня, што наша мова прадстаўляе ня толькі суму народных дыялектаў, а што яна ўжо мае досыць разьвітую і навукова апрацаваную літаратурную мову, якая мае права заняць сярод іншых славянскіх моваў роўнае месца.

У наступным дакладзе проф. П. Бузука: „Становішча беларускай мовы сярод іншых славянскіх моваў“ асабліва выразна выступіла самастойнасьць беларускае мовы. Параўноўваючы факты, якія збліжаюць беларускую мову з іншымі славянскімі мовамі, дакладчык адкідае тэорыю родаводнага дрэва і, карыстаючыся тэорыяй хваль, даказвае самастойнасьць беларускай мовы, выводзячы яе ня з прынятай расійскай школай „прарускай мовы“, а з асн. славянскай. Вынікшыя па дакладу П. Бузука спрэчкі з мэтодолёгічнага боку зьяўляюцца вельмі цікавымі. У іх яскрава выявілася, што з дзьвюх

рабочых тэорый аб пахаджэньні мовы—тэорыі родаводнага дрэва і тэорыі хваль—для беларускага лінгвіста найбольш падыходзіць апошняя тэорыя, бо яна ўсе мовы ставіць у роўныя ўмовы і такім чынам касуе падзел на мовы старэйшыя (расійская) і пазьнейшыя (беларуская, украінская), чаго ў запраўднасьці ня было, але што стварыла старая „руская“ лінгвістычная школа ў угоду расійскай вялікадзяржаўнасьці.

Але цэнтральнымі пунктамі працы Конфэрэнцыі былі пытаньні рэформы беларускага правапісу і азбукі.

Патрэбнасьць у рэформе нашай азбукі адчувалася ўжо даўно. Асабліва часта прыходзілася чуць нараканьні на перадачу афрыкатаў *дз* і *дж* дзьвюма літарамі. Па гэтым пытаньні ўжо ў 1922 г. у Інстытут Беларускае Культуры паступалі проекты літар для гэтых гукаў. Тым ня менш да апошняга часу справа з рэформаю нашае азбукі стаяла на месцы, і толькі ў зьвязку з рэформай правапісу была пастаўлена і рэформа беларускае азбукі.

Аб рэформе азбукі на Конфэрэнцыі былі зроблены два даклады: Я. Лёсікам і проф. П. Растаргуевым. Я. Лёсік прапанаваў наступную рэформу азбукі: 1) гукі *дз* і *дж* пісаць праз *д* і *ж* з дыякрытычнымі значкамі зьверху (птушачкамі), 2) выбуховы гук *г*, як і ў украінскай мове, азначаць *г* з хвосьцікам справа, паднятым угору *(ґ)*, 3) заместа *й* увесьці *(j)*, 4) ётаваныя *е, ё, ю, я* пісаць праз *jэ, jo, jу, jа (jэлі, маjо, маjа)*, 5) што-ж датыча выпадкаў, калі *е, ё, ю, я* азначаюць мяккасьць зычных, то яны павінны быць застаўлены: песьня, сёлы, ганю, неба. Апрача таго, Я. Лёсік яшчэ прапанаваў: выкінуць літару *э* і замяніць яе адваротным *е (є)*, а таксама 7) выкінуць літару *ы* і замяніць яе *и*.

П. Растаргуеў у сваім дакладзе выступіў за рэформу беларускай азбукі ў наступным: 1) афрыкаты *дз* і *дж* азначаць адпаведнымі літарамі сербскага альфабэту: *ђ (ђед)* і *ћ (хаћу)*; 2) выкінуць *й* і ўвесьці ў беларускую азбуку *j* у тых выпадках, у якіх прапанаваў яго ўжываць і Я. Лёсік.

Спрэчкі па дакладах Я. Лёсіка і П. Растаргуева выявілі, папершае, неабходнасьць азначэньня беларускіх афрыкатаў асобнымі літарамі, і, падругое, беспадстаўнасьць замены ў азначэньні літары *э* адваротным *э (є)* і літары *ы* літараю *и*. Адносна іншых пунктаў рэформы былі выказаны розныя погляды. З прычыны гэтага для далейшага больш дэтальнага апрацаваньня пытаньняў рэформы азбукі была створана з членаў Конфэрэнцыі асобная Графічная Камісія, якая ў выніку сваёй працы прышла да наступных конкрэтных рэзультатаў: 1) афрыкаты *дз* і *дж* азначаць сербскімі літарамі ђ і ћ; 2) выкінуць *й* і замяніць яго *j;* 3) увесьці напісаньне *jа, jэ (jе), jу, jо,* заместа *я, е, ю, ё* ў пачатку складу перад галоснай—

јама, бајуся; 4) літары *я, е, ю, ё* пакінуць для азначэньня мяккасьці зычнай: нясу (ньасу), сёлы (сьолы); іншыя пункты рэформы азбукі адхіліць.

У сувязі з рэформай беларускай азбукі было закранута пытаньне і аб лацінскай азбуцы. Гэтае пытаньне паднялося яшчэ і ў сувязі з тым, што цюрскія народы СССР адмаўляюцца яд сваіх старых азбук і ўводзяць лацінку. Але дзякуючы таму, што значная большасьць прамоўцаў (Некрашэвіч, Лёсік, Растаргуеў, Фасмэр, Блесэ, Ластоўскі і інш.), на аснове навуковых даных, высказаліся проці ўвядзеньня лацінкі, а таксама таму, што ўвядзеньне лацінкі на ўсім абшары СССР не зьяўляецца актуальным, пытаньне аб лацінцы было адхілена.

Больш складаным у працы Акадэмічнае Конфэрэнцыі зьявілася пытаньне аб рэформе нашага правапісу.

Як вядома, у нас існуе правапіс Б. Тарашкевіча. Да апошняга году правапіс Тарашкевіча трымаўся моцна. Праўда і тут былі некаторыя дробныя ўхіленьні, але яны наагул ні самага правапісу, ні яго прынцыпаў не парушалі.

У 1926 годзе ўзьнікаюць ужо досыць вялікія нездаваленьні правапісам Тарашкевіча. Адны знаходзяць яго занадта цяжкім, іншыя ня зусім адпавядаючым беларускай мове і да т. п.

Найбольшае незадаваленьне правапісам Б. Тарашкевіча мы знаходзім у брошуры-проекце братоў Я. і А. Лёсікаў: „Да рэформы беларускага правапісу“, выданай улетку 1926 году. Галоўнае пытаньне рэформы у проекце Лёсікаў—поўнае аканьне (яканьне). У адказ на проект правапісу бр. Лёсікаў выступілі з сваімі ўвагамі аб рэформе правапісу бадай усе нашы мовазнаўцы: П. Бузук, Воўк-Левановіч, А. Багдановіч, С. Некрашэвіч. Усе яны крытычна аднесьліся да проекту рэформы правапісу бр. Лёсікаў і знаходзілі яго навукова неўгрунтаваным і неадпавядаючым законам беларускае мовы. Тым ня менш, паколькі пытаньне аб рэформе беларускага правапісу пашырылася ў самыя шырокія масы нашага настаўніцтва і такім чынам параджала непатрэбныя і шкадлівыя аб правапісе спрэчкі, Інстытут Беларускае Культуры пастанавіў склікаць Акадэмічную Конфэрэнцыю, каб перадаць на вырашэньне гэтай аўторытэтнай нарады спрэчныя пытаньні нашага правапісу.

Па пытаньнях правапісу на Конфэрэнцыі былі пастаўлены два даклады: Я. Лёсіка „Да рэформы беларускага правапісу“ і С. Некрашэвіча на тую-ж тэму.

У сваім дакладзе Я. Лёсік прапанаваў: 1) прыняты ў нашым правапісе фонэтычны прынцып правапісу галосных пашырыць поўнасьцю ня толькі на *а,* г. зн. пісаць усякае

ненаціскное *о* праз *а* (галава), але і на *е;* такім чынам пісаць кожнае ненаціскное *е* праз *я* (пя́ракуліць); 2) пашырыць фонэтычны прынцып правапісу і на зычныя за выключэньнем канца слоў; г. зн. пісаць ка*зь*ба́, но*ш*ка (ад нага), рашка́ (ад рог), але рог, воз і да т. п. Што-ж датыча чужаземных слоў, то яны ў адносінах да аканьня падлягаюць правілам для нашых слоў; з гэтае прычыны дакладчык прапануе пісаць: д*а*по (дэпо), д*а*барк*а*дар (дэбаркадэр). і да т. п.

Апрача таго, Я. Лёсік прапанаваў: 3) *й* і *ў,* калі яны стаяць асобна або на пачатку слова, заўсёды пісаць праз складовыя *і* і *у;* г. зн. ня так, як пісалі: баба й дзед, баба йдзе, мы ў хаце, вы ўбілі, але: баба і дзед, баба ідзе, мы у хаце, вы убілі і г. д.; 4) выкінуць мяккі знак пасьля зычных перад наступнымі мяккімі зычнымі, калі *ь* азначае памякчэньне першых; г. зн. пісаць не *каменьне, сьнег,* а *каменне, снег;* 5) у сувязі з яканьнем: а) у родн. скл. прыметнікаў жан. р. адзін. ліку пісаць на канцы *і:* лева*і* рукі, у сама*і* хаты і да т. п.; б) у месн. ск. назоўнікаў адзін. л. пісаць на канцы не пад націскам і: у лес*і,* у ям*і* і г. д.

С. Некрашэвіч у сваім дакладзе „Да рэформы беларускага правапісу“ разгледзеў асноўныя хібы ў запроектаванай Я. Лёсікам рэформе нашага правапісу і з сваго боку лічыць магчымым увесьці ў правапіс Б. Тарашкевіча ў мэтах упрашчэньня наступныя корэктывы: 1) у другім складзе перад націскам заўсёды пісаць толькі *е* (н*е*прыхільна, н*е*прыцямна); 2) у мэтах мэханізацыі правапісу *не* і *без,* калі яны стаяць асобна, не падлягаюць яканьню; г. зн. заўсёды пішуцца *не, без* (*не* раз, *без* шапкі); 3) слова няма, няхай пісаць *ні*ма, *ні*хай; 4) пашырыць аканьне на ўсе чужаземныя словы гэткім чынам: кожнае ненаціскное *о* чужаземных слоў пішацца ў беларускай мове праз *а:* к*а*місія, к*а*нстытуцыя,—аднак, дэпо, дэл*е*гат.

У спрэчках па дакладах Я. Лёсіка і С. Некрашэвіча выказалася некалькі асоб, пасьля чаго пытаньне аб рэформе правапісу было перанесена ў асобную, складзеную з членаў Конфэрэнцыі, Правапісную Камісію.

Правапісная Камісія на некалькіх сваіх пасяджэньнях дэтальна абмеркавала высунутыя дакладчыкамі проекты зьмен у нашым правапісе і большасьцю галасоў прыняла наступныя пастановы: 1) пашырэньне фонэтычнага прынцыпу правапісу на зычныя, паколькі гэтае пытаньне навукова дакладчыкам Я. Лёсікам не ўгрунтавана, не разглядаць; 2) запроектаванае Я. Лёсікам поўнае яканьне, г. зн. напісаньне кожнага ненаціскнога *е* праз *я,* адхіліць; 3) увесьці ў правапіс Б. Тарашкевіча аб *е* наступныя корэктывы: а) у другім складзе перад націскам заўсёды пішацца *е* (а ня *я*) і б) адмоўныя словы

не, без, калі яны стаяць асобна, яканьню не падлягаюць; 4) напісаньне слова „*ня*ма", „*ня*хай" праз „*ні*ма", „*ні*хай" адхіліць; 5) пашырыць аканьне на чужаземныя словы ў рэдакцыі С. Некрашэвіча: кожнае ненаціское *о* чужаземных слоў у беларускай мове пішацца праз *а;* 6) правапіс *і,* калі яно стаіць у сярэдзіне слоў або ў пачатку слова, заўсёды пісаць праз *і* (а ня праз *й*); 7) напісаньне *у,* калі яно стаіць паміж словамі або ў пачатку слова праз *у* (складовае), адхіліць (такім чынам, правапіс *у* застаецца ў рэдакцыі Б. Тарашкевіча); 8) рэшту высунутых пунктаў рэформы правапісу перадаць у Правапісную Камісію Інбелкульту.

Апрача спэцыяльна мовазнаўчых пытаньняў, на Конфэрэнцыі былі зачытаны і чатыры даклады па беларускай літаратуры.

Першы даклад: „Асноўныя этапы разьвіцьця новай беларускай літаратуры" прачытаў проф. М. Пятуховіч. У сваім дакладзе М. Пятуховіч зрабіў агульную характарыстыку літаратурнага процэсу на Беларусі ў пазьнейшыя часы.

Наступны дакладчык М. Гарэцкі зрабіў агульную характарыстыку літаратурных пэрыодаў—нашаніўскага і пасьлякастрычнікавага.

Доц. Варшаўскага Унівэрсытэту Ю. Голомбэк зрабіў даклад аб пісьменьніках XIX ст., што пісалі пабеларуску і папольску і аб вывучэньні іх творчасьці.

Апошні даклад па літаратуры на тэму: „Поэтычнае мастацтва навейшай беларускай літаратуры" быў зроблены доц. Вазьнясенскім.

Для абгаварэньня закранутых у дакладах пытаньняў была створана з членаў Конфэрэнцыі Літаратурная Камісія. У выніку сваёй працы Камісія прыняла рэзолюцыю, у якой зазначае: 1) заслуханыя на пленарных пасяджэньнях даклады па беларускай літаратуры ўсебакова асьветлілі беларускую мастацкую літаратуру ў адносінах яе высокай культурнай каштоўнасьці як для беларускай, так і агульна-людзкай культуры. 2) Гэтае агульна-людзкае значэньне беларускай мастацкай літаратуры асабліва пачынае ўсьведамляцца цяпер, калі яна вышла ўжо з рамак чыста нацыянальных і атрымлівае права на ўвагу да сябе і на сваё распаўсюджаньне за межамі Беларусі аднолькава з іншымі эўропейскімі літаратурамі. 3) Адмечаны рост, разьвіцьцё і значэньне беларуская мастацкая літаратура набыла, дзякуючы Кастрычнікавай Рэволюцыі, якая дала шырокія магчымасьці дзяржаўнага, эконамічна-політычнага і нацыянальнага будаўніцтва Савецкай Беларусі. 4) Аднак яшчэ да апошняга часу беларуская літаратура мала дасьледавана; дзеля гэтага неабходна распачаць самую шырокую працу па ўсебаковым вывучэньні беларускай

літаратуры. 5) Дзеля выкананьня гэтых мэт навуковай працы неабходна заснаваньне спэцыяльнага навукова-дасьледчага інстытуту па вывучэньні гісторыі беларускае літаратуры.

Значэньне Акадэмічнай Конфэрэнцыі ў беларускім культурным жыцьці бязумоўна вялікае. Ужо вышэй гаварылася, якое вялікое значэньне мае Конфэрэнцыя, як фактар, дзякуючы якому беларуская мовазнаўчая праца робіцца набыткам усяго славянскага сьвету, што разам з гэтай працай і сама беларуская мова па праву пачынае займаць сярод іншых славянскіх моваў належнае ёй роўнае месца.

Разам з тым Конфэрэнцыя выявіла і той шлях, па якім мусіць ісьці навуковая праца па беларускай мове, як самастойнай мове, роўнай з іншымі славянскімі мовамі.

Але асабліва каштоўныя вынікі працы Конфэрэнцыі па рэформе нашай графікі, а яшчэ больш па рэформе нашага правапісу. У гэтай галіне Конфэрэнцыя выказала свой аўторытэтны голас, прыняла цэлы шэраг запраўды жыцьцёвых паправак да правапісу Б. Тарашкевіча, якія безбалезна могуць быць прыняты нашай ортографіяй для яе спрашчэньня.

Разам з тым сваімі дакладамі, прамовамі, увагамі члены Конфэрэнцыі далі шмат вельмі цікавага матар'ялу па рэформе нашага правапісу і графікі і па дасьледваньні беларускай мовы наагул.

Бязумоўна не малое навуковае значэньне мае Конфэрэнцыя і для вывучэньня нашай літаратуры. На Конфэрэнцыі разгледжаны асноўныя этапы разьвіцьця беларускай літаратуры і мэтоды яе дасьледваньня. У выніку мы маем шмат каштоўнага матар'ялу па дасьледваньні навейшага пэрыоду беларускай літаратуры.

Усе прыежджыя дэлегаты мелі магчымасьць бачыць, як будуецца жыцьцё ў Савецкай Беларусі. Чужаземныя дэлегаты з вялікай цікавасьцю аглядалі культурна-асьветныя і навуковыя ўстановы ў Менску і Віцебску. Усе гэтыя ўстановы зрабілі на іх добрае ўражаньне.

Вось што, напрыклад, гаворыць дэлегат Конфэренцыі— вядомы латвійскі пясьняр Райніс—аб нашых культурных установах: „Справа друку і наагул асьветы моцна ідзе ўперад... Дэлегаты Конфэрэнцыі агледзелі Унівэрсытэт, добра наладжаныя клінікі, багата пастаўлены зоолёгічны габінэт, псыхіятрычную клініку. Унівэрсытэт, хоць яшчэ і не абсталёван канчаткова, але трэба прызнаць, пастаўлен добра. Беларускі тэатр існуе ўсяго 5 год, але ён дасягнуў цяпер высокай ступені разьвіцьця. Ставяцца як орыгінальныя п'есы, так і п'есы з эўропейскага рэпэртуару. У Віцебску тэатр адчынілі орыгінальнай п'есай, а на другі дзень ставілі „Сон у

летнюю ноч“ Шэкспіра“. (Латвійская газэта „Соцыял-дэмократ“, № 265,24/XI).

Доцэнт латвійскага Унівэрсытэту Блесэ ў газэце „Латвіс“ ня можа не адзначыць, што „Інстытут Беларускай Культуры зрабіўся кіраўнікам культурнай працы, і Унівэрсытэт прымушан з ім лічыцца. У бліжэйшай будучыні з найбольш моцных членаў Інбелкульту будзе ўтворана Акадэмія Навук. Разьвіваецца архэолёгія. Кожнае лета адбываюцца раскопкі, і экспонаты музэяў растуць. У Менску сабраны новыя музэі па архэолёгіі і этнографіі, у якіх ужо ёсьць даволі многа матар‘ялаў. Яшчэ багацейшы віцебскі музэй“. Або далей: „Беларускія артысты добрыя. Артысты віцебскага тэатру атрымалі адукацыю ў студыі маскоўскага мастацкага тэатру“.

Дэлегат Конфэрэнцыі, вядомы славісты проф. бэрлінскага Унівэрсытэту Фасмэр дае такую рэцэнзію аб працы Слоўнікавай камісіі Інбелкульту: „З вялікай радасьцю вітаю я багатыя зьместам зборы Слоўнікавай Камісіі. Я вельмі зьдзіўлен тым, як многа тут зроблена за кароткі час ад утварэньня Інстытуту. Спадзяюся і жадаю, каб гэтыя матар‘ялы, якія так прыгожа цяпер выглядаюць, па магчымасьці хутка зьявіліся ў друку з тым, каб заходня-эўрапейскія вучоныя маглі зьвярнуць на іх сваю ўвагу і ацаніць іх“.

Зразумела, што такая ацэнка нашай працы замежнымі вучонымі дэлегатамі спрыяе больш правільнаму асьвятленьню за граніцай тых посьпехаў, якіх дасягнуў наш край пад кіраўніцтвам Компартыі і Савецкай улады. Гэтым самым Конфэрэнцыя спрыяла ўзмацненьню значэньня Менску, як адзінага культурнага цэнтру этнографічнае Беларусі.

Такім культурным агульна-беларускім цэнтрам Менск мог зрабіцца толькі таму, што Саюз ССР дае ўсе гарантыі і магчымасьці для правільнага разьвязаньня ня толькі соцыяльнага, але і нацыянальнага пытаньня як на Беларусі, так і наагул сярод усіх прыгнечаных раней народаў.

Вялікім недахопам у працы Конфэрэнцыі быў той факт, што навуковыя працаўнікі Заходняй Беларусі, у тым ліку Б. Тарашкевіч, які напісаў першую граматыку беларускай мовы, не маглі прыехаць у Менск з прычыны таго, што польскі ўрад ня даў ім пашпартоў. Гэты сумны факт Конфэрэнцыя адчувала ўвесь час на працягу сваёй працы. Ужо на другім пасяджэньні была ўхвалена рэзолюцыя, якая ганьбіла гэты факт. Калі недапушчэньне дэлегатаў з Заходняй Беларусі на Конфэрэнцыю зьявілася адмоўным фактам для працы Конфэрэнцыі, дык з другога боку, яно вельмі яскрава выявіла ўсю бестактоўнасьць політыкі польскага ўраду. Намі атрыман з-за граніцы ліст аднаго профэсара, які піша, што нават у польскіх колах „шкадуюць“, што зрабілі глупства і

далі повад для варожай сабе дэмонстрацыі. Польская газэта „Кур'ер Віленскі" (24/XI) у перадавым артыкуле „Мядзьвежая палітыка" таксама асуджае ўрад за „адсутнасьць палітычнага розуму" і гаворыць аб тым, што ў „палітычных адносінах польскі ўрад зрабіў сабе вялікую шкоду ў поглядах на нас Эўропы, а таксама і ў поглядах на нас беларускага жыхарства тут і за кардонам". З гэтымі словамі перадавіцы магчыма згадзіцца.

Факты, зьвязаныя з Акадэмічнай Конфэрэнцыяй, з аднаго боку, далі магчымасьць усёй беларускай інтэлігенцыі ўбачыць напрамак палітыкі польскага ўраду, а з другога боку, яны спрыялі ўзмацненьню позыцыі партыі як сярод блізкай да партыі часткі інтэлігенцыі, так і сярод тэй яе часткі, якая да гэтага часу яшчэ хісталася. І ня можна згадзіцца з думкаю, якая часам выказвалася ў артыкулах аб нашай Конфэрэнцыі ў замежнай прэсе, што ня гледзячы на ўплыў комуністаў, нацыяналістычныя імкненьні ў Савецкай Беларусі мацнейшыя за комуністычныя; што ня выключана магчымасьць перарасту нацыяналізму над комунізмам. Вывучэньне сучаснага становішча Савецкай Беларусі дае зусім іншы малюнак.

Мінулыя гады сьведчаць аб значным узросьце народнай гаспадаркі. Социялістычныя элемэнты гаспадаркі ўзрасьлі асабліва буйна. Мы не зачыняем вачэй на тое, што поруч з ростам социялістычнай гаспадаркі растуць і элемэнты НЭП'у. На гэтых элемэнтах НЭП'у могуць узрастаць і ўзрастаюць і кулацкія, нацыяналістычныя, шовіністычныя настроі. Частка інтэлігенцыі сваю актыўнасьць накіравала па гэтым шляху ў бок нацыяналістычных настрояў і ідэалаў. Магчыма, што з далейшым разьвіцьцём НЭП'у будзе ісьці і ўзрост актыўнасьці ў гэтым напрамку. Частка беларускай інтэлігенцыі можа і будзе прагнуцца на грунце беларусізацыі зьдзейсьніць нацыянал-дэмократычныя ідэалы, частка расійскай інтэлігенцыі будзе рэагаваць на гэта ўзмацненьнем вялікадзяржаўных настрояў. Сярод яўрэйскай і польскай нацменшасьцяй могуць зьявіцца на грунце правядзеньня беларусізацыі настроі, што іх культурныя запытаньні ігноруюцца. На ўсё гэтае мы не заплюшчваем вачэй.

Але адначасна з усім гэтым мы добра бачым і іншае. Мы бачым, што социялістычная гаспадарка расьце куды мацней, чым элемэнты НЭП'у. Аб гэтым сьведчыць буйны рост дзяржаўнай прамысловасьці і гандлю, які выціскае прыватнага прадпрыемцу і гандляра; беднякі і серадднякі ў вёсцы ўзмацняюцца коопэрацыяй, крэдытам і ідуць паступова ў бок колектыўнай гаспадаркі. Павялічваецца лік і расьце ўплыў пролетарыяту. Дыктатура пролетарыяту, якая апіраецца на

цесную сувязь рабочага з беднякамі і серадняками, узмацняецца. Усё гэта таксама робіць уплыў на сьветапогляд інтэлігенцыі і робіць куды мацнейшы ўплыў, чым НЭП, які разьвіваецца куды слабей, чым социялізм. Зразумела, што пад гэтымі социялістычнымі ўплывамі пераважная частка інтэлігенцыі, асабліва масавае настаўніцтва, зусім выразна павярнулася тварам да партыі і шчыра працуе пад яе кіраўніцтвам. Гэтая інтэлігенцыя стаіць на грунце інтэрнацыяналізму, а не нацыяналізму, добра разумеючы, што нацыяналізм перашкаджае адбудаваньню ўсякай социялістычнай дзяржавы, у тым ліку і Беларусі. Рэволюцыйны марксызм і ленінізм для гэтай інтэлігенцыі зьяўляецца грунтам іх дзейнасьці, тым больш, што нацыяналізм і шовінізм у „дэмократычнай Польшчы“ дае яскравы малюнак усіх адмоўных яго бакоў. Кожны дзень газэты прыносяць нам факты з жыцьця Заходняй Беларусі, якія сьведчаць аб тэй шкодзе, што прыносіць прыгнечаным народам шовінізм, у якую-б вопратку ён не апранаўся.

Даволі ўзяць для прыкладу працу хоць-бы ў такім невялічкім куточку Савецкай Беларусі, як Інстытут Беларускае Культуры, з яго Яўрэйскім, Польскім і Латыскім аддзеламі. Тут дружна працуюць пад кіраўніцтвам Компартыі працаўнікі розных нацый, і кожны з іх разумее, што нацыяналізм— гэта такая хвароба, якая разлучае, а ня злучае, руйнуе, а ня будуе; што нацыяналізм не вызваляе нацыі, а закоўвае іх у кайданы; што толькі рэволюцыйны марксызм і ленінізм вызваляе ня толькі пролетарыя-серадняка і бедняка-селяніна, але і прыгнечанага нацыянала. А таму з кожным годам, з кожным месяцам у нас усё больш і больш нашай савецкай інтэлігенцыі, якая сьвядома ідзе пад кіраўніцтвам Компартыі да будовы новай пролетарскай культуры.

Матар‘ялы Акадэмічнай Конфэрэнцыі заключаюць у сабе або прадстаўленыя аўтарамі даклады, або запісаныя стэнографічна прамовы. Праўда, з прычыны таго, што стэнографічная частка на Конфэрэнцыі была пастаўлена няпоўна і слабавата, некаторыя прамовы прышлося друкаваць па протокольных запісах, а ў іншых дапускаць рэдакцыйныя папраўкі. Вядома, пры гэтым магчымы пропускі і некаторыя недакладнасьці.

Што да парадку разьмяшчэньня матар‘ялу, то рэдакцыя лічыла патрэбным, у мэтах большай зручнасьці для карыстаньня, разьмеркаваць яго ня ў тым парадку, у якім адбываліся пасяджэньні Конфэрэнцыі, а па асобных тэмах.

У заключэньне Інстытут Беларускае Культуры ласкава просіць усіх асоб, асабліва лінгвістаў і настаўнікаў, якім будзе

надаслана гэта кніга, або ў рукі якіх яна пападзе, **прыслаць сваё рэцэнзіі** па закранутых у кнізе пытаньнях, а таксама і па іншых пытаньнях нашага правапісу і графікі, што хоць не закраналіся на Конфэрэнцыі, але якія патрабуюць пэўнай зьмены ў бок іх упрашчэньня. Усе гэткія рэцэнзіі, артыкулы і заўвагі, хоць-бы і дробныя, з удзячнасьцю будуць прыняты і надрукаваны Аддзелам Мовы і Літаратуры ў наступнай кнізе, якая павінна прадставіць сыстэматычны і поўны проект рэформы беларускага правапісу і графікі.

24 мая 1927 г.

У. Ігнатоўскі.
С. Некрашэвіч.

VORWORT.

Zu den wichtigsten Kulturereignissen der letzten Zeit gehört ohne Zweifel die Akademische Konferenz zur Reform der Ortographie und des Alphabets, berufen am 14. November 1926 vom Institut für weissruthenische Kultur in Mesnk. Diese Konferenz, in Betreff ihrer Mitglieder, die daran Teil nahmen, übertrifft weitaus die gewöhnlichen weissruthenischen wissenschaftlichen Konferenzen und erhält einen bedeutend weiteren wissenschaftlichen Charakter. In Wirklichkeit, auf dieser Konferenz waren nicht nur Vertreter von Sowiet-Weissruthenien in der Person der besten Sprachkenner des Instituts für weissruthenische Kultur und der Universität (Prof. P. Buzuk, S. Niekraševič, J. Liosik, Dozent Volk-Lievanovič, A. Bogdanovič, L. Cviatkov), sowie auch der Lehrer der weissruthenischen Sprache an den pädagogischen Technikumen,—desgleichen auch viele Gebiete der Republiken er SSR und sogar des Auslandes waren vertreten.

Von der RSFSR waren auf der Konferenz anwesend: Prof. P. Rastorgujev, Prof. Gorčynski und A. Sierzputovski, von USSR—Dozent Nemčynov, von Deutschland—Prof. d-r Max Vasmer, von Polen—Dozent Golombek. Es waren auch Vertreter von unseren nicht slavischen Nachbarländern Lithauer und Letten: von Lithauen—Prof. Biržyško und von Lettland der berühmte Dichter Jan Rajnis und Dozent Blesse. Es kamen auf die Akademische Konferenz die Vertreter der weissruthenischen Volkminderheit in Lithauen (der bekannte Forscher der weissruthenischen Sprache W. Lastovski und A. Golovinski), aus Lettland—K. Jezovitov und Pigulevski und aus der Tschecho-Slowakei—Dichter Žylka.

Die Mehrzahl der zu dieser Konferenz eingeladenen Personen, welche aus den oder jenen Gründen nicht selbst kommen konnten, schickten der Konferenz ihre Bewillkommungen und Beiträge zur weissruthenischen Orthographie u. Alphabet; zum Beispiel, die bekannten Professoren Adolph Černý, Huer und Liacki (alle drei aus der Tschecho-Slowakei), Prof Baudouin-de Courtenay (Polen), Prof. Sviencicki (Galizien), Akademiker Liapunov (RSFSR), die Proffesoren E. Tymčenko und A. Kurylo (USSR) u. a.

Somit wurden auf der Akademischen Konferenz die Ansich-

ten fast aller bekanntesten Slavisten in der Frage über weissruthenische Orthographie nnd Alphabet angehört und das gab der Konferenz einen allgemein-slavischen Charakter.

Die Akademische Konferenz dauerte eine ganze Woche, vom 14. bis zum 21. November.

Die Arbeiten der Konferenz vollzogen sich auf den Plenar-Sitzungen, sowie auch in den Komissionen: der graphischen, orthographishen und literarischen. Im Laufe ihrer wöchentlichen Arbeit erörterte die Konferenz nicht nur die im Programm stehenden Kardinalfragen über Orthographie u. Graphik, sondern sie hörte auch mehrere andere Vorträge über weissruthenische Sprache u. Literatur an.

Im Programm der Konferenz standen folgende Vorträge: „Die moderne Lage der Forschung der weissruthenischen Sprache" (Referat S. Niekraševič), „Die weissruthenische Sprache inmitten der übrigen slavischen Sprachen" (Refer. P. Buzuk), und „Die weissruthenischen Elemente in der polnischen Sprache" (Refer. Cviatkov). Der letzte Vortrag wurde auf der Konferenz aus Mangel an Zeit nicht gehalten.

In seinem Vortrag „Die Moderne Lage der Forschung der weissruthenischen Sprache" machte S. Niekraševič einen ausführlichen bibliographischen Ueberblick aller philologischen Arbeiten über die weissruthenische Sprache während der letzten fünf Jahre. Hier wurden alle gedruckten Sachen und Handschriften untersucht, welche nicht nur in weissruthenischer Sprache, sondern auch in anderen (russisch, ukrainisch u. s. w.) erschienen sind. Im Vortrage wurde die sprachkundige Arbeit des Instituts für Weissruthenische Kultur gründlich beleuchtet, sowie auch die Perspektiven dieser Arbeit für die nächste Zeit.

Alles, was in den letzten fünf Jahren in der Sprachkunde erreicht worden ist, beweist die glänzenden Resultate dieser Arbeit, welche auch von den Vertretern der ausländischen Wissenschaft gebührend beachtet wird. Einen besonderen Eindruck machte die weit ausgebreitete Arbeit unserer Wörterbuch-Kommission.

Aus dem Vortrage von S. Niekraševič und nach Bekanntmachung mit dem Standpunkte unserer Sprachkunde wurde allen Mitgliedern der Konferenz klar, dass jetzt im Verein mit der Selbstständigkeit von Weissruthenien die weissruthenische Sprache nicht nur ein Faktor von lokaler Bedeutung ist, dass unsere Sprache nicht nur ein Inbegriff von Volksdialekten ist, sondern dass sie schon eine genügend entwickelte und wissenschaftlich-bearbeitete Literatursprache bildet, welche berechtigt ist den ihr gebührenden Platz inmitten der übrigen slavischen Sprachen einzunehmen.

In dem folgenden Vortrage von Prof. Buzuk: „Die Lage der

weissruthenischen Sprache inmitten der übrigen slavischen Sprachen" wird die Selbstständigkeit der weissruthenischen Sprache besonders deutlich hervorgehoben. Indem er die Tatsachen vergleicht, welche die weissruthenische Sprache den anderen slavischen Sprachen nahe stellt, verwirft der Referent die Stammbaumteorie und beweist auf Grund der Wellentheorie die Unabhängigkeit der weissruthenischen Sprache, indem er sie nicht von der „urrussischen Sprache", wie es die russische Sohule annimmt, abführt, sondern von der urslavischen.
Die nun enstandenen Diskussionen waren vom methodoligischen Standpunkte aus sehr interessant. Dabei stellte es sich klar heraus, dass von den beiden geltenden Theorien über Entstehen der Sprachen—der Stambaumtheorie und der Wellentheorie,—die letztere für den weissruthenischen Lingvisten am passendsten ist, weil sie alle Sprachen in gleiche Bedingungen stellt und dadurch die Teilung in ältere (russische) und jüngere (weissruthenische u. ukrainische) Sprachen aufhebt, was in Wirklichkeit nicht der Fall war, sondern von der alten „russischen" lingvistischen Schule, der russischen Grossmacht zu Liebe, erdacht wurde.

Den Zentralpunkt der Konferenz—Arbeiten bildeten aber die Fragen über die Reform der weissruthenischen Orthographie u. des Alphabets.

Das Bedürfniss der Reform unseres Alphabets war schon längst fühlbar. Besonders oft beschwerte man sich über die Bezeichnuug der Affrikate *дз* und *дж* durch zwei Buchstaben. Diesbezüglich wurden noch im Jahre 1922 dem Institute für Weissruthenische Kultur Projekte neuer Buchstaben für diese Laute gemacht. Aber bis zu lezter Stunde kam das ABC=Reform nicht vom Platze und nur im Verband mit der Reform der Orthographie wurde auch eine solche des Alphabets in Frage gestellt.

Ueber die Reform des Alphabets wurden auf der Konferenz zwei Vorträge gehalten: von J. Liosik und Prof. P. Rastorguev. J. Liosik schlug folgende Reform vor: 1) die Laute *дз* und *дж* mit *д* und *ж* nebst darübergestellten diakretischen Zeichen („Vögelchen") zu schreiben. 2) das explosive *г*, wie auch in der ukrainschen Sprache, durch ein *г* mit dem Schwänzchen rechts nach oben gewendet *(ґ)*, 3) statt *й—j* einzuführen, 4) die jotierten *е, ё, ю, я* so zu schreiben *jэ, jo, jy, ja (jэлi, мajo, мaja)*, 5) in den Fällen aber, wo *е, ё, ю, я* die Weichheit der Konsonnanten bezeichnen, sollen sie beibehalten bleiben: песьня, сёлы, ганю, неба. Ausserdem schlägt J. Liosik noch vor: den Buchstaben *э* zu streichen und durch umgekehrtes *э (є)* zu ersetzen und ebenso 7) statt *ы—и*.

P. Rastorgujev in seinem Vortrage über die Reform des

weissruthenischen Alphabets machte folgende Vorschläge 1) die Affricatae *дз* und *дж* mit den entsprechenden serbischen Buchstaben ђ (*ђед*) und ћ (*хаћу*) zu bezeichnen; 2) das *й* zu streichen und dafür *j* in das weissruthenische Alphabet einzuführen in all' den Fällen, wie es auch J. Liosik vorschlägt.

Die darauf folgenden Diskussionen bewiesen 1) die Notwendigkeit der Bezeichnung der weissruthenischen Africate durch besondere Buchstaben und 2) die Unbegründung der Ersetzung des *э* durch das umgekehrte *э* (*є*) und des Buchstaben *ы* durch *и*. In Betreff der übrigen Punkte der Reform wurden verschiedene Meinungen geäussert. Deshalb wurde zur weiteren, ausführlichen Bearbeitung dieser Fragen aus den Mitgliedern der Konferenz eine besondere graphische Komission gebildet, deren Arbeit zu folgenden concreten Resultaten führte: 1) die Affrikate *дз* und *дж* werden mit den serbischen Buchstaben *ђ* und ћ bezeichnet; 2) *й* wird durch *j* ersetzt; 3) die Schreibart *ja, jэ* oder *je, jy, jo* einzuführen statt *я, ю, е, ё* im Anfange der Silbe vor einem Selbstlaut—*jама, бajуся;* 4) die Buchstaben *я, е, ю, ё* zu behalten zur Bezeichnung der Weichheit der Konsonanten: нясу, (ньасу); сёлы (сьолы), 5) die übrigen Punkte der Reform wurden abgelehnt.

Im Anschluss an die Reform des weissruthenischen Alphabets wurde auch die Frage über das lateinische Alphabet berührt, umsomehr, als auch die türkischen Völker SSSR ihre alten Schriftzeichen durch die lateinischen ersetzen. Aber da die Mehrzahl der Redner (Niekraševič, Liosik, Rastorgujev, Vasmer, Blesse, Lastovski u. a.), auf Grund wissenschaflicher Angaben, sich gegen die Einführung des lateinischen Alphabets aussprachen, da auch die Frage über die Einführung desselben im ganzen Bereiche des SSSR noch nicht reif genug worden ist, so wurde dieselbe abgelehnt.

Bedeutend komplizirter in den Arbeiten der Akademischen Konferenz erschien die Frage über die Reform unserer Ortographie.

Wie bekannt, gilt bei uns die Orthographie von B. Taraškiewič. Bis zum letzten Jahre hielt sich dieselbe sehr fest. Es waren zwar auch hier einige geringe Abweichungen, aber sie liessen die Orthographie und deren Grundsätze unbehelligt.

Das Jahr 1926 bringt schon viele Unzufriedene mit der Orthographie Taraškewič's mit sich. Die einen finden, dass sie allzuschwierig sei, die anderen, dass sie der weissruthenischen Sprache nicht vollständig entspreche u. s. w.

Die grösste Unzufriedenheit mit Taraškevitč's Orthographie finden wir in der Broschüre der Brüder J. und A. Liosik: „Zur Reform der weissruthenischen Rechtschreibung", herausgegeben im Sommer v. J. Die Hauptfrage in der Reform nach dem Liosik'-

schen Entwurfe ist das volle Akanje—„Аканьне“ (яканьне). In Beantwortung des Rechtschreibung—Entwurfes der Brüder Liosik äusserten ihr Gutachten über die Reform fast alle unsere Sprachkenner (P. Buzuk, Volk-Levanovič, A. Bogdanovič, S. Niekraševič). Sie hielten sich kritisch zu dem Reform-Entwurfe der Brüder Liosik, fanden ihn wissenschaftlich unbegründet und den Gesetzen der weissruthenischen Sprache nicht entsprechend. Dessenungeachtet, weil die Frage über die Reform der weissruthenischen Rechtschreibung sich in den weitesten Massen unserer Lehrerschaft verbreitet und unnötige, ja schädliche Diskussionen hervorgerufen hatte, so veranlasste das Institut für Weissruthenische Kultur die Berufung einer Akademischen Konferenz zur endgültigen Entscheidung der streitigen Frage über unsere Rechtschreibung auf dieser Kompetenten Versammlung.

In Fragen der Recht schreibung wurden auf der Konferenz zwei Vorträge gehalten: Liosik's „Zur Reform der weissruthenischen Rechtschreibung“ und S. Niekraševič's, dasselbe Thema betreffend.

In seinem Vortrage schlägt J. Liosik vor: 1) den in unserer Rechtschreibung angenommenen phonetischen Grundsatz des Gebrauchs der Selbstlaute nicht nur gänzlich auf *a* zu erweitern, d. h. jedes unbetonte *o* durch *a* zu schreiben (галава), sondern auch auf *e,* folglich auch jedes unbetonte *e* durch *я* zu schreiben (п*я*ракуліць); 2) den phonetischen Grundsatz der Rechtschreibung auch auf die Konsonnanten zu erweitern ausser am Ende der Wörter; d. h. ка*зь*ба, но*ш*ка (von нага), рашка (von рог) schreiben, aber рог, воз u. s. w.

Was die Fremdwörter betrifft, so sollen sie in Bezug auf das „Akanje“ (аканьне) den Regeln für unsere Wörter unterliegen, deshalb proponiert der Referent zu schreiben: д*а*по (дэпо), дабаркадар (дэбаркадэр) u. s. w.

Ausserdem schlägt J. Liosik vor: 3) *й* und *ў,* wenn sie einzeln oder im Anfang des Wortes stehen, immer als *і* und *у* zu schreiben; d. h. nicht so, wie man früher schrieb: баба й дзед, баба йдзе, мы ў хаце, вы ўбілі, sondern: баба і дзед, баба ідзе, мы у хаце, вы убілі u. s. w. 4) den „*ь*“ nach den Konsonnanten und vor folgender weichen Konsonanten wegwerfen, wenn *ь* eine Erweichung der ersten bedeutet, d. h. nicht *каменьне, сьнег,* sondern *каменне, снег* schreiben; 5) im Anschluss an das „яканьне“: a) im Genitif, Einzahl, der Eigenschaftswörter weiblichen Geschlechts am Ende *і:* лева*і* руки, у сама*і* хаты u. s. w. b) im Ablatif, Einzahl, der Hauptwörter, wenn ohne Betonung, auch ein *і* am Ende: у лес*і,* у ям*і* u. s. w.

S. Niekraševič in seinem Vortrage „Zur Reform der weissruthenischen Rechtschreibung“ bezeichnet die Hauptfehler der von J. Liosik projektirten Reform unserer Rechtschreibung und

hält es seinerseits für möglich in der Rechtschreibung von B. Taraškevič folgende Korrektive zur Vereinfachung derselben einzuführen: 1) in der zweiten vor der Betonung Silbe immer *e* zu schreiben (н*е*прыхільна, н*е*прыцямна); 2) zur Mechanisation der Rechtschreibung sollen *не* und *без*, wenn sie besonders stehen, nicht dem „яканьне" unterliegen, d. h. man soll immer *не* und *без* schreiben (*не* раз, *без* шапкі); 3) die Wörter н*я*ма, н*я*хай folgendermassen schreiben: нiма, н*i*хай; 4) das „аканьне", wie folgt, auf alle Fremdwörter zu erweitern: jedes unbetonte *o* der Fremdwörter im Weissruthenischen durch *a* zu schreiben: к*а*місія, к*а*нстытуцыя, aber дэпо, дэл*е*гат.

An den darauf folgenden Diskussionen beteiligten sich einige Personen, worauf die Fragen, betreffend die Reform der Rechtschreibung, einer besonderen, aus Mitgliedern der Konferenz gebildeten Komission übergeben wurden.

Diese Rechtschreibungs-Komission erörterte in einigen Sitzungen gründlichst alle von den Referenten gemachten Entwürfe etwaiger Veränderungen in unserer Rechtschreibung und fasste folgende Beschlüsse: 1) Die Erweiterung des phonetischen Grundsatzes der Rechtschreibung auf die Konsonanten, insofern solche von J. Liosik wissenschaftlich nicht begründet ist, nicht zu beachten. 2) das von J. Liosik projektirte volle „яканьне", d. h. Schreiben jedes unbetonten *e* durch *я* wird abgelehnt; 3) in Taraškevitč's Rechtschreibung über *e* werden folgende Korrektive eingeführt: a) in der zweiten Silbe vor der Betonung wird immer *e* geschrieben (nicht *я*) und b) die Verneinungswörter *„не", „без",* wenn sie besonders stehen, unterliegen dem „яканьне" nicht; 4) das Schreiben der Wörter н*я*ма, н*я*хай, durch *i*, d. h. н*i*ма, н*i*хай, wird abgelehnt; 5) das Erweitern des „аканьне" auf die Fremdwörter, laut S. Niekraševič: jedes unbetonte *o* in Fremdwörteru wird durch *a* geschrieben; 6) das *i*, wenn es in der Mitte des Wortes oder im Anfang steht, soll immer wie *i* geschrieben (und nicht *й*); 7) das Schreiben des *y*, wenn es zwischen den Wörtern oder im Anfang eines solchen steht, als *y* (silbig) wird abgelehnt (also bleibt in der Rechtschreibung des *y* die Redaktion B. Taraškevič); 8) Die übrigen Punkte der vorgeschlagenen Reform werden in die Rechtschreibungs-Kommission übergeben.

Ausser diesen speziellen Vorträgen über Sprachkunde wurden auf der Konferenz noch vier Vortrage über weissruthenische Literatur gehalten.

Den ersten Vortrag: „Die Grundetappen der Entwickelung der neuen weissruthenischen Literatur" hielt Prof. M. Piotuchovič. In seinem Vortrag gab M. Piotuchovič eine allgemeine Charakteristik des Literaturprozesses in Weissruthenien während der letzten Zeit.

Der nächste Referent M. Harecki machte eine allgemeine Charakteristik der Literaturperioden: der Naschaniwischen und der NachOktober-Periode.

J. Golombek, Dozent an der Universität zu Warschau, hielt einen Vortrag über die Schriftsteller des XIX Jahrhunderts, welche weissruthenisch und polnisch schrieben, und die Erlernung ihrer Werke.

Der letzte literarische Vortrag behandelte das Thema: „Poesie der neuesten weissruthenischen Literatur" und wurde von Doz. A. Vozniesienski gehalten.

Zur Besprechung aller in den Vorträgen berührten Fragen wurde aus den Mitgliedern der Konferenz eine Literatur-Kommission gebildet. Als Resultat ihrer Arbeiten wurde von der Kommission Folgendes festgestellt: 1) die auf den Plenarsitzungen angehörten Vorträge über weissruthenische Literatur haben deren hohen Werth nicht nur in Betreff der weissruthenischen, sondern auch der allgemein-menschlichen Kultur allseitig beleuchtet. 2) Diese allgemein-menschliche Bedeutung der weissruthenischen Literatur erhält jetzt eine besondere Verbreitung, da sie aus ihrem echt-nationalen Rahmen tritt unb ihre Beachtung ausserhalb der Grenzen von Weissruthenien, der übrigen europäischen Literatur ebenbürtig, findet. 3) Solche Entwickelung und Bedeutung erwarb sich die Weissruthenische Literatur dank der Oktoberrevolution, welche allein den staatlichen, politisch-ökonomischen und nationalen Aufbau von Sowjet-Weissruthenien ermöglichte. 4) Allein noch bis in die letzte Zeit hinein ist die weissruthenische Literatur nur wenig erforscht; dazu ist eine ausgedehnte Arbeit zum allseitigen Studium der genannten Literatur unbedingt nötig. 5) Um dieses Ziel zu erreichen, muss ein spezielles Institut zur wissenschaftlichen Forschung und Erlernung der Geschichte der weissruthenischen Literatur gegründet werden.

Die Bedeutung der Akademischen Konferenz für das Kulturleben von Weissruthenien ist ohne Zweifel sehr gross. Es wurde schon früher angedeutet, welch einen grossen Werth die Konferenz hat, als ein Faktor, mit dessen Hilfe die weissruthenische Sprachkunde zum Erwerbniss der ganzen slavischen Welt wird und die weissruthenische Sprache selbst mit Recht den ihr gebührenden Platz unter den übrigen slavischen Sprachen einnimmt.

Gleichzeitig ergründete die Konferenz auch den Weg, den die wissenschaftliche Arbeit machen muss, damit die weissruthenische Sprache unabhängig und den anderen slavischen Sprachen gleich werde.

Aber besonders wertwoll waren die Ergebnisse der Konferenzarbeiten im Gebiete der Alphabetreform und noch mehr unserer Rechtschreibung. Auf diesem Gebiete äusserte die Konfe-

renz ihre autoritätische Meinung und machte in Taraškevič's Rechtschreibung eine ganze Reihe höchst wichtiger Verbesserungen, welche zu deren Vereinfachung führen.

Gleichzeitig lieferten die Mitglieder der Konferenz in ihren Vorträgen, Reden und Anmerkungen eine Menge höchst interessanten Materials zur Reform unserer Rechtschreibung und des Alphabets, sowie auch zur Erforschung der weissruthenischen Sprache überhaupt.

Ohne Zweifel hat die Konferenz auch eine nicht geringe wissenschaftliche Bedeutung für das Studium unserer Literatur. Auf der Konferenz wurden die Grundetappen der Entwickelung der weissruthenischen Literatur und deren Forschungsmethoden erörtert. Im Resultate haben wir sehr viel wertvolles Material zum Studium der neuesten Periode der weissruthenischen Literatur.

Alle ausländischen Delegierten hatten die Möglichkeit den Bau des neuen Sowjetweissruthenien zu sehen. Mit grossem Interesse besuchten sie die kultur-bildenden und wissenschaftlichen Anstalten in Mensk und Witebsk. Alle diese Anstalten machten auf sie einen guten Eindruck.

So, z. B., äussert sich der bekannte lettische Dichter Raynis über unsere Kulturanstalten: „Die Presse und uberhaupt die Volksaufklärung machen gewaltige Fortschritte... Die Delegierten der Konferenz besuchten die Universität, die prächtig eingerichteten Kliniken, das reichlich ausgestattete Zoologische Kabinet, die Psychiatrische Klinik. Die Universität, wenn auch noch nicht völlig ausgestattet, muss doch zugegeben werden, dass sie sehr gut gestellt ist. Das Weissruthenische Theater existirt erst 5 Jahre, aber es hat schon jetzt eine hohe Stufe der Entwickelung erreicht. Es werden sowohl Originalstücke, sowie auch Piecen (Stücke) aus dem europäischen Repertoire gestellt. In Witebsk wurde das Theater mit einem Originalstück eröffnet und am nächsten Tage stellte man Shakespeare's „Sommernachtstraum". (Lettische Zeitung „Sozial-demokrat", № 265, 24/XI).

Der Dozent an der lettischen Universität Blesse in der Zeitung „Latwis" kann nicht umhin zu bemerken, dass—„das Institut für Weissruthenische Kultur ein Führer der Kulturarbeit geworden ist und die Universität gezwungen ist mit ihm zu rechnen. In nächster Zukunft wird aus den tüchtigsten Mitgliedern vom Institut eine Akademie der Wissenschaften gebildet werden. Die Archäologie enwickelt sich. Jedes Jahr werden Ausgrabungen gemacht und die Exponate in den Museen wachsen. In Mensk sind neue Museen für Altertumskunde und Etnographie erröffnet, in welchen schon ziemlich viel Material angesammelt ist. Noch reicher ist das Witebsker Museum". Oder weiter: „Die weissruthenischen Artisten sind tüchtig. Die Artisten des Witebsk'schen

Theater's haben ihre Bildung in der Studie des Moskauer Kunst-Theater's bekommen".

Der Delegierte der Konferenz u. bekannte Slavist, Prof. an der Berliner Universität Max Vasmer giebt folgende Rezension über die Arbeit der Wörterbuch-Kommission vom Institut für weissruthenische Kultur: „Mit grossem Vergnügen begrüsse ich die an Inhalt reichen Sammlungen der Wörterbücher-Komission. Ich bin überrascht, wieviel in so kurzer Zeit nach Eröffnung des Instituts gemacht worden ist. Ich hoffe und wünsche, dass all dieses Material, welches jetzt hier so hübsch aussieht, möglichst schnell im Druck erscheinen möchte, damit die west-europäischen Gelehrten es nach Gebühr beachten und schätzen könnten"..

Es versteht sich, das solche Beachtung der ausländischen Gelehrten zu einer richtigeren Beleuchtung im Auslande jener Fortschritte u. Erfolge führt, welche unser Land unter der Führung der Kommunistischen Partei u. Rätemacht erreicht hat. Dadurch förderte die Konferenz auch die Bedeutung von Mensk, als des einzigen Kultur-Mittelpunkts des etnographischen Weissruthenien.

Zu solch einem allgemein-weissruthenischen Kultur-Mittelpunkte konnte Mensk nur werden, weil der Bund der SSSR alle Garantien und Möglichkeiten giebt zur richtigen Lösung der sozialen und nationalen Lage nicht nur in Weissruthenien, sondern in allen früher unterdrückten Ländern und Völkern.

Einen grossen Mangel in den Arbeiten der Konferenz verursachte die Tatsache, dass die wissenschaftlichen Arbeiter von West-Weissruthenien und darunter Prof. Taraškevič, der die erste Grammatik der weissruthenischen Sprache verfasst hat, nicht nach Mensk kommen konnten, weil die polnische Regierung ihnen keine Pässe gab.

Diese traurige Tatsache wurde von der Konferenz im Verlaufe ihrer ganzen Arbeit gefühlt. Schon auf der zweiten Sitzung wurde ein Beschluss gefasst, welcher diese Tatsache tadelte.

Wenn die Nichtzullassung der Delegierten von West-Weissruthenien zur Konferenz eine negative Tatsache bildete, so offenbarte sie, anderseits, glänzend die völlige Taktlosigkeit der Politik der Polnischen Regierung. Wir erhielten aus dem Auslande den Brief eines Professors, welcher schreibt, dass man sogar in polnischen Kreisen „bedauert, dass man eine Dummheit begangen und dadurch Anlass zu feindichen Demonstrationen gegeben habe". Die polnische Zeitung „Kurjer Wileński" (24/XI) in ihrem Leitartikel „Die Bärenpolitik" tadelt auch die Regierung wegen Mangel an politischer Klugheit und spricht davon, dass in politischer Hinsicht die polnische Regierung sich sehr geschadet hat sowohl in der Meinung Europa's, als auch in den Ansichten der weissruthenischen Bevölkerung hier und ausserhalb

des Kordons". Mit diesen Worten des Leitartikels stimmen wir überein.

Die mit der Akademischen Konferenz verbundenen Tatsachen ermöglichten, einerseits, der ganzen weissruthenischen Intelligenz sich in der Richtung der polnischen Politik zu überzeugen, anderseits förderten sie die Festigung der Position unserer Partei sowohl in dem uns nahestehenden Teil der Intelligenz, als auch in dem bisher noch schwankenden. Und man kann dem Gedanken nicht Recht geben, welcher in den Artikeln der ausländischen Presse über unsere Konferenz manchmal geäussert wurde, dass, ungeachtet der Einwirkungen der Kommunisten, die nationalistischen Neigungen in Sowjet-Weissruthenien stärker als die kommunistischen seien; dass die Möglichkeit nicht ausgeschlossen sei, der Nationalismus werde über den Kommunismus überhand nehmen. Das Studium der gegenwärtigen Lage von Sowjet-Weissruthenien giebt uns ein ganz anderes Bild.

Die vergangenen Jahre zeugen von einem bedeutenden Wuchse der Volkswirtschaft. Die sozialistischen Elemente der Wirtschaft wachsen besonders lebhaft. Wir verhehlen es auch nicht, dass neben der sozialistischen Wirtschaft auch die Elemente des „NÖP" (Neue Ökonomische Politik) wachsen.Auf diesen Elementen des NÖP können u. erwachsen auch „kulazkije", nationalistische und schowinistische Stimmungen. Ein Teil der Intelligenz richtet ihre Aktivität auf diesen Weg der nationalistischen Stimmungen und Ideale. Es ist möglieh, dass mit der weiteren Enwickelung des NÖP auch die Aktivität in dieser Richtung wachsen wird.

Ein Teil der weissruthenischen Intelligenz wird vielleicht danach streben durch Weissruthenisirung die national-demokratischen Ideale zu verdrängen, ein Teil der russischen Intelligenz wird darauf durch Verstärkung der Grossmächtigen Stimmungen reagieren. Unter den jüdischen und polnischen Volksminderheiten können sich bei der Durchführung der Weissruthenisirung Stimmungen bilden, als ob ihre Kulturforderungen ignorirt werden.

Alles dies verheimlichen wir uns nicht. Aber gleichzeitig mit alledem sehen wir auch Anderes. Wir sehen, dass die socialistische Wirtschaft viel mächtiger wächst, als die Nöp'schen Elemente. Dafür zeugt das ungestüme Wachsen der Staats-Industrie und des Handels, welche den Privatunternehmer und Händler gänzlich verdrängen; die Armen u. Mittelbauern auf dem Lande festigen sich durch Kooperation und Kredit, gehen allmählig zur Kollektiv-Wirtschaft über. Es wächst die Zahl und der Einfluss des Proletariats. Die Diktatur des Proletariats, welche sich auf den engen Bund des Arbeiters und Landmanns stützt, wird immer fester. Alles dies wirkt auch auf die Weltanschauung

der Intelligenz und macht einen viel tieferen Eindruck, als der NÖP, welcher sich viel schwächer entwickelt, als der Sozialismus. Versteht sich, dass unter diesen sozialistischen Einflüssen die überwiegende Mehrzahl der Intelligenz, insbesondere die Lehrermasse, ausdrücklich Front zur Partei genommen haben und unter ihrer Führung eifrig arbeiten.

Diese Intelligenz steht auf dem Grunde des Internationalismus und nicht des Nationalismus, weil sie es richtig versteht, dass der Nationalismus dem Aufbau eines jeden sozialistischen Staates und folglich auch des Weissruthenien nur hinderlich ist.

Der revolutionäre Marxismus und Leninismus bildet für diese Intelligenz die Grundlage ihrer Tätigkeit um so mehr, da der Nationalismus und Schowinismus im „demokratischen" Polen ein grelles Bild aller ihrer negativen Seiten giebt. Jeden Tag bringen uns die Zeitungen Tatsachen aus dem Leben von West-Weissruthenien, welche Zeugniss von dem Schaden geben, den der Schowinismus, in welches Gewand er sich auch hülle, den unterdrückten Völkern bringt.

Es genügt z. B. die Arbeit eines so kleinen Winkels von Sowjet-Weissruthenien, wie des Instituts für Weissruthenische Kultur mit seinen jüdischen, polnischen und lettischen Abteilungen zu nehmen. Hier wirken kameradschaftlich Arbeiter verschiedener Nationalität unter der Führung der Kommunistischen Partei und jeder von ihnen versteht, dass der Nationalismus eine Krankheit ist, welche trennt, aber nicht bindet, zerstört aber nicht baut; das der Nationalismus die Völker nicht befreit, sondern in Ketten schlägt, dass nur der revolutionäre Marxismus und Leninismus nicht nur den Proletarier, Mittel und Armenbauer, sondern auch den unterdrückten Nationalisten befreit. Und deshalb wächst mit jedem Jahr, mit jedem Monat die Zahl unserer sowjet'schen Intelligenz, welche unter der Führung der Kommunistischen Partei bewusst zum Bau der neuen proletarischen Kultur schreitet.

Die Materialen der Akademischen Konferenz bestehen aus den von den Verfassern eingereichten Vorträgen und den stenographisch aufgeschriebenen Reden. Weil aber der stenographische Teil der Konferenz nur schwach vertreten war, so mussten einige Reden nach den Protokoll-aufzeichnungen gedruckt, bei anderen Redaktions-verbesserungen gemacht werden. Es sind daher wohl Lücken und sonstige Unvollständigkeiten möglich.

Was die Anordnung des Materials betrifft, so hielt die Redaktion es für zweckmässiger, dasselbe zur bequemeren Benutzung nicht in der Reihenfolge der abgehaltenen Konferenzsitzungen, sondern nach den einzelnen Themata zu ordnen.

Zum Schlusse ersucht das Institut für weissruthenische

Kultur höflichst alle Personen, besonders Lingvisten und Lehrer, denen dieses Buch gesandt oder in deren Hände es kommen wird, ihre Rezensionen über die im Buche berührten Fragen zu schicken, sowie auch über andere Fragen unserer Rechtschreibung und Alphabets, welche zwar auf der Konferenz nicht berührt wurden, aber doch zur Vereinfachung bestimmt eingeführt werden müssen.

Alle diese Rezensionen, Artikel und Anmerkungen, so klein sie auch sein sollten, werden mit Dankbarkeit angenommen und von der Abteilung für Sprache u. Literatur im nächsten Buche, welches einen systematischen und vollen Entwurf der Reform der weissruthenisshen Rechtschreibung und des Alphabets darstellen soll, gedruckt werden.

24 Mai 1927.

V. Ignatovski.
S. Niekraševič.

Урачыстае адчыненьне Акадэмічнай Конфэрэнцыі.

Старшыня Інбелкульту, проф. Ігнатоўскі. Паважаныя грамадзяне! Адчыняючы Акадэмічную Конфэрэнцыю па пытаньнях беларускага правапісу і азбукі, я хацеў-бы тут, на гэтым урачыстым сходзе, успомніць цяжкія часы жыцьця 70-х, 80-х і 90-х гадоў прошлага сталецьця. На гэтым урачыстым сходзе, на якім сабраліся прадстаўнікі сусьветнай навукі і прадстаўнікі працоўных мас Савецкай Беларусі, я хацеў-бы ўспомніць аднаго з беларускіх песьняроў 70-х, 80-х і 90-х гадоў, Фрацішка Багушэвіча. Вось што ён гаворыць па тым самым пытаньні аб беларускай мове, па якім будзе працаваць скліканая Інстытутам Беларускай Культуры наша Акадэмічная Конфэрэнцыя.

„Братцы мілыя, дзеці зямлі—маткі маей! Вам афяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, да і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя „мужыцкай“ завуць, а завецца яна беларускай“ [1]).

Далей пясьняр пытаецца „Што-ж мы за такія бяздольныя?“ Усе, хто жыве навокала нас, нават зусім малыя народы пасвойму гавораць і маюць пасвойму надрукованыя кніжачкі,—„а ў нас, як-бы захацеў цыдулку, ці да бацькі лісток напісаць пасвойму, дык можа-б і ў сваёй вёсцы людзі сказалі, што „піша памужыцку“ і, як дурня, абсьмяялі-б!“ [2]).

Крыху далей Багушэвіч з вялікім болем кажа: „Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, як той чалавек прад скананьнем, катораму мову займае, а потым і зусім памерлі. Не пакідайце-ж мовы нашай беларускай, каб не памерлі!“ [3]).

Баліць сэрца песьняра за мужыцкі народ і за яго мужыцкую мову. Здаецца яму, што калі зьберагчы мову народу, то зьберажэцца і народ. У нявымоўна цяжкіх абставінах

[1]) Францішак Багушэвіч. Дудка беларуская. Смык беларускі. Менск, 1922, выд. VI і V; стар. 7.

[2]) Ibid. ніжэй, стар. 7.

[3]) Ibid. — стар. 8.

жыцьця, у цісках царскай рэакцыі, ён не адчувае сваёй абмылкі. Ён ня бачыць таго, што ня мова консолідуе ўсебаковае жыцьцё народу, а што сама „мова народу консолідуецца ў процэсе экономічнай і політычнай консолідацыі“[1]); што ня мова творыць народ, а народ творыць мову.

Багушэвічу часам здаецца, што беларускі народ ужо памірае і фізычна і культурна. З гэтай прычыны засмучана сэрца песьняра. Дудка песьняра ніяк ня можа зайграць на вясёлы лад. Пясьняр кажа, што ён сорак год б‘ецца, як тая рыба аб лёд, і ніяк ня зьвернецца, ніяк не патрапіць на кроплю такой вадзіцы з такой крыніцы, „што як хто нап‘ецца, дык вольным стаецца“. Ніяк ня можа пясьняр паставіць сваю леру-дудку на вясёлыя, бадзёрыя лады. Багушэвіч зьвяртаецца да яе з такімі горкімі словамі:

„Ну, дык грай-жа, грай-жа,
Усё спамінай-жа!
Што дзень і што ночы
Плач, як мае вочы,
Над народу доляй
І плач, што раз болей!
Плач да астатку,
Галасі, як матка,
Хаваючы дзеці,
Дзень, другі і трэці,
Іграй сьлёзным тонам
Над народу сконам“[2]).

Так плакаў над доляй беларускага народу, прыгнечанага царызмам, дудар Багушэвіч. І калі мы прыгледзімся да сучаснай яму эпохі, то пабачым, што ня толькі ён адзін тады плакаў. Гэта была наогул эпоха плачу, эпоха енку, эпоха рэакцыі. Плакалі польскія песьняры, яўрэйскія песьняры, літоўскія, рускія і г. д. Вось, напрыклад, як аплакваў долю яўрэйскага народу пясьняр С. Фруг.

„Все поникло кругом, помертвело,
Как средь диких пустынных равнин.
Зарыдал-бы хоть кто-нибудь смело,
Застонал-бы хоть громко один!
Эти ночи без звезд и без бури,

---

[1]) Проф. В. И. Пичета. Белорусский язык, как фактор национально-культурный. Минск, 1924 г. Стар. 11.

[2]) Францішак Багушэвіч. Дудка беларуская. Смык беларускі. Выд. VI і V; стар. 11.

Эти дни без теней и лазури,—
Мой народ, как похожи они
На печальные годы твои!“ [1]).

Гэта быў той пясьняр, які гаварыў аб сваёй творчасьці так: „Я арфа Эолова доли народной, я эхо народных скорбей; что взял у народа я гневом и ядом, я песней ему отдаю“[2]). І цікава, што сучасны яму беларускі пясьняр Ян Няслухоўскі (Я. Лучына) аб сваёй творчасьці гаворыць амаль-што такімі-ж словамі. Ён кажа, што ў яго песьні гаворыць прыгнечаны народ,

„Бо на сэрцы маю путы
І з народам імі скуты...
Мне гаворыць вёска, хата,
Мне гаворыць сэрца брата,
Рад, зьбіраю, што пачую,
У грудзі сваёй нашу я,
Аж, як траўка на кургане,
Яно ўзыйдзе—песьняй стане“ [3]).

Гэтыя сумныя гады царскай рэакцыі добра вядомы ўсім нам прысутным у гэтай залі. Гэта былі гады цемры, гады ночы перад зоркай надыходзячай рэволюцыі. Царызм—гэты эўропейскі жандар за граніцаю і турэмшчык народаў у сябе ў хаце—душыў ня толькі рабочага і селяніна, але і так званага „инородца“. Больш ста народаў, якія былі прызнаны „инородцами“, сядзелі за кратамі гэтай царскай турмы. Пагромы, абмежаваньні ў правох, экономічнае і культурнае прыгнечаньне, зьдзек, нацкоўваньне аднэй нацыі на другую. Ня толькі беларусы, але і прадстаўнікі іншых нацыянальнасьцяй, прысутныя тут, добра памятаюць гэтыя часы, кашмарныя часы царызму. Царская Расія мела выгляд моцна памураванай турмы, выгляд могілак.

„Сьцішна, нудна, як ў вастрозе,
Як на могілках якіх“ [4]).

Так было даўно, так жылося працоўным масам у часы крывавага самаўладзтва. Кат і провокатар былі запраўднымі гаспадарамі палажэньня ў імпэрыі. Але пролетарыят ужо быў гатовы да бою і цэмэнтаваў наўкола сябе сялянства, што гатавалася да паўстаньня. У розных канцох шырокай імпэ-

---

[1]) С. М. Дубнов. Евреи в России и Зап. Европе. Москва, 1923. Кн. I. Стар. 81.

[2]) Ibid.—стар. 91.

[3]) М. Гарэцкі. Гісторыя беларускай літаратуры. Выд. III, стар. 244.

[4]) Якуб Колас. Песьні жальбы. Вільня. 1910, стар. 34.

рыі паднімаліся на барацьбу за сваё вызваленьне працоўныя гушчы. У адказ на гэта царызм сьпешна арганізаваў чорную сотню. Ішлі расстрэлы рабочых і сялян. Даволі нам тут успомніць Ленскі расстрэл рабочых у далёкай Сібіры 17-га красавіка 1912 году. Жандарскі ротмістар Цярэшчанка, абараняючы здабыткі капіталістаў, расстраляў 520 рабочых: 270 чалавек былі забіты на месцы, 250 былі паранены. Т-шч У. І. Ленін так характарызуе гэтага ротмістра і той лад, у якім былі гаспадарамі палажэньня гэткія асобы: „Человекообразная машина в жандармском мундире, которая при ближайшем рассмотрении оказалась точнейшим воплощением всей романовской монархии... Провокатор и палач в ротмистре Терещенко скрывался под мундиром начальника охранного отделения. Но под министерским мундиром Столыпина не скрывался-ли тот-же провокатор и палач лишь во всероссийском масштабе? И под императорской мантией Николая Романова не живет-ли тот-же провокатор и палач? Терещенко расстрелял сотни, но Столыпин и Романов не расстреляли-ли тысячи“ [1]).

Моцная, вычэрпваючая ленінская характарыстыка. Да яе нічога ня можна дадаць.

Калі запытаньне аб Ленскім расстрэле стаяла ў чорнасотніцкай III Думе, то царскі міністар унутраных спраў Макараў кінуў такія крылатыя словы, каторыя абляцелі шырокія абшары імпэрыі і вылецелі далёка за яе межы: „Так было и так будет впредь“.

Гісторыя сказала іншае. „Так было, але ніколі ня можа і не павінна так быць уперад“. Гісторыя ня толькі так сказала, але і даказала.

У турме рабочых і сялян, у турме народаў заварушыліся сілы. На могілках буйна ўзрасьлі расткі барацьбы і новага творчага жыцьця. Пад кіраўніцтвам пролетарыяту вышаў на шлях змаганьня селянін. Амаль што адна за другою адбыліся тры рэволюцыі. Цьвёрдаю нагою стаў Вялікі Кастрычнік. Развалілася дашчэнту раней царская, а потым і буржуазная турма. З турмы вышлі да шырокай, бадзёрай

1) Н. Ленин (В. Ульянов). Собрание сочинений. Т. XII, ч. 1, Москва, 1924, стар. 90-91.

творчасьці прыгнечаныя клясы і прыгнечаныя народы былой Расійскай імпэрыі.

Сярод буры і пяруноў Кастрычнікавай Рэволюцыі нарадзілася на сьвет і наша рабоча-сялянская Савецкая Беларусь. Новыя песьні беларускіх песьняроў чуем мы ў гады рэволюцыйнай барацьбы і ў часы пасьлярэволюцыйнай працы.

Янка Купала, яшчэ на прадвесьні Кастрычніка, адчувае надыходзячую зацятую барацьбу. Ён зьвяртаецца ад імя пакрыўджанага селяніна да пануючых кляс з такою пагрозаю:

„...за крыўду сваю адамсьціць,
Адамсьціць, аж зямля задрыжыць.
Сьвіньням будзе крыві не пабраць.
Адамсьціць, аж зямля задрыжыць,
Аж віхры зашумяць, загудуць...“ [1]).

Якуб Колас таксама сярод сваіх песень жальбы знаходзіць моц заклікаць працоўныя масы, каб яны ўсталі да новага жыцьця:

„Ўстаньце, хлопцы, ўстаньце, браткі,
Ўстань ты, наша старана,
Ўжо глядзіць к нам на палаткі
Жыцьця новага вясна.

...Выйдзем разам на работу,
Дружна станем, як сьцяна,
І прачнецца ад драмоты
З намі наша старана“ [2]).

Трэба, каб сьціхлі песьні жальбы і пакуты. Новыя песьні павінны шырыцца. Путы павінны быць скінуты.

„Змоўкні ты, сьціхні, песьня пакуты,
Заварушыся, наш край!
Люд беларускі! Рві свае путы,
Новую песьню сьпявай“ [3]).

„Песні працы і змаганьня“ сьпявае наш пясьняр-гарбар Цішка Гартны (З. Жылуновіч). Пяруны барацьбы і соцыяльнай рэволюцыі грымяць у яго сьпевах. Новы ўклад жыцьця вітае ён.

---

[1]) У. Ігнатоўскі. Кароткі нарыс культурнага адраджэньня Беларусі, Менск, 1921 г. стар. 59.

[2]) Ibid.—стар. 51-52.

[3]) Якуб Колас. Водгульле. Менск, 1922, стар. 106.

„Над сьветам рэе Сьцяг Чырвоны,
Вакол ўздымаючы паўстаньне
Супроць вяковага прыгону,
Супроць няволі панаваньня.
...Сьцярпеўшы раб ўстае да бою,
Рвучы вакол свае аковы,
І ўжо вітае над зямлёю
Жыцьця уклад свабодны, новы“ [1]).

А вось перад намі добра ўсім нам вядомы малады пясьняр-барацьбіт, паўстанец 1920 году, асновапаложнік літаратурнага згуртаваньня „Маладняк“—Міхась Чарот (М. Кудзелька). З вінтоўкаю ў мазолістых мужыцкіх руках ён змагаўся за перамогу Кастрычніка на Беларусі. Барацьбіт, комуністы па пераконаньнях і поглядах, ён малюе нам яскравыя карціны барацьбы за Савецкую Беларусь.

„Крыжы... курганы на балоце...
Заросшыя дзёрнам магілы,—
Ўсе ў вогненай зноў пазалоце:
Бушуюць дзьве страшныя сілы,—
Змагаюцца—праца з багацьцем,
Сьвет новы жыцьцё утварае.
Зышліся дзьве моцныя раці,
І праўда няпраўду змагае“ [2]).

Ідзе зацяжная, заўзятая, крывавая барацьба. Палае вогнішча соцыяльнай рэволюцыі. Перамога то на тым, то на другім баку. Усё растуць і растуць сьвежыя магілы невядомых барацьбітоў за лепшую долю працоўных мас. Адзін за другім гінуць на Беларусі арлы—двохгаловы чорны арол Расійскай імпэрыі, аднагаловы чорны арол кайзараўскай Нямеччыны і белы арол Польшчы. „Большавіцкая зараза“ ўсё пашыраецца.

„Уласьць усю забралі босыя,
А іх тут мільёны!“ [3]).

З агня ў агонь і праз агонь нясуцца раці барацьбітоў ўсё далей і далей на Захад. З кожным крокам перамога ўсё бліжэй і бліжэй. Трубачы ўжо граюць песьню пабеды.

„Тру-ру-ру, тра-та-та.
Гэй, за намі, бедната!
На дарозе макрата...

---

[1]) Цішка Гартны. Песьні працы і змаганьня. Бэрлін, 1922, стар. 78.
[2]) Міхась Чарот. Босыя на вогнішчы. Поэма. Менск, 1922, стар. 9.
[3]) Ibid.—стар. 15.

Тру-ру-ру, тра-та-та.
Тухне вогнішча ў крыві,
Песьню йграйце: „дзінь-дзі-ві“.
Каго зловіш, разарві,
Хто ня наш, таго даві...
Босы хто, за намі ўсьлед,
Хто убогі, хто раздзет,
Гэй, за намі ў новы сьвет!
Цёпла там і там прастор,
Небасхіл там повен зор...
Сонца тчэ жыцьця узор!
Так спачынеш, бедната...
Тру-ру-ру, тру-та-та“ [1]).

Пад кіраўніцтвам Компартыі і Савецкай Улады пачалося новае жыцьцё на Беларусі. Зразумела, што зьніклі песьні жальбы, смутку і гора. Зараз мы чуем новыя бадзёрыя песьні каторыя адбіваюць жыцьцё.

Савецкая Беларусь прынялася за працу. Шмат трэба было зрабіць. Найперш ад усяго трэба было адбудаваць усё тое, што было зруйнавана за часы імпэрыялістычнай вайны і рэволюцыі. Трэба было ўтварыць экономічны базіс для жыцьця маладой рабоча-сялянскай рэспублікі. Пад чырвоным штандарам дыктатуры пролетарыяту, у сьціслай сувязі паміж сабою—рабочы стаў каля варштату, селянін пайшоў за плугам, інтэлігент сеў за кнігу. Шэсьць год цяжкай, упартай працы. Цяпер ужо заложаны моцныя грунтоўныя падваліны для нашага дабрабыту. Шмат чаго яшчэ не хапае, шмат чаго яшчэ трэба дабіцца, але шмат ужо ёсьць і вынікаў нашай цяжкай працы. Бадзёра і сьмела глядзім мы на нашу будучыну. Наш народны поэта Янка Купала такімі словамі адбіў сучасны настрой рабоча-сялянскіх гушчаў Беларусі:

„Беларусь на куце
Ў хаце сваёй села,—
Чарка мёду ў руцэ,
Пазірае сьмела.
Сядзіць важна, сама
Сабе гаспадыня,
І прыбрана яна,—
Ніхто не закіне.
На галоўцы вянок
З сініх васілёчкаў,

[1]) Ibid.—стар. 28-29.

А чырвон паясок
Стан абвіў дзявочы“ [1]).

Побач з адбудовай экономікі ішла і культурная праца. І тут мы спаткаліся з вялікімі труднасьцямі. Бракавала культурнікаў і навуковых працаўнікоў. Найперш трэба было сабраць раскіданыя культурныя сілы. Гэтае зьбіраньне сіл заняло выдатнае месца ў нашым культурным будаўніцтве. Потым мы прыняліся за зьбіраньне кніг. Амаль што з нічога вырасла наша Дзяржаўная Бібліотэка, каторая ў цяперашні час налічвае больш 200 тысяч томаў. Адна за другою нараджаліся і разьвіваліся вышэйшыя школы. Беларусь, якая пад царызмам ня мела ніводнай вышэйшай школы, налічвае цяпер пад Савецкай Уладай чатыры вышэйшыя, навучальныя ўстановы: Комуністычны Унівэрсытэт, Дзяржаўны Унівэрсытэт, Акадэмію сельскай і лясной гаспадаркі і Вэтэрынарны Інстытут. Гатуюцца там тысячы кваліфікаваных працаўнікоў да працы сярод рабоча-сялянскіх мас Беларусі. З кожным годам усё гусьцее і гусьцее сетка тэхнікумаў, профэсыянальных школ, сямігодак і пачатковых школ. Усе гэтыя школы даюць дзецям і моладзі навуку ў матчынай мове. Сталі на ногі беларускі і яўрэйскі дзяржаўныя тэатры. Заснаваліся музэі і пачалі прыводзіцца ў парадак архівы. Пачала ўзрастаць і ўзмацняцца культура Беларусі,—пролетарская па сваім зьмесьце і кірунку і нацыянальная па форме. Разам з другімі культурнымі і асьветнымі ўстановамі вырас у вышэйшую навуковую ўстанову і Інстытут Беларускай Культуры, каторы сягодня адчыняе скліканую і падрыхтаваную ім Першую Акадэмічную Конфэрэнцыю па пытаньнях беларускага правапісу і азбукі.

Пытаньні, якія пастаўлены перад Акадэмічнай Конфэрэнцыяй, выніклі рэальна яшчэ ў канцы мінулага акадэмічнага году. Пачалася справа нібы з маленькага пытаньня аб правапісе чужаземных слоў у беларускай мове. Для вырашэньня вынікшага пытаньня была ўтворана спэцыяльная Камісія ў Аддзеле Мовы і Літаратуры Інстытуту. Камісія прыступіла да працы. У процэсе працы выявілася, што пастаўленае перад Камісіяй асобнае пытаньне ня можа быць

---

[1]) Янка Купала. Безназоўнае. Менск, 1925 г. Стар. 16.

дасканала выяўлена без разьвязаньня агульнага пытаньня аб правапісе. Побач з гэтым выплыла пытаньне і аб беларускай азбуцы. Камісія, па згодзе з Прэзыдыумам Інбелкульту, унесла вынікі сваёй працы на разгляд Навуковай Рады Інстытуту. Навуковая Рада, заслухаўшы даклад Камісіі, згадзілася з ёю, у выніку чаго была ўтворана новая Камісія па пытаньнях наогул беларускага правапісу і азбукі. Камісія прыступіла да працы.

Працамі Камісіі вельмі зацікавіліся шырокія масы грамадзянства, якія добра разумеюць значэньне мовы, як важнейшага фактару ў культурным і дзяржаўным будаўніцтве. Заварушыўся актыў вёскі, мястэчка і ґораду. З месц у Камісію пасыпаліся матар'ялы. Пачалі зьяўляцца адпаведныя артыкулы ў журналах і газэтах. Камісія выкарыстала ўсе тыя думкі, якія прышлі да яе з працоўных гушчаў Беларусі.

Хутка Аддзел Мовы і Літаратуры, пры якім працавала Камісія, мог ужо ўнесьці ў Навуковую Раду Інбелкульту ґрунтоўны рэфэрат аб працы Камісіі. Навуковаю Радаю Інстытуту было вынесена пажаданьне аб скліканьні шырокай Акадэмічнай Конфэрэнцыі па пытаньнях беларускага правапісу і азбукі. Прэзыдыум Інстытуту выканаў гэтае пажаданьне.

Сягодня, паважаныя грамадзяне, мы адчыняем Акадэмічную Конфэрэнцыю.

Дазвольце, паважаныя члены Конфэрэнцыі і госьці, прывітаць Вас ад імя Прэзыдыуму і Навуковай Рады Інстытуту Беларускай Культуры. Мы запэўнены, што працаю Конфэрэнцыі будуць вельмі цікавіцца шырокія масы грамадзянства Беларусі. Мы спадзяемся, што праца Конфэрэнцыі ўзбагаціць навуку аб беларускай мове каштоўнымі ўкладамі, якія з падзякаю скарыстае Аддзел Мовы і Літаратуры ў сваёй далейшай працы па пытаньнях беларускага правапісу і азбукі. Мы лічым, што праца Конфэрэнцыі будзе карыснай і каштоўнай ня толькі для вывучэньня беларускай мовы. Гэтая праца дапаможа вывучэньню моў усіх раней прыгнечаных народаў, каторыя вызваліліся, дзякуючы Кастрычнікавай Рэволюцыі з царскай турмы народаў і працуюць цяпер над адбудаваньнем сваіх культур, бо агульныя законы моў аднолькавы для ўсіх народаў.

Як відаць з рэгістрацыйных картак, кворум Конфэрэнцыі ўжо сабраўся. Конфэрэнцыя можа распачаць сваю працу ў тэрмін, які быў вызначаны Прэзыдыумам Інстытуту. Лічу, што пара прыступаць да працы. А загэтым абвяшчаю Першую Акадэмічную Конфэрэнцыю па пытаньнях беларускага правапісу і азбукі адчыненай. (Воплескі).

Проф. Ігнатоўскі. Для кіраваньня працай Акадэмічнай Конфэрэнцыі Прэзыдыум Інстытуту Беларускае Культуры выдзяліў Прэзыдыум Конфэрэнцыі ў складзе: т.т. У. Ігнатоўскага, А. Смоліча, А. Цьвікевіча, С. Некрашэвіча і Я. Лёсіка і Сэкрэтарыят у складзе: Л. Цьвяткова, Я. Троські і М. Мачульскага.

Членаў Прэзыдыуму Конфэрэнцыі і Сэкрэтарыяту прашу заняць месцы ў Прэзыдыуме. (Воплескі).

Старшыня: На Конфэрэнцыі прысутнічае Народны Камісар Асьветы БССР т. Баліцкі. Прэзыдыум Конфэрэнцыі просіць яго заняць месца ў Прэзыдыуме. (Воплескі).

Старшыня: Слова для зачытаньня прывітальных тэлеграм ад Беларускага Ўраду мае т. Смоліч.

Смоліч: (чытае)

Менск. Інбелкульт. Старшыні Ігнатоўскаму.

Прашу перадаць маё шчырае прывітаньне. Улада Савецкай Беларусі прыдае працы Конфэрэнцыі вялікае значэньне. З аднаго боку Конфэрэнцыя павінна падвесьці вынікі ўсім папярэднім мерапрыемствам Улады з боку разьвіцьця беларускае культуры, з другога боку, вырашыўшы пытаньні аб беларускай мове, палажыць цьвёрды грунт для далейшага разьвіцьця мовы, як важнейшага фактару агульнага культурнага росту Беларусі. Жадаю Конфэрэнцыі посьпеху ў працы.

Старшыня ЦВК Чарвякоў. (Бурныя воплескі).

Акадэмічнай Конфэрэнцыі.

Ня маючы магчымасьці быць прысутным на адчыненьні Конфэрэнцыі, шлю ёй шчырае прывітаньне. Жадаю Конфэрэнцыі пасьпешнай працы, прызнаючы яе важнасьць для разьвіцьця культуры і навукі на Беларусі, для падняцьця культурнага стану рабочых і сялян.

Старшыня СНК БССР Я. Адамовіч. (Бурныя воплескі).

Старшыня: Слова мае Народны Камісар Асьветы тав. Баліцкі.

Баліцкі. Высокапаважаная Конфэрэнцыя! Я маю гонар прывітаць Вас ад імя Народнага Камісарыяту Асьветы, таго Наркамату, які па волі рабочых і сялян, кіруе навукай, культурай і асьветай у БССР. Пролетарыят, які разам з працоўным сялянствам атрымаў перамогу ў нашай краіне, узяў пад сваё высокае кіраўніцтва і магутную забясьпеку ўсе навуковыя і культурна-асьветныя ўстановы. Мы ня толькі захавалі ўсе культурныя здабыткі папярэдніх вякоў, але мы значна іх пашырылі і папоўнілі. Той абшар, які зараз займае Беларуская Рэспубліка, да рэволюцыі быў закінутым і заняпалым краем як у эономічных, так і культурных адносінах. Балоты, малазямельле, пяскі, прымітыўная сельская гаспадарка, адсутнасьць буйнае прамысловасьці, — вось тыповы эономічны малюнак дарэволюцыйнай Беларусі. Фронт імпэрыялістычнай вайны 1914 г., які цалком прайшоў па сучаснай тэрыторыі БССР, грамадзянская барацьба і частыя окупацыі ўшчэнт зруйнавалі і без таго заняпалую гаспадарку і культуру беларускіх рабочых і сялян. Толькі напружаная і ўпартая воля перамогшых у барацьбе рабочых і сялян змаглі за такі невялікі тэрмін часу прывясьці Беларускую Рэспубліку да таго стану, у якім яна знаходзіцца зараз. Гаспадарка наша падымаецца і расьце з кожным годам. Мы можам констатаваць, што па важнейшых галінах нашай эономікі мы ня толькі дасягнулі, але і перавышылі даваенныя лічбы. Агульная продукцыя сельскай гаспадаркі ў 1926 годзе на тэрыторыі сучаснай БССР раўнялася 294.249.000 дав. руб.; у 1925—26 годзе 330.292.000 руб., дасягнуўшы такім чынам 102,2% даваеннага часу.

Агульная продукцыя цэнзавай прамысловасьці адпаведна была роўна па даваенных цэнах 42.667.000 руб. (1913 г.) і 38.976.000 руб. (1925—26 г.), даўшы дасягненьне 94% даваеннага часу.

Мы пераходзім да інтэнсыфікацыі нашай сельскай гаспадаркі, да пераабсталяваньня і новай пабудовы прамысловасьці. Бюджэт нашай рэспублікі расьце з кожным годам: ён раўняецца ў чырвоных рублёх (бяз утрыманьня зьлітных наркаматаў, іх установ і мерапрыемстваў)

у 1923—24 г. — 17.188.000 р.
у 1924—25 г. — 29.277.600 р.
у 1925—26 г. — 54.557.200 р.
у 1926—27 г. — 71.780.000 р.

Заняпаламу стану экономікі дарэволюцыйнага часу і інтарэсам пануючай шляхоцка-буржуазнай клясы адпавядаў і заняпалы стан культуры таго часу. На тэрыторыі сучаснай БССР ня было ніводнай вышэйшай навучальнай і навуковай установы. Сярэдняя школа ў 1924 г. выпадала адна на 82.000 душ насельніцтва, а пачатковая школа ў тым-жа годзе разам з царкоўна-прыходзкімі школамі, якіх было 30% ад агульнага ліку школ, ахапляла сабою толькі 43% дзяцей школьнага ўзросту (ад 8 да 11 год). Дашкольнага дзяржаўнага выхаваньня, пазашкольнай профэсыянальна-тэхнічнай асьветы зусім можна лічыць, што ня было. На ўсю народную асьвету царскім урадам, разам з земствамі, у 1914 г. адпускалася 4.154.000 на год. Беларуская мова, культура і мастацтва, гэтак сама, як мовы і культуры іншых нацыянальнасьцяй БССР, ганьбаваліся і былі ў заняпадзе.

Бурнае культурнае будаўніцтва, якое пачалося з часоў рэволюцыі, дало значныя вынікі і ў галіне культурна-асьветнай. За невялікі час свайго існаваньня (6 год) Беларуская Рэспубліка стварыла 4 вышэйшыя навучальныя ўстановы: Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, Беларускую Дзяржаўную Акадэмію сельскай і лясной гаспадаркі, Вэтэрынарны Інстытут, Комуністычны Унівэрсытэт імя вялікага правадыра пролетарыяту Ў. І. Леніна.

На абшарах БССР існуе 23 тэхнікумы і цэлы шэраг профэсыянальна-тэхнічных школ.

Каб даць рабочым і бядняцкаму сялянству фактычную магчымасьць навучацца ў вышэйшых навучальных установах, тэкнікумах і профшколах, мы організоўваем для іх інтэрнаты і даем стыпэндыі. У нас карыстаюцца стыпэндыямі 47% студэнтаў вышэйшых школ, 50% студэнтаў тэхнікумаў і 60% вучняў профшкол.

Усё гэта разам узятае дае нам магчымасьць забясьпечыць наша будаўніцтва належнымі кваліфікаванымі працаўнікамі.

Сваю гаспадарку і культуру мы будуем на навуковых падставах. Мы ставім сваім заданьнем плянавую і ўсебаковую організацыю навукова-дасьледчай працы і далейшае стварэньне навукі, якая прывядзе да перамогі чалавека над матэрыяй, часам і прасторам і да пранікненьня яе ў законы грамадзкага разьвіцьця. Навукова-матэрыялістычны сьветапогляд, які аб'яднае ў вышэйшым сынтэзе матэматычныя, прыродазнаўчыя і грамадзкія навукі, дае нам магчымасьць тэорыю пазнаньня сьвету накіраваць на перабудову сьвету шляхам рэволюцыйнай практыкі.

Навуковая праца вядзецца ў нас, як у вышэйшых навучальных установах, так і ў спэцыяльна-навуковых інстытуцыях. Апроч Інстытуту Беларускай Культуры, які ў нас замяняе Ўсебеларускую Акадэмію Навук, мы маем яшчэ шэраг навуковых установ.

Савецкая дзяржава добра ведае, што бяз значнага падняцьця агульнага стану культуры і асьветы ўсіх рабочых і сялян немагчымы іх актыўны ўдзел у савецкім будаўніцтве, немагчыма пабудова социялістычнага ладу. У зьвязку з гэтым падняцьце элемэнтарнай асьветы і культуры сярод самых шырокіх колаў працоўных зьяўляецца найважнейшай нашай задачай. Мы маем вялізарную сетку політасьветных установ, мы вядзем вялікую пазашкольную працу па падняцьці асьветы, культуры і сьвядомасьці рабочых і сялян. Працоўная чатырохгадовая школа ахапляе сабою ўжо 69,3% дзяцей (ад 8 да 11 год), а сямігадовая школа—8,8% (ад 12 да 15 год). 1926—27 г. зьяўляецца першым годам правядзеньня пляну ўсеагульнага абавязковага навучаньня дзяцей, якое ў нас закончыцца ў 1933—34 нав. годзе.

Па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дарослых мы маем цэлы шэраг раскіданых па ўсім абшары Беларусі ліквідацыйных пунктаў.

На ўсю асьвету БССР траціць 19.051.800 руб., што дае номінальнае павялічэньне ў параўнаньні з мірным часам (1914 г.) на 358%.

Але разам з гэтымі дасягненьнямі мы маем і вялікія недахопы, зьнішчыць якія не дазваляюць нам нашыя матар'яльныя магчымасьці. У нас да гэтага часу вандруюць бяспрытульныя дзеці, якіх па БССР налічваецца да 5.000; нашы

культурна-асьветныя ўстановы яшчэ не абсталяваны належным чынам; значная частка чатырохгадовых працоўных школ (да 45%) ня мае адпаведных памяшканьняў; матар'яльнае становішча працаўнікоў асьветы стаіць не на належнай вышыні. Усё гэта магчыма будзе зьнішчыць з працягам часу, раўналежна ўздыму экомомікі і дабрабыту рабочых і сялян.

Беларуская Рэспубліка вызвана да жыцьця воляй паўстаўшых рабочых і сялян, гэтак сама, як і іншыя Савецкія Рэспублікі, што організаваліся на вялікім абшары быўшай Расійскай імпэрыі. Кожная з іх будуе сваё жыцьцё самастойна, знаходзячыся адначасна ў брацкім супрацоўніцтве і інтэрнацыянальным аб'яднаньні з іншымі Савецкімі Рэспублікамі ў вядомай вам організацыйнай форме СССР. Пролетарыят, які атрымаў перамогу ў нашай краіне, даў магчымасьць кожнай нацыянальнасьці, што мае адпаведную тэрыторыю, збудаваць сваю Рэспубліку Саветаў, і праз гэта забясьпечыў фактычнае раўнапраўе як усіх савецкіх рэспублік, так і ўсіх нацыянальнасьцяй, што жывуць у гэтых рэспубліках, а таксама і тых нацыянальнасьцяй, якія па тэрыторыяльных адзнаках ня могуць быць выдзелены ў паасобныя рэспублікі. У нас няма „вялікіх і малых нацый“; з часу Кастрычнікавай Рэволюцыі ўсе нацыянальнасьці ў нас роўныя.

Згодна волі пролетарыяту нацыянальная політыка, якую праводзіць Савецкая Ўлада, значна дапамагае экономічнаму і культурнаму разьвіцьцю ўсіх нацыянальнасьцяй. „Зьліквідаваць заняпаласьць (гаспадарчую, політычую і культурную) нацыянальнасьцяй, якую яны атрымалі ў спадчыну ад мінулага, каб даць магчымасьць заняпалым народам дагнаць царскую Расію ў дзяржаўных, культурных і гаспадарчых адносінах“ (з прамовы т. Сталіна на X з'езьдзе РКПб),—вось сутнасьць нацполітыкі Савецкай Улады. У зьліквідаваньні гэтай адсталасьці ў значнай меры дапамагае СССР.

Падняцьце экономікі і культуры БССР немагчыма было-б без дапамогі Саюзнага Ураду. Толькі ў зьвязку з гэтай дапамогай мы маем тыя дасягненьні, аб якіх я вам гаварыў.

Нацполітыка дала магчымасьць паасобным рэспублікам і паасобным нацыянальнасьцям выяўляць і разьвіваць сваю

культуру ў нацыянальных формах. Беларуская культура і іншыя культуры на Беларусі, апрача расійскай, былі ў заняпадзе; яны ўціскаліся і ганьбаваліся царскім урадам; толькі Савецкая Ўлада, вызваўшы да жыцьця Беларускую Рэспубліку, дала магчымасьць шырокаму разьвіцьцю беларускай культуры і культурам іншых нацыянальнасьцяй (яўрэйскай, польскай, латыскай і літоўскай).

У царскія часы асабліва дрэнныя адносіны былі да беларускай культуры і да беларускай мовы. Пануючая шляхецка-буржуазная кляса, зрусіфікаваная беларуская і расійская інтэлігенцыя лічыла беларускую мову „наречием“ адзінай расійскай мовы і ганьбавала яе, як „простую, мужыцкую, хамскую“ мову. Савецкая-ж Улада яшчэ ў 1919 г. абвесьціла беларускую, расійскую, яўрэйскую і польскую мову—дзяржаўнымі мовамі Беларускай Рэспублікі, прызнаючы адначасна роўнапраўнасьць і за ўсімі іншымі мовамі тых нацыянальнасьцяй, што насяляюць БССР. Мала гэтага, беларуская мова з ўсіх дзяржаўных моваў была прызнана пераважнаю моваю пры зносінах і карыстаньні, як мова большасьці насельніцтва БССР, пры адначасным забесьпячэньні карыстаньня роднай мовай і ўсімі іншымі нацыянальнасьцямі. На беларускай мове, а па меры патрэбы і на мовах іншых нацыянальнасьцяй, зараз пішуцца законы, выдаецца літаратура, ствараецца навука і мастацтва, працуюць школы і іншыя савецкія і грамадзкія ўстановы.

Калі прыняць пад увагу, што да рэволюцыі ўвесь дзяржаўны апарат быў зрусіфікаваны, што ўсе школы працавалі на расійскай мове (за выключэньнем невялічкага ліку рэлігійных яўрэйскіх школ і патаемных польскіх), што друкаваныя выданьні на беларускай і яўрэйскай мовах можна было пералічыць па пальцах, што інтэлігенцыі, якая ведала беларускую мову, было вельмі мала,—дык тыя лічбы, якія я вам агалашу, сьведчаць аб нашых вялікіх дасягненьнях у практычным правядзеньні нацыянальнай політыкі.

З 4.057 чатырохгадовых школ па мове выкладаньня мы маем: беларускіх—3.794, яўрэйскіх—123, польскіх—93, расійскіх—27, латыскіх—14, літоўскіх—3, нямецкіх—2, эстонскіх—1; з 261 сямігадовых школ па мове выкладаньня адзначаюцца:

беларускіх—199, яўрэйскіх—44, польскіх—5, расійскіх—12, латыскіх—1.

Процант школ, якія працуюць на нацыянальных мовах, адпавядае ліку насельніцтва паасобных нацыянальнасьцяй, за выключэньнем школ яўрэйскіх і часткова расійскіх чатырохгодак. Неадпаведнасьць у адносінах да яўрэйскіх школ тлумачыцца, галоўным чынам, імкненьнем дробна-буржуазнага яўрэйскага насельніцтва пасылаць сваіх дзяцей у беларускія альбо расійскія школы. Неадпаведнасьць у адносінах да расійскіх школ—чатырохгодак, тлумачыцца тым, што чатырохгадовыя школы знаходзяцца пераважна ў сельскіх мясцовасьцях, дзе расійскае насельніцтва жыве паасобнымі сем'ямі і раскідана невялічкімі лічбамі сярод асноўнай масы беларускага насельніцтва.

Ня ўсе яшчэ з беларускіх і яўрэйскіх школ працуюць цалком на роднай мове. Большасьць з гэтых школ раней былі расійскімі, і дзеля гэтага перавод іх на родную мову адбываецца паступова, па меры падрыхтоўкі адпаведных працаўнікоў, падручнікаў і навучальных прылад; ды і ня мэтазгодна тых вучняў, якія ўжо некалькі гадоў навучаліся на расійскай мове, зразу пераводзіць на родную мову.

У зьвязку з гэтым перавод на родную мову ў канцы 1925—26 навучальнага году меў наступны выгляд:

З 3.794 беларускіх школ працавалі на беларускай мове: першыя чатыры гады навучаньня—у 3.021 школах, першыя тры гады навучаньня—у 773 школах; чацьверты год навучаньня ў гэтых школах (773) яшчэ працавалі на расійскай мове.

Яўрэйскія чатырохгадовыя школы, гэтак сама як і школы для іншых нацыянальнасьцяй, цалком працуюць на роднай мове.

З 199 сямігадовых беларускіх школ у канцы таго-ж 1925—26 году пераведзены ўсе сем год навучаньня толькі ў 88 школах, 6 год навучаньня ў трох школах, пяць год навучаньня ў 17 школах, чатыры гады навучаньня ў 30 школах, тры гады навучаньня ў 36 школах і два гады навучаньня ў 25 школах.

З 44 яўрэйскіх школ цалком пераведзены на яўрэйскую мову толькі 9 школ, у 7 школах пераведзена 6 год навучаньня, у 6 школах—5 год навучаньня і ў 22 школах—4 гады навучаньня.

Вышэйшыя навучальныя ўстановы і тэхнікумы, якія гатуюць спэцыялістаў па розных галінах гаспадаркі, культуры і савецкага будаўніцтва, павінны выпускаць працаўнікоў, якія-б ведалі мову тых нацыянальнасьцяй, каторых яны будуць абслугоўваць. Вось чаму намі ўзят кірунак на поўную беларусізацыю гэтых установ незалежна ад таго, студэнты якіх нацыянальнасьцяй у іх навучаюцца, з тым, аднак, каб забясьпечыць належнымі спэцыялістамі абслугоўваньне на роднай мове і іншыя нацыянальнасьці БССР.

Беларусізацыя вышэйшых навучальных установ і тэхнікумаў зьяўляецца справай надзвычайна цяжкай. Тлумачыцца гэтая зьява адсутнасьцю падрыхтаваных навуковых працаўнікоў, якія-б стала ведалі беларускую мову і маглі-б на ёй весьці навучальныя дысцыпліны, а таксама малым лікам адпаведнай навуковай літаратуры на беларускай мове, адсутнасьцю навуковай тэрмінолёгіі і інш. Ня гледзячы, аднак, на ўсе гэтыя няспрыяючыя ўмовы, мы беларусізавалі цалком беларускія пэдагогічныя тэхнікумы і перавялі выкладаньне навучальных дысцыплін на беларускую мову ў вышэйшых навучальных установах у 1925—26 годзе па ліку гадзін у наступных процантах: Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт—14%, Бел. Дзярж. Акадэмія сельскай і лясной гаспадаркі—10%, Вэтэрынарны Інстытут — 2%, Комуністычны Унівэрсытэт—26%. Вестак на 1926—27 год у нас яшчэ па ўсіх вышэйшых навучальных установах няма. Тут можна толькі гаварыць аб Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце, у якім беларусізацыя ў бягучым годзе пасунулася наперад і мае наступны выгляд: пэдагогічны факультэт—46%, мэдычны факультэт—12%, па факультэту гаспадаркі і права ў мяне пад рукамі вестак няма.

Для падрыхтоўкі настаўнікаў для яўрэйскіх і польскіх школ у нас існуюць: яўрэйская і польская сэкцыі на пэдагогічным факультэце, 2 яўрэйскіх і адзін польскі пэдагогічны тэхнікумы.

Разам з беларусізацыяй навучальных установ у нас

ствараюцца беларуская навука, літаратура і мастацтва. Аб стане навукі на Беларусі вы даведаецеся з тых матар'ялаў, якія вам будуць раздадзены Інстытутам Беларускай Культуры, аб літаратурных кірунках гаварыў у сваёй прамове паважаны старшыня нашай Конфэрэнцыі, У. М. Ігнатоўскі, і, апрача таго, будуць спэцыяльныя даклады на Конфэрэнцыі. Я цяпер хачу толькі ў некалькіх словах застанавіцца на мастацтве. З працай беларускіх дзяржаўных тэатраў вы пазнаёміцеся практычна (паколькі мне вядома, абодва беларускія дзяржаўныя тэатры запрасілі вас на свае пастаноўкі). Адзначу толькі, што, апрача гэтых тэатраў, у нас існуе яшчэ беларускі дзяржаўны яўрэйскі тэатр і дзяржаўная беларуская вандроўная трупа, якая забіраецца ў самыя цёмныя куткі беларускае вёскі.

Значную працу правяла ў нас Беларуская Дзяржаўная Кіноўправа. Сетку кінэматографаў яна раскінула па ўсёй БССР; у палавіне ўсіх раёнаў у гэтым годзе будуць кіно-перасоўкі, якія, вандруючы па вёсках, будуць абслугоўваць сялянства.

Пачаліся здымкі першых беларускіх кіно-фільмаў з быту і жыцьця беларускіх рабочых і сялян.

Гаворачы аб мастацтве, упамяну аб нашых тэхнікумах: вобразнага мастацтва і музычным; з працай іх вы зможаце пазнаёміцца практычна.

Разам з беларусізацыяй культурна-асьветных устаноў адбываецца беларусізацыя дзяржаўнага і грамадзкага апарату. Гэтая справа ў нашых умовах таксама нялёгкая: у спадчыну мы атрымалі зрусіфікаваных спэцыялістаў, зрусіфікаваную інтэлігенцыю і зразумела, што перавясьці яе працу на беларускую мову мы адразу не змаглі. Усе мы навучаліся ў расійскіх школах, і дзеля гэтага перавод працы на беларускую мову нават актывістаў з рабочых і сялян, што былі граматнымі толькі парасійску, адбываўся цяжка.

Гэты перавод, таксама як і перавод культурна-асьветных устаноў на беларускую мову, магчыма было рабіць толькі паступова.

У сучасны момант мы маем цэлы шэраг акруг, дзе цалком савецкі і грамадзкі апараты зьбеларусізаваны, маем

цэлы шэраг цэнтральных установ, праца якіх цалком пераведзена на беларускую мову. Пераводзячы апараты на беларускую мову, мы адначасна забясьпечваем фактычную магчымасьць абслугоўваньня нашымі апаратамі насельніцтва іншых нацыянальнасьцяй на яго роднай мове, уводзячы ў штат гэтых апаратаў адпаведных працаўнікоў.

У тых мясцовасьцях, дзе насельніцтва тэй ці іншай нацыянальнасьці жыве компактнай масай, мы працу ўсяго апарату ў гэтай мясцовасьці пераводзім на мову насельніцтва, комплектуючы апараты працаўнікамі, якія ведаюць мову, быт, умовы жыцьця тэй ці іншай нацыянальнасьці. Гэтакім чынам, у нас існуе 18 яўрэйскіх сельсаветаў, 14 польскіх і 5 латыскіх. Праца ў іх вядзецца на адпаведнай мове. Такім чынам, кожная нацыянальнасьць атрымлівае поўную магчымасьць разьвіваць сваё культурнае і грамадзкае жыцьцё, прымаць удзел ва ўсім савецкім будаўніцтве, быць роўнапраўнай ва ўсіх адносінах. Рабочыя і сяляне ўсіх нацыянальнасьцяй агульнымі сіламі, згуртаваўшыся па клясавым прызнаку, будуюць вялікую Рэспубліку Саветаў па ўсім абшары Савецкага Саюзу.

Рэволюцыя прабудзіла да жыцьця нашу краіну. Як казачны гэрой, закуты па руках і нагах, які, сабраўшы ўсю сваю моц, разрывае зайржавелыя ланцугі пакуты і, разгарнуўшы свае магутныя плечы, упарта змагаецца з гадамі і ведзьмакамі, працярэбліваючы сабе шлях да жыцьця,—так і мы, разарваўшы ланцугі няволі, перамогшы сваіх ворагаў, будуем сваю сьветлую будучыну.

Дазвольце, Высокапаважаныя Сябры Конфэрэнцыі, пажадаць вам карыснай працы. (Воплескі).

Старшыня: Слова для прывітаньня мае Рэктар Беларускага Комуністычнага Унівэрсытэту імя Леніна т. Гэльтман.

Тав. Гэльтман: Ад імя Комуністычнага Унівэрсытэту Беларусі імя Леніна вітаю Конфэрэнцыю па рэформе беларускага правапісу і азбукі, скліканую Інстытутам Беларускае Культуры.

У працы, якую вядзе Комуністычны Унівэрсытэт над распаўсюджаньнем марксыцкіх ведаў сярод працоўных мас Беларусі, не апошняе месца займае пытаньне аб найбольш,

адпаведных формах прыбліжэньня навукі Маркса, Энгельса і Леніна да шырокіх працоўных мас.

Вялікая Кастрычнікавая Рэволюцыя, грунтоўна зьмяніўшы экономічны і політычны лад, дала рабочым і сялянам уступ да крыніц навукі. Адначасова яна вырашыла нацыянальнае пытаньне, вызваліўшы ўсе нацыі ад уціску, у якім яны жылі пры панаваньні цара і пануючых клясаў. Беларускія масы, якія раней ня мелі нават пачатковае школы, цяпер шырака і глыбака разгарнулі экономічную політыку і культурна-асьветную працу.

Дасягненьні, якія мы маем у БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе,—моцныя і непарушныя, бо яны грунтуюцца на тым, што на чале дзяржавы стаіць пролетарыят, які пад кіраўніцтвам Комуністычнае Партыі вядзе сваю працу на навуковых падставах Ленінізму. Пролетарыят у саюзе з сялянствам, у сваіх клясавых інтарэсах, ня можа дапусьціць няроўнасьці.

Мінулы лад пакінуў нас у такіх умовах, дзякуючы якім патрэбна шмат часу і працы, каб зьнішчыць рэшты мінулага ўціску і нагнаць той час, які прыгнечаныя нацыі дарма патрацілі.

Гэтая праца па адбудове культуры ў нас шырака разгарнулася.

Ваша Конфэрэнцыя зьяўляецца часткаю яе. Жадаю посьпеху ў працы Конфэрэнцыі на карысьць працоўных мас Беларусі, што вызваліліся ад усякага ўціску і будуюць сваю будучыну, якая давядзе нас да комунізму. (Воплескі).

Старшыня: Слова для прывітаньня мае Рэктар Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту проф. Пічэта.

Пічэта. Шаноўныя грамадзяне! Сягодняшні дзень—вялікі момант у беларускім нацыянальна-культурным адраджэньні. Сягодня ў першы раз адчыняецца навуковы зьезд на Беларусі, скліканы нашай вышэйшай навуковай установай — Інстытутам Беларускае Культуры.

І гэта ня простая выпадковасьць, што першая Конфэрэнцыя была склікана якраз у гэтым годзе. Пяць год Беларусь залечвала свае раны, пяць год працоўныя масы Беларусі тварылі новую мову для свайго жыцьця. Пяць год вялася вялікая праца па падняцьці агульнай культуры на Беларусі.

І цяпер, калі мы маем на гаспадарчым і нацыянальна-культурным фронтах вялікія дасягненьні, калі за гэтыя часы ўтварылася і ўзрасла беларуская навука, становіцца зразумелым скліканьне сягодняшняй Конфэрэнцыі, вынікі якой будуць мець вялікае значэньне для разьвіцьця беларускай навукі ў галіне беларускага мовазнаўства.

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, які быу адчынены пяць год таму назад, які сваёй навуковай і навучальнай працай прымае вялікі ўдзел у разьвіцьці беларускай навукі, які павінен падрыхтаваць нашу моладзь для практычнай і навукова-тэорэтычнай працы, шчыра вітае Першую Акадэмічную Конфэрэнцыю і жадае ёй посьпехаў у яе працы.

На сягодняшняй Конфэрэнцыі таксама прысутнічаюць прадстаўнікі навукі іншых краін. Профэсары, доцэнты, асыстэнты і студэнты БДУ шчыра вітаюць усіх тых, якія знайшлі магчымым прыняць удзел у працах нашай Конфэрэнцыі. БДУ выказвае ўпэўненасьць у тым, што гэтай Конфэрэнцыяй будзе пакладзена сталая падстава для навуковых зносін паміж беларускімі вучонымі і вучонымі іншых краін. Дазвольце мне яшчэ пажадаць усякіх посьпехаў у вашай працы і выказаць упэўненасьць у тым, што навуковыя зносіны паміж Беларусьсю і іншымі краінамі будуць пашырацца і разьвівацца. (Воплескі).

Старшыня: Ад сэкцыі Навуковых Працаўнікоў Саюзу Працаўнікоў Асьветы слова мае проф. Друшчыц.

Друшчыц. Дазвольце мне, паважаная Конфэрэнцыя, ад імя Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў вітаць вас з сягодняшнім вашым зьездам. Навуковыя працаўнікі 4-х вышэйшых навучальных установ БССР у ліку 400 чалавек з вялікай увагай будуць сачыць за вашай працай. Для навуковых працаўнікоў Беларусі ваша праца зьяўляецца нязвычайна важнай і патрэбнай. У сваёй практычнай працы мы адчуваем той недахоп, які існуе ў галіне навуковай тэрмінолёгіі. Тлумачыцца гэта тым, што беларусам прыпала будаваць сваю навуку, будаваць сваю навуковую мову ў XX стагодзьдзі, у той час як іншыя народы займаліся гэтым ужо ў XVI-XVII стагодзьдзях. Беларусь у гэтых адносінах займае бадай што адно з апошніх месц, ня гледзячы на тое, што ў нас у свой час быў пэўны грунт для разьвіцьця свае навуковае мовы. XVI ст. давала магчымасьць Беларусі

будаваць сваю высока апрацаваную мову, якая ўжывалася, як у дзяржаўным жыцьці, так і ў тагочаснай навуцы. На жаль, рэакцыя, што пачалася ў канцы XVI ст., захапленьне лацінскаю моваю, якая зрабілася мовай навукі на Беларусі,— затрымала развой беларускае мовы на тры стагодзьдзі. Навуковыя працаўнікі самі працуюць у галіне разьвіцьця беларускай навуковай мовы, у галіне апрацаваньня навуковай тэрмінолёгіі, адчуваючы сувязь мовы з правапісам і беларускай азбукай.

У гэты час і пры Бел. Сел.-Гасп. Акадэміі і пры Бел. Дзярж. Унівэрсытэце існуе цэлы шэраг камісій, якія выключна займаюцца апрацаваньнем навуковай тэрмінолёгіі на беларускай мове.

Вітаючы ад імя Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў паважаную Конфэрэнцыю, я жадаю ёй усіх посьпехаў, жадаю вялікіх вынікаў яе працы, бо гэтыя посьпехі, гэтыя вынікі зьвязаны таксама з працай усіх навуковых працаўнікоў. (Воплескі).

Старшыня: Слова мае рэктар Літоўскага Дзяржаўнага Унівэрсытэту проф. Біржышка.

Біржышка (гаворыць на літоўскай мове, пасьля робіць пераклад на расійскую мову): Пастараюся ў некалькіх словах пераладжыць тое, што я сказаў на літоўскай мове, на мову, хоць і ня родную вашу, беларускую, але зразумелую і для вас і для мяне.

Наш Унівэрсытэт атрымаў ад вас запрашэньне на такой прыгожай літоўскай мове, што хоць перад намі адчынялася вельмі далёкае, цяжкае падарожжа, хоць мы вельмі заняты штодзеннай навуковай і грамадзкай працай, усё-ж такі Унівэрсытэт дапаручыў аднаму з сваіх профэсароў зьявіцца і прывітаць вас з Конфэрэнцыяй. Справа была даручана таму майму таварышу, які дасканальна гаворыць на беларускай мове. Ён мусіў на вашай роднай мове злажыць вам прывітаньне. Але, на жаль, ён занядужаў, дзеля чаго Унівэрсытэт павінен быў перамяніць сваю пастанову і даручыў мне злажыць вам прывітаньне ад нашага Унівэрсытэту.

Наш Унівэрсытэт зьяўляецца яшчэ больш маладым, чым ваш Унівэрсытэт, а таму вы мусіце выбачыць нам, літоўцам, што я, магчыма, ня буду мець сілы памагчы вашай Конфэ-

рэнцыі так, як таго-б мы жадалі. Наш Унівэрсытэт малады, мы яшчэ ня маем практыкі, і сам я, як бачыце, не магу гаварыць на беларускай мове, але вы нас выбачыце за гэта, маючы на ўвазе, што мы, прыяжджаючы да вас, хочам праз гэта падчыркнуць тую культурную сувязь, якая між намі ўстанаўляецца.

Я, вярнуўшыся ў свой Унівэрсытэт, зраблю падрабязьнейшы даклад аб тым, што я тут пачую, убачу, і думаю, што мая прысутнасьць з гэтага боку на Конфэрэнцыі будзе карыснай, бо пасьля Конфэрэнцыі наша сувязь, бязумоўна, яшчэ больш узмацнее.

Жадаю вам посьпеху, жадаю, каб тая справа, якая носіць скромную назву—рэформа правапісу, дапамагла вам выйсьці на запраўдны самастойны культурны шлях, выявіць творчасьць вашага народу ў найбольш вольных, найбольш поўных формах.

Сардэчнае прывітаньне вам ад Літоўскага Унівэрсытэту і найлепшыя пажаданьні. (Воплескі).

Старшыня: Слова мае выдатны пясьняр Латвіі, вядомы ня толькі ў Латвіі, але далёка па-за межамі яе і ў нас, на Беларусі, Ян Райніс.

Ян Райніс (пачынае сваю прамову латыскаю мовай, потым пераходзіць на расійскую): Вельмі шаноўны сход! Вітаю я вас ад Латвіі! Я буду далей гаварыць расійскаю мовай, хоць гэта ня будзе для мяне лёгка, бо я ня вельмі добра ўладаю расійскаю мовай.

Я прыношу прывітаньне вам, беларускаму народу, прадстаўніком беларускае інтэлігенцыі, Інстытуту, ад Латвіі, вашай суседкі, сяброўскае Латвіі. Я глыбака ўзрушаны тым значэньнем, якое мае сягодняшні дзень і гэты сход. Гэты сход будзе лічыцца вялікім гістарычным здарэньнем. Акадэмічная Конфэрэнцыя зьявіцца будаўніком падвалін беларускае культуры, яна ўрэгулюе ортографію і розныя пытаньні беларускае мовы. Конфэрэнцыя будзе, такім чынам, законадаўцам, толькі не ў палітычным ці экономічным сэнсе, а ў культурным.

Я хачу сказаць вам некалькі слоў аб палажэньні беларускага народу ў Латвіі. Вашых аднапляменьнікаў у Латвіі налічваецца каля 70.000. Яны складаюць у Латвіі каля 4% усяго жыхарства. З нацменшасьцяй Латвіі беларусы самая

большая: палякаў у нас меней, чым беларусаў. У Латвіі меншасьці карыстаюцца культурнаю аўтаноміяй, і нам здаецца, што наша культурная аўтаномія для меншасьцяй самая лібэральная ў Заходняй Эўропе. Організацыя беларускай культурнай аўтономіі злучана ў Беларускім Аддзеле пры Міністэрстве Асьветы. Гэты Аддзел організуе школы і другія культурныя ўстановы.

Не адразу беларусы атрымалі гэтую аўтономію. Адзін час у нас быў такі погляд, які панаваў і ў царскай Расіі, а менавіта, што беларусы ня твораць асобнага народу, што іх мова—гэта толькі падмова, гаворка расійскай ці польскай мовы. Трэба было ў нас, у Латвіі, змагацца супроць гэтых поглядаў, дзеля гэтага і ня лёгка было дабіцца ўтварэньня беларускай культурнай аўтономіі. Нарэшце, беларусам усё-ж удалося атрымаць нац. аўтономію, але тут ворагі беларусаў, каб дыскрэдытаваць беларускі нацыянальны рух, утварылі так званы „беларускі процэс“. Беларускія культурныя дзеячы былі абвінавачаны ў дзяржаўнай зрадзе. Аднак, на судзе было ўстаноўлена, што ніякага злачынства з іх боку ня было, што ўвесь процэс быў выдуманы шляхтай, з ініцыятывы і пад уплывам не латыскіх, а чужаземных колаў. Цяпер адносна прызнаньня культурнай аўтономіі беларусаў і беларускага культурнага руху ў Латвіі ніякіх протэстаў няма. Такім чынам, можна спадзявацца, што беларускі культурны рух пойдзе наперад хуткімі крокамі.

Але ёсьць яшчэ перашкоды іншага характару. Культурны ўзровень беларускага народу ў нас, у параўнаньні з латыскім народам, нявысокі. Мне здаецца, што прычына ў тым, што беларусы ў Латвіі ў сваёй масе—рабочыя і сяляне. Нявысокім культурным узроўнем тлумачацца тыя абставіны, што беларусы ня маюць у нашым сойме свайго прадстаўніка. Па ліку беларускага насельніцтва ў Латвіі ў нас у сойме мусіла быць аж тры дэпутаты-беларусы, а між тым іх няма ніводнага.

Інтарэсы пролетарыяту Латвіі вымагаюць, каб беларускі народ разьвіваўся як мага барждзэй; на гэтае разьвіцьцё спадзяецца латыскі пролетарыят і робіць усе залежныя ад яго мерапрыемствы.

Я сам паходжу з Латгаліі, з тэй яе часткі, дзе жыве многа беларусаў. Я зьвязаны з беларусамі сяброўствам. Я

ўзяў на сябе абавязкі бараніць іх інтарэсы, пакуль у сойме ня будзе беларускага прадстаўніка. Я глыбака спачуваў беларусам яшчэ ў тыя часы, калі яны былі прыгнечаны царскім рэжымам, а таму і зразумела, што цяпер я магу таксама глыбака спачуваць культурнаму ўздыму беларускага народу, які далучаецца да сусьветнае культуры народаў і прагнецца ўнесьці сваю долю ў агульналюдзкую культуру. Мне здаецца, што беларускі народ, які меў ужо высокую культуру ў той час, калі ў нас ня было яшчэ ніякай культуры, гэты народ хутка дасягне культуры агульнаэўропейскай і зойме віднае і пачэснае месца ў сям'і іншых народаў. Ваша будучына самая слаўная.

Гэтай слаўнай будучыны я і жадаю беларускаму народу; жадаю посьпехаў Конфэрэнцыі, якая сягодня распачынае сваю працу. (Воплескі).

Старшыня: Слова мае профэсар Бэрлінскага Унівэрсытэту М. Фасмэр.

Фасмэр (гаворыць нямецкаю моваю): Вітаю вашу Конфэрэнцыю ад імя Прускага Міністэрства Асьветы і Бэрлінскага Унівэрсытэту. Раблю гэта з асаблівым задаваленьнем, бо бачу ў вашай Конфэрэнцыі зьявішча, якое вядзе да нязвычайна шчасьлівага вырашэньня нацыянальнага пытаньня.

Культурная свабода і натхненьне, з якім Інстытут Беларускай Культуры распачаў сваю працу, забясьпечвае посьпех яго пачынаньням. Вы можаце быць пераконаны ў тым, што адпаведныя колы Бэрліну і Нямеччыны з напружнай увагаю будуць сачыць за ходам вашай культурнай працы. (Воплескі).

Старшыня: Слова мае профэсар Варшаўскага Унівэрсытэту Ю. Голомбэк.

Голомбэк. Дзякуючы за запрашэньне Інстытуту Беларускае Культуры ў Менску, хачу з свайго боку зазначыць, што для мяне, як для дасьледчыка па гісторыі беларускае літаратуры, было вельмі цікава прыняць удзел у гэтай навуковай Конфэрэнцыі.

Беларуская мова і беларуская літаратура ня ёсьць зьявішча сягодняшняга дня, бо пачаткі яе сягаюць некалькі вякоў назад, калі беларуская мова ўжывалася ў дзяржаўных установах даўнейшага Вялікага Княства Літоўскага. Помнікам тагочаснай мовы ёсьць, як ведама, біблія Скарыны і Літоўскі

Статут, выданы ў першай рэдакцыі ў 1529 г. Жыгімонтам Старым.

Пераходзячы да характарыстыкі беларускай літаратуры, мушу адзначыць, што, з прычыны палітычных умоў, беларуская літаратура разьвівалася ў сьцiслым зьвязку і пад уплывамі польскай літаратуры.

Варта ўвагі, што ў час разьвіцьця школьнай драмы ў XVII і XVIII стагодзьдзях у польскіх драматычных п'есах неаднакроць уводзіліся народныя сцэнкі з беларускага жыцьця, пісаныя беларускай мовай.

У часы разьвіцьця романтызму імкненьне да знаёмства з народнай культурай абудзіла некаторых песьняроў да чэрпаньня літаратурных мотываў з жыцьця простага народу, і гэта ўтварыла падваліны для новае беларускае літаратуры, якая адна заняпала на гадоў дваццаць пасьля здарэньняў 1863 г. і вынікшых пасьля рэпрэсій.

Хай будзе дазволена мне закончыць некалькі гэтых уваг выказам пажаданьня Інстытуту Беларускае Культуры карыснай працы ў вызначанам ім кірунку. (Воплескі).

Старшыня: Слова мае доцэнт Латвійскага Унівэрсытэту Блесэ.

Блесэ (гаворыць латыскаю мовай, потым перакладае на расійскую). Шаноўныя паны і пані! Маю гонар вітаць Беларускую Конфэрэнцыю па рэформе правапісу і азбукі ад імя Латвійскага Унівэрсытэту і асабліва ад імя філёзофска-філёлёгічнага факультэту Унівэрсытэту. Нам, латыскім вучоным, асабліва латыскім мовазнаўцам, беларусы і іх мова заўсёды былі прадметам глыбокай цікавасьці. Мы ведаем, што беларусы зьяўляюцца спаконвеку суседзямі латышоў як на паўднёвым усходзе ад Латвіі, так і на паўночным усходзе. Мы ведаем, што ўжо з IX стагодзьдзя, а магчыма і раней—у VIII, VII в. в.—існуе ўплыў беларускае мовы на мову латыскую. Нашы латыскія мовазнаўцы, калі сталі вывучаць сваю народную мову, не маглі не зьвярнуць сваёй увагі на гэтую зьяву. У самых старых помніках, прысьвечаных гэтаму пытаньню, маюцца паказаньні на сувязь латыскай мовы з беларускаю. Дзякуючы разьвіцьцю латвійскай лінгвістычнай навукі, гэты ўплыў беларускай мовы на латыскую становіцца ўсё больш і больш ясным, што я мушу тутака і адзначыць. Цяпер нават

ужо маюцца працы, выключна прысьвечаныя гэтаму пытаньню. Уплыў беларускай мовы сказваецца і на нашай лексыцы. Калі вы возьмеце новы слоўнік, які ў нас складаецца, то ў нашым сучасным лексыконе вы знойдзеце вельмі шмат слоў, запазычаных з беларускай мовы. Вось чаму латыскія моваснаўцы мусяць лічыць беларускую мову асабліва вартай іх увагі, як блізкую мову да іх роднай мовы.

Пры такім становішчы справы нельга было не адгукнуцца на ваша ласкавае запрашэньне зьявіцца сюды на Конфэрэнцыю па рэформе беларускае ортографіі і правапісу. Сардэчна дзякую за ласкавае запрашэньне і яшчэ раз маю гонар пажадаць Конфэрэнцыі шмат посьпехаў у яе навуковай працы. (Воплескі).

Старшыня: Слова мае профэсар Маскоўскага Унівэрсытэту Растаргуеў.

Растаргуеў. Дазвольце падзякаваць Вас за запрашэньне на Конфэрэнцыю па рэформе беларускае азбукі і правапісу. Справа рэформы правапісу і азбукі—складаная і трудная справа. Ад рэформатара вымагаецца ня толькі, каб ён ведаў сваю справу і ўмеў правесьці рэформу, але, апрача таго, патрэбна вялікая асьцярожнасьць, каб не адтаўхнуць народныя масы ад праведзенай рэформы. Усё гэта мы мусім узяць пад увагу і правесьці рэформу так, каб яна была безбалезна прынята шырокімі народнымі масамі.

Дазвольце разам з тым на гэтым урачыстым пасяджэньні сказаць некалькі слоў па пытаньні, цесна злучаным з рэформай азбукі і правапісу, па пытаньні аб навуковым дасьледваньні сучаснай беларускай мовы.

Беларуская мова вывучаецца цяпер толькі ў фактах яе гісторыі і дыялектолёгіі. Гэта тыя галіны ў вывучэньні мовы, якія мелі сваіх дасьледчыкаў у дарэволюцыйныя часы, калі беларуская мова яшчэ ня была мовай шырокай культурнай працы на ёй. Зараз, калі беларуская мова пасьля доўгага шэрагу год, на працягу якіх яна лічылася толькі гаворкай (наречием) расійскай мовы, прынята ў сям'ю славянскіх моваў і займае выдатнае месца ў усходняй групе іх, г. зн. у тэй групе, да якое належаць расійская і украінская мовы,—зараз неабходна Інбелкульту зьвярнуць увагу і на навуковае вывучэньне сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Можа паўстаць пытаньне, што значыць навуковае вывучэньне сучаснае беларускае мовы? Маецца-ж граматыка гэтае мовы, граматыка якраз літаратурнае мовы, і мы зараз заняты рэформай азбукі і правапісу гэтае мовы. Усё гэта так, але граматыка мае на мэце перш за ўсё практычныя заданьні,—таксама, як і правапіс.

Што-ж датыча гістарычных процэсаў, іншы раз вельмі складаных у літаратурнай мове, і яе фонэтычнага складу, то ўсё гэта застаецца па-за межамі школьнай граматыкі, і пры адсутнасьці адпаведных дысцыплін, зусім не вывучаецца. На гэта якраз і трэба ў бліжэйшыя часы зьвярнуць сур'ёзную ўвагу. Гэта пытаньне насьпеўшае, безадкладнае і чакаючае сваіх працаўнікоў.

Зьвярну тут увагу на тыя абставіны, што сучасныя літаратурныя мовы іншых народаў, напрыклад, расійская мова, даўно ўжо зьяўляюцца прадметам навуковага дасьледваньня, а ў апошні час нават уваходзяць у курс унівэрсытэцкага выкладаньня. Успомнім тут хоць-бы „Очерк истории русского литературного языка XVIII—XIX века“ казанскага проф. Е. Ф. Буддэ („Энциклоп. славянск. филологии“, вып. 12) ці шэраг яго прац аб мове паасобных пісьменьнікаў, напрыклад, яго праца аб мове Пушкіна, артыкул аб мове Гоголя і г. д., і шэраг артыкулаў і прац іншых расійскіх вучоных. Словам, расійская літаратурная мова ўжо ўвайшла ў сфэру навуковага дасьледваньня і вывучэньня. У апошні час, як я ўжо сказаў, літаратурная мова ў яе гісторыі, г. зн. ад пачатку выступу яе на старонках кніг і аж да нашых дзён, зрабілася прадметам унівэрсытэцкага выкладаньня, напр., у Маскоўскім Унівэрсытэце, дзе ня толькі чытаецца курс гісторыі расійскае літаратурнае мовы, але і вядзецца сэмінарый па сучаснай літаратурнай мове.

Усё гэта мусіць быць праароблена і з беларускай мовай. Навуковае вывучэньне беларускае літаратурнае мовы зьяўляецца магчыма болей патрэбным, чым у іншых мовах.

Тут, на ўрачыстым сходзе, зразумела, ня месца вызначаць дэталі вывучэньня, а таксама той шлях, па якому мусіць праходзіць гэтае вывучэньне; тут я толькі выказваю гарачыя пажаданьні, каб такое вывучэньне знайшло месца ў

мурох Інстытуту Беларускае Культуры, і выказваю ўпэўненасьць у тым, што яно будзе праведзена ў жыцьцё. (Воплескі).

Старшыня: Слова мае ад імя дасьледчай катэдры Харкаўскага Інстытуту Народнай Асьветы доцэнт Німчынаў.

Німчынаў (гаворыць украінскаю моваю): Шчыра вітаю Конфэрэнцыю ад імя дасьледчых катэдраў Харкаўскага Інстытуту Народнай Асьветы.

Бязумоўна, у вашай беларускай літаратурнай мове, як і ў нашай украінскай, ёсьць яшчэ шмат неўстаноўленага як у галіне правапісу, гэтак і ў галіне літаратурнай мовы. Што датыча літаратурнай мовы, то тут часта існуюць некалькі паралельных і часта непатрэбных форм. Далейшая праца вашага Інстытуту павінна быць накіравана як на ўстанаўленьне правапісу, гэтак сама і на апрацаваньне літаратурнай мовы.

Вітаючы Конфэрэнцыю, жадаю ёй карысных вынікаў працы. (Воплескі).

Старшыня: Слова мае рэдактар часопісу „Крывіч" у Коўне гр. Ластоўскі.

Ластоўскі. Ад імя рэдакцыі „Крывіч", а таксама ад цэлага шэрагу беларускіх організацый, якія знаходзяцца на эміграцыі, мне даручана вітаць Конфэрэнцыю па рэформе правапісу і азбукі.

Трэба сказаць, што людзі, якім часта здараецца спатыкацца з беларускім словам, бачаць многа недахопаў у цяперашнім нашым правапісе, а таксама ў нашай азбуцы. Заданьнем нашай Конфэрэнцыі і павінна быць—ухіліць гэтыя недахопы і спросьціць правапіс. У гэтай працы трэба мець на ўвазе нашу старую літаратурную мову, помнікі якой маюцца ад X ст., і якая даходзіць да свайго красаваньня ў XVI ст.

Разам з тым, у аснову гэтай працы ў першую чаргу трэба палажыць народную мову, якая бязумоўна зьяўляецца старэйшай ад мовы ўсіх помнікаў; нарэшце, трэба ўзяць пад увагу тую літаратурную мову, якую мы да гэтага часу ўжываем у літаратуры.

І вось пажадана было-б, каб наша рэформа, якую мы будзем тут абгаварваць, была вырашана на грунце гэтых трох момантаў.

Бачу ўсю важнасьць гэтай Конфэрэнцыі для беларускага адраджэньня, для беларускага пісьма, для якіх гэта Конфэрэнцыя зьяўляецца ў пэўнай меры паваротным момантам і вялікім этапам у гісторыі нашага адраджэньня. А таму ад шчырага сэрца вітаю ініцыятара гэтае Конфэрэнцыі— Інстытут Беларускае Культуры. (Воплескі).

Старшыня: Слова мае рэдактар газэты „Голас Беларуса“ і Старшыня Беларускага Навуковага Таварыства ў Латвіі грам. Езавітаў.

Езавітаў. Паважаныя грамадзяне і грамадзянкі! Ад імя рэдакцыі „Голас Беларуса“, а таксама ад імя жмені беларусаў, якія знаходзяцца цяпер у межах Латвійскай дзяржавы, горача вітаю Інбелкульт, які ўзяў на сябе ініцыятыву па скліканьні беларускай Конфэрэнцыі. Мы ня маем магчымасьці пахваліцца вялікімі посьпехамі нашай нацыянальнай працы. Калі ў вас тут 4.000 пачатковых беларускіх школ, у нас толькі—45; калі тут працуе болей 200 школ II ступ., у нас на ўсю беларускую нацыянальнасьць толькі адна гімназія. Заместа вашых вышэйшых школ, мы маем усяго адну ўстанову—гэта Вышэйшыя Пэдагогічныя Курсы. З нашай нацыянальнай працай мы спазьніліся на некалькі гадоў. Толькі ў 1921 г. мы зрабілі некаторыя крокі, каб аб‘яднаць нашу нацыянальную меншасьць. Ува ўсёй нашай працы мы чэрпалі сілу, узіраючыся на тую культурную працу, якая праводзіцца ў вас. Гэтая культурная праца давала нам сілу ў змаганьні за нашу нацыянальную справу, за захаваньне жменькі нашага народу ў межах чужое дзяржавы. Сягодняшні зьезд ёсьць новы крок на шляху стварэньня і ўмацаваньня беларускае культуры. Адгэтуль мы будзем чарпаць сілу для тэй культуры, якая ў нас будуецца. Горача вітаю Конфэрэнцыю, жадаю посьпехаў, жадаю, каб яна дала багатыя вынікі, якія будуць класьці моцны грунт для нашага культурнага будаўніцтва. (Воплескі).

Старшыня: Слова мае старшыня Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Літве грам. Галавінскі.

Галавінскі. Паважаныя грамадзяне! Дазвольце ад беларускіх гурткоў у Літве вітаць Конфэрэнцыю. Мы, беларусы Літвы, з вялікай цікавасьцю ўзіраемся на тое, што робіцца ў вас, мы ўвесь час сочым за вашымі дасягненьнямі як у

нацыянальна-політычным будаўніцтве, так і ў культурным. Вашы посьпехі замацоўваюць ня толькі вашу, але і нашу працу. Таму беларусы Літвы вельмі былі зацікаўлены ў скліканьні вашай Конфэрэнцыі і спадзяюцца, што праца Конфэрэнцыі будзе мець карысныя вынікі. (Воплескі).

Старшыня: Слова мае рэдактар часопісу „Прамень“ у Празе гр. Жылка.

Жылка. Рэдакцыя часопісу „Прамень“ і беларускае студэнцтва ў Чэхаславакіі, якое паслала мяне сюды, горача вітае Першую Беларускую Акадэмічную Конфэрэнцыю. Гэта першае сьвята нашай беларускай навуковай думкі. Мы спадзяемся, што Конфэрэнцыя будзе новым крокам на шляху разьвіцьця беларускай культуры, на шляху пашырэньня асьветы сярод беларускіх працоўных мас, на шляху цяжкага змаганьня за вызваленьне беларускага народу ад някультурнасьці, няпісьменнасьці і прыгнячэньня. Беларускі працоўны народ, які раней быў прыгнечаны соцыяльна і нацыянальна, цяпер будуе сваю рэспубліку. І там, у нас на Захадзе, дзе ідзе цяжкае змаганьне ня толькі за сваю культуру, але і за нацыянальнае існаваньне, за права „людзьмі звацца“, там к здабыткам беларускай навукі асабліва прыслухоўваюцца. Кожны новы крок, кожны новы посьпех беларускай культуры зьяўляецца там, на Захадзе, новай сілаю, новай зброяй у руках беларускіх мас, якія ў апошнія гады паднялі сьцяг змаганьня.

Хай жыве і разьвіваецца беларуская культура, хай жыве адроджаная беларуская навука, хай сьветла і культурна жывуць беларускія працоўныя масы! (Воплескі).

Старшыня: Слова мае ад Беларускага Таварыства культурнае сувязі з заграніцай тав. А. Цьвікевіч.

А. Цьвікевіч. Вітаю Конфэрэнцыю ад імя маладой беларускай організацыі—Беларускага Т-ва культурнай сувязі з заграніцай. Мэты нашага Т-ва—найбліжэйшае азнаямленьне з навуковымі і культурнымі дасягненьнямі ў Эўропе, а таксама азнаямленьне Эўропы з дасягненьнямі і культурнымі посьпехамі нашай Савецкай Беларусі. Цяперашняя Конфэрэнцыя з прадстаўнікамі выдатных навуковых устаноў Захаду ўжо зьяўляецца сьведкам увагі Захаду да дзяржавы рабочых і сялян—Савецкай Беларусі.

Пераконаны, што гэтая Конфэрэнцыя паложыць новы фундамант нашай славы, што Конфэрэнцыя зьявіцца лішнім доказам таго, што наша мужыцкая, як казалі раней, беларуская культура ёсьць культура сусьветная. Вітаю прысутных дэлегатаў і жадаю ад імя Т-ва посьпехаў у працы. (Воплескі).

Старшыня: Слова для прывітаньня ад Ленінградзкага Унівэрсытэту мае профэсар Гарчынскі.

Гарчынскі. Я хачу вітаць Конфэрэнцыю ад імя Ленінградзкага Унівэрсытэту, які мяне ўпаўнаважыў на гэта.

Ленінградзкі Унівэрсытэт з асабліваю шчырасьцю вітае Конфэрэнцыю, бо ў сваіх мурох ён бачыў шмат слаўных і вялікіх сыноў Беларусі, як Тарашкевіч, Карскі, якія палажылі моцныя падваліны ў гмаху беларускай культуры. Вітаю Конфэрэнцыю і таму, што яна зьяўляецца выдатнай культурнай падзеяй, за якою з вялікаю пільнасьцю сочыць цэлы шэраг навуковых устаноў.

Вось чаму Ленінградзкі Унівэрсытэт, пасылаючы мяне сюды, лічыў патрэбным даручыць мне зрабіць прывітаньне як ад імя Ленінградзкага Унівэрсытэту, гэтак і ад Кіраўніцтва гэтага Унівэрсытэту. Я вітаю і перадаю гарачыя пажаданьні, якія былі выказаны Конфэрэнцыі Ленінградзкім Унівэрсытэтам. (Воплескі).

Старшыня: Слова для прывітаньня ад Беларускай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі мае доцэнт Гаўрыла Гарэцкі.

Г. Гарэцкі. Я маю гонар вітаць беларускую Акадэмічную Конфэрэнцыю ад імя Праўленьня Беларускай Дзяржаўнай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі. Мы ўжо віталі Конфэрэнцыю тэлеграмай, бо, на жаль, не маглі раней прыслаць свайго прадстаўніка з тае прычыны, што былі вельмі заняты праверкай беларусізацыі і распрацоўкай пляну далейшай беларусізацыі нашай Акадэміі.

Беларуская Акадэмія ў гэтых адносінах за апошні час, як вядома, мае даволі вялікія дасягненьні. Як высьветлілася пасьля праверкі, каля 75% асыстэнцкага складу ўжо пераходзіць на беларускую мову; каля 50% навуковых працаўнікоў таксама перайшлі на беларускую мову; цэлы шэраг доцэнтаў выкладае пабеларуску і нават некаторыя профэсары, ня гледзячы на тое, што пераход на беларускую мову зьяў-

ляецца добравольным, перайшлі на беларускую мову. Але, на жаль, на шляху далейшай поўнай беларусізацыі Акадэміі мы маем вялікія перашкоды—гэта адсутнасьць у нас навуковае тэрмінолёгіі. Самі навуковыя працаўнікі, будучы спэцыялістамі паасобных прыродазнаўчых дысцыплін, не зьяўляючыся мовазнаўцамі, могуць толькі дапамагаць пры распрацоўцы беларускай сельска-гаспадарчай тэрмінолёгіі. А загэтым кіраўніка ў гэтай працы—Інстытут Беларускае Культуры—і скліканую ім Беларускую Акадэмічную Конфэрэнцыю асабліва горача вітае наша Сельска-Гаспадарчая Акадэмія. Конфэрэнцыя зьяўляецца надзвычайна сваячасовай. Яна зьяўляецца сымболем маладой Беларускай Савецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. На самай справе: беларускі народ, які да сяго часу зьяўляўся этнографічнай масаю, дажыў да факту ўтварэньня БССР—гэтага вялікага гістарычнага факту. І Беларуская Савецкая Рэспубліка, ня гледзячы на вялікае зруйнаваньне, зробленае імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайною, зараз перажывае процэс інтэнсыўнага гаспадарчага будаўніцтва. Мы ведаем, што Беларуская Рэспубліка стаіць аднэй з першых у Саюзе на шляху аднаўленьня гаспадаркі. Беларуская Рэспубліка зьяўляецца рэспублікай з найбольш інтэнсыўнаю сельскаю гаспадаркаю ва ўсім Саюзе. Савецкая Беларусь ужо даўно перашагнула даваенны ўзровень. З гэтага боку яна апярэдзіла буржуазныя дзяржавы Эўропы і тую частку этнографічнай Беларусі—Заходнюю Беларусь, якая ў часы царызму была наперадзе яе па інтэнсыўнасьці гаспадаркі. Цяпер мы бачым, што наша Савецкая Беларусь папераджае Заходнюю Беларусь у тэмпе гаспадарчага разьвіцьця. У той час, як там ідзе процэс дэіндустрыялізацыі гаспадаркі, у нас ідзе індустрыялізацыя краіны. І ўласна на гэтай аснове гаспадарчага і дзяржаўнага адраджэньня ідзе культурнае адраджэньне. Яно павінна быць гармонізавана ва ўсіх сваіх частках. Усе гамы беларускага руху павінны зьліцца ў адзін развой адраджэньня беларускай культуры. Гэты процэс даўно пачаўся ў Савецкай Беларусі. Мы маем беларусізаваную сетку пачатковай і сярэдняй школы, тэхнікумаў, сельска-гаспадарчых школ і г. д. і ўжо стаім на пераломным моманце беларусізацыі вышэйшых школ. І Унівэрсытэт і, асабліва, Беларуская Сельска-Гаспадарчая Акадэмія

маюць зараз у гэтых адносінах вялікія дасягненьні. І калі будзе створана да канца беларусізаваная вышэйшая школа, тады будзе дасягнута поўная беларусізацыя асьветы, беларусізацыя культуры, будзе ўтворана беларуская навука. Але паколькі такі важны процэс ня можа адбыцца сам па сабе, без утва- рэньня навуковай тэрмінолёгіі і навуковага правапісу, па- толькі скліканьне Конфэрэнцыі зьяўляецца надзвычайна свая- часовым. Усьведамляючы важнасьць Конфэрэнцыі, яе выключ- ную гістарычную ролю—бо Конфэрэнцыя стаіць на рубяжы ўтварэньня вышэйшай беларускай школы,—Беларуская Дзяр- жаўная Сельска-Гаспадарчая Акадэмія асабліва горача вітае Конфэрэнцыю. Факт дзяржаўнага будаўніцтва Савецкай Бела- русі павінен быць падмацаваны і іншымі фактамі—утварэнь- нем навуковай беларускай мовы, самастойнай беларускай навукі. Толькі тады будзе цалком запоўнена гістарычная гама будаўніцтва беларускай культуры.

Сельска-Гаспадарчая Акадэмія даручыла мне вітаць Вас і сказаць: няхай жыве беларуская культура, няхай жыве беларуская навука! (Воплескі).

Старшыня: Слова для зачытаньня тэлеграм і лістоў мае правадзейны член Інстытуту Беларускай Культуры *Смоліч*.

Смоліч (чытае):

Минск, Инбелкульт. Из Москвы.

От имени Наркомпроса РСФСР приветствую Первую Белорусскую Академическую Конференцию ученых филологов, призванную подвести прочный научный фундамент для бело- русского литературного языка, что послужит более тесному об'единению всех белоруссов, находящихся пока за пределами СССР. Желаю успеха Конференции на благо белорусского народа.

Наркомпрос Л у н а ч а р с к и й. (Бурныя воплескі).

Інстытут Беларускай Культуры. З Варшавы. Сойм.

Ніхто з прадстаўнікоў Беларускага Навуковага Тава- рыства—*Луцкевіч, Тарашкевіч, Астроўскі, Рак, Дварчанін*—не атрымаў ад улады дазволу выезду на Конфэрэнцыю. *Янка*

Станкевіч ня прыедзе дзеля солідарнасьці протэсту. Шчыра жадаючы вам добрых вынікаў працы, культурныя навуковыя работнікі Заходняй Беларусі перакананы, што ніякая сіла ня зможа парваць культурнай еднасьці беларускага народу.

Ад імя Навуковага Таварыства Тарашкевіч.

(Бурныя воплескі).

Інбелкульт. Менск Беларускі. З Вільні.

Пазбаўлены магчымасьці прыняць асабіста ўдзел у працах Конфэрэнцыі, шлю ёй вітаньне, жадаю знайсьці найлепшае вырашэньне пастаўленых пытаньняў.

Антон Луцкевіч. (Воплескі).

Інбелкульт. Менск. З Вільні.

Ня маючы, на жаль, магчымасьці прыняць удзел на Конфэрэнцыі з прычыны адмовы польскай улады даць нашым дэлегатам пашпарты, гэтым Таварыства Беларускай Школы Заходняй Беларусі шле шчырае прывітаньне сваім свабодным усходнім братом, жадаючы продукцыйнай працы Конфэрэнцыі на карысьць усяго беларускага народу.

Старшыня Таварыства Беларускай Школы Астроўскі.

(Воплескі).

Минск. Инбелкульт. Игнатовскому. Из Москвы.

Угнетаемый в продолжении веков царизма белорусский народ в тесном единении с трудящимися массами Советского Союза ныне возрождает и развивает свою культуру. Белорусский язык является государственным языком нашего Союза ССР. Все законы Союзного правительства издаются на всех шести конституционных языках, в том числе белорусском. Придавая большое значение работе Конференции, Управление Делами СНК СССР приветствует Белорусскую Академическую Конференцию пожеланием плодотворных результатов работы.

Управдел СНК СССР Горбунов.

Завотделом опубликований законов Беляев. (Воплескі).

Інстытут Беларускай Культуры. З Варшавы.

Шчыра дзякую за запрашэньне. Горача жадаю Акадэмічнай Конфэрэнцыі добрых вынікаў у працы. Перадаю падзяку ад профэсароў *Лося* з Кракава, *Сьвеніцкага, Студынскага* з Львова за запросіны на Конфэрэнцыю.

Ульянаў. (Воплескі).

Инбелкульту. Минск. Из Москвы.

Всесоюзное Общество культурной связи с заграницей приветствует Конференцию, имеющую огромное политическое культурное значение. Желает успеха работе.

Председатель Каменева. (Воплескі).

Інститутові Білоруськоі Культури. З Харькова.

Многолюдні збори лекторів украінськоі мови мовазнавців та вчителів Харкова, зібравшись на обговорення проекту украінського правопису, вітають Інбілкульт за закінченнем робот правописноі Конференціі і бажають, шоб ця робота дала міцну підвалину для культурного будівництва братерськоі Радянськоі Білоруси.

Голова Старостату Лекторів Павло.
Секретар Сукманський. (Воплескі).

Менск. Інбелкульт. Акадэмічная Конфэрэнцыя. З Горы-Горак.

Навуковае Таварыства па вывучэньні Беларусі ў Горках шчыра вітае Акадэмічную Конфэрэнцыю і жадае посьпеху ў яе працы на карысьць працоўных савецкай і замежнай Беларусі.

Старшыня Т-ва Проф. Люнгерсгаузэн. (Воплескі).

Минск. Белорусская Академическая Конференция. Из Москвы.

Общество Политэмигрантов Западной Белоруссии шлет привет Конференции, собравшейся на территории Советской Белоруссии, и выражает надежду, что наши зарубежные братья полностью используют результаты Конференции в

деле поднятия национальной культуры и приложат все усилия на борьбу за культурное единство с Советской Белоруссией.

Президиум: Чуденок, Ромаш. (Воплескі).

Менск. Інбелкульт. Акадэмічная Конфэрэнцыя. З Горы-Горак.

Горацкае аддзяленьне сэкцыі навуковых працаўнікоў Беларусі вітае Першую Акадэмічную Конфэрэнцыю. Жадае поўнага посьпеху яе працы. Няхай жыве беларуская культура!

Бюро. (Воплескі).

Минск. Инбелкульт. Игнатовскому. Из Москвы.

Совнацмен Наркомпроса РСФСР приветствует Белорусскую Академическую Конференцию пожеланием плодотворной работы в деле развития языка и культуры белорусских рабоче-крестьянских масс.

Совнацмен Лиэ. (Воплескі).

Менск, Рэволюцыйная, 21. Профэсару Ігнатоўскаму. З Дзьвінску.

Дзьвінскія організацыі выбаршчыкаў, вучыцельства, „Прасьвета“, „Хатка“ вітаюць Першую Акадэмічную Конфэрэнцыю. Жадаюць посьпехаў навуковай працы для ўмацаваньня беларускай мовы, багацьця беларускай культуры.

Раткін, Жэрдзі, Сахараў, Райко. (Воплескі).

Менск. Профэсару Ігнатоўскаму. З Дзьвінску.

Дзьвінская Дзяржаўная Беларуская Гімназія вітае Акадэмічную Конфэрэнцыю, як моцны крок на шляху культурнага разьвіцьця беларускага народу. Жадаем посьпеху ў працы.

Дырэктар Сахараў. (Воплескі).

Інстытут Беларускай Культуры. З Львова.

Таварыства імені Шэўчэнкі ў Львове вітае сардэчна беларускі народ з адкрыцьцем Конфэрэнцыі.

Акадэмік Студынскі. (Воплескі).

Менск. Інбелкульт. Ігнатоўскаму. З Полацку.

Полацкая Акруговая Конфэрэнцыя вясковых працаўнікоў асьветы шчыра вітае Беларускую Акадэмічную Конфэрэнцыю і адзначае, што беларуская вёска, вызваленая ад соцыяльнага і нацыянальнага уціску, стаўшы на культурны шлях разьвіцьця, упэўнена, што Акадэмічная Конфэрэнцыя сваёй працай дапаможа павялічыць уздым рабоча-сялянскіх гушчаў незалежнай Беларусі.

Прэзыдыум. (Воплескі).

Менск. Інбелкульт. Ігнатоўскаму. З Мазыра.

Мазырскі Беларускі Пэдагогічны Тэхнікум, на вялікі жаль, ня мае магчымасьці прыняць удзел у працы Першай Усебеларускай Акадэмічнай Конфэрэнцыі. Тэхнікум з захапленьнем сочыць за ходам Конфэрэнцыі, шле ёй сваё шчырае прывітаньне з пажаданьнем поўнага посьпеху ў працы на карысьць беларускай культуры. Няхай жыве Акадэмічная Конфэрэнцыя! Няхай жыве беларуская культура!

Дзегцяроў. (Воплескі).

Do Instytutu Kultury Białoruskiej w Mińsku*).

W. Szanowni Panowie!

Zaproszenie z 12 października r. 1926 na Konferencję Akademiczną, która ma się odbyć między 14 a 21 listopada, otrzymałem dopiero 30 października. Z miłą chęcią pojechałbym na tę Konferencję, gdyby nie to,

1) że jest już zapóźno na załatwienie związanych z wyjazdem formalności,

2) że w danej chwili cały mòj czas jest pochłonięty przeglądaniem i porządkowaniem resztek mego mienia (książek, rękopisów i t. p.), zwróconych mi z Leningradu, ale zwróconych w okropnym stanie, t. j. w bezładzie i chaosie.

---

*) *У Інстытут Беларускае Культуры ў Менску.*

Вельмі Паважаныя Грамадзяне!

Запрашэньне ад 12-га кастрычніка 1926-га году на Акадэмічную Конфэрэнцыю, якая мае адбыцца паміж 14 і 21 лістапада, я атрымаў толькі 30-га кастрычніка. З прыемнай ахвотай паехаў-бы я на гэту Конфэрэнцыю, калі-б ня тое, што

Z prawdziwym więc żalem muszę sobie odmòwić przyjemności odwiedzenia Panów i wzięcia udziału w ich pracach, tak ważnych dla pomyślnego i pokojowego rozwoju kultury i świadomości narodowej ludu białoruskiego, któremu przesyłam szczere i serdeczne życzenia.

Dołączone do zaproszenia rosprawy: *1) Язэп Лёсік.* „У справе рэформы нашае азбукі“, *2) Антон Лёсік і Язэп Лёсік.* „Да рэформы беларускага правапісу“, *3) Антон Лёсік.* „Да рэформы беларускага правапісу“—przeczytałem uważnie i z wielkiem zainteresowaniem. Chciałem jednocześnie z tym listem przesłać także swoje uwagi, ale okazało się, że to nieda się zrobić na poczekaniu. Sprawa jest zbyt ważna i wymaga pilnego zastanowienia się oraz gruntownego omówienia. Musiałbym poświęcić na to kilka dni czasu, tak że nie zdążyłbym załatwić się z tem przed Konferencją Szanownych Panów. Każdorazowa Komunikacja między Warszawą a Mińskiem wymaga parę tygodni czasu, a korespondencja urzędowa bywa wysyłana z Warszawy do SSSR tylko raz na tydzień.

Prócz tego w danej chwili inne bieżące i konieczne prace nie pozwoliłyby skoncentrować uwagi na kwestji alfabetu i pisowni białoruskiej. Mogło by to nastąpić dopiero po kilku tygodniach. Jeżeli to nie będzie zapóźno i jeżeliby Panowie sobie tego życzyli, mógłbym za kilka tygodni lub za parę miesięcy zająć się tą spawą i przysłać Panom obszerne i wszechstronnie obmyślane uwagi.

Czekając wskazówek, pozostaję z głębokim szacunkiem i poważaniem. J. Baudouin de Courtenay.

Warszawa, 2 listopada 1926 r.

---

1) запозна ўжо, каб здолець выканаць усе зьвязаныя з выездам формальнасьці;

2) у даны момант увесь час мой заняты пераглядам і ўпарадкаваньнем рэштак маёй маёмасьці (кніжак, рукапісаў і г. д.), зьвернутых мне з Ленінграду, але зьвернутых у жудасным стане, г. зн. у поўным бязладзьдзі і хаосе.

Дык з праўдзівым жалем мушу адмовіць сабе ў прыемнасьці даведацца да вас і прыняць удзел у вашых працах, так важных для памыснага і мірнага разьвіцьця культуры і нацыянальнай сьвядомасьці беларускага народу, якому шлю шчырыя і сардэчныя пажаданьні.

Далучаныя да запрашэньня артыкулы: *1) Язэп Лёсік.* „У справе рэформы нашае азбукі“, *2) Антон Лёсік і Язэп Лёсік.* „Да рэформы беларускага правапісу“, *3) Антон Лёсік.* „Да рэформы беларускага правапісу“—я прачытаў уважна і з вялікім зацікаўленьнем. Адначасна з гэтым лістом хацеў я паслаць таксама свае ўвагі, але аказалася, што гэта не даецца зра-

Інстытуту Беларускай Культуры.

Паважаныя Грамадзяне!

Лістом з дня 11 кастрычніка г. г. вы аказалі мне гонар прыемным запрашэньнем на Конфэрэнцыю вашага Інстытуту, на якой маюць быць разгледжаны неадкладныя пытаньні беларускай мовы, а менавіта правапісу. Шмат разважаў я над гэтым запрашэньнем і над прадметам нарад, на каторыя я заклікан (таму так позна адказваю на ваш ліст), і па разважаньнях гэтых бачу, што толькі вельмі мала мог-бы быць карысным у вашай працы, таму што дагэтуль адносна мала займаўся пытаньнямі, якія будзе разьбіраць Конфэрэнцыя, а кароткі адносна час не дазваляе мне дакладна прастудыяваць гэтыя пытаньні і падрыхтавацца да іх вырашэньня.

А дзеля таго з жалем мушу паведаміць вас, паважаныя грамадзяне, што з гэтае прычыны не магу прыняць вашага ласкавага запрашэньня і прашу, каб мне гэта ласкава прабачылі. Урэшце я заўжды ахвотна гатоў афяраваць вам свае паслугі пры граматычнай апрацоўцы вашай мовы, калі-б вы часам іх патрабавалі. Вашай Акадэмічнай Конфэрэнцыі жадаю поўнага посьпеху.

Прага. З выражэньнем пашаны О. Гуер. (Воплескі) *).

Многоуважаемый Председатель Ин. Бел. Культуры!

Принося глубокую благодарность Институту Белорусской Культуры за оказанное мне внимание, в частности,

---

біць так хутка. Справа вельмі важная і патрабуе пільнага разважаньня і грунтоўнага абгаварэньня. Я-б мусіў прысьвяціць гэтаму некалькі дзён часу, так што ня здолеў-бы зрабіць гэтага да вашай Конфэрэнцыі. Між тым зносіны паміж Варшавай і Менскам вымагаюць пары тыдняў часу, а ўрадовая корэспондэнцыя высылаецца з Варшавы ў СССР толькі раз у тыдзень.

Апроч таго, у даны момант іншыя бягучыя і неабходныя працы не дазволілі-б мне сконцэнтраваць увагу на пытаньні беларускага альфабэту і правапісу. Гэта магло-б наступіць толькі пасьля некалькіх тыдняў. Калі гэта ня будзе запозна і калі-б вы гэтага жадалі, я мог-бы праз некалькі тыдняў або праз пару месяцаў заняцца гэтай справай і прысылаць вам абшырныя і ўсебакова абдуманыя ўвагі.

Чакаючы ўказаньняў, застаюся з глыбокай пашанай і паважаньнем.

Варшава, 2/XI—26 г. Я. Бодуэн-дэ-Куртэнэ. (Воплескі).

---

*) Лісты чэскіх вучоных О. Гуера і А. Чернага, з-за адсутнасьці чэскіх шрыфтоў, не маглі быць зьмешчаны ў орыгінале. *Увага рэд.*

приглашение на Академическую Конференцию по вопросу об улучшении белорусского правописания, я спешу Вас известить, что, вследствие неотложных занятий здесь по службе в Академии Наук и в Университете и по работам для словаря в Публ. Б-ке, я не имею возможности поехать на Конференцию. Сознавая, однако, важность поставленных Конференциею задач, я, внимательно изучив „Матар‘ялы да Акадэмічнае Конфэрэнцыі“ (члена ИБК Лёсика и доцэнта Бел. Госуд. Унив. Волк-Левановича), послал свои замечания на проект Лёсика профессору П. А. Бузуку и доценту Иос. Вас. Волк-Левановичу, которых я прошу отстаивать мои положения на заседаниях Конференции.

С глубоким уважением к вам член Акад. Наук СССР Б. М. Ляпунов. (Воплескі).

Гр. Старшыні Інстытуту Беларускае Культуры.

Я надзвычай пацешаны запрашэньнем Прэзыдыуму Інстытуту і прашу прыняць маю шчырую ўдзячнасьць. Сочачы з найвялікшай увагай за культурнымі дасягненьнямі майго роднага краю, радуюся яго посьпехам і жадаю самых спрыяючых варункаў для іх далейшага разьвіцьця. Шчыра шкадую, што мае унівэрсытэцкія абавязкі ў Празе перашкаджаюць мне асабіста прыняць удзел у гэтым зьезьдзе, але спадзяюся, што абставіны дазволяць мне ў бліжэйшым будучым асабіста пазнаёміцца з тымі дзеячамі, якія кладуць такі бліскучы пачатак будучаму слаўнаму разьвіцьцю беларускай культуры.

Зайздрошчу тым, хто мае шчасьце быць у сучасны момант яе будаўнікамі. Прашу Вас, грамадзянін Старшыня, прыняць і перадаць Акадэмічнай Конфэрэнцыі маё гарачае прывітаньне.

Прага. Проф. Аўгень Ляцкі. (Бурныя воплескі).

Высокодостойный Президенте Інституту Білоруьскої Культуры!

Складаючы на Ваші рукі сердечне спасибі за так почесні для мене запросини на Академичну Конференцію

14/XI—26 г. за 3.008, залучаю присьому мій причинок п. з. „Правописні ціхи поділу памяток староруского письменства“ для ужитку Академичноі Конференціі і прошу приняти моі горячі побажання як самому Інститутові Білоруськоі Культури і учасникам Академичноі Конференціі як найкращих успіхів розцвіту для Білоруси, та для злученоі з нею вузками писменно-культурноі спільноти на протягови віків Украіни і Великоруси.

Нехай живе, росте, цвіте і по всі віки розвиваєтся Білорусь у вінкови східного словянства, та в свойому ростови нехай веде до повного розцвіту злучені з нею інші народности.

З виразами глыбокого поважання Иларион Свеніцкі (Воплескі).

Высокошановний Колего!

Дуже прошу переказати Інститутові Білоруськоі Культури мою щиру подяку за зроблену мені честь, а саме за запрошення взяти участь в Академичній Конференціі, питанням білоруського правопису присвяченій.

Якщо обставини дозволять, то буду радий завітати до культурного центру Білоруси і шляхом особистоі знайомости спричинитися до тіснішого єднания білоруськіх і українських наукових робітників.

З щирою пошанаю В. Ганцов. (Воплескі).

Киів, 25 жовтня 1926 г.

В Институт Белорусской Культуры.

Приношу глубокую благодарность Институту Белорусской Культуры, почтившему меня приглашением на Академическую Конференцию. Крайне сожалею, что условия работы и состояние здоровья не позволяют мне теперь отлучиться из Москвы. Приветствую Конференцию и желаю успеха в ее работе на благо белорусского народа.

Профессор Д. Ушаков. (Воплескі).

Москва, 13/XI—26 г.

Беларускай Акадэмічнай Конфэрэнцыі ў Менску.

Беларускае (Крывіцкае) Культурнае Таварыства імені Францішка Скарыны ў Празе вітае Першую Беларускую Акадэмічную Конфэрэнцыю і жадае ёй памысных вынікаў у яе працы.

Старшыня М. Ільляшэвіч.

Пісар М. Кабраў. (Воплескі).

Інстытут Беларускае Культуры.

Да Конфэрэнцыі па рэформе правапісу.

Вітаю Конфэрэнцыю. Падзяку выказваю Інбелкульту. На жаль, цяпер не магу прыняць удзел у пасяджэньнях Конфэрэнцыі, але дазволю выказаць надзею, што ў наступных працах Конфэрэнцыі па рэформе правапісу будзе і мая праца.

З шчырым паважаньнем Грунскі,
проф. Кіеўскага Ін. Н. Асьветы. (Воплескі).

Смоліч. Да нас яшчэ надасланы прывітальныя лісты з увагамі аб азбуцы і правапісу ад профэсароў Адольфа Чернага, Е. Тімчэнкі і А. Курылы. Увагі аб правапісу і азбуцы будуць зачытаны пры абгаварэньні гэтых пытаньняў на Конфэрэнцыі, а цяпер дазвольце зачытаць прывітальныя часткі лістоў. (Чытае).

Інстытут Беларускае Культуры. Менск.

Атрымаў усе тры артыкулы № 2674, 2852 і 3008 і дзякую за прыемнае запрашэньне на Акадэмічную Конфэрэнцыю па рэформе беларускага правапісу. Вельмі шкадую, што ў позную пару году (амаль не ў палове лістапада) маё здароўе не дазваляе, каб я рушыў у такую далёкую дарогу. Быў-бы вельмі рады наведацца ў Менск, які стаўся асяродкам беларускага культурнага жыцьця. Ня ведаю, аднак, ці досыць я адпавядаю таму, каб быць членам Конфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу, хоць беларускай справай і літаратурай займаюся даўно.

З пажаданьнем усялякага посьпеху Конфэрэнцыі і выражэньнем праўдзівай пашаны.

26/X—26 г. Прага. Адольф Черны. (Воплескі).

В Институт Белорусской Культуры.

Благодарю за любезное приглашение на Конференцию по вопросам белорусского правописания. Обстоятельства, к сожалению, не позволяют мне приехать в Минск.

11/XI—26 г. Проф. Е. Тимченко. (Воплескі).

Многоуважаемые Коллеги!

Сердечно приветствую Белорускую Академическую Конференцию. Не могу, к сожалению, принять участие в Конференции: известие о смерти моего отца настолько подействовало, что я не чувствую себя в силах предпринять поездку в Минск.

С товарищеским приветом и глубоким почтением

Кіев, 13/XI—26 г. Елена Курило. (Воплескі).

Старшыня Ігнатоўскі: У адказ на прывітаньні, якія мы тут выслухалі, я мушу ад імя Інстытуту Беларускай Культуры і, думаю, ад усяе Акадэмічнае Конфэрэнцыі сказаць: усе выступы вітаўшых нас выяўлялі добрыя адносіны да працы, якая стаіць перад намі, і казалі аб дружным пажаданьні нам поўнага посьпеху ў вырашэньні тых цяжкіх пытаньняў, якія стаяць перад Конфэрэнцыяй. Да працы Акадэмічнае Конфэрэнцыі будуць вельмі ўважліва адносіцца працоўныя масы нашай Савецкай Беларусі, якія пад кіраўніцтвам Компартыі будуюць новае жыцьцё. Працы Конфэрэнцыі адгукнуцца і ў беларускіх масах, якія жывуць у суседніх заходніх дзяржавах. Будуць цікавіцца Конфэрэнцыяй вучоныя колы як Саюзу ССР, гэтак і замежныя. Такая цікавасьць да Конфэрэнцыі як у Беларусі, так і па-за яе межамі, накладае на членаў Конфэрэнцыі абавязак быць вельмі ўважлівымі, дакладнымі і пільнымі ў працы па рэформе беларускага правапісу і азбукі, у сэнсе спрашчэньня іх на аснове навуковых, самых грунтоўных падвалін. Я глыбака пераконаны, што ў гэтым напрамку мы будзем працаваць з поўнай нагрузкай і з поўнаю сьвядомасьцю свае адказнасьці. Працы Конфэрэнцыі Інстытут Беларускай Культуры пастараецца выдаць асобным зборнікам і гэтым дасьць магчымасьць усім, хто цікавіцца, пазнаёміцца з імі.

Ад імя Інстытуту Беларускай Культуры выказваю здавальненьне, што Акадэмічная Конфэрэнцыя адчыняецца ў вызначаны тэрмін, што тут зьяўляюцца прысутнымі ў вялікай колькасьці навуковыя сілы Саюзу ССР і замежныя прадстаўнікі навукі.

Жадаю вялікага посьпеху Конфэрэнцыі ў яе цяжкай і адказнай працы, якая, бязумоўна, дасьць вялікія вынікі. (Воплескі).

Цяпер дазвольце аб'явіць програму Конфэрэнцыі:

Панядзелак 15 лістапада:

Ураньні ад 10—2 гадз. даклады: *С. Некрашэвіч.* Сучасны стан вывучэньня беларускай мовы. *П. Бузук.* Становішча беларускай мовы сярод іншых славянскіх моваў. (У клюбе Карла Маркса).

Увечары ад 5—8 гадз.: *Язэп Лёсік, П. Растаргуеў.* Да рэформы беларускай азбукі. (У клюбе Карла Маркса).

Аўторак 16 лістапада.

Ураньні ад 10—2 гадз.: *Язэп Лёсік, С. Некрашэвіч.* Да рэформы беларускага правапісу. (У клюбе Карла Маркса).

Увечары ад 5—8 гадз. Пасяджэньні камісій па правапісу і графіцы. (У будынку Інстытуту Беларускай Культуры).

Серада 17 лістапада.

Ураньні ад 10—2 гадз.: *М. Пятуховіч.* Соцыяльныя мотывы ў беларускай літаратуры. *М. Гарэцкі.* Беларуская літаратура апошняга часу. (У клюбе Карла Маркса).

Увечары ад 5—8 гадз. Пасяджэньні камісій па правапісу і графіцы. (У будынку Інстытуту Беларускай Культуры).

Чацьвер 18 лістапада.

Ураньні ад 10—2 гадз.: *Л. Цьвяткоў.* Беларускі элемэнт у польскай мове. (У клюбе Карла Маркса).

Увечары ад 5—8 гадз. Пасяджэньні камісій. Зачыненьне Конфэрэнцыі.

Члены Конфэрэнцыі, якія маюць даклады і хацелі-б іх зрабіць на Конфэрэнцыі, будуць ласкавы зьвярнуцца аб гэтым у Прэзыдыум Конфэрэнцыі.

Старшыня: Програму стаўлю на галасаваньне. Хто за прыняцьце програмы Конфэрэнцыі ў цэлым? (Аднагалосна прымаецца). Якія хто мае ўнесьці дадаткі або зьмены? (Ня ўносіцца). Такім чынам, програма лічыцца прынятай.

ПРОТЭСТ СУПРОЦЬ ЗАБАРОНЫ ДЭЛЕГАТАМ АД ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ ВЫЕХАЦЬ НА КОНФЭРЭНЦЫЮ.

Старшыня: Слова для па-зачарговай заявы мае грам Езавітаў.

Езавітаў. Паважаныя грамадзяне! Учора з тэлеграм, агалошаных Прэзыдыумам Конфэрэнцыі, мы з сумам даведаліся аб тым, што ўрад Польскае Рэспублікі адмовіў навуковым беларускім сілам Заходняе Беларусі ў выдачы пашпартоў на выезд у Менск, і гэткім чынам пазбавіў нашых заходніх братоў магчымасьці прыняць удзел у Конфэрэнцыі, праца якой нязвычайна важная для нашай культуры.

Нас, прадстаўнікоў беларускае меншасьці з Латвіі, вельмі дзівяць гэткія незразумелыя адносіны польскага ўраду да беларускае культуры, і я, ад імя беларускіх дэлегатаў з Латвіі, прапаную паважанай Конфэрэнцыі з протэстам і жалем констатаваць гэты новы доказ нацыянальнага і культурнага уціску беларусаў пад польскай окупацыяй.

Старшыня: Слова для заявы мае грам. Ластоўскі.

Ластоўскі. Ад імя беларускіх дэлегатаў з Літвы заяўляю, што прадстаўнікі беларускай меншасьці ў Літве поўнасьцю далучаюцца да заявы грам. Езавітава.

Старшыня: Слова для заявы мае поэта Якуб Колас.

Якуб Колас. У той час, калі на чарзе нашага дня стаяць вельмі важныя задачы культурнага будаўніцтва, а ў нас яшчэ так мала культурных сіл, і кожны культурны працаўнік для нас так дараг, мы з вялікім жалем даведаліся ўчора, што нашы браты з Заходняе Беларусі не маглі прыехаць да нас, каб прыняць удзел у працах навуковае Конфэрэнцыі, не маглі прыехаць, бо іх улада не дала ім дазволу на прыезд у нашу Савецкую Беларусь, дзе куецца беларуская культура: новае, вольнае жыцьцё рабочых і сялян. Я прашу высокапаважаную Конфэрэнцыю паслаць прывітаньне культурным і

навуковым працаўніком Заходняе Беларусі і разам з намі выказаць жаль з прычыны таго, што польская ўлада не дала ім дазволу прыбыць на Навуковую Конфэрэнцыю. (Воплескі).

Старшыня: Для агалашэньня тэксту тэлеграмы слова мае т. Смоліч.

Смоліч. Прапаную паслаць наступны тэлеграфны адказ прадстаўнікам Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні і Таварыству Беларускай Школы ў Вільні:

„З пачуцьцём глыбокага суму заслухалі вашыя тэлеграмы аб забароне вам прыезду на нашае агульнае культурнае сьвята—Акадэмічную Конфэрэнцыю ў справе правапісу. Маем гонар давесьці да вашага ведама наступную пастанову Конфэрэнцыі, прынятую пасьля атрыманьня вашых тэлеграм: Конфэрэнцыя выражае глыбокі жаль, што ў яе працы ня могуць прыняць удзелу навуковыя і культурныя работнікі Заходняй Беларусі, прадстаўнікі Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні і Таварыства Беларускай Школы ў Вільні, якім урад Рэчы Паспалітай Польскай адмовіў у пашпартох. Конфэрэнцыя адзначае, што адсутнасьць вышэйпамянёных выдатных дзеячоў навукі і культуры беларускай адбіваецца адмоўна на працах Конфэрэнцыі. Конфэрэнцыя вельмі ўдзячна ім за іх прывітаньні і пажаданьні і з свайго боку засылае ім сваё шчырае братэрскае прывітаньне. (Бурныя воплескі. Тэлеграма прымаецца аднагалосна).

Сучасны стан вывучэньня беларускай мовы.

Старшыня: Слова для дакладу: „Сучасны стан вывучэньня беларускай мовы“ мае правадзейны член Інстытуту Беларускай Культуры С. М. Некрашэвіч.

Некрашэвіч: У сваім дакладзе я хачу зрабіць агляд сучаснай працы па вывучэньні беларускай мовы за апошнія 5-6 гадоў, и таксама даць пэрспэктывы гэтай працы ў бліжэйшыя гады.

Дасьледаваньне беларускай мовы пачалося ўжо даўно. Аднак, да зьяўленьня ў сьвет прац акад. Е. Ф. Карскага гэта дасьледаваньне насіць больш выпадковы, эпізодычны характар. І толькі Е. Ф. Карскі сваімі грунтоўнымі і ўсебаковымі працамі па дасьледаваньні беларускай мовы робіць цэлую эпоху ў справе вывучэньня беларускай мовы. Дзякуючы яго капітальным працам, беларуская мова высьвятляецца, як мова самастойнага значэньня, што жыве па сваіх асобных моўных законах і па свайму значэньню роўная вялікарускай і украінскай мовам. Праўда, у сваіх працах акад. Е. Карскі яшчэ прадаўжае называць беларускую мову „наречием русского языка“, разумеючы пад гэтым „языком“ агульную ўсходня-славянскую або рускую мову, але ўжо яго сучасьнікі (Шахматаў, Дурново і інш.), некаторыя, можа, і на аснове яго прац, уносяць больш яснасьці ў гэтае пытаньне і называюць беларускую мову не падмовай, „наречием“, а самастойнай мовай усходня-славянскай галіны моваў. Такім чынам, на аснове пераважна прац акад. Е. Карскага, беларуская мова выяўляецца ня як нейкі прыдатак да якойсьці іншай мовы, а як самастойная мова, якая павінна займаць сярод іншых славянскіх моваў роўнае месца.

Я нарачна застанавіўся на пытаньні аб самастойнасьці беларускай мовы, бо гэта пытаньне цесна зьвязана з беларускім культурна-нацыянальным рухам і з дзяржаўным жыцьцём нашага народу і нашай мовы.

За нашыя часы, усяго якіх 6 гадоў назад у жыцьці на-

шага народу адбылася надзвычайна важная гістарычная падзея,—гэта акт абвяшчэньня дзяржаўнасьці Беларусі. Гэты акт зьяўляецца ня толькі важным палітычным актам, але і ня менш важным актам у гісторыі нашай мовы, бо разам з дзяржаўнасьцю Беларусі абвешчана і дзяржаўнасьць беларускай мовы. Існаваўшая да гэтага часу беларуская мова, як мова народная, мужыцкая прызвана цяпер стаць мовай літаратурнай, мовай усяго беларускага грамадзянства. У зьвязку з гэтым, ад беларускай мовы патрабаваліся надзвычайныя высілкі, нябывалыя ў гісторыі разьвіцьця моваў іншых народаў. Беларуская літаратурная мова, зрабіўшыся дзяржаўнай мовай, мусіла адбіць усе здабыткі агульна-чалавечай культуры, усе тыя ідэі, што ў іншыя мовы пранікалі паступова, на працягу, можа, цэлых вякоў, і якія ў нашай мове адразу-ж павінны былі атрымаць сваё выражэньне.

А між тым, ня маючы генэтычнай сувязі з ранейшай дзяржаўнай беларускай мовай, мовай нашага старога пісьменства, бо гэткай сувязі не магло быць, з прычыны страты на працягу больш, чым двох вякоў беларускай дзяржаўнасьці і фактычнага заняпаду беларускай мовы,—наша літаратурная мова к часу абвяшчэньня яе мовай дзяржаўнай зьяўлялася яшчэ мала апрацаванай і яшчэ менш дасьледаванай. Калі раней і гаварылася аб дасьледаваньні нашай мовы, то тут мелася на ўвазе беларуская народная мова і старажытная мова нашых помнікаў. Сучасная беларуская літаратурная мова дасьледаваньнямі папярэдніх вучоных бадай што ня была закранута,—папершае, таму, што яна была занадта маладая, а таму яшчэ канчаткова несфармаваная, а. падругое, і таму, што гэта пытаньне наагул менш цікавіла вучоных.

Тут упамяну толькі аб аднэй вялікай гістарычнай важнасьці працы Б. Тарашкевіча: „Беларуская граматыка для школ“, у якой правільна вызначаны асноўныя законы беларускай літаратурнай мовы, і праз гэта намечаны шляхі яе далейшага разьвіцьця. Аднак, Б. Тарашкевіч, так таленавіта распачаўшы сваю працу па дасьледаваньні беларускай літаратурнай мовы, хутка яе закінуў, будучы адцягнуты палітычным бокам жыцьця беларускай краіны, і такім чынам к часу абвяшчэньня нашай мовы дзяржаўнай новых прац па яе дасьледаваньні не зьявілася.

Разам з тым, дзяржаўнасьць нашай літаратурнай мовы вымушала хуткага яе дасьледаваньня і апрацаваньня. Стаўшы прыладай мысьлі культурнага грамадзянства, наша мова мусіла быць настолькі апрацаванай, каб на ёй можна было выражаць усе самыя тонкія ўхілы нашай мысьлі, самыя дакладныя навуковыя разуменьні. Апошняга вымагала беларусізацыя нашага дзяржаўнага апарату, усіх культурна-асьветных установ і наагул культурнага жыцьця нашай дзяржавы.

І трэба сказаць, што ад гэтага часу наглядаецца надзвычайна цікавы процэс разьвіцьця беларускай мовы. Нашу мову цяпер апрацоўваюць ня толькі вучоныя, пісьменьнікі, але ўсё беларускае грамадзянства, усе тыя, хто гаворыць і піша пабеларуску. Наша літаратурная мова ў сэнсе свайго разьвіцьця за апошнія шэсьць год зрабіла вялікі крок наперад. Праўда, трэба заўважыць, што пры такім хуткім росьце нашай літаратурнай мовы часта з посьпеху ў яе склад уносіцца неўласьцівая ёй стыхія. Але пры сьвятле здаровай навуковай крытыкі ўсё, неўласьцівае для беларускай мовы, адпадае і адпадзе, і наша літаратурная мова апрацоўваецца, як адзіная, сталая і для ўсіх абавязковая мова. Асноўнае запатрабаваньне, якое ў нас ставіцца пры апрацаваньні беларускай літаратурнай мовы,—гэта блізасьць яе да мовы народнай. Нашым ідэалам зьяўляецца адзінства літаратурнай і народнай мовы, і мы спадзяемся, што гэтага адзінства дасягнем.

Гаворачы аб адзінай беларускай літаратурнай мове, трэба сказаць, што ў нас яшчэ дзе-ні-дзе наглядаюцца тэндэнцыі асобных ухілаў пры апрацаваньні нашай літаратурнай мовы, галоўным чынам, па-за межамі Савецкай Беларусі. Але мы спадзяемся, што шляхам конфэрэнцый, шляхам узаемных уступак мы пагодзім гэтыя ўхіленьні і выпрацуем беларускую літаратурную мову адну для ўсяго беларускага народу, у якой-бы дзяржаве ён ні жыў.

У сваім дакладзе я і хачу высьветліць тую працу па дасьледаваньні беларускай мовы, якая вядзецца ў нас у Савецкай Беларусі, галоўным чынам, Інстытутам Беларускай Культуры.

Вынікамі сваёй працы мы яшчэ не асабліва можам пахваліцца. У нас няма ні тоўстых многатомных прац, ні

шырокай пастаноўкі навукова-дасьледчай працы па мовазнаўству. Мы яшчэ толькі распачынаем сваю працу па мовазнаўству. Хоць першая навуковая організацыя па апрацаваньні беларускай мовы — Беларуская Навукова-Тэрмінолёгічная Камісія—узьнікла яшчэ ў 1921 г., аднак, з прычыны розных перашкод, нам удалося больш-менш солідна паставіць мовазнаўчую працу толькі з восені гэтага году. Цяпер у нас мовазнаўчую працу вядзе Аддзел Мовы і Літаратуры, які ўваходзіць у склад Інстытуту Беларускай Культуры і падзяляецца на пяць сталых камісій: Тэрмінолёгічную, Слоўнікавую, Правапісную, Фольклёрна-дыялектолёгічную і Літаратурную. З наступнага году Аддзел Мовы і Літаратуры мае 14 штатных супрацоўнікаў і належныя крэдыты для выданьня прац Аддзелу.

Але яшчэ да сформаваньня Аддзелу мовы і літаратуры, незалежна ад працы яго Камісій, мы маем некалькі мовазнаўчых прац, якія мусяць быць адмечанымі ў маім дакладзе.

Па агульнаму мовазнаўству мы маем толькі адну, нядаўна выданую нашым Дзяржаўным Выдавецтвам працу проф. П. Бузука: „Асноўныя пытаньні мовазнаўства“ (Менск, 1926 г.).

Узаемаадносіны беларускай мовы да літоўскай разглядаюцца акад. Е. Карскім у адносінах уплыву беларускай мовы на літоўскую ў яго працы: „Культурные завоевания русского языка в старину на западной окраине его области“ (Изв. Отд. Русск. яз. и слов., XXIX, 1925). Тое-ж пытаньне разглядаецца і ў працах б. проф. Ковенскага Унівэрсытэту Бугі, які даводзіць, што ўплывы беларускай мовы на літоўскую пачаліся яшчэ з VI в., і што, такім чынам, усе запазычаньні з славянскіх моваў літоўская мова набыла праз беларускую. Узаемаадносіны беларускай мовы да суседніх славянскіх моваў разглядаюцца ў працы П. Бузука: „Взаємовідносини між білоруською і українською мовами“ (Зап. Інст.-філол. Відд. Укр. Акад. Наук, т. VII—VIII) і ў дзьвюх рукапісных працах Л. Цьвяткова: „Беларускія элемэнты ў польскай мове“ і „Польскі элемэнт у беларускай мове“.

Трохі большы лік прац мы маем па вывучэньні гісторыі беларускай мовы. Тут перш за ўсё трэба ўказаць на каштоў-

ную працу проф. Растаргуева: „Белорусская речь в ее современном и прошлом состоянии“ (Курс Белоруссоведения, Москва, 1920). З беларускіх мовазнаўцаў па гісторыі нашай мовы працуе В. Воўк-Левановіч. Ім напісаны добрыя ўводзіны ў вывучэньне гісторыі нашай мовы: „Гістарычнае вывучэньне беларускай мовы ў славянскай філёлёгіі“ (Працы Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, 1925 г.). У зборніку, прысьвечаным Ф. Скарыне, друкуецца яго новая праца: „Мова Фр. Скарыны“. Апрача таго, ім напісаны курс гісторыі беларускае мовы, першая частка якога (фонэтыка) ужо здана ў друк. З іншых прац па гістарычным вывучэньні беларускай мовы адмечу цікавую працу Янкі Станкевіча: „Мова Аль-Кітаба“ (у рукапісу) і С. Некрашэвіча: „Васіль Цяпінскі. Яго прадмова, пераклад евангельля на беларускую мову і мова перакладу“ (у рукапісу). Заўважу між іншым, што ў апошняй працы аўтар, на аснове вывучэньня графікі евангельля, устанаўляе азначэньне Цяпінскім асобным значком ▮ рэдукаванага і нескладовага „у“. Мае дачыненьне да вывучэньня гісторыі беларускай мовы і праца Н. Дурново: „Очерк истории русского языка“ (Москва, 1921 г.), дзе адначасна разглядаюцца зьявы з гісторыі беларускай мовы.

Па вывучэньні сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў нас працуе пераважна Язэп Лёсік. У журнале „Полымя“ за 1924 і 1925 г. г. ім зьмешчаны „Увагі да беларускай літаратурнай мовы“, праца, як відаць, напісаная не без некаторага ўплыву аналёгічнае працы проф. А. Курылы: „Уваги до сучасноі украінськоі літературноі мови“. А. Лёсікам-жа, ня лічачы яго школьных граматык, напісаны, галоўным чынам, на аснове прац Е. Карскага, больш солідныя курсы: „Сынтакс беларускае мовы“ (Менск, 1925) і „Граматыка беларускае мовы (фонэтыка)“ (Менск, 1926 г.). Апошняя яго кніга вызвала досыць многа рэцэнзій, лепшымі з якіх трэба лічыць П. Бузука („Полымя“, 1926 г., № 3). Апрача прац Я. Лёсіка, многа дробных, але цікавых заметак аб сучаснай беларускай літаратурнай мове, аб сэмантыцы і этымолёгіі беларускіх слоў мы знаходзім у журнале „Крывіч“, што выходзіць у Коўне пад рэдакцыяй В. Ластоўскага. Тут яшчэ ўпамяну аб удалым „Курсе беларускай мовы“ А. Багдавіча, які знаходзіцца ў друку.

Тут-жа назаву і сваю дробную працу: „Правапіс спрэчных дзеяслоўных форм“ („Адраджэньне“, 1922), дзе, побач з правапісам, разглядающца і некаторыя формы літаратурнай мовы.

Аб вывучэньні мовы паасобных пісьменьнікаў мы маем дзьве невялікія працы П. Бузука. Адна з іх—„Галоўныя асаблівасьці мовы Цішкі Гартнага“ надрукавана ў „Полымі“ (№ 5 за 1926 г.), а другая—„Мова і правапіс Якуба Коласа“ друкуецца.

Наагул-жа, вывучэньне сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў нас яшчэ толькі пачынаецца. Працы для дасьледчыка тут яшчэ зашмат. У галіне морфолёгіі ў нас ёсьць ня мала паралельных і непатрэбных форм, у сынтаксе мы маем шмат неўласьцівых для беларускай мовы конструкцый пабудовы сказу. На наш сынтакс, на нашу лексыку яшчэ і цяпер моцна ўплываюць, з аднага боку, расійскі сынтакс і лексыка, а з другога боку—польскі. Тут патрэбна разьмежаваньне, выяўленьне свайго, што ўласьціва для беларускай мовы, патрэбны солідныя навуковыя працы.

Задачай заснаванай у нас сталай навукова-мовазнаўчай організацыі—Аддзелу мовы і літаратуры—і павінна зьявіцца ў першую чаргу вывучэньне і апрацаваньне нашай літаратурнай мовы.

Праца Аддзелу адбываецца пераважна ў яго Камісіях, да разгляду дзейнасьці якіх я і прыступаю.

З усіх Камісій Аддзелу найбольш першачарговае, як-бы баявое значэньне мае праца Тэрмінолёгічнай Камісіі. Каб уявіць сабе значэньне тэрмінолёгічнай працы для беларускай культуры, трэба сказаць, што за царскія часы беларускіх школ ня было, і, такім чынам, да рэволюцыі ні аб якой навуковай тэрмінолёгіі не магло быць і гутаркі, бо яна, зразумела, мала каму была патрэбна. Калі-ж пасьля рэволюцыі пачалі адчыняцца беларускія школы, то яны спаткаліся з надзвычайна вялікаю труднасьцю, якая перашкаджала, аднака, паставіць выкладаньне пабеларуску навуковых дысцыплін,—з адсутнасьцю беларускай навуковай тэрмінолёгіі. Патрэбна было даць навуковую тэрмінолёгію па кожнай галіне навукі, пачынаючы ад запатрабаваньняў пачатковай школы і канчаючы вышэйшай. Беларуская народная мова, як і ўсякая іншая народная мова, аказалася багатай словамі—

вобразамі, што ўваходзяць у зварот селяніна, і беднай словамі абстрактнага значэньня. Прымаючы пад увагу гэту асаблівасьць народнай мовы, будзе зразумела, што праца Камісіі была вельмі трудная. Сваіх слоў не хапала. Прыходзілася або рабіць запазычаньні з іншых моваў, або тварыць нэолёгізмы. Камісія ў сваёй працы застанавілася на прынцыпе менш уводзіць чужаземных слоў, замяняючы іх сваімі словамі, хоць, можа, і ня зусім дапасаванымі да таго ці іншага абстрактнага значэньня. Але Камісія была ўпэўнена, што словы народнай мовы з іх конкрэтным, рэальным значэньнем будуць лепш перадаваць навуковыя, абстрактныя разуменьні, чым словы чужаземнай мовы, што конкрэтныя словы народнай мовы будуць з часам набываць абстрактнае значэньне, і такім чынам, калі тое ці іншае слова сягодня яшчэ ня зусім падходзіць, то праз колькі гадоў яно зусім можа быць на месцы. Тэндэнцыя да замены чужаземнай стыхіі сваёю ня ёсьць толькі зьявішча беларускай культуры. Яна заўважваецца ў апошнія часы бадай ува ўсіх народаў, нават, у рускіх, у мову якіх „вышэйшым сьветам“, арыстократыяй XVIII і XIX в. в., было ўнесена вельмі многа чужаземнага элемэнту. Беларуская культура, разьвіваючыся ў асаблівых умовах, у ўмовах пролетарскай дзяржаўнасьці, калі ў грунт культурнага жыцьця кладзецца раўненьне на народную масу, зразумела, павінна вымагаць яшчэ большага паглыбленьня гэтай тэндэнцыі і самага асьцярожнага ўвядзеньня ў нашу мову чужаземшчыны. Гэта тым больш небясьпечна, што беларуская культура яшчэ да апошняга часу адчувае на сабе досыць моцныя ўплывы нашых суседніх народаў—рускіх і палякаў, у мове якіх вельмі многа чужаземнай стыхіі. Аднак, імкнучыся да замены чужаземных слоў па магчымасьці сваімі, Тэрмінолёгічная Камісія не аддзялялася якімсьці кітайскім мурам ад увядзеньня ў сваю мову міжнародных навуковых тэрмінаў па зоолёгіі, батаніцы, мэдыцыне і да т. п.; такіх тэрмінаў прынята ці мала.

Гаворачы аб конкрэтных выніках працы Тэрмінолёгічнай Камісіі, трэба сказаць, што ёй распрацаваны і надрукаваны 9 тэрмінолёгічных слоўнікаў па розных галінах навукі, галоўным чынам, выходзячы з запатрабаваньняў сярэдняй школы. Гэтыя 9 тэрмінолёгічных слоўнікаў зьмяшчаюць у сабе

11.641 слоў-тэрмінаў, 6 тэрмінолёгічных слоўнікаў, агульнаю колькасьцю каля 19.000 слоў-тэрмінаў, Камісіяй прынята, але яшчэ не надрукавана. Такім чынам, усяго Тэрмінолёгічнай Камісіяй прынята звыш 30.000 слоў. Апрача таго, запроектавана, але Тэрмінолёгічнай Камісіяй не разгледжана 3 тэрмінолёгічныя слоўнікі, агульнай колькасьцю 6.000 слоў. Тут варта таксама ўпамянуць аб адным тэрмінолёгічным слоўніку на 600 слоў-тэрмінаў, што быў выданы ў Коўне Душэўскім і Ластоўскім.

Праца Тэрмінолёгічнай Камісіі яшчэ далёка ня скончана. Чарговаю яе задачаю павінна быць апрацаваньне навуковай тэрмінолёгіі для патрэб нашых вышэйшых школ, для нашых савецкіх і дзяржаўных устаноў. Тэрмінолёгічная Камісія павінна ў сваёй працы цесна зьвязацца з нашай школай, з усімі тымі асобамі, якія цікавяцца тэрмінолёгічнай працай Камісіі і жадаюць прыняць у гэтай працы чынны ўдзел. А такіх асоб ёсьць ці мала. Разам з гэтым, Камісія павінна пераглядзець мэтоды сваёй працы, і, улічыўшы сваю пяцігадовую практыку, больш зьвярнуць увагі на атрыманьне тэрмінолёгічнага матар'ялу за дапамогай програм з народнай мовы. Камісія ў сваёй працы павінна цесна зьвязацца з Слоўнікавай Камісіяй і выкарыстоўваць багатыя матар'ялы апошняй Камісіі. Трэба наагул сказаць, што праца Тэрмінолёгічнай Камісіі ў цяперашні час куды лягчэй, чым гэта было некалькі гадоў таму назад. Цяпер на дапамогу ў працы Камісіі прыходзіць яе папярэдняя практыка і ранейшыя апрацаваныя матар'ялы, а галоўнае—вялікі лік асоб, якія сьвядома ці несьвядома прыймаюць удзел у тэрмінолёгічнай працы. Ня так даўно, праходзячы па Савецкай вуліцы, я бачыў беларускую шыльду, якая зьвярнула маю ўвагу цікавымі словамі-тэрмінамі з гандлёвай тэрмінолёгіі—„Продаж гуртам і ўраздроб". Слова „ўраздроб" дакладна перадае рускае „в розницу". Такіх цікавых слоў ці мала творыць штодзенная практыка беларусізацыі нашых устаноў. Трэба толькі ўмець гэткія словы вышукоўваць. Дзеля гэтага Тэрмінолёгічная Камісія павінна, разам са Слоўнікавай Камісіяй, сачыць за разьвіцьцём нашай мовы і ўсё новае, цікавае выкарыстоўваць для сваіх мэтаў.

Скажу некалькі слоў аб прынятай тэрмінолёгіі. У наву-

ковай крытыцы ўказвалася на некаторую штучнасьць нашай тэрмінолёгіі, часта на недакладнасьць і неадпаведнасьць беларускіх слоў адпаведным рускім словам-тэрмінам. З крытыкаю ў большасьці прыходзіцца згадзіцца. У нашай тэрмінолёгіі запраўды ёсьць яшчэ ня мала штучнага, выдуманага, якое з часам адпадзе і будзе заменена больш дакладнымі і трапнымі словамі. Неапрацаванасьць некаторых тэрмінолёгій трэба прыпісаць занадта вялікай сьпешнасьці, з якою яна прымалася. Чарговаю задачаю Тэрмінолёгічнай Камісіі павінна зьявіцца паверка, рэвізія раней прынятай тэрмінолёгіі. Паколькі апошняя тэрмінолёгія ўвайшла ўжо ў школу, то за дапамогаю адпаведных спэцыялістаў такую паверку можна будзе наладзіць і лёгка і поўна.

У цеснай сувязі з працай Тэрмінолёгічнай Камісіі стаіць Камісія па ўкладаньні слоўніка жывой беларускай мовы, організаваная ў сярэдзіне 1925 г. Да гэтага часу слоўнікавая праца ў нас вялася па ўкладаньні слоўнікаў больш практычнага тыпу. К пачатку дзейнасьці Слоўнікавай Камісіі ўжо былі ў рукапісах два слоўнікі: С. Некрашэвіча і М. Байкова: „Расійска-беларускі слоўнік“ (каля 60.000 слоў) і іх-жа: „Беларуска-расійскі слоўнік“ (каля 30.000 слоў). Першы слоўнік яшчэ друкуецца, а другі праз колькі дзён выходзіць з друку. Тут трэба яшчэ сказаць аб даволі аб‘ёмістым, але ня зусім удалым з прычыны багацьця нэолёгізмаў і рэдкіх, неапраўданых провінцыялізмаў, расійска-крыўскім (беларускім) слоўніку В. Ластоўскага, які вышаў у Коўне ў 1924 г. Разгляд апошняга слоўніка мною зроблены ў „Полымі“ за 1925 г., № 2. Таксама ўпамяну аб невялікім расійска-беларускім слоўніку М. Байкова і М. Гарэцкага, які ўжо вышаў у 1926 г. паўторным выданьнем.

Камісія па ўкладаньні слоўніка, задаўшыся мэтай улажыць па магчымасьці поўны слоўнік жывой беларускай мовы, прыняла ў аснову сваёй працы запіску аб укладаньні слоўніка С. Некрашэвіча: „Да пытаньня аб укладаньні слоўніка жывой беларускай мовы“. Згодна высунутым у запісцы прынцыпам, слоўнік павінен адбіць як народную, гэтак і літаратурную беларускую мову. Прыймаючы пад увагу, што беларуская літаратурная мова адносна яшчэ мала апрацаваная, Камісія пастанавіла перавагу ў слоўніку аддаць народнай

мове, выкарыстаўшы пры гэтым усе ранейшыя як друкаваныя, так і рукапісныя матар'ялы, і шырака організаваўшы зьбіраньне слоў з жывой народнай мовы.

Што да тэрыторыі, якую павінен абхапіць слоўнік, то мова ўсёй этнографічнай Беларусі павінна знайсьці ў слоўніку сваё месца. Значыць, Камісія не абмежавалася для свайго слоўніка толькі тэрыторыяй Савецкай Беларусі, а пастанавіла распачаць зьбіраньне слоўнага матар'ялу з усёй этнографічнай Беларусі, бо толькі пры гэтых умовах, адбіваючы ўсе беларускія гутаркі, слоўнік мог зьявіцца агульным для ўсяго беларускага народу.

Перад Камісіяй яшчэ стаяла цікавае пытаньне, які пэрыод часу павінен абхапіць слоўнік беларускай мовы. Але паколькі ў задачы Камісіі ўваходзіла ўлажыць слоўнік жывой беларускай мовы, то зразумела, што гэткім пэрыодам павінен быць увесь XIX век і першая чвэртка нашага веку,— гэта значыць, ад часу так званага несьвядомага адраджэньня аж да нашых дзён. Больш раньняга часу, каб не парушыць прынцыпу, Камісія не магла захапіць, хоць, бязумоўна, і ў больш раньніх помніках нашага пісьменства знайшлося-б ня мала каштоўнага матар'ялу для слоўніка жывой беларускай мовы. Але гэты матар'ял застаўлены для гістарычнага слоўніка, аб якім гутарка будзе пасьля.

Як вышэй гаварылася, Камісія ў грунт укладаньня слоўніка палажыла народную мову. Аднак, і літаратурная беларуская мова павінна быць поўнасьцю, за вызначаны пэрыод часу, унесена ў слоўнік. Такім чынам, мова прыгожага пісьменства, мова навуковых выданьняў, падручнікаў, пэрыодычнага друку і інш. выкарыстоўваецца намі, як матар'ял, для слоўніка. Аддаючы перавагу з літаратурных крыніц мове прыгожага пісьменства, Камісія ў мэтах паўнаты слоў з літаратурнай мовы застанавілася на прынцыпе ўкладаньня слоўнікаў паасобных пісьменьнікаў. Зразумела, што падобныя слоўнікі ўкладаюцца не для ўсіх пісьменьнікаў, а толькі для найбольш важных, якія заставілі значны сьлед у нашай літаратуры, як Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны, Багушэвіч і інш. Усяго такіх слоўнікаў паасобных пісьменьнікаў уложана 11. Дробныя пісьменьнікі групаваліся па тым ці іншым прынцыпе па некалькі разам, і для іх састаўляўся

агульны слоўнік. З некаторых пісьменьнікаў, але больш з мовы навуковай, падручнікаў і інш., словы выпісваюцца шляхам выбаркі.

Справа выкарыстаньня для слоўніка крыніцы літаратурнай мовы даволі простая, і мы тут выкарыстаем усё, што для слоўніка будзе прадстаўляць цікавасьць.

Больш складаная справа стаіць з выкарыстаньнем другой крыніцы—народнай мовы. Этнографічныя запісы, розныя слоўнікі народнай мовы, як Насовіча, Дабравольскага і рукапісныя: Шпілеўскага, Мядзьведзкага, вядома, могуць быць выкарыстаны, як агульны літаратурны матар'ял. Але нас больш цікавіць зьбіраньне слоўнага матар'ялу з жывой народнай мовы. Як-жа сабраць гэты матар'ял? Як арганізаваць гэтую справу, каб атрымаць магчыма больш і магчыма поўны матар'ял? Дзеля гэтай мэты Камісія застанавілася на двох спосабах: 1) рассылкі асобных інструкцый для зьбіраньня слоўнікава-тэрмінолёгічнага матар'ялу, надрукаваных пабеларуску ў ліку 8.000 экз. і парасійску ў ліку 1.000 экз., і 2) за дапамогай укладаньня краёвых слоўнікаў. Такім чынам, у зборы слоўнікавага матар'ялу з народнай мовы мы наладзілі як-бы падвойнае сіта. Тое, што можа не папасьці ў Камісію за дапамогаю інструкцый, павінна быць сабрана шляхам укладаньня краёвых слоўнікаў. Паколькі-ж за ўкладаньне краёвых слоўнікаў узяліся такія солідныя організацыі, як Акруговыя Краязнаўчыя Таварыствы, мы мелі пэўнасьць, што наш другі спосаб зьбіраньня слоўнага матар'ялу такі-ж рэальны і практычны, як і першы. Год працы Слоўнікавай Камісіі пераканаў нас у гэтым. Па першапачатковаму пляну Камісіі мелася на ўвазе ўлажыць 16 беларускіх краёвых слоўнікаў: 10 адпаведна ліку акруг для Савецкай Беларусі, 3 для Заходняй Беларусі і 3 для Гомельшчыны, Смаленшчыны і Пскоўшчыны. Зразумела, што ўсіх краёвых слоўнікаў мы друкаваць ня зьбіраліся. Мы мелі на ўвазе выдрукаваць з іх толькі лепш уложаныя і найбольш тыповыя. Рэшта краёвых слоўнікаў павінна быць выкарыстана Камісіяй, як матар'ял пры ўкладаньні слоўніка жывой беларускай мовы.

З народнай мовы мы зьбіраем і маем на ўвазе ўнесьці ў наш слоўнік усе словы, якія можна пачуць з народных

вуснаў. Выключэньнем зьяўляецца толькі географічная номэнклятура і ўласныя іменьні, якія павінны ўвайсьці ў асобныя слоўнікі.

Сабраны матар'ял праходзіць папярэднюю рэдакцыю Камісіі. Непатрэбнае адкідаецца. Разам з гэтым ідзе інструктаваньне дапішчыкаў, якім указваецца на хібы іх працы.

Калі ўвесь слоўны матар'ял як з літаратурнай, гэтак і з народнай мовы будзе сабраны, а гэта можа быць не раней, як праз год-два,—Камісія прыступіць да рэдагаваньня слоўніка і выданьня яго асобнымі выпускамі.

Слоўнік намечана даць у беларускім выглядзе, дзеля гэтага ўсе тлумачэньні слоў мусяць быць дадзены толькі пабеларуску. Тлумачэньне слоў—справа наагул вельмі трудная для лексыколёга, а пабеларуску тым больш, але Камісія спадзяецца, што яна справіцца з гэтаю труднасьцю і дасьць беларускаму грамадзянству такі-ж слоўнік, які маюць і іншыя культурныя народы.

Зазначыўшы ў агульных рысах прынцыпы ўкладаньня слоўніка беларускай мовы, перайду цяпер да азнаямленьня з конкрэтнымі вынікамі паўтарагадовай працы Слоўнікавай Камісіі. К цяперашняму часу Слоўнікавая Камісія налічвае: а) да 80.000 слоў-картак з мовы прыгожага пісьменства; б) звыш 50.000 картак-слоў, узятых з ранейшых беларускіх слоўнікаў; в) 10.000 картак-слоў, узятых з іншых крыніц літаратурнай мовы. Усяго, такім чынам, з літаратурнай мовы сабрана 140.000 картак-слоў. Праца па выбарцы слоў з літаратурнай мовы яшчэ ня скончана. Спадзяемся, што праз год мы давядзем яе да канца.

Трохі горш у нас справа стаіць з зьбіраньнем слоў з народнай мовы. Праўда, што датыча Савецкай Беларусі, то мы тут маем бязумоўны посьпех. Намі сабрана з гэтай тэрыторыі звыш 70.000 слоў. Апрача таго, краязнаўчыя таварыствы, якія па нашаму заданьню зьбіраюць словы народнай мовы для краёвых слоўнікаў, маюць каля 50.000 слоў. Ня прысланы нам яшчэ сабраныя матар'ялы і паасобнымі корэспондэнтамі-зьбіральнікамі. А між тым некаторыя з гэтых корэспондэнтаў сабралі больш, чым па 10.000 слоў. Такім чынам, каб палічыць усе словы, што собраны на тэрыторыі

Савецкай Беларусі, то іх набярэцца звыш 120.000, а з словамі літаратурнай мовы—звыш 260.000 слоў. Некаторыя з краязнаўчых таварыстваў праявілі вялікую актыўнасьць у зьбіраньні слоў з народнай мовы. Назаву Віцебскае Акруговае Краязнаўчае Т-ва, Аршанскае, Магілеўскае. Але асабліва многа зрабіла Віцебскае Т-ва, якое ўжо друкуе Віцебскі краёвы слоўнік Касьпяровіча. Слоўнік друкуецца пад рэдакцыяй Слоўнікавай Камісіі.

З Гомельшчыны, Смаленшчыны і Пскоўшчыны мы параўнаўча мала атрымалі слоў з народнай мовы. Тлумачыцца гэта тым, што наладзіць сувязь з імі даволі цяжка. У нас трохі большая сувязь маецца з Гомельшчынай, адкуль мы атрымалі да 5.000 слоў з народнай мовы. Са Смаленшчыны слоў зусім не паступала. Затое мы тут маем, апрача слоўніка Дабравольскага, новы складзены слоўнік Агейчыка, праўда, ня зусім навукова ўложаны. З Пскоўшчынай (б. часткай Віцебскай губ.) сувязь у нас зусім слабая, а таму адтуль таксама слоўнікавага матар'ялу не атрымана.

Але вельмі прыходзіцца шкадаваць, што нам так доўга не ўдаецца зьвязацца з Заходняю Беларусьсю і наладзіць там зьбіраньне слоўнікавага матар'ялу. Гэта тым больш важна, што заходнія гутаркі менш падупадалі расійскаму ўплыву, а таму ў большай чыстаце захавалі сваю беларускую лексыку. На гэтай Конфэрэнцыі мы мусім канчаткова дагаварыцца з тымі прадстаўнікамі Заходняй Беларусі, якія тут прысутнічаюць, і організаваць там такую-ж працу па зьбіраньні слоўнікавага матар'ялу, якая вядзецца ў нас, у Савецкай Беларусі. Зрабіць гэта неабходна, бо без Заходняй Беларусі наш беларускі слоўнік будзе няпоўны.

З свайго боку, мы ў наступным годзе маем на ўвазе, можа, шляхам командыровак, распачаць больш актыўную працу па зьбіраньні слоўнікава-народнага матар'ялу. У нашай слоўнікавай працы трэба памятаць, што слоўнік—такое навуковае прадпрыемства, якое ня робіцца кожны год. Зьяўляючыся раз на працягу некалькіх дзесяткаў гадоў, слоўнік, каб ён быў агульны для ўсяго беларускага народу, павінен адбіць і ўсю яго лексыку.

Камісія па ўкладаньні слоўніка жывой беларускай мовы зацікаўлена ў апрацаваньні і другога тыпу слоўніка—больш

поўнага расійска-беларускага слоўніка, які-б зьявіўся дадаткам і пашырэньнем расійска-беларускага слоўніка С. Некрашэвіча і М. Байкова. Гэты слоўнік павінен мець больш практычнае значэньне і па ўзоры сваім мусіць нагадваць „Росийсько-український словник“ Украінскай Акадэміі Навук. Выданьне такога слоўніка, у зьвязку з беларусізацыяй нашага культурнага жыцьця, ня толькі сваячасова, але і проста неабходна. Для гэтага слоўніка мы маем на ўвазе выкарыстаць увесь той багаты матар‘ял, які знаходзіцца ў Слоўнікавай Камісіі, і ўвясьці ў яго часткова тэрмінолёгію. Слоўнік павінен рэдагавацца не аддзельнай асобай, а ўсёй Слоўнікавай Камісіяй. Падгатоўчую працу па гэтым слоўніку мы зьбіраемся распачаць з наступнага году.

Ня менш цікавым пытаньнем для нашага культурнага жыцьця павінна зьявіцца ўкладаньне гістарычнага слоўніка беларускай мовы. Апрача свайго чыста навуковага значэньня, гэты слоўнік у нашых умовах апрацаваньня беларускай мовы будзе мець і не малое практычнае значэньне. Пытаньне аб укладаньні гістарычнага слоўніка беларускай мовы абгаворвалася ў Слоўнікавай Камісіі ўжо колькі разоў і на адным з апошніх пасяджэньняў Аддзелу мовы і літаратуры пастаноўлена прыступіць к яго апрацаваньню. Проект аб прынцыпах укладаньня гэтага слоўніка даручана апрацаваць супрацоўніку Аддзелу Л. Цьвяткову. Працу па складаньні слоўніка маем на ўвазе распачаць з наступнага году. Па нашай думцы, гістарычны слоўнік беларускае мовы павінен адбіць мову помнікаў нашага старажытнага пісьменства ня ўсіх, што пісаліся або друкаваліся на тэрыторыі Беларусі, а толькі *беларускіх*. У гэтым будзе значная розьніца нашага слоўніка ад гістарычнага слоўніка Срезневск'ага і такога-ж слоўніка Украінскай Акадэміі Навук пад рэдакцыяй проф. Тімченко.

У зьвязку з укладаньнем гістарычнага слоўніка беларускай мовы зьяўляецца надзвычайна важнае пытаньне аб устанаўленьні таго сьпісу старажытных рукапісных і друкаваных матар‘ялаў, якія павінны быць выкарыстаны для нашага гістарычнага слоўніка. Устанаўленьне сьпісу, само сабой зразумела, закране другое вельмі важнае пытаньне— выяўленьне помнікаў нашага старажытнага пісьменства. Хоць

у гэтай галіне многа працаваў акад. Е. Карскі (Белорусы, т. I і II, ч. II, „К обзору звуков и форм белорусской речи“, „Западно-русские переводы псалтири“ і інш. яго працы) і шмат другіх вучоных, аднак, і тут яшчэ працы для дасьледчыка засталося ня мала. Сашлюся хоць-бы на тыя беларускія рукапісы, што знаходзяцца ў беларускіх музэях і бібліотэках, і якія яшчэ невядомы вучонаму сьвету. Задачу па выяўленьні беларускіх старадрукаў і рукапісных помнікаў старога пісьменства ўзяў на сябе ў сваёй соліднай працы „Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі“ (Коўна, 1926 г.) В. Ластоўскі. Аднак, са сваёй задачай ён ня зусім справіўся, хоць наагул трэба сказаць, што аднаму чалавеку пры адсутнасьці папярэдняй дасьледчай працы аб асобных помніках ня толькі цяжка, але проста і немагчыма з гэтым справіцца. Хібы працы В. Ластоўскага мною паказаны ў рэцэнзіі, зьмешчанай у журнале „Асьвета“, і Шлюбскім у журнале „Полымя“ за бягучы год. Цяпер нашай чарговай задачай павінна зьявіцца дасьледаваньне рукапісных і старадрукаваных помнікаў, пераважна тых, што знаходзяцца ў нашых музэях, бібліотэках і архівах, улажэньне іх каталёгу і, самае галоўнае,—крытычнае выяўленьне беларускіх старадрукаў і рукапісных помнікаў нашага пісьменства, разьмежаваньне іх з расійскімі і украінскімі помнікамі пісьменства і навуковае выданьне гэтых прац.

Пераходжу да разгляду працы Правапіснай Камісіі. Пытаньнямі правапісу, апрача Б. Тарашкевіча, і ў Вільні Я. Станкевіча, у нас, галоўным чынам, займаўся Язэп Лёсік. Ён напісаў некалькі школьных падручнікаў па правапісу, разглядаліся пытаньні правапісу і ў яго школьных граматыках. Апрача таго, Язэп Лёсік выступаў у журналах з артыкуламі і па асобных пытаньнях правапісу. З гэтага роду яго прац назаву „Неўстаноўленыя выпадкі нашага правапісу“ ў журнале „Полымя“ за 1924 г., у адказ на якую працу ў „Запісках“ Інбелкульту зьмешчаны мой артыкул: „Да артыкулу Я. Лёсіка—„Неўстаноўленыя выпадкі нашага правапісу“ і ў „Полымі“ А. Багдановіча: „Да пытаньня аб неўстаноўленых выпадках нашага правапісу“ (Полымя, 1925 г.). З ранейшых прац па правапісу заслугоўваюць увагі журнальныя рэцэнзіі, галоўным чынам, на граматыку Я. Лёсіка, у якіх можна спаткаць ня мала цікавых заметак аб правапісу. Але асаблі-

вае ажыўленьне правапісныя пытаньні знаходзяць у бягучым годзе. Паколькі пытаньні правапісу зьяўляюцца кардынальнымі на нашай Конфэрэнцыі, я коратка спынюся на бліжэйшай гісторыі нашага правапісу. Да 1918 г. ў нас цьвёрда ўстаноўленага правапісу ня было. Законапаложнікам нашага правапісу, бацькам яго, лічыцца Б. Тарашкевіч, які ў сваёй школьнай граматыцы даў і асноўныя правілы нашага правапісу.

Правапіс Б. Тарашкевіча больш-менш цьвёрда трымаўся да 1925 г. Праўда, тут былі некаторыя ўхіленьні, напр., у правапісе чужаземных слоў. Наша газ. „Савецкая Беларусь“ і некаторыя загранічныя беларускія выдавецтвы ненаціскное (бязударнае) „о“ чужаземных слоў увесь час перадавалі пабеларуску праз „а“,—усё роўна, ці ўвайшлі гэтыя чужаземныя словы ў народную мову, ці яны зьяўляюцца кніжнымі. Аднак, калі гэтае ўхіленьне ў правапісе чужаземных слоў, у мэтах прастаты, мной, М. Байковым і М. Гарэцкім было ўведзена ў слоўнікі і, такім чынам, атрымлівала ўжо некаторае ўзаканеньне, то тут адчыніліся досыць гарачыя спрэчкі.

Асабліва вострым праціўнікам прынцыпу пашырэньня аканьня на чужаземныя словы быў Язэп Лёсік. У рэзультаце ўсіх па гэтым пытаньні дыскусій справа паступіла на вырашэньне Навуковай Рады Інбелкульту. Навуковая Рада Інбелкульту не захацела парушаць прынцыпаў правапісу Б. Тарашкевіча і ўтварыла, па пропозыцыі Я. Лёсіка, асобную Правапісную Камісію, якой даручыла ўлажыць слоўнік чужаземных слоў, дзе-б ненаціскное „о“ пісалася праз „а“. У адказ на пастанову Навуковай Рады, я ў журнале „Полымя“ (1925 г. № 5) зьмесьціў артыкул „Аб пашырэньні аканьня на чужаземныя словы“. Між тым Камісія, старшынёй якой зьяўляўся Я. Лёсік, хутка праканалася, што свайго заданьня яна ня выпаўніць, бо ніякага крытэрыю аб тым, якое чужаземнае слова зьяўляецца народным, а якое—кніжным, быць ня можа. Камісія сваю працу спыніла. Неўзабаве пасьля гэтага Я. Лёсік, супольна са сваім братам Антонам, выступае з проектам поўнага аканьня ў нашым правапісе. Паколькі Я. Лёсік разьвіваў досыць вялікую агітацыю за свой прынцып правапісу, то Навуковая Рада Інбелкульту, у мэтах

адзінства правапісу, пастанавіла стварыць новую Правапісную Камісію пад старшынством навуковага сэкратара Інбелкультү А. Цьвікевіча, якая мусіла разглядзець проект бр. Лёсікаў і прыйсьці да тэй ці іншай згоды. У адказ на проект бр. Лёсікаў: „Да рэформы беларускага правапісу“ выступілі з сваімі ўвагамі аб правапісе: А. Багдановіч — „Увагі да проекту аб рэформе правапісу Я. і А. Лёсікаў“, П. Бузук—„Некаторыя непаразуменьні ў спрэчках аб рэформе беларускага правапісу“, Язэп Воўк-Левановіч—„Да пытаньня аб аканьні ў беларускім правапісе“ і яго-ж—„Беларускае аканьне“. Усе пералічаныя ўвагі выданы асобнымі выпускамі. Антон Лёсік, у дадатак да супольнай з Я. Лёсікам брошуры аб рэформе правапісу, выдаў яшчэ больш пашыраную сваю популярную брошуру—„Да рэформы беларускага правапісу“. Аднак, Правапісная Камісія ў выніках сваёй працы да згоды ня прышла. Тады Навуковая Рада Інбелкультү пастанавіла склікаць па рэформе правапісу Конфэрэнцыю, якая-б дала асноўны кірунак у правапіснай працы. Асабісты мой погляд, што Конфэрэнцыю была склікаць рана, бо спрэчныя пытаньні правапісу ў нас яшчэ не належна распрацаваны.

У сувязі з пытаньнем правапісу ў нас стаіць і пытаньне аб рэформе нашай азбукі. Першы даклад аб рэформе азбукі быў прачытаны Я. Лёсікам яшчэ ў 1923 г. і спачатку друкаваўся ў газ. „Савецкая Беларусь“, пасьля асобнай брошурай. У пачатку гэтага году аб рэформе нашага правапісу чытаў даклад і проф. Растаргуеў. Рэформа нашай графікі ў некаторых сваіх часьцях ужо насьпела, і трэба спадзявацца, што Конфэрэнцыя скажа па гэтым пытаньні сваё аўторытэтнае слова.

Аднэй з найбольш цікавых галін мовазнаўчай працы зьяўляецца праца Фольклёрна-Дыялектолёгічнай Камісіі. Камісія гэта організавана толькі ўвосені бягучага году, а таму, зразумела, вынікаў сваёй працы яшчэ даць ня можа.

Фольклёрна-дыялектолёгічная праца за апошнія гады ў нас вялася асобнымі дасьледчыкамі. У 1924 г. для дасьледаваньня ўсходніх беларускіх гутарак Калінінскай акругі быў камандыраваны А. Сяржпутоўскі. Праца яго аб гэтых гутарках з друку яшчэ ня вышла. Найбольш шчасьлівы для дыялектолёгічнай працы быў бягучы год. Селета былі коман-

дыраваны для дасьледаваньня народных гутарак і запісу памятак народнай творчасьці І. Сербаў і П. Бузук у паўднёвыя паветы Пскоўшчыны і А. Сяржпутоўскі ў паўночныя беларускія паветы б. Чарнігаўскай губ. Апрача таго, П. Бузук гэтым летам дасьледаваў яшчэ гутаркі б. Менскай губ. Матар'ялы досьледаў зараз друкуюцца. Адначасна з гэтым, у бягучым годзе ў Інбелкульт паступіла каштоўная праца аб беларуска-северскіх гутарках проф. Растаргуева, праца Палявога аб гутарцы „Літвіноў Ноўгарад-Северскага павету“ і популярная праца аб северскіх гутарках проф. Растаргуева. Апошнія дзьве з гэтых прац ужо вышлі з друку, а першая друкуецца. Тут не магу не ўпамянуць каштоўнай працы аб северскай беларускай гутарцы проф. А. Курылы: „Говор села Хоробричив б. Городнянського пов. Чернігівськїй губ.“ Праца выдана на украінскай мове ў 1924 г. Разгляд яе зроблены Арасімовіч (журнал „Полымя“ за 1925 г., № 8). З іншых прац па дасьледаваньні беларускіх гутарак назаву працу Н. Дурново: „Диалектологические разыскания в области великорусских говоров“, дзе разглядаецца, між іншым, і пытаньне аб беларускім аканьні (вып. I і II, 1918), а таксама „Русскую диалектологію“ Е. Карскага, дзе, побач з расійскай дыялектолёгіяй, разглядаецца і беларуская (Ленінград, 1924). З організацыяй асобнай Фольклёрна-Дыялектолёгічнай Камісіі трэба спадзявацца, што праца па дасьледаваньні нашых гутарак яшчэ больш ажыве. За шырокую інтэнсыўную працу па дасьледаваньні беларускіх гутарак нас прымушае факт хуткага сьціраньня іх асаблівасьцяй. Русіфікацыя Ўсходняй Беларусі і полёнізацыя Заходняй можа яшчэ ня так страшны ў гэтым сэнсе, як беларусізацыя Савецкай Беларусі. Блізасьць беларускай літаратурнай мовы да народнай пры ўвядзеньні ўсеагульнага навучаньня зьявіцца прычынай самага хуткага зьніканьня асаблівасьцяй нашых гаворак. Для зьбіраньня дыялектолёгічнага матар'ялу ў першую чаргу трэба надрукаваць програму па вывучэньні нашых дыялектаў, проект якой ужо складзены, і разаслаць яе па ўсіх краязнаўчых організацыях і школах. Хоць дыялектолёгічная програма ўжо і друкавалася Расійскай Акадэміяй Навук, аднак, мы лічым патрэбным яшчэ раз выдаць падобную програму, бо, папершае, Акадэмія Навук па сваёй програме сабрала параўнаўча

мала адказаў, усяго 43; мы-ж, маючы густую сетку краязнаўчых організацый, маючы ўжо выяўленых корэспондэнтаў па працы ў Слоўнікавай Камісіі, спадзяемся атрымаць адказаў больш лікам і лепшых па зьместу; падругое, матар'ялы, сабраныя Акадэміяй Навук, хаваюцца ў яе, але нам цікава мець для пастаянных нашых досьледаў гэтыя матар'ялы ў сябе. Апрача таго, сабраныя адказы самі па сабе будуць зьяўляцца каштоўнейшымі гістарычнымі помнікамі для ўсіх тых дасьледчыкаў, якія пасьля будуць вывучаць беларускую мову.

Зразумела, што паранейшаму, для дыялектолёгічных досьледаў і паверкі атрыманых шляхам праграм матар'ялаў будуць організавацца з дыялектолёгічнымі мэтамі і навуковыя командыроўкі. Па меры таго, як будзе зьбірацца матар'ял, яго трэба навукова апрацоўваць. Між іншым, у задачы навуковага апрацаваньня ўваходзіць складаньне асобных дыялектолёгічных мапаў (карт), у якіх будуць прасочаны граніцы пашырэньня паасобных зьяў (фонэтычных і морфолёгічных) нашай мовы.

Застанаўлюся на зьбіраньні фольклёру. У спадчыну ад ранейшых этнографаў Камісіі дасталося многа фольклёрнага матар'ялу. Мы маем пяць томаў „Белорусского сборника" народнай творчасьці Е. Раманава. Зборнік прадстаўляе запісы ў розных месцах Беларусі песень, казак, прыказак і т. п., запісаных яшчэ ў дарэволюцыйныя часы. Зборнікі Раманава паступілі ў Інбелькульт ад Усесаюзнай Акадэміі Навук. Усяго ў зборніках Раманава зьмяшчаецца матар'ялу на 45—50 друкаваных аркушаў. У нас таксама ёсьць запісы народнай творчасьці А. Сяржпутоўскага па паўднёвай Беларусі, галоўным чынам, па Мазырскай, Бабруйскай і Слуцкай акругах. З дыялектолёгічнага боку і з боку зьместу гэта лепшыя матар'ялы, якія знаходзяцца ў Камісіі. Усяго матар'ялаў А. Сяржпутоўскага набіраецца да 70 аркушаў. Частка іх, каля 20 друкаваных аркушаў, зараз друкуецца і хутка выйдзе ў сьвет.

З іншых матар'ялаў Камісіі заслугоўваюць увагі запісы па б. Віцебскай губ. А. Шлюбскага: „Творчасьць крывічоў", агульным лікам, прыблізна, на 50 друкаваных аркушаў; матар'ялы запісаў І. Сербава на 20 друкаваных аркушаў, Доўнар-Запольскага на 15 аркушаў і інш.

У бягучым годзе Літаратурная Камісія апрацавала „Програму зьбіраньня вуснае народнае творчасьці“ і разаслала яе па ўсіх краязнаўчых організацыях Беларусі. У адказ на гэтую програму ўжо паступіла шмат рознастайнага матар‘ялу па народнай творчасьці, агульным лікам звыш 60 друкаваных аркушаў.

Такім чынам, Фольклёрна-Дыялектолёгічная Камісія мае цяпер матар‘ялу па беларускай народнай творчасьці ня менш, чым на 265 друкаваных аркушаў.

Побач з гэтым, варта спыніцца на матар‘ялах па беларускай народнай творчасьці, што знаходзяцца ў Ленінградзе ў бібліотэцы „Русского Географического Общества“. Адных толькі збораў матар‘ялаў у „Обществе“ налічваецца да 60. Цяпер, па заданьні Інбелкульту, гэтыя матар‘ялы выкарыстоўваюцца супрацоўніцай Ленінградзкага Унівэрсытэту Арасімовіч для слоўніка жывой беларускай мовы і адначасна з гэтым цікавейшыя з іх апрацоўваюцца для друку.

Не магу тут не ўпамянуць аб этнографічных матар‘ялах нябожчыка Федароўскага па Заходняй Беларусі. Матар‘ялы гэтыя, разьлічаныя, прыблізна, на 9 томаў, знаходзяцца ў Варшаўскім Навуковым Таварыстве. IV том матар‘ялаў— „Беларускія прыказкі“—рыхтуецца да друку. Зараз Інбелкульт вядзе перамаўленьне з Варшаўскім Навуковым Таварыствам адносна выкарыстаньня гэтых матар‘ялаў для слоўніка жывой беларускай мовы і для друку.

Навуковых прац па вывучэньні беларускага фольклёру за апошнія гады ў друку бадай не зьяўлялася. Назаву толькі невялікую працу на польскай мове Голомбэка: „Dziady białoruskie“ (Warszawa, 1925).

Чарговай задачай працы Фольклёрна-Дыялектолёгічнай Камісіі ў галіне фольклёру зьяўляецца кіраваньне працаю супрацоўнікаў Камісіі і навуковая апрацоўка для друку матар‘ялаў Камісіі.

Гаворачы аб працы Фольклёрна-Дыялектолёгічнай Камісіі, трэба, разам з гэтым, узьняць пытаньне аб пастаноўцы гэтай працы, падобна таму, як і працы Камісіі па ўкладаньні слоўніка жывой беларускай мовы, ва ўсебеларускім маштабе.

Пераходжу ўрэшце да разгляду працы Літаратурнай

Камісіі. Літаратурная Камісія арганізавалася паўтара гады таму назад. Галоўнай задачай яе, апрача агульна-дасьледчай працы па літаратуры, зьяўляецца навуковае апрацаваньне і падрыхтоўка да друку твораў беларускіх пісьменьнікаў. У першую чаргу Камісія ўзялася за падрыхтоўку да друку твораў Максіма Багдановіча. Распрацаваўшы і ўсебакова вывучыўшы ўсе сабраныя матар'ялы, якія могуць быць аднесены да збору твораў Максіма Багдановіча, Камісія расплянавала выданьне яго твораў на 3 томы, разьмерам на 50 друкаваных аркушаў. Заўважу, між іншым, што працу Камісіі ў зборы матар'ялаў М. Багдановіча значна палегчыў бацька поэты, які прывёз з Яраслаўлю ўвесь архіў свайго сына. Працу па падрыхтоўцы да друку твораў М. Багдановіча можна бадай ужо лічыць скончанай. Першы том знаходзіцца ў друку і хутка выйдзе ў сьвет. З выхадам яго мы запраўды будзем мець першую акадэмічнага выданьня кнігу прыгожага пісьменства. Працай Камісіі кіруе вядомы знаўца літаратуры проф. Замоцін.

Зараз Камісія працуе па выданьні і навуковай апрацоўцы для акадэмічнага выданьня твораў Алеся Гаруна і Цёткі. Усіх твораў Алеся Гаруна сабрана на 10—12 друкаваных аркушаў, а Цёткі—на 8 аркушаў.

Таксама падрыхтоўваецца для акадэмічнага выданьня „Сялянка" Дунін-Марцінкевіча.

Адначасна з гэтым Камісія працуе па зьбіраньні матар'ялаў, якія маюць тыя ці іншыя адносіны і да другіх пісьменьнікаў. З матар'ялаў, што паступілі ў Камісію, вызначаюцца аўтографы Насовіча, Гаруна, уласная папка з рознымі лістамі Ядвігіна Ш. і інш.

Праца па вывучэньні літаратуры, пераважна сучаснай беларускай літаратуры, у нас вядзецца паасобнымі навуковымі працаўнікамі. Тут мы маем да 50 каштоўных прац, зьмешчаных у нашых журналах: „Полымі", „Маладняку", у „Працах Унівэрсытэту", у „Крывічы" і інш. Апрача таго, у апошнія гады аб сучаснай беларускай літаратуры вышла каштоўная праца акад. Е. Карскага: „Белорусы" т. III, ч. 3, а таксама солідная праца М. Гарэцкага: „Гісторыя беларускай літаратуры". Зараз друкуецца і хутка выйдзе ў сьвет новы курс па беларускай літаратуры проф. М. Пятуховіча.

Тут-жа ўпамяну аб працы па гісторыі беларускай літаратуры на нямецкай мове Е. Карскага, што вышла ў гэтым годзе ў Бэрліне.

Не малая навуковая праца па літаратуры вядзецца ў нашых літаратурных аб'яднаньнях: „Маладняку“ і „Ўзвышшы“.

Але асабліва многа гаварыць аб вывучэньні беларускай літаратуры мне ня прыходзіцца. У праграме Конфэрэнцыі аб беларускай літаратуры стаяць асобныя даклады, у якіх пэўна будзе зачэплена і пытаньне аб вывучэньні нашай літаратуры. Скажу толькі, што праца па вывучэньні сучаснай беларускай літаратуры за апошнія гады разгарнулася, пераважна ў галіне літаратурнае крытыкі, досыць шырака.

Трохі горш у нас стаіць справа з вывучэньнем нашай старажытнай літаратуры. У гэтай галіне мы маем капітальную працу акад. Е. Карскага: „Старая западно-русская письменность“ (Белорусы, т. III, ч. 2), салідную працу акад. Перэтца: „Адшуканьні і нагляданьні ў беларускай народнай творчасьці“ (Запіскі Інбелкульту), працу проф. Варшаўскага Унівэрсытэту Юзэфа Голомбэка: „Początki dramatu białoruskiego“ (Warszawa, 1925) і некалькі больш дробных. Тут яшчэ варта ўпамянуць аб грунтоўнай рукапіснай працы докт. філёлёгіі Дварчаніна аб Скарыне і яго перакладах на беларускую мову (у рукапісу).

Вось галоўны агляд працы па вывучэньні беларускай мовы.

З гэтага агляду мы бачым, што цэнтрам вывучэньня беларускай мовы за апошнія гады зьяўляецца ўжо сама Беларусь, што гэту працу пераважна організуе і вядзе яе навуковая ўстанова—Інстытут Беларускай Культуры. Пад кіраўніцтвам Інстытуту Беларускай Культуры праца па дасьледаваньні беларускай мовы шырыцца і паглыбляецца. Праўда, у нас яшчэ параўнаўча мала зроблена, дый тое, што мы робім, мае больш наша мясцовае значэньне, чым агульна-сусьветнае. Мы ня ставім сабе шырокіх задач па вывучэньні моваў іншых народаў, па дасьледаваньні агульна-мовазнаўчых проблем, як гэта робяць больш старыя мовазнаўчыя організацыі. Нашы задачы больш вузкія—дасьледаваньне і навуковае апрацаваньне нашай мовы, бо цяпер, калі наша літаратурная мова яшчэ знаходзіцца ў стадыі сваёй твор-

часьці,—гэтыя задачы найбольш важныя і найбольш неадкладныя. Агульны кірунак нашай працы мною ўжо выказаны раней,—гэта блізасьць літаратурнай мовы да народнай. Патрэбна, каб наша літаратурная мова па магчымасьці была блізка да ўсіх нашых дыялектаў, каб яна зьяўлялася агульнаю для іх. Прызнаючы ў справе апрацаваньня беларускай літаратурнай мовы кіраўнічую ролю за Савецкай Беларусьсю, мы тым ня менш ня можам ня ўлічваць і тэй працы, што вядзецца па-за межамі яе, і тых пажаданьняў, якія могуць быць унесены зарубежнай Беларусьсю. Нашым агульным імкненьнем павінна быць адзінства беларускай мовы, бо гэты фактар переважна і азначае адзінства беларускага народу. Адсюль зразумела, чаму мы склікалі першую Ўсебеларускую Конфэрэнцыю якраз па мовазнаўчых пытаньнях. Мы хочам гэтым фактам падкрэсьліць, якое вялікае значэньне ў нашых культурных і палітычных умовах жыцьця мы надаём мове і, у частковасьці, адзінству нашай мовы. Мы спадзяемся, што Мовазнаўчая Конфэрэнцыя выявіць свой погляд ня толькі ў адносінах да конкрэтных пытаньняў—правапісу і графікі,—але і дасьць агульны кірунак усёй нашай мовазнаўчай працы ў сэнсе адзінства і паўнаты дасьледаваньня і апрацаваньня нашай мовы. Разам з тым, мы спадзяемся, што Акадэмічная Конфэрэнцыя, паколькі ў нас ужо існуе сталая навуковая організацыя—Аддзел Мовы і Літаратуры,—зьявіцца тым стымулам, які будзе сымптоматызаваць павышэньне інтэнсыўнасьці мовазнаўчай працы, вызываючы зацікаўленасьць да яе ў самых шырокіх масах нашай Рэспублікі. А дасьледаваўшы сваю мову, добра апрацаваўшы яе, мы запраўды надамо ёй тое значэньне, якое яна павінна мець сярод іншых славянскіх моваў, як самастойная мова беларускага народу, што ў апошнія гады паўстаў для будаваньня свайго ўласнага культурнага жыцьця.

Старшыня: Магчыма, што некаторыя паважаныя члены Конфэрэнцыі маюць вусныя запытаньні дакладчыку. Прашу гэтыя пытаньні запрапаноўваць.

Фасмэр. У Нямеччыне існуе шмат краёвых слоўнікаў. Гэтаму пытаньню адводзіцца шмат увагі. Краёвыя слоўнічкі распаўсюджваюцца ў вялікай колькасьці экзэмпляраў. Лепей

ад другіх апрацаваны ў гэтых адносінах Швэйцарскі краёвы слоўнік, які друкуецца ў Цюрыху, і слоўнікі францускіх гаворак.

Дзеля гэтага я хацеў-бы зьвярнуць увагу Інбелкульту перш за ўсё на выданьне краёвых слоўнікаў, а таксама на выданьне апытальных лісткоў, якія выходзяць ў Швэйцарыі і Францыі. Апытальных швэйцарскіх лісткоў ужо існуе каля 200 нумароў. У мяне асабіста маецца поўны комплект гэтых лісткоў, які, на жаль, застаўся ў Бэрліне. Я мог-бы запрапанаваць яго вам для часовага карыстаньня.

У Нямеччыне выдавалася шмат краёвых слоўнікаў. Усе гэтыя слоўнікі зьбіраюцца Магдэбурскім Інстытутам. Інбелкульт можа мець магчымасьць, хоць-бы пры маёй дапамозе, пагадзіцца з Магдэбурскім Інстытутам, які, напэўна, дасьць усе патрэбныя праўкі.

Апытальныя лісткі бываюць рознага тыпу, напрыклад, аб вінаробстве, якое ў некаторых месцах Нямеччыны мае вялікае гаспадарчае значэньне. У іншых мясцовасьцях Нямеччыны гэтае пытаньне адпадае. У зьвязку з гэтым для розных мясцовасьцяй апытальныя лісткі выпускаюцца па свайму зьместу асобныя.

Мне здаецца, што такія лісткі, якія ў вялікай колькасьці пашыраюцца ў Нямеччыне, маглі-б быць вельмі карыснымі для беларускага слоўніка. Апрача гэтага, у нас, побач з зьбіраньнем слоў для краёвых слоўнікаў, ідзе зьбіраньне матар'ялаў аб умоўных мовах. Я асабіста зьбіраюся надрукаваць этымолёгічны слоўнік умоўных моваў з лінгвістычнымі тлумачэньнямі. Было-б цікава даведацца, як праводзіцца праца па зьбіраньні ўмоўных моваў на Беларусі. На гэтую працу трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу, бо гэтыя мовы зьнікаюць хутчэй, чым гутаркі.

Некрашэвіч. У дакладзе я ўжо казаў, што ў нас для зьбіраньня тэхнічных слоў выдана асобная інструкцыя. У апошні час у нас таксама проектуюцца апытальныя лісткі. Будзе вельмі цікава азнаёміцца з тымі лісткамі, аб якіх казаў проф. Фасмэр. Адносна ўмоўных моваў у нас асобнай працы не вялося, але некаторыя матар'ялы намі атрыманы, напр., аб мове слуцкіх краўцоў. З гэтымі матар'яламі можна пазнаёміцца ў Слоўнікавай Камісіі.

Фасмэр. У Нямеччыне ўмоўныя мовы зьбірае і дасьледвае, галоўным чынам, проф. Кюнгэ. Маецца некалькі яго прац аб мове маракоў, жаўнераў, мове студэнтаў і інш. Умоўныя мовы бясспрэчна маюць значэньне і ў беларускай краіне. Таксама пажадана ведаць, як організавана праца па зьбіраньні мясцовых назваў. Для нас вельмі было-б важна, каб Інбелкульт даў сьпіс дробных вазёр, рэчак, пэўных тэрыторый,—усё гэта зьявілася-б надзвычайна каштоўным навуковым матар'ялам.

Німчынаў. Цікава ведаць, наколькі пры распрацоўцы слоўнікавага матар'ялу быў скарыстаны Інбелкультам мэтод „Wörter und Sachen“ (найбольш характэрныя працы ў гэтым кірунку дала школа проф. Мурко). Гэты мэтод карысны тым, што ён дае, апрача чыста моўнага матар'ялу, каштоўныя паказаньні да гісторыі матар'яльнае культуры. Гэты мэтод дае таксама магчымасьць найбольш інтэнсыўна выкарыстоўваць народны моўны матар'ял для стварэньня спэцыяльнае тэхнічнае тэрмінолёгіі. Як на вельмі добрыя прыклады ўжываньня гэтага мэтоду, можна паказаць на працу „Les appelations de traîneaux et des ses parlies“, якая разьбірае адпаведны матар'ял францускае Швэйцарыі, а таксама на працы проф. Зеленіна.

Імшэньнік (з месца). Мы ведаем, што беларуская мова вельмі блізкая да расійскай і польскай мовы, дзеля чаго часта кажуць, што ў беларускай мове ёсьць шмат запазычаньняў з польскай і расійскай мовы. А таму я хацеў-бы ведаць, што калі распрацоўваюцца матар'ялы аб беларускай мове, то ці выдзяляюцца тыя асаблівасьці беларускай мовы, якія зьяўляюцца належачымі выключна аднэй беларускай мове і ніякае сувязі ня маюць з мовамі польскай і расійскай, а толькі з агульна-славянскай.

Сербаў. На пытаньне, якое падняў проф. Фасмэр, як у нас, на Беларусі, вядзецца праца па вывучэньні ўмоўных гутарак, а таксама географічнае номэнклятуры, назваў прадметаў і зьяў прыроды і назваў прадметаў і зьяў бытавога характару, я дазволю сабе зрабіць спраўку па гэтым пытаньні. У нас, на Беларусі, да гэтага часу выяўлены наступныя ўмоўныя гутаркі: гутарка шапавалаў м. Дрыбіна Аршанскае акругі і гутарка краўцоў м. Капыль Слуцкае

акругі. Гэтыя гутаркі сформаваліся і да гэтага часу захаваліся ў тых раёнах, дзе ў старыя часы існавалі моцныя цэхавыя організацыі—шавецкія, кравецкія, шапавальскія, ганчарскія і інш. Умоўная гутарка дрыбінскіх шапавалаў запісана Е. Р. Раманавым і ў свой час выдрукавана асобнай брошурай, капыльская ўмоўная гутарка краўцоў мае ўсе асновы і формы асобнае мовы. На гэтай мове лёгка і добра гаворацъ усе капыльскія рамесьнікі. Маюцца цэлыя творы народнай творчасьці на гэтай гутарцы: песьні, казкі, загадкі, прыказкі. Для вывучэньня капыльскай умоўнай гутаркі зараз зьбіраюцца матар‘ялы, якія пасьля апрацоўкі будуць выдрукаваны Інстытутам Беларускай Культуры.

Географічная номэнклятура і назвы прадметаў і зьяў прыроды і быту вывучаюцца Этнографічнай Сэкцыяй Інбелкульту. Назвы прылад вытворчасьці, розных вырабаў і самых процэсаў працы вывучаецца Камісіяй па вывучэньні саматужных промыслаў пры Інбелкульце. Складзены адпаведныя програмы і накіраваны для запісваньня мясцовым краязнаўчым організацыям.

Некрашэвіч. У сваім дакладзе я нічога не сказаў аб укладаньні географічнага слоўніка. Зрабіў гэта я сьвядома, бо справай укладаньня гэтага слоўніка ў нас ведае асобная Географічная Камісія. Аднак, паколькі некаторыя члены Конфэрэнцыі цікавяцца географічнай номэнклятурай, скажу, як у нас стаіць справа з зьбіраньнем географічнай номэнклятуры і з укладаньнем географічнага слоўніка наагул. Уласна кажучы, у нас яшчэ географічнага слоўніка няма і матар‘ял для яго пакуль што яшчэ ня зьбіраецца. Аднак, патрэбнасьць такога слоўніка для кожнага зразумела і пытаньне аб укладаньні географічнага слоўніка ўжо насьпела. Пытаньне гэта ўжо колькі разоў абгаварвалася ў адпаведных навуковых організацыях, і трэба спадзявацца, што нават у бягучым годзе справа з зьбіраньнем матар‘ялу для географічнага слоўніка ў нас будзе наладжана.

Што-ж датыча зьбіраньня ўмоўных моваў і тэхнічнай тэрмінолёгіі, то аб гэтым за мяне ўжо даў належны адказ І. А. Сербаў.

Мне застаецца толькі адказаць т. Імшэньніку. Ён цікавіцца пытаньнем, ці выяўляюцца найбольш характэрныя

асаблівасьці беларускай мовы, тыя асаблівасьці нашай мовы, якіх няма ні ў польскай ні ў расійскай мове. Гэткія асаблівасьці даўно ўжо выяўлены ў працах папярэдніх дасьледчыкаў па беларускай мове, галоўным чынам, у працах акад. Е. Карскага. З гэтымі асаблівасьцямі можна пазнаёміцца па любой школьнай граматыцы беларускай мовы.

Становішча беларускай мовы сярод іншых славянскіх моваў.

Старшыня: Слова для дакладу „Становішча беларускай мовы сярод іншых славянскіх моваў“ мае профэсар П. Бузук.

Бузук. Зьмест майго дакладу распадаецца на дзьве часьціны: 1) на пытаньне аб географічным становішчы беларускай мовы—становішчы ў прасторы, г. зн. аб яе граніцах і 2) на пытаньне аб яе становішчы ў часе, г. зн. аб моманце яе зараджэньня і аб далейшым разьвіцьці.

Некаторыя славісты, зьвярнуўшы ўвагу на цэнтральнае становішча славацкай мовы сярод трох іншых славянскіх моваў, падкрэсьлівалі яе цікавасьць для мовазнаўцаў,—цікавасьць, якая зьяўляецца вынікам гэтага цэнтральнага становішча ўспамянутай мовы. Але бясспрэчна, калі-б для гэтых мовазнаўцаў (напр., для Флорынскага) беларуская мова ня была-б „наречием единого русского языка“, яны тое самае павінны былі-б сказаць і адносна нашай мовы, якая знаходзіцца паміж польскай, украінскай і дзьвюх падмоў расійскай мовы. Дзякуючы такому цэнтральнаму становішчу, мы знаходзім у беларускай мове рысы, агульныя з кожнай з пералічаных суседніх груп. Напр., з польскай мовай яе зьвязваюць дзеканьне, цеканьне і цьвёрдае „р“, з паўднёва-вялікарускай падмовай яна яднаецца аканьнем, шмат рысаў належыць беларускай і ўкраінскай мовам[1]). Да такой катэгорыі беларуска-ўкраінскіх зьяў адносіцца напр., зьмена „л“ на „ў“ перад наступным зычным (укр. *вовк,* бел. *воўк* з ранейшага *вълкъ)* або пераход злучэньня зычнага з ётам у падвойную зычную (укр. *життя,* бел. *жыцьцё*). Апроч гэтага, ёсьць у беларускай мове асаблівасьці, якія характарызуюць іншыя ўгрупаваньні славянскіх моваў, напр., зьмена „ъ“, „ь“ на „о“, „е“ (у г. зв. моцным становішчы), якая зьвязвае расійскую, украінскую, беларускую і амаль што ўсю славацкую мову.

Асаблівую ўвагу зварочвалі дагэтуль мовазнаўцы (а

[1]) Аб агульных беларуска-ўкраінскіх адзнаках дакладней у маім артыкуле „Взаемовідносини між українською та білоруською мовами“, Зап. I ст. Філол. В. Укр. Ак. Н., т. VII—VIII.

некаторыя з іх і цяпер яшчэ зварочваюць) на рысы, што існуюць у так званых усходня-славянскіх ці „русских“ мовах. На падставе гэтых зьяў, сярод якіх найбольш бясспрэчнымі зьяўляецца поўнагалосьсе (злучэньні „оро“, „оло“, „ере“ паміж зычнымі адпаведна да злучэньняў „ра“, „ла“ і г. д. у паўдн.-славянскіх і чэскай мовах, *ro, ło, rze, le* ў польскай— з ранейшых злучэньняў or, ol, er, el) і гук „ч“ з ранейшага злучэньня *tj*, мовазнаўцы ўтварылі тэорыю пахаджэньня беларускай, расійскай і украінскай моваў ад аднэй агульнай, г. зв. прарускай мовы.

Гаворачы аб далейшай групоўцы ўсходня-славянскіх моваў, лінгвісты, базуючыся на тых ці іншых зьявах, лічылі беларускую мову то бліжэйшай да украінскай (Міклошыч, Огоновський), то бліжэйшай да расійскай мовы (Срезневский, Потэбня). Але кожная з клясыфікацый, якая прапаноўвалася ў славянскай навуцы, зьяўляецца ў значнай меры ўмоўнай і штучнай. Як на довад гэтай умоўнасьці, можна паказаць на наступнае. Польскі лінгвісты Лер-Сплавінскі (Roczn. Slaw., IX, ст. 23—71), а пасьля яго Трубецкой (Zeitschr f. slav., Phil. I, ст. 287—319), зьвярнуўшы ўвагу на розьніцу ў вымове „г“ і на некаторыя іншыя адзнакі, запрапанавалі зусім іншы падзел усходня-славянскай галіны. Беларускую, украінскую мовы і паўднёва-вялікарускую падмову яны зьвязваюць у вадну вялікую групу (у якой і знаходзім якраз працяжную ці фрыкатыўную вымову „г“, адмяжоўваючы ад яе паўночна-вялікарускую падмову.

Таксама няма сталасьці і ў пытаньні адносна клясыфікацыі ўсіх славянскіх моваў. Умоўнымі і недакладнымі зьяўляюцца як трыялістычная, так і дуалістычная клясыфікацыі гэтых моваў[1]). Зазначаная няпэўнасьць у розных спробах угрупаваньня славянскіх моваў зьяўляецца вынікам недасканаласьці ведаў аб граніцах моўных зьяў, якімі характарызуюцца як паасобныя славянскія мовы, так і групы гэтых моваў. У рачавістасьці-ж, бачым мы, ізоглёсы перасякаюцца ў самых розных кірунках. Гэта мы і павінны браць пад увагу, азна-

---

[1]) Аб гэтым гл. артыкул Ван-Вэйка ў Revue des étud slav., III; Цонева ў яго гістор. баўгарск. мовы (1919); у Ляпунова ў артык. „Памяти А. А. Шахматова“, ст. 101-102, і ў маім артыкуле аб Шахматаве (Изв. Отд. р. яз. и сл. Р. А. Н., т. XXIII, кн. 2).

чаючы граніцы беларускай мовы і яе паасобных падмоў. Граніцы характэрных зьяў нашай мовы не супадаюць адна з аднэй. Асабліва яскрава несупадзеньне ізоглёсаў мы наглядаем на пэрыфэрычных гутарках,—гутарках, пераходных ад беларускай мовы да моваў суседніх. Так, напр., беларускую мову ад украінскай адрозьнівае аканьне і мяккая вымова зычных перад мяккімі галоснымі „е“, „і“, але граніцы гэтых дзьвюх зьяў не супадаюць. А менавіта, граніца між аканьнем і аканьнем праходзіць недалёка каля Прыпяці, мяккую-ж вымову зычных (зубных) перад мяккімі галоснымі мы мелі магчымасьць знайсьці далёка на поўдзень ад Прыпяці (у Тонежы, у Мілашэвічах, Лельчыцах, у Ельскім і Нараўлянскім раёнах). На поўначы-ж Беларусі, у Нэвельскім і Вяліскім паветах, дасьледаваньне якіх было даручана мне[1]), мы знаходзім некаторыя рысы, характэрныя для паўночна-вялікарускіх дыялектаў, напр., такія формы скланеньня, як *у руке, на наге,* ужываньне давальнага склону множнага ліку ў сэнсе прыладнага: *з рукам, з ныгам* (замест *нагам* (〈 *ногамъ* у выніку дысыміляцыйнага аканьня), цоканьне і некат. інш., але, з другога боку, вядомым зьяўляецца факт існаваньня тыповых беларускіх адзнак (захаваньня „ы“ перад ётам і ётавымі галоснымі: *мыю, крыю,* зьмены „л“ на „ў“ пры пэўных умовах: *воўк, казаў,* дзеканьня-цеканьня і інш.) у паўночна-вялікарускіх гутарках. Гэткім чынам, мы бачым, што гутаркі паступова зьмяняюцца, пераходзячы ад аднэй да другой. Адна сялянка з Нэвельшчыны дала ў сваіх словах яскравую ілюстрацыю пераходнасьці дыялектаў. „Калі мы паедзем на поўнач за Вялікія Лукі,—сказала яна,—там нас называюць палякамі (г. зн. беларусамі), калі-ж мы паедзем ужо на поўдзень за Нэвель, там з нас сьмяюцца ўжо за тое, што мы трохі „наварачваем“ парасейску“.

Нарэшце і граніцы дыялектычных зьяў перарэзваюць тэрыторыю этнографічнай Беларусі ў розных кірунках. Як далёка адстаяць, напр., адна ад другой граніцы галоўных асаблівасьцяй паўднёва-беларускіх дыялектаў? Разгледзім граніцу пашырэньня такіх форм 1 ас. мн. л., як *будам, пойдам,*

---

[1]) Дакладней аб выніках гэтага дасьледаваньня ў маім артыкуле „Да характарыстыкі паўн. беларускіх дыялектаў. Гутаркі Нэвельскага і Вяліскага паветаў“, Менск, 1926 г.

правядом. Пачаўшыся ў Узьдзенскім раёне Менскай акругі [1]), яна праходзіць недалёка ад Менску з паўднёва-ўсходняга яго боку, захапіўшы Гатава (гл. Карскага: „Мат. для изуч. бел. гов.“, 2 вып., стар. 33); прайшоўшы вышэй ад Сьмілавіч, граніца даходзіць да Дамавіцкага, пасьля чаго яна паварочвае ўжо ў паўднёва-ўсходнім кірунку; перарэзаўшы Бярэзіну на вёрст 15, прыблізна, ніжэй ад мястэчка таго-ж імя, граніца накіроўваецца на ўсход (крыху ніжэй ад Ліпніцы, у якой падобных форм не знаходзім); дайшоўшы да Доўгага (гл. „Материалы для изучения бел. гов“., стар. 117), граніца зноў паварачвае на паўднёвы ўсход; захапіўшы Азяраны і Станькаў на поўнач ад Рагачэву (гл. Раманава „Белорусский сборник“, вып. III і інш.), потым Мяркулавічы і Нісімкавічы ў 10 в. на ўсход ад Чэчэрску (таксама гл. Раманава, „Белорусский сборник“), ізоглёса данай зьявы захапляе нарэшце Новазыбкаўскі пав. (гл. А. Полевого „О языке населения Новозыбковского уезда Гомельской губ“., Менск, 1926, ст. 25); паўднёвая-ж граніца данай зьявы праходзіць ніжэй ад Харобрычаў (гл. О. Курило „Фонет. та морфологічні особливості говірки с Хоробричів“, 1924, ст. 81) і Брагіна; перарэзаўшы Прыпяць, граніца далей прыблізна супадае з паўднёвай граніцай БССР.

Значна меншай зьяўляецца тэрыторыя гутарак, у якіх існуе саканьне. Пачаўшыся на захадзе ад Слуцку, граніца падымаецца ў паўночна-ўсходнім кірунку, прайшоўшы на поўнач ад Палесься і Баслаўцаў (гл. „Мат. для изуч. бел. гов“., III, стар. 88) і на поўдзень ад Капыля (адкуль Ц. Гартны) і Грозава, ізоглёса данай зьявы, прыблізна, праходзіць па паўднёвай граніцы цяперашняга Шацкага раёну (аб адсутнасьці саканьня ў Шацку гл. „Мат. для из. бел. гов.“, ст. 34—44) захапіўшы далей паўночна-ўсходні кут Случчыны, а менавіта—былую Жыцінскую воласьць (гл. працу Сербава аб сакунох у XCIV т. № 1, Сборн. Отд. р. яз. и сл. Р. Ак. Н.), потым Глуск, граніца паварочвае на паўднёвы ўсход і, пры-

[1]) Мы падаем пакуль што веды адносна Ўсходняй Беларусі, ня маючы магчымасьці дасьледаваць гутаркі Заходняй Беларусі. Між іншым, калі пры пералічаных у нас пунктах не стаіць назва крыніцы, гэта паказвае на тое, што веды адносна гутаркі данай вёскі здабыты намі на падставе ўласных назіраньняў або з адказаў на нашы програмы.

блізна, у вярстах 15—20 на поўнач ад Калінкавічай перасякае чыгунку Калінкавічы-Жлобін; паўднёвая-ж граніца саканьня даволі блізка падыходзіць да паўднёвай граніцы папярэдняй зьявы (г. зн. ф. ф. *будам, пойдам*).

Нарэшце яшчэ менш тэрыторыя дыялектычнай зьмены „ы“ на „у“ пасьля губных *(мула, путаць* зам. *мыла, пытаць).*

Як-жа мы зможам адзначыць у такім выпадку географічнае становішча беларускай мовы, г. зн. яе граніцы? Зрабіць гэта можна некалькімі спосабамі.

Узяўшы, папершае, пад увагу, што мора пераходных гутарак (а гэту пераходнасьць мы спасьцерагаем і ў іншых мясцох славянскага сьвету) яднаецца ў паасобныя мовы, дзякуючы цэнтралізуючым гістарычна-экономічным і культурным фактарам, сярод якіх найгалоўнейшае месца належыць літаратурнай мове, мы зразумеем, што пры правядзеньні граніцы па спрэчнай тэрыторыі пераходных дыялектаў мы можам базавацца на параўнаньні гэтых дыялектаў з дзьвюма суседнімі літаратурнымі мовамі.

З вялікай асьцярожнасьцю належнасьць спрэчнай гутаркі да тэй іншай з дзьвюх суседніх моваў можна азначаць на падставе параўнаньня з народнымі дыялектамі даных моваў, бо злучнасьць усіх жывых гутарак, якія адносяць да тэй ці іншай мовы, уласна кажучы, ня мае характэрных толькі для іх і агульных усім ім адзнак. Можна, здавалася-б на першы погляд, прапанаваць іншы выхад, а менавіта—параўноўваць цікавячую нас гутарку з асаблівасьцямі, характэрнымі *для большасьці* дыялектаў кожнай з суседніх моваў, але і гэты падыход да пытаньня нас ня можа здаволіць, бо ў ім скрыта лёгічная памылка; ён лічыць ужо вядомымі граніцы мовы і нават граніцы самых зьяў. Але як мы можам без дакладнага вывучэньня ўсіх беларускіх гутарак запэўняць, напр., што формы загаднага ладу, як *бярэце, нясеце* (а не *бярыце, нясіце*) ведае большасьць беларускіх дыялектаў. Пасьля гэтага становіцца відавочнай неабходнасьць вывучэньня граніц паасобных зьяў мовы.

Нарэшце, часам прапануюць праводзіць граніцы мовы на падставе аднэй якой-небудзь, але вельмі важнай зьявы. Так, напр., укладальнікі „Опыта диалектологической карты русского языка в Европе“ (1925, ст. 32 і наст.), указаўшы на

тое, што некаторыя беларускія зьявы спатыкаюцца і ў пераходных, гэт. зван. сярэдня-вялікарускіх дыялектах, галоўнай падставай для правядзеньня паўночнай граніцы белар. м. лічаць розьніцу ў вымове „г“. Граніцу-ж паміж беларускай мовай і паўднёва-вялікарускай падмовай у сваёй працы „Диалектологические разыскания в области великорусских говоров, ч. I. Южновеликорусское наречие“, вып. 1 і 2, 1917-1918, проф. Дурново паспробаваў азначыць, выходзячы з розных тыпаў аканьня: дысыміляцыйнае аканьне і яканьне ён абвясьціў зьявай беларускага пахаджэньня[1]).

Бязумоўна, і апошні мэтод азначэньня граніц мае свае хібы. Калі мы возьмем пад увагу, што некаторыя моўныя процэсы, дзякуючы сваёй псыхофізыолёгічнай прыродзе, могуць вельмі лёгка пашырацца, тады мы зразумеем, што зьявы, якія былі адзнакамі ранейшай асновы насельніцтва, з працягам часу могуць зьмяніць свае граніцы, перакінуўшыся на суседнія племенныя і моўныя групы. Пасьля дакладнага дасьледаваньня граніц такой кардынальный адзнакі мы можам пазбавіцца права праводзіць на яе падставе граніцы самой мовы. Так, паміж іншым, і здарылася з проф. Дурново, які пасьля прыблізнага вывучэньня граніц дысыміляцыйнага аканьня заблытаўся і нарэшце амаль што зусім адмовіўся ад запрапанаванага ім спосабу азначэньня граніцы. Ужо ў I-м вып. сваёй працы на 24 стар. (3-я увага) Дурново кажа, што „диссимилятивное аканье само по себе не может служить критерием при проведении границы между ю.-в. р. и б.-р. В виду этого вопрос о границе будет пересмотрен мною ниже“. У 2-м вып. „Диалектологических разысканий“ аўтар іх характэрнай адзнакай беларускіх дыялектаў лічыць „диссимилятивное яканье Жиздринского типа“, але і тут ён павінен зазначыць існаваньне гэтага тыпу яканьня і ў суседніх паўднёва-вялікарускіх гутарках з меншай колькасьцю вялікарускіх адзнак (ст. 33—36).

Апроч таго, выбар аднэй-якой небудзь зьявы ў якасьці крытэрыя для правядзеньня граніцы па сваёй сутнасьці

---

[1]) Між іншым, у сваім апошнім артыкуле „Беларускае аканьне“ шляхам гістарычных досьледаў Я. В. Воўк-Левановіч прышоў да погляду аб тым, што дысыміляцыйнае аканьне зарадзілася раней у беларускіх крывічоў. Да гэтай думкі Воўк-Левановіч прышоў незалежна ад Дурново, бо ў яго не знаходзім упамінаньня аб зазначанай працы Дурново.

зьяўляецца актам умоўным і адвольным. Чаму мы пры правядзеньні граніцы беларускай мовы з паўночна-вялікарускай падмовай павінны базавацца якраз на вымове *г*, пры правядзеньні-ж граніцы з паўдн.-вялікар.—на тыпе аканьня? А што мы пакладзем у аснову пры азначэньні граніцы з польскай мовай? Адсутнасьць аканьня, розьніцу ў вымове *ѣ* ці, нарэшце, назаляваныя галосныя? Таксама, прыблізна, стаіць справа і з правядзеньнем граніцы паміж беларускай і ўкраінскай мовамі. Найбольш важнымі зьявамі, на якіх тут можна было-б базавацца, трэба лічыць аканьне і розьніцу ў вымове зычных перад *е, і* (у ўкраінскай *и),* але граніцы іх аддзяляюцца адна ад другой вялікай адлегласьцю; апроч таго, усе процэсы, якія яднаюцца пад тэрмінамі *аканьне і мяккае вымаўленьне зычных перад е, і,* зьнікаюць паступова ў кірунку на поўдзень. Так, напр., яшчэ далёка да Прыпяці зьнікае аканьне ў апошніх складох *(мало, нічого),* зьнікае да Прыпяці і яканьне (гл. „Сказки и рассказы белоруссов-полешуков“ Сержпутоўскага, 1911), далей страчваецца аканьне ў не-апошніх складох пасьля губных і заднянёбных[1]), нарэшце (недалёка за Прыпяцьцю) зьнікаюць апошнія сьляды данай зьявы. Значна далей на поўдзень ад Прыпяці мяккая вымова зычных перад мяккімі зычнымі (а ў сувязі з гэтым дзеканьне і цеканьне) зьмяняецца на цьвёрдую *(нэбо, дэнь, тихо),* але і ў зьнікненьні мяккасьці зычных перад *е, і (и)* ёсьць пэўная паступовасьць: значна раней (прыблізна, каля Прыпяці) зьнікае мяккасьць губных зычных: *овэчка, помэрці, вэльмі*[2]), крыху далей, замест *л* мяккага, зьяўляецца перад *і (и), е—л* сярэдняе (напр., у словах *були, валикі).*

З усяго зазначанага ня трэба, аднак, рабіць вывады аб тым, что азначэньне граніц беларускай мовы (як і іншых славянскіх) зьяўляецца наогул немагчымым. Мы толькі адмаўляемся ад апрыорнага правядзеньня гэтых граніц без дакладных ведаў лінгвістычнай географіі. Пасьля таго-ж, як ста-

---

[1]) У некалькіх вёсках за Прыпяцьцю (у Асаўцы, Раманаўцы, Казяньках) нам даводзілася чуваць: *вода, голова, гора,* пры *нага, тавар.*

[2]) Цікава, між іншым, што ў некаторых вёсках з цьвёрдай вымовай губных не пад націскам *вэ, мэ, бэ, пэ* зьмяняюцца на *ва, ма, ба, па.* Так, напр., у Міхалках, у Ельскім і Нараўлянскім раёнах я чуў: *вадро, вачэраць, пасок* і да т. п.

нуць вядомымі граніцы і галоўных і другарадных моўных зьяў, гэтыя ўсе даныя, у злучнасьці з мэтодам параўнаньня з літаратурнымі мовамі, дадуць нам магчымасьць накрэсьліць дыялектолёгічныя карты беларускай і іншых славянскіх моваў.

Такім чынам, дыялектолёгі славянскіх моваў павінны ўстрымацца ад апрыорных азначэньняў граніц моваў і іх падмоваў і дыялектаў, абмежаваўшы пакуль што сваю працу высьвятленьнем граніц пашырэньня паасобных дыялектычных процэсаў. Падобную мэту і паставілі перад сабой Gilliéron і Edmont у сваім „Atlas linguistique de la France“. Прыблізна такога самага погляду прытрымліваюцца і некаторыя з славістаў—польскі вучоны Ніч (гл. яго „Proba ugrupowania gwar polskich“, Poradn. językowy, 1910, X і „Mowa ludu polskiego“, 1911), баўгарскі Младэнаў (Roczn. slawist., IV і V) і расійскі акадэмік Соболеўскій (гл. Изв. Отд. р. яз. и сл. Р. Ак. Н. за 1914 г. і Ж. М. Н. Пр. за 1915 г., чэрвень).

Задачу ўкладаньня дыялектолёгічнага атлясу зьяў беларускай мовы паставілі перад сабой і мы.

Пераходзім цяпер да другой часьціны нашага дакладу—да пытаньня аб старажытнасьці галоўных процэсаў, якія перажыла беларуская мова, да пытаньня аб яе пахаджэньні. Тэорыя дрэва гэтыя пытаньні вырашала вельмі проста, прымаючы строгую падлегласьць прамоўных эпох: з інда-эўропейскай прамовы вышла прабальтыцка-славянская, з апошняй—праславянская, пасьля праславянскай, па думцы прыхільнікаў дуалістычнай клясыфікацыі славянскіх моваў, існавала яшчэ нейкі час эпоха праўсходня-паўднёва-славянская, якая зьмянілася далей прарускай ці праўсходня-славянскай эпохай; нарэшце апошнюю эпоху магла аддзяляць ад пачатку існаваньня паасобных усходніх славянскіх моваў ці прабеларуска-ўкраінская (па думцы тых, хто зьвязвае беларускую мову з украінскай) ці правяліка-беларуская эпоха. Але прыняцьце такой строгай падлегласьці зьяўляецца недаведзенай гіпотэзай, якая базуецца на апрыорнай думцы аб тым, што процэсы, якія ахапілі інда-эўропейскія мовы, адбыліся раней, як процэсы бальтыцка-славянскія, а гэтыя—раней, як праславянскія і г. д. Калі-ж, аднак, нам удалося-б давесьці, што

працэсы з вужэйшымі ізоглёсамі маглі ўзьнікаць раней ад працэсаў з шырэйшымі граніцамі, хіба гэта не падарвала-б у корані тэорыю дрэва. Калі-б, напр., за дапамогай розных мэтодаў (аб іх гл. ніжэй), мы пабачылі-б, што вельмі хутка пасьля пачатку праславянскай эпохі здарылася якая-небудзь моўная зьмена, якая ахапіла толькі продкаў будучай беларускай або будучай украінскай мовы, хіба гэта ня значыла-б, што гісторыю даных моваў трэба пачынаць амаль што з таго моманту, з якога пачалася і праславянская мова. Усё зазначанае даводзіць важнасьць другой задачы для сучаснага славянскага мовазнаўства: *побач з географіяй моўных зьяў трэба вывучаць і іх гісторыю* (пар. К. Т. Німчынава—„Український язык у минулому й тепер“, 2 выд., 1926, ст. 20). А покуль што для большай карысьці мы павінны адмовіцца ад апрыорных гіпотэз аб падлеглых і пасьлядоўных прамоўных эпохах, пакінуўшы за сабой права толькі на адзіны распадзел, які адпавядае рэальным этапам, гэта распадзел на прадгістарычную эпоху, г. зн. эпоху да зьяўленьня пісьменнасьці, і эпоху гістарычную, г. зн. пасьля пачатку пісьменнасьці.

Высьветліць гісторыю прадгістарычных зьяў, звычайна, справа нялёгкая [1]). Чыста лёгічнай працы думкі славянскаму лінгвісту тут шмат дапамагае аналіз слоўнікавых зносін старажытных славян з іншымі народамі—іранцамі, грэкамі, рымлянамі, германцамі і бальтыйцамі, а галоўнае, славянская археолёгія. Прывяду прыклады карыстаньня гэтымі дапаможнымі мэтодамі.

Слова **čeršьnja* (чарэшня), якое проф. Фасмэр лічыць запазычаньнем з грэцкай мовы (гл. яго „Греко-слав. этюды“, XII, 2, ст. 205), ясна паказвае на тое, што пераход гэтага слова да славян мог здарыцца да таго, як у мове славян *s* зьмянілася пры пэўных умовах на *x*.

Германа-славянскія-ж зносіны, як гэта даводзіць проф. С. П. Обнорскій (Изв. отд. р. яз. и сл. Р. Ак. Н. XIX, 4, 1915, ст. 99—102) на падставе таго, што словы *цръкъ*ы *цѧта* падупалі ня першаму, а другому зьмякчэньню заднянёбных,

[1]) Спробу даць гісторыю прадгістарычнай эпохі славянскай фонэтыкі і зрабілі мы ў артыкуле „Да гістор. прадгістар. эпохі славянск. фонэтыкі,“ які друкуецца ў 1 т. Зборн. Аддз. Мовы і Літарат. Інбелкульту.

азначаюць, такім чынам, terminus ante quem першага і terminus post quem другога зьмякчэньня. А з гісторыі вядома, што гэтыя зносіны маглі мець месца ў I—II сталецьцях нашай эры.

Аднолькавы лёс глухіх *ъ, ь* у моцным становішчы ў мовах польскай, чэскай і паўночна-заходніх славенскіх гутарках (а менавіта зьмена абодвух гукаў на *e*), потым існаваньне злучэньняў *trat—, tlat—* і г. д. у чэскай мове,—усё гэта даводзіць, што абодва процэсы—пераход *ъ, ь* у *e* і разьвіцьцё *trat—, tlat—,* < *tart, talt* і г. д.—маглі зьявіцца яшчэ тады, калі захоўвалася сувязь паміж паўднёвым і заходнім славянствам. А з даных славянскай археолёгіі (гл. Нідэрле, Slovanské Starožitnosti, т. II, ст. 356 і інш.) зьяўляецца вядомым, што гэта сувязь перапынілася ў VIII—IX стал.; гэткім чынам, мы атрымоўваем магчымасьць дакладна азначыць terminus ante quem абодвух зазначаных процэсаў.

Злучэньне двух мэтодаў узмацняе вывады. А часам адна хронолёгічная дата пацьвярджаецца другой. У сваім артыкуле ў 1—2 вып. II т. „Zeitschr. f. slavische Philol.“, ст. 117—121, Трубецкой захаваньне *dl, tl* у ст. сл. *длань, тлъшти* лічыць лепшым высьветліць тым, што зьмена злучэньняў *dl, tl* на *l* была магчымай не ў пачатковых складох. Але калі-б ён узяў пад увагу, што зьмена *dl, tl* на *l*, як адна з агульных усходнім і паўднёвым славянскім мовам зьяў, магла здарыцца да VI—VII стал., г. зн. да таго часу, калі паўднёвыя славяне, бясспрэчна, страцілі сувязь з усходнімі, а з другога боку, адпаведныя зьмены злучэньняў *tart,—talt—*і г. д. адбыліся не раней ад VIII—пач. IX ст., што даводзіцца лёсам імя *Карл* ва ўсіх славянскіх мовах (усх. сл. *король,* паўдн. сл. і чэск. *краль,* польск. *kròl*[1]), тады ён рашуча прыняў-бы той погляд, які ён адкінуў, выказаўшы яго толькі, як гіпотэзу, а менавіта: захаваньне *dl, tl* у словах *длань, тлъшти* ён павінен быў-бы вытлумачыць тым, што пераход *dl, tl* у *l* адбыўся раней ад адпаведных зьмен *tart,—talt—,*

---

[1]) Аб хронолёгіі зьмен *tart—, tart—,* на падставе лёсу імя Карл гл. Міккольы „Urslavische Grammatik“ 1913, ст. 88; потым Мэйе „Revue des étud slaw.“, 1, 1—2, ст. 8; закід. Беліча ў „Slavia“ (1 т., 16), адказ Мэйэ ў „Revue des étud. slav.“, Т. 1, 3—4, ст. 303.

гэткім чынам, калі адбываўся пераход *dl, tl* у *l*, тады ў паўднёва-слав. мовах існавалі неперастаўленыя злучэньні.

Разгледзім цяпер галоўныя катэгорыі зьяў беларускай мовы з боку іх пахаджэньня.

У беларускай мове знаходзім перш за ўсё шэраг асаблівасьцяй, якія становяць спадчыну прадгістарычнай эпохі перавагі агульна-славянскіх ізоглёс [1]). Сюды адносяцца наступныя рысы: а) захаваньне „ы“ перад ётам і ётаванымі галоснымі: *мыю, крыю, молодый (малады),* б) захаваньне праславянскага памякчэньня ў скланеньні *(у руце, на назе),* в) формы дав. скл. мн. л. не-жан. р. на—*ом: братом* і месн. скл. мн. л. на—*ох (у садох)* [2]), г) захаваньне форм парнага ліку. Між іншым, як гэта мы імкнуліся паказаць у I часьціне нашага дакладу, пералічаныя зьявы могуць і ня быць агульнымі ва ўсіх дыялектах. І запраўды, форм *у руцэ, на назе* не знаходзім на ўсходзе і на поўначы беларускай моўнай тэрыторыі. Яшчэ менш граніцы пашырэньня форм на—*ом,ох.*

Что-ж датычыць тых зьяў беларускай мовы, якія становяць ня спадчыну эпохі перавагі агульна-славянскіх ізоглёс, а вынік процэсаў, пераж ытых продкамі беларусаў (і суседніх славянскіх груп), то і тут мы знойдзем ня мала такіх фактаў, узьнікненьне якіх адносіцца да тэй самай прадгістарычнай эпохі. З іх заслугоўвае ўвагі перш за ўсё зьмена *г* выбуховага на *г* працяжнае, якая ахапляе ўсходня-слав. галіну, апроч паўн.-вял. падмовы. Як гэта відаць з *х* у слове *прах* у Канстант. Чырвонароднага, а таксама з прыкладаў *разнъвавъ* у Зборн. 1073 г. і *ражнъвахъ* (сѧ) у Зб. Свят. 1073 г. і *ражнъва* (сѧ) у Арханг. ев. 1092 г. [3]), *г* пра-

---

[1]) У сваёй працы, якая друкуецца ў 1 т. Зборн. Аддз. М. і Л. мы a posteriori, пасьля дасьледаваньня хронолёгіі паасобных зьяў, прышлі да вываду аб тым, што прадгістарычныя часы славянскай фонэтыкі трэба падзяляць на такія чатыры эпохі: 1) эпоху дыялектычных інда-эўропейскіх ізоглёс, 2) эпоху перавагі агульных бальтыцка-славянскіх ізоглёс, 3) эпоху перавагі агульна-славянскіх ізоглёс і 4) эпоху перавагі дыялектычных славянскіх ізоглёс.

[2])—*ом* магло зьявіцца або з канчатку асноў на—*о: омъ* або з канчатку асн. на *й: ъмъ, ох* < *ъхъ* (*й*—асноў); у расійскай мове і ў большасьці ўкраінскіх гутарак, замест форм на—*ом,—ох* зьявіліся новаўтварэньні на—*ам,—ах* пад уплывам жан. р.

[3]) Гл. рэцэнзію Ганцова на маю „Коротку істор. укр. м.“ (Зап. Іст.-Філ. Відд. Укр. Ак. Н., т. V) і Шахматова „Оч. древн. пер. ист. р. яз.“, ст. 181.

цяжнае існавала ўжо да пачатку пісьменнасьці ў усходніх славян [1]).

Да прадгістарычнай эпохі адносіцца і разьвіцьцё поўнагалосься, агульнага ўсім усх.-слав. мовам, потым зьмена *л* на *ў*, якая зьвязвае беларускую мову з украінскай. Апошні процэс адбыўся да зьнікненьня *ъ, ь* у слабым становішчы, бо іначай мы не зразумелі-б, чаму, побач з *воўк,* мы маем у бел. і ўкр. мовах *голка, палка* [2]).

Некаторыя зьявы беларускай мовы ўзьніклі ўжо на працягу яе гістарычнага жыцьця. Позна пачынае адбівацца ў помніках, напр., дзеканьне і цеканьне (гл. акад. Карскага, Белорусы, т. II., в. I, стар. 435 і наст.), але гэта не выключае магчымасьці значна ранейшага, можа, нават, прадгістарычнага пахаджэньня данай зьявы.

Адбіцьцё рэдукцыі ненаціскных галосных, якая ўжо зьяўляецца, уласна кажучы, пачаткам аканьня, можна бачыць ужо ў Смаленскай Грамаце 1229 г., у якой, як на гэта паказаў акад. Ляпуноў, выпадкі зьмяшэньня *ъ, ь* з *о, е* назіраюцца часьцей у ненаціскных складох (Исслед. о яз. Синод. сп. Новгор. I летоп.) [3]). Мусіць у гістарычную ўжо эпоху ў беларускай мове (як і ў украінскай) злучэньні зычнага з ётам зьмяніліся на падвойную зычную *(жыцьцё).*

Гэткім чынам, бачым мы, што ўтварэньне беларускай мовы, г. зн. узьнікненьне галоўных фонэтычных і морфолёгічных зьяў, характэрных для большасьці беларускіх дыялектаў, а таксама для бел. літаратурнай мовы, у XIII—XIV стал. была скончана, г. зн., прыблізна тады, калі сфармаваліся і іншыя славянскія мовы.

Гаворачы аб гісторыі разьвіцьця кардынальных асаблівасьцяй, мы зусім не адчувалі патрэбы для высьвятленьня

---

1) Пра магчымую сувязь разгледжанай усх.-слав. зоглёсы з адпаведнай зьявай чэскай мовы, у якой ранейшы прыклад $h < g$ зьяўляецца ў помніку 1131 г. (гл. артыкул Бергмана ў „Listy filologické", XLVIII, 1921, ст. 223—239), я гавару дакладней у маім „Нарысе іст. украінскай мовы", які цяпер друкуецца.

2) Гл. маю „Коротку іст. укр. м.", ст. 53—54, а такасама рэцэнзію Ганцова—Зап. Іст.-Філ. в. У. Ак. Н., V.

3) Па гэтым пытаньні гл. яшчэ артыкул У. М. Тымчынавай у зборн., прысьвечаным Б. М. Ляпунову (Уч. Зап. Высш. Шк. г. Одессы, т. II, ст. 114—116).

гэтага разьвіцьця ў гіпотэзе прарускай мовы. Мы не адмаўляем магчымасьці таго, што a posteriori можа быць дavедзена існаваньне такой прарускай эпохі, але пакуль што ў нас няма падставы і нават права гаварыць аб ёй. Наадварот, тыя даныя, якія ўжо ёсьць у нашым распараджэньні, быццам гавораць якраз супроць тэорыі прарускага адзінства.

Апроч поўнагалосься, ёсьць яшчэ толькі адна зьява, якая зьвязвае ўсходня-славянскія мовы, гэта зьмена *tj* на *ч*. Значна менш пэўным довадам на карысьць гіпотэзы прарускай мовы можа быць пачатковае *о*—з ранейшага злучэньня *je (один, осень)*. Але калі нават мы і яе вызналі-б за агульнарускую асаблівасьць, то пасьля азначэньня хронолёгіі ўсіх гэтых трох усх.-слав. рысаў мы пазбавімся права гаварыць аб прарускай эпосе. Мы ўжо гаварылі, што канец VIII—пачатак IX стал., г. ё. той час, калі славяне даведаліся аб імі Карл, азначае terminus post quem зьмены злучэньняў *tart*—, *talt*—. Але канец таго самага IX ст. зьяўляецца ўжо terminus ante quem данага працэсу[1]). Значна-ж раней зьмянілася *tj* на *ч*. Як вядома, лёсам злучэньняў *dj*, *tj* усх. славян. мовы яднаюцца з паўдн.-слав. тым, што ў абедзьвюх галінах з зазначаных злучэньняў зьяўляюцца шыпячыя рэфлексы (а ня сычачыя, як у зах.-слав. мовах). А з гэтага выцякае, што зьмены, якім падупадалі *dj, tj,* павінны былі ўзьнікнуць у мове продкаў паўднёвых і ўсходніх славян не пазьней ад таго моманту, калі паўднёвыя славяне канчаткова парвалі сувязь з усходнім славянствам, г. зн. не пазьней VI-VII ст. ст.—часу засяленьня Балканскае паўвыспы. Трэцяя зьява, калі мы пагадзіліся-б з тымі, хто лічыць пачатковае *о*— $<$ *je*— усх.-слав. адзнакай, якраз наадварот, канчаткова разьвілася вельмі позна, ужо ў XI стал., як на гэта паказвае лёс грэцкіх уласных іменьняў і назваў царкоўнага ўжытку з пачатковым ε ў усх.-слав. мовах[2]). Вось і бачым мы, што такімі вялікімі працягамі часу паміж гэтымі трыма момантамі ўзьнікненьня ўсх.-слав. ізоглёс самая эпоха прарускай мовы разрываецца, зусім зьніштажаецца, бо гэтыя тры ўсх.-слав. ізоглёсы, бязумоўна, чаргаваліся з іншымі зьявамі з

[1]) Прынамсі адпаведныя зьмены ў паўднёва-славянскай галіне адбыліся не пазьней ад таго моманту, калі парвалася сувязь з заходнім славянствам.

[2]) Пар. артык. Дурново ў „Slavia“, III, 2—3, 1924, ст. 225—271.

вужэйшымі або з шырэйшымі ізоглёсамі. Між іншым, як на прыклад таго, што процэс з вужэйшай ізоглёсай мог здарыцца раней, чым процэс з шырэйшай ізоглёсай, можна паказаць на тое, што зьмена *л* на *ў*, якая ахапіла продкаў беларусаў і ўкраінцаў, адбылася раней ад зьнікненьня слабых *ъ, ь*, вядомага ўжо ўсім славянскім мовам.

Апроч таго, для кожнай групы дзьвюх, трох славянскіх моваў заўсёды можна падшукаць таксама некалькі агульных ім зьяў, але гэта не дае нам права зараз-жа ўтвараць тэорыю іх пахаджэньня ад агульнай прамовы.

Між іншым, індывідуальнасьць беларускай мовы, як мы бачылі, становяць у значнай меры не пражытыя процэсы, а асаблівасьці, якія зьяўляюцца захаваньнем спрадвечнай спадчыны. Гэтую некаторую архаічнасьць беларускай мовы, можа, трэба тлумачыць тым, што продкі беларусаў, параўнаўча з іншымі славянамі, вельмі мала перасоўваліся ў прасторы. Ня так далёка ад сучаснай Беларусі сядзелі гэродотаўскія *будыны*, якіх акад. Карскі (Белорусы, т. I, ст. 35 і інш.) лічыць магчымым вызнаць продкамі беларусаў. Далей вядома з дасьледзін нябожчыка Казіміра Бугі (гл. Roczn. Slaw. VI, 1—38 і Streitberg Festgabe, 1924, ст. 22—35), што бальтыйцы перадалі славянам (а менавіта беларусам) сваю тэрыторыю яшчэ да таго, як зьявілася першае зьмякчэньне заднянёбных, і да таго, як *ai* праз *e* перайшло ў *я* [1]).

Аб праве тэй ці іншай славянскай гутаркі называцца мовай гавораць яшчэ на падставе таго, ці зрабілася ўжо даная гутарка мовай літаратуры і навукі. Але ня толькі сумненьне ў гэтым, але нават пытаньне аб гэтым у данай залі, у якой сабралася гэтулькі прадстаўнікоў мастацтва, навукі і політыкі, якія пішуць свае поэтычныя творы і артыкулы па розных галінах на данай мове, я лічу ня толькі лішнім, але нават і ганебным.

У заключэньне дазволю сабе ўспомніць урыўкі з вершу слаўнага ўкраінскага пісьменьніка Івана Франка:

Діялект чи самостійна мова,—
Найпустіше в світі це питання;

[1]) Гэта відаць з назваў рэк *Ятра, Яса, Лючоса*, < Aitra, Aisa, Laukesa. Ня можам мы толькі пагадзіцца з апрыорнай думкай Бугі адносна таго, што ўсе гэтыя прaслав. процэсы зьявіліся не раней ад VI стал., бо раней ад гэтага сталецьця славяне, быццам, не маглі выйсьці з свайёй радзімы.

Міліонам треба цього слова,—
І гріхом усяке тут хитання...

Хай та мова вбога в славнім роді,
Хай московська, польська,ческа краща,
Поки служить матері в пригоді,
То вона культурі не пропаща.

Бідні ми, як коні на притоні,—
Збагатить нас труд на рідній ниві,
В діялекті, хоч-би і в жаргоні,
Будемо багаті і щасливі.

Діялект, а ми його надишем
Міццю духа і вогнем любови,
І нестертий слід його запишем
Самостійно між культурні мови.

Дапасоўваючы гэтыя словы да беларускай мовы, мы павінны сказаць, папершае, што ёсьць міліёны, якім патрэбна беларускае слова, падругое, ёсьць міліёны мацярок, якім „в пригоді служить" гэта слова,—тых мацярок, якіх змаляваў Я. Купала ў сваім „Безназоўным", нарэшце, ёсьць шмат працаўнікоў мастацтва і навукі, якія збагачаюць яе „трудом на рідній ниві". Гэта ўсё даводзіць, што беларуская мова— роўнапраўны сябра ў сям'і славянскіх моваў, які мае права на пачэснае месца сярод моваў сусьвету.

Фасмэр. З пункту погляду вывучэньня сучасных гутарак неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на тэорыю хвалі. Калі мы зьвяртаемся да любой граніцы гутарак, то ясна, што для кожнага зьявішча мовы патрэбна ўстанаўляць асобныя граніцы ня толькі для паасобных зьяў, напрыклад, зьмены *г* у *h*, але нават для паасобных слоў з гукам *г*, і тут хістаньні могуць быць досыць значныя. У Нямеччыне ў апошні час лінгвістычнай географіяй займаўся, галоўным чынам, профэсар Бонскага Унівэрсытэту Фрынгс; вышаў цэлы шэраг яго прац, у якіх ён галоўную ўвагу зьвяртае на граніцу паміж ніжня-і сярэдня-нямецкімі мовамі. Сярэдня-нямецкая — гэта больш-менш літаратурная нямецкая мова. Ніжня-нямецкія гутаркі маюць зьмену *chs* у *s*. У сярэдня-нямецкіх гутарках *chs* захавалася бяз зьмены. Значыцца, нямецкія словы *sechs (шэсьць), Ochs (бык), Fuchs (ліс)* адпавядаюць ніжня-нямецкім словам бяз *ch*. Фрынгс дасьледаваў граніцы кожнага слова па вёсках. Ён устанаўляе, што граніца слова *sechs* асабліва далёка зайшла на поўнач пад уплывам гандлю. На поўдзень праходзіць

граніца слова *Ochs*, яшчэ больш на поўдзень—*Fuchs* і менш усяго на поўнач пашырылася слова *vachsen*.

У гандлі, на рынку часьцей усяго ўжываецца слова *sechs*, а з гэтае прычыны яно і далей усяго пайшло.

Тут, значыцца, патрэбна казаць не аб граніцах паасобных гукавых зьяў, але аб граніцы паасобных слоў. Гукавы ўплыў заваёўвае паасобныя словы. Тэорыя хвалі ў сучасных гутарках выяўляецца вельмі навочна, але ў глыбіні вякоў пераходныя гутаркі робяцца для нас няпрыступнымі, бо культурныя цэнтры прыцягваюць да сябе гэтыя гутаркі, і пераходныя гутаркі губляюць свой твар. З гэтае прычыны ў нас, напрыклад, паміж нямецкімі і славянскімі мовамі няма пераходу, у чэскай мове няма пераходу да нямецкае.

Кажучы аб прамовах, усякі сур'ёзны дасьледчык скажа, што па сутнасьці ёсьць столькі моваў, колькі ёсьць індывідаў. Тым ня менш тэрмін прамовы падкрэсьлівае свайго роду аднастайнасьць. Такім чынам выйграе навочнасьць гістарычнага выясьненьня. Мы такім чынам лягчэй можам устанавіць хронолёгію, г. зн. час распаду якое-небудзь мовы. Што датычыцца тэрміну сканчэньня праславянскага часу, то я ня бачу магчымасьці раней IV сталецьця нашай эры казаць аб славянскай мове на тэрыторыі паўднёвых славян, г. зн. у даваеннай Аўстрыі. У ўсходняй Нямеччыне паміж Віслай і Эльбай таксама раней IV стал. цяжка казаць аб славянах.

Больш падрабязна параўнуй маю працу „Die Urheimat der Sloven“ у кніжцы: „W. Volz. Der ostdeutsche Volks boden“. 2-ое выданьне. Leipzig. 1926 г.

Воўк-Левановіч. Проф. Фасмэр закрануў тут пытаньне, якое цікавіць наогул усякага гісторыка якой-бы то ні было мовы, пытаньне чыста мэтодолёгічнае—аб магчымасьці ўводзіць у гісторыю мовы паняцьце „праязык“ (нямецк. „Ursprache“, франц. „langue commune“ і г. д.). Трэба заўважыць, што пытаньне гэтае ўжо старое, яно нават не зьяўляецца пытаньнем XX сталецьця. Супраціўнікам тэорыі „праязыка“ і аўтарам так званай тэорыі „хваль“ (Wellentheorie) зьяўляецца вэймарскі профэсар *Іоган Шмідт*, які разьвінуў сваю тэорыю ў працы „Verwandschaftverhältnisse der indogermanischen Sprachen“, што зьявілася ў Вэймары яшчэ ў 1872 годзе. Там

І. Шмідт адмаўляе ўсякую магчымасьць будаваць клясыфікацыю моўных зьяў па прынцыпе генэолёгіі. Ён гаворыць, што ня было ў мінулым ніякіх „праязыкоў“, г. зн. моваў—„дзядоў“, „прадзядоў“ і г. д., і што ўсе мовы, вышаўшы з аднаго грунту, якім зьяўляецца для славянскіх моваў—мова „праславянская“, разьвіваліся затым кожная самастойна. Па думцы І. Шмідта, ужо ў праславянскай (агульнаславянскай) мове пачалі зьяўляцца тыя гукавыя зьмены, якія цяпер адрозьніваюць асобныя славянскія мовы паміж сабой. Гэтыя зьмены, аднак, зьяўляліся не адразу на ўсёй тэрыторыі пэўнай пляменнай групы, але ў адным якім-небудзь яе месцы, у нязначным моўным асяродку, іншы раз у аднаго толькі індывіда.

Калі новае вымаўленьне падабалася бліжэйшым супляменьнікам, г. зн. у іх моўнай псыхіцы і прыродзе артыкуляцыі меліся ўмовы для новага вымаўленьня, то яно тады пашыралася далей (падобна да кругавідных хваль, якія разыходзяцца ад кінутага ў ваду каменя). Пры гэтым, разумеецца, многія зьмены маглі трапляць ня толькі да бліжэйшых суседзяў, але слабеючымі хвалямі таксама маглі заходзіць і ў тыя мясцовасьці і пляменныя групы, дзе зьмена таго ці іншага гуку адбывалася ў іншым кірунку.

Адсюль і гэтыя „выключэньні“ з асноўных гукавых законаў, адсюль і немагчымасьць правесьці дакладную, абсечаную граніцу тых ці іншых гаворак, бо рысы адных з гэтых гаворак заўсёды сустракаюцца і ў другіх гаворках, хоць-бы ў відзе выключэньняў—у некаторых толькі словах. Гэткая тэорыя „хваль“ у сваёй ідэі. Раней-жа гісторыкі мовы, прымаючы выключна толькі тэорыю „праязыка“, будавалі схэму ўзаемаадносін паміж мовамі і дыялектамі занадта адцягненую, часта не абапёртую на факты жывой мовы. Проф. Бузук правільна адзначыў тут карысьць мэтоду вывучэньня гісторыі і геаграфіі ізоглёс, які абапёрты на тэорыю „хваль“. Аднак, ужываць адзін толькі гэты мэтод, як і адзін толькі мэтод „праязыка“—таксама будзе занадта аднабакова. Па гэтай прычыне мэтод „ізоглёс“ і мэтод „праязыка“, на наш погляд, павінны быць аб'яднаны пры пабудове гісторыі тае ці іншае мовы. Справа ў тым, што тэорыя „хваль“, добра абясьняючы *геаграфічнае* пашырэньне тых ці іншых языковых зьяў, не

дае, аднак, магчымасьці пабудаваць больш-менш ясную схэму *хронолёгічных* узаемаадносін гукавых зьмен. Вось тут і прыходзіць на дапамогу мэтод „праязыка“, які ня мае ніякай іншай мэты, апрача ўстанаўленьня (прыблізнага) тых *эпох*, у якія адбываліся тыя ці іншыя групы гукавых зьмен. Эпохі гэтыя ў гісторыі ўсходня-славянскіх моваў акад. А. А. Шахматаў, карыстаючыся параўнальна-гістарычным мэтодам, устанаўляў наступныя: а) эпоха праязыка агульна-славянскага, б) эпоха праязыка ўсходня-славянскага (рускага), в) эпоха „старарусская“ і г) эпоха самастойных ужо ўсходня-славянскіх моваў— эпоха беларуска-украінска-вялікаруская. У сваім курсе „Введение в курс истории русского языка“ (Пгр., 1916 г.) А. А. Шахматаў тэорэтычна і фактамі абасноўвае падзел мінулага ўсходня-славянскіх моваў на пералічаныя намі эпохі. У гэтай схэме можна прызнаць лішняй, мoжа, толькі эпоху „старарускую“, якой не знаходзім у іншых гісторыкаў мовы. Так і самая тэорыя „прарускай“ мовы не знаходзіць прызнаньня з боку такіх вядомых славістаў, як Фр. Міклошыч, Огоноўскі, Смаль-Стоцкі і некаторых пазьнейшых менш вядомых лінгвістаў. Ня гледзячы на гэтае, усё-ж такі зьяўляецца магчымым пры пабудове гісторыі ўсходня-славянскіх моваў пэўную групу гукавых зьмен адносіць да *эпохі праязыка агульна-ўсходня-славянскага* (рускага), маючы на ўвазе пры гэтым, што, згодна тэорыі „хваль“, гэтая эпоха, як і ўсякая іншая эпоха ў гісторыі мовы, ня можа быць абмежавана дакладнымі хронолёгічнымі вехамі, і аб ёй можна гаварыць толькі ўмоўна.

Такое прымірэньне, абʼяднаньне абодвых мэтодаў скора-ж пасьля зьяўленьня тэорыі І. Шмідта даў вядомы славісты проф. Лейпцыгскага Унівэрсытэту А. Лескін у прадмове да сваёй працы: „Die Declination im Slavisch-Litauischen und Germanischen, Leipzig, 1876“.

Узяўшы ідэю А. Лескіна ў дапасаваньні да ўсходня-славянскіх моваў, будзем разважаць так: згодна тэорыі І. Шмідта, многія рысы з тых, якія цяпер, збліжаючы ўсе славянскія мовы паміж сабой, адрозьніваюць іх ад іншых славянскіх моўных груп, маглі вызначыцца яшчэ ў праславянскую эпоху ў усходніх гаворках праславянскай мовы. Адзначым гэтую ўсходнюю групу літарай *а*. Аднак, аканчальна разьвіліся гэтыя

агульна-ўсходня-славянскія рысы ўжо пазьней, пасьля распаду агульна-славянскай сям'і. У гэтую пазьнейшую эпоху, якую можам азначыць літарай *b*, пашыраліся сярод усх., славян вядомыя нам агульна-ўсх.-славянскія фонэтычныя рысы. Самай характэрнай з гэтых рыс зьявілася „поўнагалосьсе". Гэтая рыса зусім аднолькава, зусім ідэнтычна пашыраецца па ўсёй тэрыторыі ўсходніх славян, і з гэтай зьявы мы ня ведаем аніводнага выключэньня. Калі маюцца прыклады поўнагалосься ў некаторых асобных словах стара-баўгарскай, лужыцкай і часткова славенскай моваў, то гэта толькі рэдкія выключэньні, якія добра тлумачацца якраз тэорыяй хвалявіднага пашырэньня гукавых зьмен. Тое самае можна сказаць і аб *ж, ч* з праслав. *dj, tj,* якая рыса таксама вельмі характэрная для ўсх.-слав. моваў. Праўда, у нас і ўкраінцаў, побач з формамі, якія маюць гук *ж,* ёсьць некаторыя формы з гукам *дж* (ǯ) напр. *джала, джыгнуць, сяджу* і пад. Гэты гук *дж* трэба лічыць, згодна меркаваньням А. Шахматава, пераходным ад **dj* да *ж,* бо і ў жывой мове гэты гук *дж* існуе побач з пераважнай большасьцю форм з *ж: мяжа, стужа* і пад.

Тое самае можна сказаць і аб замене **dl, *tl* на адно *л* *(сало, мыло* з **sadlo, *mydlo* і пад.), аб пачатковым *о* зам. іншаслявянскіх *je (озеро, осень, олень, ольха* і пад. пры іншаслав. *jezero, jeseň, jeleň, jelcha* і пад.) і інш. вядомых усх.-слав. рысах.

Праўда, пытаньне аб пахаджэньні апошняй рысы зьяўляецца спрэчным у навуцы. Гэтак, вядомы славісты, саратаўскі проф. *Г. А. Ільлінскі* ў часопісе „Slavia", II, 2-3, Прага. 1923 г. („К вопросу о чередовании ряда *о—е*") выказваецца супроць прызнаньня гэтай рысы выключнай асаблівасьцю ўсходня-славянскіх моваў (як раней Поцебня, Міклошыч, А. І. Сабалеўскі). Факты, прыведзеныя ў гэтым артыкуле такім вялікім знаўцам славянскіх моваў, як проф. Г. А. Ільлінскі, бязумоўна, зьяўляюцца вельмі каштоўнымі для дэталізацыі нашых вед аб зьяве чаргаваньня *о—е* ў пачатку слова ў слав. мовах. Г. А. Ільлінскаму, аднак, пярэчыць проф. *Н. Н. Дурново* у тым-жа часопісе „Slavia", III, 2—3 вып., стар. 225-271 („Спорные вопросы о.-слав. фонетики"), і скарэй можна згадзіцца з Дурново. Наагул-жа ў гэтым пытаньні ясна адно, што калі і ня можна рашуча гаварыць аб *пе-*

раходзе пачатковага *е ў о на ўсходня-славянскім грунце,* то ва ўсякім разе можна гаварыць аб *пашырэньні* формаў з *о* ў пачатку слова якраз у эпоху праязыка ўсходня-славянскага, як аб зьяве *характэрнай* для ўсіх усх.-славянскіх моваў. Гэтак, у беларускай мове маем усяго толькі два словы з пачатковым *е*—гэта: *яшчэ* (нават—*ашчэ,* з *jеще*) і *еўня* (таксама *ёўня).* У вялікарусаў маем, апрача *ещё, ёж, ежевика* (але *овин*)—пры белар. *ажына, вожык* і г. д.

Такім парадкам, бачым, што зьява гэтая—характэрна для падаўляючай большасьці ўсходня-славянскіх форм. Пакольські-ж у чэхаў, палякаў, сербаў, баўгар і інш. у падобных формах на пачатку слова маем *пераважна je,* то трэба дапусьціць, што пашырэньне гэтай рысы ў іх і процілежнай у нас, як і іншых рыс, характэрных для ранейшай эпохі ў розных славянскіх сем'ях моваў, напэўна адбылося ў эпоху *пасьля распаду* агульна-славянскай сям'і, у *эпоху пераходную,* якую для ўсходніх славян мы азначылі, як эпоху *„праязыка“ ўсходня-славянскага;* для заходніх славян гэтую эпоху можна назваць эпохай „праязыка“ *заходня-славянскага* і для паўднёвых—„праязыка“ *паўднёва-славянскага.*

Такім парадкам, у паступовай зьмене *эпох* у жыцьці ўсіх славянскіх дыялектаў мы выдзелілі ўжо дзьве: *а*—эпоху праязыка агульна-славянскага і *в*—эпоху праязыка агульна-ўсходня-славянскага (рускага), прычым апошняя эпоха характарызуецца далучэньнем да пэўнай сумы агульна-славянскіх рыс яшчэ рыс спэцыфічна ўсходня-славянскіх, галоўнейшыя з якіх мы назвалі вышэй. Аднак, побач з разьвіцьцём і пашырэньнем гэтых агульна-ўсходня-славянскіх рыс, у эпоху *b,* згодна тэорыі „хваль“ у розных канцох усх.-слав. тэрыторыі маглі вызначыцца і некаторыя моўныя рысы мясцовыя, напр., мена *ч* і *ц* (на поўначы) пры модуляцыі праслав. **dl, *tl>, gl, kl* (пскоўск. *веглі, чклі),* рэдукцыя ненаціскных галосных (з якой потым—„аканьне“) у центры ўсходня-славянскай тэрыторыі і пачатак ацьвярдзеньня зычных перад *е, і*—на поўдні.

Паступова да гэтых рыс сталі далучацца іншыя, і ўсе гэтыя рысы, аканчальна вызначыўшыся і закрапіўшыся на пэўных тэрыторыях у эпоху пазьнейшую, якую ак. Шахматаў называе „старарускай“, стварылі ўжо дыялекты *к, l, m,*

якія затым, пад уплывам розных фактараў палітычных, культурных і экономічных, аканчальна аформіліся ў сучасныя самастойныя мовы—беларускую, украінскую і вялікарускую. Значыць, эпоха, калі на абшары ўсходняга славянства была толькі мова *b*, якая характарызавалася пэўнай колькасьцю агульна-славянскіх рыс з дадаткам рыс спэцыфічна ўсходня-славянскіх, гэтая эпоха—у адносінах да эпохі пазьнейшай, калі вызначыліся дыялекты *к, l, m,*—зьяўляецца *эпохай* якбы агульнага продка гэтых дыялектаў—*„праязыка“ ўсходня-славянскага.* Такім парадкам, тэорыю ўсходня-славянскага „праязыка“ мы прымаем толькі як неабходны мэтод—для сыстэматызацыі, клясыфікацыі моўных рыс, што характарызуюць сучасныя ўсходня-славянскія мовы ў іх гістарычнай эволюцыі. Гэтак бачым, што мэтод „ізоглёс“, які базуецца на тэорыі „хваль“, у поўнай меры можа ўжывацца побач з мэтодам „праязыка“: першы добра асьвятляе географічнае пашырэньне моўных рыс, а другі—дае больш-менш ясны малюнак хронолёгічных узаемаадносін іх у мінулым.

У заключэньне сваёй прамовы я хацеў-бы сказаць яшчэ некалькі слоў „pro domo sua“ з повaду закранутага тут пытаньня аб дысыміляцыйным аканьні ў беларускай мове.

Проф. Фасмэр выказаў тут некаторае зьдзіўленьне з поваду маёй думкі аб тым, што аканьне зарадзілася ў краіне квывічоў. З гэтага поваду павінен сказаць, што мая гіпотэза (з якой напэўна яшчэ ня ўсе пазнаёміліся па маёй брошуры „Беларускае аканьне“) базуецца вось на якіх меркаваньнях. Аканьне ў паўночна-ўсходняй Беларусі (краіне квывічоў смал.-полацкіх) захавалася да нашага часу ва ўсіх сваіх архаічных фонэтычных тыпах (дысыміляц. в*ыдà,* д*ыбрá,* д*ілá,* ж*илá*іш і пад.; таксама пераднаціскныя *а, я,* калі пад націскам *і, ы, у:* дзяцьм*і,* к*а*сьцьм*і,* сва*яму* і пад., але: в*і*с*é*льля, с*і*сьцёр і пад.).

Між тым, у паўднёва-вялікарускай краіне часта сустракаем дысыміляцыйнае „яканьне“—г. зн, паяўленьне *і (ы)* на месцы асноўнага *е (э)* перад націскным складам, калі ў апошнім ёсьць *а (я)*—і вельмі рэдка сустракаецца дысыміляцыйнае „аканьне“, г. зн. *ы* на месцы асноўнага *о,* калі пад націскам *а (я).* Прыклады апошняга засьведчаны ў курскіх і варонескіх гаворках у час нядаўняй дыялектолёгічнай па-

ездкі Н. Н. Дурново і Ефрэмава. На жаль, я ня меў магчымасьці азнаёміцца з запісамі названых вучоных, але думаю, што выпадкі дысыміляцыйнага аканьня ў Варонескай і Курскай губ. можна разглядаць, як занесеныя туды беларускімі (крывіцкімі) перасяленцамі. У паўднёва-ж беларускіх (дрыгавіцкіх) гаворках—пры некаторых выпадках дысыміляцыйнага „яканьня“—дысыміляцыйнае аканьне зусім, наколькі ведаю, не сустракаецца (ёсьць: *німà, ніхáй,* зрэдка—*дзілá, нíслá* і пад., але няма: *выдà, ыгà, барыдà* і пад.). З усяго гэтага я раблю вывад, што аканьне магло зарадзіцца якраз у крывічоў, а ў значнай часьці паўдн. вялікарусаў і дрыгавічоў—яно зьява запазычаная.

Німчынаў. Пытаньне, якое ў нас сягодня абгавараецца, зьяўляецца вельмі важным. Прэзумпцыя прамовы нарабіла шмат шкоды ў справе гістарычнага вывучэньня моваў усходня-славянскай галіны; і вось з гэтай прычыны я з прыемнасьцю праслухаў даклад проф. Бузука, які ня быў збудаваны на гэтай прэзумпцыі. Запраўды, што становіць з сябе гэта „рабочая“ гіпотэза прамовы? Як яе можна скарыстаць у справе гістарычнага вывучэньня ўсякай мовы? Калі гэта гіпотэза не прэзумпцыя, выходзячы з якой імкнуцца высьветліць усе зьявы данай групы моваў, тады прамова можа быць пабудавана толькі пасьля доўгага і падрабязнага дасьледаваньня з дапамогай мэтоду гістарычна-параўнаўчага вывучэньня данай групы моваў. І толькі пры такім дакладным вывучэньні ізоглёс паасобных груп мовазнаўцы змогуць спроектаваць цэлую сетку ізоглёс у адзін гістарычны пункт, і толькі тады будзе магчымым гаварыць аб прамове. Гэта „рабочая“ гіпотэза значна больш зручнай і больш карыснай будзе тады, калі яна зьявіцца вынікам падрабязнага вывучэньня за дапамогай мэтоду ізоглёс. Вось чаму такі падыход да вывучэньня зьяў у даным выпадку беларускай мовы, які ўжыў проф. Бузук, усяляк трэба вітаць.

Я хацеў-бы цяпер паказаць на конкрэтных прыкладах, на колькі шкадліва адбівалася на проблемах усходня-славянскага мовазнаўства злоўжываньне прэзумпцыяй прамовы. Тут якраз папярэдні дакладчык—опонэнт проф. Бузука—так яскрава паказаў, да чаго прыводзіць мэтод прамовы.

Бяруць пэўную колькасьць аднолькавых моўных зьяў, якія характарызуюць даную групу гутарак, і вось на аснове гэтага выводзіцца штучная будова прамовы. А дальш усе аднолькавыя зьявы данай групы будуць тлумачыцца, выходзячы з гэтай прамовы, якая сконструявана на грунце 3—4—10 аднолькавых фактаў. Гэта, памойму, можна добра паказаць на тых памылковых поглядах, якія сучаснае мовазнаўства зусім адкідае, вывучаючы больш падрабязна зьявы ўсходня-славянскіх моваў мэтодам параўнаўча-гістарычнага і географічнага вывучэньня ізоглёс данай групы моваў. Возьмем самую надворна-паказальную агульнасьць усіх моваў усходня-славянскіх—гэта поўнагалосьсе. Запраўды, на першы погляд поўнагалосьсе зьяўляецца характэрнаю прыметаю ўсіх усходня-славянскіх моваў. Але, калі не абмежавацца такім першым павярхоўным уражаньнем, а зьвярнуцца да гістарычнага, падрабязна-дасканальнага вывучэньня гэтай зьявы, мы ўбачым такі факт, які паказвае, што гэта зьява ў мовах усходня-славянскай групы неаднолькавая. І той факт, які чамусьці ўпарта папярэднія мовазнаўцы не прымячалі, што ў украінскай мове поўнагалосьсе адзначаецца асаблівым характарам другога *о* пасля *р*, ужо характарызуе, што гэта зьява ў расійскай і ўкраінскай мовах неаднолькавая. Бо калі-б яна была аднолькавая, мы-б мелі ў украінскай мове не *горох, мороз,* а мелі-б *горіх, моріз*. Значыць, украінская мова сьведчыць аб тым, што *о* перад *р* і пасьля *р* было неаднолькавае, тады калі расійскі дыялектолёгічны матар'ял не дае падстаў гаварыць, што яно было перад *р* і пасьля *р* рознае. Гэта гаворыць за тое, што поўнагалосьсе зьяўляецца не такім ужо абсолютным для ўсходня-славянскай прамовы, як аб гэтым гавораць прыхільнікі тэорыі дрэва.

Дальш, з аднаго боку спасылаюцца на рэфлексы—tort у ўсходня-славянскіх мовах, як на найабсолютны довад агульнасьці, адзінства прамовы ўсходня-славянскай, агульнарускай, а з другога боку, не зварочваюць увагі на тое, што гэта ўжо не такая характэрная рыса ў славянскіх мовах, на якой можна цалком грунтавацца, як на довадзе існаваньня прарускае мовы. Гэтыя-ж самыя рысы злучаюць у адну групу мовы заходнія—славацкую і чэскую з мовамі паўднёва-славянскай групы—сербскай, баўгарскай і г. д. Значыць, калі-б

гэта было бясспрэчным довадам існаваньня прамовы, дык мы маглі-б гаварыць аб прыналежнасьці чэскай і славацкай моваў да паўднёва-славянскай групы. Тутака, як асноўны рэфлекс групы—tort, чэскае—*ra*—зьвязвае чэскую мову з групай паўднёва-славянскіх моваў. Так што па гэтай зьяве „агульнарускай мовы“ мы бачым, што ня так цьвёрда стаіць пытаньне дасьледаваньня гэтай усходня-славянскай ізоглёсы.

Зварочваемся дальш да гэтых характэрных прымет „агульнарускай мовы“, бярэм хоць-бы пачатковае *о* ў мове ўсходня-славянскай групы адпаведна з *е* ў іншых славянскіх мовах. Тутака гаварылася аб артыкуле Ільлінскага і адказе на яго Дурново. Але яшчэ раней—у 80 г. мінулага сталецьця—Потэбня адзначаў, што, разглядаючы гэту адпаведнасьць *о* і *е*, мы павінны, папершае, прыняць пад увагу малую колькасьць прыкладаў і, падругое, тое, што пры малой колькасьці фактаў і прыкладаў ёсьць паказаньні ў мовах заходніх і паўднёвых груп на пачатковае *о*, і з другога боку, у мове рускіх груп таксама маем гэту роўналегласьць, напр., *ежевика*—паукраінску—*ожына*. Такім чынам, факты гавораць, што тутака штось ня так—нельга гэтыя неверагодныя факты прыцягваць да пабудовы гіпотэзы праруская мовы.

Дальш, ня ведаю, чаму ня ўспомнілі аб спэцыяльным дасьледаваньні пад назваю „Oboczność *o—je* w językach słowiańskich“ (Rocznik sławistyczny, t. VIII) Развадоўскага, дзе апошні вельмі добра тлумачыць роўналежнасьць, як рэфлекс зьяў праславянскіх. Якраз Развадоўскі грунтоўна ўстанаўляе закон, які дзейнічаў у праславянскай мове,—закон асыміляцыі раду *о* ў гуку *е* наступнага складу. Калі мы прымем гэты закон, для нас будуць ясныя дублеты *о—е* і ў усходня-славянскай мове і ў іншых мовах. Якраз аб гэтай працы чамусь не ўспаміналі, а памойму яна тлумачыць шмат што, напр., яна тлумачыць, што дублеты *о—е* зьяўляюцца проста вынікам інда-эўропейскага (славянскага) чаргаваньня галосных раду *о, е,* якое паказвае славянскія рэфлексы для назваў, напр., *лебедзя*. Праформа для слова *лебедзь* была форма з пачатковым *ол*. Сербская і польская мовы сьведчаць нам аб ступені *о,* а расійская мова сьведчыць аб ступені *е* і г. д. Прыняўшы гэты закон мы можам цалком стаць на пункт погляду проф. Ільлінскага і адкінуць усе нягрунтоўныя пярэчаньні

проф. Дурново. Дальш бярэм рэфлексы *tj, dj*. Вядомае адзінства (шыпячыя рэфлексы) усходня-славянскіх і паўднёва-славянскіх моваў паказвае, што гэта зьява, як відаць, больш раньняя, чым эпоха ўсходня-славянскай прамовы, бо падабенства рэфлексаў сербска-баўгарскіх і расійска-украінска-беларускіх паказвае, што яна пачалася, прыблізна, раней усходня-славянскага адзінства, якое дапушчаюць. З другога боку, калі мы ўжо возьмем факты ў межах самай усходня-славянскай групы, мы ўбачым непадабенства працэсаў, бо, як паказана тутака, у беларускай, як і ў украінскай мовах, ёсьць рэфлекс *дж*, што гаворыць аб тым, што працэс гэты хоць і датуецца раней эпохі агульнарускага адзінства, але ў гістарычным разьвіцьці расійска-украінска-беларускай моваў праходзіў розна.

Успомнім яшчэ аб розьнасьці ў вымаўленьні зычных перад *е* і *і*. Як вядома, у чэскай мове зычныя перад гэтымі галоснымі вымаўляюцца цьвёрда, а ў славацкай—мякка. Тое самае ў беларуска-расійска-украінскіх адносінах. У украінскай мове вымаўленьне цьвёрдае *(нэбо)*, у беларускай і расійскай мовах—мяккае *(неба)*. Кульбакін у працы „O pracach Szachmatowa, dotyczących sie polszyzny (Rocznik sławistyczny, t. II) ацэньвае гэту зьяву, як належачую да праславянскай эпохі. Калі-ж Кульбакін піша сваю кнігу „Украінский язык“, ён ацэньвае яе, як гаворыцца ў прадмове да гэтай кнігі, ужо з пункту погляду адзінства рускай мовы, забываючы свой ранейшы погляд у „Roczniku“ і пераходзячы на тэорыю агульнарускага адзінства.

Я хацеў яшчэ сказаць аб тым, што Шахматаў, выдатны расійскі лінгвісты, у аднэй працы, прысьвечанай уласна гэтаму пытаньню аб зацьвярдзеньні зычных перад *е*, *і* ў украінскай мове, так пісаў аб мэтодзе дасьледаваньня пытаньня: „Я буду выходзіць з фактаў прарускае мовы“. Гэта вельмі характэрна.

Усе гэтыя факты характарызуюць, што ў даны момант нам трэба вельмі асьцярожна падыходзіць да рабочай гіпотэзы прамовы, асабліва нам, што вывучаюць зьявы моваў усходня-славянскай групы, дзе найбольшую шкоду ў справе об‘ектыўнага разуменьня фактаў зрабіла гэта тэорыя агульнарускай мовы.

Я хацеў зьвярнуць увагу яшчэ на адну зьяву. У тым тлумачэньні, якое давалася і даецца беларускім дыфтонгам заходняй часткі Беларусі, паважаны проф. Бузук у даным выпадку, тлумачачы гэтыя дыфтонгі, выходзіў з позыцыі прамовы. Вучоныя, што сталі на мэтод прамовы, прабавалі тлумачыць гэта ўплывам украінскай мовы на беларускія гутаркі або ўплывам беларускай мовы на ўкраінскія гутаркі. Былі розныя спрэчкі і розныя довады. Але вось праца Лера „O śladach różnic intonacyjnych w językach ruskich“ (Rocznik sławistyczny, t. VIII) з вялікай пераконваючай сілай даводзіць, што беларускія дыфтонгі зьяўляюцца на месцах акутавай і новаакутавай інтонацыі. Украінскія факты паказваюць тое самое, і ўкраінскі дыфтонг можна тлумачыць, як рэфлекс акутавай і новаакутавай інтонацыі. Ужо ў спэцыфічных умовах украінскай мовы, уласна там, дзе акуты пападалі ў спэцыфічна-ўкраінскія ўмовы, г. зн., зачынены склад,—гэта тлумачэньне таксама зьяўляецца прыкладам дасягненьня пэўных вынікаў, ня выходзячы з тэорыі прамовы.

Я хацеў сказаць, як рэзюмэ, што позыцыю проф. Бузука, уласна для вывучэньня беларускай мовы, як аднэй з усходня-славянскіх, трэба горача вітаць. Гэта ёсьць якраз тое, што патрэбна зараз пры дасьледаваньні моваў усходніх славян. На першых часох лепш і карысьней для нашых канчатковых вывадаў трохі забыцца аб тэорыі прамовы. Што тычыцца прыналежнасьці гутаркі да тае ці іншае моўнае групы, дык я думаю, што той мэтод, які рэкомэндаваў проф. Бузук—мэтод чытаньня нэўтральных моваў, у даным выпадку можа дапамагчы; яго трэба толькі корэктаваць. Неабходна вывучэньне вымаўленьня данага краю. Кожная мова мае сваю артыкуляторную базу, якую заўсёды можна апісаць і дакладна азначыць. Таму той практычны мэтод, які паказвае проф. Бузук, каб азначыць, на якой мове гаворыць вёска—на беларускай, украінскай ці расійскай,—думаю, вельмі паможа, калі яго корэктаваць мэтодам паверкі адносін да вядомай артыкуляторнай базы.

Фасмэр. Тут абмяркоўваўся цэлы шэраг складаных пытаньняў, і я лічу, што такія пытаньні занадта спэцыяльныя для гэткага вялікага сходу. Мы напэўна ў некаторых выпадках адзін аднаго не зразумеем, але мне хацелася-б пад-

крэсьліць, што я да гэтага часу, ня гледзячы на пярэчаньні, якія чутны былі ў канцы першага пасяджэньня, прытрымліваюся тае-ж думкі, што і раней выказаў: зьяўленьне гуку *о* ў такіх словах, як *озеро, олень, осень* і г. д., ня ёсьць інда-эўропейскае, а толькі ўсходня-славянскае. З тэорыяй Ільлінскага я ня згодзен. Памойму, гэтая тэорыя надзвычайна падазроная, яна дае адзін ненадзейны матар'ял, які патрэбна зусім выключыць.

Успаміналася тэорыя Развадоўскага, які дае тлумачэньне пачатковага галоснага праслявянскага гуку ў такіх выпадках, як стара-славянскае І-Єзеро. Я гэтую тэорыю Развадоўскага лічу зусім правільнаю, але яна да ўсходня-славянскага, больш познага часу, ня мае ніякіх адносін. Той, хто спасылаецца на Развадоўскага і думае, што ён гэтым што-небудзь даводзіць для ўсходня-славянскіх моваў, той, бязумоўна, зьмешвае дзьве зусім розныя зьявы. Рознагалосьсі ў усходня-славянскіх мовах ня могуць быць довадам таго, што гук *о* ў другім складзе слоў, як *мороз*, зьявіўся ў надта позны час, бо мы маем магчымасьць растлумачыць гэтую асаблівасьць. Варта толькі дапусьціць, што падаўжэньне *о* ў такіх выпадках, як *дом, ноч,* ужо адбылося ў той час, калі адбылося поўнагалосьсе ў усходня-славянскіх мовах, і што новае *о* ў такіх выпадках, як *мороз,* зьявілася потым і з гэтае прычыны не падоўжылася,—і ўсё робіцца ясным.

Я ня імкнуся пераканаць тых, хто прытрымліваецца іншага погляду; гэта досыць цяжка зрабіць у працягу некалькіх хвілін, але я хачу падкрэсьліць, што мая думка ад паказаньня на такую форму, як *мороз* у ўкраінскай мове, зусім не зьмяняецца.

Цяпер аб тым, што гаварылася аб пэрыодах у мове. Памойму, калі хто разглядае якую-небудзь мову гістарычна, ён павінен лічыцца і з такім часам, які па помніках не вызначаецца. Але я лічу даволі небясьпечным казаць тут аб гістарычных і дагістарычных часох у мове. У нас былі выпадкі, напрыклад, у нямецкай мове, калі патрэбна было пераглядзець старую думку: аб дагістарычным і гістарычным пэрыодзе; здавалася, што тут магчыма гаварыць аб эпохах перад і

пасьля зьяўленьня пісьменнасьці. Але потым была зьвернута ўвага дацкім лінгвістам Томсэнам на вельмі старыя нямецкія запазычаньні ў фінскіх мовах. Ён знайшоў у сучаснай фінскай мове гэткае слова, як *Kuninhas* замест *König*, дзе апошні склад мае галосны гук. Гэтая гукавая форма—старэй таго, што вядома з пісьменных помнікаў. Гэты дакумант ня ўступае помніку, і вось куды трэба адносіць гэтае зьявішча канчатку слова ў нямецкіх мовах,—к гістарычнаму або дагістарычнаму пэрыоду, калі нямецкія мовы мелі канцовы склад *as*? Для мяне гэта пытаньне, якое цяжка вырашыць. Таксама, памойму, патрэбна адрозьніваць тое, што імкнуцца толькі рэканструяваць тэорэтычным шляхам, ад таго, што засьведчана прыкладам. Мы, бязумоўна, павінны зварачаць вялікую ўвагу на хронолёгію зьяў. Але я лічыў-бы даволі небясьпечным казаць аб гістарычным і дагістарычным часе паводле фактаў мовы, бо тое, што здаецца дагістарычным, раптам можа зьявіцца гістарычным. Але хронолёгію, бязумоўна, вельмі важна ўстанаўляць.

Цяпер скажу адносна тэорыі хвалі і тэорыі родаводнага дрэва. Я трохі быў зьдзіўлены, што нас падзялілі на дзьве групы: групу, якая прызнавала адно вучэньне, і на другую групу, якая далучалася да другога вучэньня. Колегай Воўк-Левановічам было ўстаноўлена, што ўжываньне ў мовазнаўстве тэорыі хвалі было вельмі пашырана ў 70-х гадох XIX сталецьця, аднак, пры гістарычным разглядзе якоенебудзь мовы я наагул не магу ўявіць сабе, каб сучасны вучоны опэраваў выключна з тэорыяй хвалі і ня прымаў-бы пад увагу тэорыю родаводнага дрэва. Для мяне і адна і другая тэорыі неабходны ў навуцы.

Потым, калі мы кажам аб праславянскім часе і прызнаем эпоху паасобнага жыцьця паасобных славянскіх моваў, то ў нас бязумоўна ёсьць пераходны час ад аднаго пэрыоду да другога, які цяжка ўстанавіць, але, хаця гэтыя эпохі ў мове некалькі штучныя, мы тым ня менш такія эпохі ўстанаўляем. Я падкрэсьліваю, што вельмі важна пасьля распаду праславянскае мовы прызнаць такі час, калі існавала нязначная розьніца паміж паасобнымі славянскімі мовамі, дзякуючы чаму магчымы былі яшчэ зносіны між паасобнымі групамі і пашырэньне моўных зьяў на ўсёй іх тэрыторыі. Гэты час

ілюструецца хоць-бы такімі словамі, як *кароль* ад імя Карла Вялікага, якое пашырылася па ўсёй славянскай тэрыторыі. Сувязь між паасобнымі славянскімі мовамі яшче існавала, але я не назваў-бы гэту сувязь праславянскім часам, ня гледзячы нават на тое, што некаторае падабенства ў зьменах гэтага імя з праславянскімі адчуваецца, бо ў той час, калі імя Карла Вялікага было запазычана, славяне ўжо пашырыліся па сваёй тэрыторыі, дзе разам з тым магчыма і павінна было зьявіцца некалькі новых зьяў у паасобных мовах.

Гэты пераходны час варта назваць *агульна-славянскім* або патрэбна прыдумаць іншы тэрмін, які-б адрозьніваўся ад праславянскага. А праславянскі час для мяне—гэта папярэдні пэрыод з нязначнымі мясцовымі розьніцамі, настолькі нязначнымі, што іх амаль што магчыма зьвесьці ў самыя старажытныя часы да нуля. Пытаньне іншае—наколькі вялікая была група асоб, што гаварыла на праславянскай мове. Для вырашэньня яго ў нас, бязумоўна, пакуль што дадзеных няма. Мне здаецца бясспрэчным, што адзінства ўсходнеславянскіх груп моваў неабходна прызнаць. Бо ясна, што беларуская мова з расійскаю мае шмат чаго агульнага, з украінскаю—таксама. І калі мы прызнаем такое адзінства, то гэта яшчэ ня значыць, што мы выказваемся супроць самастойнасьці беларускай або ўкраінскай мовы, што мы лічым беларускую і ўкраінскую мовы толькі гутаркамі. Адзінства для мяне бясспрэчна; яно сьведчыцца вялікаю колькасьцю агульных зьяў паміж паасобнымі ўсходня-славянскімі мовамі. Гэтае адзінства магчыма назваць расійскім або ўсходняславянскім—гэта для мяне розьніцы ня мае, але сумнявацца ў яго існаваньні нельга. Напрыклад, поўнагалосьсе ў такіх выпадках, як *горад, бераг, волас, малако* і г. д.,—гэта бязумоўна ўсходня-славянская асаблівасьць, у якой беларуская мова супадае з украінскай і расійскай,—гэта старая рыса, і я-б на яе зьвярнуў большую ўвагу, чым на супадзеньні беларускае і польскае, што адносіцца да больш познага часу. Зьмена гуку *г* у прыдуўны гук маецца ў беларускай, украінскай, чэскай і верхня-лужыцкай мовах у вельмі падобнай форме, але мы ня маем права лічыць яе старою, бо ў нас маецца магчымасьць на аснове мясцовых назваў або на аснове лацінскіх або нямецкіх крыніц устанавіць

хронолёгію гэтай зьявы для чэскай і лужыцкай мовы. Там гэтую зьяву мы знаходзім больш позна, раней XII ст. аб ёй нельга казаць. Падабенства з беларускаю моваю тут выпадковае. І такіх выпадковых супадзеньняў ня мала. Аднак, нам прыходзіцца ў гісторыі мовы даражыць больш старымі супадзеньнямі, якія сьведчаць аб усходня-славянскім адзінстве.

У дакладзе проф. Бузука мне здалося, што ён ня зусім правільна аддзяляе старажытныя зьявішчы ад больш позных. Яшчэ адзін прыклад выпадковага ўзьнікненьня аднолькавых зьяў незалежна адна ад другой у розных мовах. У нас ёсьць довады таго, што гэтак званая перастаноўка плаўных у паўднёвых славян зьявілася ўжо пасьля таго, як яны занялі свае сучасныя месцы расьсяленьня, што беларуская і сербская мовы на сваіх сучасных мясцох яшчэ ня мелі яе. Гэта сьведчыцца славянскімі мясцовымі назвамі ў Грэцыі і Альбаніі і славянскімі запазычаньнямі ў грэцкай і альбанскай мовах. Перастаноўка адбылася толькі потым у сербскай, баўгарскай, славянскай і чэскай мовах у зусім аднолькавай форме, але ўсё-такі без непасрэднай сувязі.

Адносна хронолёгіі закранутых тут гукавых зьяў у мяне ёсьць сумненьне, але з прычыны таго, што гэта спэцыяльна да беларускае мовы ня мае ніякага дачыненьня, мне ня хочацца на іх спыняцца. Адзначу толькі, што такія словы, як *чрѣшьня-вишня,* я ня лічу прыгоднымі для ўстанаўленьня хронолёгіі зьмены *с* у *х* у праславянскай мове, бо гэтая зьмена вельмі старая. Але гэтае пытаньне вельмі складанае і яно зьвязана з інда-эўропейскаю параўнальнаю граматыкаю.

У заключэньні адзначу, што вельмі важна ўстанавіць дакладныя граніцы кожнай моўнай зьявы на пэўнай тэрыторыі, і мяне асабліва цешыць тое, што колега Бузук гэтым пытаньнем займаецца ў апошнія часы на беларускай глебе.

Цьвяткоў. Паважаная Конфэрэнцыя! Калі мы гаворым аб тым ці іншым спосабе працы, дык мы судзім аб ім па тым, як гэты спосаб адбіваецца на самой працы: гэта ёсьць мэтодолёгічнае пытаньне. З гэтага пункту погляду мы можам раўнаваць тэорыю хваль з тёорыяй родаслоўнага дрэва. Калі мы возьмем другую тэорыю, г. зн. тэорыю родаслоўнага дрэва, дык мы павінны зьвярнуць увагу на тое, што карыстаньне гэтай тэорыяй ня вельмі нам дапаможа. Сапраўды,

калі мы будзем карыстацца фонэтычнымі дадзенымі, дык у нас будзе шмат неразьвязаных пытаньняў з пункту погляду родаслоўнага дрэва, напрыклад, у сэнсе *зямля* ў Баўгарыі кажуць *земя,* што падобна да польскага слова: у баўгар, як і ў заходніх славян, *л* тутака няма. Дальш, калі мы будзем пасылацца на якасныя памякчэньні зычных гукаў, дык атрымаем тое самае: у славенцаў кажуць *ноч,* дзе *ч* цьвёрдае, як пабеларуску і паўкраінску, у той час як у расійскай мове гэты гук некалькі памякчаецца—кажуць *ночь;* атрымліваецца розьніца паміж усходня-славянскімі мовамі і набліжэньне некаторых з іх да аднэй з паўднёва-славянскіх моваў. Затым мы кажам, што тэорыі хваль прытрымліваюцца больш для мэтаў мэтодолёгіі мовазнаўства. Гэта зусім зразумела; калі-б мы прынялі гэту тэорыю хваль, дык ня было-б так шмат недакладнасьцяй у галіне мовазнаўства. Што такое македонцы? Калі мы возьмем тэорыю хваль, дык моўныя асаблівасьці македонцаў будуць зразумелы, але калі мы возьмем тэорыю родаслоўнага дрэва, дык для нас гэтыя зьявы ня зусім зразумелы. Ня зусім лёгка тлумачыцца гэта быццам прамежнае становішча македонцаў паміж сербамі і баўгарамі, калі мы ўжываем тэорыю родаслоўнага дрэва. Між тым тэорыя хваль карысна ўжо тым, што дае нам вобразнае прадстаўленьне аб зьявах. Мы бачым конкрэтную зьяву і ў даным выпадку гэта прадстаўляе вядомую ўсім каштоўнасьць для вывучэньня становішча народу сярод іншых блізкіх яму народаў.

Што такое расійцы, беларусы, палякі і іншыя? Што такое наагул славяне? Гэтыя пытаньні тычацца ня толькі мовы, але і псыхолёгіі, бо зьявы мовы цясьнейшым чынам зьвязаны з побытам, а ў залежнасьці ад розных матар'яльных і інш. умоў адпаведным чынам ішла зьмена і ў экономіцы.

Тэорыя хваль, як рабочая гіпотэза, дае нам большую адпаведнасьць з хваляпадобным зьменным бегам жыцьця, чым іншыя мэтодолёгічныя прыёмы ў нашай навуцы. Калі-б мы глядзелі чыста мэтафізычна, дык мы маглі-б пайсьці далей—бачыць у родаслоўным дрэве моваў штосьці рэальнае. А тэорыя хваль зьяўляецца зусім здавальняючаю гіпотэзаю, апрача таго, каштоўнаю ўласна сваім ухілам у бок сапраўднай рэальнасьці.

Якраз у галіне славянскіх моваў мы бачым вялікую блытаніну: ня ведаюць, да якой моўнай галіны аднесьці некаторыя мовы. Возьмем, напрыклад, пераходныя гаворкі паміж беларусамі і палякамі, і мы ня будзем ведаць, да якой галіны яны належаць. Калі-ж мы будзем прытрымліваццa тэорыі хваль, дык мы дамо гэтым гутаркам належнае месца. Тое самае будзе і з пераходнымі гутаркамі паміж украінцамі і славакамі і з пераходнымі гутаркамі паміж баўгарамі і сербамі і г. д. Такім чынам мы можам даць больш-менш адпаведнае тлумачэньне кожнай зьяве і знайсьці належнае месца кожнаму факту. Мы бачым, што ёсьць вялікая рознастайнасьць, напрыклад, адносна якасных памякчэньняў зычных гукаў у славянскіх мовах. Нават у адным толькі ўсходнім славянстве рознастайнасьць значная: яна выяўляецца, паміж іншым, і ў тым факце, што якаснае памякчэньне зычных гукаў, напрыклад, у Заходняй Беларусі наўрад ці такое самае ўва ўсіх дэталях, як і ва ўсходняй.

Такім чынам, як на рабочую гіпотэзу, нам неабходна зьвярнуць увагу ўласна на тэорыю хваль. Што гэта тэорыя ня новая, дык гэта яшчэ лепш, бо гэта азначае, што яна магла выявіць сябе на практыцы.

Воўк-Левановіч. Я хачу даць некаторыя тлумачэньні да папярэдняй сваёй прамовы, дзеля таго, што з слоў колегі Німчынава я ўбачыў, што ён мяне, ды бадай і проф. Фасмэра, прыняў за заўзятых абаронцаў выключнасьці тэорыі „прамовы“ ў тым чыстым яе відзе, які проста ўсходзіць да тэорыі „родаслоўнага дрэва“. Апошняя-ж лічыць, што тыя або іншыя моўныя зьмены, раз зарадзіўшыся ў тэй або іншай групе дыялектаў, клалі тым самым паміж ёю і раней агульным моўным цэлым рэзкую мяжу, што не дапускала ў далейшым паміж гэтым цэлым і вылучанымі частковымі ніякіх агульных зьяваў, падобна да таго, як ветка, аддзяліўшыся ад дрэва, расьце ўжо ў іншым кірунку ад яго.

Выступаючы тутака супроць *канчатковага* ўхіленьня *мэтоду* прамовы, я (ды, думаю, і проф. Фасмэр) далёкі быў ад толькі што памянутага пункту гледжаньня. Я думаю, што даволі ясна выказаўся ў тым сэнсе, што, прызнаючы мэтод ізоглёс, што базуецца на Шмідтаўскай тэорыі „хваль“, я ўсё-ж прызнаю, што мэтод „прамовы“ ня толькі не выклю-

чае мэтоду ізоглёс, але цалком зжываецца з ім. Такім чынам гаварыць аб „прэзумпцыі“ (як выказваецца колега Німчынаў) рабочага мэтоду „прамовы“ ў нашым разуменьні ня прыходзіцца; абодва яны—і мэтод прамовы і мэтод ізоглёс—роўнапраўны і роўнакаштоўны, абодва яны—*толькі рабочыя мэтоды,* якія дапамагаюць больш усебакова асьвятляць распаўсюджанасьць тых або іншых моўных рысаў ня толькі тэрыторыяльна, але і хронолёгічна. З прычыны гэтага нельга згадзіцца з тэндэнцыяй колегі Німчынава зусім адкінуць тэорыю „прамовы“ ўсходня-славянскай, дапушчаючы ў тойжа час існаваньне ў мінулым прамовы агульнаславянскай.

І запраўды, якія довады паважаны колега Німчынаў прыводзіць супроць дапушчэньня аб існаваньні *эпохі* так званае прамовы ўсходня-славянскай? Ён адшуквае дробныя, усім вядомыя выключэньні з ідэнтычнай распаўсюджанасьці буйнейшых усходня-славянскіх рысаў і гэтымі выключэньнямі хоча закрыць усю масу фактаў з характэрнай усходня-славянскай афарбоўкай, што кідаюцца ў вочы кожнаму, нават не-спэцыялісту. Так, напрыклад, выклікае пярэчаньні дапушчэньне колегі Німчынава, не падмацаванае ні помнікамі старажытнай пісьменнасьці, ні жывымі гутаркамі, а пабудаванае выключна так званым *лёгічным* мэтодам,—аб тым, што характар украінскага поўнагалосься іншы, чым вялікарасійскага і беларускага. Дапушчэньне колегі Німчынава аб тым, што поўнагалосьсе зьявілася не ў аднолькавым відзе ў беларусаў і вялікарасійцаў, з аднаго боку, і ўкраінцаў—з другога, па правільнай заўвазе проф. Фасмэра ёсьць маленькае непаразуменьне. У дадатак да меркаваньняў проф. Фасмэра я лічу мажлівым выказаць і яшчэ адно. Мне здаецца, што факт непераходу ў украінскай мове другога *о* ў словах накшталт *горох, город* у *і* (горíх, горíд) у той час, як такі пераход меў месца ў украінскіх *кінь, ніс* і да т. п., яшчэ ня сьведчыць аб тым, што поўнагалосьсе ў украінцаў і беларусаў з вялікарасійцамі было неаднолькавае пры сваім узьнікненьні. Трэба ўспомніць, што поўнагалосьсе зьявілася з праславянскіх груп **tort—*tolt, *tert—*telt;* на ўсходня-славянскай глебе з гэтых груп зьявіліся *torot—tolot, teret—telet,* прычым другі галосны (пасьля плаўнага) у гэтых апошніх групах не адразу зьявіўся ў відзе галоснага поўнага ўтва-

рэньня *о* або *е;* справядлівей за ўсё на першых часох ён быў паразытным *ъ* або *ь,* які толькі з працягам, бясспрэчна, доўгага часу стаў галосным поўнага ўтварэньня, асыміляваўшыся з папярэднім асноўным галосным, які прыходзіўся перад плаўным. І такія адносіны мелі месца ня толькі ў украінскай групе гутарак, як гэта мысьліць колега Німчынаў, але і ўва ўсіх іншых агульнаславянскіх, г. зн. продках беларускіх і вялікарасійскіх. Быць можа, паказчыкамі гэтага, яшчэ няскончанага працэсу асыміляцыі другога глухога папярэдняму галоснаму поўнага ўтварэньня і зьяўляюцца такія напісаньні, з якімі мы сустракаемся, напрыклад, у найстарадаўняй беларускай грамаце—Смаленскай Гандлёвай Праўдзе 1229, а ўласна: *берьго* (берег), *новагоръда, новоугоръду* і нават *горда, сербра.* Штось падобнае сустракаем нават у больш позных помніках, напр., у Супрасьльскім летапісе (канца XV або пачатку XVI в.), дзе сустракаем напісаньні накшталт *Волъдимера, Водимера,* ко *Въдимеру* і інш.

Адносна іншых характэрных усходня-славянскіх рысаў трэба таксама сказаць, што хоць яны і спатыкаюцца ў розных іншых славянскіх мовах, што адзначаў і Шахматаў і чаго ніхто з нас не забываецца, але ўсё-ж у ўсходня-славянскай сям'і моваў яны сустракаюцца, як *масавыя* зьявы, у той час як у іншых славянскіх мовах яны зьяўляюцца або *толькі спорадычна,* або ў злучэньні з іншымі рысамі, неўласьцівымі ўсходня-славянскай сям'і дыялектаў.

Такім чынам недапушчэньне мэтоду „прамовы“, нават *як рабочага мэтоду,* мне здаецца зусім няправільным. Якраз як рабочы мэтод, мы і павінны яго ўжываць; інакш атрымаецца тая-ж аднабаковасьць, якая атрымлівалася пры выключным панаваньні тэорыі „дрэва“, хоць такога панаваньня, як адзначыў проф. Фасмэр, ніколі па сутнасьці і ня было. Успомнім Шахматава або нават Коласава, які ў працы, што вышла ў 70 г. г. мінулага сталецьця („Заметки о языке и народной поэзии в обл. сев.-великор. нар.,“ 1877), прысьвечанай апісаньню паўночна-вялікарускіх гаворак, літаральна станавіўся ўтупік перад немагчымасьцю правесьці межы паміж гутаркамі, адзначаючы, што ні адна з фонэтычных рысаў не зьяўляецца замкнутай у акрэсьленых межах. Успомнім таксама меркаваньні гісторыка баўгарскае мовы

Б. Цонева—аб труднасьці клясыфікацыі славянскіх моваў наагул. У сваёй, ня так даўно выданай „История на българскый език, I“ (София, 1919) гэты вучоны ў уступе да названай працы (стар. 16—62) таксама адзначае, што суседнія славянскія мовы маюць такое мноства агульных рысаў, што правядзеньне паміж імі дакладных межаў зьяўляецца надзвычайна цяжкай справай. З тае-ж прычыны, што паміж паасобнымі славянскімі мовамі існуюць вельмі нязначныя адмены, Цонеў знаходзіць магчымым гаварыць не аб славянскіх мовах, але аб славянскіх *падмовах*. Значыць, калі згадзіцца з такою думкаю, дык можна нават у наш час гаварыць аб адзінай славянскай мове. Мы ня будзем спыняцца на гэтым пункце гледжаньня і паказалі яго толькі для таго, каб выявіць, наколькі пытаньні клясыфікацыі славянскіх моваў і падмоваў турбавалі і турбуюць вучоных.

Як вынік шуканьняў найбольш навуковай, найбольш рацыянальнай клясыфікацыі, якая адказвала-б *сапраўдным узаемаадносінам,* мы маем часта супярэчныя погляды з боку такіх вучоных, якіх бязумоўна нельга абвінаваціць у тэндэнцыі палітычнага характару. Паміж тым колега Німчынаў у сваёй кніжцы „Український язик у минулому й тепер“ (Харкаў, 1925 г.) якраз і вінаваціць акад. Шахматава ў захапленьні ідэей „общерусской государственности“.

Абвінавачваньне гэтае несправядліва затым, што Шахматаў не адзін раз падкрэсьліваў у сваіх працах, што ён зусім ня зьвязвае пытаньняў навуковых з пытаньнямі палітычнымі. Асабліва яскрава выказваецца ён у гэтым сэнсе ў сваім „Введении в курс истории русского языка“ (Пгр., 1916 г.), і калі ў сваім выкладаньні гісторыі ўсходня-славянскіх моваў ён прытрымліваўся мэтоду „прамовы“, дык ужываў яго *толькі як рабочы мэтод,* ня больш. Колега Німчынаў у сваёй прамове адносна тэорыі „праязыка“ зусім правільна ўжыў слова „жупэл“. І вось мне здаецца, што ў тэорыі „праязыка“, як толькі мэтоду навуковай клясыфікацыі, ня трэба бачыць гэтага страшнага жупэлу.

Бузук (заключнае слова). Можа таму, што ў мяне было няшмат часу, я ня меў магчымасьці спыніцца дакладна на ўсіх пытаньнях. Гэта я і зраблю цяпер у заключным слове. Калі-б я зрабіў поўны агляд географіі і гісторыі моўных зьяў,

я думаю, значна менш было-б зроблена закідаў. У сваім дакладзе я даваў толькі прыклады азначэньня хронолёгіі. Між інш., за мяне шмат сказаў доцэнт Німчынаў, але трохі я дадам да яго слоў. Дазволю сабе ўзяць слова па поваду спрэчак, якія тут узьніклі паміж колегамі Німчынавым і Воўк-Левановічам. Я яшчэ раз падкрэсьліваю, што сапраўды нельга прыняць якую-небудзь простую клясыфікацыю, бо нават для дзьвюх якіх-небудзь зьяў мы маем розныя граніцы. Вазьмеце, напр., поўнагалосьсе і зьмену глухіх *ъ, ь* на *о, е*. Апошнюю зьяву ведае і большасьць славацкіх гутарак. Я. В. Воўк-Левановіч гаварыў яшчэ аб зьмене *дл, тл* на *л*. Зусім не разумею, чаму ён выхапіў гэту зьяву з ліку адзнак, якія зьвязваюць усходня-славянскія і паўднёва-славянскія мовы. З такім-жа правам можна было-б гаворыць і аб зьмене *gv, kv* на *цв, зв* перад *ѣ*, аб разьвіцьці l epentheticum і нават аб шыпячых рэфлексах з ранейшых злучэньняў *tj, dj*, з якіх у заходня-славянскай галіне зьяўляюцца сычачыя гукі. Звычайна і тут будуць несупадзеньні (напр., злучэньні *дл, тл* існавалі ў старапскоўскай гутарцы, знаходзім іх і цяпер і ў паўночна-славенскіх дыялектах; *l* epentheticum вельмі рана пачало зьнікаць у баўгарскай мове, але, гаворачы прыблізна, пералічаныя чатыры зьявы можна абагульніць як паўднёва-ўсходня-славянскія адзнакі. Ёсьць, у сваю чаргу, рысы, якія зьвязваюць усходнія мовы з заходнімі (напр., формы займеньнікаў *тобѣ, собѣ,* разрозьніваньне пачатковых *art, alt* і *ort, olt* у залежнасьці ад праславянскага націску), але і тут таксама можна назіраць адхіленьне граніцы кожнай паасобнай зьявы ад граніцы ўсяго паўночнага славянства. Такім чынам, тэорыя хваль, так сказаць, тэорыя адмоўная. Яна толькі зазначае, што пакуль мы ня ведаем географіі і гісторыі ўсіх моўных зьяў, мы ня маем права a priori, упершае, падзяліць усё славянства на паасобныя мовы, падругое, прымаць існаваньне падлеглых эпох. Можа для школьных мэтаў тэорыя родаводнага дрэва і зручная, але навуцы яна ня прыносіць ніякай карысьці.

Цяпер мы паспрабуем даць хронолёгію ўсходня-славянскіх зьяў, каб пабачыць, ці нельга будзе a posteriori праканацца ў існаваньні прарускай эпохі. Тут я павінен яшчэ раз паўтарыць тое, што гаварыў у сваім дакладзе. Разьвіцьцё поўна-

галосься, зьмена *tj* на *ч* і нават, калі-б мы пагадзіліся з вучонымі, якія пачатковае *о—<je*—лічаць усходня-славянскай рысай,—усё гэта зьявы, якія адбыліся ў розныя, вельмі адлеглыя адзін ад другога моманты: адна з іх *(tj>ч)* здарылася не пазьней ад VI-VII стал., другая (разьвіцьцё поўнагалосься)—прыблізна ў VIII-IX в. в., трэцяя (зьяўленьне пачатковага *о—<je)* у XI сталецьці яшчэ ня была скончана. Такім чынам, бачым мы, прарускай эпохі, уласна кажучы, ня было, бо паміж трыма зазначанымі момантамі, бязумоўна, адбываліся процэсы з шырэйшымі або з вужэйшымі ізоглёсамі.

Проф. Фасмэр зазначыў, што моўныя зьявы могуць разьвівацца і незалежна адна ад другой. Мы маем бліскучыя прыклады правільнасьці гэтай думкі. Так, напр., незалежна і самастойна ўжо ў XII-XIII в. в. у розных славянскіх мовах закончыліся зьмены, якім падупадалі *ъ, ь*. Таму мы ня можам зусім пагадзіцца з Трубецкім, які (у Revue d. ét slav.) на падставе гэтых агульных зьмен *ъ, ь* лічыў, што праславянская эпоха цяглася да XII ст.

Але таксама і поўнагалосьсе магло разьвівацца незалежна ў трох усходня-славянскіх мовах: у украінскай мове канчаткова поўнагалосьсе зьявілася ўжо пасьля дыфтонгізацыі *е, о* ў зачыненых складох.

Я, між іншым, чакаў іншага закіду. Я думаў, што опонэнты зазначаць адну супярэчнасьць у маім дакладзе: я-ж сам гаварыў аб зьявах беларускай мовы, якія становяць спадчыну прадгістарычнай агульна-славянскай эпохі. Але гэта я зрабіў на падставе сваёй працы аб хронолёгіі прадгістарычных часоў. У ёй я а posteriori шляхам розных дапамагальных мэтодаў праканаўся ў тым, што гэтыя часы можна падзяліць на такія чатыры эпохі: 1) эпоху перавагі дыялектычных інда-эўропейскіх ізоглёсаў, 2) перавагі бальтыцка-славянскіх ізоглёсаў, 3) перавагі агульна-славянскіх ізоглёсаў і 4) дыялектычных славянскіх ізоглёсаў.

Проф. Фасмэр гаварыў, што зьявы беларускай мовы, агульныя з польскай, дзеканьне-цеканьне—параўнаўча пазьнейшыя зьявы, але адсутнасьць запісаў у ранейшых помніках ня сьведчыць аб тым, што тады гэтых зьяў яшчэ ня было. Мы ведаем, што сяляне-беларусы вельмі часта не

адбіваюць на пісьме зазначаных асаблівасьцяй сваёй мовы.

Яшчэ другі прыклад на карысьць маёй думкі. Зьнікненьне слабых *ъ, ь* і пераход сільных глухіх у галосныя *о, е,* як вядома, працэсы роўналеглыя, але ў старэйшых усходня-славянскіх помніках прыклады пропуску *ъ, ь* зьяўляюцца больш частымі, як прыклады замены гэтых гукаў на *о, е:* відавочна, вымагалася больш сьмеласьці для таго, каб паставіць адну літару замест другой, значна лягчэй было прапусьціць літару.

Вельмі шкадую, што праф. Фасмэр зьмяніў свой погляд на слова *чарэшня.* Я меў права аб гэтым ня ведаць, бо Вы аб гэтым яшчэ нідзе не друкавалі. Бязумоўна, гэта слова было каштоўным матар'ялам для азначэньня хронолёгіі аднэй з прадгістарычных зьяў славянскай фонэтыкі.

Цікавая ўвага праф. Фасмэра адносна таго, што *sechs* пашырана і ў тых мясцовасьцях, дзе *chs* у іншых словах зьмянілася на *s.* Гэтае дае нам повад успомніць аб тым, што формы лічэбнікаў *адзінанцаць, дванацаць* і г. д. уступаюць месца формам бяз *н* перад *ц* (адзінацаць) у мястэчках і гарадох, г. зн, у тых мясцох, дзе беларускае насельніцтва больш знаходзіцца ў зносінах з расійцамі і яўрэямі.

Спынюся цяпер на дысыміляцыйным аканьні. Я сам не настойваю на тым, што граніцу беларускай мовы з паўдн.-влр. падмовай трэба праводзіць якраз на падставе гэтай зьявы. Бярэ гэту зьяву за аснову для правядзеньня граніцы праф. Дурново, а мы гэта прывялі толькі як прыклад таго, на чым можна было-б базавацца пры азначэньні граніцы паміж блр. і паўдн.-влр. дыял.

Гэткім чынам, мы яшчэ раз скажам, што пакуль мы ня ведаем граніц і гісторыі моўных зьяў, мы павінны адкінуць апрыорныя прадпасылкі прамовы, пакінуўшы за сабой права гаварыць аб прадгістарычнай і гістарычнай эпохах. Эпоху гістарычную мы пачынаем з таго моманту, калі зьяўляюцца ўласныя помнікі, але не фрагмэнтарныя запісы паасобных слоў у помніках іншых народаў і не запазычаныя словы, якія перайшлі да суседзяй: гэта ўсё матар'ялы для вывучэньня прадгістарычнай эпохі. Звычайна, калі-б знайшлі для тэй ці іншай мовы старэйшы помнік, гэтым самым перасунуўся-б і пачатак гісторыі данай мовы.

Закончыўшы сваё заключнае слова, я павінен заявіць, што згаджаюся з проф. Фасмэрам у тым, што ў такіх шырокіх пасяджэньнях нельга дакладна асьвятліць спэцыяльных пытаньняў; значна лепш гэта можна зрабіць у друкаваных артыкулах.

Jetzt will ich ein kurzes Resüme aus meinem Referate machen. Infolge ihrer Stellung unter drei slavischen Sprachen (poln., ukrain. und russisch) sich durchkreuzen in der weissrussischen Sprache die Isoglossen verschiedener sprachlichen Erscheinungen. Mit der Südgrossrussisch. Mundart verbindet die Weissruss. Spr. sogenannte *Akanje* und andere Erscheinungen, mit der polnischen—*Dzekanje* und *Cekanje,* mit der ukrainischen—Veränderung *л* in *ў* u. s. w. Die Isoglossen aller dieser Erscheinungen fallen nicht zusammen. Die Vereinigung dieser Erscheinungen bildet eine Individualität der Wsr. Spr. Wenn wir in Betracht nehmen werden, das Isoglossen nicht zusammenfallen, können wir dann die Grenzen der Wsr Spr. entweder auf dem Grunde der Mehrheit dieser oder jener Eigentümlichkeiten oder auf dem Grunde eines, aber dabei sehr wichtigen Zuges ziehen. So z. B., die Grenzen zwischen Wsr. und Nordgrossruss. Mundart können wir auf dem Grunde der Aussprache *g—h* bestimmen, diese mit südgrossruss. auf dem Grunde dissimilativen *Akanje,* die ukrain. Spr. wird von der Wsr. durch die verschiedene Aussprache der Consonanten vor den weichen Vocalen, abgegrenzt. In jedem einzelnem Falle ist diese Grenzbestimmung bedingt; endgültig aber können wir die Grenzen der wsr. Spr. (wie auch anderer slavischen Sprachen im allgemeinen) nur dann bestimmen, wenn wir ausführlich die Grenzen der einzelnen sprachlichen Erscheinungen wissen werden. Die Vereinigung dieser verschiedenen Dialekten, daraus jeder eine Übergangsmundart von einem Nachbardialekt zum andern ist, helfen sehr die staatskulturellen Faktoren, aus welchen die Literatursprache der wichtigste ist.

Alle sprachlichen Eigentümlichkeiten, welche die Wsr. Spr. überlebt hat, sind verschiedenen Ursprungs. Einige, z. B. Beibehaltung des *ы* vor jotirten Vocalen *(мыю),* einige Kasusendungen sind von der vorgeschichtlichen Periode übergeblieben, andere erschienen vor dem Beginne des Schrifttums, dabei ist es möglich, dass die Erscheinungen mit kürzeren Isoglossen früher, als solche mit

breiteren Isoglossen entwickelt seien; endlich die dritte Kategorie der Umwandlungen erschien schon in geschichtlicher Periode. U. and., wie Ljapunoff bewiesen hat, kommt die Reduction der unbetonten Vocalen, welche ein Grund des Akanie ist, schon in einem Denkmale des XIII Jhd. vor. Aber im allgemeinen vollendete sich die Bildung der Wsr. Spr. schon im XIII-XIV Ihd., d. h. ungefähr zu jener Zeit, zu welcher auch die Bildung anderer slavischen Sprachen schon beendigt war.

П. Бузук.

Да рэформы беларускай азбукі.

Старшыня: Слова для дакладу аб рэформе беларускай азбукі мае Язэп Лёсік.

Лёсік. Высокапаважаныя члены і госьці Першае Беларускае Акадэмічнае Конфэрэнцыі! Выступаючы перад вамі з дакладам на тэму аб рэформе беларускае азбукі, я ня буду ўтамляць вашае ўвагі гістарычнымі спраўкамі аб тым, як разьвівалася беларускае пісьмо, як і чаму яно дайшло да сучаснага стану і якія прычыны вымагаюць перагляду і паправак у азбуцы.

Я хачу сьцісла пазнаёміць вас са сваім проектам рэформы нашае азбукі, каб ведаць ад вас, што ў гэтым проекце можна прыняць, чаго прыняць нельга, з чым у гэтым проекце можна згадзіцца, з чым згадзіцца нельга, і што трэба будзе адкінуць.

Пытаньне аб рэформе нашае азбукі паўстала не сягодня і ня ў гэтым годзе; пытаньне стала адразу, як толькі беларуская пісьменнасьць, беларускае пісьмо зрабілася штодзеннай патрэбай беларускіх шырокіх мас і, у першую чаргу, беларускае школы. Покі беларускае пісьмо служыла патрэбам невялічкага кола інтэлігенцыі, то яго дэфэктыўнасьць, яго недахопы і недапасаванасьць да гукаў нашае мовы не адчувалася, а калі адчувалася, то вельмі слаба.

Калі наша пісьмо трапіла ў школу і ў шырокія грамадзкія колы, гэтыя дэфэктыўнасьці і недахопы зрабіліся об'ектыўнымі фактарамі адмоўнага характару, што стаяць на шляху разьвіцьця пісьменнасьці сярод рабочых і сялян Савецкае Беларусі.

Як настаўнік і выкладчык беларускае мовы, я блізка знаёмы з беларускаю школаю і даўно ўжо чую нараканьні як на нашую цяперашнюю графіку і асабліва на наш цяперашні правапіс. Навуковае азнаямленьне з нашаю азбукаю, ці графікаю, правапісам ці ортографіяй паказвае, што гэтыя нараканьні маюць пэўны грунт. Гэтая акалічнасьць была прычынаю таго, што я яшчэ ў 1923 годзе выступіў з проектам рэформы беларускае азбукі, але ў той час мой проект не спаткаў

прыхільнасьці ні ў колах беларускае інтэлігенцыі, ні сярод большасьці тых асоб, ад якіх залежала рэформа нашага пісьма. Знайшлі, што ня трэба да часу рабіць гэтую рэформу, і наагул непатрэбна рэформа нашае азбукі.

Але жыцьцё мае сваю лёгіку і свае вымаганьні, і мы зноў пастаўлены перад тым, на што не зьварачалі ўвагі раней. Асабліва востра стаіць пытаньне аб правапісе, але аб гэтым гутарка будзе ў нас заўтра. Ня меншае значэньне мае і рэформа нашае азбукі.

Папершае, наша цяперашняя азбука не адпавядае ўва ўсіх пунктах гукавому пісьму; падругое, у нашай цяперашняй азбуцы ня ўсё адпавядае звычайнай практычнасьці; патрэцяе, наша цяперашняя азбука ня мае ўласнага твару, што мае не малое значэньне, калі нашы ворагі заўсёды тыкаюць пальцам, што ў нас нічога няма, што мы ўсё запазычаем, усё пераймаем ад нашых суседзяў.

Тут трэба сказаць вось што: калі ў апошні час усё мацней і мацней чуюцца гутаркі аб рэформе нашае азбукі, то шмат хто пачаў казаць, што ці ня ляпей нам прыняць азбуку агульна-эўропейскую—лацінку. Але з гэтым згадзіцца нельга, хоць нашыя школьныя падручнікі кажуць, што беларускіх азбук дзьве: кірыліца і лацінка,—перайсьці поўнасьцю на лацініку нельга і вось чаму.

Хоць і рабіліся ў нас спробы друкаваць кніжкі і газэты лацінкай, але гэтыя спробы так і засталіся толькі спробамі. Лацінка не прышчапляецца; кнігі, надрукаваныя лацінкай, ляжаць бяз ужытку, а газэты ўжо і не прабуюць нават друкавацца лацінкай, калі ня лічыць невялічкага клерыкальнага тыднёвіка „Крыніца“, што выходзіць у Вільні, і які ня мае шырокага грамадзянскага значэньня, як орган рэлігійна-каталіцкі. Такім парадкам, мы бачым, што ў штодзенным жыцьці скрозь і беспадзельна пануе адна толькі *кірыліца.*

Такога пашырэньня кірылічнага пісьма ў нас нельга тлумачыць адным толькі ўплывам расійскае школы. Тут ёсьць яшчэ адна прычына. Прычына гэта ляжыць у гісторыі нашай культуры. Справа ў тым, што кірыліцу беларусы лічаць сваёю нацыянальнай, беларускай азбукай. Вось чаму яны, так сказаць, без протэсту паддаліся ўплыву расійскай

школы. Бо каб гэта было ня так, то ў нацыянальнага руху хваціла-б сілы перамагчы гэты ўплыў, як хваціла ў яго сілы на перамогу шмат чаго іншага і далёка дужэйшага.

Гісторыя нам кажа, что беларусы ў XVI-м сталецьці рэформавалі ц.-славянскую азбуку-кірыліцу, прыдаўшы ёй форму лацінкі. Потым адзін вучоны манах Капіевіч пазнаёміў з новай кірыліцай маскоўскага цара, вядомага рэформатара Пятра І-га. Кажуць, што Капіевіч даў цару на выбар два ўзоры рэформаванай кірыліцы, якая ўжо тады ўжывалася на Літве, на Беларусі. Гэтае знаёмства Пятра І-га з беларускай, або з *літоўскай,* як тады казалі, азбукай адбылося дзесь заграніцай, бадай што ў Голяндыі. З тых узораў цар злажыў адну ды ўвёў яе ў Расіі, тады яшчэ Масковіі, назваўшы яе „гражданкай“, каб адрозьніць ад царкоўнай, бо маскоўская цэркаў, як гэта заўсёды бывала, не згаджалася, мабыць друкаваць „сьвятога пісьма“ *літоўскімі* ды яшчэ *лацінскімі* літарамі. У тыя часы Масква баялася лаціншчыны і скрыва пазірала на Літву (Беларусь), адкуль падчас трапляла да Масквы гэтая „латынь“ у форме розных кніжак „проклятой литовской печати“.

Ёсьць ведама, што прынятая ў Расіі новая кірыліца зьмянялася і далей подлуг таго, як зьмянялася лацінка заграніцай; тымчасам на Беларусі, з упадкам культуры, разьвіцьцё азбукі прыпынілася. Цяпер нашая славянская азбука зусім падобна да лацінкі, толькі некаторыя літары маюць сваё асобнае значэньне *(с=ц, у=ы, р=п, е=э* і г. д.).

Адгэтуль мы бачым, што кірыліца мае глыбокае і моцнае карэньне ў нашай культуры, у нашай гісторыі, ня кажучы ўжо пра тое, што яна цяпер шырака ўжываецца. І трэба думаць, што кірыліца ў нас ніколі не замеціцца лацінкай. Лацінка можа ўжывацца ў школах поплеч з кірыліцай, як гэта мы бачым у Нямеччыне, дзе поплеч з готыкай—нацыянальнай нямецкай азбукай,—ужываецца лацінка, але аб поўным скасаваньні кірыліцы і гутаркі быць ня можа.

Можна гаварыць аб рэформе цяперашняй нашай кірылічнай азбукі, але не аб яе скасаваньні. І гэтую рэформу канечна трэба зрабіць, прычым цяпер, як можна скарэй, покі не замацавалася прывычка, з якою потым трудна змагацца. Дагэтуль аб рэформе азбукі нельга было гаварыць,

бо мы ня мелі сваіх беларускіх школ, якія-б правялі ў жыцьцё зробленую рэформу. Цяпер школы ў нас ёсьць, і рэформа якраз будзе на часе.

Як ужо зазначалася вышэй, з упадкам нашай культуры, само сабой разумеецца, прыпынілася і далейшае разьвіцьцё ў нас кірылічнага пісьма. Рэформаваная на Беларусі ў XVI-м сталецьці кірыліца стала зьмяняцца ўжо ня ў нас, а ў Расіі, пад уплывам расійскай мовы і для патрэб расійскага правапісу. Яна не параставала зьмяняцца, але зьмянялася ўжо на іншай глебе і дзеля таго набрала іншага характару, уласьцівага расійскай мове.

Цяперашняя нашая азбука розьніцца ад расійскай азбукі толькі літарамі *ў, і*. Яна, гэтая азбука, была прынята насьпех, у тэй форме, якую прыняла ў расійскім разьвіцьці, і ў тым значэньні літар, якое яны маюць у расійскім пісьме. Дзеля гэтага нашая цяперашняя азбука ня мае свайго ўласнага твару, а некаторыя літары зусім не адпавядаюць гукам нашай мовы.

Праўда, бяручы кірыліцу ў тэй форме, якая вытварылася ў Расіі, мы адразу-ж зрабілі ў ёй некаторыя зьмены (выкінулі *и, щ, ъ, ѳ, ѣ* раней расійскай рэформы, апіраючыся на старое, даўнейшае беларускае пісьмо), але гэтыя зьмены адбыліся насьпех, без належнай крытыкі, абы скарэй даць народу роднае слова ў друкаванай кніжцы. Гэтыя першыя зьмены не пабудаваны на навуковых дасьледзінах: яны часам супярэчаць простай практычнасьці, ня кажучы ўжо пра навуковы бок справы, які заўсёды павінен стаяць на першым месцы.

Украінцы, сербы, баўгары ўжываюць цяперашнюю кірыліцу, але яны па магчымасьці дапасавалі яе да гукаў свае мовы. Гэта трэба зрабіць і нам.

Рэформу трэба пачаць з літар *э, ы* і *й*. Дзьве першыя літары не адпавядаюць гукам нашае мовы, а трэцяя—*й*—становіць нейкую недарэчнасьць, калі ў нашай азбуцы няма літары *и* (васьмярычнага). Літара *й* зусім не надаецца пры навуковых дасьледзінах, дзе заўсёды карыстаюцца літарай *j* (ёт).

Літара *э*—чыста расійская літара. Яна азначае гук, які звычайна стаіць у расійскай мове на пачатку слова і вымаў-

ляецца з шырака адкрытым ротам *(этот, эти, эх!)*. Наш адпаведны гук слабейшы за расійскае *э* і падобен да чужаземнага *э* ў словах—*турнэ, кабарэ.* У нашай мове гэты гук звычайна ня бывае на пачатку слова, а калі бывае, то замыкаецца „прыдыханьнем“, і тым шырокая вымова яго па-слабляецца *(гэты, гэтак);* звычайна гэты гук стаіць у нас пасьля зацьвярдзелага зычнага ды вымаўляецца больш-менш так, як расійскае *е „при купце“* або *„церковь“*. Пераносячы значэньне расійскай літары ў нашую азбуку, мы няправільна перадаем на пісьме наш гук і гэтым псуем вобраз пісанага слова з гэтай літарай *(рэкі, шэпча, стрэхі)*. Тымчасам для гэтага гуку ў нас ёсьць свая літара, якая пісалася даўней. Гэта такая самая літара, толькі пастаўленая наадварот—*є* *(рєкі, шєпча, стрєхі*). Пішацца яна, як малая літара *з*, калі яе напісаць у радок, бяз рыскі ўніз, што мы робім у літары *у*, ды перавярнуць зубцамі наперад. Гэтая літара мае прыгажэйшы выгляд і дакладней перадасьць гук *э;* тады кожны, і незнаёмы з нашым пісьмом, лёгка зразумее, што гэтая літара азначае асобны гук, не такі, як расійскае *э*, ды ня будзе вымаўляцца з шырака адкрытым ротам.

Літара *ы*—аднолькава і беларуская літара. Даўней гэты гук *ы* азначаўся дзьвюма літарамі *ь* і *і*, злучанымі зьверху папярэчнай рыскай, прычым над *і* заўсёды ставілася кропка *(ьі)*. Мяккім знакам хацелі паказаць, што гэта той самы гук *і*, толькі яго трэба вымаўляць цьвярдзей. А з часам ужо вытварылася новая літара, якую мы бачым цяпер—*ы*. Яе трэба замяніць літарай *и* (васьмярычным), якая часова выкінута была з нашае азбукі. Тады гэтую літару *ы* можна будзе разглядаць, як суму дзьвюх літар *і (і+і=и)*, што і правільна, бо гукі *ы* і *і* знаходзяцца ў блізкім сваяцтве паміж сабою (інтымныя) па органах вымовы, і часам кажуць, нават, што *ы*—гэта цьвёрдае *і*, а *і*—гэта мяккае *ы*. Літара *и*, у значэньні *ы*,—вельмі практычная для пісьма і прыгажэйшая за *ы*. Тады мы будзем пісаць: *жиць, миць, шиць, биць, ми, ти* і г. д. Раней гэтая літара была выкінута з нашай азбукі не дзеля таго, што не разумелі яе практычнасьці. Гэта было выклікана патрэбаю часу: трэ' было пісаць і друкаваць так, каб людзі маглі чытаць беларускае друкаванае слова па расійскай азбуцы. Зразумела, што літара *и*, у значэньні *ы*, пе-

рашкаджала-б чытаньню. Цяпер гэтую літару *и* трэба зноў увесьці ў нашую азбуку, а *ы* выкінуць. Школа азнаёміць народ з гэтай рэформай.

Таксама трэба выкінуць літару *й*, бо яна і раней была недарэчнасьцю, а пры замене літары *ы* літараю *и* тым большай стане недарэчнасьцю. Літара *й* азначае слабы, нескладовы (кароткі, як ненавукова кажуць) гук *і*, тымчасам літара *и* у нас будзе азначаць *ы*. Выйдзе недарэчнасьць, няпраўда, бо *й*—гэта тое самае *і*, толькі слабейшае, цішэйшае, але не карацейшае, як кажуць старыя падручнікі; *й* толькі вымаўляецца слабей і ня творыць складу, гэтым ён і розьніцца ад гуку *і*.

Літару *й* трэба замяніць ётам *(j)*. Замяніўшы яе ётам, мы тады зможам выправіць нашае пісьмо, зрабіўшы яго чыста гукавым. Справа ў тым, што нашае гукавое пісьмо псуюць літары *я, е, ё, ю*. Гэтыя літары на пачатку складоў азначаюць два гукі— *йа, йэ, йо, йу (ja, jэ, jo, jу): йама-яма, майя-мая, майо-маё, йяйе-яе* і г. д. Тымчасам *гукавае* пісьмо вымагае, каб літара азначала адзін толькі гук, а ня два, бо калі некаторыя літары, як *я, е, ё, ю* азначаюць два гукі, то пісьмо становіцца мешаным: *гукавым* і *складовым*. Для аднаўленьня адзінства нашага гукавога пісьма і патрэбен нам ёт *(j)*. З літараю *й* зрабіць нам гэта нельга, бо яна шырокая, займае шмат месца, а дзеля таго непрактычная. У навуковых працах заўсёды ў такіх разох ужываюць літару *j*. Тады на пачатку складоў мы будзем пісаць ня *я, е, ё, ю*, а *ja, jэ, jo, jу: jама* замест *яма, тваja—твая, jєсьць—есьць, jосьць—ёсьць, jушка—юшка, патаjомны—патаёмны, jон—ён, jано—яно, чытаjє—чытае, бялеjє—бялее* і г. д. І то трэба сказаць, калі мы дагэтуль пісалі на пачатку складоў літары *я, е, ё, ю*, то трэ' было пісаць і літары *щ, пс, кс*, якія таксама азначаюць па два гукі...

Літары *я, е, ё, ю* трэба пісаць толькі пасьля мяккіх зычных і, такім парадкам, надаць ім аднаго значэньня. Дагэтуль яны мелі падвойнае значэньне, несьлі падвойную службу. На пачатку складоў, як вышэй гаварылася, яны азначалі ётаваныя галосныя *а, э, о, у*, а пасьля мяккага зычнага—*ь* і адпаведныя галосныя: *ьа, ьэ, ьо, ьу: ньаньа—няня, сьэні—сені, сьолы—сёлы, ньух—нюх* і г. д. У такіх разох яны маюць прак-

тычнае значэньне і, разам з тым, не парушаюць адзінства гукавога пісьма, бо *ь* не азначае ніякага гуку, а значыць, літары *я, е, ё, ю* пасьля мяккіх зычных, замяняючы сабою па дзьве літары *(ьа, ьэ, ьо, ьу)*, ня будуць азначаць двух гукаў, што рабілі яны на пачатку складу. Такім парадкам, ёт *(j)* дапаможа нам выявіць значэньне або прыроду літар *я, е, ё, ю*, адновіць адзінства нашага гукавога пісьма і зробіць яго больш навуковым і дакладным.

Адгэтуль мы бачым, што гэтая маленькая, здаецца, рэформа—замена літар *э, ы, й* літарамі *є, и, j*—1) зробіць нашую азбуку больш дакладнай для азначэньня на пісьме гукаў нашае мовы, 2) надасьць ёй большай навуковасьці і 3) пісьмо наша стане больш прыгожым ды набудзе свайго ўласнага, самабытнага выгляду.

Такім парадкам, рэформа нашае азбукі павінна выразіцца, перш-на-перш, у замене літар *э, ы, й* літарамі *є, и, j*; потым трэба прыдумаць асобныя літары для абазначэньня на пісьме гукаў *дз, дж*.

Увёўшы ў нашую азбуку літары: *є* заместа *э*, *и* заместа *ы*, *j* заместа *й*, мы будзем мець такое пісьмо:

Неспакојна зашумела жита маладојє. Кукавала зязюлька ў гајочку, прилажиўши галоўку к лісточку. Јакі гєта старац з хлопцам јдзе? Ој коню, мој коню, заграј пада мноју! Ој пајду ја лугам, дзе мој міли арє плугам. Віншују вас новим годам, новим шчасьцем, каб гєти правесьці ў карисьці, у радасьці і ў добрым здароўjі.

Асабліва важнае значэньне мае замена літары *й* ётам *(j)*. Увёўшы ёт, мы ня будзем пісаць літар *я, е, ё, ю, і* на пачатку складу, бо яны ў такіх разох азначаюць ётаваныя галосныя *а, э, о, у, і*, г. зн. два гукі: *ja, jэ, jo, jу, ji;* такім способам раскрыецца таямніца літар *я, е, ё, ю, і* на пачатку складу, а значыць, і пасьля галосных у сярэдзіне слова *(поіць=појіць, краі=краjі)*.

Пры граматычных разборах літары з ётаваным значэньнем, г. зн. літары *я, е, ё, ю, і*, на пачатку складу ў слове становяць вялікую перашкоду для школьнікаў, і ня толькі для школьнікаў. Прыкладам, граматыка вучыць, што пры скланеньні аснова слова не зьмяняецца, а тымчасам у слове *„край“* і падобных, дзякуючы літарам з ётаваным значэнь-

нем, выходзіць, што аснова зьмяняецца, бо ў другіх склонах будзе: кра-ю, кра-ем, кра-ёх і г. д., дзе гук *й,* на які канчаецца аснова, як-бы выпаў, зьнік, а ён толькі скрыўся ў літарах *ю, е, ё (йу, йэ, йо).* Далей, граматыка кажа, што ў творна-прыладным склоне назоўнікаў і прыметнікаў жан. роду часта гук *у* адпадае, напр: *нагою-нагой, рукою-рукой, добраю-добрай.* Тут нават настаўнік не заўсёды дакладна разьбіраецца, аб якім тут гуку *у* ідзе гутарка, калі яго нідзе няма.

Гук гэты схован у літары *ю,* якая пасьля галоснага абазначае на пісьме ётаванае *у—йу.* Такіх прыкладаў у школьнай практыцы сустракаецца цэлыя сотні.

Добра было-б, каб ня пісаць літар *я, е, ё, ю* і пасьля мяккіх зычных, як зрабілі гэта сербы, але ў нас гэта зьвязана з вялікімі труднасьцямі на практыцы: прышлося-б пасьля кожнага мяккага зычнага ставіць мяккі значок, каб азначыць яго мяккасьць: *ньаньа—няня, ньэба—неба, сьолы—сёлы, ньухаць—нюхаць* і г. д.

Сербам лёгка было выкінуць літары *я, е, ё, ю* пасьля мяккіх зычных, бо ў іх мяккімі бываюць толькі некаторыя зычныя—*н* і *л,* для каторых яны прыдумалі асобныя літары. У нас-жа пераважная большасьць зычных бывае мяккімі; значыць, выкінуўшы літары *я, е, ё, ю* пасьля мяккіх зычных, нам трэба было-б або прыдумаць для мяккіх зычных асобныя літары, або ставіць кожны раз мяккі значок, што ў абодвух выпадках было-б вельмі непрактычна.

У сербскай азбуцы-кірыліцы няма і мяккага значка— гэтай мёртвай літары, тымчасам у беларускім пісьме абысьціся бяз мяккага значка бадай што немагчыма. Усё гэта, агулам узятае, прымушае нас пакінуць літары *я, е, ё, ю* ў нашай азбуцы-кірыліцы, але толькі з правам пісаць іх пасьля мяккіх зычных, дзе яны будуць мець адно значэньне: мяккасьць папярэдняга зычнага плюс адпаведны галосны: *я-ьа, е-ьэ, ё-ьо, ю-ьу,* г. зн. з такім значэньнем, якое мае ў нашым пісьме літара *і* пасьля мяккага зычнага: яна таксама перадае на пісьме *ь—і*: *сыны-сіні* і г. д.

Як ведама, сербская азбука-кірыліца лічыцца самай лепшай азбукай у Эўропе, бо іх азбука ня мае ні мёртвых літар, як мяккі значок, ні літар з падвойным значэньнем, як

я, е, ё, ю. Дзякуючы гэтаму, сербскае пісьмо зьяўляецца найбольш чыстым *гукавым* пісьмом, дзе па магчымасьці кожны асобны гук мае толькі адзін значок, адну пэўную літару.

Асаблівасьці нашых *зычных* гукаў не дазваляюць нам рэформаваць нашую азбуку так, каб нашае пісьмо стала чыста *гукавым,* але набліжаць сваю азбуку да гукавога пісьма мы павінны, каб не абярнуць яго ў такое мёртвае і труднае для навучаньня, якім зьяўляецца пісьмо францускае або ангельскае.

Што да нашых гукаў *дз* і *дж,* якія мы абазначаем дзьвюма літарамі, то тут справа далёка прасьцейшая. Яшчэ ў старой азбуцы-кірыліцы была асобная літара для абазначэньня гуку *дз.* Гэта даўнейшая літара падобна крышку на сучасную цыфру *3,* калі яе напісаць вот так: З. Гэта для друку, а на пісьме яе можна пісаць, як літару *з,* толькі з такім рысункам уверсе, як мы робім у літары *ч,* калі яе пішам. Для *дж* можна дапасаваць гэтую самую літару, толькі з маленькаю рыскаю, у форме вілачкі, над літараю як у друку, так і на пісьме: ǯ. Увёўшы ў сваю азбуку гэтыя дзьве літары, мы збавімся ад абазначэньня зычных гукаў дзьвюма літарамі.

А самае лепшае, каб ня ўводзіць зусім новых і незнаёмых літар, перадаваць гук *дз* у друку літараю Д̌ (з вілачкамі ўверсе), а гук *дж*—літараю Ж̌ (з вілачкамі ўверсе), а на пісьме *дз* азначаць пісанаю літараю *з* толькі з такім напісаньнем зьверху, як і пісанай літары *ч* (ʒ), а *дж*—звычайнаю пісанаю літараю *ж* з вілачкамі зьверху *(ж̌).*

Такі ў асноўных рысах проект рэформы нашае азбукі-кірыліцы. Разумеецца, у дэталях могуць быць розныя зьмены і дадаткі, калі выясьніцца іх патрэба, але аснова рэформы выражана, як мне здаецца, правільна.

На заканчэньне яшчэ адна маленькая ўвага. Некаторыя думаюць, што можна збавіцца ад бяды, калі перайсьці на агульна-эўропейскую азбуку-лацінку. Вышэй ужо гаварылася, чаму мы ня можам адмовіцца ад свае азбукі-кірыліцы. Тут трэба толькі дадаць, што, увёўшы лацінку, мы ня збавімся ад яе рэформы, бо і лацінка мае тыя самыя і нават большыя недахваты, якія трэба выправіць у кірыліцы. А да таго, зусім перайсьці на лацінку далёка трудней на практыцы, як зрабіць рэформу кірыліцы.

Старшыня. Слова для дакладу: *„Да рэформы беларускае азбукі“* мае правадзейны член Інбелькульту, проф. П. А. Растаргуеў.

Растаргуеў. Пытаньне аб рэформе беларускае азбукі — адно з асноўных пытаньняў сучаснага культурнага жыцьця Беларусі; гэта пытаньне вымагае безадкладнага вырашэньня. Беларуская мова да гэтага часу карысталася расійскай азбукай з нязначнымі яе зьменамі. Гэтыя зьмены ў значнай ступені, за выключэньнем *ў,*—чыста знадворнага характару, і такім чынам беларуская азбука не прыстасавана да асаблівасьцяй беларускай мовы. Перш за ўсё, у азбуцы няма знакаў для азначэньня гукаў складанага ўтварэньня *дз* і *дж,* якія ёсьць у беларускай мове і якіх няма ў расійскай мове. Гэта—галоўная хіба азбукі, ад якой безадкладна трэба пазбавіцца.

Побач з гэтым, азбука мае яшчэ адну хібу, праўда, агульную з расійскай азбукай. Расійская азбука далёка не адзначаецца дакладнасьцю ў перадачы некаторых гукаў. Самая галоўная яе хіба ў способе азначэньня мяккіх зычных у палажэньні іх перад галоснымі. Мяккасьць зычнага гуку ў палажэньні яго перад зычным і на канцы слова азначаецца ў расійскай і беларускай азбуцы літарай *ь,* якая цяпер называецца мяккім знакам; а мяккасьць зычнага гуку ўпалажэньні яго перад галосным гукам не азначаецца ніякім асобным знакам, а пасьля мяккага зычнага пішуцца літары *я, ю, е, ё.* Але гэтыя літары ня толькі азначаюць мяккасьць зычнага, але маюць і іншыя значэньні: у пачатку слова, пасьля галоснага і ў некаторых выпадках пасьля зычнага яны азначаюць склады—злучэньне *а, у, э, о* з *j* або *i̯* *(и* нескладовае). Гэта хіба цалком перанесена ў беларускую азбуку і зьяўляецца другой яе галоўнай хібай. Ухіліць гэтыя недахопы зьяўляецца заданьнем рэформы беларускай азбукі.

Але перш, чымся прыступіць да гэтай рэформы, трэба вырашыць адно пытаньне, якое напрошваецца само сабой, калі пачынаеш гаварыць аб рэформе беларускай азбукі. Гэта пытаньне больш агульнага характару і датычыцца ўсёй азбукі ўва ўсім яе аб‘ёме; мімаволі паўстае пытаньне, якая азбука павінна быць у Беларусі — зьмененая славянская, больш дакладна—кірылаўская ў сваёй аснове, ці зьмененая лацінская? І тэй і другой азбукай карыстаюцца славяне. Славянскай,

г. зн. кірылаўскай азбукай у сучасны момант карыстаюцца *ўсходнія славяне,* г. зн. беларусы, расійцы і ўкраінцы, і *значная частка паўднёвых славян*—баўгары і ўсходнія сербы. А лацінскай азбукай карыстаюцца ў апошняй частцы *паўднёвых славянскіх народаў*—заходнія сербы і славенцы і *ўсе заходнія славяне*—палякі, кашубы, верхнія і ніжнія лужычане і чэхаславакі. Калі далучыць сюды карыстаньне лацінскай азбукай романскімі народамі, амаль усімі германскімі, бальтыцкімі і фінскімі народамі, якія маюць эўропейскую культуру, дык лікавую перавагу будзе мець лацінская азбука.

Аднак, адсюль яшчэ нельга зрабіць вываду, што і беларусы павінны прыняць лацінскую азбуку—беларусы павінны мець тую з гэтых дзьвёх азбук (зразумела, з адпаведнымі зьменамі), якая больш адпавядае гукавому складу іх мовы.

Якая-ж з азбук мае ў гэтых адносінах перавагу?

Яшчэ ў X ст., г. зн. 10 сталецьцяў назад, баўгарскі пісьменьнік Храбр кажа аб перавазе славянскай кірылаўскай азбукі над лацінскай, у якой няма гукаў, уласьцівых старабаўгарскай мове. Праўда, з часоў Храбра большая частка славянскіх моваў утраціла значную частку гэтых гукаў і здолела разьвіць новыя, аднак, выказанае Храбрам палажэньне ня страціла свайго значэньня і цяпер, напрыклад, адносна адсутнасьці ў лацінскім альфабэце спэцыяльных знакаў для перадачы так званых шыпячых гукаў. Гэта палажэньне застаецца ўва ўсёй сіле і для беларускай азбукі. Славянскія народы, якія прынялі лацінскую азбуку, прымушаны былі, ня маючы ў ёй адпаведных літар, ужываць розныя спосабы для перадачы гэтых гукаў. Чэхі, напрыклад, з часоў Яна Гуса ставілі кропку над літарамі *c, s* і *z* для азначэньня *ч, ш* і *ж,* і толькі з канца XIV ст. пачалі з гэтай мэтай ставіць над імі значок „v“ (вілачкі) č, š і ž. Канчатковы выгляд чэскае пісьмо прыняло толькі ў канцы 40-х гадоў XIX ст., дзякуючы працам Даброўскага, Пельцэцэля, Юнгмана, Шафарыка і інш. Палякі, пачынаючы з XV ст., прабуюць ухіліць нявыгоды лацінскага альфабэту, і толькі ў канцы XVIII і пачатку XIX ст. замацавалася ў іх злучэньне літар *c* і *z* для азначэньня *ч (cz), s* і *z* для *ш (sz),* а для азначэньня *ж* над літарай *z* ставяць кропку (ż). Іншыя славянскія народы, якія ўжываюць расійскую азбуку, прымаюць да пэўнай меры адзін або два з гэтых спосабаў.

Лацінская азбука ў беларускай мове таксама будзе вымагаць аднаго з гэтых спосабаў—чэскага, як можна назваць ужываньне над літарай вілачак, або польскага. Але ці патрэбна гэта? Паколькі сучасная беларуская азбука мае ў гэтых адносінах перавагу над польскай ці чэскай, маючы асобныя літары для гукаў *ж, ч, ш,* гаварыць ня прыходзіцца: *мы выразна бачым перавагу сучаснай беларускай азбукі, і замена яе лацінскай азбукай з гэтага боку зьяўляецца непажаданай.*

Далей, як стаіць справа з азначэньнем мяккасьці зычных у мовах, якія карыстаюцца лацінскай азбукай? Чэская мова для азначэньня мяккіх зычных ужывае сыстэму значкоў, якія ставяцца ці над літарай ці зьверху з правага боку яе, напр.: *tvořiti, křik, baseň, bázeň, pojď, pojďte, zeď, mladosť, kosť* і гэтак далей.

У польскай мове мяккасьць зычных перад зычнымі і на канцы слова азначаецца значком ´, напр.: *pić, koń, leśny, późny, broń* і г. д. А мяккасьць зычнага перад галосным азначаецца літарай *i*, якая ставіцца пасьля зычнага перад галоснаю: *wiara, wierzić, biały, bielić* і г. д.

Прыблізна тое самае бачым і ў іншых славянскіх мовах.

Аднак, ніводзін з гэтых спосабаў ня прыгодны для беларускай мовы. Перш за ўсё, беларуская мова, як вядома, мае вельмі шмат мяккіх зычных, і значкі над літарамі (вілачкі) для азначэньня мяккасьці ўтвораць цяжкую для вока стрыкатасьць; з другога боку, яшчэ менш удалым трэба прызнаць польскі спосаб перадачы мяккасьці зычнага перад наступным галосным. Такім чынам, калі ў Беларусі будзе прынята лацінская азбука замест сучаснай славянскай, дык ня толькі нельга будзе пазбавіцца паказаных вышэй недахопаў яе, а наадварот, паўстануць яшчэ большыя труднасьці. Пры такім становішчы справы з лацінскім альфабэтам раз назаўсёды прыходзіцца адмовіцца ад карыстаньня ім у беларускай мове і пашукаць спосабаў рэформы сучаснай беларускай азбукі.

Адным з галоўных недахопаў сучаснай беларускай азбукі, як ужо мы гаварылі, зьяўляецца адсутнасьць у ёй знакаў (літар) для азначэньня звонкай сьвісьцячай і шыпячай афрыкаты; гэтыя гукі перадаюцца ў ёй злучэньнем літары *д* з *з* і *ж;* першае злучэньне перадае афрыкату *дз,* а другое—афрыкату *дж.* Няма чаго казаць тут аб тым, што азначэньне

ґукаў, хоць-бы і складаных па сваёй артыкуляцыі, з дзьвюма літарамі—зьява непажаданая і павінна быць ухілена. Гэтыя гукі, як і такія самыя складаныя па сваёй артыкуляцыі гукі, г. зн. як і глухія афрыкаты *ц* і *ч*, павінны азначацца ў беларускай азбуцы асобнымі літарамі, якія з гэтай мэтай трэба ўвесьці ў азбуку.

Паўстае пытаньне: адкуль запазычыць гэтыя літары? Урэшце, гэта ня мае значэньня; усё роўна, якія гэта будуць літары—ці яны будуць нанова прыдуманыя ці запазычаныя з якогась іншага альфабэту. Трэба толькі паклапаціцца аб тым, каб яны формай сваёй не парушалі агульнага стылю беларускай азбукі. Найбольш адпаведнымі з гэтага боку лічу літары сербскага альфабэту ђ для афрыкаты *дз* і ћ для афрыкаты *дж*. У сербскай мове яны, праўда, маюць іншае значэньне: ђ азначае *дж* мяккае, а ћ служыць знакам для *ч* мяккага.

> У в а г а: *Дж* мяккае ў сербскай мове азначаецца літарай џ, але яна мне здаецца па сваёй форме няпрыгоднай для беларускай азбукі.

Але гэта ня можа быць перашкодай для прыняцьця гэтых літар у беларускім альфабэце. Ня можа таксама служыць перашкодай і тое, што літары запазычаюцца з іншага альфабэту: запазычаньне літар адным народам у другога—справа звычайная ў культурным жыцьці людзкасьці: грэкі, напр., запазычалі з некаторымі зьменамі альфабэт у фінікійцаў, паўднёвыя і ўсходнія славяне, у сваю чаргу, палажылі ў аснову сваёй азбукі грэцкае пісьмо IX ст.; але таму, што грэцкая азбука не адпавядала гукаваму складу стара-баўгарскай мовы тэй эпохі, дык укладальнік славянскай азбукі Кірыла дапоўніў яе літарамі, запазычанымі з іншых моваў, паміж іншым, з стара-яўрэйскай, адкуль, напрыклад, былі ўзяты літары ש (шын) і ע (айн) для азначэньня стара-баўгарскіх і наагул славянскіх *ш* і *ц*.

> У в а г а: Літары ћ і ђ могуць мець тлумачэньне і на беларускім грунце: літара ћ—гэта перавернутая зьверху ўніз і зьлева направа перакрэсьленая літара *ч;* а літара ђ—тая самая літара, толькі з прадоўжанай уніз і крыху загнутай налева другой яе часткай.

Апроч таго, на літары ћ і ђ можна глядзець і як

на перакрэсьленае лацінскае ħ у першым выпадку і крыху зьмененае—у другім.

Можна было-б не прапанаваць запазычаньне гэтых літар у сербаў, а скарыстацца для *дз* стара-баўгарскім *s* (зело), якое ўжывалася ў такім значэньні ў старадаўніх помніках пісьма, ці літарамі ʒ і ǯ для *дз* і *дж*, якія ўжываюцца цяпер у навуковых транскрыпцыях. Але тое, што літара *s* (зело), а тым больш ʒ і ǯ (асабліва апошняя) недапасаваны да агульнага стылю беларускай азбукі, прымушае нас адмовіцца ад прыняцьця гэтых літар.

Няўдалай таксама трэба прызнаць і спробу ўвесьці літару *д* з хвосьцікам, загнутым ў рукапісным пісьме ўверх, ці з значком над ёй (д̆) для азначэньня *дз*, а *ж* з такім самым значком над ім (ӂ) для *дж:* беларуская афрыката *дз* зьяўляецца даволі яркім гукам, які розьніцца ад *д,* і на пісьме гэтыя дзьве літары павінны быць больш выразна адмежаваны адна ад другой, чымся напісаньне аднэй з іх з хвосьцікам, загнутым уверх, а другой—з хвосьцікам, апушчаным уніз. Знакі над літарамі *д* і *ж,* пастаўленыя для таго, каб паказаць, што яны азначаюць афрыкаты *дз* і *дж,* няпрыгодны, аб чым мы ўжо гаварылі вышэй аб такіх значкох над літарамі, ня кажучы ўжо аб тым, што конструкцыя літары *ж* і асабліва вялікіх *Д* і *Ж* рашуча гаворыць супроць значка над імі. Апроч таго, ставіць значок „v“ (вілачкі) над літарамі *д* і *ж* для афрыкатаў *дз* і *дж* гэта тое самае, што і прыстасаваньне гэтага спосабу для азначэньня глухіх афрыкатаў, якія перадаюцца літарамі *ц* і *ч,* што значыць, для азначэньня *ц,* якое ў пэўных умовах зьяўляецца злучэньнем *т* і *с,* ставіць значок над *т* (т̆) і для *ч,* якое складаецца ў тых самых умовах з злучэньня *т* і *ш,* ставіць значок над *ш (ш̆).*

Але як-бы там ні было, урэшце рэшт справа ня ў тых ці іншых літарах: ці будуць прыняты ў беларускі альфабэт сербскія літары ђ і ħ, якія, паўтараю, на мой погляд, зьяўляюцца найбольш прыгоднымі, бо не парушаць стылю азбукі, і прыдадуць хараство беларускаму пісьму, ці будуць уведзены іншыя якія-небудзь з названых тут літар, патрэба рэформы тут відаць выразна; дзеля карысьці справы, думаю, варта вітаць тут тое ці іншае вырашэньне пытаньня аб азначэньні афрыкатаў *дз* і *дж* у беларускай азбуцы.

Далёка цяжэйшае другое пытаньне—аб азначэньні мяккасьці зычных. Мяккасьць зычных перад зычным гукам і на канцы слова ў беларускай мове азначаецца, як мы ўжо гаварылі, мяккім знакам, г. зн. літарай *ь*, а мяккасьць зычнага перад наступным галосным не перадаецца асобнай зычнай літарай, а пасьля мяккіх зычных пішуцца літары *я, ю, е, ё;* у той самы час літары *я, ю, е, ё* ў пачатку слова, пасьля галоснага гуку і ў некаторых выпадках пасьля зычнага, як ужо мы казалі, азначаюць злучэньні *j* ці *i̯* з *а, у, е, о,* напрыклад, у словах *яма (jама), юшка (jушка), ёсьць (jосьць), ёжык (jожык), мая (маjá), свой (своi̯), чай (чаi̯), аб'ём (абjом), разьехаліся (разjехаліся)* і г. д. Гэта падвойнасьць у значэньні літар *я, ю, е, ё,* гэта значыць, у палажэньні іх пасьля мяккіх зычных, з аднаго боку, і пасьля *j* і *i̯*—з другога, зьяўляецца адным з слабых бакоў беларускай азбукі і таксама павінны быць ухілены. Унікнуць яго можна, замяніўшы літары *я, ю, е, ё* ў тых выпадках, дзе яны азначаюць склады, злучэньнямі *ja, jу, je, jo*. Каб зрабіць гэту замену, трэба ўвесьці ў беларускую азбуку літару *j* і выкінуць, як лішнюю, *й,* а таксама апостроф, г. зн. цяперашні знак разьдзельнага вымаўленьня *я, ю, е, ё* ад папярэдняга зычнага.

У в а г а: Знак апостроф застаецца толькі для азначэньня скарочаных слоў, напр.: ня трэ' (=ня трэба).

Пры такой рэформе беларускае пісьмо выйграе з таго боку, што літары *я, ю, е, ё* ў значэньні складоў выкідаюцца з беларускага пісьма і маюць значэньне галосных толькі пасьля мяккіх зычных; разам з гэтым беларускае пісьмо будзе мець больш-менш правільную перадачу гукаў.

У в а г а 1. Кажу „больш-менш" таму, што *j* у некаторых злучэньнях будзе азначаць і *i̯*.

У в а г а 2. Можна было-б у даным выпадку пакінуць і літару *й,* ня ўводзячы новай літары *j,* але асаблівасьці напісаньня *й* і прывычка бачыць яе ў сучасным беларускім пісьме ў пэўным значэньні прымушаюць аддаць перавагу літары *j*.

Калі ўвядзем у азбуку літару *j* у паказаным значэньні, дык гэта яшчэ не вырашае пытаньня аб аднолькавым азначэньні мяккіх зычных. Мяккасьць зычнага гуку перад зычным і на канцы слова азначаецца літарай *ь* (мяккі знак); з другога

боку, за *я, ю, е, ё* пакідаецца значэньне літар, якія ўжываюцца толькі пасьля мяккіх зычных, і нічым іншым не азначаецца на пісьме. У гэтым спосабе азначэньня мяккасьці ёсьць дзьве хібы: 1) асобная літара *ь* служыць толькі знакам мяккасьці зычнага перад зычным і на канцы слова, у той час як усе іншыя літары маюць гукавое значэньне; і 2) асобныя галосныя літары існуюць у азбуцы для азначэньня мяккасьці зычнага перад галосным. Каб ухіліць гэтыя хібы, трэба было-б устанавіць аднолькавасьць у азначэньні мяккіх зычных ва ўсякім іх палажэньні. Некаторыя славянскія мовы мяккасьць зычных у пэўным палажэньні азначаюць знакам ´, пастаўленым над зычным, а ў беларускай мове, дзе шмат мяккіх зычных, такі спосаб азначэньня мяккасьці стварыў-бы нязвычайную дла вока стрыкатасьць, і гэты спосаб трэба прызнаць няпрыгодным для беларускай азбукі. Таксама рашуча трэба прызнаць няпрыгодным спосаб перакрэсьленых зычных, як знакаў мяккасьці. Застаецца адзіны, на мой погляд, спосаб— азначаць мяккасьць зычнага гуку значком ¸, як францускі знак *sédille*, ці польскі ˛, які падпісваецца пад насавой галоснай літарай. Літары *н, б, с, м, п* будуць, такім чынам, азначацца: н̧, б̧, с̧, м̧, п̧, ці н̨, б̨, с̨, м̨, п̨, напрыклад, у словах: *н̧еба, б̧ада, с̧олы, м̧аса, п̧арына* і г. д., ці *н̨еба, б̨ада, с̨олы, м̨аса* і г. д.

Зычнымі, якія могуць быць цьвёрдымі і мяккімі, г. зн., якія прымаюць пры мяккасьці знак унізе, будуць: *б, в, г, з, к, л, м, н, п, с, х* і *ц*.

Літары *ж, р, ш, ч* і ђ азначаюць толькі цьвёрдыя гукі і, значыцца, ніколі ня пішуцца з кручком; літары *j* і *ђ*, якія азначаюць толькі мяккія гукі, таксама ніколі ня пішуцца з гэтым знакам.

Калі-б увялі кручок пад мяккімі зычнымі, дык гэта дало-б магчымасьць зусім выкінуць з беларускай азбукі, як лішнія, літары *я, ю, э, ё* і *ь* і зрабіць пісьмо больш-менш вольным ад лішніх умоўнасьцяй. А калі ўвядзем *j,* як ужо гаварылі, дык выкінем з азбукі *й* і знак апострофа. Агулам атрымаецца значны лік выкінутых літар заместа дзьвёх ноgaltва-ўведзеных: *j* і *знаку мяккасьці.*

Рэформаваная такім чынам беларуская азбука перш за ўсё адпавядае ўсім вымаганьням навукі; у ёй ёсьць толькі адна невялікая хіба, з якой дзеля спрашчэньня прыходзіцца

пагадзіцца: ӏ̦ і j азначаюцца ў ёй аднэй літарай. Калі ўвядзем *знак мяккасьці* і *j*, дык беларуская азбука будзе вельмі блізкай да транскрыбаванага азначэньня гукаў. З гэтай прычыны навучаньне па ёй грамаце будзе простым і лёгкім. Значныя зьмены ўносіць гэтая рэформа ў морфолёгію беларускай мовы: пры ўжываньні знаку мяккасьці значнае спрашчэньне адбываецца ў формах скланеньня.

Урэшце, знак мяккасьці зычных значна палягчае вырашэньне пытаньня аб правапісе зычных: *з, с, ц, дз* перад мяккімі зычнымі і падвойных зычных: *л, н, з, с, дз, ц* і надасьць часткова пісьму фонэтычны характар: мяккі зычны заўсёды пішацца там, дзе ён чуецца.

Трэба тут адзначыць, што знак мяккасьці зычнага зьліваецца з літарай разам і ня робіць перашкод у наборы літар пры друку.

Такім чынам рэформаваная беларуская азбука мае пераваги, зьяўляецца найбольш дасканалай паміж азбук іншых славянскіх народаў і можа быць пастаўлена побач з сербскай.

Аднак, прапануючы такую рэформу азбукі, я не спадзяюся і не настойваю, каб яна была прынята і праведзена ў жыцьцё: сама традыцыя, прывычка, баязьнь навіны і іншыя падобныя аргумэнты, на жаль, будуць гаварыць супроць паказанай тут рэформы; супроць яе будзе гаварыць і тая асьцярожнасьць у рэформе, аб якой я ўжо казаў у сваім прывітаньні.

Але калі рэформа ня можа быць прынятай у цэлым, дык трэба зрабіць яе, прынамсі, часткова, абмежавацца ўводам літар для афрыкатаў *дз* і *дж* і *j* замест *й* для азначэньня злучэньняў ӏ̦ і *j* з *а, у, е* і *о*.

Чаржынскі. Мне прыходзіцца трэці раз выступаць опонэнтам Лёсіка адносна яго проекту рэформы беларускае азбукі. На працягу 3-х год, з таго часу, калі Лёсік упяршыню падняў пытаньне аб рэформе беларускай азбукі, і да гэтых пор, ён гэты проект свой угрунтоўвае аднымі і тымі-ж аргумэнтамі, паміж якіх найбольш значную ролю іграе наступны аргумэнт: няпрыхільнасьць да яго проекту рэформы азбукі выклікаецца прывычкай да старой азбукі. На гэты аргумэнт Я. Лёсік апіраўся тры гады таму назад, на гэта ён

апіраецца і цяпер *). Зразумела, зьбіць гэты „аргумэнт“ вельмі трудна, і я перайду да іншых аргумэнтаў, прыведзеных дакладчыкам у сваім проекце рэформы азбукі.

Перш за ўсё Лёсік спыняецца на гуку *э*. Ён гаворыць, што гэты гук у беларускай мове абазначаецца зусім неадпаведнай літарай. Лёсік таму нападае на літару *э*, бо ён лічыць, што яна ёсьць расійская літара. Ён гаворыць, што гэта літара вымаўляецца шырака адкрытым ротам, і што наагул літара *э* няпрыгожая.

Я думаю, што Я. Лёсік тут памыляецца. Калі шукаць пахаджэньня літары *э*, то гэтага пахаджэньня належыць шукаць не ў расійскай азбуцы, а ў глаголіцы.

Што-ж датыча вымаўленьня яе ў расійскай мове шырака адкрытым ротам, то я і тут ня згодзен з Язэпам Лёсікам і лічу, што ў вымаўленьні *э* ў расійскай і беларускай мове розьніцы няма. А калі-б нават і прызнаць такую розьніцу, то наагул трэба памятаць, што літара—знак умоўны і можа азначаць розныя гукі ў розных азбуках. Напрыклад, літара *P* у лацінцы значыць адно, а ў кірыліцы—другое. Эстэтычны-ж падыход у даным выпадку, а менавіта, што калі пераварнуць *э* ў другі бок—*є*, то будзе прыгажэй, памойму, не падлягае навуковай дыскусіі данай Конфэрэнцыі.

Другі момант проекту рэформы беларускай азбукі—гэта літара *ы*. У сваім проекце т. Лёсік выясьняе гісторыю пахаджэньня гэтай літары і гаворыць, што літара, якая азначае гук *ы*, склалася з *ь—і*. Я думаю, што літара *ы* першапачаткова злажылася з *ъ—і*.

Лёсік прапануе замяніць літару *ы* праз *и* і на тэй падставе, што яна ў расійскай мове абазначае адзін гук, а ў беларускай мове—другі.

Я лічу, што гэта ня так, што фонэтычная прырода гуку *ы* як у беларускай мове, так і ў расійскай—тая самая. І ў сваім проекце і ў сваёй брошуры т. Лёсік гэтага не даказаў і даказаць ня мог.

Аднак, цэнтральным пунктам проекту Я. Лёсіка і проф. Растаргуева адносна рэформы нашай азбукі зьяўляюцца літары: *я, ё, е, ю*, г. зн. значкі, якія абазначаюць галосныя ётавыя ці галосныя пасьля мяккіх зычных. Я лічу, што гэта

*) Гл. спэцыяльную брошуру Я. Лёсіка, выданую Інбелкультам.

ёсьць цэнтральны пункт данага проекту, і на гэтым трэба спыніцца.

Тут т. Лёсік пачынае з нападу на літару *й:* ён гаворыць, што літара *й* зьяўляецца недарэчнасьцю, што яе трэба выкрасьліць.

Я лічу, што кваліфікаваць *й*, як недарэчнасьць, у той час як гэта літара мае і пэўнае фонэтычнае значэньне, няма падставы.

З пунктам проекту адносна літар *е, я, ё* і г. д. можна было-б згадзіцца, але толькі пры аднэй умове, а менавіта, калі цалком разьвязаць проблему гэтых літар у нашай азбуцы. Гэта спрабаваў зрабіць т. Лёсік і проф. Растаргуеў, але я павінен сказаць, што гэтую цэнтральную проблему, якая ўваходзіць у рэформу нашай азбукі, ні адзін дакладчык, на мой погляд, не разьвязаў.

Гэтыя літары маюць падвойнае значэньне: у адным выпадку яны зьяўляюцца ётавымі, а ў другім выпадку— галоснымі пасьля мяккіх зычных. Гэта правільна; але я думаю, што калі мы падыходзім да гэтага пункту рэформы нашай азбукі, то ня лішнім было-б памятаць аб адным моманце, а менавіта, што кожная азбука ў любой літаратурнай мове мае перш за ўсё практычныя мэты, а для навуковых мэт, побач з практычнай азбукай, існуе азбука навуковая, найчасьцей гэта лацінская азбука з поўнай сумай дыякрэтычных значкоў. Мне здаецца, што гэтыя два моманты—момант практычнасьці азбукі і момант навуковасьці азбукі—ні ў якім выпадку нельга зьмешваць, асабліва, калі мы падыходзім да рэформы беларускай азбукі пад знакам спрашчэньня яе. І я думаю, што калі мы карыстаемся кірыліцай, то якраз літары *я, ё, ю* маюць вялікае практычнае значэньне, і іх падвойная істота, мне здаецца, не зьяўляецца вялікай перашкодай нават пры навуковым вывучэньні беларускай мовы, таму што заўсёды гэту падвойную істоту іх можна ўрэшце растлумачыць. Возьмем, напрыклад, гук, які абазначаецца літарай *б.* Гэты значок абазначае ў адным выпадку гук—*б*, у другім—*п* (пры этымолёгічным напісаньні зычных). Гэта падвойная істота літар можа заўсёды быць растлумачана.

Ня гледзячы, аднак, на практычны бок справы, можна было-б пайсьці на рэформу нашай азбукі ў гэтым пункце

пры аднэй умове, а менавіта, што мы рэформуем азбуку так, што пакідаем тыя літары, якія нам перашкаджаюць пры навуковым падыходзе.

Пазнаёміўшыся з проектам т. Лёсіка і проф. Растаргуева, мы зварочваем увагу на тое, што ні адзін з гэтых проектаў ня выконвае гэтай умовы, ні адзін з іх ня радзіць выкінуць літары *я, ё, ю, е.*

Праўда, проф. Растаргуеў прабаваў даць проект поўнай замены гэтых літар, аднак, у канцы дакладу робіць агаворку, што гэту рэформу трэба праводзіць асьцярожна і пакуль што трэба абмежавацца толькі ўвядзеньнем літары *j.* Такім чынам, абодва проекты становчa ня выказваюцца супроць гэтых літар нашай азбукі. Яны толькі на дапамогу гэтым літарам дадаюць новую—*j.* Я лічу, што такое разьвязаньне проблемы, калі мы ня выкідаем зусім гэтых літар з азбукі, а наадварот, калі на дапамогу даём новы знак, ня вытрымлівае крытыкі і перш за ўсё з боку пэдагогічнасьці. Якраз пры тэй умове, калі мы рэформуем азбуку пад знакам спрашчэньня, дадатковае ўвядзеньне *j* не спрашчае, а толькі, можа быць, ускладняе яе.

Чаму ня ідуць рэформатары на тое, каб выкінуць зусім гэтыя літары? А таму, што выкінуць іх з кірыліцы пры фонэтычных фактах беларускае мовы прадстаўляе вельмі вялікія труднасьці. Калі іх памякчаць дыякрэтычнымі значкамі зьверху, то выйдзе вялікая недапасаванасьць да кірылічнага пісьма, на якую зьвярнуў увагу проф. Растаргуеў.

Проект-жа проф. Растаргуева аб памякчэньні зычных літар пры дапамозе кручкоў зьнізу, сэдыляў, на мой погляд, таксама ня вытрымлівае крытыкі, і перш за ўсё з боку практычнасьці пісьма.

Такім парадкам, літары *я, е, ё, ю* абодва проекты пакідаюць, атрымліваецца палавінчатасьць, і гэта ня можа служыць да спрашчэньня беларускага правапісу.

Наагул, я павінен сказаць, што літары, якія выклікаюць такія спрэчкі, на мой погляд, зьяўляюцца для кірылічнага пісьма вельмі характэрнымі літарамі. Я лічу, што гэтых літар, якія не паддаліся лацінізацыі з боку формы, няма сэнсу выкідаць з кірылічнага пісьма пры фонэтычных фактах беларускае мовы.

Вось тое, што я лічу цэнтральным пунктам проекту т. Лёсіка і проф. Растаргуева. Паколькі проект палавінчаты, ён не зьяўляецца спрашчэньнем азбукі, а толькі ўскладняе справу, і з гэтае прычыны, на мой погляд, яго падтрымліваць нельга.

4 пункт у проекце рэформы азбукі ёсьць проблема абазначэньня гукаў *дз* і *дж*. Гэта ёсьць адзін з конкрэтных момантаў проекту, які можна было-б абгаворваць на данай Конфэрэнцыі, прысьвечанай рэформе нашай азбукі.

Бязумоўна, гукі *дз* і *дж,* ня маючы асобных літар у нашай азбуцы, выклікаюць значныя труднасьці ў пэдагогічнай практыцы. Разьвязаць-жа гэта пытаньне даволі лёгка; трэба толькі падшукаць пэўныя літары для гэтых гукаў, што можа быць выканана супольна лінгвістамі і мастакамі. Проект-жа Я. Лёсіка, каб абазначыць гук *дз* літарай д̆, а *дж*—літарай ӂ, здаволіць мяне зусім ня можа, бо замяняць двухзнакавымі літарамі, як *д* і *ж,* няма практычнага сэнсу. А з другога боку, я баюся, што ўвядзеньне такіх літар мела-б адмоўны ўплыў на фонэтыку беларускае мовы, бо гукі *дз* і *дж,* пад уплывам напісаньня іх паводле проекту Я. Лёсіка, паволі набліжаліся-б да мяккага *д* і *ж,* што было-б прычынай страты характэрнай асаблівасьці беларускай мовы.

Вось некалькі заўваг да проекту. З майго пункту гледжаньня наагул рэформа нашай азбукі ў сучасны момант не зьяўляецца актуальнай. Падругое, рэформаваць беларускую азбуку ў сапраўдным сэнсе гэтага слова можна толькі на аснове лацінкі. Сёньня дакладчык казаў, што лацінка не разьвяжа спрэчнай проблемы. Я кажу, што ў гэтым кірунку не працавалі, ці працавалі вельмі мала.

Гэта пытаньне пакуль што прынцыповае, актуальнага значэньня сёньня ня мае. На аснове кірыліцы гаварыць аб рэформе, памойму, ня прыходзіцца. Тут можа быць не рэформа, а некаторыя папраўкі, некаторае дапаўненьне адносна абазначэньня гукаў *дз* і *дж*. Кірыліцу, на мой погляд, немажліва рэформаваць, бо гэта пярэчыць яе існасьці пры беларускіх фонэтычных умовах. Сербская мова магла зрабіць рэформу кірыліцы (выкінуць *я, е́, ё, ю),* бо фонэтычныя ўмовы яе гэта дазвалялі; у нашых умовах зрабіць гэтага нельга.

Рэформаваць беларускую азбуку мы, відаць, будзем, але толькі на аснове лацінікі, хаця такая рэформа сёньня яшчэ не зьяўляецца актуальнай, але прынцыпова аб ёй гаварыць ужо пара.

Некрашэвіч. Перш, чым выказаць свой погляд адносна запроектаванай рэформы беларускай азбукі, дазвольце мне зачытаць надасланыя ўвагі да проекту рэформы азбукі акадэміка Ляпунова (чытае):

„Во первых, вполне соглашаюсь с теми доводами, какие приводит Я. Лёсік в пользу сохранения кирилицы, как основы белорусской азбуки.

Во вторых, предлагаю свои замечания на проект предложенной им реформы.

1) Почему „э—чыста расійская літара"? И верно-ли, „што яна азначае гук, які звычайна стаіць у расійскай мове на пачатку слова і вымаўляецца з шырака адкрытым ротам (этот...)" (Мат. да Акад. Конф. 1, 3)? Напротив, эта буква вполне годна для выражения чистого нейотованого *е,* который совершенно „падобен да чужаземнага *э* ў словах *турнэ, кабарэ"*, как и „адпаведны гук" в белорусском. Старина ее засвидетельствована и древней письменности: в памятниках югослав. XIII—XIV в. она давно уже отмечена, а „от югославян этот знак проник в Западную Русь: его находим напр., в рукописи С. П. Б. П. Б. XV в....., встречается.... и в некоторых изданиях Литовского Статута 1588 г." (Е. Ф. Карский, очерк славянской кирилловской палеографии, изд. Варшава 1901, стар. 189). Далее, акад. Карский пишет: „В западно-русских рукописях этот знак употребляется иностранных словах для передачи *е* неумягчительного: в *єкъспэктатывах,* Стат. 1588 г. После реформы Петра I это *э* вошло и в нашу гражданскую азбуку" (ibid. 189). Таким образом, в виду старины этой буквы в этом же значении, в каком она употребляется теперь в белорусском письме, и ввиду появления ее именно *в том же значении впервые после южных славян* в старом западно-русском письме, следует удержать ее и в нынешнем белорусском письме в том же значении *е* несмягчающего. Употребление ж в таком значении буквы є, которая уже в письменности славянской XIV века в виде широкого *є, Є* в разных юго-

славянских и русских рукописях, в особенности с утратой употребления Ꙓ, получила значение *je* или *ȷe*, было бы совершенно противно историческому ходу развития кирилловского письма у славян, тем более, что умные украинцы, а ранее их сербы до принятия вуковицы, давно уже воспользовались этою буквою для означения йотованого *е,* т. е Ꙓ. Поэтому считаю употребление є в словах *рєкі, шєпча* и т. д. лишённым всякого „сэнсу“ и способным породить только недоразумения. Совершенно отказываюсь понимать, почему т. Лёсик боится, что этот белорусский знак будут „вымаўляць, як расійскае э з шырака адкрытым ротам“, а не боится, что *є* в *рєкі* и т. п. прочтут, как *ȷe (je),* как искони привыкли его читать все восточно-славянские грамотеи, и как до сих пор читают украинцы, следуя традиции. Нелепее этой замены ничего нельзя придумать. Гораздо было бы умнее ввести букву є в знач. Ꙓ, следуя разумному примеру украинцев, а букву *э* оставить там, где ей и надлежит быть как в великорусском, так и в белорусском письме, т. е. для означения чистого *е* без йотации и без мягкости предшествующего согласного, какого бы оттенка этот гласный ни был—более открытого (широкого) или более узкого; недоразумений здесь быть не может. Я так много распространяюсь об этом потому, что никак не могу понять того пугала, „с широко открытым ртом“, о котором говорит так Я. Лёсик.

2) Буква *ы* традиционна и необходима для выражения белорусской, как и великорусской речи. Это один из пунктов общей белорусско-великорусской фонетики. Согласен, что возможна некоторая разница в произношении соответствующего звука в белорусском и великорусском. Но ведь такая разница может быть и в говорах великорусских. Это тонкости, требующие специального экспериментально-фонетического исследования. Если существует действительно разница между произношением *ы* во всем об‘еме белорусской языковой области или, по крайней мере, в господствующем белорусском говоре с одной стороны, и господствующем великорусском произношении звука *ы,* с другой, чего не находит лучший знаток белорусского языка акад. Карский, то во всяком случае эта разница—ничто в сравнении с крупной разницей в произношении этимологически соответствующего звука

в господствующем *малорусском*, т. е. в украинском *говоре*, в котором он совпал со старым звуком *и*, резко сохранившим отличное произношение и в белорусском и в великорусском. Кроме того, считаю необходимым исправить ту ошибку против истории письма у восточных славян, которую нахожу в утверждении Яз. Лёсика на стр. 5 статьи: „У справе рэформы нашае азбукі": „Даўней гэты гук *ы* азначаўся дзьвюма літарамі *ь* і *і*, злучанымі зьверху папярэчнай рыскай, прычым над *і* заўсёды ставілася кропка. *Мяккім знакам хацелі паказаць*, што гэта той самы гук *і*, только яго трэба вымаўляць цьвярдзей". Автор, очевидно, совершенно незнаком с древней письменностью у восточных славян. Иначе он знал бы, что в XI стол. обычно правильно писалось ЪІ (в Остром. ев., Арх. ев., Сборн. 1073 и 1076, Мин. 1095—1097 г.), только изредка *ы* (но всегда без поперечной черты), напр.: в Сб. 1073 до 86 листа; что в памятниках XII и XIII и первой и даже второй половине XIV в. на севере, юге и в центре восточно-славянской области писалось правильно ЪІ, которое в оригинальной письменности до конца XIV в. выдержано. И только во второй половине XIV в. в некоторых, списанных с южнославянских оригиналов, книгах изредка стало появляться ЬІ, что уже чаще является*) в памятниках XV в. Это ЬІ, которое потом утвердилось в русской письменности бессознательно и вопреки произношению, ибо буква *ь* продолжала и продолжает выражать мягкость (и даже получила название „мягкий знак" в школе) как в великорусской, так и в белорусской и украинской письменности,—это ЬІ, откуда и *ы* уже в скорописном письме XVI—XVII в. в пришло в русскую (восточнославянскую) письменность от южных славян, которые, особенно последовательно сербы, рано стали употреблять *ь* вместо *ъ*, вследствие утраты мягкого произношения согласных перед *ь* (кроме случаев йотации), а потому и заменили ЪІ на ЬІ, а последнее стали смешивать с буквою *и*.

Вследствие указанных причин, я решительно протестую против замены буквы *ы* буквою *и*, чтобы не вызывать недо-

*) Однако в Полоцкой грамоте 1407 г. и Печерском патерике 1462 еще ЪІ (Карский, Оч. сл. палеогр., 211).

разумения, будто соответствующий белорусский звук тожествен с украинским, выражаемым буквою *и*.

3) Т. Лёсик считает нужным выкинуть букву *и*, чтобы не было противоречия с употреблением вместо *и* только *i*. Но, вопервых, не лучше ли последнюю букву заменить буквою *и*, выражавшею и в дореформенной и в современной русской графике тот же звук, что и в великорусском (о диалектических разновидностях не говорю), по крайней мере, господствующем московском и русском литературном говоре? Это было бы гораздо лучше, чем вводить исключительно употребление *i* в то время, когда общерусская графика (волей или неволей) приняла исключительно *и*, потому что украинское *i* разного этимологического происхождения (из ѣ, из *ê* и *ô* в закрытых слогах), хотя и произносится приблизительно близко к великорусско-белорусскому *i (и)*, отличается от него этимологически. А кроме того, как белорусское, так и великорусское *i* из общерусского *i*, отличаются от украинского нового *i* (хотя в последнем *нi* в *нiс* < **несл* мягче, чем *нi* в *нiс* < **нос)* большею мягкостью предшествующих ему согласных, кроме, разумеется, тех, которые в белорусском и великорусском отвердели, и после которых следовало бы писать *ы* (напр., *ры* в белорусском, а в отдельных словах, как *крыло*, и великорусском, *шы, жы* в белор.—великор.). Изменение перед *i* и *е* согласных зубных затворных в зубные фрикативные разной—то более слабой, то более сильной—степени свойственно не только белорусским, но и великорусским говорам; только мы по привычке не замечаем слабой степени фрикативности *(t's, d'z)* в собственном произношении. Итак, непоследовательность в употреблении *й* при *i* можно устранить, обратно введя букву *и* вместо *i*. Что же касается *j*, то я считаю его нисколько не лучше, а даже хуже с фонетической точки зрения, чем *й*. А именно: в таких формах, как *мой, твой, моя—мая, твоя—твая*, в большинстве славянских языков слышатся звуки į *(i* неслогов.) и звукосочетания *įа, įе* и т. п. В немецком произношении буквы *j* слышится, напротив, более интенсивная *согласная* артикуляция. Наше *й*, правда, выражает краткость звука *i*, не выражая его неслогового характера, что было бы желательно. Но все таки оно лучше

выражает артикуляцию этого краткого неслогового звука и вполне гармонирует в белорусском письме с буквою *ў*, которая начертанием выражает только краткость звука *и*, а должна выражать не только краткое, но именно неслоговое ų. Введение *j*, несмотря на то, что оно утвердилось в сербской вуковице, нежелательно, как нарушающее цельность кирилловской азбуки, и если вводить *j* в формах *моj, твоj*, то для последовательности пришлось бы ввести латинское *v* или *w* вместо *ў* в формах шо*v*, кро*v* и т. п., во*v*к и т. п., так как согласный *j* так относится к гласному *i*, как согласн. *v* к гласному *и*, но это слишком пестрило бы письмо. В таких же сочетаниях, как *добрае, беларускае* я бы рекомендовал, как было выше сказано, возродить старорусское и стариное южнославянское *є*, следуя разумному примеру украинцев, а *мая, твая, гэтая, яго, маю, тваю, гэтую, нашую* оставить так, как пишется и теперь: не для чего здесь вводить *j*, когда йотация прекрасно выражается буквами *є, я, ю*, *є̈* (последнее вместо ё). Большой беды не будет, если две буквы—*я* и *ю* будут иметь два значения, как они имеют теперь в русской графике: *а* и u (впрочем, со склонностью к *ä, ü)* после мягких согласных и сочетания *i̯а, i̯и*.

Вот мои главные замечания о проекте реформы Лёсика. В особенности я считаю важным удержание букв *ы* и *э* в их настоящем значении и нахожу желательным введение є только в значении І-Є *(ie)*, считая совершенно недопустимым введение этой буквы вместо *э*, которая необходима так же, как и *ы* (если угодно, можно воскресить и древнерусское *ЪІ!*). Академик Б. М. Ляпунов.

Вось што піша аб проекце рэформы вядомы акадэмік Ляпуноў, разглядаючы проект Лёсіка пераважна ў гістарычным асьвятленьні. З увагамі акадэміка Ляпунова я не магу згадзіцца толькі ў тым месцы, дзе ён прапануе замяніць наша *і* літарай *и*. Не гаворачы ўжо аб тым, што *і* замацавалася ў нашай азбуцы і не выклікае ніякіх нараканьняў, яно і з гістарычнага боку мае такое-ж права на існаваньне ў нашай азбуцы, як і *и*. Рэшта-ж уваг акад. Ляпунова зьяўляюцца вельмі каштоўнымі і заслугоўваюць быць прынятымі пры абгаварэньні пытаньня рэформы нашай азбукі.

Цяпер выкажу коратка свае ўвагі да проекту рэформы азбукі. Пачну з гісторыі гэтага пытаньня. У сваім дакладзе Я. Лёсік адзначыў, што ён аб рэформе азбукі рабіў даклад у Інстытуце Беларускае Культуры яшчэ ў 1923 г., і што тады яго даклад быў спатканы няпрыхільна. У 1923 г. я зьяўляўся опонэнтам Я. Лёсіка. Мушу зазначыць, што даклад Я. Лёсіка быў спатканы, наадварот, прыхільна, толькі не ўва ўсіх сваіх частках. Спадзяюся, што такія-ж адносіны да дакладу будуць і сягодня. Пастаноўку дакладу аб рэформе азбукі трэба прызнаць на часе, але згадзіцца поўнасьцю з проектам, які тут прапануе Я. Лёсік, бязумоўна нельга.

Аб насьпеласьці пытаньня реформы азбукі гаворыць той факт, што ўжо ў 1922 г. ў Інстытут Беларускае Культуры паступіў проект ад грам. Бывалькевіча комбінаваных знакаў з *д* і *з* для афрыкаты *дз* і з *д* і *ж*—для афрыкаты *дж*. Наагул-жа, аб патрэбе замяніць афрыкаты *дз* і *дж* кожную аднэю літараю ў нас ідуць сур‘ёзныя гутаркі з 1920 году, ад самага пачатку існаваньня Савецкай Беларусі. У заслугу Лёсіка трэба паставіць, што ён першы па гэтым пытаньні выступіў з дакладам і ў друку, адбіўшы аб замене афрыкатаў *дз* і *дж* агульную грамадзянскую думку. Пасьля гэтага будзе зразумела, што даклад Я. Лёсіка наагул ня мог у 1923 г. быць спатканы няпрыхільна. Няпрыхільнасьць магла толькі выражацца да тых конкрэтных пунктаў рэформы, якія проектаваў Я. Лёсік. Напэўна гэта няпрыхільнасьць будзе выражана адносна тых-жа пунктаў і сягодня.

Найбольш важным пунктам рэформы азбукі трэба лічыць замену аднэю літараю афрыкаты *дз* і афрыкаты *дж*. Якую-ж замену тут прапануе Я. Лёсік? Ён знаходзіць мэтазгодным заместа *дз* напісаньне д̆ і заместа *дж*—ӂ. Але як ужо правільна заўважыў папярэдні прамоўца т. Чаржынскі, такое напісаньне не на карысьць беларускай мовы, бо яно будзе сьціраць характэрную асаблівасьць беларускай мовы—дзеканьне і джэканьне. Гэтыя асаблівасьці лепш за ўсё азначаць асобнымі літарамі. Проф. Растаргуеў прапануе азначаць гэтыя асаблівасьці—афрыкаты *дз* і *дж*—літарамі сербскага альфабэту ђ, ћ. Але чаму сербскага, а не якога іншага? Тым больш, што ў сербскай азбуцы літары ђ, ћ азначаюць мяккія *д* і *т*. Апрача таго, калі сербы ўвялі ў свой альфа-

бэт літару ђ, ћ, то гэта зразумела: у сербскіх рукапісах яшчэ ў XII в. спатыкаецца значок ђ. У нас такой падставы няма, дзеля чаго я лічу немэтазгодным замяніць нашы афрыкаты *дз* і *дж* праз ђ, ћ. За нязручнасьць такой замены сьведчыць і той факт, што як-ніяк, але ў нас, побач з кірыліцай, ужываецца і лацінка, у якой літара, блізкая да ћ=h, азначае іншы гук. Мне здаецца, што нам для афрыкатаў *дз* і *дж* трэба прыдумаць свае літары. Якія павінны гэта быць літары, зараз цяжка сказаць, бо пытаньне аб рэформе азбук ў нас зьяўляецца яшчэ мала апрацаваным. Тут, апрача брошуры Я. Лёсіка „Да рэформы беларускай азбукі", мы нічога іншага ня маем. А таму я лічу, што мы сягодня павінны абгаварыць пытаньне, у якім напрамку павінна ісьці рэформа нашай азбукі. Лічу, што будзе карысна, калі мы тут унясем тыя ці іншыя проекты, аднак, я супроць таго, каб мы прымалі конкрэтныя пастановы аб тэй ці іншай літары. Прызнаючы, з свайго боку, патрэбнасьць замены аднэю літарай афрыкаты *дз* і афрыкаты *дж*, я лічыў-бы мэтазгодным прыняць для гэтых афрыкат комбінаты з *д* і *з* для *дз* і з *д* і *ж* для *дж*. Якія гэта павінны быць комбінаты, зараз сказаць не магу. Тут, мне здаецца, лепш за ўсё было-б абвясьціць конкурс,—і я не сумняваюся, што нашы мастакі дадуць патрэбныя нам літары, якія могуць задаволіць і з боку прастаты, і з боку стылю, і з боку мастацкасьці.

Найбольш слабым пунктам проекту Я. Лёсіка зьяўляецца замена літары *ы* на *и* і літары *э* на *є*. Я. Лёсік знаходзіць патрэбным зрабіць такую замену, папершае, таму, што гэтыя літары не беларускія, а падругое, што гэтыя літары дапасаваны да расійскай мовы, але не да беларускай, і што яны, такім чынам, недакладна перадаюць гукі беларускай мовы.

Што датыча *ы*, то, як ужо добра ў сваім лісьце давёў акад. Ляпуноў, гэтая літара перайшла ў беларускую азбуку ад сербаў і што яна ўжо ад беларусаў пранікла на ўсход. Такім чынам, літара *ы* больш беларуская, чым расійская. Гэта літара таксама дакладна перадае наш сярэдні гук верхняга пад'ёму, як і адпаведны гук расійскай мовы, бо ў нашай мове і ў расійскай гэтыя гукі зусім аднолькавыя. Мы маем іншае *ы* ў украінскай мове, якое набліжаецца да гуку пярэд-

няга раду і якое запраўды правільна азначаецца літарай *и*. Лічыць-жа наша і ўкраінскае *ы* адным і тым-жа гукам—было-б вялікаю памылкаю. Дзеля гэтага я абсолютна ня бачу ніякіх падстаў да замены *ы* на *и*. Тут, між іншым, заўважу, што дакладчык памыляецца, калі кажа, што літара *ы* раней азначалася праз *ь* і *і*. Глыбокі знаўца старой мовы, акад. Ляпуноў, кажа, што такое азначэньне *ы* (ьı) стала спатыкацца з XIV в. Да гэтага-ж часу *ы* звычайна азначалася праз *ЪI*.

Таксама ніякіх солідных падстаў у дакладчыка Я. Лёсіка няма і адносна замены *э* на *є*. Літара *э* ўласьціва беларускаму пісьменству і спатыкаецца ў нашых старажытных рукапісах. Прыклады мы чулі з ліста акад. Ляпунова. Наш пярэдні гук сярэдняга пад'ёму лепш перадаецца праз *э*, чым *є*, бо ў нашых старых помніках *є* звычайна пісалася, як ётаванае *е*: здарэньє, єсть і да таго пад.

Больш сур'ёзным пунктам рэформы трэба лічыць замену *й* на *j* і замену ётаваных *я, е, ё, ю* на *ja, jэ, jo, jу*. Аб гэтай замене гаварылі абодва дакладчыкі—і Я. Лёсік і Растаргуеў. Што-ж датыча мяне, то я ў поўнай меры згадзіўся-б з дакладчыкамі, калі-б яны наагул выкінулі з нашай азбукі *я, е, ё, ю,* г. зн. у тым значэньні, калі яны азначаюць памякчэньне папярэдніх зычных. Праўда, адзін з дакладчыкаў прапанаваў азначаць мяккія зычныя знакам сэдыль. Але такое пісьмо было-б зусім нязручна, бо, як аднастайнае, яно рабіла-б брыдкі выгляд. Ёсьць і яшчэ некаторыя недакладнасьці ў запроектаванай рэформе—гэта неадпаведнасьць *j* нескладоваму *і (й)*. У той час, як *j* зьяўляецца гукам зычным *(jама, баjуся)*, *й* зьяўляецца гукам галосным *(мой, вайна, добруйу)*; такім чынам, дапусьціўшы напісаньне *jама, маjа*, будзе ня зусім дакладна пісаць *моj, ваjна* і да т. п. Але нічога страшнага ў прыняцьці запроектаванай дакладчыкамі адносна *j* рэформы я ня бачу. *J* мае і свае дадатныя бакі. Дзеля гэтага, лічачы прынцыпова пажаданым увядзеньне ў нашу азбуку *j*, я аднак зараз устрымліваюся ад яго прыняцьця з прычыны застаўленьня аўтарамі проекту літар *я, е, ё, ю* ў сэнсе памякчаючых папярэднія зычныя гукі. Думаю, што пытаньне аб увядзеньні ў нашу азбуку *j* таксама належыць да тых пытаньняў нашай графікі, якія павінны быць больш грунтоўна апрацаваны.

Што-ж датыча ўвядзеньня ў нашу азбуку значка для азначэньня выбуховага *г*, то тут і гаварыць многа ня прыходзіцца. Гэтакі значок (ґ) у нас ёсьць, напр., у грам. Б. Тарашкевіча. Мы толькі мусім пацьвердзіць патрэбнасьць яго ўжываньня.

У канцы сваёй прамовы я хацеў-бы азнаёміць Конфэрэнцыю з поглядамі на пытаньне аб рэформе нашай азбукі беларускіх навуковых працаўнікоў Заходняй Беларусі. Будучы ўлетку гэтага году ў Вільні, я быў запрошаны на нараду ў справе рэформы нашай азбукі. На нарадзе былі прысутнымі Б. Тарашкевіч, А. Луцкевіч, Дварчанін, Я. Станкевіч і інш. Там я зачытаў проект Лёсіка па яго брошуры, экзэмпляр якой знаходзіўся пры мне. Большасьць прысутных выказалася за ўвядзеньне ў нашу азбуку *j* і асобных значкоў для афрыкат *дз* і *дж*. Адносна іншых пунктаў рэформы, апрача ґ, усе прысутныя на нарадзе выказаліся адмоўна.

Канчаючы сваю прамову, я хачу сказаць, што пытаньне аб рэформе нашай азбукі лічу насьпелым, аднак, яшчэ не належна апрацаваным, у зьвязку з чым нам патрэбна быць вельмі асьцярожнымі пры прыняцьці тых ці іншых пастаноў па заслуханых дакладах.

Ластоўскі. Рэвізія ўжыванай у нашай пісьменнасьці кірылаўскай азбукі бязумоўна справа ўжо даўно насьпелая.

Забесьпячэньне літаратурнай мове ўмоў здаровага разьвіцьця ў значнай меры залежыць ад добрага дапасаваньня пісьменных знакаў да гукаў жывой мовы і ўстанаўленьня згоднага з фонэтыкай і гісторыяй правапісу. Ад гэтых двох асноўных момантаў залежыць найважнейшае ў жыцьці мовы, а ўласна—магчымасьць дасканаліцца ёй у кірунку стройнасьці і мілагучнасьці.

Мова ёсьць зьявішча ня толькі анатомічна-фізычнае, але таксама—*духовае, псыхічнае.* Гук з пункту гледжаньня фізыкі і з пункту гледжаньня граматыкі—гэта дзьве зусім розныя справы.

Гук мовы перадаецца на пісьме прынятымі знакамі—літарамі. Літары, у свой чарод, маюць два бакі—знадворны і ўнутраны. Знадворны—гэта іх форма (фігура), унутраны

бок пісьменных знакаў, гэта іх стылізація і гісторыя. Як
знадворны, так і ўнутраны бок літар маюць сувязь з псы-
хікай чытача.

Паложаная ў аснову крывічанскай (беларускай) пісьмен-
насьці кірылаўская азбука ў яе „гражданскай“, ці больш
правільна рэнэсансавай стылізації,—пры рэформе, а не рэво-
люцыі, не вымагае замены на якую-колечы іншую (скажам,
лацінскую) азбуку. Пераход бязмала тысячалетняй крывічан-
скай пісьменнасьці на другую азбуку—гэта „царскае сячэньне“,
на якое можна наражаць толькі хворы об‘ект, калі ён зна-
ходзіцца паміж жыцьцём і сьмерцю. Здаровы організм нашай
пісьменнасьці няможна наражаць на непатрэбную яму „опэ-
рацыю“, бо гэта аслабіла-б малады і поўны энэргічнага
ўзросту організм, прывяло-б яго да нямінучага цяжкога
заняпаду і да неаблічальных у выніках комплікацый.

Затое, як вышэй было сказана, рэвізія кірылаўскай
азбукі, дзеля лепшага яе дапасаваньня да гукаў жывой мовы
і новачаснай пісьменнасьці ёсьць адно з найпільнейшых
бягучых заданьняў нашага мовазнаўства. Малады парастак
з тысячалетняга пня моцна і здарова буяе, але вымагае ад
навукі, як ад добрага садоўніка, каб апошняя выправіла і
аформавала каронку, каб у будучыне дрэва расло ня толькі
магутна, але і стройна.

Кожная літара зьяўляецца *ўмоўным* знакам для пера-
дачы гуку жывой мовы; яна, бяручы фізычна, не перадае і
ня можа перадаць усіх адценьняў і вібрацый голасу пры
зьменах, якія наступаюць, калі мы вымаўляем словы; пісоўны
знак, на мове граматыкі, *гэта толькі прадстаўленьне аб
даным гуку, або групе жывых гукаў*. Напісаны намі, прыкла-
дам, знак *а* служыць для абазначэньня цэлай гамы блізкіх
яму гукаў а^{о}, а^{і}, а^{е}, а^{ё}, а^{у}. Такі самы характар маюць і
ўсе галосныя літары. Прыкладам, мы ўжываем цяпер для
абазначэньня „ітавых“ гукаў тры літары: *і, й, ы;* і гэта ня
значыць, што паказанымі трыма знакамі вычэрпваецца ўся
гама „ітавых“ гукаў, якія маюцца ў нашай мове: для аднаго
ўмоўнага „і“, каб вычарпаць усе яго адценьні ў жывой мове,
патрэбна было-б 6-7 знакаў.

Гісторыя разьвіцьця пісьменнасьці паказвае нам, што ў
першапачатным ерогліфічным пісьме ўжывалася надта многа,

цэлыя тысячы знакаў. Гукавае пісьмо, зьменшыўшы лік знакаў, патрэбных для перадачы паняцьцяў, а гэтым самым аблягчыўшы граматнасьць, лёгка выціснула ерогліфічнае пісьмо. У меру поступу цывілізацыі тэхніка пісьма дасканалілася, і, разам з гэтым, лік літар стала памяншаўся ва ўсіх азбуках. Прыкладам, старaславянскае пісьмо патрабавала больш літар, чым „гражданка“, а „гражданка“, у свой чарод, імкнецца да рэдукаваньня ўжываных ёю знакаў. Чым меншая азбука, тым лягчэй навучыцца пісаць, і тым менш завілай становіцца граматыка.

Спаміж знакаў нашай азбукі ў першую чаргу павінна быць перарэформавана група галосных літар. Гэтых літар цяпер маецца дванаццаць: *а, о, у, ў, е, ё, э, і, й, ы, ю, я;* падзяляюцца яны на цьвёрдыя *(а, э, ы, о, у),* мяккія *(я, е, ё, ю, і)* поўгалосныя *(й, ў)**. Цьвёрдыя галосныя (апрача замены *э* на *е)* ніякай перапраўкі не патрабуюць; „мяккія“-ж, якія распадаюцца на тры групы: „ітавых“ *(і, ы),* „ётаваных“ *(я, е, ё, ю),* і таксама „кароткіх“ *(й, ў),* павінны быць перагледжаны. Найперш затрымаем сваю ўвагу на т. зв. „ётаваных“.

Група „ётаваных“ знакаў зьяўляецца ў нас такім самым перажыткам, як у расійскай азбуцы нядаўна яшчэ былі: *ѣ, ъ,* а раней *ѳ, ѵ,* і якія зусім слушна цяпер выкінуты з азбукі. Ад нястачы вышэйшых знакаў расійская азбука і пісьменнасьць ня толькі нічога ня страцілі, але значна выйгралі. У нашай азбуцы „ётаваныя“ знакі—непатрэбны баляст, які перашкаджае ў навуцы пісьма і награмаджае лішнія труднасьці ў правапісе, а ў дадатак тушуе фонэтыку жывой мовы, а ўласна нашы дыфтонгі.

Ва ўсіх старaславянскіх рукапісах на месцы *я, ю, е* мы знаходзім **ı-а, ı-о, ı-є,** г. зн. падвойныя літары, злучаныя, зьвязаныя паміж сабой тоненькай рыскай, а ёсьць некаторыя рукапісы XII-XIII ст., дзе „і“ нават рыскай ня прылучана да чародных *а, о, е.* На гэтай падставе вядомы нямецкі славіст, проф. Абіхт, сьцьвярджаў, што першавучыцелі славянскія—Кірыла і Мэтоды ў зложанай імі славянскай азбуцы не ўстанавілі вязаных літар, што апошнія ёсьць вытвар не

*) Падзел В. Ластоўскім галосных мы астаўляем згодна выпраўленай прамоўцам стэнограмы. Толькі далей „дыфтонгі *дз* і *дж*“ для яснасьці пытаньня заменены намі ўсюды на „афрыкаты *дз* і *дж*.“ *Увага Рэд.*

ґраматыкаў, а, галоўна, перапісчыкаў кніг, каліграфаў, якія любілі вязаць літары, імкнучыся да аздобнасьці пісьма. Перапісчыкі вязалі ў адну фігуру ня толькі часта побач сустрачаныя „ётаваныя“, але таксама і іншыя літары, прыкладам: *ть, тр* і інш.

Рукапісная славянская кніга наражана была на ўсякія каліграфічныя экспэрымэнты шэсьць стагодзьдзяў да першадрукаў. Першыя кірылаўскія друкі зьяўляюцца ў канцы XV ст., але друкарства запраўды пачало конкураваць з рукапіснай кірылаўскай кнігай толькі пад канец XVI ст., дый то сьпярша ледзь займаючы віднае месца побач ручнога перапісваньня; апошняе зусім замерла ў нас толькі ў другой палавіне XIX ст. Перапісчыкі на працягу тысячалецьця мелі сьпярша выключна, а пазьней паўзьбежна з друкамі шырокае поле для сваёй стылізатарскай і каліграфскай продукцыі, якая ня мела нічога супольнага з ніякай фонэтыкай. Першапачатны выразны бізантыцкі стыль (устаў), які быў прыняты ў аснову кірылаўскіх літар, падлягае грунтоўным перам енам у часе рэнэсансу, чаму могуць быць прыкладам прыгожыя скарынаўскія літары. Яшчэ большыя зьмены ў іх стылізацыі наступаюць пад уплывам стылю бароко, пры якім зьяўляецца ўжо завілая, выкрутасная скорапісь. У гэтым чаргаваньні стыляў і была зацерта першапачатная яснасьць складовых часьцей „ётаваных“ літар, у якіх зусім яўнае ды выразнае *і* мала-па-малу становіцца „скрытым“.

Літара **і** *перад* **а, о, э, у** *ва ўсякай кірылаўскай азбуцы мае заданьне мякчыць наступаючыя пасьля яе галосныя гукі,* гэтак: *і+а=я, і+э=е, і+о=ё, і+у=ю.* Калі цяпер мы пішам і вымаўляем „ётаваны“ гук, мы, дзякуючы затрачанай фігуры іх складовых часьцей, забываем, што гэтыя „мяккія“ галосныя ня з прыроды сваёй такія, а зьмякчоныя *а, о, у, е,* пры помачы скрытага ў іх стылістамі і рэформатарамі знаку *і*. Такое скрытае *і* ў „ётаваных“ зьяўляецца вялікай абузай пры навучаньні граматыкі (прыклад дае Я. Лёсік: „У справе рэформы нашае азбукі“, стар. 8). А галоўна тое, што знакі з скрытым, стушаваным *і* не падходзяць да жывой мовы, бо ў нас на месцы *я, ю, е, ё* існуюць дыфтонгі, якія пры пісаньні адным вязаным знакам заціраюцца. Кажуць: *міера, віера, ліепіей, ліудзі, сьвіедкі,*

пі͡ершы, мі͡арлі͡ец, ві͡арзе, лі͡евы, лі͡он, і͡он, клі͡он, ві͡еці͡ар, і дзеля гэтага тут павінна стаяць яўна выдзелена *і* перад *а, о, у, е (=э)* для мякчэньня гэтых гукаў, і ў злучнасьці з імі, для адзначаньня вельмі каштоўных для акцэнтацыі мовы дыфтонгаў.

Знак **і** *зьмякчае ня толькі галосныя, але таксама і зычныя гукі;* гэта бывае ва ўсіх тых здарэньнях, калі зычныя стаяць перед *і,* прыкладам: *віджу, пішу, ніва, ліст, кірую, бірка, мігаю, зіма, кінь, фігура, хіба.*

Гук *і* мае і яшчэ адну цікавую асобнасьць, уласьцівую і другім галосным (а ўласна гуку *у),* што *калі ён стаіць пасьля галоснага, то заўсёды вымаўляецца каротка,* г. зн. ён асымілюецца, зьліваецца з папярэднім галосным гукам і творыць з ім дыфтонг, прыкладам*: ваіна, прыішоў, гоікае, леіка, дыі, моі, крыі, твоі, даі, своі, гаі, віися, веікі, міеісца;* таксама і гук *у,* стоячы пасьля галоснага гуку, асымілюецца з папярэднім галосным: *меў, веў, хадзіў, хаўтуры, воўк, мовіў.* Гэтая асаблівасьць галосных *і* і *у,* іх здольнасьць асыміляваца пасьля галоснай, пашыраецца таксама і на злучнікі, бо мы гаворачы не адрываем востра адно слова ад другога, як то робяць, прыкл., ангельцы або немцы, але лучым іх з сабой; нашы органы мовы, канчаючы гук сказанага ўжо слова, гатуюцца вымавіць наступны гук і то найлягчэйшым для сябе спосабам: чарадуючы, згодна законам рытмікі, пасьля доўгіх кароткія гукі. Гэта ёсьць зялезны, нязьменны закон нашай мовы, і дзеля гэтага ні для асыміляцыйнага *у,* ні для асыміляцыйнага *і* ў азбуцы не патрэбны ніякія асобныя знакі. Яны такімі самі сабой робяцца, калі стаяць пасьля галосных.

Гук *і* асымілюецца з наступнай галоснай у пачатку слоў *іакі, іон, іама.* Тут дзейнічае той-жа закон, што і вышэй.

Калі мы дагэтуль прызнавалі патрэбным мець у нашай азбуцы скрытае *і* ў *я, ю, е, ё* для мякчэньня галосных і папярэдніх зычных *(мяне, цябе, людзі, левы, клён),* а таксама ўжывалі *і* для мякчэньня зычных *(ніва, кіну, зіма),* то значыць, у нас даўно ўжо вырашана пытаньне, як і прыпомачы якіх знакаў мякчацца зычныя. Яшчэ славянскія першавучыцелі ўстанавілі мудрае і простае правіла, якое кажа,

што *ўсякая зычная перад* і *вымаўляецца мякка, а калі мяккая зычная стаіць перад цьвёрдым гукам, то мякчэньне яго адбываецца пры помачы мяккага знаку* (ь).

У першы чарод, у выніку сказанага, з нашай азбукі павінны быць выкінуты „ётаваныя“ літары *ю, я, е, ё,* а такcама і літара *э* (бо кожнае *е* бяз *і* чытаецца цьвёрда). Замест *ю,* будземо пісаць *іу,* замест *я—іа,* замест *ё—іо* і замест *э—е.* Адваротнае *э* зьявілася ў беларускай пісьменнасьці даўно. Мы яго знаходзім ужо ў сьпісках Кронік В. Кн. Літоўскага і ў некаторых дакумэнтах XVI ст. Мне здаецца, што зьяўленьне адваротнага *э* трэба тлумачыць простай нястачай палеографічнай веды ў тварцоў гэтага новага знаку. У першапачатнай кірылаўскай азбуцы знак *е* азначаў цьвёрды гук; мяккім ён станавіўся толькі тады, калі да яго прыстаўлялі *і* (ѥ). Грам. Лёсік проектуе, замест знаку *е* увясьці є. Між гэтымі двума знакамі ніякай розьніцы няма; абодва яны адназначны, і ўжываньне таго або другога на месцы цяперашняга „адваротнага“ *э* зьяўляецца адкрытым пытаньнем, якое, мне здаецца, ня сустрэне ніякіх перашкод для рэалізацыі яго.

У другую чаргу трэба выкінуць *ў* („кароткае“) і *й* („кароткае“). Азбуку трэба скарачаць, а не расшыраць новымі дадаткамі.

Для кождай азбукі вялікая небясьпека яе зьнестылізацыя, бо пісаны знак мае ўплыў ня толькі на орган зроку, але і на псыхіку, дзейнічае на нашае пачуцьцё эстэтыкі. Калі-б мы, награмаджаючы лішнія знакі, увялі ў кірылаўскую азбуку лацінскае *j,* гэтым, апрача яе непатрэбнасьці, была-б парушана яшчэ аднацэльнасьць композыцыі кірылаўскіх літар, што, сьвядома ці падсьвядома, заўсёды непакоіла-б і дражніла чытача сваёй дысгармоніяй. Між іншым, украінцы раз увялі ў сваю азбуку лацінскае *j.* У 1870—1880-х гадох друкавалася шмат украінскіх кніжак з лацінскім *j,* але, урэшце-рэшт, выкінулі яны яго між іншым таму, што паходжаньне ёта (сягаючае праз лацінскую азбуку з эгіпецкіх ерогліфаў) ёсьць фалічнае. Апошняе было прычынай да ўшчыплівых кпінак з боку яе праціўнікаў.

З ліку зычных найбольш пасьвячаецца ў нас увагі афрыкатам, зложаным з *д+з* і *д+ж.* Афрыката *д+з* у цяпе-

рашнім напісаньні бывае *цьвёрдай (дзын, дзогаць, дзурчыць, дзыніць) і мяккай (дзед, дзеці, дзіва, дзядзька);* афрыката *д+ж* бывае толькі цьвёрдай. Афрыкаты, выражаныя адным знакам, не належаць да практычных помыслаў, як мы гэта і вышэй бачылі на прыкладзе галосных дыфтонгаў *(я, е, ю, ё)*. Праўда, у нас у азбуцы маюцца ўжо дзьве афрыкаты, выражаныя адным знакам, гэта *ц*, зложанае з *т+с* і *ч*, зложанае з *т+ш*.

Афрыката, законсэрваваная адным знакам, заўсёды ўносіць непажаданае зацямненьне, калі пераносяцца гукі жывой мовы на пісьмо, а апошняе, у сваю чаргу, адбіваецца на граматыцы, якая становіцца надзвычайна скомплікаванай. Прыкладам, мы пішам: *гаворы***цц***а, піша***цц***а, дае***цц***а, бярэ***цц***а,* стаўляючы два *цц* на месцы *тьс* і *тс,* або *два***цц***аць, пятна***цц***аць,* стаўляючы *цц* на месцы *дс,* і, у выніку, наша граматыка ня можа нам вытлумачыць, чаму *ццаць* мы павінны лічыць *скарочаным дзесяць.* Гэтак сама мы не адрозьніваем афрыкат *дз* з *дс*, пішучы: *суседзкі, людзкі, гарадзкі*, або *гарацкі люцкі.*

Літара *д,* як вядома, перад цьвёрдымі гукамі вымаўляецца цьвёрда *(дата, дом, дуля, дэка, дудкі)* і тое-ж самае *д* перад *і* і *ь* вымаўляецца мякка *(діадька, дієці, дієд),* але пры гэтым, зусім няма ў нас чыстага мяккога *д*, як, прыкладам, у расійскай ці лацінскай мове. Характэрная асаблівасьць нашай мовы вымагае, каб мяккае *д* прыбірала заўсёды дзынячую тонацыю, прыбліжаючыся да афрыкаты *дзь* (але ня тожсамую). Нашае мяккое *д* ня ёсьць нават афрыката, а толькі ёсьць гук мяккі, дзынячы і дзеля таго, што іншага мяккога *д* у нас няма, дык ня ведаю, ці маюць рацыю тыя, якія хочуць увесьці ў азбуку асобны знак для адразьненьня нашага мяккога *д* ад чужога ў даным здарэньні, практычна бяручы, для адразьненьня ад расійскага мяккога *д.* Мне здаецца тут ёсьць ламаньне ў адчыненыя дзьверы: мы хочам тварыць новы знак для адмежаваньня ад зусім няіснуючага ў нас гуку.

Іначай кажучы, выходным пунктам для дыскусіі над беларускім мяккім *д* для нас служаць ня гукі нашай мовы, а наадварот—гукі і знакі, якія маюцца ў суседняй расійскай мове. Раз двох мяккіх *д* у мове няма, а адно, якое ёсьць, мае сваю характэрную вымову, то гэтай вымовы павінна навучыць граматыка, незалежна ад таго, ці гэты гук будзе выражаны

тым ці іншым знакам. Дзеля вышэйсказанага ня толькі няма патрэбы для мяккога *д* уводзіць новы які знак, але нават няма патрэбы выабражаць яго афрыкатай, пры помачы *дз*, як мы гэта цяпер робім.

Гэтак сама няма патрэбы з афрыкатаў *дз* і *дж* утвараць адналітныя фігуры, а трэба пісаць іх, як пісалі дагэтуль, пры помачы двох уходзячых у склад іх знакаў.

Беларуская (крывічанская) мова здавён-даўна ня знала звонкага *г*. Грэцкае і гэбрайскае звонкае *г* перакладалі глухім *г*, у найдаўнейшых кнігах, пісалі: *галилея, Голгофа, ангел, архістратіг*. У XV ст. чужое звонкае *г* пачало прыходзіць да нас з жывых моваў, галоўна, з нямецкай, польскай, але перад усім з лацінскай, якая была выкладовай мовай у зах.-эўропейскіх школах, дзе пераважна адукоўвалася тагочасная наша моладзь. З гэтай прычыны ў XVI ст. сталася модным адзначаць звонкае *г*, але адзначалі яго дваяка, адным знакам *г* і складным знакам *кг*. Апошняе, памойму, больш рацыянальнае, бо мае падставу ў фонэтыцы жывой мовы, у якой дужа спэцыфічна гучыць „звонкае“ *г*, прыкладам: *кганак, кгузік*. Зрэшты гэтае мяккое *г* сустракаецца толькі ў некаторых чужаземных словах, для якіх утварэньне асобнага знаку не зьяўляецца пільнай патрэбай: старасьвецкае зложанае *кг* знамяніта выпаўняе ўзложаную на іх службу. Урэшце, народная фонэтыка стала імкнецца чужаземнае звонкае *г* заступіць глухім. Цяпер у большасьці здарэньняў кажуць: *ганак, гузік, географія* і г. п.

Наша рэформаваная азбука павінна складацца:

з шасьці галосных (замест 12-ці): *а, о, у, е, і, ы;*

з дзевятнаццаці зычных (замест 23-х): *б, в, г, д, ж, з, к, л, м, н, п, р, с, т, ф, х, ц, ч, ш;*

з мяккога знаку: *ь*.

„Дзэта“ (не мяккое *д)*, „джэта“, звонкае „г“ у патрэбе павінны пісацца, як і дагэтуль, падвойнымі знакамі: *дз, дж, кг.*

Пасьля такой рэформы азбукі, пісоўня будзе выглядаць гэтак:

Апокрыф. Ад Максіма кніжніка пачатак.

Калі скончыласіа сіем тысіач год ад стварэньніа

сьвіету, Хрыстос ізноу зышоу на зіамліу і хадіу па іоі, каб споуніласіа тоіе, аб чым казалі пракрокі.

І хадіу іон па усіаму нашаму краіу: і па Міеншчыніе, і па Віліеншчыніе, і па Магіліеушчыне і па Задьвінскай зіамлі.

І разам з ім былі сьвіаты Піатро і сьвіаты Іуры. Аліе ніхто з ліудіей ніе пазнавау іаго.

Бо ішлі іаны босымі нагамі, з непакрытымі галовамі і былі адіеты у біелы кужаль, а ніе таго спадіавалісіа ліуді.

Таму ніхто не зьвіарнуу увагі на іх, калі у час жніва праходілі іаны між працуіучых ліудіеі.

Толькі музыка, катораму ціапіер ніа было што рабіць, падышоў да іх і сказаў: „Сорамна мніе, бо сіагоньніа—діень працы і усіе клапочуцца каліа іаіе; адін іа нікчемны чалавіек".

І адказау іаму Ісус: „Ніа смуцісіа у серцы сваім. Ціж ніе тваіе песьні сьпіеваіуць іаны ціапіер у час жніва? Таму ніа схіліаі нізка галавы тваеі, і не хаваі твар ад вачеі ліудзкіх.

Цэлых бязмала тысячу год пісалі і друкавалі знак *и* (васьмірычнае) для абазначэньня мяккага „ітавага" гуку. Адраджэнчая наша пісьменнасьць з многіх меркаваньняў гэты знак замяніла ў азбуцы другім мяккім „ітавым", а ўласна-знакам *і* (дзесяцярычнае). Добра ці блага зрабілі тады, можна ацэньваць і так і гэтак, але паступілі зусім лёгічна: у азбуцы двох мяккіх знакаў для аднаго і таго-ж гуку ня трэба. Цяпер грам. Я. Лёсік проектуе ўвесьці ў азбуку чытаньне мяккога *и* цьвёрда. Пры гэтым ён даводзіць, што „еры" вытварылася *ь+і*. Такое цьвярджэньне пярэчыць палеографіі, якая на тысячах прыкладаў паказвае, што *ы* вытварылася з *ъ+і;* ды і лёгіка дыктуе, што ня можа з двох мяккіх гукаў зрабіцца цьвёрды гук. Гэта бывае часам, але толькі ў хэміі, а не ў граматыцы.

Праўда, *и* ўжываюць замест цьвёрдага *ы* ўкраінцы; на гэта ў іх была свая важная прычына, бо ў жывой украінскай мове, у большасьці выпадкаў, на месцы нашага мяккага гуку *і* (=*и*), бывае гук цьвёрды: *пишы, написано; „нашы*

стары пысмэнныкы ужывалы цього самого правопысу". І вось, паводле проекту Драгоманава, у ўкраінскай пісьменнасьці пачалі пісаць *и*, надаўшы яму, згодна фонэтыцы, характэрную цьвёрдую вымову. Такім чынам, было дасягнута ўкраінцамі для іх вельмі каштоўнае, што ўсю царкоўна-славянскую старую пісьменнасьць стала магчымым чытаць украінскай вымовай. Цяпер ужо, у новым украінскім пакаленьні, пераходзіць у пераконаньне, што ня толькі „цього самого правопису уживали в церковних книгах", а што, быццам, ужывалі ўкраінскай вымовы ў кроніках і статутах Вял. Кн. Літоўскага. Ведама-ж, гэтае іх „пераконаньне" не пацьвярджаецца гістарычнай філёлёгіяй, якая кажа выразна, што ў В. Кн. Літоўскім пануючай мовай і вымовай была мова і вымова крывічанская (беларуская), а не ўкраінская. Такі глыбокі знавец літары і слова, як акадэмік Ляпуноў, слушна кажа, што *ы* павінна быць утрымана ў такім выглядзе, у якім яно прайшло праз гісторыю, і я вітаю яго высокакомпэтэнтны осуд у гэтай справе.

Да рэформы цяперашняй нашай граматыкі мушу зазначыць, што вялікім яе адступленьнем ад жывой народнай мовы ёсьць крайняе аканьне. Дзякуючы крайняму аканьню, жывая народная мова таксама застаецца непадобнай як да гістарычнай, так і да цяперашняй нашай пісоўні.

У народнай мове выразнае *а* сустракаецца толькі пад націскам; ненаціскное *а*, перад *а* ў чарговым складзе заўсёды вымаўляецца глуха, прыбліжаючыся да сярэдняга гуку паміж *ъ* і *ы*: *бырана, гырапашнік, гылава, кызакі, гэтыга, гыра, стырана*, а нават—*стырына*.

Гэтак сама на месцы дыфтонгу *іа* (=*я*), вытваранага са ст.-слав. *е*, перад і пасьля націскных складоў з *а* і *я* заўсёды чуваць сярэдні гук паміж *ь* і *і*: *піравоз, сіляне, вірабей*, на *дарозі*, ў *хаці, Вілія, вецір, жалім, восімдзісят, сімнадцаць, вірутны*.

Гук *о* ніколі ня бывае чысты ў нашай жывой мове, ён заўсёды вымаўляецца, як дыфтонг *уо*: *буог, нуогі, руодны, даруогі, мнуогі, руогі, муожна, руожна, куонь* і г. д.

Раздаюцца галасы за лацініку таму, што лацінікай піша ўвесь Захад Эўропы, што лацініка пранікае і ў Азію; а магчыма, прыдзе час, што лацініка будзе сьветавай азбукай. Што-ж, калі ўся тэрыторыя б. Расіі прыме лацініку, што не абойдзецца без папярэдніх конфэрэнцый, аб якіх і мы дачуемся, то тады прымем і мы. У кожным здарэньні ўвядзеньне сягодня ў нас лацінікі—мо' і цікавая вівісэкція, але няхай сабе іншыя пробуюць яе на сабе, а мы лепш пачакаем і паглядзім, што з гэтага вынікне. У кожным здарэньні спэктатары на гэтым экспэрымэнце больш выйграюць, чым той, хто будзе выконваць ролю опэраванага кроліка.

Фасмэр. Шмат з таго, аб чым я хацеў казаць, ужо было сказана колегамі Некрашэвічам і Чаржынскім. Я хацеўбы сказаць аб тых увагах, якія былі зроблены Ляпуновым. За пяць мінут да зачытаньня іх я прыблізна шапнуў на вуха майму суседу кол. Бузуку тое-ж самае, нават не падазраючы аб існаваньні ліста Ляпунова. Мы разам з Бузуком абмяркоўвалі закранутыя Ляпуновым пытаньні і прышлі да тых-жа вывадаў. Дзеля гэтага, мне здаецца, нам трэба сур'ёзна па сутнасьці разабрацца ў увагах Ляпунова.

Гаворачы аб проекце рэформы азбукі, я думаю, нам трэба пакінуць больш далёкую гістарычную ортографію і гаварыць аб сучаснай азбуцы. Тут, вядома, маюцца ўхіленьні ад фонэтычнага прынцыпу. У навуцы я заўсёды абараняю фонэтычны прынцып: кожнаму гуку павінна адпявядаць адна літара. Але калі мы маем справу з пісьмом, якое носіць практычны характар, то тут, у інтарэсах практычнасьці, іншы раз патрэбна рабіць некаторыя адхіленьні ад фонэтычнага прынцыпу. Але бяз крайняй патрэбы я-б ад фонэтычнага прынцыпу не адступаў.

Цяпер аб лацінскім шрыфце. Я асабіста ўсюды зьяўляюся прыхільнікам лацінскага шрыфту. Аднак, на беларускай глебе з лацінскім шрыфтам будзе трудна. Труднасьць будуць складаць дыякрэтычныя значкі, якія прышлося-б увесьці. У друку літары з дыякрэтычнымі значкамі маглі-б і быць, але на пісьме было-б вельмі цяжка іх ужываць: я-бы баяўся заграмаджэньня беларускага пісьма дыякрэтычнымі значкамі. Дзеля гэтага я гляджу, што ў цяперашні час лацінскі шрыфт зусім не падходзіць да беларускай ортографіі. Ортографія

павінна быць зручна ня толькі для друку, але і для пісьма. Трэба лічыцца ня толькі з друкаванай формай літары, але і з пісоўнай. Калі лічыцца з пісоўнай формай літар і мецъ на ўвазе, што ў кожнага з нас маюцца індывідуальныя прывычкі пісаньня, то з гэтага пункту погляду ўсякія значкі зьверху або зьнізу літар трэба адхіліць. Пісьмо з мноствам значкоў я-б лічыў ня толькі цяжкім, але і проста небясьпечным; напр., дзе прыставіць кручок для азначэньня мяккасьці ў літары *м* або, яшчэ лепш, у літары *ц*, калі апошняя літара ўжо мае кручок? Мне здаецца, што напісаньне падобных значкоў было-б зусім няправільным.

Что-ж датыча *j*, то, памойму, у сербскім альфабэце ён зусім на месцы, але калі ўвесьці *j* ў беларускую ортографію, то выйдзе шмат труднасьцяй: мы ня можам канчаткова выкінуць *я, е, ё, ю*.

Што да *дз*, я-б усё-такі стаяў за захаваньне тэй ортографіі, якая існуе; бо і запраўды, як *дз* адзначыць *s* якое тут прапануецца? У друку гэты знак яшчэ можна адрозьніваць, а на пісьме—вельмі цяжка. А таму я знаходжу такі шлях рэформы небясьпечным.

Мне здаецца, што ў даны момант цяжка прапанаваць якую-небудзь іншую рэформу. Праўда, я да гэтага прыходжу тэорэтычным шляхам, бо пабеларуску толькі чытаю, а пісаць ня ўмею; з гэтай прычыны, можа, мой погляд зьяўляецца аднабаковым. Аднак, я рад адмеціць, што два практыкі зусім з іншага боку прышлі да тых-жа вывадаў.

Жылуновіч. Патрэба ў рэформе беларускай азбукі ў такой плошчы, як ставіць яе член Інбелкульту Лёсік, з майго пункту погляду, ня так неабходна, як ён гэта знаходзіць і прапануе Конфэрэнцыі. Фактычна ўвесь даклад члена Інбелкульту Лёсіка быў пабудаваны на тым, каб надаць нашай азбуцы, нашаму альфабэту нацыянальны твар. Я ня ведаю, ці можна лічыць актуальнай рэформу, якая даводзіцца такім чынам. Ён сказаў, што да сяго часу ў нас азбука ня мае свайго твару—таму пажадана-б было гэты твар ёй надаць. З гэтага ён выходзіў—і прыводзіў тыя довады, аб якіх тутака ўжо гаварыў і вельмі добра і ўдала т. Чаржынскі. Напрыклад, калі ўзяць адзін з яго довадаў—перастаноўку *э* на *є*, дык ён зусім бязгрунтоўны. Справа ў тым, што эстэтычны

бок, аб якім гаварыў член Інбелкульту Лёсік, тутака не паможа, і гэта эстэтычнасьць не да твару беларускай азбуцы. Тое самае з падменаю *ы* на *и*.

У украінскай мове *и* ўжо ўведзена, але там яно мае іншае значэньне. У нас-жа, дзякуючы таму, што Беларусь вельмі моцна зьвязана з расійскай азбукай, а значыць і літарай *ы*, цяжка будзе чытаць *и* за *ы*. Я лічу, што асноўнае ў патрэбе рэформы беларускае азбукі заключаецца ў падмене нашых падвойных літар, якія складаюць выключныя асаблівасьці нашае азбукі, *дж* і *дз*. З практычнага боку гэтыя літары асабліва зьяўляюцца перашкодаю да пераходу на беларускую мову нашых установ і асоб, якія дагэтуль ня знаюць беларускай мовы.

Калі сустракаешся з людзьмі, якія павінны перайсьці на беларускую мову, яны заяўляюць аб труднасьці для іх *дж* і *дз*. Яны гавораць, што, калі-б ня было гэтых гукаў, дык можна-б было ўспрыняць беларускую мову значна лягчэй. Мне здаецца, што гэта адзін з асноўных момантаў, які актуальны ў справе рэформы нашай азбукі.

Аргумэнты Лёсіка і Растаргуева, мне здаецца, ня зусім важкія для таго, каб імі можна было падмацаваць патрэбу рэформы. Справа ў тым, што тая рэформа, якая была прапанавана Лёсікам і Растаргуевым, ня можа адказваць практычнаму ўжытку. Я лічу, што з гэтага боку пакуль што можна было-б экспэрымэнтаў не рабіць. Можна лёгка абыйсьціся з *ы* заместа *и*. Няма такой азбукі ў сьвеце, якая магла-б дакладна адказваць усім нюансам мовы, запатрабаваньням з фонэтычнага і артографічнага боку, якія ёсьць у жывой мове.

Я лічу, што, апрача асноўных зьмен нашае азбукі, якія належаць да *дж* і *дз*, ёсьць яшчэ і іншыя цяжкасьці ўжо тэхнічнага характару. Наша азбука будавалася ў дарэволюцыйны час, калі важную ролю гралі і палітычныя моманты, і трэба было азбуцы надаць нацыянальны твар. І вось, былі ўзяты *і* зам. *и* і *шч*—заміж *щ*.

Я думаю, што з тэхнічнага боку зараз можна папрашчацца з *шч*, якія літары можна лёгка падмяніць *щ*. Такая-ж складанасьць ёсьць і ў нашых літарах, напр., можна лёгка падмяніць *хв* літару *ф* і г. д.

Мне здаецца, што тутака пабудова розных значкоў і прыставак да літар, аб якіх гаварылі Лёсік і Растаргуеў, непатрэбна. Аб гэтым ужо гаварылі. Я думаю, што нельга згадзіцца і з сябрам Чаржынскім, якога абверг ужо паважаны профэсар Фасмэр у справе падмены літары *дз* лацінскім *s*.

Аргумэнты сябра Ластоўскага наконт павароту да старадаўняга пісьма роўнасільны падмене трактара палкай. Сябра Ластоўскі падыходзіў з таго боку, што і Лёсік, а ўласна, з боку наданьня нашай азбуцы нацыянальнага твару, а зусім не з практычных мэтаў.

Проф. *Бузук*. Я пастараюся зусім об'ектыўна разглядзець прамовы адносна неабходнай зьмены беларускай азбукі. Быць можа, я адзін або два погляды паўтару з тых, якія ўжо прапанаваліся, але я мысьлю, што калі нават кожны з опонэнтаў будзе некалькі паўтарацца, дык гэта ўсё-ж важна ў тым сэнсе, што такім чынам будзе выяўляцца, за што стаіць большасьць або меншасьць прысутных на Конфэрэнцыі.

Я думаю, што агульныя вывады выяўляюцца самі сабою ў адносінах тых або іншых пропозыцый тав. Лёсіка і проф. Растаргуева. Я пачну з гэтых пропозыцый. Тав. Лёсік прапануе *ы* падмяніць на *и*. Я ведаю яго довады і ведаю, з другога боку, ліст акадэміка Ляпунова, які ён мне даручыў прачытаць. У ім зусім відавочна акадэмік Ляпуноў выступае супроць аргумэнтацыі Лёсіка. Аргумэнтацыя апошняга са ссылкамі на старыя помнікі бязумоўна зьяўляецца памылковай, таму што ў старых помніках мы маем злучэньне Ъ і I. Якраз у артыкуле Ляпунова, які мне толькі што перадаў С. Некрашэвіч, мы чытаем наступнае: „и только во второй половине XIV в. в некоторых, списанных с югославянских оригиналов книгах изредка стало появляться *ы*, что чаще является в памятниках XV в.“

Такім чынам, пярэчаньні Лёсіка акадэміку Ляпунову зьяўляюцца лішнімі.

Галоўны фонэтычны аргумэнт Лёсіка таксама неабаснаваны; ужо даўно я прыводзіў супроць яго пярэчаньні, але на іх Лёсік, як відаць, не зьвярнуў увагі. Заява, што быццам беларускае *ы* адрозьніваецца ад расійскага, зусім ня мае падстаў. Як вы ўжо ведаеце з ліста акадэміка Ляпунова, пра-

чытанага С. М. Некрашэвічам, такія знаўцы беларускай мовы, як акад. Карскі, Ляпуноў, не маглі знайсьці паказаньня, што беларускае *ы* адрозьніваецца ад расійскага *ы*. Адносна *э* мне таксама раней прыходзілася, яшчэ задоўга да таго, як знаў аб гэтым лісьце Ляпунова, гаварыць, што і тутака паміж расійскім і беларускім вымаўленьнем розьніцы няма. Такім чынам, тая небясьпека, аб якой гаварыў тутака тав. Лёсік, зьяўляецца беспадстаўнай.

Цяперака адносна *j*. Ужо акад. Шахматаў адзначыў розьніцу ў славянскіх мовах між гэтым гукам (яго чуем у нямецкім *jèder)* і тым гукам, які чуваць у пачатку расійскага слова *есть*. Таксама і ў канцы слова мы маем *лой*— нескладовае *й*, якое зьяўляецца ня зычнай, а галоснай.

Таму я думаю, што прыведзеныя пропозыцыі т. Лёсіка няжыцьцёвыя з тае прычыны, што ня выкліканы вострай неабходнасьцю. Няма ў гэтым ніякай патрэбы, тутака мы ня маем для вучняў ніякага „камня преткновения“. Тутака толькі аднэю думкаю мог кіравацца аўтар гэтых пропозыцый— толькі жаданьнем адасобніцца ад расійскай азбукі, але, памойму, гэта было-б няправільна, калі-б мы хацелі толькі літарамі адрозьніць беларусаў ад расійцаў. Мы ведаем, што шмат ёсьць больш асноўных фактаў, якімі беларусы могуць адрозьнівацца ад расійцаў. Ёсьць факты ў мове, у характары своеасаблівай культуры. Такім чынам, імкненьне да таго, каб толькі адрозьніцца дзьвюма або трыма літарамі, зьяўляецца непатрэбным і лішнім. Мы можам мець іншы спосаб адрозьніць нашую мову, але аб гэтым размова будзе далей. Гэтыя меркаваньні зусім ня выкліканы неабходнасьцю. Замест таго, каб траціць лішні час і энэргію на пропозыцыі, якія ня маюць падстаў, лепш пагаварыць больш сур‘ёзна аб тым, як перадаць у беларускай мове *дз* і *дж*, для якіх бязумоўна неабходна мець асобныя літары. Мы маем тутака афрыкаты. У адным з сваіх проектаў т. Лёсік трапіў на правільны шлях— гэта ў тым месцы, дзе ён прапануе пісаць замест *дз*—д̆ (з кручком наверсе). Чэхі ўжываюць літару ž з значком і адзначаюць гэтым шыпячую літару, якая зьявілася з *ч* памякчальнага,—такім чынам, азначаюць гук, які зьявіўся з другога ў выніку памякчэньня. Але тады непасьлядоўным і па прынцыпу нявытрыманым будзе азначэньне *дж* літарай

„ж̌“ з такім самым значком наверсе. Афрыкату *дж* з *dj* можна азначыць якім-небудзь іншым спосабам; можна, напр., скарыстаць тыя значкі, якія ёсьць у іншых славянскіх мовах. Я лічу мажлівым скарыстаць чэскую азбуку.

Я думаю, што ўвядзеньне літары *щ*, што прапанаваў Жылуновіч, бязумоўна супярэчыць фонэтычнаму прынцыпу. Добра зрабілі беларусы, калі, заместа гэтай літары, сталі ўжываць злучэньне дзьвюх літар—*шч*.

Адносна азначэньня мяккасьці зычных, я думаю, што той аргумэнт, які тут выказваўся, аўласна, што у беларускай мове шмат ёсьць памякчальных зычных,—больш, чым у сербскай мове,—мае пад сабой ня зусім цьвёрдую падставу: у беларускай мове спатыкаецца ня так ужо многа памякчальных зычных. Калі-б мы захацелі адрозьніць *а* пасьля памякчальных зычных, мы маглі-б зьвярнуцца да сербскай азбукі: не такая ўжо тут вялікая розьніца паміж колькасьцю памякчальных літар у беларускай і сербскай мовах; бо ў нас *р, ц* ды шыпячыя зьяўляюцца цьвёрдымі. Я не настойваю на гэтым, але думаю, што ўжо ня так страшна падумаць аб гэтым; трэба, толькі паставіць такое пытаньне.

Ня трэба, між іншым, азначаць мяккасьці зубных *д, т*, бо тыя самыя знакі, якія маглі-б быць знакамі *дз, ц*, азначалі-б тыя-ж гукі, што зьявіліся ў выніку памякчэньня; выходзіць, што азначэньне гэтых гукаў уключыла-б і азначэньне мяккасьці. Ва ўсякім выпадку бязумоўна трэба адрозьніць на пісьме гэтыя два выпадкі: мяккасьць зычных перад цьвёрдымі галоснымі і азначэньне ётавых галосных.

Акадэмік Ляпуноў у самым пачатку гаворыць, што ён згаджаецца з тав. Лёсікам адносна таго, што трэба пакінуць кірыліцу, але тутака я якраз не згаджаюся з акадэмікам Ляпуновым. Я хачу выказаць думку, прыхільнікі якой таксама знаходзяцца ў гэтай залі. Я думаю, што надыходзіць час падумаць аб лацініцы; бязумоўна, да гэтага справа дойдзе: мы эўропеізуемся, мы прынялі новы стыль, мы прынялі дзесятковую сыстэму мер, нам застаецца зрабіць апошні крок—перайсьці да лацінікі. Як гэта зрабіць, каб ня было цяжка для школ? Я думаю, што мы здолеем знайсьці прыклады. Мы ведаем, што на тэрыторыі Ўкраіны стварылася Малдаўская рэспубліка. Тамака былі раней кнігі, друкава-

ныя кірыліцай, але азбукай літаратурнай румынскай мовы зьяўляецца лацінка. На тэрыторыі Малдаўскай рэспублікі цяперака пішуцца кнігі кірыліцаю, але ў іх ёсьць кавалкі лацінкай. Адна школьная хрэстоматыя проф. Шэвіча зьмяшчае адрыўкі, надрукаваныя кірыліцай і лацінкай. Такі шлях дасьць магчымасьць падрыхтаваць глебу для пераходу на лацініку.

Бялькевіч. Высокая Конфэрэнцыя! Шмат прамоўцаў выступала тут да мяне, і ўсе яны казалі аб неабходнасьці рэформы беларускай азбукі і правапісу. Падыходзілі да вырашэньня гэтага важнага пытаньня і з гледжаньня навукі. Не гаварылі аб рэформе толькі з таго пункту погляду, з якога павінны былі пачаць гаварыць, які павінны былі мець на ўвазе пры вырашэньні таго ці іншага пытаньня ў справе рэформы азбукі і правапісу,—з пункту погляду сучаснай пэдагогікі. Вось, з тае прычыны, што пэдагогічны бок у такой, зноў кажу, важнай справе быў як-бы ігнараваны, мне, як пэдагогу, і захацелася сказаць некалькі слоў.

Казаць аб тым, што рэформу нашае азбукі рабіць патрэбна, што гэтая справа надасьпела, мне ня прыходзіцца; на гэтым, здаецца, усе згаджаюцца. Гутарка можа быць толькі аб тым, як рабіць гэтую рэформу. Каб гладка вырашыць гэтае пытаньне, заўсёды неабходна памятаць, для каго мы зьехаліся рабіць папраўкі ў нашай азбуцы. Уся наша праца ў справе спрашчэньня азбукі і правапісу для дзяцей, для соткаў тысяч маладых вучняў, якія праз усваеньне граматы ўспрыймаюць навуку, успрыймаюць культуру і становяцца сталымі грамадзянамі Савецкае рэспублікі, робяцца карыснымі сябрамі соцыялістычнае грамады. Сваёю рэформаю мы павінны палегчыць успрыйманьне гэтае навукі і культуры, павінны зрабіць азбуку і правапіс простымі і лёгкімі. Паглядзім, наколькі адказваюць вось гэтым запатрабаваньням тыя проекты рэформы, якія запрапанаваны паважнымі сябрамі Конфэрэнцыі, доц. Лёсікам і проф. Растаргуевым.

Перш за ўсё неабходна спыніцца на ётавых галосных, бо яны зьяўляюцца асяродкам у проекце рэформы паважаных дакладчыкаў. Літары *я, е, ё, ю* з навуковага боку на пачатку складу азначаюць па два гукі кожная: *яма—йама, есьць—йэсьць, ёт—йот, юшка—йушка* і г. д. Калі-ж гэтыя

літары стаяць пасьля зычнай і служаць для памякчэньня апошняй, то азначаюць адзін гук. Калі-б настаўнік першае клясы, а нават і другое, захацеў вытлумачыць дзецям гэтыя гукі (іх прыроду) і давесьці, што напісаньне гэтых гукаў рознае—дзеці гэтага зразумець не маглі-б. Прынамсі вельмі і вельмі трудна ім гэта давесьці. Каб унесьці ў выкладаньне азбукі больш навуковасьці і дакладнасьці, трэба было-б прыняць прапанову паважаных дакладчыкаў і запісваць ётавыя галосныя двума значкамі. З навуковага боку гэта будзе правільна, але з пункту гледжаньня пэдагогікі такой рэформы прыняць нельга. Паважаны сябра Лёсік кажа: „Для аднаўленьня адзінства нашага гукавага пісьма патрэбен нам ёт. Тады на пачатку складоў мы будзем пісаць ня *я, е, ё, ю*, а *ja, jэ, jo, jy,* і далей—„літары *я, е, ё, ю* трэба пісаць толькі пасьля мяккіх зычных і, такім парадкам, надаць ім аднаго значэньня“. Ці палягчае гэтая рэформа навучаньне граматы? Не, бо ўводзіць чатыры новыя значкі, якіх дзеці павінны будуць адбіць у сваёй памяці. Прыняўшы гэтую прапанову, мы значна абцяжаем процэс навучаньня, бо ўвядзем для т. званых мяккіх галосных па два значкі на кожную. Прыкладам, гук *е* на пачатку складу будзе запісвацца значкамі *jэ*, а пасьля мяккіх зычных—значком *е*. Як тады настаўнік зможа вытлумачыць дзецям, што гук *я* ў слове *яма* патрэбна запісваць праз ёт плюс а *(ja)*, а ў словах *сяло, лялька*—праз *я?* Калі для вучонага ясна, што гук *я* ў гэтых словах мае розную прыроду, то для дзіцяці гэта адзін гук, і яму зусім незразумела, чаму ў адным выпадку ён (гук *я)* запісваецца двума значкамі, а ў іншым адным. Колькі часу будзе патрачана на тое, каб навучыць дзяцей, як запісваць ётавыя гукі без памылкі. А карысьць ад гэтага якая? Ніякой, далажу я вам, апрача тормазу ў навучаньні дзяцей грамаце, а значыць, і разьвіцьці іх. Мне здаецца, што рабіць гэтага нельга. Калі ўжо ўводзіць ёт, то неабходна ўвесьці яго для абазначэньня т. зв. мяккіх галосных ўва ўсіх выпадках, тады мы спрашчаем запраўды напісаньне, бо зьнішчаем чатыры буквы *е, я, ё, ю,* і будзем пісаць *jама, сjало, лjалька, jэлка, сjуды* і г. д. Зрабіўшы такую рэформу, мы палягчаем процэс запамінаньня на цэлыя чатыры буквы. Калі-ж мы абмяжуемся ўвядзеньнем ёта для абазначэньня галосных на пачатку

складу, а для абазначэньня мяккасьці зычных пакінем буквы *е, я, ё, ю,*—мы ўскладнім нашу азбуку. Мне здаецца, што Конфэрэнцыя зусім не зацікаўлена ў тым, каб ускладніць навучаньне маладога пакаленьня, і дзеля гэтага, пры вырашэньні такога важнага пытаньня, прыме пад увагу мае довады і не застановіцца на паўдарозе: або ўвядзе ёт і выкіне *е, я, ё, ю,* або пакіне іх і ня будзе ўводзіць ёта.

Цяпер дазвольце перайсьці да афрыкатаў *дз* і *дж*. Профэсар Бузук слушна зазначыў, што ў беларускай мове ёсьць такія словы, як *адзначыць, паджары,* у якіх гукі *д* і *з* і *д* і *ж* не азначаюць афрыкатаў, а стаяць у простым злучэньні, між тым як запісваюцца яны аднолькава з афрыкатамі *дз, дж* у словах *дзеці, дождж* і г. д. Рэч вядомая, што пры навучаньні дзеці доўга ня могуць зразумець, калі трэба пісаць і чытаць *дз* і *дж* як афрыкату, а калі—як злучэньні, і словы—*дзень* і *дождж* чытаюць *д'зень, дожд'ж,* а словы *ад'знака, ад'жаць,*—як адзнака, аджаць. Тут рэформа больш чым патрэбна, але і ў гэтым разе нельга згадзіцца з прапановаю Лёсіка абазначаць афрыкаты *дж* значком v над букваю *д,* а афрыкату *дж*—такім-жа значком над букваю *ж* (д̌, ж̌) зноў-жа з пэдагогічных меркаваньняў. Паважаныя сябры, нам вядома, што ўспрыйманьне літар зрокаваю памяцьцю будзе тым лягчэйшым, чым прасьцейшым будзе іх напіс. Папрабуйце вы, дарослыя людзі, лічыць кропкі, калі яны будуць стаяць у стройным парадку, напрыклад: . . . . ; ваша вока не спаткае ніякіх перашкод, і лічэньне будзе адбывацца хутка. А папрабуйце палічыць кропкі, пастаўленыя так: . . . : . . . : . . ; ваша вока будзе прыпыняцца, каб схапіць кропкі ў верхнім радку,—процэс успрыйманьня абцяжаецца. Тое самае мы зробім для дзяцей, калі ўвядзем надбуквенныя значкі для азначэньня афрыкатаў. Дзіця павінна будзе чытаць зараз у двох радкох. Гэты проект трэба рашуча адкінуць, бо ён значна абцяжыць процэс успрыйманьня.

Проф. Растаргуеў прапануе для азначэньня афрыкатаў *дз* і *дж* увесьці буквы з сербскага альфабэту ђ і ћ. Я выказваюся супроць увядзеньня ў нашу азбуку гэтых значкоў (ђ і ћ) таму, што, папершае, яны будуць парушаць форму

нашага пісьма, асабліва друку, будуць адчуваць сябе, як кажуць, чужымі ў радкох нашых букваў, а падругое, для напісаньня паземнае рыскі ў верхняй частцы букваў ђ, ђ патрэбна адрываць руку, што зьявіцца перашкодай у скорапісу. Для азначэньне афрыкатаў *дз, дж* на пісьме неабходна выдумаць асобныя значкі, якія павінны адбіваць уласьцівасьць гэтых гукаў і, разам з гэтым, не павінны рэзка выдзяляцца з нашага альфабэту сваёю формаю. З свайго боку, я прапаную шаноўнай Конфэрэнцыі на разгляд такія комбінаты: для афрыкаты *дз*—значок-букву Ꙉ друкаваную і Ȝ (вялікае), ȝ (малое) пісаныя, а для афрыкаты *дж*—Җ друкаваную і Дж, дж пісаныя. Гэтыя значкі, на мой погляд, будуць адбіваць уласьцівасьць гэтых гукаў, задаволяць з боку формы і будуць лёгкімі для напісаньня. Калі-ж гэтыя значкі будуць забракаваны, можна абвясьціць конкурс на лепшы ўзор літар для афрыкатаў *дж* і *дз*.

Што датычыць буквы *э* ў пытаньні, як яго пісаць—*э* альбо *є*, то я далучаюся да тых прамоўцаў, якія стаяць за цяперашняе яе напісаньне. З пэдагогічнага пункту гледжаньня лёгкасьць успрыйманьня значка (першапачатковага) не залежыць ад таго, як ён будзе напісаны. Калі вы будзеце паказваць дзецям значок *э* задам наперад—*є*, гэта не палегчыць процэсу ўспрыйманьня яго, а калі гэта так, то і рэформы рабіць ня трэба, бо гэтая рэформа будзе для самой рэформы.

Цяпер аб букве *ы*. Паважаны сябра Лёсік прапануе замяніць яе букваю *и* з расійскага альфабэту. Трэба сказаць, што гэтую прапанову прыняць нельга—і вось з якой прычыны. Беларуская школа карыстаецца і доўга яшчэ будзе карыстацца расійскімі кнігамі, бо справа выдавецкая на Беларусі ня так яшчэ добра наладжана, каб забясьпечыць школу беларускімі кнігамі на сто процантаў. Але каб выдавецтва і змагло забясьпечыць школу беларускімі кнігамі на ўсе сто процантаў, ад расійскіх кніг наша школа адмовіцца ня можа, бо ў ёй расійская мова выкладаецца, як абавязковы прадмет, і для навучаньня дзяцей расійскай мове патрэбны расійскія кнігі. У расійскім альфабэце буква *и* ўжываецца для адзнакі, што папярэдні зычны гук—мяккі, у нашай-ж азбуцы яна будзе азначаць цьвёрдасьць папярэдняга зычнага. У расійскай мове

ўсе зычныя могуць быць цьвёрдымі і мяккімі, а ў беларускай некаторыя з зычных, як *ж, ч, ш, р,* зьяўляюцца цьвёрдымі. Бачачы адну і тую-ж літару ў расійскім тэксьце і ў беларускім у розным значэньні, вучні будуць вечна блытаць яе вымаўленьне. Калі дзіця навучыцца чытаць раней пабеларуску і ўсвоіць літару *и,* як значок цьвёрдага галоснага *ы,* то прыступіўшы да вывучэньня расійскае мовы, яно ў расійскім тэксьце словы *книга, линейка, пишет,* будзе чытаць—*кныга, лынейка, пышет.* Калі-ж дзіця навучыцца чытаць раней парасійску і ўсвоіць гэтую літару як *і,* то, прыступіўшы да вывучэньня беларускае мовы, будзе чытаць *ріба, шіла, жіта, чітаць* заместа—*рыба, шыла, жыта, чытаць.* Апрача гэтага, трэба лічыцца яшчэ і з тым, што большая частка грамадзян БССР граматна толькі парасійску, і гэтаю рэформаю мы абцяжым навучаньне іх пабеларуску па тэй самай прычыне, аб якой я казаў вышэй. Адгэтуль вывад—паколькі нельга вывесьці з ужываньня ў нашых школах расійскае кнігі, пастолькі нельга перамяніць графічнага напісаньня *ы.*

Далей, аб зьмене нескладовага *й* на ёт. Я разумею тых таварышоў, хто выказваецца за ўвядзеньне лацінскага альфабэту. Гэтая мера дапамагла-б шмат у справе вырашэньня некаторых спрэчных пытаньняў графікі і зблізіла-б нас з заходня-эўропейскай культурай. Але ўводзіць у нашу азбуку адзін значок з лацінскага альфабэту ня варта, бо, папершае, ён парушыць сымэтрыю нашага друку, а падругое, вялікае карысьці ад яго ня будзе. Ну, якая, скажам, будзе карысьць ад таго, калі мы напішам *край, салавей, вайна* і г. д. не праз нескладовае *й,* а праз *j?* Ці ад гэтага зьменіцца прырода гукаў? Пэўна, што не. А калі гэта так, то ня трэба абцяжаць навучаньне грамаце ўвядзеньнем яшчэ аднаго новага значка ў альфабэт, хоць некаторыя сябры і раяць гэта.

Паважаны сябра Конфэрэнцыі т. Жылуновіч запрапанаваў новы, асобны значок для напісаньня гукаў *ш* і *ч,* калі яны стануць у злучэньні *шч,* і раіў значок *щ* з расійскага альфабэту. У корані не згаджаюся з т. Жылуновічам і рашуча выказваюся супроць гэтае рэформы, бо яна ня мае аніякае падставы. Аднаго гуку *шч* няма, ёсьць злучэньне гукаў *ш, ч,* і калі маюцца значкі для напісаньня іх паасобку, няма патрэбы ўводзіць новы значок для абазначэньня іх у

злучэньні. Карыстаемся-ж мы, прыкладам кажучы, двума значкамі для злучэньняў *кс, пс, зд, ст* і г. д. і ніхто не паднімае пытаньня аб увядзеньні новых значкоў для абазначэньня на пісьме гэтых гукавых злучэньняў. Практыка навучаньня гукавага злучэньня *шч* не выклікае ніякага непаразуменьня. Калі дзеці пазнаёміліся з значкамі для гукаў *ш, ч* і калі вы дасьце запісаць ім словы *шчодры, шчарбаты, шчыры* і г. д. дзеці адразу і без запінкі паставяць вам у гэтых разох спачатку *ш,* а затым *ч,* хоць вы і ня тлумачылі ім аб гэтым злучэньні. Гэта вам сьцьвердзіць кожны настаўнік, які вядзе першую групу. З гэтага, думаю, ясна відаць, што лішняй буквы для напісаньня *шч* уводзіць зусім непатрэбна. Згаджаюся з думкаю т. Жылуновіча аб выключэньні з нашага альфабэту буквы *ф.* У жывой беларускай мове гук *ф* адсутнічае. Беларус ня кажа—*Філіп, Фёдар, фартук, фунт,* а кажа—*Піліп, Тодар, Хведар, хвартук, хунт*—гук *ф* абыходзіць, ухіляецца яго, а з гэтае прычыны можна абыйсьціся і бяз буквы *ф.*

Вось і ўсе заўвагі, якія я хацеў зрабіць адносна рэформы азбукі. Спадзяюся, што азбучная камісія будзе мець на ўвазе мае довады, як довады пэдагога-практыка, і пры вырашэньні пытаньня рэформы азбукі будзе кіравацца пэдагогічным лёзунгам—больш прастаты, больш яснасьці ў навучэньні грамаце.

Німчынаў (гаварыў паўкраінску; прамова стэнографічна не запісана). Выказаўся за захаваньне літар *ы, э, я, ю, е, ё* ў цяперашнім іх ужываньні і даводзіў, што *г* у сэнсе лацінскага *g,* а таксама і знакі для афрыкатаў *дз, дж* трэба абавязкова ўвесьці ў беларускую азбуку.

Старшыня: Спрэчкі па дакладах скончыліся; заключнае слова мае проф. *Растаргуеў.*

Проф. *Растаргуеў.* Ня буду гаварыць шмат і абмяжуюся толькі пярэчаньнямі паасобным прамоўцам, якія выступалі па поваду майго дакладу. Надзвычайна дзіўным паказаўся мне закід у тым, што мой проект рэформы азбукі ненавуковы. Я прасіў-бы даць адказ, у чым ён ненавуковы? Адна справа кінуць абвінавачваньне ў ненавуковасьці, а другая—на падставе фактаў давесьці гэта. Я паказваў у сваёй азбуцы на адзін дэфэкт, на адну рысу, якая ўхіляецца ад

навуковасьці—гэта ўжываньне знака *j* у значэньні *і* нескладовага; гэта адзіная рыса, што парушае прынцып навуковасьці.

Закіды ў ненавуковасьці я лічу агульнымі, ні на чым не ўгрунтаванымі, і, мне здаецца, што раней, чым кідаць гэтыя закіды, трэба было-б давесьці іх. Гэтага, аднак, ня было. Дальш, тутака гаварылі, што я ня выкінуў зусім літар *я, ю, е, ё*. Зусім справядліва, я іх ня выкінуў таму, што ў сваім проекце я дапушчаю частковую рэформу: падмену складоў *я, ю, е, ё* злучэньнямі *ja, jy, jэ, jo* і захоўваю літары *я, ю, е, ё* пасьля мяккіх зычных. З другога боку, ёсьць асобы, якія-б жадалі правесьці да канца прапанаваную мною азбуку; дык я-ж прапаную ў проекце пісаць мяккія зычныя літары з значком „сэдыль", але сам на гэтым не настойваю. І як можна не зьвярнуць увагі на наступнае месца ў маім дакладзе, дзе я азначана гаварыў: „Аднак, высоўваючы такую рэформу азбукі, я сумняваюся, каб яна была прынята і ажыцьцёўлена; сама традыцыя, прывычка, страх навіны і інш. падобныя аргумэнты будуць гаварыць супроць гэтай рэформы", і далей я казаў: „Супроць яе будзе і *тая асьцярожнасьць* у рэформе, аб якой я гаварыў у сваім прывітальным слове".

Значыць, высоўваючы проект азначэньня мяккай зычнай літары пры дапамозе „сэдыль", я на гэтым не настойваю, і мне дзіўна, што пасьля гэтага робяць мне закід па поваду майго проекту ў тым, што я чагось не зрабіў. Як-жа я павінен быў чытаць свой даклад? Няўжо яго загана ў тым, што ён пабудаваны лояльна?

Па пытаньні аб падмене *дз* і *дж* у значэньні афрыкат я казаў наступнае: „У канцовым выніку, справа ня ў тых ці іншых літарах"... З гэтым некалькі прамоўцаў згадзіліся, і цяпер я паўтараю, што неабходнасьць реформы тутака відавочная, і ў інтарэсах справы трэба вітаць тутака тое або іншае вырашэньне пытаньня аб азначэньні афрыкат *дз* і *дж* у беларускай азбуцы.

Пярэчаньне опонэнтаў, што на дапамогу *я, ю, е* ўводзіцца новая літара *j*—неабаснаванае. Зусім не на дапамогу, і справа тут не ў дапамозе. Кожны з нас ясна чуе, напр., у словах *яма* і *юшка,* што тутака літара *я* азначае два гукі. Калі мы задамо пытаньне, колькі ўсяго гукаў у слове *яма,*

дык вучань скажа, што тры гукі, і ня толькі вучань, але і шмат хто з дарослых кажа, што тутака толькі тры гукі, і вельмі цяжка давесьці іх да разуменьня таго, што ў слове *яма* чатыры гукі.

Яшчэ мяне дзівіць тэзіс у прамовах опонэнтаў, якія кажуць, што можна гаварыць аб рэформе азбукі толькі на грунце лацінікі. Хтось з опонэнтаў казаў, што „тутака робяцца якіясь латы“. Чаму аб рэформе азбукі можна гаварыць только на грунце лацінікі, а не на аснове славянскай азбукі? Гэта для мяне няясна, на тэй або іншай аснове яна бязумоўна можа быць праведзена.

Далей было сказана, што сербы не парушылі свайго альфабэту, уводзячы літару *j*. А ці-ж мы парушаем? У чым-жа тутака розьніца? І мы і сербы маем адзін і той самы альфабэт, і калі не парушылі яго сербы, уводзячы *j*, дык не парушаем яго і мы.

Дальш, мне дзіўна чуць заяву, што літара *j* у пачатку слова азначае злучэньне *i* нескладовага і *a*. У слове *яма* ясна чуецца *j* і ў слове *ён*—таксама маем *j*, і гаварыць, што тутака *i* нескладовае,—было-б няправільна.

Тав. Некрашэвіч прапануе заместа літары *дз* і *дж* увесьці комбінацыю з дзьвюх літар. Але я думаю, што такая комбінацыя ня зусім зручная. Літары *ц* і *ч* мы не азначаем комбінацыяй, мы не накладваем адну літару на другую; з другога боку, з цягам часу, калі мы ўжывем тутака комбінацыю, будзем пісаць зьлітна, дык у звычайным пісаньні, у скорапісу, з гэтай комбінацыі атрымаюцца два знакі, г. зн., тое, што ёсьць зараз.

Прапануецца таксама прызначыць конкурс для азначэньня гэтых знакаў. Я лічу, што гэта нямэтазгодна: у нас акрэсьленая задача—мы павінны зрабіць рэформу і аб конкурсе гаварыць ня варта. Калі конкурс неабходны, дык трэба было пагаварыць аб гэтым да скліканьня гэтай Конфэрэнцыі. Я-ж чытаў свой проект 17 чэрвеня г. г., калі прыяжджаў у Менск. Я чытаў свой проет у такім самым выглядзе, у якім ён выкладзены мною зараз тутака, і адносіны да проекту былі такія самыя, як і ў даны момант, і тым ня менш, я палічыў патрэбным нічога не зьмяніць у ім, бо я мысьлю, што азбука, якая прапануецца ў маім проекце, зьяўляецца

больш дасканалай, чым тыя, што ёсьць зараз: *н, м, п* і г. д. з значком зьнізу—гэта адзіны найбольш практычны спосаб азначэньня мяккасьці зычных. Тое самае трэба сказаць і адносна *j*. Калі ў словах *вайна, мой* чуецца *i* нескладовае, дык у слове *яма* чуецца *j*, які для зручнасьці прапаную пісаць і ў такіх словаях, як *вайна, мой*.

Учора т. Лёсік сказаў аб тым, што адзін з маскоўскіх пэдагогаў Флёраў на аднэй з конфэрэнцый прапанаваў і нават настойна пісаць слова *няня* такім чынам: *ньаньа*. У Маскве, значыць, падымаецца пытаньне аб азначэньні маккасьці зычных. Якія-ж могуць быць спосабы азначэньня мяккіх зычных? Адзін спосаб—перакрэсьліваньне зычных—трэба прызнаць самым нязручным; другі спосаб—зычная ставіцца з апострофам—таксама нязручны; ня можа быць прыняты для беларускай мовы і чэскі спосаб азначэньня мяккіх зычных, г. зн. пісаць мяккі зычны з значком наверсе. Пакажэце іншы спосаб азначэньня мяккіх зычных?

(Проф. *Бузук* прапануе (з месца) пісаць слова *бяда* праз *бьада).*

Я лічу, што перадаваць літару *я* ў слове *бяда* з дапамогаю *ь* нязручна. Застаецца, значыць, ставіць значок *сэдыль* пад зычнай: іншага спосабу азначаць мяккасьць зычных няма. Але на гэтым спосабе я і не настойваў і не настойваю, таму што ажыцьцяўленьне яго будзе вельмі цяжкае: правесьці рэформу зразу нельга. Я прапаную падзяліць рэформу на дзьве часткі і ўвесьці зараз *j* і знакі для азначэньня афрыкат *дз* і *дж*.

Далей, тав. Ластоўскі гаварыў, што ён часткова згодзен са мной адносна *j*, толькі азначае яго літарай *i* з значком наверсе і прапануе пісаць *iама*. Я ня бачу прычыны баяцца літары *j* толькі затым, што гэта літара ўзята з лацінскай азбукі. Чаму мы павінны ўнікаць лацінскае азбукі, калі лацінская літара мае для нас значэньне? Гэта незразумела для мяне. Памойму, трэба браць адусюль тое, што карысна для нас. Літара *j* нікольки не парушае стылю нашай азбукі: яна таксама мае хвосьцік, як літара *у*, так што мне здаецца, што ўнікаць *j* таму, што гэта літара ўзята з лацінскае азбукі, нявартa—яна зьяўляецца для нас карыснай і неабходнай літарай для азначэньня *я, ю, е, ё* ў паказаным стане.

Аднэю з хіб мае азбукі зьяўляецца тое, што я не праводжу на пісьме розьніцы паміж *j* і *i* нескладовым; на гэта я сам ужо паказаў у сваім дакладзе. Што-ж тычыцца азначэньня мяккасьці зычных, дык з Ластоўскім я абсолютна не магу згадзіцца. Гэта той спосаб, які мае месца ў польскай мове. Ластоўскі прапануе пісаць слова *лес, места* такім чынам: *ліес, міеста* і ня чытаць тутака літары *i*. Я не магу згадзіцца з гэтым. Я прыватна ўжо гаварыў з Ластоўскім аб гэтым. Ён сказаў мне прыклад, што адна дзяўчынка вывучылася вельмі хутка чытаць і пры такім спосабе. Думаю, што гэта было вельмі здольнае дзіцянё. А што-ж будуць рабіць іншыя, менш здольныя дзеці? Мы перш-на-перш павінны падумаць аб іх. Пры гэтым спосабе азначэньня мяккіх зычных, калі ўводзіць яго, дык трэба прыняць лацінскі альфабэт у польскай або чэскай адменнасьці яго ці комбінаванай чэска-польскай. Тутака была пропозыцыя зьвязаць пісьмо з гісторыяю. Я-б гэта адхіліў; глядзець на тое, як пісалі ў XVI-XVII в.—пытаньне складанае. Проф. Фасмэр казаў, што неабходна зрабіць рэформу з практычнаю мэтаю і дзеля яе нельга ня ўнікнуць некаторых адхіленьняў ад фонэтычнага прынцыпу. Я з гэтым згодзен, і мой даклад якраз і пабудаваны асьцярожна. Я заявіў аб неабходнасьці гэтай асьцярожнасьці яшчэ ў сваім прывітальным слове, але навуковыя і практычныя прынцыпы па магчымасьці павінны быць злучаны.

Гаварылася таксама, што для сербскага альфабэту *j* уласьціва; значыць, і для беларускай мовы ён таксама будзе ўласьцівы. Тое, што гадзіцца для сербскай мовы, можа згадзіцца і для беларускай; і тая і другая карыстаюцца аднымі і тымі-ж альфабэтамі. Сербская мова зрабіла рэформу, увяла *j*, і ніхто зараз не супярэчыць гэтаму; у беларускую азбуку ён таксам павінен быць уведзены; тутака ён зьяўляецца ня менш карысным, чым у сербскай мове. Я хачу аднаго, шчыра жадаю палегчыць беларускаму народу апанаваньне пісаньнем, падмяніць склады *я, ю, е, ё* адпаведнымі напісаньнямі з *j*. У слове *яма* 4 гукі і нельга 4 гукі азначаць трыма літарамі. Калі гэта мела месца дзесяць вякоў назад, дык зараз гэта павінна быць выпраўлена.

Маленькая заўвага тав. Жылуновічу. Ён зьяўляецца прыхільнікам лацінскай азбукі. Я супроць гэтага нічога ня маю:

у кожнага свой погляд, але мне быў зроблены закід, быццам ■ не ўгрунтаваў гэтага, што нельга перайсьці на лацінскую азбуку ў тым выглядзе, як яна ўжываецца палякамі і чэхамі. Я даволі ўгрунтаваў гэта ў проекце рэформы і паказаў, чаму нельга ўвесьці яе ў нас. Жылуновіч казаў, што я не ўгрунтаваў гэтага, і сам прабаваў угрунтаваць. Я з вялікаю ўвагаю слухаў яго. Ім было паказана, што ў лацінскім альфабэце ёсьць літары *g, h, j.* У гэтым, зразумела, перавага лацінскай азбукі. А дальш? Як азначыць пры дапамозе лацінскай азбукі шыпячыя гукі, афрыкаты *дз* і *дж,* або як азначыць мяккасьць зычных—ці будзем азначаць іх па спосабу Ластоўскага або пачэску—нічога ня было сказана. Я даводзіў, што лацінская азбука ня можа быць прынята для беларускай мовы не затым, што яна лацінская (для навукі ўсё роўна лацінская ці кітайская), але таму, што яна перш-на-перш не разьвязвае пытаньня аб азначэньні мяккіх зычных.

Дальш, проф. Бузук гаворыць, што гукі, блізкія адзін да аднаго, трэба азначаць аднымі і тымі-ж гукамі з асаблівым значком на аднэй з іх. А дазвольце запытаць, ці-ж гэты тэзіс праведзены ў азначэньні *т* з аднага боку і *ч* і *ц*—з другога? Калі ёсьць асобныя літары для *ч* і *ц,* дык такія-ж літары павінны быць для *дз* і *дж.* Дзеканьне належыць да зьнікаючых зьяў; *хочаце сьцерці гэтую асаблівасьць беларускай мовы—можаце ставіць дыякрэтычны значок. Хочаце захаваць яе—трэба ўвесьці асобныя літары,* інакш атрымаецца такая зьява, якая наглядаецца ў сучаснай літоўскай мове: насавыя галосныя зьнікаюць з вымаўленьня і цяжка іх стрымаць. Пры няўдалым спосабе азначэньня мы дасягнем таго, што *дз* зьнікне і ў нас.

Затым мне паказалася дзіўнай другая акалічнасьць—прыплесьці сюды славянафілаў. Прычым тутака славянафілы? Сказаць аб тым, што прыхільнікі кірылаўскае азбукі—гэта прыхільнікі славянафілаў, а асобы, якія стаяць за лацінскую азбуку—прыхільнікі заходняга кірунку,—гэта зусім не дарэчы. Зусім не дарэчы таксама гаварыць тутака аб славянафілах, спасылаючыся на тое, што ёсьць людзі, якія стаяць за захаваньне кірылаўскай азбукі, як больш уласьцівай для беларускай мовы. Няможна рабіць такіх упамінаў, няможна

кідаць тых ці іншых слоў, якія могуць мець іншае тлумачэньне. Мы сабраліся тутака справу рабіць, рэформаваць азбуку і наша задача—толькі гэта рабіць.

Далей, Німчынаў кажа, што ў беларускай мове ёсьць літары, якія пішуцца толькі пасьля цьвёрдых зычных. Гэта *ы* і *э*. Калі ёсьць літары, якія пішуцца толькі пасьля цьвёрдых зычных і нікога яны ня турбуюць, дык з такім самым пасьпехам пасьля мяккіх зычных можна пісаць асобныя літары, г. зн. *я, ю, е, ё*. Гэта заўвага Німчынава дае мажлівасьць ставіць адну літару пасьля цьвёрдай зычнай, а другую пасьля мяккай.

Старшыня: Заключнае слова мае Я. Лёсік.

Лёсік. Высокапаважаная Конфэрэнцыя! На жаль, я не занатаваў усяго таго, што тут гаварылася, і таму ня здолею адказаць кожнаму опонэнту паасобна. Мой адказ будзе мець агульны характар.

Учора, выступаючы з дакладам аб рэформе беларускай азбукі, я зазначыў, што хачу азнаёміць Конфэрэнцыю з сваім проектам, паслухаць і парадзіцца, што ў ім ёсьць добрага, а што—не, што можна прыняць, а што трэба адкінуць. Само сабою разумеецца, што я ні на адзін момант ня думаў, што мой проект можа прайсьці так, як я яго прапанаваў. Ад сваіх опонэнтаў сёньня ўсё-ж такі я ня чуў нічога, што зьмяніла-б мой погляд на неабходнасьць зьмяніць беларускую азбуку. Я нічога ня чуў такога, што магло-б паслужыць асноваю маёй адмовы ад проекту. Але з усіх сёнешніх выступленьняў можна зрабіць толькі адзін вывад, што большасьць опонэнтаў ня хоча ніякай рэформы ў нашай азбуцы, што большасьць опонэнтаў лічыць гэту справу неактуальнаю, а я лічу, што гэта справа неабходная і актуальная. У мяне склаўся тут такі погляд, што калі-б ухвалілі гэту рэформу, дык нібыта яна адразу павінна і ажыцьцёвіцца. Не, гэта праводзілася-б паступова. Кнігі друкаваліся-б такою-ж азбукаю, як і цяпер, толькі пазьней, як з рэформаю азбукі азнаёміліся-б нашы школы, паступова распачалі-б пераходзіць на новую азбуку. Баяцца гэтай навіны няма падставы. Я зноў адзначаю, што пытаньне аб рэформе азбукі ўзьнімаецца і ў РСФСР якраз зараз. Я павінен сказаць, што было-б досыць няпрыемна нам, калі-б мы правялі рэформу тады, як яна

будзе ўжо праведзена. А так будзе: як толькі правядзецца рэформа там, дык мы пойдзем усьлед за ёю.

Дык ці ня лепш гэту рэформу правесьці зараз?

З таго, што я чуў, я магу зрабіць вывад, што рабіць рэформу ў пісьме надзвычайна цяжка. Я не хачу сказаць нікому нічога благога, пераказаўшы словы аднага з францускіх мовазнаўцаў: „Лягчэй каралю адсячы галаву, як зрабіць якую-небудзь зьмену ў пісьме“. Я, хоць коратка, павінен напомніць вам, як праходзіла маленечкая рэформа, праведзеная ў расійскім пісьме і расійскай азбуцы: 20 год людзі навукі, акадэмікі (зразумела, у іх былі падставы) абаранялі і „цьвёрды знак“ і „яць“. Кажуць, напрыклад, што вядомы мовазнавец Томсон дагаварыўся да таго, што, водлуг яго думкі, калі адмовіцца ад *ѣ*, дык зруйнуецца расійская культура. Але вось яшчэ цікава, што пра рэформу расійскага пісьма і азбукі распачалі гутарыць не вярхі, не акадэмікі, а якраз нізы. Размовы пачаліся яшчэ гадоў 20 назад, задоўга да 1917 году. Распачалі іх настаўнікі, пачатковыя школы, так званыя дэмократычныя земствы, а вучоныя верхавіны доўгі час не зварочвалі нават на гэта ніякай увагі. У 1905 годзе проект рэформы ўжо бадай што быў прыняты, але перамагла рэакцыя, і рэформа была забыта. Калі-ж прышла такая ўлада, як Савецкая, дык адразу былі спынены ўсе спрэчкі, і Савецкая Ўлада ўхваліла тое, чаго жадалі нізы, чаго хацелі настаўнікі, што патрэбна было школам. Гэта гісторыя з рэформаю расійскай азбукі надае надзеі і мне і паважанаму профэсару Растаргуеву. Мы ведаем, што калі ня сёньня, дык заўтра, калі ня сёлета, дык налета рэформа нашае азбукі будзе зроблена. Мы маем цьвёрдую навуковую падставу і ні адзін не сказаў, што мы ня маем навуковай падставы. Гаварылі пра дробязі, пра філёлёгічныя дробязі, але чаго-небудзь цьвёрдага і выразнага, што перамагло-б нас, мы ня чулі.

Я таксама хацеў-бы коратка спыніцца на тых увагах, якія былі зроблены некаторымі опонэнтамі, напрыклад, тав. Жылуновічам.

Тав. Жылуновіч гаворыць, што я, проектуючы рэформу беларускай азбукі, кіраваўся нацыянальным момантам. Гэта зусім ня так. Учора-ж я сказаў, што прычыны, якія прыму-

шаюць мяне выступіць з проектам рэформы, былі featured розанага зьместу. Папершае, наша кірылічная азбука не адпавядае так званаму гукаваму пісьму. Гэта значыць, што ў нас літары ня маюць свайго аднаго сталага значэньня. Падругое, я казаў, што наша кірылічная азбука агулам мае многа недахватаў. Патрэцяе, мы ня маем сваёй асобнай азбукі. Дзе тут які-небудзь нацыянальны момант? Нічога нацыянальнага тут няма. Справа ў тым, што ўсё-такі, гаворачы аб рэформе, мы ні на момант не павінны забывацца, што адмовіцца ад кірыліцы ў бліжэйшай будучыне мы ня можам. Можа быць гэта будзе калі-небудзь. Я ўчора казаў, што хацеў-бы, каб, побач з кірыліцай, у нашых школах ужывалі лацінку; і ўчора-ж казаў, што нашы школьныя падручнікі ўжываюць дзьве азбукі—кірыліцу і лацінку, але толькі лацінка ня мае практычнага значэньня. Я ведаю, што лацінка нам, зразумела, патрэбна, хоця-б толькі з тае прычыны, што яна можа стаць у далейшым азбукай інтэрнацыянальнай. Але пакуль што, і магчыма яшчэ доўга, тыя славяне, якія да гэтага часу ўжываюць кірыліцу, будуць яшчэ доўгі час яе ўжываць, і, значыць, рэформу прыходзіцца пачынаць з яе. У чым тут справа? У чым характар рэформы? Я кажу, што трэба зрабіць такую азбуку, каб кожны значок адпавядаў аднаму гуку. Т. Жылуновіч гаварыў, што няма на сьвеце такой азбукі, аб якой думае Лёсік. Гэта ня зусім так: у сербаў якраз ёсьць такая азбука, якая лічыцца найлепшай у Эўропе, бо ў сербаў кожная літара мае толькі адно значэньне, адпавядае аднаму гуку. Галоўная ломка ў нашай азбуцы ў маім проекце выражаецца ў тым, што я хачу ўвесьці *ёт*. Увёўшы *ёт*, мы тым самым напалову наблізім нашу азбуку да азбукі сербскай (зразумела, у сэнсе дакладнасьці яе).

Літары *ё, а, ю* перашкаджаюць чыстаце нашага гукавага пісьма. Уводзячы літару *ёт* для таго, каб пісаць яе ў пачатку складу, мы гэтым самым зробім вялікую працу. Праўда, лепей было-б зусім адмовіцца ад літар *я, е, ю,* якія калісьці былі выпрацаваны старымі славянскімі перапісчыкамі, але тут ужо зазначалася, што характар нашай кірыліцы не дазваляе нам зусім ад гэтага адмовіцца, бо мы ня будзем мець магчымасьці адзначаць мяккіх зычных. Праўда, у нас ёсьць мяккі знак, якім можна было-б азначыць мяккія зычныя,

што ў маім проекце і ёсьць; але гэта вельмі непрактычна, што адзначыў ужо проф. Растаргуеў. З другога боку, трэба адзначыць, што расійскі вучоны Флёраў і цяпер стаіць на гэтым пункце гледжаньня, але гэта, зразумела, непрактычна.

Лепей зрабіць што-небудзь, чым нічога. Чаржынскі кажа, што калі нельга зрабіць усяго, то ня трэба рабіць нічога,—што калі нельга зусім выкінуць літар *е, ё, я, ю,* то ня трэба ўводзіць і ёта. Гэта значыць, калі нельга купіць галёш, то ня трэба купляць і ботаў. Дзіўная паступовасьць!

Цяпер што да гукаў *дж* і *дз.* Я ня думаю, што мой проект азначыць гэтыя гукі латарамі *д* і *ж* беззаганны. Я нічога ня маю і проціў асобных для іх літар, але гісторыя пісьма паказвае, што лепш комбінаваць старыя матар‘ялы, як прыдумляць новыя літары. Кажуць, калі азначаць гэтыя гукі значкамі над літарамі *д* і *ж,* то выйдуць два значкі для аднаго гуку. Добра, а хіба-ж у нас такіх літар з значком уверсе няма? А літара *ў, і?* А возьмем нашую літару *ы.* Гэтая літара складаецца з двух значкоў, прычым кожны гэты значок у нашай азбуцы мае зусім асобнае значэньне: літара *ы* гэта *ь* плюс *і,* у друку ніякай сувязі паміж імі няма. Як бачым, той закід, што літары *д* і *ж* становяць два значкі, а не асобныя літары, ня мае ніякае рацыі, паколькі ў нашай азбуцы падобныя літары ёсьць.

Я стараюся рэформаваць нашую азбуку так, каб у ёй кожны значок меў адно значэньне, каб кожная літара адпавядала аднаму толькі гуку, каб ня было ў нас літар з падвойным значэньнем, бо гэта становіць вялікую перашкоду для нашага гукавага пісьма.

Што да літар *э* і *ы,* каб замяніць першую літараю *є,* а другую літараю *и,* то я на гэтым настойваць ня буду, бо тут справа ўжо густу. Акад. Ляпуноў кажа, што трэба пакінуць літару *э* так, як яна ёсьць, а вось другі расійскі акад.— Грот хацеў яе выкінуць з расійскае азбукі і замяніць літараю *є,* як і я прапаную.

Мяне папракалі ў тым, што я раблю навуковую памылку, калі лічу ёт (j) зычным гукам. Так, я лічу ёт зычным гукам, як гэта рабяць усе лепшыя граматысты, маючы на ўвазе школьную граматыку. Бо што такое зычны гук? Як азначае зычны гук школьная граматыка? Школьная граматыка кажа,

што калі гук вымаўляецца з перашкодамі з боку тых ці іншых органаў мовы для вольнага выдыху паветра і ня творыць асобнага складу, то гэта і будзе зычны гук. Ёт якраз зьяўляецца такім гукам.

Дзеля таго, што аб рэформе азбукі будзе яшчэ гаварыцца ў камісіі, то я ня буду ўтамляць тут вашае ўвагі далейшаю абаронаю свайго проекту. Скажу толькі, што калі рэформа нашае азбукі ня пройдзе цяпер, то яна адбудзецца праз 10—15 год, але адбудзецца, бо ў аснове яе ляжыць жыцьцёвая патрэба і навука.

ГРАФІЧНАЙ КАМІСІЯ *).

(Старшыня *В. Ластоўскі,* нам. старшыні *Імшэньнік,* сэкратар *Дамброўскі).*

Працяг спрэчак па дакладах Я. Лёсіка і П. Растаргуева.

Аб літарах для афрыкат дз *і* дж.

Э. Блесэ знаходзіць, што для беларускай мовы лацінка не падыходзіць, бо, прыняўшы апошнюю, мы мусім згадзіцца і з старым спасабам азначэньня афрыкатаў *дз* і *дж* падвойнымі літарамі. Асобных літар для гэтых афрыкатаў лацінка ня мае. Адносна *j* Блесэ знаходзіць магчымым увесьці яго ў азбуку заместа *й,* а таксама ў злучэньнях *ja, jэ, jу, jo,* заместа *я, е, ю, ё.* Што-ж датыча *я, е, ю, ё,* калі яны азначаюць памякчэньне зычных, то іх патрэбна аставіць.

А. Сержпутоўскі знаходзіць, што новыя літары для афрыкатаў *дж, дз* не павінны быць падобнымі ні да *д,* ні да *з (ж),* бо іначай гэтая падобнасьць будзе прычынай зьнíканьня гукаў *дз, дж.*

Фасмэр лічыць, што беларускі нерэформаваны правапіс лепшы ад нямецкага. Калі-ж у беларускай азбуцы ёсьць недакладнасьць у азначэньні афрыкатаў *дз, дж,* то лепш за ўсё для іх узяць сербскія літары.

П. Бузук супроць няжыцьцёвых замен *ы* на *и,* *э* на *є* Я. Лёсіка. Таксама выказваецца супроць д̆, ӂ і супроць вязі. Больш мэтазгодным лічыць для *дз*—ђ, а для *дж*—џ. Наагул-жа знаходзіць, што трэба браць для *дз, дж* такія літары, якія-б мелі сваю традыцыю.

---

*) Па протоколу пасяджэньняў Камісіі.

П. Растаргуеў згаджаецца з Сержпутоўскім адносна немагчымасьці замены *дз* на д̆ і *дж* на ӂ. Вязь (лігатуру) лічыць непэдагогічнай і ненавуковай, а знак Џ нязручным для пісаньня. Лепшымі і больш зручнымі літарамі знаходзіць для *дз*—ђ і для *дж*—ћ.

М. Грамыка прапануе для *дз* і *дж* зьлітныя літары (лігатуры): для *дз*—Д (друкаванае) і Дз, дз (рукапісныя), для *дж*—Д (друкаванае) і Дж і дж (рукапісныя).

Гаўрук знаходзіць, што няма ніякай падставы для ўвядзеньня сербскіх літар. У зьвязку з рэформай азбукі трэба падняць пытаньне аб лацінцы. Вырашыўшы прынцыпова пытаньне аб лацінцы, мы знойдзем знакі і для патрэбных нам гукаў. У італьлянскай мове *дз* азначаецца z (або ƶ), у ангельскай *дж*—*j*. Гэтыя літары можна ўвесьці і ў гражданку.

Катовіч таксама знаходзіць патрэбным у першую чаргу вырашыць пытаньне аб лацінцы, тым больш што лацінка мае шмат прыхільнікаў. Лацінка мае сваю будучыну. Увесьці-ж яе цяпер, да ўвядзеньня ўсеагульнага навучаньня, будзе куды лягчэй. Што-ж датыча азначэньня *дз, дж* пры дапамозе *д, ж* з значкамі або рыскамі, Катовіч знаходзіць нерацыянальным. Таксама ён знаходзіць нерацыянальнымі сербскія літары, якія ня будуць гармонаваць з кірыліцай. Дзеля гэтага лепш прыняць для *дж*—ангельскае *j*, а для *дз*—*s* (зело).

Л. Цьвяткоў лічыць непажаданым, каб *дз* і *дж* вымаўляліся не як афрыкаты, дзеля чаго ён адмаўляецца ад свайго ранейшага погляду, які ён выказаў адносна s (зело) ў „Асьвеце“. Лацінку лічыць патрэбным уводзіць вельмі асьцярожна.

М. Фасмэр знаходзіць, што прапанаваныя Грамыкай літары цяжка будзе адрозьніваць; з гэтага боку ўжо зьяўляюцца лепшымі літары, запрапанаваныя Катовічам, паколькі яны згладжваюць падвойнасьць у азначэньні гуку.

В. Ластоўскі ня лічыць магчымым увесьці новыя значкі, бо ў праціўным выпадку масы будуць адрэзаны ад кнігі. Нават літара *ў* ужо цяжкая для селяніна. Дзеля гэтага Ластоўскі знаходзіць рацыянальным толькі вязь (лігатуру) з элемэнтаў *д, з* і *ж*.

Імшэньнік не згаджаецца з прапановай Ластоўскага.

Пераход у „Нашай Ніве“ з *cz* на č і з *sz* на š ня быў цяжкі. А як пісаць новыя літары—гэтаму ўжо навучыць школа. На лацінку адразу перайсьці нельга, аднак, яе трэба ўводзіць. Пралом у кірыліцы мы ўжо зробім, калі ўвядзем літары ђ, ћ, *j*, бо апошнія маюць крыніцу ў лацінцы.

В. Ластоўскі кажа, што пры рэформе азбукі перш за ўсё трэба мець на ўвазе селяніна. Калі мы дамо селяніну новыя знакі, то селянін кнігу з новымі значкамі, да якіх ён ня прывык, чытаць ня будзе.

П. Растаргуеў знаходзіць, што калі стаяць на грунце поглядаў Ластоўскага, то ў такім выпадку немагчыма зрабіць якую-б то ні было рэформу азбукі.

Старшыня прапануе для дэтальнага апрацаваньня проекту новых літар для афрыкатаў *дз* і *дж* абраць падкамісію ў складзе: Фасмэра, Растаргуева, Блесэ, Гарчынскага, Голомбэка, Бузука і Імшэньніка.

Пропозыцыя прымаецца.

Аб увядзеньні „j“.

М. Фасмэр знаходзіць, што калі ўвесьці *j*, то патрэбна было-б разам з гэтым выключыць з беларускай азбукі зусім *я, ю, е, ё.*

Растаргуеў выказваецца за *j*. За рэформу будуць удзячны дзеці. Неабходна ўвесьці *j* заместа *й*, а таксама і заместа злучэньняў *я, ю, е, ё,* калі яны азначаюць *ја, ју, јэ, јо*. Што-ж датыча *я, ю, е, ё,* калі яны азначаюць памякчэньне зычных, то іх трэба заставіць.

Я. Лёсік кажа, што ён не настойвае на рэформе *є*, але лічыць неабходным увесьці *j*. *J* трэба пісаць і перад галоснай і пасьля галоснай (зам. *й*). Нашу азбуку трэба наблізіць да гукавага пісьма. Аб поглядах на *j* Чэрнага, Курылы, Тымчэнкі просіць зачытаць іх лісты.

Мачульскі (чытае):

Адольф Чэрны. З дасланых друкаваных матар‘ялаў да Акадэмічнай Конфэрэнцыі я здолеў пакуль што прачытаць толькі „У справе рэформы нашае азбукі“ Язэпа Лёсіка. З запрапанаванай тут рэформай беларускай азбукі я цалком згодзен. Вітаю менавіта ўвядзеньне *и* замест *ы*, чым беларускі правапіс прыблізіцца да ўкраінскага; аднолькава горача вітаю паступовае ўвядзеньне літары *j*, якая ёсьць і ў серб-

скім альфабэце; таксама *є* будзе больш практычным, яно лепш будзе пісацца, чым *э*. Што датыча аднэй літары замест злучэньня дзьвюх літар *дз* і *дж*, то ўвядзеньне аднэй літары я-б ня лічыў за так ужо канечна патрэбнае, бо-ж запраўды тут у адзіным гуку можна распазнаць абедзьве яго складаныя часткі *(д-з, д-ж)*. Супроць гэтага да пэўнай меры гаворыць і тое, калі мы прымем пад увагу беларушчыну, пісаную лацінкай. Як-бы пасьля ў лацінцы пісалася *ж*, калі ўжо само *ж* (=ž) мае ў лацінцы зьверху птушачку? Але калі-б Конфэрэнцыя ўсё-такі астанавілася на аднэй літары замест дзьвюх, то радзіў-бы, каб і ў пісаным, як і ў друку, адна літара азначалася адзінакавым спосабам, а значыць д̆, ӂ.

Апроч таго, дазволю сабе зьвярнуць увагу на памылку ў уступе да цікавай стацьці „У справе рэформы нашае азбукі“. Ані ў чэхаў ані ў палякаў ня была кірыліца закінута толькі з часоў Гуса,—кірыліцы чэская мова ў запраўднасьці ніколі ня ўжывала. У чэхаў ад самага пачатку народная мова пісалася пісьмом готыцкім, каторае ўжывалася аж да пачатку XIX ст., значыць, некалькі сот гадоў пасьля Гуса. Гус толькі значна зрэформаваў чэскі правапіс у готыцкай графіцы тым, што выкінуў злучэньне дзьвюх і больш літар, а ўвёў сыстэму аднэй літары для аднаго гуку. Ён стаў ужываць кропкі для азначэньня (пазьнейшыя кручкі-птушкі): *ċ* (пазьней č) замест *cz*, *ṙ* (пазьней *ř*) замест *rz* і г. д.; апроч таго, увёў азначэньне даўжыні коскай: *á*=доўгае *a* і г. д.

Тімчэнка. Позволяю себе сказать несколько слов по интересующему Конференцию вопросу, тем более что этот вопрос носит злободневный характер и на Украине. Мне кажется, что прежде всего необходимо остановиться на вопросах графики и не допустить, чтобы их прошли мимо, с обычными ссылками на мнимую несвоевременность, на традицию, на привычки и тому подобные вредные делу и во всяком случае чуждые науке аргументы. Если говорить об упрощении, то надо начинать именно с этой стороны. Проект Я. Лёсика приветствую всей душой. Он совпадает совершенно с моим проектом украинской графики, предложенным еще в 1918 г. („Шлях“ 1918 г., № 10—11) и повторенным в 1924 г. („Украина“, № 4). Проектированная графичная система, если будет принята, будет прекрасно отражать индивидуаль-

ность белорусской речи, упростит правописание, проведет один принцип звукового письма, устранит крайне вредное смешение в сознании буквы, звука и даже слога. Вся трудность будет состоять в введении столь важного знака, как *j*. Консерваторы перед этим знаком чувствуют панический страх, делающий их глухими и недоступными к самым убедительным аргументам. Они никак не могут пойти на реальные требования жизни, никак не могут усвоить, как необходим этот знак в славянской графике, как отсутствие его затемняет морфологический состав слова, ведет к установлению мысли ненужных правил, утрудняет преподавание и т. д.

Остальные вопросы правописания мне представляются уже не такой важности; они такого характера, что сами белоруссы являются наиболее компетентными в их разрешении, а именно, какой диалект положить в основу белорусского литературного языка и в связи с этим, каким формам отдать предпочтение. Для меня решение этих вопросов представляется в общей форме: диалект, который отражает ярче других индивидуальность белорусской речи.

О. Курыла. Позволю себе высказать кое-какие соображения по поводу реформы белорусского правописания.

Относительно тех пунктов белорусского правописания, которые связаны с формами слов, я некомпетентна и не буду о них говорить. Коснусь лишь слегка белорусской азбуки.

Взгляды, высказанные Язэпом Лёсиком в первом выпуске „У справе рэформы нашае азбукі", в общем, по моему, правильны. Но не следовало бы, по моему, исходить из соображений, что тот или иной знак имеет иное значение в великорусской азбуке. Графика должна преследовать простоту, а проект Я. Лёсика значительно упрощает белорусское правописание, не говоря о том, что и в научном отношении он выше стоит существующего белорусского правописания. Ведь, если исходить из значения того или иного звука в белорусской азбуке, то следовало бы исключить не только буквы *э, ы,* а также и *и,* которая в русской азбуке имеет совершенно не то произношение, что в проекте Я. Лёсика. Буква *и* проще, чем *ы,* и это говорит в ее пользу, тем более что букву *и* знают белорусские литературные памятники.

Точно также буква *j* проще, чем *й*. Хотя, с другой стороны, белорусское неслоговое *и*, насколько мне известно, настолько широкий звук, особенно в конце слова и между неузкими гласными, что часто ближе становится к звуку, обозначенному в проекте буквой *и*, чем к звуку *і*, и обозначение этого неслогового звука знаком *й* не всегда, по моему, является непоследовательностью по отношению к родственным слоговым звукам. Но, повторяю: знак *j* проще, чем *й*, и это говорит в его пользу.

Проект Я. Лёсика значительно совершенствует и упрощает белорусское правописание.

Фасмэр. У мяне зьявіліся меркаваньні на карысьць *j*: *й* можа набліжацца да *п* з рыскай зьверху (п̄), каб адразьняцца ад *и*. З гэтай прычыны *j* будзе зьяўляцца больш выразнай літарай.

Растаргуеў знаходзіць, што няма супярэчаньняў з боку *j* у кірыліцы. З экономічнага-ж боку ён больш карысны знак.

Бузук лічыць, што заместа *й* лепш было-б пісаць *j*, а дзеля гэтага магчыма і напісаньне *j*.

Некрашэвіч кажа, што ён ня меў-бы нічога супроць увядзеньня *j*, калі-б не перашкоды з боку такіх слоў, як *маjа*, дзе *j* зычны гук, і *моj*, дзе *j* галосны гук.

Воўк-Левановіч выказваецца за *j*. *J* ёсьць крок да лацінкі. Хоць у *маjа* і *моj* і адчуваюцца два гукі, аднак, азначаць іх рознымі літарамі непатрэбна,—гэтага вымагае практычнасьць пісьма.

Я. Лёсік кажа, што *j* супярэчнасьці ў школьным ужытку прадстаўляць ня будзе. У школе зычным гукам называюць той, які ня творыць складу, а *j* і *й*—гукі блізкія. Урэшце, *j* пасуе да кірыліцы таксама, як *с* і *р*. Наша кірыліца прадстаўляе перапробленую лацінку.

Цьвяткоў гаворыць, што ня трэба зьвязваць *j* з спосабам памякчэньня зычных. *J* не такі мяккі гук, як, напр., *нь*. *J*—сярэдняй мяккасьці, як рас. *ч*,—мяккаваты гук. *J* у поўнай меры заменіць *й*. Студэнты-сербы ніколі ня кажуць на супярэчнасьці ў словах *краj* і *краjа*.

Бузук кажа, што ў нас *й* галосны і *j* зычны прадстаўляюць у сьвядомасьці адну фонэму. Паняцьці зычнасьці і галоснасьці адносныя. Можна было-б літарам *я, е, ё, ю*

надаць функцыю галоснага пасьля мяккага зычнага, але гэта быў-бы ўжо зварот да сылябічнага пісьма; дзеля гэтага лепш пісаць *нја=ня*.

Растаргуеў гаворыць, што ім у дакладзе паказан спосаб, каб ухіліцца ад сылябічнага пісьма.

Імшэньнік зноў выказваецца за неабходнасьць увядзеньня *ј*, каб праз яго прабіць шлях да лацінкі.

Старшыня ставіць пытаньне аб увядзеньні *ј* на галасаваньне. За ўвядзеньне *ј* у пачатку складу перад галоснымі за—19; супроць—3. За ўвядзеньне *ј* ў канцы складу пасьля галосных: за—19; супроць—3. Даводзіцца да ведама, што за ўвядзеньне *ј* выказаліся Б. Тарашкевіч, А. Луцкевіч, Дварчанін, Я. Станкевіч.

Аб азначэньні мяккіх зычных.

Бузук знаходзіць, што пасьля мяккіх зычных запраўды адчуваецца маленькі *ј*. Каб ухіліцца сылябічнага пісьма *(ня)*, можна-б і тутака ўвесьці *ј*, тым больш што тут мы маем некаторы прыклад і ў палякаў *(nia)*.

Лёсік прапануе заставіць *я, е, ю, ё* ў тым значэньні, у якім яны ўжываюцца адносна памякчэньня зычных і цяпер.

Растаргуеў выказваецца супроць прапановы Бузука.

Воўк-Левановіч прынцыпова згодзен з Бузуком; трэба выкінуць цалком *я, е, ё, ю*. Аднак запрапанаваны Бузуком спосаб трэба прызнаць непрактычным. Лепш увесьці для азначэньня мяккасьці зычных асобны значок.

Растаргуеў выказваецца за астаўленьне для памякчэньня зычных літар *я, е, ё, ю*.

Фасмэр згаджаецца з поглядам Растаргуева.

Ластоўскі далучаецца да прапановы Воўка-Левановіча і знаходзіць, што найлепшы спосаб азначэньня мяккіх зычных—гэта захаваньне старабеларускіх літар *(ніух)*.

Лёсік кажа, што кожны значок павінен мець сваё месца, дзеля чаго слова *сюды* нельга пісаць: *сіуды*.

Блесэ гаворыць аб латыскай азбуцы і знаходзіць, што азначаць у беларускай азбуцы памякчэньне зычных праз *ј* нямэтазгодна.

Пытаньне ставіцца на галасаваньне. За астаўленьне *я, е ё, ю* для памякчэньня зычных: за—11; супроць—5.

Бузук зачытвае пастанову графічнай падкамісіі:

Протокол Падкамісіі па рэформе азбукі ад 19/XI 1926 г. Прысутнічалі: проф. Фасмэр, проф. Растаргуеў, проф. Блесэ, проф. Голомбэк, проф. Гарчынскі, проф. Бузук і Імшэнік Хв. Старшыня проф. Фасмэр, сэкрэтар Імшэнік.

Абмаўлялася пытаньне аб напісаньні гукаў *дз* і *дж* у напісаньні *дз*—ђ, *дж*—ћ і *џ*.

Ухвалілі прыняць наступнае напісаньне: *дз*—ђ; *дж*—ћ па ніжэйпаданых мотывах:

1. Літары ђ і ћ зьяўляюцца вельмі лёгкімі для ўсваеньня, простыя па сваёй конструкцыі, розьняцца ад усіх іншых літар беларускага альфабэту і вельмі прыгодны для скорага пісьма. Маленькія літары вельмі падобны да вялікіх, дзеля чаго зусім палягчаецца іх усваеньне.

2. У друкарнях вельмі лёгка атрымаць літары ђ і ћ шляхам нязначнага відазьмену літар *ђ* і *ч* (первернутага).

3. На фонэтычную блізасьць *дз* і *дж* ёсьць яснае паказаньне ў першай частцы гэтых знакаў, зусім аднолькавай. Выбуховы элемэнт абодвух гукаў азначаны аднолькава.

4. У абодвух выпадках для кожнага афрыкатнага гуку ўводзіцца адна літара.

Старшыня: М. Фасмэр, сябры: І. Голомбэк, П. Растаргуеў, П. Гарчынскі, Э. Блесэ, П. Бузук. Сэкрэтар Хв. Імшэнік.

Пытаньне ставіцца на галасаваньне. За астаўленьне *дз—дж*: за—1; супроць—17. За сербскія значкі (проект Растаргуева): за—10; супроць—8. За дыякрэтычныя значкі; (проект Я. Лёсіка): за—4, супроць—14. За лігатуру: за—5, супроць—11.

Да рэформы беларускага правапісу.

Старшыня: Слова для дакладу: „Да рэформы беларускага правапісу“ мае Я. Лёсік.

Я. Лёсік. Высокапаважаная Конфэрэнцыя! Выступаючы з дакладам на тэму аб спрашчэньні нашага правапісу, я дазволю сабе прыпомніць словы, сказаныя проф. Растаргуевым у сваім прывітаньні: „Дело реформы правописания и азбуки одно из самых сложных и тяжелых дел“.

Гэта праўда. Ужо ўчарашняя дыскусія аб рэформе азбукі паказала, як трудна зрабіць хоць-бы адну маленькую зьмену ў пісьме. Тут я не магу ня выказаць жалю з прычыны таго, што некаторыя з прысутных тут вучоных пайшлі проціў зьмен у нашай азбуцы і выказаліся проціў нашага імкненьня дапасаваць ці наблізіць нашу азбуку да гукавага пісьма. Але ёсьць і другая частка вучоных, якая ў поўнай меры згаджаецца з тымі проектамі рэформы ў азбуцы, што былі запрапанаваны мною і проф. Растаргуевым. Даволі назваць украінскую лінгвістку А. Курылу, проф. Тімчанку, рэдактара чэскага журналу „Přegled“ Адольфа Чэрнага. Гэта дае нам надзею на тое, што настане час, і наша азбука рэформуецца і рэформуецца ў тым кірунку, што ў ёй кожная літара будзе мець адно гукавае значэньне. Разумеецца, ідэальнае азбукі няма і быць ня можа, але добрую азбуку зрабіць можна, і гэта будзе зроблена калі не цяпер, то ў чацьвер... Важна палажыць пачатак, важна паказаць хібы і вызначыць, як істыя недахваты выправіць. Ніводная рэформа не рабілася адразу, і я ані на момант ня цешыў сябе надзеяй, што рэформа нашае азбукі пройдзе адразу. На ўсё трэба часу. Даволі прыпомніць хоць-бы рэформу расійскага правапісаньня, колькі трэ' было часу, барацьбы, змаганьня, каб зрабіць тое, што было зроблена пры Савецкай Уладзе. Колькі было спрэчак, колькі было напісана „вучоных“ трактатаў проціў рэформы мёртвага, беспадстаўнага і ненавуковага расійскага пісьма, і, не зважаючы на гэта, рэформа адбылася; адбудзецца яна і ў нас.

Пераходжу да свайго дакладу. Я ня буду ўдавацца ў гісторыю пісьма,—я стаўлю пытаньне практычна. Я пастараюся паказаць, які наш правапіс, у чым яго слабасьць і неда-

хваты і як яго трэба зьмяніць, каб удасканаліць, каб зрабіць лёгкім, простым, даступным шырокім народным масам, якім правапіс, галоўным чынам, і патрэбен.

Правапіс, у яго звычайным значэньні, патрэбен ня вучоным, не інтэлігентам, а школе, народу—рабочым і сялянам. Вось і трэба зрабіць усё, што можна зрабіць, каб пісьмо стала даступным кожнаму грамадзяніну, усім тым, хто хоча або павінен навучыцца граматна пісаць пабеларуску.

Цяжкія, а ў некаторых разох хітрыя і ні на чым не абапёртыя правілы нашага правапісу даўно ўжо непакояць і нашу школу, і наша грамадзянства. Адкрытыя сходы Сэкцыі беларускае мовы і літаратуры, прысьвечаныя перагляду нашага правапісу, былі самыя многалюдныя ў Інбелкульце. Гэта паказвае, што правапісам цікавіцца не адна толькі школа, а і шырокія колы грамадзянства. Яно і натуральна, бо правапіс—справа больш грамадзянская, як габінэтна-вучоная. Як дзяржаўныя законы ня могуць ня цікавіць кожнага сьвядомага грамадзяніна, так і правапіс ня можа не абходзіць кожнага граматнага чалавека.

Благі правапіс—гэта благія, недапасаваныя да жыцьця законы: яны валтузяць нормальнае жыцьцё і перашкаджаюць яго разьвіцьцю.

Ідучы насустрач насьпеўшай патрэбе ў спрашчэньні і рэформе нашага правапісу, Інбелкульт, як навуковая ўстанова, што стаіць на чале культурнае працы на Беларусі і кіруе гэтаю працаю, яшчэ сёлета вясною выдзеліў асобную камісію, якая павінна падгатаваць матар'ялы да Акадэмічнай Конфэрэнцыі па перагляду правапісу і азбукі. Разам з гэтым, Інбелкульт выдаў цэлы рад брошур для азнаямленьня грамадзянства з тым, *як* і *ў якім* кірунку павінна ісьці работа ў справе падгатоўкі да рэформы нашага пісьма.

Як бачым, Інбелкультам робіцца ўсё патрэбнае, каб паставіць работу на належны грунт.

I. Нашы правапісныя прынцыпы і прычыны, што перашкаджаюць спрашчэньню пісьма.

Як вядома, беларускі правапіс устаноўлен першым беларускім граматыстам Б. Тарашкевічам. У аснову яго паложаны тры прынцыпы: *1) фонэтычны* для запісваньня галосных

гукаў, *2) этымолёгічны* (правільней, этымолёгічна-фонэтычны) для запісваньня зычных гукаў і *3) прынцып напісаньня чужаземных слоў.* Гэта значыць, што галосныя гукі запісваюцца паводле таго, як яны вымаўляюцца ў *літаратурнай* мове, а зычныя—не. Зычныя павінны запісвацца ня так, як вымаўляюцца, а зважаючы на этымолёгію або на паходжэньне слова, напрыклад, хоць і гаворым мы *грась, дуп, прозьба,* але пішам: *гразь, дуб, просьба,* бо так вымагае этымолёгія—паходжэньне гэтых слоў, бо ў родных ім словах на месцы *с, п, з* будуць *з, б, с (гразі, дубы, прасіць).*

Што да прынцыпу напісаньня чужаземных слоў, то тут такая справа. Словы чужаземныя, абеларушаныя, г. зн. тыя, што запазычаны даўно і ўжываюцца шырокімі народнымі масамі нараўне з сваімі роднымі словамі, запісваюцца нашым правапісам: галосныя—фонэтычна, а зычныя—этымолёгічна; тымчасам словы чужаземныя, кніжныя, шырокім масам невядомыя або мала вядомыя, павінны пісацца так, як яны пішуцца ў тэй мове, адкуль яны ўзяты.

Трэба дадаць, што ёсьць яшчэ трэці правапісны прынцып—прынцым *гістарычны,* які выражаецца ў тым, што словы запісваюцца так, як даўней пісалі (а даўней пісалі—як гаварылі, гэта зн. фонэтычна). Элементы гістарычнага пісьма знаходзім у расійскім правапісу *(доброго, сінего,* замест—*добраво, сінево),* але тыповае гістарычнае пісьмо—гэта пісьмо францускае і ангельскае. Хто хоць крышку знаём з францускім ці ангельскім правапісам, той ведае, што гэта за цаца! Кажуць, што калі прыходзіцца чытаць ліст францускага ці ангельскага рабочага, што скончылі добрую школу, то трэба вялікай дагадлівасьці, каб разабраць, што яны хацелі выказаць сваім дзіўным злучэньнем літар, што не азначаюць ніякіх гукаў. Вот што значыць пісаць гістарычным правапісам.

Гістарычны правапіс з канечнай няўхільнасьцю абарачаецца ў штучны, трудны і недаступны шырокім народным масам, бо гукі, як і ўсе іншыя факты мовы, нясупынна зьмяняюцца, і тыя літары, што азначалі некалі пэўныя гукі, перастаюць служыць свайму назначэньню, бо на месцы старых гукаў нарадзіліся новыя, а значэньне літар засталося старое.

Цяпер ужо кожнаму вядома, што, каб зрабіць грамат-

насьць набыткам шырокіх народных мас, трэба, каб пісьмо было простае і лёгкае, дзеля гэтага яно не павінна разыходзіцца з жывым вымаўленьнем слоў. Такое пісьмо можа быць пабудавана на адным і толькі на адным прынцыпе—на прынцыпе *фонэтычным*. Этымолёгічнае пісьмо таксама цяжкае пісьмо, бо ня кожны можа разабрацца ў пахаджэньні слова, тым больш што пахаджэньне слоў з часам забываецца і выклікае няўхільныя памылкі проціў этымолёгічнага пісьма. Гэта мы бачым у расійскім пісьме, пабудаваным пераважна на этымолёгічным прынцыпе, які называецца яшчэ прынцыпам параўнаньня родных паміж сабою слоў, дзе пішуць *лестница, свадьба, изба* замест этымолёгічных *лезтница* (ад „лезьці"), *сватьба* (ад „сватацца"), *истба* (ад „істопка") і г. д. Значыць, гэтыя словы пішуцца ўжо фонэтычным пісьмом, не зважаючы на пахаджэньне слова. Або вось папрабуйце ўстанавіць на аснове этымолёгічнага прынцыпу, як трэба пісаць такія, напрыклад, расійскія словы, як *корова, лапша̀, касатка, паром* і падобныя. Ёсьць шмат слоў, да якіх нельга падабраць родных ім слоў, як таго патрабуе этымолёгічны правапіс, каб пазнаць, якую галосную літару трэба пісаць. І калі расійцы пішуць: *корова, береза, стакан, сапог, паром, лапша* (беларуск. *локшына), лапта, тетива, касатка* і шмат іншых, то яны проста запамінаюць гэтыя словы.

Наш першы правапісны законадаўца Б. Тарашкевіч стаяў на правільнай дарозе, калі клаў у аснову напісаньня галосных гукаў прынцып фонэтычны, і зрабіў памылку, што не перанёс гэтага прынцыпу на зычныя гукі і не дадзяржаў яго да канца ў правапісу галосных. Гэтую памылку прыходзіцца цяпер выпраўляць, або, як кажуць, рабіць „рэформу". А рабіць рэформу пісьма—як гэта ні дзіўна—далёка трудней, як адсячы каралю галаву.

Французы і ангельцы, напрыклад, мучаць школьнікаў сваім мёртвым гістарычным правапісам, а вот не адважацца зьмяніць яго,—перашкаджае прывычка, традыцыя, страх перад тым, што трудна або зусім нельга будзе чытаць кнігі старога друку. А ці-ж гэта рацыя? Старому пакаленьню не павінна быць страшна, бо яно прачытае кнігі як старога, так і новага друку бяз ніякіх перашкод, як мы чытаем цяпер новыя і старыя расійскія кнігі, нават не заўважваючы розьніцы ў

правапісу; тымчасам для новага пакаленьня ўсе патрэбныя кнігі пасьпеюць ужо передрукавацца новым правапісам. Праўда, шмат кніг застанецца не передрукавана, але гэта не бяда; значыць, яны ня так ужо патрэбны, калі не заслужылі таго, каб іх передрукавалі, і шкадаваць тут няма чаго. Не шкадуем-жа мы таго, што цяжка або зусім ня можам чытаць кнігі старога славянскага друку або хоць сваіх старабеларускіх кніг. Тыя, каму трэба іх чытаць (гісторыкі, лінгвісты), навучацца чытаць—і прачытаюць. Вучоныя людзі чытаюць пісьмо далёка старэйшае і зусім чужога і нават невядомага пахаджэньня.

Страх перад зьменаю ў пісьме мы бачылі і ў даўнейшай дарэволюцыйнай Расіі. Перад тым, як выкінуць зусім непатрэбныя літары „яць", „цьвёрды знак" і „фіту", вучоныя людзі 20 год спрачаліся, панапісвалі горы „навуковых" кніг за і проціў „яці" і „цьвёрдага знаку", і нічога-б ня вышла, каб не соцыяльная рэволюцыя, бо толькі Савецкая Ўлада разьвязала гэтае пытаньне. Можна з пэўнасьцю сказаць, што каб „не адсеклі каралю галавы", то расійцы і дагэтуль пісалі-б старым пісьмом; друкуюць-жа вось эмігранты газэты і кнігі з яцямі і цьвёрдымі знакамі.

Гэта самае мы бачым і ў нас, калі ў Правапіснай Камісіі, выбранай Інбелкультам, было пастаўлена пытаньне так, што трэба ўжыць некаторую рэволюцыйнасьць у зьмене правапісу, каб зрабіць яго даступным шырокім народным масам, якія ня маюць часу на завучваньне цяжкіх, ні на чым не абапёртых правіл, то Камісія стала проціў такой пастаноўкі пытаньня. Пераважная большасьць членаў Камісіі знайшла, што бяз *новых* дасьледзін усіх беларускіх дыялектаў (гаворак) ня можна зьмяняць таго, што ўстанавіў Тарашкевіч, што правапіс Тарашкевіча навукова абаснаваны, і калі ёсьць у ім труднасьці, то ня правапіс трэба зьніжаць да мас, а масы падцягваць да правапісу і г. д. Словам, вышла, што Тарашкевіч адзін меў права рабіць усё, што знаходзіў патрэбным, не чакаючы новых дасьледзін беларускіх дыялектаў, а Інстытут Беларускае Культуры, які злучае ўсе навуковыя і культурныя беларускія сілы, павінен перш дасьледваць усе дыялекты, а потым выпраўляць правапіс Тарашкевіча.

Разумеецца, справа тут ня ў „новых навуковых дасьле-

дзінах“, а ў тым, што ў людзей пасьпелі ўжо разьвіцца прывычкі, прызвычаенасьць да цяперашняга пісьма. Людзі бароняць свае прывычкі, прызвычаенасьць, а думаюць і могуць шчыра думаць, што бароняць законны і справядлівы стан рэчаў. Кажуць —праўда ці не,—што вядомы расійскі мовазнаўца Томсан, працы каторага становяць вялікую навуковую цэннасьць, баронячы буквы „яць“ і „цьвёрды знак“ у расійскім пісьме, дагаварыўся да таго, што заявіў, што можа разьбіцца расійская культура і дзяржава, калі выкінуць „яць“ і „цьвёрды знак“. Разьбіваліся яго прывычкі, прызвычаенасьць да старога пісьма, а ён думаў, што разьбіваецца культура. У нас-жа страх перад зьменаю пісьма і нехаценьне зьмяняць тарашкевічаўскі правапіс выклікаюцца яшчэ асаблівымі, чыста беларускімі прычынамі, аб якіх гутарка будзе ніжэй, у II-м разьдзеле, дзе будзе гаварыцца пра беларускае аканьне.

Правапіс Б. Тарашкевіча вышаў у сьвет у канцы 1918 г. Да таго часу кожны пісаў так, як умеў або як каму падабалася. Гэта ўсіх мучыла, і за правапіс Тарашкевіча ўхваціліся, як за паратунак, прыняўшы яго на веру, без ніякай крытыкі. Так правапіс Тарашкевіча стаў *правапісам беларускім.* Навучыцца гэтаму правапісу было лёгка, бо пабеларуску пісалі тады адны толькі інтэлігенты, добра граматныя або парасійску, або папольску. Ня тое сталася, калі правапіс Тарашкевіча пайшоў у школу і ў шырокія масы. Там труднасьці і беспадстаўнасьці яго адразу выплылі на верх, і не прайшло трох-чатырох год, як мы апынуліся перад правапісным крызысам. Газэты і некаторыя журналы сталі зьмяняць правапіс Б. Тарашкевіча і пісаць пасвойму.

Жыцьцё мае сваю лёгіку, і тое, што некалі было ў Расіі, покі не прайшла рэформа пісьма, *няхай будзе нам ня прыкладам, а перасьцярогаю.*

Усе, хто мае справу з нашым правапісам, хто вучыцца яму сам ці вучыць другіх, наракаюць на яго труднасьці і нявыразнасьці. Чытаючы лекцыі на розных курсах, я меў магчымасьць пазнаёміцца з пераважнаю большасьцю беларускага настаўніцтва, і скрозь чуў адну і тую жальбу, адно і тое нараканьне—наш правапіс цяжкі для школы. І бяда тут ня ў тым, што ён цяжкі—гэта можна перамагчы, матэматыка

таксама навука нялёгкая,—а бяда ў тым, што гэтыя труднасьці беспадстаўны і зусім непатрэбныя.

II. Труднасьці і беспадстаўнасьці ў нашым правапісу.

Найлепш, калі ў аснове правапісу ляжыць адзін які прынцып; наш-жа правапіс пабудован, як мы бачылі, аж на трох і нават чатырох прынцыпах, калі ўзяць пад увагу, што зычныя гукі запісваюцца этымолёгічна-фонэтычна, прычым ніводзін з іх не праведзен да канца. Кожны з гэтых прынцыпаў мае столькі выключэньняў і дае такое шырокае поле для асабістых выгадак і мудраваньняў, што абарачае наш правапіс у бяспрынцыпны і беспадстаўны.

Возьмем, напрыклад, чужаземныя словы. Аб іх у правапісу мы маем гэткае правіла: „Словы чужаземныя, узятыя з чужое мовы, даўно пішуцца так, як гэта чуваць у штодзенным ужытку: *літара, аканом, арганісты, паляруш, калідор, леварвэр, камісія* і г. д. Словы чужаземныя, што ўжываюцца ў кніжках і ў кніжнай мове і да народу не дайшлі або дайшлі нядаўна, пішуцца так, як у тэй мове, скуль яны ўзяты: *тэлеграф, тэлеграма, літэратура, монолёг, тэатр, дынастыя, партыя, рэдакцыя, інспэктар, дырэктар, рэдактар* і г. далей“. Да трох апошніх слоў у гэтым правіле зроблена ўвага: „У такіх разох „ар“ заместа „ор“ пад уплывам беларускіх слоў на „ар“: *пісар, знахар* і г. д.“ („Беларуск. грамат. для школ“ Б. Тарашкевіча, стар. 70, 1918 г.). А далей ідзе цэлы рад выключэньняў з чужаземнага напісаньня на карысьць беларускае фонэтыкі.

Покі з беларускім правапісам мелі справу адны толькі інтэлігенты, то і гэтае „правіла“ магло служыць правілам. Інтэлігент мог яшчэ сяк-так разьбірацца ў тым, якое чужаземнае слова „дайшло да народу даўно“, а якое—нядаўна, хоць і сам аўтар тут-жа, у самым правіле, робіць характэрную памылку, калі залічыў слова „дырэктар“ да слоў кніжных і народу невядомых, бо гэтае слова вядома шырокім народным масам нараўне з такімі словамі лацінскага пахаджэньня, як „літара“, „аканом“ або „калідор“ (бач хоць-бы „Дарэктар“ у „Новай Зямлі“ Якуба Коласа).

Як бачым, сам аўтар заблутаўся ў сваім уласным правіле, то што-ж гаварыць пра звычайных людзей, якім пры-

ходзіцца кіравацца гэтым правілам у штодзенным ужытку. Папрабуйце ўстанавіць на аснове гэтага правіла, якое чужаземнае слова да народу дайшло, а якое не дайшло, а калі дайшло, то ці даўно, ці нядаўна? Тут ужо што ні галава, то розум: адзін будзе гаварыць так, а другі гэтак. Тут мы маем шырокае поле для асабістых выгадак і мудраваньняў.

Так яно і вышла: правапіс чужаземных слоў быў першым каменем, на які спатыкнуўся наш правапіс і выклікаў той крызыс, які мы цяпер перажываем. Пачалося гэта з таго што рэдакцыі журналу „Асьвета“ і „Савецкай Беларусі“, занятыя штодзеннай бягучай работаю, адмовіліся разважаць аб тым, якое чужаземнае слова „да народу дайшло“, якое— не, ды пашырылі беларускае аканьне на ўсе чужаземныя словы без выключэньня. Пры гэтым рэдакцыя „Асьветы“ (заўважце—орган Наркамасьветы!) выступіла як-бы з маніфэстам (бач. „Асьвета“ № 1 за 1926 г.), дзе стараецца аб'ясьніць, што новага нічога ня ўводзіць, а толькі паддержвае старыя традыцыі беларускага пісьма. О, гэтыя „традыцыі“! Але аб традыцыях пасьля, а цяпер цікава заўважыць, што абедзьве рэдакцыі, пашыраючы аканьне на ўсе чужаземныя словы, праявілі характэрную асьцярожнасьць. Аканьню яны падпарадкавалі адно толькі чужаземнае *о,* а гук *э* запісваюць паводле таго, як ён пішацца „ў тэй мове, скуль чужаземныя словы ўзяты“. Чым гэта аб'ясьніць? Традыцыяй беларускага пісьма ці фонэтыкаю беларускае мовы?

На традыцыі беларускага пісьма, як мы ўгледзім ніжэй, вельмі часта апіраўся Б. Тарашкевіч, а такое напісаньне чужаземных слоў, якое прынялі ўпамянутыя рэдакцыі, супярэчыць правілу, што дае Тарашкевіч, які і сам кіраваўся традыцыямі. Значыць, прычына тут не ў традыцыях, а аб фонэтыцы тут і гаварыць ня прыходзіцца, бо ў беларускай фонэтыцы кожнае *о* і *э* і ў словах чужаземнага пахаджэньня заўсёды вымаўляецца, як *а,* напр.: ***аканом*** замест ***эконом, літара*** замест ***літэра, адукацыя*** замест ***эдукацыя*** і г. д.

Далей, у нашым правапісу галосных гукаў *э (е)* ёсьць такое правіла: „Калі ў першым мяккім складзе перад націскам няма *а (я),* то ў другім складзе пішацца *я;* калі-ж у першым складзе ёсьць *а (я),* то ў другім пішацца *е;* у трэцім і далейшых мяккіх складох перад націскам заўсёды пішацца *е*

(Б. Тарашкевіч, „Беларуск. грамат. для школ“, стар. 60, 1918 г., тут рэдакцыя гэтага правіла мая).

З гэтым правілам трудна справіцца стала граматнаму чалавеку, а ня то што школьніку, бо каб запісаць слова паводле гэтага правіла, трэба пішучы спыніцца, мысьленна палічыць склады ды яшчэ ад правай рукі к левай, потым паглядзець, што стаіць у першым складзе перад націскам — *а(я)* ці *ы-у-і*, а ўжо пасьля гэтых комбінацый можна прыступіць да запісу слова. Гэта, як кажуць, сем раз прымерай, а адзін раз адрэж! Гэта—шарада, ламігалоўка, а ня правіла, якое павінна дапамагаць у няпэўных выпадках. Падумаць толькі, колькі трэба маломý дзіцяці, каб навучыцца правільна пісаць.

Навука кажа, каб стаць граматным, трэба навучыцца пісаць словы паводле ўстаноўленых правіл ня думаючы, г. зн. мэханічна. А ці-ж можна калі-небудзь навучыцца пісаць паводле гэтага правіла ня думаючы, мэханічна? Прыкладам, словы „не“ і „без“ могуць злучацца ў мове з тысячамі розных слоў і кожны раз зьмяняць сваё месца ў палажэньні перад націскам, ня кажучы ўжо пра тое, што і паасобныя словы зьмяняюць свой націск у залежнасьці ад формы, напр.: селянін—сяляне, бядак—бедака, зялёны—зеляно і г. далей. У такіх разох напісаньне слова зьмяняецца, як у калейдоскопе.

Мы сьмяёмся з даўнейшага расійскага „яць“, але-ж „яць“—гэта драбніца ў параўнаньні з гэтым правілам-шарадаю. З „яцьцю“ справа была простая хоць-бы для таго, хто меў добрую памяць: завучыў словы з „яцьцю“ напамяць ды пішы сабе ня думаючы. Так яно і рабілася. У нашым-жа правіле завучыць нічога нельга, а кожны раз трэба рабіць матэматычныя вылічэньні ды пры гэтым памятаць, што над тваімі комбінацыямі вісіць дамоклаў меч—цэлы рад слоў за выключэньнем з гэтага правіла, як, напрыклад: *сьвяткаваць, якава, ялавец, ясакар* і іншыя. Гэтае правіла магло-б хіба задаволіць даўнейшага пэдагога ў футляры, які ня вучыў, а паляваў на школьнікаў, каб лавіць іх на памылках.

А то вот яшчэ—наш правапіс вучыць, што ў мяккіх складох пасьля націску пішацца *е: восень, возера, вецер, чытае, гуляе* і г. д. (Б. Тарашкевіч. „Б. грам. для школ“, стар. 60, 1918 г.), але з гэтага правіла сам аўтар зрабіў 10 выклю-

чэньняў (бач. там-жа, стар. 60—61), а на дзеле іх ня 10, а цэлых 14! І так што ні правіла, то цэлыя дзесяткі выключэньняў.

Тут могуць сказаць: праўда, гэтыя правілы цяжкія, асабліва для школьнікаў, але-ж яны выцякаюць з фонэтычнага прынцыпу ў напісаньні галосных гукаў—гэтак гавораць, так вымаўляецца гук *е* ў беларускай літаратурнай мове, а напісаньне слова павінна адпавядаць яго жывому вымаўленьню, бо „чым бліжэй правапіс да жывога вымаўленьня, тым ён лепшы“ (С. Некрашэвіч. „Аб пашырэньні аканьня на чужаземныя словы“, „Полымя“ № 5, стар. 123, 1926 г.).

Ніхто і нідзе на Беларусі з такою матэматычнаю дакладнасьцю не гаворыць. Гэта можа праверыць кожны з нас сам.

Закон беларускага аканьня гаворыць, што ў беларускай мове, у абсолютнай большасьці яе дыялектаў, галосныя *о (ё)*—*э (е)* чуваць выразна толькі пад націскам; не пад націскам яны даюць гук няясны, нявыразны, але бліжэйшы да таго гуку, які мы звычайна азначаем літарамі *а*—*я,* дзеля таго і закон гэты называецца *аканьнем.* Навуковыя дасьледзіны паказалі, што чым далей ад націску, тым аканьне становіцца нявыразьней і глушэй, а найясьней выступае яно ў першым складзе перад націскам. Калі наймацнейшае аканьне (у першым складзе перад націскам ад правае рукі к левай) азначыць цыфраю 1, а слабейшае — наступнымі, то можна напісаць такую формулу: 4, 3, 2, 1. Дык хіба-ж можна азначыць гэтыя гукавыя нюансы ў звычайным пісьме? На такія гукавыя модуляцыі існуе навуковая транскрыпцыя, патрэбная навуковым дасьледзінам, а ня звычайнаму правапісу, які служыць мільённым масам для патрэб штодзеннага ўжытку.

У звычайным правапісу абсолютнай блізасьці ў перадачы гукаў на пісьме быць ня можа і не патрэбна. Гукі ў мове, як і ўсё ў прыродзе, бязупынна зьмяняюцца, і перадаць кожную гукавую асаблівасьць абсолютна нельга; тут нават ноты нічога не памогуць, бо няма такога тонкага вуха, каб магло злавіць і азначыць на пісьме ўсе гукавыя адценьні. У кожнай жывой мове ў яе цяперашнім стане навука налічае адных толькі галосных у некалькі разоў больш, чым гэта мы звычайна лічым. Але „для звычайнага пісьма бяруцца

найбольш характэрныя, асноўныя гукі, і адкідаюцца іх модуляцыі“. (С. Некрашэвіч. „Аб пашырэньні аканьня на чужаземныя словы“, „Полымя“ № 5, стар. 124).

Ніжэй мы ўгледзім, што ня гэтым—не дакладнасьцю ў перадачы гукаў кіраваўся наш правапісны аўтар і яго прыяцелі, на каторых ён пасылаецца ў прадмове да свае граматыкі, калі сумесна з імі ўкладаў правілы для запісваньня гуку *е*. Якраз наадварот. Палажыўшы ў аснову напісаньня галосных гукаў прынцып фонэтычны, ён і яго дарадчыкі спалохаліся таго ценю, які самі выклікалі, і сталі гнаць яго заклінаньнямі, што выразілася ў абмежаваньні беларускага аканьня ў форме тых хітрых правілаў, якія мы маем цяпер у правапісу чужаземных слоў і гуку *е*. Палажыўшы ў аснову граматыкі „найбольш характэрную і найбольш чыстую гутарку беларускае мовы, што мае цьвёрдае *р* і *вялікае* аканьне“, Б. Тарашкевіч робіць такую агаворку: „Але аканьне агранічана некаторымі разамі, да чаго прымушае нас доўгая практыка нашага пісьменства“. („Ад аўтара“, стар. 3).

Вот нам і трэба паглядзець, што разумеў Тарашкевіч пад „доўгаю практыкаю нашага пісьменства“, які зьмест і характар гэтае „практыкі“.

Сьвядомая практыка беларускага пісьменства магла пачацца з таго часу, калі сталі выходзіць першыя легальныя беларускія кнігі і газэты. Запісы вуснае народнае творчасьці ня могуць служыць практыкаю беларускага пісьма, бо яны рабіліся фонэтычна або звычайным расійскім (этымолёгічным) правапісам. Фонэтычныя запісы народнае вуснае творчасьці становяць матар'ял для дасьледзін над законамі беларускае мовы.

Пераглядаючы-ж беларускі друк да 1918 г., лёгка заўважыць, што ў аснове яго ляжыць расійскі правапіс, а ў кнігах, друкаваных лацінкаю,—польскі. Узорам старога беларускага пісьма можа служыць „Сыгнал“ Гаршына ў перакладзе пабеларуску, што вышаў у 1891 г., і першыя беларускія газэты—„Наша Доля“ і „Наша Ніва“ з яе выданьнямі асобных кніжак—брошур і календароў, а таксама выданьні суполкі „Загляне сонца і ў наша аконца“. У „Сыгнале“ знаходзім нават „яці“ і „цьвёрдыя знакі“ на сваім законным месцы. У пазьнейшых выданьнях гэтых літар няма, зроблены

ўжо і іншыя графічныя спрашчэньні, але аснова ў правапісу засталася старая → расійская, або этымолёгічна-гістарычная, што відаць нават з назвы першае выдавецкае суполкі — „Загляне сонцэ і ў нашэ аконцэ“, дзе літары *е* і *э* стаяць на сваіх гістарычных мясцох. Элемэнты беларускае фонэтыкі дапускаюцца там у тэй меры, якая патрэбна была—на густ кожнага аўтара і выдаўца паасобку,—каб захаваць характар беларускае мовы, бо кожнаму ясна было, што напісаць „человек“ або „земля“—гэта значыла сказаць не пабеларуску.

Аканьне пасьля цьвёрдых зычных у „Сыгнале“, як і ў пазьнейшых выданьнях, даволі частае і поўнае, напр.: *чалавека, вадзяныя, дарожнаго, гаворыць, аб паходзі, с палавінаю, папраўдзі* і іншыя. Ёсьць аканьне і пасьля мяккіх зычных, асабліва ў першым складзе перад націскам: *пясочак, пяройдзе, нядоля, Кацярына, пярвей, цябе, вялікую, ня было, падмалявалі, ня зробіш, ня сподобалася* і іншыя. Само сабою разумеецца, што поплеч з літараю *я* знаходзім і *е*, напр.: *не спала, не было, каб ня было беды, не спаў, ешчэ, заедае, не відаць, пераеждждаў* і іншыя. Дзеясловы І-га спражэньня ў 3-яй асобе адзіночнага ліку заўсёды канчаюцца на *э—е*: *каже* і *кажэ, плаче* і *плачэ, слухае, будзе, чытае, рэжэ, пішэ* і гэтак далей.

Цікава, што месны склон іменьнікаў заўсёды канчаецца на *і*, калі націск ня прыходзіцца на канчатак, напр.: *на дарозі, пасярэдзіні, аб паходзі, на сьвеці, на павароці, папраўдзі, на ўвазі, у хаці, на версі, у вусі, на галіне* і г. далей. Гэты канчатак знаходзім ува ўсіх абсолютна ранейшых выданьнях, напр., у „Нашай Долі“ або ў „Нашай Ніве“: *у задумі, у павеці, на сходзі, на Каўказі, у вастрозі, пры дарозі, па сьвеці, у горадзі, у Кіеві, на ніві, аб свабодзі, на мові, у Кранштаці* і гэтак далей.

Дзеканьне і цеканьне ўсюды запісваецца правільна: *дзень, дзесяць, гадзіна, плаціць, цёпла, чысьціць*. Чужаземныя словы ў пераважнай большасьці запісваюцца з аканьнем, напр.: *дарэктар, афіцэр, на дразіні, караспандэнт* і іншыя. Гукі *у* і *і* скарачаюцца вельмі рэдка, прычым незалежна ад свайго палажэньня, напр.: *вёрст пяцьдзесят ў дзень ў гарачыню, заўсёды у іх была, толькі ў руках і ў нагах* і г. далей. Затое нескладовае *ў* у сярэдзіне і ў канцы слова скрозь

пішацца правільна, напр.: *быў, чарнеў, вярнуўся, гадоў, сталоў, роў, воўк, хлеў, поўна* і нават *поўк* (полк).

Мяккі знак паміж падвойнымі мяккімі зычнымі рэдка калі пісаўся, а ў журнале „Вольная Беларусь“ было нават правіла ня пісаць мяккага знаку паміж мяккімі падвойнымі зычнымі, і, бывала, зазвычай пісалі так: *палажэнне, жыццё, галлё, пытанне, праклящце, паляпшэнне* і г. далей. Таксама рэдка калі ставіўся мяккі знак пасьля *з—с, дз—ц*, калі яны стаялі перад мяккімі складамі, напр.: *на свет, звер, снег, памысліць, шчасце, сметнік, песня, смех, цвет* і іншыя.

Хоць ненаціскное *е* зазвычай перадаецца літараю *е*, як таго вымагае этымолёгія слова, але поплеч з гэтым літару *я* на месцы ненаціскнога *е* знаходзім, як памылку пад уплывам жывога вымаўленьня, ува ўсіх складох, незалежна ад націску, напр., у „Нашай Долі“ і ў „Нашай Ніве“: *пярамяніць, цямната, ня працягнеш, ня адпачыўшы, змяя, вецяр, бедна, поля, вывясці на свет, выбярам* і іншыя, але дзеясловы I-га спражэньня ніколі ня пісаліся з аканьнем, напр.: *можэ, захочэ, маем, памагае, думаеце* і г. д.

У „Нашай Долі“ знаходзім нават у некаторых разох фонэтычны запіс зычных, напр.: *грась, скрось, Пецербурх, прозьба, атказаць, атпісаць* і іншыя.

Вось такая ў агульных рысах практыка беларускага пісьменства. У аснове яе, бясспрэчна, ляжыць расійскі або польскі правапіс з дамешкаю беларускае фонэтыкі ў тэй мэры, якая дапускалася асабістым густам кожнага аўтара або выдавецтва, выгадаваных школаю і штодзеннаю практыкаю на этымолёгічна-гістарычным расійскім або польскім правапісу. І трэба згадзіцца з Тарашкевічам, што „практыка беларускага пісьменства“ дазваляла яму абмежаваць беларускае аканьне, але, з другога боку, на гэтай практыцы можна было абаперці і шмат іншых „абмежаваньняў“, калі кіравацца ня фактамі жывое мовы, а фактамі гэтае практыкі. Тымчасам, палажыўшы ў аснову напісаньня галосных гукаў прынцып фонэтычны і сказаўшы, што „галосныя пішуцца так, як вымаўляюцца“ („Беларуская граматыка для школ“, 1918 г., стар. 59), трэ' было меркавацца ня з практыкаю маласьвядомага ў правапісу даўнейшага пісьменства, а з жывым народным вымаўленьнем і зважаць толькі на тое,

як пашырана гэтае вымаўленьне, г. зн. ці становіць яно факт для пераважнай большасьці беларускіх гаворак, або дыялектаў. Факты жывой мовы не даюць ніякай падставы для абмежаваньня нашага аканьня ды яшчэ ў такіх хітрых і заблутаных формах, якія мы маем цяпер.

Сам Тарашкевіч вось што гаворыць аб нашым аканьні:

„Аканьне найвыразьней выступае ў складох перад самым націскам: *лес, лясы.* У другіх складох на месцы *э* можа быць гук, блізкі да *і,* або гук няясны паміж *а* і *е—а*е: „лесавік вымаўляецца *лісавік* або *лясавік*“. („Белар. граматыка для школ“, 1918 г., стар. 10). І Тарашкевіч устанаўляе, што ў нас няма ненаціскнога *э (е),* калі кажа, што „гукі *о (ё), э (е)* у беларускай мове чуваць ясна толькі пад націскам: *добра, цёпла, лес, цэлы* і г. далей. Калі склад не пад націскам, то замест *о, э* чуваць *а: добры—дабро, цёплы—цяпло,* (цьапло), *лес—лясы* (льасы), *цэп—цапы*“. (Там-жа, стар. 10).

Як бачым, усё яно і проста, але „практыка беларускага пісьменства“ прымусіла Тарашкевіча адступіцца ад гэтага закону ў беларускай мове ды пайсьці на хітрыя манэўры, каб абмежаваць беларускае аканьне. Як ведама, ён стаў абазначаць ненаціскное *е* ня літараю *я,* як гэта чуваць у жывым вымаўленьні, а літараю *е* бяз націску, каб задаволіць, мабыць, тых, хто сароміўся беларускага аканьня. Дзіўны спосаб! Калі ў жывой мове ад аканьня нідзе не схаваешся, дык трэба схаваць яго хоць на пісьме. Але — гані прыроду ў дзьверы, дык яна ўскочыць праз акно. Школа наша не сароміецца літары *я* і піша яе скрозь, дзе гэта вымагаецца жывым вымаўленьнем на задор усім правілам.

Але можа гэта праўда, што ненаціскное *е* не заўсёды дае *я?* Можа гэта ўласьцівасьць *некаторых* толькі, зусім нязначных дыялектаў беларускае мовы? Мы бачылі ўжо, што ранейшае беларускае пісьменства, памыляючыся, ставіла літару *я* там, дзе сьвядома ніколі-б не паставіла. Чым гэта аб‘ясьніць? Пэўна-ж, фактам жывога вымаўленьня, бо—гані прыроду ў дзьверы, дык яна ўскочыць калі не праз акно, дык праз шчыліну. А цяпер паслухаем, што кажуць вучоныя людзі.

Акадэмік Карскі, працы каторага становяць першую навуковую крыніцу ўсіх нашых вед аб беларускай мове і

вывады каторага можа кожны з нас праверыць на практыцы сам, акуратна прыслухаўшыся, як гаворыць беларускі народ, вось што кажа аб нашым аканьні: „Переход *о* безударного в *а* вместе с таким-же переходом *е* безударного в *а* с предыдущей мягкостью согласного, или так называемое *аканье,*—одна из выдающихся черт белорусской фонетики в области гласных. Этот переход в той или другой степени известен и старым западно-русским (чытай—беларускім. Яз. Л.) памятникам, начиная с древнейших, и продолжается до сих пор на всем пространстве белорусского наречия" („Белорусы", т. II, I, стар. 137).

Акадэмік Карскі адрозьнівае вялікае або моцнае аканьне, сярэдняе (мернае) і малое або слабое аканьне і кажа, што на пераважнай большасьці беларускае зямлі (там-жа, стар. 143—144) „почти всякое *о* і *е* безударные обращаются в *а (я)*" (там-жа, стар. 144), ды прыводзіць прыклады на ўсе ступені беларускага аканьня паасобку.

Вот некаторыя з гэтых прыкладаў:

1) З вялікага, або моцнага, аканьня: *па бару, залатога, памаладзела, пазалацела, галава, савет, караліху, харошага, бяленькага* (там-жа, стар. 147-148); *пяранясу, развясялю, салезёначка (!), дзяраўляны, зяляно, сямярых, цяцярук, зялянаваты, і дзісяцірых, пярапеўцы, сярабро, сялязёначка, пяралічыць, дзяравянный, куйця, вставайця, восянь, аб жывоя, сінянькі, возяра, мілянькі* (там-жа, стар. 205-206).

2) З сярэдняга (мернага) аканьня: *у бару, ваду бяру, пачуя, залатоя, галасочкаў, апасьледняму, пагаварылі, папалудную, пакаціўся, паганяем, дапаможа, малання, паганяя, пазалота, сенакос, малако, талкаваць, пападымая, гадаваліся, ад аднае маладзіцы, абамлела, саладок, харашэнька, панапекае (!), дарагая, галава, баранавалі, дарагога, пірамолатнага, сунічная ліцо, харошаю пагодаю, перэпалах* (там-жа, стар. 152-153); *пазлятаді, пярэпісь, пярсцёнак, ня шчабечуць, не пярапівай, сяляніна, цяцярук, дзяравянны, сямярых, шасьцярых, цямнатою, пярабірачку, цяраз лес, пярэляцела, сярабро, піранясі, піраляці, падвязеця, пярэбірала, пярасьмяе, пярамяніў, ня пазнаў* (там-жа, стар. 207-208); *будзя, едзя, восянь, возяра, высялкі, дзевяра, сінянькі, бярэця, кольля, брусься, знаяця,*

думаяцц, соняйка, міляньні, радуйцяся, заступая дарогу, хлопяц, мацяры, выбяры, трэйцяму (там-жа, стар. 208-209).

3) З малога, або слабога, аканьня: *сцярог, цябе, сямярых, вяплача, скача, жана, беляньні, няздарово, яшчэ, у мяне, вяселле, ночаваць, царкоўны, перайшоў, наша поля, слухайця, белая карэння* (там-жа, стар. 201—211).

Карскі прыводзіць гэтыя і падобныя прыклады з запісаў народных песень, казак, прыказак, што рабіліся па ўсёй Беларусі. Запісы польскага этнографа Федароўскага, адкуль браў прыклады і Карскі, паказваюць, што аканьне аднолькава пашырана і ў Заходняй Беларусі, за выключэньнем тых гаворак, што мяжуюць з польскімі.

Адгэтуль відаць, што на Беларусі нідзе так не гавораць, як вучыць правапіс Тарашкевіча, патрабуючы пісаць галосныя так, як яны вымаўляюцца. Галосныя *о (ё)—э (е)* у беларускай мове вымаўляюцца выразна толькі пад націскам; не пад націскам яны даюць *а (я)*.

„Еканьне“ ў нашым правапісу выклікана асабістымі меркаваньнямі Тарашкевіча і яго дарадчыкаў з „Нашае Нівы“. Выгадаваныя ў традыцыях этымолёгічна-гістарычнага расійскага і польскага правапісу і будучы абкружаныя пастаяннымі насьмешкамі, яны спалохаліся беларускага аканьня ды адступіліся ад фонэтычнага прынцыпу ў напісаньні ненаціскнога *е*, пасылаючыся на „практыку беларускага пісьменства“ Замілаваныя ў роднае слова ўсім сваім памышленьнем яны прымушаны былі гэта зрабіць,—яны прымушаны былі падмаляваць беларускае пісьмо на густ расійскага і польскага правапісу, каб хоць у гэтай форме яно магло абмінуць варожыя насьмешкі ды трапіць у народныя гушчы.

Гэтую баязьнь беларускага аканьня можна назіраць і цяпер, хоць і няма ўжо тых абставін, у якіх працаваў Тарашкевіч. Вось, напрыклад, пачынальнікі ў зьмене правапісу Тарашкевіча С. Некрашэвіч і М. Гарэцкі адважваюцца правесьці хоць няпоўнае аканьне ў чужаземных словах, але ня хочуць поўнага аканьня ў сваіх родных словах. Каб апраўдаць сваю беспадстаўнасьць і схаваць запраўдную прычыну няпрыхільнасьці да поўнага аканьня, дык яны—няпрыхільнікі аканьня на пісьме,—выдумляюць нейкую новую тэорыю, нібыта ў беларускай мове ёсьць аканьне, але няма „яканьня“,

г. зн., што ненаціскныя *о* і часткаю *э* даюць *а*, а вот *е* (тое самае *э*, што пасьля мяккага зычнага азначаецца літараю *е)* не заўсёды падлягае аканьню, або, як яны кажуць, „яканьню“. Аб гэтым вось што піша С. Некрашэвіч у сваім артыкуле „Аб пашырэньні аканьня на чужаземныя словы“ („Полымя“ № 5, стар. 129): „Аднак правапіс ненаціскнога *о* ў чужаземных словах нельга зьвязаць з правапісам ненаціскнога *э (е)* у гэтых-жа словах. *О* і *е*—гукі розныя. У той час як усякае ненаціскное *о* ў нашай мове, бязумоўна, пераходзіць у *а*,—пра *е (э)* гэтага сказаць нельга. Наш правапіс адносна пераходу *е (э)* у *я (а)* налічае нямала адхіленьняў“... Далей пералічваюцца ўсе вядомыя нам адхіленьні ў правапісу ненаціскнога *е* ды ўносіцца гэткая папраўка ў беларускае аканьне: „Пасьля цьвёрдых зычных хоць мы і пішам *а* (з *э)*, але трэба заўважыць, што і тут адчуваецца ня зусім чысты гук *а;* гэта хутчэй будзе гук сярэдні паміж *а* і *э*“...

Адгэтуль мы бачым, што абмежаваньне аканьня, або т. зв. ненаціскное „еканьне“ ў нашым пісьме, робіць падвойную шкоду: 1) яно адрывае нашую літаратурную мову ад народнае і 2) вытварае хітрыя, ні на чым не абапёртыя правілы ў нашым правапісу. Аб гэтых правілах гаварылася ўжо вышэй, але трэба застанавіцца яшчэ на некаторых з іх.

1) Чым, напрыклад, аб‘ясьніць, што ненаціскныя канчаткі іменьнікаў ніякага роду з цьвёрдаю асноваю (з цьвёрдым зычным перад канчаткам) падлягаюць аканьню, а калі іменьнік з мяккаю асноваю, то той-жа самы канчатак ужо не падлягае гэтаму аканьню? Я хачу сказаць, чаму мы пішам: *неба, палена, дрэва, вока, гора, сэрца, мора* замест гістарычных: *небо, палено, дрэво, воко, горэ, сэрцэ, морэ?* Чаму ў гэтых формах дапушчана аканьне, а ў тых-жа іменьніках з мяккаю асноваю пакідаецца гістарычны канчатак *е: поле, здарэньне, бацьвіньне, пытаньне, хаценьне; цярпеньне, вецьце, сьмецьце* і г. д. Так гавораць? Не, так не гавораць. У жывым вымаўленьні і пасьля мяккіх зычных будзе аканьне і скажуць: *поля, бацьвіньня, здарэньня, сьмецьця* і г. далей. Адрозьніць канчатак ніякага роду ад жаночага *(поля-доля)?* Дык тады трэба пісаць і *небо, горэ, воко* і г. д., бо канчатак *а* таксама канчатак жаночага роду *(рука, гара, сястра)*. Гэта аб‘ясьняецца ўсё тэй-жа прычынаю: практыкаю даўнейшага (да-

граматычнага) пісьма, якая кіравалася баязьню поўнага аканьня.

2) „Наша Ніва“ і яе выданьні таксама стараліся праводзіць няпоўнае аканьне, але рабілі гэта больш паступова, як зрабіў Тарашкевіч, апіраючыся на іх практыку. „Наша Ніва“ дапускала нараўне з ненаціскным *е* ненаціскное *э* і нават *о* і магла напісаць, напрыклад, так: *чэлавек, шчэбятала, маладзенькі, харошаго* і г. д., а ў напісаньні дзеясловаў І-га спражэньня 3-яе асобы адзіночнага ліку зусім паступова трымалася аднае формы на *э—е,* напр.:

кажэ, чытае (чытай—э)
рэжэ, гуляе (гуляй—э)
пішэ, слухае (слухай—э)
топчэ, думае (думай—э) і г. д.,

а Тарашкевіч гэтага не датрымаў, чым і парушыў „доўгую практыку нашага пісьменства“. Тарашкевіч дапускае толькі ненаціскное *е,* якое азначае літараю *е* бяз націску, каб адрозьніць яго ад націскнога *е,* якое азначае літараю *е* з націскам. Гэты спосаб азначаць ненаціскное *е* літараю *е* бяз націску, а націскное *е*—літараю *е* з націскам практычнага значэньня ня меў ды так і застаўся таямніцаю для школы і грамадзянства.

Азначэньне аднае і тае самае дзеяслоўнае формы і аднаго і таго самага гуку рознымі літарамі вытварыла такое правіла, проці якога нашы школьнікі і сталыя людзі пастаянна робяць памылкі, і вінаваты тут не яны, а правіла, бо якое-ж гэта правіла, калі большая часьць слоў не падлягае закону?—Калі мы пішам: *кажа, рэжа, піша—кажаш, рэжаш, пішаш-кажам, рэжам, пішам* і г. д., то чаму ня пісаць і — дума*я*, гуля*я*, слуха*я*—думаяш, гуляяш, слухаяш—дума*ям*, гуля*ям*, слуха*ям* і г. д. Усё наша настаўніцтва пасьведчыць, што школьнікі, на задор правілу, гэтак і пішуць, бо ў гэтых дзеясловах аднолькавая граматычная форма і адзін ненаціскны гук *э (е),* які вымаўляецца, як *а (я).* Памылкі гэтыя аб'ясьняюцца дзьвюма прычынамі—жывым вымаўленьнем і граматычнаю аналёгіяй (падабенствам).

Разумеецца, памылкі гэтыя ня трудна перамагчы, але для барацьбы з імі няма ніякай законнай падставы. Прымушаць школьнікаў запісваць адну і тую граматычную форму

ў адных разох літараю *а*, а ў другіх—літараю *е* мы ня маем ніякага права—ні граматычнага, ні фонэтычнага: гэта гвалт дарослых над дзяцьмі.

3) Агранічаючы аканьне, Тарашкевіч парушыў яшчэ шмат чаго з „практыкі нашага пісьменства“. Напрыклад, журнал „Вольная Беларусь“ азначаў на пісьме іменьнікі ніякага роду ўсе без выключэньня: *поле, вецьце, калено, сэрцо, горо* і г. д. і не баяўся зьмяшаць формы творнага склону адзін. л. з давальным склонам множн. ліку, калі пісаў адзін мяккі ненаціскны канчатак *ям: з локцям—локцям, з гэтым звычаям—нашым звычаям* і г. д.

Тарашкевіч-жа зрабіў якраз наадварот, або, лепей сказаць, падзяліў усё напалам. Іменьнікі ніякага роду з цьвёрдай асноваю, як мы бачылі вышэй (бач. І-ы абзац), падпарадкаваў аканьню *(палена, калена, неба, гора, сэрца, мора)*, а канчаткі ў тых-жа самых граматычных формах з мяккаю асноваю стаў запісваць гістарычным пісьмом *(поле, вясельле, здарэньне, сумленьне, вецьце)*. Гэтак сама ў творным склоне адзін. ліку ў словах з ненаціскным мяккім канчаткам пакідаецца гістарычны канчатак *ем (гаем, краем, локцем, полем, сумленьнем)*, каб адрозьніць творны склон адзін. ліку ад давальнага склону множ. ліку *(звычаям, гаям, локцям, коням)*, але жывая мова, як і „практыка беларускага пісьменства“, не баіцца гэтага замяшчэньня, напр., у творным склоне адзін. ліку і давальным множн. ліку ў іменьніках муж. і ніякага роду, калі націск бывае на адным і тым-жа складзе: *з валом—к валом, за морам—к морам, з паленам—к паленам, з вераб‘ём—к вераб‘ём* і г. д.

А раз жывая мова не баіцца замяшчэньня граматычных форм, то яго няма чаго баяцца і на пісьме, бо калі мы станем азначаць на пісьме тое, чаго няма ў жывой мове, то мова кніжная (літаратурная) адарвецца ад народных крыніц ды стане штучнаю, габінэтнаю і мёртваю.

4) Няма належнага парадку ў нас і ў правапісу зычных гукаў. Аб правапісу зычных Б. Тарашкевіч кажа: „Зычныя пішуцца гледзячы на тое, які зычны ў корані, прыстаўцы ці канчатку: *мёд, калодка, падтрымаць, мыешся* і г. далей, а ня так, я чуваць: *мёт, калотка, паттрымать, мыесься*“. („Грамат. для школ“, стар. 59).

Мы ня бачым ніякіх перашкод для таго, каб не запісваць і зычных так, як чуваць, як яны вымаўляюцца, тым больш што ў пераважнай большасьці мы і запісваем іх так, як чуваць і як патрабуе таго правапіс Тарашкевіча, напрыклад: *баяцца, часацца, умывацца* і г. д. замест гістарычных: *баяться, чесаться, умываться* і г. д., а гэтак сама: *полацкі, брацкі, францускі* і г. далей—замест: *полатскі, братскі, французскі* і г. далей. Паступовасьць патрабуе, калі мы пішам: *цалавацца, баяцца, турбавацца,* то трэба пісаць і *баісься, турбуесься, цалуесься* і г. д., а не *баішся, турбуешся, цалуешся,* а таксама, калі мы пішам: *брацкі, полацкі,* то трэба пісаць і *люцкі, гарацкі, швэцкі* і г. д., а ня *людзкі, гарадзкі, швэдзкі,* бо нельга-ж у адных разох кіравацца фонэтыкаю слова, а ў другіх—яго пахаджэньнем.

Слова *мёд* або *хлеб* ці *ножка, калодка* (з звонкімі *д, б, ж)* былі тысячу год назад, а цяпер у беларускай мове іх няма, а ёсьць: *мёт, хлеп, ношка, калотка, прозьба, каска* і г. далей.

Правіла Б. Тарашкевіча аб этымолёгічным напісаньні зычных адносіцца толькі да звонкіх зычных у канцы і сярэдзіне слова перад глухімі *(сад, боб, казка, просьба),* ува ўсіх іншых разох зычныя таксама пішуцца, як чуваць (фонэтычна). Значыць, і тут тая-ж самая падвойнасьць, непаступовасьць і заблутанасьць, якая пануе ў правапісу галосных гукаў, бо, зрабіўшы адзін крок, Тарашкевіч не адважыўся зрабіць другога,—палажыўшы ў аснову правапісу прынцып фонэтычны, ён не датрымаў яго да канца, што і прывяло да тэй неразьбярыхі і да таго крызысу, які мы маем цяпер.

III. Як трэба рэформаваць наш правапіс, каб зрабіць яго простым, лёгкім і навуковым?

Правапіс—гэта аднолькавае пісьмо. Правапіс дае нам правілы, як трэба пісаць у тых разох, калі гукі вымаўляюцца граняясна, нявыразна, калі пішацца ня так, як чуваць. Граматна, або правільна пісаць,—гэта значыць пісаць так, як патрабуюць установленыя абавязковыя для ўсіх правілы. Правапіс—гэта законы, дысцыпліна, і як кожны закон, правапіс што-небудзь абмяжуе, агранічае, чаго-небудзь не дазваляе. Словам, правапіс—гэта тое самае, што парадак, законнасьць і дысцыпліна ў грамадзянскім жыцьці. Разумныя законы павінны кіравацца патрэбамі пераважнай большасьці

грамадзянства, а разумны правапіс будуецца на гутарцы, або гаворцы (дыялекце) пераважнай большасьці насельніцтва таго ці іншага народу.

Б. Тарашкевіч у прадмове да свае граматыкі кажа: „І ня гледзячы ня вялікую суцэльнасьць усяе беларускае мовы, яна мае, як і кожная іншая мова, колькі асобных, выразьней азначаных гутарак. Кожная гутарка дабівалася, каб заняць пачэснае месца ў нашым пісьменстве. Дзеля гэтага і розныя, часта паміж сабою нязгодныя, спосабы пісаньня.

Трэба было часу, каб само жыцьцё паказала, якая гутарка мае найбольш сілы і здатнасьці на тое, каб зрабіцца *асновай* літаратурнае мовы.

Трэба было часу, каб праявіліся ў пісьменстве ўсе, якія толькі ёсьць у асобных гутарках, чыста беларускія асобнасьці.

Бяз гэтага не магло быць ніякае, хоць больш-менш закончанае граматыкі, не магло быць і сталага, яснага правапісу. Бо граматыка павінна толькі замацаваць і падраўняць тыя лініі, якія сама ўжо мова азначыла.

Мне здаецца, што гэтыя лініі і характэрныя асобнасьці ўжо азначыліся, дзеля чаго я і адважыўся выпусьціць у сьвет „беларускую граматыку“.

У аснове яе ляжыць найбольш характэрная і найбольш чыстая гутарка беларускае мовы, што мае цьвёрдае „р“ і вялікае аканьне. („Ад аўтара“, апошні курсыў мой. Яз. Л.).

Значыць, Б. Тарашкевіч устанаўляе (і нашае грамадзянства прымае, бо ніхто, нідзе і ніколі сьвядома і організавана проціў гэтага не выступаў, а цяпер і выступаць ужо позна), што ў аснове нашае літаратурнае мовы ляжыць найбольш характэрная і найбольш чыстая гутарка беларускае мовы, што мае цьвёрдае *р* і вялікае аканьне.

Гэтае палажэньне аб нашай літаратурнай мове мы прымаем поўнасьцю. Прызнаем мы і правапіс, устаноўлены Б. Тарашкевічам, але з тэю агаворкаю, якую ён робіць сам: „Аднолька-ж ня думаю, што жыцьцё ня зробіць з часам *значных зьмен.* Будзем толькі мець надзею, што не залішне вялікія, і што ўсё найважнейшае зроблена добра“. („Ад аўтара“, курсыў мой. Яз. Л.).

Так, усё найважнейшае зроблена добра, аснова ў на-

шай літаратурнай мове і ў нашым правапісу здаровая і жыцьцёвая, але трэба было часу, каб жыцьцё выявіла ўсе тыя дробныя недакладнасьці і недахваты ў правапісу, якія прачуваў і сам аўтар, і якіх не магло ня быць у такой вялікай рабоце, якая зроблена сіламі аднаго чалавека. Цяпер нам трэба толькі падраўняць і замацаваць тыя лініі, якія само жыцьцё ўжо вызначыла. А жыцьцё паказала, што каб зрабіць наш правапіс простым, лёгкім і паступовым, трэба надкінуць усё, што супярэчыць фонэтычнаму прынцыпу ў нашым правапісу і аставіць у аснове яго адзін фонэтычны прынцып як для напісаньня галосных, так і зычных гукаў, маючы на ўвазе той дыялект беларускае мовы, які ляжыць у аснове літаратурнае мовы і характарызуецца вялікім, або поўным, аканьнем і цьвёрдым *р* з усімі іншымі гукавымі і морфолёгічнымі асаблівасьцямі гэтага дыялекту.

Палажыўшы ў аснову свайго правапісу адзін фонэтычны прынцып, мы можам напісаньне галосных выразіць двума наступнымі правіламі:

1) У беларускай *літаратурнай* мове галосныя гукі *о* (пасьля мяккага зычнага і на пачатку складу літара *ё)* і *э* (пасьля мяккага зычнага і на пачатку складу літара *е)* чуваць і пішуцца толькі пад націскам (д*о*бра, г*о*ра, гал*о*ўка; ц*ё*пла, с*ё*лы, *ё*сьць; цэны, рэкі, шчэбят; н*е*ба, л*е*с, с*е*на); не пад націскам чуваць і пішацца *а,* а пасьля мяккага зычнага і на пачатку складу *я,* і нідзе ня пісаць ненаціскнога *е,* як нідзе ня пісалі мы дагэтуль ненаціскных *о* і *э,* бо гук *е* не пад націскам хоць і няясны, але ўсё-ж такі бліжэй да *я,* чым да *е;* тады фонэтычны прынцып адносна галосных будзе праведзены поўнасьцю, і аканьне будзе не вялікім, а *поўным.*

Толькі ў складаных словах, калі выразна адчуваюцца яго складаныя часьці, гэтыя галосныя запісваюцца так, як яны запісваліся-б пры асобным ужываньні тых слоў, што вытвараюць складанае слова *(Беларусь—Бела Русь, сенажаць, белабокі, штодня, вярбалоз, вялікалюд, роўналетак, грэхаводнік, гэтарочны),* бо ў такіх складаных словах выразна чуваць два націскі—адзін слабейшы, а другі мацнейшы, аб чым дакладна гаворыць граматыка.

Разам з гэтым, прынцып поўнага аканьня пашыраецца і на ўсе чужаземныя словы, як гэта бывае і ў жывой мове ў

словах чужаземнага пахаджэньня *(аканом, камісар, літара, адукацыя, сакрэт, сакратар, акуляры, лямантар* або *алямантар, каляндар, калідор; лягенда, камунізм, сацыялізм фанэтыка, фартуна);* выключэньне можа быць толькі для слоў чужаземных складаных па падабенству з складанымі словамі роднага пахаджэньня *(марфолёгія, манолёг, геаграфія, тэолёг,* але *талеграма, тарыторыя, Яўропа, дыплямат, апарацыя, філёзаф* або *філязоф, рацэнзія, паэзія, ражым, равалюцыя, празыдэнт; далягат, дапо).*

2) У беларускай літаратурнай мове нескладовыя („кароткія“) гукі *ў* і *й* чуваць выразна і пішуцца толькі ў канцы і ў сярэдзіне слова пасьля галосных перад зычным *(конаўка, воўк, поўны, галоўка, хлеў, роў, рабіў, хадзіў, чытаў, гуляў; вайна, зайцы, хвойка, край, чай, мой, твой, чый);* а калі гукі *у—і* стаяць асобна або на пачатку слова, то заўсёды пішуцца складовыя *у—і,* бо хоць у некаторых разох гэтыя гукі, стаўшы не пад націскам пасьля галоснага перад зычным, „скарачаюцца“, г. зн. становяцца нескладовымі, але на пісьме дакладна і правільна азначаць гэтага скарачэньня нельга з прычын такога характару:

а) Вылажыць дакладным і ясным правілам таго фонэтычнага факту ў беларускай мове, калі гук *і,* стоячы асобна або на пачатку слова, „скарачаецца“, а калі „не скарачаецца“— абсолютна нельга; калі-ж гэты закон пераходу ненаціскных і мэханізаваць, як зрабілі гэта ўкраінцы, ды скарачаць кожнае *і* пасьля галоснага перад зычным, калі яно стаіць асобна або на пачатку слова, то гэтым вытварым нямілагучны і нефонэтычны зьбег зычных, якога наша мова ня церпіць, як злучэньня зычных, цяжкіх для вымаўленьня, напр.: *„сыпалася йможака“, „стаяла ймгла“, „у Ймгліне“,* на *ймпэрыялістых*“ і г. д.

б) Хоць правіла аб скарачэньні гуку *ў,* калі яно стаіць асобна ці на пачатку слова пасьля галоснага перад зычным, мэханізаваць можна, бо гэтае правіла асаблівых практычных перашкод не сустракае, але было-б зусім нелёгічна і непаступова ніколі не скарачаць асобнага і пачатковага *і,* а заўсёды скарачаць у такіх разох *у;* апроч таго, ёсьць многа выпадкаў, калі пачатковае *у* ў словах нельга скараціць, не зра-

біўшы гвалту над беларускім вымаўленьнем, напр.: *ухвала, угода, умова, увага, уціск, уклад, убраньне, уважлівы, урад, умова* і іншыя, або ў чужаземных словах: *Урагвай, унівэрсытэт, Уран, унівэрсал, узурпатар* і падобныя; а да таго, скарачэньне *у* пасьля галосных перашкаджае мэханічнасьці пісьма, бо кожны раз трэба спыняцца і думаць або глядзець, на які гук кончылася папярэдняе слова.

З гэтых двух кароткіх, ясных і дакладных правіл аб правапісу галосных гукаў найбольш „страшным" здасца поўнае аканьне на пісьме. Людзей, звыкшых да гістарычна-этымолёгічнага пісьма і да Тарашкевічаўскага няпоўнага, штучна і заблутана абмяжованага аканьня, палохае поўнае аканьне. Але падумаць толькі—чаго яны баяцца? Літары *я*—гэтага маленькага ўмоўнага значка? Ды чым-жа яна горшая за літару *е?* Тут адно можна сказаць, што калі людзі не згаджаюцца з поўным аканьнем на пісьме, якое пануе ў жывой мове, то яны кіруюцца не практычнасьцю, не навуковасьцю і не інтарэсамі нашае школы і грамадзянства, якія мучацца і дарэмна трацяць час на завучваньне і практычнае дапасаваньне хітрых, цяжкіх і ні на чым не абапёртых правіл, што панавыдумлены для штучнага абмежаваньня нашага характэрнага літаратурнага аканьня,—а сваім асабістым густам, аб чым ня прынята нават спрачацца, бо з навуковага боку для правядзеньня на пісьме поўнага аканьня няма ніякіх перашкод, а з боку яснасьці, дакладнасьці і практычнасьці гэтага правіла—камар і носу не падточыць.

Тут могуць сказаць—усё гэта добра, але вот, чытаючы гэтакае пісьмо, будуць занадта ўжо „якаць". Наіўная ўвага! Калі хто чытае літаральна так, як напісана, той чытаць ня ўмее, таму трэба яшчэ павучыцца. Калі-б хто стаў чытаць, скажам, расійскую кнігу так, як надрукавана, той выклікаў-бы сваім няграматным чытаньнем сьмех і зьнявагу да самога сябе, і кожны сказаў-бы, што гэты чалавек не навучыўся яшчэ чытаць. Пісьмо—гэта ўмоўныя значкі, што напамінаюць нам живое слова, і граматны чалавек чытае не па літарах, а цэлымі словамі, пісьменнымі вобразамі іх, нават не заўважваючы паасобных літар. Значыць, калі-б то і пабеларуску стаў чытаць, як напісана ці надрукавана, то яму трэба сказаць, што чытаць ён яшчэ не навучыўся. Чытаць правільна, як

прынята ў літаратурнай мове, навучае нас школа і *ортоэпія*, або мастацтва правільнага і чыстага вымаўленьня.

Прыкладаючы фонэтычны прынцып да напісаньня зычных гукаў, трэба сказаць наступнае.

У пераважнай большасьці зычныя гукі ў нас і дагэтуль запісваліся паводле Тарашкевічаўскага правапісу фонэтычным пісьмом, аб чым гаварылася ўжо вышэй. Выключэньне рабілася толькі для звонкіх зычных у канцы і ў сярэдзіне слова перад глухімі. Гэта значыць, што ў нашым правапісе не азначаўся закон канца слоў *(сат, боп, хлеп,* замест *сад, боб, хлеб)* да асыміляцыі звонкіх з глухімі і наадварот. Напрыклад, мы ня пісалі: *ношка, дзяцька, вашка, глатка, прозьба каска, лёт, мөх* і г. далей, а пісалі: *ножка, дзядзька, важка, гладка, просьба, казка, лёд, мог* і г. далей. Цяпер прынцып фонэтычнага напісаньня зычных трэба правесьці поўнасьцю, каб зьнішчыць тую непаступовасьць, якая практыкуецца цяпер, што ў адных выпадках яны запісваюцца фонэтычна, а ў другіх—не, напр., зьбег некаторых зычных і прыстаўкі, што канчаюцца на *з*, запісваюцца фонэтычна, а ўсе іншыя разы не падлягаюць гэтаму правілу, як, напрыклад, прыстаўкі, што канчаюцца на *д (ад, над, прад)*, зваротныя дзеясловы ў 2-ой асобе адзін. ліку: *мыешся, купаешся* замест *мыесься, купаесься.*

Пашырыўшы фонэтычны прынцып на зычныя, а таксама і на морфолёгічныя формы, мы будзем мець поўнае права сказаць школьніку: пішы так, як чуеш; пішы так, як вымаўляецца ў літаратурнай мове, каб вока тваё бачыла тое, што чуе вуха.

Выходзячы з эканоміі ў часе і паперы, ня трэба пісаць мяккага знаку: 1) паміж падвойнымі мяккімі зычнымі *(жыцьцё, каменьне, гальлё)*, бо ён тут лішні. Закон асыміляцыі гаворыць, што калі зычныя стануць поплеч, то папярэдні прыпадабняецца да наступнага. Стала быць, і ў словах—*жыццё, каменне, галлё, калоссе, граззю*, і падоб. папярэдні зычны сам сабою будзе вымаўляцца мякка, як і наступны. Значыць, мяккі знак тут непатрэбен.

2) На гэтай-жа падставе ня трэба пісаць *ь* пасьля *з-с, ц-дз*, калі яны стаяць перад мяккімі зычнымі, тым больш што гэтыя 2 пары зычных у некаторых дыялектах (на Магілеўшчыне, напр.) падлягаюць зьмякчэньню і перад *г-к-х*,

што становіць дял нашага правапісу выключэньне. Перастаўшы пісаць *ь* пасьля гэтых зычных, мы тым самым збавімся ад выключэньня і прымірым усе дыялекты; тады будзе: *звер, снег, цвет, скінуць, згінуць* і г. д.

Яшчэ адна апошняя ўвага. Праціўнікі фонэтычнага пісьма звычайна любяць пасылацца на *омонімы*, г. зн. на словы аднагучныя, з аднолькавым напісаньнем, але з розным значэньнем, што нібыта вытвараюцца пры фонэтычным пісьме. Але омонімы ёсьць у кожным пісьме, бо яны ёсьць у жывой мове, напр.: *прышлі, шыла, тачыла, мука, засыпаць, баба, каса* і падобныя, якім-бы пісьмом ні запісаць, усё роўна будуць омонімы; а калі жывая разгаворная мова не баіцца аднагучных слоў з розным значэньнем, то няма ніякай падставы баяцца іх на пісьме.

Я ня думаю і ня цешу сябе надзеяй, што мой проект рэформы нашага правапісу сустрэне агульнае спачуцьцё і прыхільнасьць. О, не! Ані на момант не захапляе мяне гэта, бо ведаю, што лягчэй каралю адсячы галаву, як зрабіць рэформу ў пісьме. У мяне ёсьць другая надзея, другое захапленьне: я глыбака перакананы ў тым, што ідэя мая правільная, што яна дыктуецца самым жыцьцём і што ня сёньня, дык заўтра, ня сёлета дык налета, не налета, дык праз 10 год, а яна зьдзейсьніцца і запануе.

Але павінен сказаць, што калі мы ня зробім рэформы ў нашым правапісу і азбуцы (бач. маю брошуру „У справе рэформы нашае азбукі“) цяпер, то дапусьцім праступленьне перад маладым пакаленьнем.

Старшыня: Слова мае для дакладу: „Да пытаньня аб рэформе нашага правапісу“ правадзейны член Інстытуту Беларускай Культуры С. М. Некрашэвіч.

С. Некрашэвіч. Да выхаду ў сьвет у 1918 г. „Беларускай граматыкі для школ“ Б. Тарашкевіча ў нас цьвёрда ўстаноўленага правапісу ня было. Праўда, практыка віленскіх выданьняў да 1918 г. ўжо высунула некаторыя прынцыпы правапісу,—фонэтычны адносна галосных і морфолёгічны адносна зычных. Аднак гэтыя прынцыпы, будучы не замацаванымі цьвёрдымі правапіснымі правіламі, часта парушаліся. Гістарычнай заслугай Б. Тарашкевіча зьяўляецца

якраз тое, што ў сваёй кароткай граматыцы, пабудаванай на апошніх вывадах прац акадэмікаў Е. Карскага і А. Шахматава, ён удала вылажыў асноўныя законы беларускай літаратурнай мовы і даў важнейшыя правілы правапісу гэтай мовы.

Былі спробы напісаньня беларускіх граматык і раней. У 1846 г. этнограф Шпілеўскі, грунтуючыся на знаёмстве з менскімі гутаркамі, напісаў першую беларускую граматыку, у якой разглядаюцца і некаторыя пытаньні правапісу. Хоць у граматыцы Шпілеўскага і былі падмечаны некаторыя досыць цікавыя зьявы беларускай мовы, але наагул яго граматыка ўложана ненавукова, дзеля чаго Акадэміяй Навук, куды яна была прыслана, для друку прынята ня была. Такая-ж няўдалая спроба была і другога беларускага „граматыста“— Пачопкі. Хоць яго граматыка беларускай мовы і вышла ў сьвет у 1915 г., аднак, не атрымала пашырэньня, бо ўложана была ненавукова і ў сваіх вывадах не адпавядала законам беларускай мовы.

Школьная граматыка Б. Тарашкевіча, будучы проста і навукова ўложанай, адпавядаючы ў сваіх вывадах законам беларускай мовы, хутка атрымала самае вялікае пашырэньне і запанавала ва ўсіх нашых школах.

На аснове граматыкі Б. Тарашкевіча ў апошнія гады выпускае ў сьвет некалькі сваіх граматык і правапісаў Язэп Лёсік у Менску, Янка Станкевіч (з некаторымі зьменамі) і Астроўскі ў Вільні.

Устаноўленыя Б. Тарашкевічам правілы правапісу трымаюцца моцна. Выключэньнем зьявіўся толькі правапіс ненаціскнога „о“ чужаземных слоў, якое наша газ. „Савецкая Беларусь“ і некаторыя віленскія выдавецтвы пішуць праз „а“. Былі яшчэ некаторыя адхіленьні, але яны хутка адпадалі; напрыклад, напісаньне ненаціскнога *о* (з *е*) у назоўным і вінавальных склонах іменьнікаў ніякага роду пасьля зацьвярдзелага *р:* горо, моро і інш. Гэткага, між іншым, правапісу прытрымлівалася газ. „Вольная Беларусь“, якая рэдагавалася Язэпам Лёсікам. Але наагул да 1925 г. правапіс Б. Тарашкевіча трымаўся моцна, і мы гардзіліся тым, што ў нас ва ўсіх частках Беларусі існуе адзін правапіс.

У 1925 г. можна ўжо было пачуць незадаваленьне пра-

вапісам Б. Тарашкевіча. Адны казалі, што ён зацяжкі, іншыя— што ён не адбівае цікавейшых зьяў нашай мовы.

Найбольш выразна гэта незадаваленьне адбілася ў 1926 г. ў проекце братоў Антона і Язэпа Лёсікаў: „Да рэформы беларускага правапісу“, Менск, 1920, якія ўносяць цэлы шэраг паправак да правапісу і самай граматыкі Б. Тарашкевіча.

Паколькі я маю на ўвазе гаварыць толькі аб правапісу, корэктывы братоў Лёсікаў адносна некаторых форм літаратурнай мовы я не разглядаю, бо літаратурнасьць або нелітаратурнасьць формы, як ужо раней зазначыў у сваіх „Увагах“ А. Багдановіч да проекту Лёсікаў, правапісу не датычыць.

У частцы проекту, дзе гаворыцца аб правапісу, браты Лёсікі прапануюць спросьціць яго, дзеля чаго, па іх словах, лічаць патрэбным „зьмяніць некаторыя правілы з мэтаю зрабіць іх болей лёгкімі для ўжываньня, калі гэтая зьмена не супярэчыць *прынцыпам* (курсыў мой) беларускага правапісу“. Як відаць з папярэдняга, бр. Лёсікі вышэй за ўсё ставяць прынцыпы правапісу, яны, бачна, дапускаюць разыходжаньні правапісу з жывым вымаўленьнем, абы толькі захованы былі прынцыпы правапісу. Б. Тарашкевіч у пабудове свайго правапісу якраз ішоў наадварот: ён браў навуковыя вывады адносна жывой беларускай мовы і дапасоўваў да іх прынцыпы правапісу. Асноўная памылка падходу да правапісу ў проекце братоў Лёсікаў відаць сама сабой. У правапісу на першы плян, апрача яго прастаты, трэба ставіць ня прынцыпы самога правапісу, а наступныя запатрабаваньні: 1) правапіс павінен абхапляць больш пашыраныя ў мове зьявы і 2) напісаньне павінна быць па магчымасьці блізка да жывога вымаўленьня. (Больш падрабязна аб агульных прынцыпах правапісу гл. ў маёй брошуры: „Аб пашырэньні аканьня на чужаземныя словы“). У сваім проекце спрашчэньня правапісу бр. Лёсікі гэтых элемэнтарных запатрабаваньняў ня ўлічылі. Яны бяруць прынцып правапісу (у даным выпадку фонэтычны) і падмацоўваюць яго не навуковымі вывадамі, а сваімі ўласнымі індывідуальна-суб‘ектыўнымі назіраньнямі, што, між іншым, заўважыў і А. Багдановіч. А вядома, што свае суб‘ектыўныя назіраньні, або,

больш правільна, пераконаньні, калі яны ня грунтуюцца на об‘ектыўных навуковых даных, будуць заўсёды памылковыя. Бр. Лёсікам, калі яны толькі хацелі сур‘ёзна працаваць па перагляду нашага правапісу і ўнясеньні ў яго тых ці іншых зьмен, трэба было будаваць свае вывады на даных беларускай дыялектолёгіі, бо гэта запраўды адзіны грунт, на аснове якога можна рабіць рэформу нашага правапісу. Калі-б аўтары проекту сталі на гэты грунт і пабудавалі-б свае вывады навукова, то яны прыблізна прышлі-б да тых-жа самых вынікаў, што і Тарашкевіч. Ды гэта і зразумела. Ніякіх новых капітальных прац, каторыя парушылі-б вывады па беларускай дыялектолёгіі Е. Карскага і А. Шахматава, на якіх грунтаваўся Тарашкевіч, ня вышла. Не рабілі досьледаў па беларускай дыялектолёгіі і аўтары проекту. А паколькі, такім чынам, вывады дыялектолёгіі занядбаны і ўвесь правапіс, можна сказать, будуецца з галавы, ненавукова, я проект бр. Лёсікаў лічу нясур‘ёзным і здавалася-б не заслугоўваючым увагі быць разгледжаным на гэтай Конфэрэнцыі. Калі, тым ня менш, мы яго разглядаем, то ня дзеля яго навуковай і практычнай вартасьці, а каб, карыстаючыся аўторытэтам Конфэрэнцыі, накіраваць працу па рэформе нашага правапісу на належны шлях.

Шлях, на мой погляд, тут адзін,—шырака распачаць працу па дасьледаваньні беларускіх гутарак і на аснове вывадаў дасьледаваньня рабіць рэформу правапісу.

Нельга пры гэтым думаць, што наша дыялектолёгія добра дасьледавана, што новае дасьледаваньне, пасьля капітальных прац Е. Карскага, нічога ня дасьць. Новага і цікавага матар‘ялу тут будзе ня мала. Я-б сказаў, што ў галіне вокалізму, часткова ў галіне аканьня, нашы гутаркі яшчэ слаба дасьледаваны, што тут трэба павесьці шырокую дасьледчую працу. А між тым аканьне (яканьне) і зьяўляецца асноўным пунктам проекту рэформы правапісу бр. Лёсікаў. Што-ж аб яканьні мы знаходзім у Карскага? На 184 стар. II т. I ч. „Белорусов“, гаворачы аб безнаціскным „е“, Карскі кажа, што „оно известно в неизменном виде далеко не во всей Белоруссии. На основании существующих изданий народных белорусских произведений точно установить, *в каких областях и когда возможно „е“ безударное, довольно трудно,*

так как прежние издатели народных произведений в отношении *е* обыкновенно держались исторической орфографии; новейшие же более исправные издания не обнимают всей белорусской области“. На наступнай 185 старонцы чытаем: „В белорусских говорах с умеренным аканьем случаев с *е* безударным больше, чем случаев с *о* безударным“. Да якіх вывадаў можна прысьці на аснове гэтых выпісак? Папершае, што аканьне больш характэрная ў нашай мове зьява, чым яканьне, і што Б. Тарашкевіч быў правы, калі ён, прыняўшы аканьне абмежаваў яканьне. Падругое, што яканьне ў нашай мове слаба дасьледавана і што нам, у мэтах рэвізіі нашага правапісу, патрэбна заняцца дадатковымі дасьледаваньнямі на нашай дыялектолёгіі.

Тут, між іншым, упамяну, што пажадана выкарыстаць і практыку нашага настаўніцтва, дзеля чаго варта разаслаць па школах адпаведныя анкеты.

Вось тыя вывады, да якіх я прыходжу ў справе рэформаваньня нашага правапісу. Шырокую пастаноўку гэтага пытаньня лічу несваячасовай, бо яно належна не дасьледавана і не апрацавана. Прыхільнікі рэформы правапісу нават не далі нам сур‘ёзна апрацаванага проекту правапісу. Апрача таго, сягодня ад дакладчыка Язэпа Лёсіка мы пачулі новыя корэктывы правапісу, аб якіх ён раней нічога не казаў. Сягодня Я. Лёсік адмаўляецца ад *я* ў другім і іншых пераднаціскных складох, прапануючы разам з тым фонэтычны прынцып пашырыць і на зычныя гукі. Проекту пашырэньня фонэтычнага прынцыпу на зычныя дакладчык не дае, што яшчэ раз пацьвярджае правільнасьць выказанай мною вышэй думкі: проект бр. Лёсікаў і даклад Я. Лёсіка ў аснову працы Конфэрэнцыі палажыць нельга.

Аднак вернемся да разгляду проекту аўтараў правапісу. Браты Лёсікі прапануюць адносна галосных поўнасьцю правесьці фонэтычны прынцып, гэта зн. пісаць ня толькі кожнае ненаціскное *о* і *э* праз *а (аканьне),* як гэта ўстанавіў Б. Тарашкевіч, а і кожнае ненаціскное *е* і *ё* таксама перадаваць праз *я,* вядома з сягодняшнімі корэктывамі Я. Лёсіка. Праўда, аб яканьні аўтары проекту нічога не гавораць. Як відаць, яны не адрозьніваюць або ня хочуць адрозьніваць розных зьяў у нашай мове—аканьня і яканьня. Але як ужо пад-

крэсьліў у сваёй брошуры: „Некаторыя непаразуменьні ў спрэчках аб рэформе беларускага правапісу“ і П. Бузук, аканьне і яканьне ў нашай мове—процэсы не аднастайныя. Ненаціскное рэдукаванае *е* ў беларускіх гутарках дапускае шмат зьмен, пачынаючы ад а *(я)* (яканьне), гуку папярэдняга раду ніжняга пад'ёму і канчаючы *і* (іканьне), гукам таго-ж раду верхняга пад'ёму. Апрача таго, краіны пашырэньня аканьня і яканьня не супадаюць, не гаворачы ўжо аб тым, што як вышэй было зазначана, аканьне ў нашай мове мае большае пашырэньне, чым яканьне. Такім чынам, падводзіць розныя, хоць і блізкія ў мове зьявы, пад адзін процэс і будаваць на аснове яго *штучны,* ненатуральны правапіс, хаця-б і кіруючыся пры гэтым высокімі мэтамі спрашчэньня,—рэч недапушчальная.

У гэтым асноўная памылка аўтараў проекту.

Якія-ж конкрэтна прычыны прымусілі аўтараў проекту пайсьці на шлях рэформы нашага правапісу? Гэта *труднасьць,* як аўтары кажуць, правапісу Б. Тарашкевіча для школьнага ўжытку, галоўным чынам, у адносінах да правапісу *е,* якое Тарашкевіч абмежаваў некалькімі выключэньнямі. Для аўтараў проекту, здаецца, незразумелы прычыны гэткага абмежаваньня, калі яны на стар. 5 проекту гавораць: „На вялікі жаль, першы аўтар беларускага правапісу—Тарашкевіч не дае дакладнага аб'ясьненьня, чаму ён так агранічыў аканьне (трэба разумець яканьне. С. Н.) адносна гукаў *е-я.* Для іх, як відаць, незразумела, чаму Б. Тарашкевіч, устанавіўшы пісаць у зачыненых складох пасьля націску *е,* разам з тым дапускае некалькі абмежаваньняў для свайго правіла, напр.: пам*яць,* дол*яю,* га*яў* і інш.

Два гэтыя адхіленьні вытлумачыў у сваіх „увагах да проекту аб рэформе правапісу“ А. Багдановіч, указаўшы, што ў словах *памяць, пояс* і да т. п. Тарашкевіч таму дапусьціў пасьля націску адхіленьне, што тут гукі *я* асноўныя, што яны стаяць на сваім прыродным месцы. Аднак, далейшае тлумачэньне А. Багдановіча, што ў беларускай мове няма адваротнага пераходу *а* ў *е,* памылковае.

Таксама А. Багдановіч тлумачыць і другую незразумелую для аўтараў зьяву адносна ўжываньня *я* ў некаторых морфолёгічных формах (дол*яю,* га*яў* і інш.), выясьняючы

гэтую зьяву ранейшай недакладнасьцю графікі ў напісаньні *о* (ё) з папярэднім мяккім зычным літарай *е*.

Незразумела, урэшце, для аўтараў проекту, чаму гэта Б. Тарашкевіч пасьля націску ў некаторых суфісках і формах слоў дапускае то *е*, то *а;* напр., піша: сін*е*нькі, вясёл*е*нькі, але мокр*а*нькі, прыгож*а*нькі; мел*е*, се*е*, але піш*а*, каж*а*. Для іх, здавалася-б, трэба было прыняць што-небудзь адно,— або *е*, або *я*. Аўтары проекту хацелі-б ва ўсіх гэтых выпадках пісаць толькі *я (а)*. (Па сягодняшнім корэктыве іншае). Вядома, калі-б толькі грунтавацца на прынцыпе прастаты правапісу, ня лічачыся з існуючымі фактамі мовы, то чаму-б тады з аўтарамі проекту не згадзіцца. Але калі выходзіць з фактаў беларускай мовы, то адхіленьне Тарашкевіча мае моцную навуковую падставу. У II томе I ч. „Белорусов“ акад. Е. Карскі некалькі разоў зазначае, што пасьля націску *е* звычайна застаецца. Аднак пасьля цвёрдага *р* і шыпячых *е* (э) звычайна пераходзіць у *а*. Такім чынам: сьцел*е*, будз*е*ш, бел*е*нькі, але рэж*а*, рэж*а*ш, харош*а*нькі і г. д., як і р*а*ка, ч*а*лавек і да т. п.

Значыць, як бачым і ў гэтым адхіленьні ў правапісу Б. Тарашкевіча ніякага непаразуменьня няма.

Але ўявім сабе на мінуту, што правапіс Б. Тарашкевіча фонэтычна нявытрыманы, што ён кепскі, як яго ганіў сягодня дакладчык, і што яго трэба зрабіць фонэтычным, згодна проекту бр. Лёсікаў. Паглядзім, як конкрэтна вытрымалі свой фонэтычны прынцып яканьня аўтары проекту, як яны дапасоўваюць свой прынцып правапісу да тых форм, да якіх ён зусім не дапасоўваецца.

Тут, перш за ўсё, нашу ўвагу зварочвае запрапанаваны аўтарамі проекту канчатак *оі* (аі) для родн. скл. прыметнікаў жаночага роду адз. ліку: як*оі*, добр*аі*, усяк*аі*, сам*аі*, шост*аі* і да т. п., заместа як*ое*, добр*ае*, усяк*ае*, сам*ае*, шост*ае* ці як*ой*, добр*ай*, усяк*ай* і г. д. Нэдарэчнасьць такіх канчаткаў відаць сама сабой. У формах родн. скл. прыметнікаў адзіночнага ліку жаночага роду з качаткамі на *ое* (ае) мы маем гук *е* з асноўнага славянскага ѣ, якое, згодна высунутым прынцыпам аканьня, магло быць заменена толькі на *я* (як*оя* жанчыны, лев*ая* рукі). Але аўтары адчувалі брак такіх форм і замяняюць *ое* (ае) на *оі* (аі), канцовае *е* гэтых

форм на *i*, уводзячы, такім чынам, новую зьяву ў свой правапіс—прынцып *іканьня*, пярэчачы самім сабе і парушаючы свой фонэтычны прынцып „поўнага аканьня“, г. зн. аканьня і яканьня.

Такое-ж пярэчаньне трэба бачыць і ў замене ненаціскнога *е* на *і* ўканчатках назоўнікаў меснага склону адзіночнага ліку; напр.: у *лесі*, на *дубі*, на *masьлі*, у *ямі*. Тут таксама аўтары проекту дапускаюць *іканьне*. Не гаварочы ўжо аб тым, што такое „спрашчэньне правапісу“, як гэта добра давёў А. Багдановіч, ніякага фактычнага спрашчэньня не дае, а толькі зацямняе морфолёгічную форму слова,—яно разам з тым не зьяўляецца і фонэтычным напісаньнем. У гэтых выпадках вымаўляюцца глухія, ірацыянальныя гукі, якія больш набліжаюцца да *е*. Аўтары проекту, згодна свайму прынцыпу яканьня, мусілі-б, здавалася, глухое *е* замяніць на *я:* на *дубя*, на *масьля*, у *ямя*. Аднак, зрабіць гэтага яны не адважыліся і, парушаючы свой прынцып, застанавіліся на іканьні.

Такім чынам, мы бачым, што ў аўтараў проекту ніякага практычнага дапасаваньня іх прынцыпу аканьня (яканьня) няма.

Пераходжу да разгляду другіх пунктаў рэформы. Аўтары проекту прапануюць *й* і *ў* толькі пісаць у зачыненых складох пасьля галосных у сярэдзіне і на канцы слоў: ва*й*на, за*й*цы, мо*й*, во*ў*к, хадзі*ў*; а калі-ж гукі *і*, *у* стаяць асобна або на пачатку слова, то заўсёды пісаць складовыя *і*, *у*.

Адносна правапісу нескладовага *і* гэтае правіла, можа, і падыходзіць. Вядома не таму, што яно адпавядае нашаму вымаўленьню, а таму, што мы ня маем покуль што дакладнага правіла, і ў нас большасьць піша *і* якраз так, як гэта зафіксавалі ў сваім проекце бр. Лёсікі. Але правіла правапісу нескладовага *ў* зусім беспадстаўнае. Мовазнаўцамі даўно ўжо даведзена, што ў беларускай мове *у*, калі яно стаіць на пачатку слова, зьяўляецца рэдукаваным, абслабленым. Калі-ж гэтае рэдукаванае, аслабленае *у* стане пасьля галоснай, то яно пераходзіць у нескладовае *у* (ў): *у*дава, *у*білі, але на *ў*даве, вы *ў*білі. Ніякіх выключэньняў гэты закон у беларускай мове ня знае. І такім чынам, тыя беларускія сло-

вы з пачатковым *у*, аб якіх аўтары проекту кажуць, што ў іх ніколі няма пераходу пачатковага *у* ў *у* нескладовае (увага, угода, урад і інш.), ёсьць нішто іншае, як штучнасьць, якая можа знайсьці апраўданьне толькі ў індывідуальным вымаўленьні аўтараў проекту.

Як довад за сваё „правіла“, аўтары кажуць, што пачатковае *у* (і) у вершах можа не скарачацца. Але *ў*, як пісаў яшчэ Тарашкевіч у сваёй граматыцы, ужываецца для складнасьці мовы; складнасьць-жа мовы вершаў дасягаецца яе мернасьцю, чаму тут і могуць быць адхіленьні.

Ёсьць яшчэ адзін довад у аўтараў за сваё правіла,— гэта: „зусім непаступова і нелёгічна ніколі не скарачаць асобнага і пачатковага ў слове *і*, а заўсёды скарачаць у такіх разох гук *у*.

На гэты довад скажу, што гукі *й* і *ў* у адносінах да галоснасьці не аднолькавыя. У той час як *ў* заўсёды зьяўляецца галосным гукам, пра *й* гэтага сказаць нельга: ён можа быць і гукам зычным *(j)*.

Выключэньнем з правіла Б. Тарашкевіча аб правапісу *ў* могуць быць только тыя беларускія словы, якія маюць на пачатковым *у* націск *(уціск)*, пры якіх умовах, вядома, *у* ня можа перайсьці ў нескладовае *у*, але аб гэтым аўтары проекту нічога не гавораць.

Што-ж датыча правапісу чужаземных слоў з пачатковым *у*, то ўсё будзе залежаць ад таго, як мы ўстановім пісаць гэта пачатковае *у*: ці так, як у сваіх словах, ці з захаваньнем чужаземнага вымаўленьня. Покуль што дакладнага правіла аб гэтым няма.

Пераходжу ўрэшце да разгляду апошняга правіла проекту—правапісу літары *ь*. Аўтары прапануюць яго выкінуць: 1) паміж мяккімі падвойнымі зычнымі і 2) пасьля *з, с, ц, дз,* калі яны стаяць перад мяккімі зычнымі. Мотывуюць аўтары сваё правіла наступным: „Закон асыміляцыі гаворыць, што калі два зычныя стануць поплеч, то папярэдні прыпадабняецца да наступнага. Стала быць, і ў словах—*жыцьцё, каменьне* і інш. папярэдні зычны сам сабой будзе вымаўляцца мякка, як і наступны. Значыць, мяккі знак тут лішні“. Тады, каб быць лёгічным, трэба было-б формуляваць падставу для правапісу ненаціскнога „о“ гэтак: „Па закону аканьня кожнае

ненаціскное *о* вымаўляецца, як *а*. Значыць ненаціскное *о* патрэбна азначаць літарай *а*. Тут проста якоесьці непаразуменьне. Можна многа павыкідаць значкоў і дайсьці ўрэшце да кітайскай азбукі, але-ж гэта не заслуга азбукі. Азбука і правапіс тады добрыя, калі яны па магчымасьці азначаюць кожныя гукі, ва ўсякім выпадку характэрныя з іх. А што нашы мяккія зычныя, асабліва сьвісьцячыя, гукі характэрныя, аб гэтым і гаварыць ня прыходзіцца. Зубныя з характэрным сьвістам беларускія гукі і зубныя з характэрным шыпеньнем польскія—наагул зьяўляюцца асаблівымі сярод падобных гукаў іншых славянскіх моваў. І падобна да таго, як азначаюць гэтыя гукі на пісьме палякі, таксама патрэбна іх азначаць і нам. Тым больш, што гэтыя-ж гукі часта азначаліся і ў нашых помніках і пры традыцыйнай ортографіі: третьтии, сьнегъ, зьверъ і г. д. Іншая рэч, як азначыць гэтыя мяккія зычныя на пісьме,—мяккім знакам, ці якім іншым знакам, але гэта ўжо галіна графікі. З свайго боку лічыў-бы, што ў мэтах экономіі варта было-б у гэтых выпадках можа і выкінуць мяккі знак і пісаць мяккія зычныя з якім-небудзь надстрочным значком, тым больш што ў гэтым ёсьць і гістарычная падстава.

Вось якія зьмены аўтарам проекту хацелася-б унесьці ў наш правапіс.

Галоўным, цэнтральным пунктам проекту рэформы правапісу зьяўляецца выключэньне, выгнаньне з нашай мовы ненаціскнога *е* і замена яго праз *я* (яканьне) і *і* (іканьне). Праўда, аўтары ў апошніх строчках свайго проекту ня хочуць гэтага зразумець і пішуць толькі аб аканьні і яканьні, калі гавораць, што ў беларускай мове гукі *о, е* чуваць і пішуцца толькі пад націскам; не пад націскам чуваць і пішацца *а, я*. Аднак, як ужо вышэй гаварылася, аўтары проекту, можа несьвядома для сябе, у правапісу ненаціскнога *е* пайшлі далей Б. Тарашкевіча і дакаціліся нават да іканьня, парушыўшы гэтым свой асноўны прынцып яканьня. Такім чынам, у правапісу ненаціскнога *е* аўтары ўзялі дзьве процілеглыя крайнасьці,—гук ніжняга пад'ёму *а* (ä) і верхняга пад'ёму *і*, пераскочыўшы, такім чынам, праз гук сярэдняга пад'ёму *е*, што бязумоўна і нелёгічна і ненатуральна. Чаго-б здавалася прасьцей, пакольні ёсьць цэлае зьвяно пераходных ірацыя-

нальных гукаў, пачынаючы ад ненаціскнога *a* (ä) і канчаючы ненаціскным *i*, застанавіцца на сярэднім з іх—*e*, паколькі ён цэнтральны і мае ў мове большае пашырэньне, а ў крайнім выпадку на компромісе, што і зрабіў Б. Тарашкевіч. Аднак, аўтары проекту, выходзячы не з об'ектыўных навуковых даных, а з сваіх індывідуальна-суб'ектыўных назіраньняў, занядбалі гэтым элемэнтарным запатрабаваньнем, дзеля чаго іх проект вышаў штучны і нават непаступовы. Тут маглі быць толькі такія комбінацыі: 1) еканьне, 2) яканьне, 3) іканьне, 4) еканьне-яканьне, 5) еканьне-іканьне; 6) еканьне-яканьне-іканьне, але толькі ня яканьне-іканьне. Паколькі-ж аўтары проекту ўзялі неўласьцівую для беларускай мовы комбінацыю, то і правапіс іх вышаў штучны і да нашай мовы недапасаваны.

Нельга пры гэтым, як прапануюць аўтары, застанавіцца і на адным яканьні, бо тады-б наша мова вышла вельмі брыдкая і немілагучная. Фонэтычнасьць правапісу вымагала-б, каб такія словы, як *перавярнуць, пералажыць, сьпяваець* вымаўляліся: пяравярнуць, пяралажыць, сьпяваяць. Такога вымаўленьня я ня мог пачуць, як гэта я наглядаў, ад самых шчырых прыхільнікаў яканьня—аўтараў гэтага проекту.

Праўда, аўтары ў сваім проекце агаварваюцца, што ў нашай мове часта ня так пішацца, як вымаўляецца (хоць з гэтым адносна галосных з аўтарамі можна і не згадзіцца). Але калі гэта так, то нашто-ж тады расьпінацца за фонэтычны правапіс і так „фанатычна“, як дасьціпна выразіўся П. Бузук, за яго агітаваць.

Аб няпрыгоднасьці проекту бр. Лёсікаў выказаліся ўсе нашы тутэйшыя мовазнаўцы, знаходзячы яго ненавуковым і штучным.

Такім чынам, проект братоў Лёсікаў трэба поўнасьцю адхіліць.

Аднак з гэтага яшчэ ня сьледуе, што ў нас з правапісам усё добра. Хоць правапіс Б. Тарашкевіча ў асноўным пабудаваны і ўдала, аднак ён занадта кароткі і не абхапляе ўсіх зьяў нашай мовы. Тут некаторыя зьявы толькі закрануты, напр., правапіс пріставачных гукаў—„прыдыханьняў“, складаных слоў, чужаземных слоў і шмат інш.

Само сабай зразумела, што нельга адмаўляцца ад

рэформы і асноўных правіл правапісу Б. Тарашкевіча. Толькі гэтую рэформу трэба праводзіць сур‘ёзна і навукова. Як я ўжо вышэй зазначаў трэба наладзіць збор дыялектычнага матар‘ялу аб нашых гутарках, паверыць на аснове ранейшых вывадаў і новых даных дыялектолёгіі граніцы пашырэньня кожнай моўнай зьявы, топографічна і можа статыстычна ўлічыць кожную зьяву і ўжо тады, прымаючы пад увагу прынцыпы прастаты правапісу, яго прыгожасьці, характэрнасьці, блізасьці да жывога вымаўленьня, уносіць у правапіс тыя ці іншыя зьмены, уводзячы ня толькі яканьне і еканьне, але магчыма і іканьне.

Якойсьці камісіі ці аддзельнай асобе трэба скласьці поўны проект рэформы правапісу, дзе павінны быць выложаны ўсе яго правілы і бязумоўна ўсе тыя выпадкі, якія яшчэ сягодня здаюцца спрэчнымі. Бязумоўна варта было побач з гэтым скласьці і слоўнік правапісу ўсіх так званых „спрэчных“ слоў—як сваіх, гэтак і чужаземных.

Я асабіста пытаньнямі правапісу не займаюся і выступаю па правапісу другі раз: першы раз адносна правапісу чужаземных слоў, калі Язэп Лёсік быў супроць пашырэньня аканьня на чужаземныя словы, г. зн. супроць напісаньня ненаціскнога чужаземнага „о“ праз „а“, і цяпер, праз поўгода пасьля, калі Язэп Лёсік разам з сваім братам упаў у другую крайнасьць і праводзіць ня толькі поўнасьцю аканьне ў сваіх і чужаземных словах, а нават яканьне.

Што датыча правапісу Б. Тарашкевіча, то я наагул лічу яго здавальняючым і покуль няма нічога лепшага,— касаваць гэты правапіс не магу. Ніякага крызісу яго няма, хоць дакладчыку і хочацца тут бачыць крызіс. Калі-б тым ня менш патрэбна было ўнесьці ў яго некаторыя корэктывы, то я застанавіўся-б цяпер толькі на такіх:

1) Выкінуць *я* ў другім складзе перад націскам, незалежна ад таго, ёсьць у першым складзе „а“ (я), ці яго няма. Не гаворачы ўжо аб тым, што гэтае *я* ў другім складзе перад націскам—самая цяжкая для мэханічнасьці правапісу рэч (і наагул у нашым правапісу), яно, апрача таго, ня мае пад сабою і цьвёрдай навуковай падставы.

2) Пашырыць аканьне на чужаземныя словы згодна

выложаным мной па гэтым пытаньні прынцыпам у асобнай брошуры.

3) У мэтах мэханізацыі правапісу прыйменьнік *без* і адмоўнасьць *не,* калі яны стаяць асобна, ніколі ня пішуцца *бяз, ня.*

4) Згодна большасьці вымаўленьня словы *няма, няхай* лепш пісаць *німа, ніхай.*

У заключэньне прыводжу погляд Заходняй Беларусі на *яканьне.* Калі я ўлетку гэтага году быў у Вільні, то там мне давялося быць на нарадзе, дзе прысутнічалі: Б. Тарашкевіч, А. Луцкевіч, Я. Станкевіч, Дварчанін і інш. Зачытаўшы проект Лёсікаў, я ні ад аднаго з іх не пачуў прыхільнасьці да проекту: *усе* выказаліся супроць. Што-ж датыча Б. Тарашкевіча, то ён заявіў: калі ў мэтах прастаты трэба рэформаваць правапіс, то я лепш-бы згадзіўся *поўнасьцю выкінуць яканьне,* застанавіўшыся на *еканьні.*

Старшыня: Слова ў парадку запісу мае член Конфэрэнцыі Воўк-Левановіч.

Воўк-Левановіч. Цалком далучаюся да меркаваньняў папярэдняга дакладчыка Некрашэвіча ў тэй частцы, дзе ён гаворыць, што проекты, пакладзеныя ў аснову абгаворваньня на гэтай Конфэрэнцыі, уласна—проекты членаў Конфэрэнцыі Антона і Язэпа Лёсікаў, зьяўляюцца нераспрацаванымі грунтоўна і па сутнасьці іх выказвацца немагчыма. Апрача таго, павінен падкрэсьліць, што для таго, каб грунтоўна вырашыць пытаньне аб неабходнасьці зьмены ў існуючым беларускім правапісу, неабходна асьвятліць яго навукова, дэтальна. Што для гэтага трэба? Об'ектыўна-навуковае падрабязнае вывучэньне народных дыялектаў і старых помнікаў пісьменства, прычым гэта навуковае дасьледаваньне трэба падзяліць на часткі, разглядзеўшы паасобна кожнае асобнае пытаньне. Спробу такога монографічнага дасьледаваньня ў галіне беларускага аканьня я асабіста і даў у матар'ялах для Конфэрэнцыі. Тутака я хацеў-бы сьцісла даць навуковае асьвятленьне самага цэнтральнага пытаньня ў нашым правапісу—гэта аб галосных ненаціскных. Аб адбіцьці гэтай зьявы ў нашым правапісу я буду гаварыць, быць можа, паміж іншым.

Я хачу трохі асьвятліць гэтую зьяву як у старых помніках, так даць і фонэтычнае тлумачэньне яе, уласна: чаму

магло зьявіцца ў нас так званае „аканьне"? З агляду жывых беларускіх гутарак мы бачым, што гутаркі цэнтральнай Беларусі моцна акаюць. Межаў гэтага моцнага аканьня я ня буду праводзіць, таму што гэта зроблена ў акадэміка Карскага, праўда, толькі прыблізна, схэматычна. Адзначу, што гэтыя межы патрабуюць выпраўленьня, яны павінны перасунуцца на іншыя месцы. З маіх асабістых нагляданьняў над беларускім аканьнем у гэтым годзе я заўважыў, што, напр., дысыміляцыйнае аканьне заходзіць на поўдзень дальш, чым адзначана Карскім. Гэта сьцьвярджае проф. Бузук, кажучы, што межы дысыміляцыйнага аканьня можна правесьці інакш, чым у Карскага. Паколькі-ж гэта канчаткова ня высьветлена, дык зьяўляецца лішнім прапанаваць тутака свае межы.

Паўтараю, можна сказаць, што гутаркі цэнтральнай Беларусі, г. зн. краіны старадаўных дрыгвічоў і полацкіх крывічоў можна лічыць моцна акаючымі з рэфлексамі сярэдняга тыпу аканьня, г. зн. з *о, ы, і,* — у складох ненаціскных, слабых у адносінах да націскнога. Зразумела, такія выпадкі вымаўленьня ў паасобных словах не даюць права гаварыць аб гэтай зьяве, як аб шырака распаўсюджанай, што мае месца ў паўночна-ўсходняй Беларусі. Праўда, як я ўжо гаварыў, тып дысыміляцыйнага аканьня (пры зьяўленьні *ы, і* толькі на месцы ненаціскного асноўнага *е)* заходзіць даволі далёка на поўдзень Беларусі. Так, у Бабруйшчыне, у гутарцы майго роднага раёну, мне гэтым летам давялося адзначыць вымаўленьне „стрыляіш, прыдсядаталь, застрыхалі, прыдналох". Праўда, паколькі, за выключэньнем слова „стрыляіш" усе іншыя прыклады — словы новага культурнага паходжэньня, дык можна лічыць, што такое іх вымаўленьне магло зьявіцца ў выніку асобнай вычварнасьці, якую народ звычайна стараецца надаваць вымаўленьню мала зразумелых для яго літаратурных і чужаземных слоў. Што-ж тычыцца слова „стрыляіш", дык у ім *ы* маем на месцы асноўнага *е* пасьля зацьвярдзелага *р,* і гэты выпадак па фонэтычным паходжэньні трэба аднесьці да тых-жа тыпаў, якія мы наглядаем у сучасным дысыміляцыйным „яканьні". Дальш мы ўбачым, што сярэдняе аканьне, да якога належаць і яго дысыміляцыйныя тыпы, зьяўляецца асноўным, якое мае фонэтычнае

органічнае пахаджэньне. Што тычыцца помнікаў старой беларускай літаратурнай мовы, дык тутака мы маем прыклады аканьня даволі рэдка. Графіка нашага старога пісьма не дапушчала аканьня, так што калі мы і знаходзім прыклады яго, дык толькі як памылковае напісаньне. Зразумела, што якраз гэтыя памылкі для нас вельмі карысны, як сьведкі таго, што ў *жывой беларускай мове* старога часу аканьне бязумоўна існавала.

Наколькі-ж яно даўно зьявілася ў нашым пісьменстве, па помніках, зразумела, нельга дакладна ўстанавіць. Нашы старажытныя помнікі даюць прыклады аканьня толькі з XIV ст. Тутака павінен адзначыць, што ў кнізе В. Ластоўскага пад назваю „Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі“ (Коўна, 1926) аўтар, прысутны тутака паважаны член нашай Конфэрэнцыі, кажа аб прыкладах аканьня ў Супрасьльскім рукапісу, беларускім помніку X або пачатку XI сталецьця. Там ён зьвярнуў увагу на некаторыя прыклады, паказаныя, праўда, яшчэ Север‘янавым у яго акадэмічным выданьні гэтага помніку (1904). Гэта *а* на месцы асноўнага *е* ў канчатках некаторых займеньнікаў: неког*а,* ког*а,* каі-ег*а,* і-ег*а,* всѣког*а* і інш. Словы гэтыя не зьяўляюцца ўсё-ж прыкладамі на аканьне. Я лічу, што Супрасьльскі рукапіс мабыць пісаўся сербам, што, быць можа, Супрасьльскі манастыр быў населены сербскімі манахамі, таму што і пазьнейшыя докумэнты, як, напр., Супрасьльскі летапіс, які можна аднесьці к канцу XV або пачатку XVI ст., уласна даюць прыклады другой рысы, сербскай. Гэта заўсёдная падмена *ъ* на *ь*—рыса, характэрная для старадаўных сербскіх рукапісаў, прыблізна, ад XV веку. Гэта падмена *ъ* на *ь* надзвычайна часта пападаецца ў Супрасьльскім летапісу. Вось таму напісаньні „некога“, „і-ега“, „кога“ і да т. п. справядлівей за ўсё ня прыклады на беларускае „аканьне“, а правільная перадача сербскіх форм роднага склону займеньнікаў, якія ў сербскай мове канчаюцца на *а*. Калі-ж гэты рукапіс пісаў ня серб, дык хутчэй за ўсё — яна сьпісвалася з сербскага арыгіналу. Зразумела, гэта мая гіпотэза, якая патрабуе яшчэ, быць можа, праверкі больш дэтальным дасьледаваньнем. Дык вось мы ўстанаўляем, што аканьне, зьяўляючыся ў адзіночных напісаньнях, толькі з XIV ст., *ва ўсіх сваіх тыпах* можа быць засьведчана ў пачатку XVI ст.

Мною перабраны даволі вялікі матар'ял старажытных помнікаў, з якіх я выбраў толькі самыя тыповыя прыклады. Я мог-бы прывесьці прыкладаў шмат, але гэта не зьяўляецца неабходным.

Цяперака, азнаёміўшыся з аканьнем у сучаснай беларускай мове і ў старых беларускіх помніках, пераходжу да фонэтычнага тлумачэньня гэтай зьявы. Гістарычная навука аб мове лічыць, што зьява аканьня зьявілася ў выніку рэдукцыі (пакарачэньня колькасьці) ненаціскных галосных. З гэтым развоем ставіцца ў сувязь аканьне, што зьявілася ўсьлед за рэдукцыяй. З рэдукцыяй зьвязана таксама зьніканьне і глухіх, поўгалосных *ъ* і *ь* у ненаціскным стане.

Дакнуўшыся найменш усталяваных у ненаціскным стане галосных, якімі былі напоўкароткія (глухія) *ъ* і *ь*, рэдукцыя пацягнула за сабой іх поўнае зьніканьне. Дакнуўшыся-ж больш усталяваных — нават у ненаціскным стане — галосных шырокіх *а, о, е,* рэдукцыя не магла павесьці да іх зьніканьня, а толькі выклікала пераход іх з галосных поўнага ўтварэньня нормальна кароткіх у гукі напоўкароткія, якія мы можам азначыць тымі *ъ* і *ь*.

Антон Лёсік. Шаноўныя члены Конфэрэнцыі! Прымаючы пад увагу кароткі час для прамовы, я магу застанавіцца толькі на некаторых пунктах дакладу; але спачатку трэба сказаць некалькі слоў у адказ паважанаму члену Інбелкульту Некрашэвічу, каторы лічыць проект Лёсікаў па спрашчэньні правапісу ненавуковым, аснованым на індывідуальных і суб'ектыўных поглядах, прытым зложаным для падтрыманьня прынцыпаў правапісу. Праўда, проект аснован на фонэтычным прынцыпе, паложаным у аснову і Тарашкевічам; дзеля таго проектам і прапануецца ўвесьці некаторыя новыя правілы правапісу, але такія, якія не супярэчаць прынцыпам сучаснага правапісу Тарашкевіча, бо з яго асноўнымі прынцыпамі згаджаецца і дакладчык. Значыць, у гэтых адносінах у дакладзе ніякіх супярэчнасьцяй няма. Таго-ж, што даклад ненавуковы і аснован на індывідуальных і суб'ектыўных поглядах член Інбелкульту Некрашэвіч не даказаў, гэта значыць, яго заяўленьне не абаснавана. Апроч таго, калі т. Некрашэвіч лічыць проект Лёсікаў па спрашчэньні правапісу ненавуковым, то тым самым ён прызнае, што пра-

вапіс Тарашкевіча пабудован на навуковых падставах. Я хачу зьвярнуць увагу членаў Конфэрэнцыі на тое, з якіх падстаў выходзіў Тарашкевіч, калі ён агранічыў аканьне ў беларускім правапісу: Тарашкевіч кажа, што *доўгая практыка пісьма прымусіла яго агранічыць аканьне.* Разумеецца, практыку пісьма нельга лічыць за навуковую падставу, тым болей што ня было і аднолькавага пісьма, бо калі ня было правапісу, то пісалі парознаму. Проект Лёсікаў лічыць агранічэньне Тарашкевічам аканьня за памылку яго, і ў гэтым няма нічога ненавуковага. Можна прывесьці прыклады, з якіх відно, што была практыка пісьма і адваротная тэй, на падставе якой Тарашкевіч агранічыў аканьне. Так, у мяне ў руках выданьне 1894 г., у якім сустракаецца такі правапіс слоў: *вецяр, восянь, цяцярук* і пад. (Гомельскі пав.), што па Тарашкевічу лічыцца за няправільнае. У мяне ў руках ёсьць віленскае выданьне 1893 г. „Гутаркі Паўлюка", дзе цалком праведзена аканьне, аб якім гаворыцца ў проекце Лёсікаў. На якой-жа падставе трэба лічыць, што правапіс гэтых слоў па Тарашкевічу *(вецер, восень, цецярук* і пад.) мае навуковую падставу, а правапіс па проекце Лёсікаў *(вецяр, восянь, цяцярук* і пад.) навуковай падставы ня мае? Такой падставы няма. Такім парадкам, трэба прыйсьці да заключэньня, што калі няпрыхільнікі проекту Лёсікаў лічаць правапіс Тарашкевіча навукова абаснаваным, то ў іх няма ніякага грунту лічыць проект Лёсікаў ненавуковым, бо якраз была і такая практыка пісьменства, у якой праводзілася поўнае аканьне, што забараняе правапіс Тарашкевіча. І запраўды, чаму лічыць правапіс слоў па Тарашкевічу — *болей, далей* — навукова абаснаваным, а правапіс тых-жа слоў па проекце Лёсікаў — *боляй, даляй* — ненавуковым? Практыка пісьма пры ўкладаньні правапісу ня можа быць навуковым грунтам, і не на гэтым грунце пабудован проект увядзеньня поўнага аканьня ў проекце правапісу Лёсікаў; ён пабудован на вялікім пашырэньні аканьня на прасторах Беларусі; так, напр., запіс аднаго з выданьняў, аб якім я гаварыў вышэй, зроблен у Заходняй Беларусі, а другога — у Ўсходняй. Аб вялікім пашырэньні аканьня на Беларусі пацьвярджае і Карскі; ён гаворыць: *„Что касается общего „е" безударного, его сохранения в различных белорусских областях, то здесь наблюдается полная ана-*

логія с тем, что известно относительно „о“ безударного. Это аканье в некоторых говорах достигает высших пределов, так что эта особенность выставляется, как отличительная черта белорусских наречий. Таким образом в сильноакающих белорусских говорах „е“ безударное совершенно отсутствует...

В говорах северо-восточных с более умеренным аканьем „е“ безударное переходит в „а“ („я“). Значыць, калі прымем пад увагу, што аканьне пашырана ня толькі ў гутарках „сильноакающих“, але і ў „умеренно-акающих“, то, разумеецца, ёсьць поўная падстава гаварыць аб тым, што аканьне—звычайная зьява ў беларускіх гаворках. Характэрным фактам зьяўляюцца запісы слоў у Карскага з „умеренно-акающих“ гаворак: *цяцярук, дзяравяны, сярабро* і пад.; ёсьць запісы слоў з *я* ў трэцім складзе перад націскам: *пярэляцела.* З гэтых прыкладаў відно, што нават „умеренно-акающие“ гаворкі ўжываюць поўнае аканьне і якраз у тых выпадках, у якіх, паводле правапісу Тарашкевіча, аканьне на пісьме не дапускаецца. Праўда, побач з запісам слоў паводле поўнага аканьня, ёсьць і такія запісы слоў, якія адпавядаюць правапісу Тарашкевіча. Калі лічыць якія-небудзь з гэтых запісаў за няправільныя, то ўсё-такі памылка будзе скарэй у тых словах, у якіх запісана „безударное“ *е,* а ня *я,* бо найбольш запісаў зроблена рускімі запішчыкамі, якія маглі ўжываць расійскі правапіс замест фонэтычнага запісу. Значыць, калі запісана ў слове *я,* а ня *е (цяцярук,* а не *цецярук),* то такому запісу можна зусім давяраць.

З усяго вышэйгаворанага выходзіць, што памыляюцца тыя, хто лічыць агранічэньне аканьня ў Тарашкевіча навукова абаснаваным. Хто абараняе правапіс Тарашкевіча, той абараняе і тыя недарэчнасьці, якія ёсьць у гэтым правапісу; інакш, як недарэчнасьці, нельга назваць такое правіла (ужываньне *е* пасьля націску), з каторага сам Тарашкевіч напісаў 10 выключэньняў; запраўды-ж іх ня 10, а 14, бо ёсьць пункты, у каторых запісаны па тры розныя морфолёгічныя формы. І ніхто з абаронцаў правапісу Тарашкевіча не сказаў, якую навуковую падставу мае правіла, з якога ёсьць 14 выключэньняў. Недарэчнасьць правапісу Тарашкевіча, аб якой ідзе справа, вышла з таго, што ён агранічыў аканьне, дзеля чаго

прышлося ўвесьці штучныя правілы ўжываньня ненаціскнога *е*. Па Тарашкевічу, які ўвёў фонэтычны прынцып для напісаньня галосных, трэба пісаць: *далей, болей,* але *доляй, воляй,* хоць усе канчаткі гэтых слоў вымаўляюцца аднолькава: *даляй, боляй* як і *доляй, воляй.* Праўда, у некаторых выпадках Тарашкевіч агранічыў аканьне дзеля таго, каб адрозьніць морфолёгічныя формы, якія ў вымаўленьні не адрозьніваюцца, напр., канчаткі прыметнікаў ніякага роду—*е* (то*е*, добра*е*, пол*е*, нова*е* акно), якія ў вымаўленьні зьмешваюцца з канчаткамі жаночага роду на *я* (то*я*, добра*я*, пол*я*, нова*я* акно). Але гэты прынцып не праведзен паступова; так, у беларускім правапісу зьмешваюцца канчаткі розных форм: мы пішам—*мора, гора* (назоўны скл. ніякага роду), як і *нага, галава* (жан. роду); аднолькавыя канчаткі жаноч. і ніякага роду ў дзеясловах прошлага часу—*гаварыла, хадзіла* (яна і яно) і др.

Растаргуеў. Наша суджэньне па гэткім важным пытаньні, якім зьяўляецца пытаньне аб рэформе правапісу, бязумоўна павінна мець об'ектыўны характар. Мы прыехалі сюды з далёкіх краін, каб об'ектыўна, бесстаронна праводзіць рэформу і ніякіх закідаў аднаго супроць другога зараз не павінна быць. Пасьля гэтага ўступу, каб не затрымліваць увагі аўдыторыі, я застанаўлюся на трох пунктах. Бязумоўна, тое, што сказаў Лёсік, верна. Правапіс і аканьне ў беларускай мове па тых правілах, якія ўстаноўлены Тарашкевічам, вывучаецца надзвычайна цяжка. Па асабістым досьледзе пры выкладаньні ў працягу 6 год беларускае мовы ў Унівэрсытэце я ведаю, што гэтыя правілы надзвычайна цяжка вывучыць нават студэнтам. Вельмі цяжка навучыць яго правільна пісаць пабеларуску па правілах, якія ўстаноўлены Тарашкевічам. Няма чаго казаць ужо аб дзецях, калі даросла691 чалавеку цяжка аўладаць гэтымі правіламі. Гэта адно палажэньне. Значыцца, Лёсік вельмі добра паказаў, што гэтыя правілы ня могуць быць прыняты. З другога боку, я не магу цалком згадзіцца з тэю акалічнасьцю, каб усюды, ва ўсіх словах пісаць *я*. З гэтым ніякім чынам згадзіцца нельга. Дзе-ж на Беларусі можна пачуць *пяравярнула?* Такога вымаўленьня няма, і напісаньне *я* зьяўляецца больш недарэчным, чым тое, калі-б мы пачалі азначаць інакш. У гэтым слове ня ўсюды чутно *я*. Над гэтаю акалічнасьцю трэба падумаць, бо ўста-

навіць усюды аканьне, гэта значыць, я сказаў-бы, надаць няпрыгожую знадворную форму беларускай мове і сказіць запраўднае вымаўленьне. Вось чаму я лічу, што пытаньне аб аканьні трэба пераглядзець.

Рашуча выказваюся супроць таго, каб ня пісаць *ь* пасьля *з, с, ц, дз* у тым выпадку, калі яны стаяць перад наступным мяккім зычным і ў падвойных злучэньнях літар: *з, дз, с, ц, л, н*. Напісаньне *звер, дзвёх, мядзведзь, свет, цвет, судздзя, жыццё, ралля, чытанне* бяз *ь* будзе мецца вынікам усваеньне няправільнага вымаўленьня падобных слоў. Спасылка на іншыя мовы беспадстаўна; напрыклад, у расійскай мове мае месца мяккае вымаўленьне некаторых зычных, але пры адсутнасьці азначэньня мяккасьці пры напісаньні яна губляецца ў жывым вымаўленьні пісьменных людзей, і ў значнай большасьці даводзіцца чуць цьвёрдае вымаўленьне. Падобная небясьпека псаваньня вымаўленьня пад уплывам недакладнасьці правапісу будзе пагражаць і беларускай мове. Урэшце, калі мы адмовімся пісаць у гэтых выпадках знак мяккасьці вымаўленьня паказаных зычных, то гэта будзе супярэчыць фонэтычнаму прынцыпу, які так настойліва праводзіцца проектам рэформы. Паказаньне ў граматыках на мяккае вымаўленьне гэтых зычных ня выратуе становішча.

Рашуча выказваюся таксама супроць прапановы, якая ўносіцца проектам, каб адмовіцца пісаць *у* і *і* нескладовыя, калі яны стаяць асобна і ў пачатку слоў пасьля галоснага папярэдняга слова. Ня пісаць у гэтых выпадках *у* і *і* нескладовыя, на мой погляд, значыць сьцерці ў пісьмовай перадачы беларускае мовы адну з найбольш характэрных яе асаблівасьцяй. Бясспрэчна, правіла ўжываньня ў гэтым выпадку *у* і *і* нескладовых цяжкае, але гэта ня значыць, што яго трэба выкінуць: наша задача—пазбавіцца гэтых цяжкасьцяй і палегчыць яго вывучэньне. Падвойнасьць напісаньня *у* і *ў, і* і *й,* якая прыводзіцца ў проекце А. і Я. Лёсікаў, прадстаўляе або недакладнасьці ў перадачы гукавых зьявішч, або мае месца пры павольным вымаўленьні прыведзеных сказаў. Пры больш хуткім вымаўленьні нескладовыя *і* і *у* бязумоўна чутны. Проект рэформы прызнае, што „пры вымаўленьні будуць выпадкі скарачэньня асобных і пачатковых гукаў *і* і *у*, але дзеля „спрашчэньня пісьма“ (III, стар. 7) рэкомэндуе не азначаць

яго пры пісаньні. Наўрад, аднак, ці ёсьць неабходнасьць у гэткім напісаньні, якое патрэбна назваць штучным. Думаю, што правіла ўжываньня *i* і *y* нескладовых у пачатку слова і тых, якія стаяць асобна, выкідваць ня варта.

Мялешка. Справа рэформы нашага правапісу—надзвычайна сур'ёзная справа. Рэформа правапісу ня будзе праводзіцца кожныя пяць год, яна можа рабіцца раз у 50 або 100 год. А калі гэтая справа надзвычайна сур'ёзная, дык патрэбна рабіць надзвычайна сур'ёзныя падыходы да гэтай справы, і я зусім цалком і поўнасьцю згаджаюся з тымі асобамі, якія казалі, што патрэбна дасьледваць усе нашыя беларускія дыялекты, бо гэтыя дыялекты да апошняга часу ня зусім добра дасьледваны.

Разам з тым я павінен сказаць некалькі слоў адносна тых рэзолюцый, якія былі прыняты настаўніцтвам на Ўсебеларускай літаратурна-лінгвістычнай конфэрэнцыі пры Унівэрсытэце, што нядаўна адбылася, удзельнікам якой, між іншым, быў і я.

Настаўніцтва па дакладу т. Лёсіка вынесла гэткую рэзолюцыю: патрэбна правесьці поўнае аканьне і яканьне, далей патрэбна правесьці фонэтычнае напісаньне зычных у сярэдзіне слова, напрыклад: слова „казка“ пісаць праз *с*, „просьба“ праз *з* і г. д., а ў канцы слоў напісаньне зычных—этымолёгічнае: „боб“ праз *б*, „воз“ праз *з*—адным словам так, як гэта было і да гэтага часу. Чаму гэтая рэзолюцыя прынята настаўніцтвам? Гэткая рэзолюцыя, на мой погляд, прынята таму, што 90% настаўніцтва, якое прысутнічала на гэтай конфэрэнцыі, нядобра было падрыхтавана да гэтага пытаньня; апрача дакладу Лёсіка, нічога больш ня чытала, бо ўвагі і погляды іншых аўтараў ня былі яшчэ надрукаваны, і наогул гэтае пытаньне ня было яшчэ досыць абдумана. Бязумоўна, на гэтай конфэрэнцыі былі і ворагі гэтай рэзолюцыі.

Калі гэтае пытаньне больш-менш ужо распрацавана, калі па гэтым пытаньні маецца некалькі поглядаў розных прадстаўнікоў навукі, прычым дыямэтральна процілеглых, то на аснове гэтых поглядаў можа і само настаўніцтва абдумае і прааналізуе ўсе гэтыя пытаньні і пярэйдзе на іншы пункт погляду. Я лічу, што рэзолюцыя настаўніцтва, бязумоўна, была складзена сьпешна, і настаўніцтва тут дапусьціла бязумоўную памылку.

Возьмем, напрыклад, наша так званае *у* доўгае і *у* кароткае. Да гэтага часу мы пісалі *у* ў пачатку слова пасьля галоснага гуку. Я лічу, што гэтую асаблівасьць трэба захаваць, бо дзецям надта лёгка будзе пісаць *у* нескладовае.

Далей у нашым правапісу было адзначана такое правіла аб прыдыханьні: *дом быў у вагні*, бо ў даным выпадку перад *а* стаіць складовае *у*, але калі папярэдняе слова канчаецца на *ў*, у такім прыкладзе, як *на лузе гарэў агонь*, прыдыханьне не патрэбна. Гэтае правіла цяжкае, і яго патрэбна выкінуць, бо яно ня мае ніякае навуковае падставы. Я лічу, што ў гэтых выпадках ніякага прыдыханьня ставіць не патрэбна, незалежна ад таго, што стаіць: *у* складовае або *у* нескладовае. Перад словам, якое пачынаецца галосным *а*, тады заміж *у Азіі* будзе *у Вазіі*, заміж *на Узьдзе—на Вузьдзе*.

Што датыча *і* нескладовага, то бязумоўна, калі *і* нескладовае зьяўляецца злучнікам, тады трэба пісаць *і* складовае. Гэта адзначыў і т. Лёсік у сваёй прадмове да трэйцяга выданьня правапісу, але ў адпаведных практыкаваньнях на гэтае правіла т. Лёсік піша пастарому, г. зн. злучнікам побач з *і* зьяўляецца *й*.

Правіла адносна напісаньня мяккага знаку пасьля *з, с, ц* і *дз*, калі яны стаяць перад мяккімі зычнымі не гартаннымі, трэба пакінуць з прычыны таго, што яно зьяўляецца даволі лёгкім і для дзяцей ніякае няясьнасці і туманнасьці ў гэтым правіле, фактычна кажучы, няма.

Аб правапісу літары *е*. Гэтае правіла вельмі цяжкае, асабліва для дзяцей. Яго патрэбна бязумоўна рэфармаваць. Я згодзен з тымі паважанымі грамадзянамі, якія адзначылі, што *я* трэба пісаць у першым складзе перад націскам: *вяду, нясу*, а ў другім складзе пісаць літару *е*, незалежна ад таго, ці маецца ў першым складзе перад націскам *а, я*, ці зусім няма; напрыклад, слова *непрыхільна* будзем пісаць праз *е*. Гэтае правіла і для дзяцей і для працоўных мас будзе надта лёгкае. Лёсік сказаў, што ў правапісу Тарашкевіча ёсьць нявытрыманасьць, так, напрыклад, у правіле аб напісаньні *е* пасьля націску ёсьць выключэньні, г. зн., што тыя словы, якія маюць у корані або ў канчатку *я*, захоўваюць апошняе і пасьля націску, але выключэньняў гэтых прыводзіцца 10, тады як фактычна іх налічваецца 14.

Мы ведаем, што Тарашкевіч ня меў часу даць належных комэнтарый правілам, а таксама прывесьці поўнасьцю ўсе прыклады. Калі напісана 10 прыкладаў, то мы дапоўнім прыкладамі і дамо адпаведныя комэнтарыі правапісу Тарашкевіча. Дзякуючы гэтаму, ніякае няяснасьці ў гэтым правіле ня будзе.

Такім чынам, я зьяўляюся ворагам *яканьня*, якое прапануецца Лёсікам, і стаю за *еканьне*. Пры *еканьні* мы захоўваем эстэтычны бок нашае мовы, яе мэлёдычнасьць, элястычнасьць, у той час як пры *яканьні*, напрыклад, *пяравярнуць, вярацяно*, будзе даволі брыдкая вымова, будзе аддаваць якімсьці дысонансам, чаго, фактычна кажучы, няма ў жывой беларускай народнай мове.

Цяпер аб аканьні ў чужаземных словах. Мы такое правіла, якое прапануюць Лёсік і Тарашкевіч, прыняць ня можам. Мы павінны пашырыць аканьне і на чужаземныя словы. Напрыклад, калі кажам, што чужаземныя словы, якія дайшлі да шырокіх народных мас, мы пішам згодна нашага аканьня, а тыя, што ўжываюцца ў літаратурнай мове, пішам так, як было запазычна,—вельмі цяжка адрозьніць, якія з чужаземных слоў дайшлі да народу і якія не дайшлі. Затым, мы ведаем, што масы растуць і культурнае разьвіцьцё іх падымаецца, ліквідуецца няпісьменнасьць, лексыка мас узбагачваецца новымі чужаземнымі словамі. Калі будзе складзены слоўнік чужаземных слоў, якія ўжываюцца масамі і ўжываюцца ў літаратурнай мове, то будзе недагаворанасьць, патрэбна будзе кожны год пераглядаць слоўнік. Напрыклад, калі возьмем слова *коопэратыў*, то раней яно ня ўсім працоўным было вядома, а цяпер, з пашырэньнем коопэрацыі, гэтае слова ўсюды вядома. Возьмем словы *рэволюцыя, комуністы*. Яны да рэволюцыі ня былі вядомы народным масам, але цяпер пасьля рэволюцыі сталі выдомымі. Значыцца, чужаземныя словы паступова з літаратурнае мовы будуць пераходзіць у слоўнік працоўных мас.

Такім чынам, мы павінны пашырыць аканьне на напісаньне чужаземных слоў. Гэта будзе надта практычна і добра для вучняў і асабліва для малапісьменных грамадзян, якім цяжка разьбірацца ў тым, якое чужаземнае слова, а якое не.

Значыць, мы павінны пашырыць аканьне і на чужаземныя словы.

Адносна *ь* паміж падвойнымі мяккімі зычнымі: *гальлё, насеньне.* Мне здаецца, што мяккі знак патрэбна заставіць. Дзеці добра адчуваюць яго і не памыляюцца. Навошта яго тады выкідаць? Гэта ёсьць асаблівасьць нашай мовы і гэтую асаблівасьць бязумоўна трэба заставіць. Паўтараю, да рэформы трэба падыходзіць бязумоўна асьцярожна і разам з тым падкрэсьліваю, што калі рэформа будзе зроблена часткова, то патрэбна будзе зьвярнуцца да адпаведных органаў аб выданьні правапіснага слоўніка і справачніка для масавых школ. У расійскай мове гэта ёсьць. Была-б надта вялікая карысьць ад выданьня табліцы; дзеці тады ня будуць блытацца, вывучэньне пойдзе больш пасьпешна, чым да гэтага часу.

Бузук. Я пачну з больш вострага пытаньня адносна аканьня. Я не хацеў-бы паўтарацца тут, а хачу дапоўніць тое, што сказана ў маім артыкуле, для таго, каб узмацніць тыя аргумэнты, якія тут высоўваліся. Вось што кажа Карскі аб аканьні: „Граніца дысыміляцыйнага аканьня захоплівае паўночную частку моцнага аканьня. Гэта тое-ж самае аканьне, толькі ў складзе перад *а* зьмяняецца характар галосных“. Дазволю сабе напомніць аб тым, што я казаў адносна характэрнасьці дысыміляцыйнага аканьня і яканьня. Я адзначыў у сваім дакладзе, што якраз Дурново лічыць дысыміляцыйнае аканьне характэрным для беларускае мовы. Дык папрабуем-жа хоць трошкі выявіць гэтую асаблівасьць беларускай мовы. Я думаю, што гэта даўно ўжо зрабілі нашыя беларускія пісьменьнікі. Возьмем Якуба Коласа,—яго выданьні напісаны ў розныя гады ў розных мясцох (12, 13, 17 г.г., у Ленінградзе, Менску, Вільні). Я знайшоў і ў першым складзе перад складам з націскам *а* заўсёды замест *а—е.* Значыць, будзе *беда, сьпевай* і г. д. Проф. Растаргуеў паказаў, што тут сярэдні гук паміж *э* і *е.* Я скажу, што ў гутарках знаходзіцца больш вузкі гук— сярэдні паміж *е* і *і.* Лёсік казаў адносна цяжкасьці правіла Тарашкевіча, але калі мы, перанясучы яго (Тарашкевіча) правіла, пакажам гэтую дысыміляцыйнасьць і ў першым складзе перад націскам, тады бязумоўна палегчыцца мэтод вывучэньня. Школьныя задачы бязумоўна трэба прыняць пад увагу. Можа скажуць, што памянёная асаблівасьць не належыць Коласу, а рэдактару, але я паказаў, што яна адбіваецца ў кніжках, якія

напісаны ў розных мясцох і ў розныя гады. Але калі-б нават зрабіў гэта рэдактар, тады варта сказаць, што ён быў добрым мовазнаўцаю. Я думаю, што на гэтую зьяву трэба зьвярнуць увагу; і яна ня надта будзе адрозьнівацца ад таго, што прапануе Лёсік. Янка Купала, другі пісьменьнік, жыў каля Лысай гары, потым у Барысаўшчыне, якая таксама знаходзіцца ў паласе дысыміляцыйнага аканьня і яканьня. Трэці выдатны наш пісьменьнік Цішка Гартны з Капыля Слуцкае акругі. Параўнаўча недалёка ад гэтага мястэчка знаходзяцца тыя мясцовасьці, ад якіх надта дакладныя запісы дадзены ў зборніку Сяржпутоўскага. У яго зборніку мы зусім не знаходзім яканьня.

Тут трэба сказаць, што аканьне і яканьне—не роўналежныя процэсы.

Розьніца фонэтыкі паміж *а* і *о* меншая, чымся між *е* і *а*.

Я думаю, што і ў расійскай мове *я* вымаўляецца, як *а* (з мяккасьцю папярэднага зычнага), а зн. гук нізкі пярэдняга раду.

Далей я павінен сказаць, што я разыходжуся з некаторымі опонэнтамі, згаджаючыся, што магчыма выкінуць мяккі знак; мой замер мае і фонэтычную падставу. Возьмем слова *вось* і *сьпявай*. У першым *с* мяккае, у другім слове *с* паўмяккае. Я думаю, што слова *сьпявай* магчыма пісаць і бяз мяккага знаку. Гэта палегчыць правапіс, калі мы будзем пісаць бяз мяккага знаку; ад вымаўленьня—ж гэта не далей, чым напісаньне з мяккім знакам. Апрача таго, мы ведаем, што ўкраінцы ня пішуць мяккага знаку. Апошняе дае нам магчымасьць думаць, што гэта ня так цяжка.

Адносна фонэтычных прынцыпаў правапісу зычных я думаю, што сербы нам далі прыклад не баяцца гэтага прыцыпу.

Самымі слабымі пунктамі ў проекце Лёсіка зьяўляецца аканьне і яканьне. Яшчэ слабое месца ў гэтым проекце. Лёсік не адрозьнівае вымаўленьня ў адчыненых і зачыненых складох: калі магчыма пісаць *будзя* (3 асоба, дзеяслоў), *поля* (адзіночн. лік), то, з другога боку, нельга пісаць *будзяш, будзям*.

Бязумоўна, калі Лёсік хоча правесьці фонэтычны прынцып, тады ён зусім надарэмна прапануе не адзначаць у па-

чатку слоў наступную характэрную асабліўасьць беларускае мовы—зьмену *у* і *і* ў нескладовыя гукі.

Я прыхільнік таго, каб ня толькі пісаць *у* нескладовае ў пачатку слоў, але нават *й:* украінцы даюць прыклад, што гэта ня так страшна.

Пасьля гэтых агульных заўваг я хацеў-бы ўспомніць аб тым, што па словах Лёсіка яго падтрымліваюць украінцы. Учора я атрымаў ліст ад проф. Е. Тімчэнкі, у якім ён, між іншым, піша, што ня можа згадзіцца з некаторымі пунктамі т. Лёсіка, але я тут хацеў-бы ўспомніць іншае месца ў гэтым лісьце. Проф. Тімчэнка піша, што справа ўстанаўленьня правапісу зьяўляецца справай самой нацыі. Я думаю, кажа, што гэта пытаньне лепш за ўсё вырашаць самі беларусы. Трэба кіравацца тым, што самі беларусы жадаюць сказаць адносна рэформы.

ПРАВАПІСНАЯ КАМІСІЯ.

(Старшыня *Езавітаў;* нам старшыні: *Німчынаў і Чаржынскі;* сэкратары: *Мялешка і Самковіч).*

Працяг спрэчак аб правапісу.

Старшыня: Слова ў парадку запісу мае доц. Німчынаў.

Німчынаў. Калі тутака абгаворваліся асноўныя прапозыцыі тав. Лёсіка пра аканьне і яканьне ў беларускім правапісу, дык, на мой погляд, тутака выстаўляліся неадпаведныя аргумэнты. Аргумэнтаваць сучасны правапіс трэба, выходзячы з сучасных зьяў беларускай мовы і яе географіі. Калі тутака займаліся высока-спэцыяльнымі пытаньнямі аб тым, якое аканьне было ў старых рукапісах, напрыклад, у Супрасьльскай, што ўсходзіць да X—XI сталецьцяў, дык, на мой погляд, гэта была неадпаведная аргумэнтацыя. Кожны з беларусаў, які ўжывае беларускую мову, ня ведае тых процэсаў, што прывялі да сучаснага аканьня, і як яно разьвівалася. Лепш аргумэнтаваць ад сучаснага стану гэтай зьявы і географіі беларускіх гутарак. Вядома, што ў беларускай мове ёсьць такія тыпы аканьня і яканьня, як дысыміляцыйнае жыздрынскага і суздальскага тыпаў і моцнае. Але я лічу, што нам зусім ня трэба гаварыць аб гэтых тыпах аканьня. Ёсьць, як мы ведаем, больш моцныя тыпы аканьня, якія маюць месца ў паўднёва-заходняй тэрыторыі.

Калі гавораць аб правапісу і аб тым, што правапіс мусіць адбіваць фонэтычны склад беларускай мовы, дык перш-на-перш трэба мець на ўвазе, што гэта азначае тое, што беларуская мова ў сваіх рэпрэзэнтантах мае вельмі шмат розных тыпаў аканьня і яканьня. Ёсьць фактычныя конкрэтныя гутаркі з дысыміляцыйным яканьнем жыздрынскага і суздальскага тыпаў, ёсьць гутаркі пераходныя і з моцным аканьнем і, апрача таго, ёсьць гутарка беларускай інтэлігенцыі, якая жыве ў Менску. Дык вось, які-б тып аканьня мы ні ўзялі за аснову, мы не дамо агульнага фонэтычнага правапісу для ўсяе Беларусі, таму што калі мы возьмем за прынцып аканьне дысыміляцыйнае, дык, значыць, мы будзем ісьці супроць фонэтыкі паўднёва-заходняй гутаркі. Разам з тым, калі мы будзем гаварыць у даным выпадку аб аднастайным правапісу рэфлексаў *a* і *e* старой беларускай мовы, дык, як відаць, для вядомых гутарак будзе не фонэтычны прынцып, а, я-б сказаў, ідэографіі, бо ўсё роўна, ці возьмем мы за аснову моцнае аканьне, ці тып дысыміляцыйнага, дык для іншых гутарак тутака будзе напісаньне нефонэтычнае.

І вось у такіх выпадках нам трэба зьвярнуць увагу на наступны момант — функцый сучаснай літаратурнай мовы. Сучасная літаратурная мова мае сваім заданьнем консолідаваць, яднаць усё насяленьне, усіх прадстаўнікоў гутарак данай моўнай групы. Напрыклад, возьмем расійскую літаратурную мову: тамака таксама ёсьць аканьне і таксама ёсьць тып дысыміляцыйнага аканьня. Расійскі літаратурны правапіс не азначае гэтага аканьня, і гэта вельмі добра, затым што дае магчымасьць консолідаваць усе гутаркі расійскай мовы па акрэсьленай літаратурнай норме, якая выяўляецца напісаньнем літары *o* заместа ўсякіх яе адценьняў. Гэта магчыма і для беларускай літаратурнай мовы; калі заўважыць, што галоўным заданьнем беларускай літаратурнай мовы ёсьць консолідацыя беларускіх гутарак, дык і ў перадачы аканьня прыдзецца гаварыць пра якісь компроміс. Які-ж тутака можа быць компроміс? Компроміс такі, які-б быў найлёгкім для ўсіх прадстаўнікоў беларускіх гутарак. Фонэтычнага компромісу, як відаць, ня можа быць, і тутака, значыць, выступае якісь мэханічны прынцып. З гэтага пункту погляду я-б абараняў пропозыцыю тав. Лёсіка, таму што ён дае вельмі

просты спосаб запісваць тое, што ў розных гутарках беларускай мовы вымаўляецца розна.

Такім чынам, паўтараю, што прынцып Лёсіка цалком просты, і я думаю, як прынцып, прапанаваны для беларускай літаратурнай мовы, цалком можа быць прыняты, таму што ён гаворыць за сябе ўласна сваёй прастатой. Калі-ж мы будзем зварочваць увагу на ўсе адценьні, усе тыпы беларускага аканьня, дык правесьці компромісную норму будзе вельмі цяжка. Выяўляць гісторыю беларускага аканьня і яго тыпы— гэта заданьне беларускай дыялектолёгіі, а заданьне літаратурнай правапіснай нормы—гэта нормаваць найпрасьцейшым спосабам беларускія выпадкі ідэографічнага пісьма. І ў даным выпадку пропозыцыя тав. Лёсіка, на мой погляд, мае ўсе падставы.

Пераходжу да другіх пропозыцый тав. Лёсіка. Трэба разглядзець пытаньне аб *ь* паміж дзьвюма зычнымі. Прыходзіцца прызнаць пропозыцыю тав. Лёсіка рацыянальнай. Калі гаварылася супроць гэтай пропозыцыі, дык прыводзіліся меркаваньні, што правапіс можа выклікаць няправільнае вымаўленьне адпаведнага гуку. Маю на ўвазе тутака толькі выпадкі з доўгім мяккім зычным тыпу *пытаньне*. Але тутака не зьвярнулі ўвагі на вымаўленьне фонэмы доўгага мяккага гуку. Гэта-ж ёсьць адзін артыкуляцыйны член з адным укладам органаў вымаўленьня за ўвесь вымоўны час.

Вось, здаецца, дзьве галоўныя пропозыцыі, якія, з майго пункту гледжаньня, дапасаваны да беларускай літаратурнай мовы, што становіцца цяперака фактарам консолідацыі беларускіх гутарак.

Бялькевіч. Лёсік у пачатку свайго дакладу сказаў: „Патрэбна, каб закон правапісу быў жыцьцёвым". Зусім правільна, я з гэтым згодзен, закон павінен быць жыцьцёвым. Але заразжа пасьля гэтага было сказана, што трэба гэты правапіс зрабіць больш фонэтычным. Мне здаецца, што гэтыя два палажэньні супярэчаць адно другому: устанаўленьне цьвёрдага закону— гэта адно, а прыстасаваньне фонэтыкі — гэта другое. Калі ўжываць поўнае фонэтычнае напісаньне як для галосных, так і для зычных, дык, на мой погляд, гэта будзе ўжо не законам, а свавольствам. Бо ніхто ня мае права прымусіць пісаць адну частку нашай Беларусі так, а другую інакш: напрыклад,

у адным месцы слова пішацца з яканьнем, а ў другім з іканьнем і г. д. І калі ўжываем фонэтычны прынцып для напісаньня ўсіх значкоў, дык тым самым узаконьваем сваволье напісаньня. З гэтае прычыны мне здаецца, што поўнага фонэтычнага прынцыпу напісаньня ня можа быць.

Далей, адносна зычных. Лёсік гаворыць, што, калі мы кажам *казьба* або *прозьба,* дык трэба так і пісаць, таму што тутака ясна чуваць *з.* Калі так напішам, дык зьменіцца не адно значэньне вымаўленьня, але ў некаторых выпадках і значэньне слова, і, мне думаецца, стаць на гэты шлях ня прыдзецца. Трэба прыняць такое правіла, якое-б запраўды стала законам.

Я згодзен з Лёсікам адносна аканьня ў тэй меры, у якой ён сказаў у сваім дакладзе. Лёсік сказаў, што можна было-б напісаць *а* і *я* заўсёды, але скончыў так: „Але я згаджаюся з тым, каб толькі ў першым складзе перад націскам было *а* або *я,* а ў іншых—*е.* Я з гэтым згодзен, і вось чаму: калі-б мы ўстанавілі такі правапіс, мы гэтым-бы ўнесьлі яснасьць у формулёўку правіла пры выкладаньні яго дзецям у школе. Тады можна з матэматычнай дакладнасьцю тлумачыць, што вось калі ў вас перад націскам ёсьць знак *а* або *я,* дык трэба яго пісаць, а ў далейшых выпадках—усё роўна, ёсьць ён ці няма яго—трэба пісаць *е.* З гэтым я, паўтараю, цалком згодзен з Лёсікам, падтрымліваю яго і лічу, што гэта будзе рацыянальна.

З тэю часткаю проекту Лёсіка, дзе ён гаворыць аб увядзеньні *я* пасьля націску, я згадзіцца не магу, таму што, на мой погляд, яна нявытрымана. Праўда, тутака прыводзіліся такія прыклады, што мы адступаем ад правіл Тарашкевіча, што Тарашкевіч дрэнна іх растлумачыў, і што ў яго ёсьць некаторыя выключэньні з правіла, як, напрыклад: *далей, болей, доляй, воляй.* Аднак, мне здаецца, што тутака блытаюць два паняцьці. *Доляй* і *воляй*—гэта ёсьць творны склон ад *доля воля,* і, мне здаецца, што гэта не адносіцца да правапісу. Гэта—зьява морфолёгічнага характару. А таму гэтыя два разуменьні я-б хацеў разьмежаваць. Што-ж тычыцца *е* пасьля націску, дык, мне здаецца, было-б добра, каб у першым складзе пасьля націску пісалася *е,* як і цяпер. Праўда, ёсьць выключэньні, як *заяц* і *пояс,* але гэтыя словы не нале-

жаць да аканьня: тутака *я* карэннае, і тутака прынцып будзе вытрыманы. Такім чынам, мы правядзем хоць і няпоўнае аканьне, але затое ўпарадкуем наш правапіс.

Што тычыцца мяккага знаку, дык я ня зусім згодзен з Лёсікам і з паважаным доц. Німчынавым, калі яны кажуць, што мяккі знак паміж зычнымі трэба выкінуць і што ад гэтага ня зьменіцца прырода зычных гукаў. Праўда, у ўкраінскай мове, калі мы возьмем такое слова, як *життя*—першае *т* не такое, як апошняе—у ім больш цьвёрдасьці, чым у апошнім гуку *т*. Калі я прыслухоўваўся да прамовы Німчынава, дык у яго вымаўленьні дзьве зычныя (на месцы зычны+j+галосны) заўсёды вымаўляюцца неаднолькава: першы зычны цьвярдзей за апошні. Але ня так у нас.

Калі мы выкінем *ь* паміж *л* і *м*, дык ніяк нельга будзе вытлумачыць дзіцяці, як чытаць *н, л:* яно заўсёды будзе чытаць літару *н* бяз мяккага знаку цьвёрда, а *н* з мяккім знакам мякка. Апрача таго, трэба зьвярнуць увагу на тую акалічнасьць, што нашы школы ня зусім яшчэ перайшлі на беларускую мову, што ў іх уведзена расійская мова, як абавязковы прадмет; у нашых школах ашчэ больш кніг на расійскай мове, чым на беларускай. Дзеля гэтага выключэньне мяккага знаку будзе вялікаю перашкодаю для правільнага вымаўленьня: у расійцаў *н* бяз мяккага знаку вымаўляецца цьвёрда; значыць, вучні і ў беларускім напісу *н* будуць чытаць цьвёрда. І ўрэшце, што можа ад гэтага стацца? Можа страціцца мяккасьць зычных; тое самае адносіцца да літары *л*.

Таксама нельга выкінуць *ь* пасьля *з, ц, с,* калі яны стаяць перад мяккімі зычнымі. Мне здаецца, што з гэтым нельга згадзіцца, таму што гукі з, *ц, с* па прыродзе тут мяккія. Калі дзеці пачынаюць вучыцца пісаць, і вы загадаеце ім напісаць словы *сьнег, зьвер,* дзеці ніколі не напішуць цьвёрда, а заўсёды з мяккім знакам. Я гэта кажу з практыкі. Я зрабіў шмат і пераканаўся ў тым, што гукі *з, ц, с* больш мякка азначаюцца ў псыхіцы дзяцей, чым іншыя гукі. Гэта паказвае, што мяккі знак выкінуць нельга. Дзеці ніколі ня робяць гэтай памылкі—яны ніколі не прапушчаюць мяккага знаку пасьля літар *з, ц, с.* Такім чынам, я стаю за тое, каб мяккага знаку ня выкідваць з нашага правапісу паміж падвойнымі зычнымі, таму што ад гэтага страціцца асаблівасьць беларускай мовы.

Ніхто з прамоўцаў ніводнага слова не сказаў аб прыназоўніку *у*. Бываюць такія злучэньні, калі вельмі цяжка выгаварыць гэтае *у*, напрыклад: „я вучыўся ў унівэрсытэце“. Для таго, каб гэта выгаварываць, трэба прыпыніць голас і зрабіць націск, што абцяжарвае нашу гутарку. Было-б добра ўвесьці некаторае сталае правіла. У некаторых выданьнях у такіх выпадках раней пісалі замест *у*—*ва*. Цяпераха гэтага ўнікаюць, але, я мысьлю, што трэба было-б пагаварыць і ўзаконіць гэтае самае *ва*. Тады можна сказаць: „Я быў ва унівэрсытэце“.

Што тычыцца нескладовых *у* і *і*, дык мне здаецца, што правіла Тарашкевіча трэба прыняць з тэю папраўкаю, якая павінна быць унесена ў напісаньне гэтых літар. Калі *ў* і *й* стаяць пасьля галосных перад зычнаю—пішуцца нескладовымі, аднак, трэба было-б узаконіць наступную папраўку: „і калі над імі няма націску“, бо калі над імі стане націск, дык гэтым самым яны становяцца складовымі.

Другая справа—адносна канчатку роднага склону. У нас родны склон мае канчатак, які зьяўляецца вялікім непаразуменьнем. У нас ёсьць такое правіла, што прадметы разумовыя і зборныя ў родным склоне маюць канчатак *у, ю*, а прадметы рэальныя, аднастайныя маюць—*а, я*. Але вельмі цяжка высьветліць, дзе тутака рэальныя, а дзе разумовыя прадметы, напрыклад, *стол* у родным склоне мае канчатак *а, лес*—канчатак *у*. З гэтым яшчэ можна згадзіцца, таму што лес прадстаўляе прадмет зборны, але, калі мы скажам *год, месяц, дзень*, дык мне здаецца, што яны азначаюць адзін час, але тым ня менш, слова *год* мае ў родным склоне канчатак *у*—*дзень—дня, месяц—месяцу*. Мне здаецца, што аб гэтым трэба пагаварыць і ўвесьці некаторую аднастайнасьць—пісаць у родным склоне або *а* або *у*.

Вось усе галоўныя моманты, на якія я хацеў-бы зьвярнуць увагу.

Воўк-Левановіч. Тав. Німчынаў адзначыў, што пры абгаварэньні пытаньняў правапісу зусім ня варта рабіць экскурсу ў галіну гісторыі тэй або іншай зьявы. Мне здаецца, што гэта цалком памылковы погляд: хоць і прыблізна, але грунтавацца на фонэтыцы неабходна і адкідаць фонэтычнае тлумачэньне тае ці іншае зьявы пры ўстанаўленьні таго ці іншага правіла—мне здаеццца няправільным. З гэтай прычыны я і

адзначыў у сваім слове на пленуме Конфэрэнцыі, што перш, чым абгаворваць якое-б то ні было пытаньне правапісу, трэба ўгрунтаваць гэта пытаньне на навукова-лінгвістычнай аснове, і ўжо потым толькі рабіць разьлікі, паколькі практычна магчыма тую або іншую зьяву замацаваць у правапісу. Але бязумоўна, заданьнем правапісу зьяўляецца выяўленьне нашай фонэтыкі, фонэтыкі нашай роднай мовы, як мовы сваеасаблівай. Бо правапіс ня ёсьць штось бязгрунтоўнае, але абапіраецца на тым ці іншым характары мовы. Выходзячы з гэтага пункту погляду, я лічыў-бы, што высьветліць фонэтычныя ўмовы аканьня неабходна. Тады ня будзе такіх зьяў, якія мне прышлося чуць, між іншым, ад паважанага члена Конфэрэнцыі Антона Лёсіка, які, опонуючы мне (ён успамінаў і мяне ў сваім слове), сказаў, што няма ненаціскнога *е* ў беларускай мове, што яго наогул ніхто ніколі ня чуе. Гэта зусім няправільна. Тутака ўжо адзначалася, што якраз Лёсік у сваім проекце грунтуецца на народных гутарках. Перш за ўсё трэба адзначыць, што мы ня можам грунтавацца выключна на народным вымаўленьні (я згодзен з Німчынавым — што на народнай гутарцы нельга грунтавацца), якое выяўляе сабою мора без берагоў: кожная вёска мае сваё вымаўленьне, і мне прыходзілася наглядаць дзьве разьмешчаныя побач вёскі, прычым у аднэй вёсцы моцна акаюць і якаюць, а ў другой— аканьне моцнае, а яканьне слабое. Мне гэта прышлося наглядаць у сваім родным павеце (Бабруйскім). А таму, калі грунтавацца на народных гутарках, чаго ў нас ніколі ня можна будзе ўзгодніць у правапісу, тады будуць бясконцыя спрэчкі, і такія спрэчкі тым шкодны, што яны ніколі не прывядуць да якіх-небудзь вынікаў.

Значыць, у аснову літаратурнага правапісу бязумоўна неабходна класьці не народнае вымаўленьне, а літаратурнае. І тутака я настойваю на тым, што ў нас літаратурнае вымаўленьне ўжо ёсьць, яно існуе, як факт.

Мне вельмі шкода, што нашы опонэнты (я кажу „нашы", паколькі я далучаюся цалком да думкі т. Некрашэвіча, Бузука і некаторых іншых, з якімі мы консолідуемся ў гэтым пытаньні), паўтараю, мне вельмі шкода, што нашы опонэнты не далі сабе працы разглядзець нашы меркаваньні ў нашых артыкулах, якія мы далі ў якасьці матар'ялу да Конфэрэн-

цыі. Там вельмі ясна, напрыклад, я выказваю свае погляды, і опонэнтам належала-б выходзіць з тых матар'ялаў, якія ёсьць у распараджэньні Конфэрэнцыі, а не распаўсюджвацца ў меркаваньнях, што не абапіраюцца на той або іншы матар'ял, які мы маем. Трэба ўзяць думку таго ці іншага опонэнта і пастарацца давесьці яе няправільнасьць; пакольки-ж гэтая думка абаснавана фактамі—трэба такімі-ж фактамі давесьці адваротнае, чаго я, на жаль, не заўважыў у прамове Антона Лёсіка.

Перш-на-перш А. Лёсік і Я. Лёсік кажуць, што ў нас няма ненаціскнога *е*, а ўсюды чутно толькі моцнае *яканьне*. Гэта фонэтычна ня так. Тыя прыклады, якія цытаваў Лёсік, зьяўляюцца выхапленымі з цэлай масы прыкладаў, прыведзеных Карскім. Чаму ня прымаюцца пад увагу супроцьлеглыя прыклады—не разумею. Ня буду прыводзіць гэтага фактычнага матар'ялу, таму што ён у мяне прыведзены ў аднэй асноўнай брошуры „Беларускае аканьне", якая, мне здаецца, поўна асьвятляе пытаньне з усіх бакоў, і ў другой маленькай брошуры: „Да пытаньня аб аканьні ў беларускім правапісу", якая даступна для кожнага, нават неспэцыяліста.

Цяперака аб літаратурным вымаўленьні. Я сьведчу, што яно існуе і зусім ня ў тым відзе, як гэта ўяўляюць Антон Лёсік і Язэп Лёсік. Я знарок зрабіў экспэрымэнт, паставіўшы сабе заданьне запісваць прыклады кожнага прамоўцы, які тутака выступае, на яканьне, і вось што я заўважыў. Т. Мялешка, напр., вымаўляе так: *безумоўна, будзе, пішыцца, нікаторыя, прадмове, не гортаннымі, пішэм, рэформаваць, незалежна, у правапісе, для дзяцей, не ўжываецца.* Дзе-ж тутака моцнае яканьне? Яго няма. Т. Бялькевіч кажа: *гэтаго, палажэньні*—наз. множн. ліку (не палажэньня), *гэто напісаньне,* (і разам з гэтым: *будзя), у праве, скажэм, нейкае, невытрыманасьць, нідобра, не можа, кажэм, чуецца, значэньне, не прыдзецца, у складзе*—тутака таксама нідзе няма моцнага яканьня. Я думаю, што калі я пасяджу да канца нашага пасяджэньня або Конфэрэнцыі, дык я зраблю спробу літаратурнага вымаўленьня ўсіх членаў Конфэрэнцыі; я паставіў сабе гэтую мэту і, мне здаецца, што мы тады перакаемся, што калі і ёсьць моцнае яканьне, дык, быць можа, толькі ў Язэпа Лёсіка і Антона Лёсіка. Маё перакананьне,

што моцнага яканьня, як шырокай зьявы, у літаратурным вымаўленьні няма, і калі ёсьць, дык гэта толькі індывідуальныя зьявы.

Рознагалосьсі ў поглядзе на *аканьне,* мне здаецца, залежаць ад асобнай чыста фонэтычнай прыроды гэтай зьявы. На падставе фонэтычных досьледаў проф. Потэбня, а за ім і Багародзіцкі далі формулу, якая характарызуе суадносіны складоў—ненаціскнога і націскнога ў слове. Па гэтай формуле, у выніку экспіраторнай прыроды нашага вымаўленьня, адрозьніваюцца наступныя склады: самы моцны склад—націскны. Мы яго адзначаем, дапусьцім, тройкай або двойкай, у залежнасьці ад таго, колькі складоў у слове да націску: калі два, дык тройкай, напр., *га^{1}ла^{2}ва^{3},* калі адзін—дык двойкай: *вада^{2}, до^{1}бра^{2}.* Адсюль бачым, што самым моцным зьяўляецца націскны склад, а наступным па моцы зьяўляецца склад пераднаціскны, а аддаленыя ад націску склады будуць найслабымі. Пасьля націску, у выніку натугі выдыху, што ўзмацняе націск, у нас наступае рэакцыя: зразу падае моц складу, які ідзе за націскным складам, і ў гэтым складзе чуецца нявыразны гук, асабліва калі ён не адчынены, а зачынены, дык, у выніку наступных зьмен, тутака адбываецца падмена яго на *і* або *ъ: будзіш, горъд.* Інакш тлумачыцца: *поля, насеньня* і г. д., дзе, з прычыны адчыненага стану, галосны гучыць больш ясна і шырака. У зачыненым-жа стане гук зьяўляецца больш глухім. На моцы рэдукцыі, якая адбылася ў раньнюю эпоху ў сярэдняй групе ўсходня-славянскіх гутарак, ненаціскныя *а, о, е* скараціліся. Прычым *а* і *о,* будучы па артыкуляцыі (па месцы вымаўленьня) суседнімі, супалі ў адным няясным няпэўным гуку. Калі-б галосныя вымаўляліся поўнай артыкуляцыяй, г. зн. калі-б гэта артыкуляцыя была нормальна-кароткай або доўгай, дык ненаціскныя гукі вымаўляліся-б ясна. Калі пасьля рэдукцыі (скарачэньня) яны сталі карацей нормальна-кароткіх, дык бязумоўна, пры кароткасьці артыкуляцыі, гэтыя гукі не маглі выгаварвацца ясна, і гукі *а* і *о* супалі ў адным няпоўным рэдукаваным гуку, які ўмоўна абазначаецца грэцкай літарай *α* (альфа), а ненаціскное *э* абазначаецца грэцкай літарай *ε* (эпсылён). Шахматаў тлумачыць, якім чынам зьявіліся потым

на месцы гэтых няясных α, ε—гукі ясныя поўнага ўтварэньня—*а, я* ('а). Якраз ён кажа (у сваім „Очерке древнего периода истории русского языка"), што скарачэньне ненацiскных галосных, што стаялі перад націскам, выклікала падоўжваньне наступнага націскнога галоснага, калі гэты націскны галосны быў вузкім, г. зн. калі гэта былі *ы, і, у, ѣ (іе)* або асноўнае *о,* якое тады было або зачыненым (вузкім), або дыфтонгічным (у͡о). У наступную эпоху доўгія галосныя ў сярэдняй групе ўсходня-славянскіх дыялектаў скараціліся. Скарачэньне націскных названых намі вузкіх галосных выклікала падменьваючае пасіленьне, павялічэньне колькасьці папярэдніх ненацiскных, няясных α і ε, якія, пасіліўшыся, сталі нормальна-кароткімі яснымі *а, е* або *я* ('а). Такім чынам, зусім фонэтычна ў пераднацiскным складзе атрымаліся найбольш ясныя, найбольш моцныя з ненацiскных галосных: *а, я, е.* У другім-жа пераднацiскным складзе застаўся слабы стан, які вышэй мы і адзначылі цыфрай адзін у параўнаньні з цыфрай два пераднацiскнога складу. Ад гэтага вось у складох аддаленых ад націскнога мы маем неакрэсьленасьць вымаўленьня: то „*ні*патрэбны", то „*не*патрэбны". Тутака прымячаецца хістаньне ў вымаўленьні, і затым слух ня ловіць яснай артыкуляцыі, бо губы, з прычыны надмернай кароткасьці артыкуляцыі, застаюцца пасыўнымі і не даюць яснага слухавога ўражаньня. Калі імкнуцца да фонэтыкі, да больш-менш вядомай і акрэсьленай, дык вымаўленьне літаратурнае н лічу фактам.

Цяперака адносна яшчэ аднэй заўвагі. Правільна адзначыў проф. Німчынаў, што бясспрэчна расійцы добра зрабілі, што не ўвялі аканьня, пакінуўшы ў сваім правапісу прынцып этымолёгічны і часткова гістарычны. Гэта такія прынцыпы, супроць якіх шмат хто выказваецца, шмат хто нездаволены, але якраз ён усіх прыводзіць да згоды, бо *ўсе* павінны яму вучыцца. Аднак, калі справа тычыцца нашага беларускага правапісу, дык я ўсё-ж супроць адваротнага ўвядзеньня *аканьня.* Прынцыпова, канешна было-б лепш за ўсё ўвесьці такі прынцып, які ўсіх можа памірыць. Аб гэтым я і пісаў у сваёй брошуры „Беларускае аканьне". Аднак, неабходна лічыцца з патрабаваньнямі практычнага жыцьця. Лічачыся з тым, што сучасны беларускі правапіс больш-менш пабуда-

ваны ўсё-ж на аснове фонэтыкі, у ім трэба захаваць аканьне ў тых выпадках, у якіх яно чуецца зусім акрэсьлена, ясна і не выклікае ніякіх сумненьняў і спрэчак. Такім зьяўляецца *моцнае аканьне* (але ня яканьне), бо яно зьяўляецца асноўным вымаўленьнем пераважнай большасьці беларусаў; яго нават трэба пашырыць і на словы чужаземнага пахаджэньня на месцы ненаціскнога *о*. У сваёй брошуры я прыводжу даволі ясныя прыклады, якія сьведчаць, што было-б зусім рацыянальна ўвесьці *моцнае* аканьне і ў правапісу чужаземных слоў.

Што тычыцца ненаціскнога *е*, дык лепш за ўсё такі стан: тутака правільна заўважылі, што ў апошнім адчыненым складзе слова нават пасьля націску, на месцы ненаціскнога *е* часта чуецца *я*. На падставе гэтага можна-б згадзіцца і на ўвядзеньне ў правапіс і такога напісаньня. Але тады, таварышы, будзе блытаніна ў формах: „добрая гаспадыня“ і „добрая гаспадыні“—наз. і род. склоны адзін. ліку. Гэта ўнясе непатрэбную блытаніну. З тае прычыны, што гук *я* на месцы ненаціскнога *е* чуецца ясна толькі ў фонэтычным стане, г. зн. у перадняціскным складзе, дык яго і пісаць трэба толькі там; ва ўсіх іншых выпадках—не перад націскам і пасьля націску—трэба пакінуць асноўнае *е*. Тады правіла будзе ясьней і прасьцей.

Што тычыцца лёгкасьці, дык я ўжо гаварыў, што ўсякае правіла правапісу трэба завучваць, і калі вы ўведзяце моцнае яканьне, дык гэта, папершае, будзе памылкаю, таму што такая рыса правапісу ня будзе адпавядаць вымаўленьню—як літаратурнаму, так і большасьці жывых беларускіх гутарак. Праз гэта правапіс набудзе яшчэ больш штучнасьці. Паўтараю сваю пропозыцыю, якую я ясна сформуляваў у сваёй брошуры; яна складаецца з таго, што рэформа правапісу ў галіне галосных патрэбна толькі частковая і вельмі нязначная: трэба толькі спросьціць сапраўды складанае правіла аб напісаньні асноўнага ненаціскнога *е*. Трэба пісаць л*е*суна, б*е*зумоўна, н*е*выразны—таксама, як і н*е*патрэбны, н*е*залежны і да т. п. Я з практыкі ведаю, як цяжка ўсвойваецца гэта правіла ў старой рэдакцыі: колькі ні тлумачыш—большасьць слухачоў заўсёды робіць памылкі ў гэтым пункце, і толькі некаторыя, больш здольныя, хутка апаноўваюць ім.

Што тычыцца другой пропозыцыі тав. Німчынава аб тым, каб выкінуць *ь* для памякчэньня галосных, дык я далучаюся да думкі т. Бялькевіча. Ён правільна паказаў, што ў нашай мове памякчэньне галосных перад мяккімі зычнымі чуецца вельмі выразна і не ствараe ніякіх цяжкасьцяй для дзяцей, якія вельмі добра ўсвойваюць гэта правіла і ў ім не памыляюцца. Дзеля таго няма ніякай неабходнасьці яго выкідаць. Напрыклад, калі мы выкінем паміж зычнымі *ь*, дык пад уплывам кнігі атрымаецца штучнае вымаўленьне, накшталт: **спіць, сніць, збіць**, заміж—*сьпіць, сьніць, зьбіць* і т. п. Можна прывесьці яшчэ шмат прыкладаў, але за адсутнасьцю часу я канчаю.

Лёсік Ан. Я застанаўлюся на галоўным пункце нашага проекту—на ўвядзеньні ў правапіс поўнага аканьня. Тарашкевіч агранічыў аканьне выключна на тым, што прымусіла яго да гэтага „доўгая практыка пісьменства“. Я ўжо на агульным сходзе Конфэрэнцыі гаварыў, што ў нас такой практыкі ня было, бо ня было граматыкі, і ўсе пісалі пароэнаму (бач Антон Лёсік. „Да рэформы беларускага правапісу“), вельмі часта ўжывалася і аканьне ў тых мясцох, у якіх забараняе ўжываць яго на пісьме Тарашкевіч паводле свайго правапісу. Калі хто з членаў Конфэрэнцыі цікавіцца гэтым пытаньнем, то можа пачытаць „Гутарку Паўлюка“ віленскага выданьня 1898 г.

Тарашкевіч для напісаньня галосных прыняў прынцып фонэтычны, але яго ня вытрымаў; так, паводле правапісу Тарашкевіча, трэба пісаць: *піша, кажа, скача* і г. д. паводле фонэтычнага прынцыпу, а ў тых-жа самых формах: *будзе, чытае, рысуе*—паводле этымолёгічнага прынцыпу; у формах: *харошанькі, прыгожанькі* напісаньне канчатку *анькі*—фонэтычнае, а ў тых-жа самых формах: *беленькі, чорненькі* і пад.—этымолёгічнае напісаньне канчатку *енькі.* Таксама Тарашкевіч зьмяшаў прынцыпы фонэтычны і этымолёгічны і ў другіх выпадках: *дошчак, сарочак*, але—*нянек, лялек; пішам, кажам,* але—*будзеш, чытаеш* і г. д. Проект наш і прапануе ўсе формы, у якіх Тарашкевіч агранічыў аканьне, пісаць паводле фонэтычнага прынцыпу, а не этымолёгічнага.

Па фонэтыцы беларускае мовы ненаціскное *е* вымаўляецца няясна і ў большай значнасьці беларускіх дыялектаў

гэтае ненаціскное *е* набліжаецца да *я,* але ніколі ня чуваць выразнае вымаўленьне гуку *е.* І калі мы ўжо ў шмат якіх выпадках на пісьме гэтае ненаціскное *е* азначаем літараю *я,* то няма ніякіх падстаў і ўсе ненаціскныя *е* азначаць на пісьме тэю-ж літараю *я.*

Зразумела, тыя, хто кажа, што ў нашай мове ёсьць выпадкі, калі *е* чуваць выразна, з такім-жа правам могуць сказаць, што ў беларускай мове чуваць выразна і гук *о,* бо па суседзтву з Украінай вымаўляюць і *о,* але гэта фонэтычная зьява ня ёсьць уласьцівасьць беларускае мовы.

Трэба адзначыць, што ў некаторых дыялектах і ў першым складзе перад націскам чуваць, заместа гуку *я,* гук *і;* прызнаюся, што і я вымаўляю: *німа, ніхай, ціпер, дзісятак* і г. д., а не: *няма, няхай, цяпер, дзесятак;* але ўсё-ж такі я не магу ўнесьці такой прапановы, каб у першым складзе перад націскам увесьці новую літару *і* замест таго *я,* якое ўжо ўведзена ў правапіс, апіраючыся на большасьць беларускіх дыялектаў. Ужываньне *і* замест ненаціскнога *е,* як, напрыклад, у формах: *будзіш, чытаіш* і пад., ня ёсьць уласьцівасьць беларускае мовы. Ніводзін опонэнт нашага проекту не даводзіў, што ў першым складзе перад націскам чуваць ня *я,* а якійсь другі гук, за выключэньнем профэсара Бузука, які памылкова, асноўваючыся на словах Якуба Коласа *беда, сьпевай,* запісаных у старых выданьнях яго твораў, у сваёй брошуры „Некаторыя непаразуменьні ў спрэчках аб рэформе беларускага правапісу“ прапануе перанесьці *е* і ў першы склад перад націскам (стар. 5). Але гэта была памылка проф. Бузука, бо Якуб Колас вырас у тэй краіне Беларусі, у якой пануе поўнае аканьне з іканьнем у некаторых выпадках, і дзеля таго ён ніколі ня скажа: *беда, сьпевай,* а заўсёды вымаўляе: *бяда, сьпявай.*

Калі я запісаў на дошцы словы з старых выданьняў: *цяцярук, дзяравяны, сярабро* і пад., запісаныя паводле фонэтычнага прынцыпу, то шмат каму з членаў Конфэрэнцыі паказалася гэты запіс якоюсь недарэчнасьцю, бо якраз, правапіс Тарашкевіча забараняе такое напісаньне гэтых слоў. Супраціўнікі нашага проекту ўвядзеньня поўнага аканьня гаварылі, што гэта будзе немілагучным; па іх словах, няпрыемным для нашага вуха зьяўляецца зьбег аднолькавых

галосных, як, напрыклад, у слове *цяцярук*. На гэта трэба сказаць, што можа быць немілагучным толькі ў тым выпадку, калі хто гэтыя *я* вымаўляе з шырака раскрытым ротам, чаго на самым дзеле ніхто ня робіць. Калі хто будзе вымаўляць з шырака раскрытым ротам і такія словы, як: *няма, бяда,* то таксама можа паказацца немілагучным, але-ж з гэтага ніхто не даводзіў, што трэба пісаць, замест прынятага, так: *нехай, беда.* Апроч таго, зьбег аднолькавых галосных у беларускай мове—зьява звычайная, напрыклад: *сяляне, ягня, лісяня;* гэтыя словы мы так і пішам, і ніхто ня кажа, што яны вымаўляюцца немілагучна.

Прымаючы пад увагу ўсё, што вышэй гаварылася, мы прыходзім да заключэньня, што няма ніякай падставы не пашырыць аканьня і на тыя выпадкі, у якіх гэта аканьне Тарашкевіч агранічыў; інакш кажучы, мы прышлі да заключэньня, што дзеля прастаты і паступовасьці нашага правапісу трэба ўсе ненаціскныя *е* азначаць на пісьме літараю *я,* што ўжо ў адных выпадках робім, а ў другіх чамусь супрацоўнікі проекту ня хочуць зрабіць, імкнучыся даказаць, што ў беларускай мове няма поўнага аканьня.

Прапанову проекту—пісаць у месным склоне назоўнікаў з цьвёрдай асновай не пад націскам замест *е* літару *і: у хаці, на небі, у горадзі*—некаторыя опонэнты лічылі непаступовасьцю нашага проекту: па іх выходзіла, што мы павінны былі тут пісаць: *у хаця, на небя* і г. д. Трэба адзначыць, што ў нашым проекце нідзе не гаворыцца аб тым, што мы прапануем усюды пісаць *я;* асноўнае ў нашым проекце—правядзеньне ў правапісу фонэтычнага прынцыпу. Прымаючы пад увагу, што вымаўленьне *і* ў адзначаных формах больш пашырана, чым *я,* і што ненаціскное *е* ў формах *у хаце, на небе* ў вымаўленьні ня чуваць, мы і прапануем гэтую фонэтычную зьяву беларускае мовы адзначыць і на пісьме. Значыць, гэта прапанова проекту ніякай супярэчнасьці з фонэтычным прынцыпам не становіць.

Тое-ж самае трэба сказаць і адносна прапановы проекту—заместа канчаткаў прыметнікаў жаноч. роду ў родным склоне адзіноч. ліку—*ае, ое* пісаць—*аі, оі,* гэта значыць, пісаць: *новаі хаты, добраі кабеты, сьляпоі, глухоі* і г. д. заместа: *новае хаты, добрае кабеты, сьляпое, глухое* (родн.

скл.). Карскі кажа, што „в живых говорах это окончание *(ае-ое)* довольно редко“ (Карскі, том II, 312). Калі-б прыняць на пісьме першае напісаньне азначанае формы, то была-б адпаведнасьць у канчатках прыметнікаў жаноч. роду ў родн. склоне: *новаі* і *новай, добраі* і *добрай, глухоі* і *глухой:* другая форма вытвараецца з першай скарачэньнем *і.* Такое напісаньне азначанае формы ёсьць і ў запісах Федароўскага.

Яшчэ трэба застанавіцца на прынцыпе пашырэньня фонэтычнага прынцыпу ў правапісу і на зычныя гукі. Тарашкевіч кажа: „Зычныя пішуцца, гледзячы на тое, які зычны ў корані, прыстаўцы ці канчатку“ (стар. 59); гэта значыць, правапіс зычных не падлягае фонэтычнаму прынцыпу. На самым дзеле ў Тарашкевіча ёсьць вельмі многа выпадкаў, у якіх праводзіцца фонэтычны прынцып напісаньня зычных; я адзначу галоўнейшыя з гэтых выпадкаў. Паводле фонэтычнага прынцыпу мы цяпер пішам:

1) *часаца, мыецца* і пад.
2) *позна, чэсны, шаснаццаць* і пад.
3) *няшчасьце, дошчачка, вашчына* і пад.
4) *францускі, парыскі, мускі* і пад.
5) *брацкі, полацкі, ткацкі* і пад.

Можна было-б прывесьці і другія выпадкі фонэтычнага правапісу зычных. Значыць, будзе паступовым, калі мы пашырым фонэтычны прынцып і на зычныя гукі. І запраўды, калі мы пішам: *лес*—але *лясы, несла*—але *нясу,* то чаму-ж нам ня пісаць так: *горат*—але *гарады, сат*—але *ў саду, лошка*—але *ложак* і г. д. Калі мы зьмяняем напіс галосных гукаў паводле націску і не знаходзім у гэтым нічога недарэчнага, то чаму нам не зьмяняць напіс зычных паводле другіх фонэтычных законаў, як, напрыклад, паводле закону асыміляцыі зычных?

Справа ідзе толькі аб пашырэньні фонэтычнага прынцыпу і на зычныя гукі, бо гэты прынцып ужо ўвёў і Тарашкевіч, хоць ён аб гэтым не гаворыць.

Мялешка. Паважаная Конфэрэнцыя! Пазаўчора, калі я выступаў па дакладу Я. Лёсіка, я, між іншым, паказаў на тую рэзолюцыю, якая была прынята большасьцю настаўніцкай літаратурна-лінгвістычнай Конфэрэнцыі, зазначыўшы, што рэзолюцыя па дакладу т. Лёсіка адносна рэформы бела-

рускага правапісу была прынята насьпех, без належнай падрыхтоўкі з боку большасьці Конфэрэнцыі. Цяпер-жа Лёсік абвінавачвае мяне ў тым, што я быццам-бы выступіў ад імя ўсяго настаўніцтва. Я выказаў свой асабісты погляд на тое, якім чынам прымалася рэзолюцыя на гэтай Конфэрэнцыі— і толькі. Я павінен адзначыць, што на гэтай Конфэрэнцыі, між іншым, была прынята пастанова: рабіць фонэтычны запіс зычных у сярэдзіне (прозьба), а ў канцы слова запіс павінен быць этымолёгічны (дуб). Цяпер-жа я чуў ад Антона Лёсіка зусім іншае, што патрэбна фонэтычны прынцып напісаньня зычных пашырыць на ўсе зычныя як у сярэдзіне, гэтак і ў канцы (дупка, дуп). Дзе тут лёгічнасьць, дзе паступовасьць? Тое, аб чым казалася некалькі тыдняў таму назад, сёньня адкідаецца; калі на тэй Конфэрэнцыі была прынята пастанова аб тым, каб правесьці поўнае аканьне ўсюды—як пасьля націску, гэтак і перад, то на гэтай Конфэрэнцыі Язэп Лёсік заяўляе, што ў другім складзе перад націскам магчыма пісаць *е (непрыхільна)*. Хіба гэта сталы погляд? Не. Ці маем мы права адносіцца крытычна да проекту рэформы правапісу? Бязумоўна. Гэтая Конфэрэнцыя навуковая, а як навукова-акадэмічная, мы павінны адносіцца да проекту крытычна, бо бачым, што сталых поглядаў у дакладчыкаў няма, што ад сваіх поглядаў адмаўляюцца і замяняюць іншымі. Я яшчэ раз падкрэсьліваю, што да справы рэформы правапісу мы павінны падыйсьці надзвычайна сур'ёзна і асьцярожна.

Проф. Бузук у сваім выступленьні, між іншым, адзначыў, што пасьля зычных *з, с, ц, дз,* калі яны стаяць перад мяккімі зычнымі не гартаннымі, непатрэбна пісаць мяккі знак *(снег, свет),* бо мяккасьць зычнай будзе ня поўная, а сярэдняя, г. зн. прытрымліваўся таго-ж погляду, што і Лёсік. Я з такім поглядам згадзіцца не магу, мяккасьць зычных *з, с, ц, дз,* калі яны стаяць перад мяккімі зычнымі не гартаннымі, будзе поўная, напрыклад, у словах *дзьверы, сьвет* такая-ж поўная мяккасьць зычных *дз* і *с,* як і ў словах *сядзь, вось.* Затым, у сваёй практыцы мне даводзілася наглядаць, што дзеці-нулявікі, якія толькі што пачалі вучыцца, у гэтых адносінах абмылак ня робяць. У слове *сьвет* пішуць мяккі знак і мякка вымаўляюць зычны *с.* Такім чынам, мне здаецца,

што гэтае правіла мы павінны заставіць так, як яно было да гэтага часу, г. зн. мяккі знак не выкідаць; правіла яснае і ніякае туманнасьці тут няма.

Далей, адносна мяккага знаку сярод падвойных мяккіх зычных. Мне здаецца, што ў гэтым заключаецца асаблівасьць нашае беларускае мовы: *куцьця, пытаньне, гальлё* і г. д. З сваёй пэдагогічнай практыкі я таксама магу адзначыць, што дзеці і ў гэтых правілах ніякіх абмылак ня робяць; ясна чуваць мяккі знак. Такім чынам, гэтае правіла патрэбна таксама заставіць.

Якую-ж рэформу мы павінны правесьці ў правапісу *й* і *і*? Калі *і* зьяўляецца злучнікам або стаіць па пачатку слоў, то заўсёды трэба пісаць *і* доўгае, складовае (яна і маці, яна ідзе). І толькі ў зачыненых складох і ў канцы слоў пісаць *й: вайна, мой, твой.* Вось тая рэформа, якую мы павінны правесьці адносна напісаньня *і* нескладовага.

Што датычыць *у,* то прапаную гэтае правіла заставіць так, як яно было да гэтага часу, за выключэньнем слоў, якія азначаюць уласныя іменьні, у якіх заўсёды пісаць *у* складовае: *на Узьдзе, на Урале,* а таксама выкінуць, як выключэньне, усе тыя словы, якія пішуцца праз *у* складовае *(увага* і інш). Гэтыя словы падлягаюць агульнаму правілу.

Што датычыць чужаземных слоў, то я стаю за той прынцып, якога прытрымліваецца т. Некрашэвіч. Адносна правядзеньня поўнага аканьня і яканьня, што прапануе Лёсік, я выступаю супроць, бо гэта будзе бязумоўна недарэчнасьцю. Калі мы возьмем Беларусь у цэлым, то ня ўсюды заўважым поўнае аканьне; апрача аканьня, мы заўважваем і *еканьне* і *іканьне.* Такім чынам, трэба ўзяць штосьці сярэдняе, г. зн. *еканьне,* і тады ўсе нашы беларускія дыялекты будуць задаволены.

Багдановіч Генадзі. Паколькі гэтае пытаньне ўжо даволі высьветлена і нават выявіўся напрамак і разьмежаваньне членаў Конфэрэнцыі ў дадзенай Камісіі, я застанаўлюся толькі на некаторых пунктах, на якіх, мне здаецца, менш усяго застанаўліваліся. Першае—гэта тое, аб чым казаў тут Антон Лёсік, г. зн. аб фонэтычным напісаньні зычных. Сам дакладчык Я. Лёсік па гэтым пытаньні ў пленуме казаў мала і на ім не настойваў, але паколькі яно за-

краналася, я хачу сказаць некалькі слоў. Перш за ўсё я хачу асьвятліць гэтае пытаньне, галоўным чынам, з пэдагогічнага і мэтодычнага боку і з боку лёгкасьці фонэтычнага і морфолёгічнага напісаньня. Паколькі пытаньне пісьменнасьці і набыцьця ўменьня правільна пісаць з псыха-фізычнага боку заключаецца ў тым, што пісьменнасьць даецца, галоўным чынам, практыкай пісаньня, г. зн. сталым паўторным пісаньнем адных і тых-жа форм слоў, то з гэтага пункту гледжаньня магчыма сказаць, што паўтарэньнем адных і тых-жа форм злучэньняў літар магчыма хутчэй набыць практыку ў пісаньні. Такім чынам, калі, напрыклад, возьмем слова *горад,* то ў ім пры фонэтычным вымаўленьні чуваць гукі *о* і *а,* а пры морфолёгічным напісаньні будзе заўсёды паўтарацца *о,* і такім чынам, правільнаму напісаньню гэтага слова магчыма будзе хутчэй навучыцца. Аднак аканьне, якое праведзена ў нас у пісьме, зьяўляецца настолькі ясным вымаўленьнем і настолькі ясна адзначана ў нашай мове, што лёгка ўсвойваецца. Гэта паказала і практыка ў нашым пісьме. Калі мы гэты прынцып пашырым і на зычныя, то мы паставім таго, хто піша, у такое становішча, што слова, якое паўтараецца ў нашай мове ў розных формах, будзе кожны раз мяняцца, і той, хто піша, будзе пастаўлены перад фактам, што яму патрэбна будзе думаць, у якім выпадку неабходна пісаць той ці іншы зычны, бо зычныя мяняюцца ў залежнасьці ад таго месца, якое яны займаюць у слове. Такім чынам, мы зусім адарвем некаторыя формы, дзякуючы пашырэньню фонэтычнага прынцыпу напісаньня нашых слоў ад іх асноў, і ўмеласьць правільнага напісаньня будзе значна цяжэй набыць. Такім чынам, мая думка заключаецца ў тым, што няма ніякага сэнсу зычныя пісаць фонэтычна. Гэта толькі ўскладняе наша пісьмо і робіць яго значна цяжэйшым. Паўтараю, што практыка ў пісаньні адных і тых-жа слоў у адных і тых-жа формах дае магчымасьць хутчэй набыць умеласьць правільна пісаць. Я яшчэ застанаўлюся на правапісу чужаземных слоў. Мой пункт гледжаньня па гэтым пытаньні некалькі адрозьніваецца ад тых, якія былі тут выказаны, і набліжаецца да пункту гледжаньня Тарашкевіча. Мне здаецца, што правапіс чужаземных слоў у практыцы таго ці іншага народу або мовы можа ўстанаўляцца

толькі гістарычна, пакольki тыя ці іншыя словы большасьцю будуць пісацца так, а ня інакш. Умеласьць правільна пісаць, набытая паўтарэньнем адных і тых-жа слоў, ёсьць у кожнай мове—у польскай, у беларускай і інш.

Але наогул, мне здаецца, у правапісу чужаземных слоў неабходна замацоўваць формы ў тым выглядзе, у якім яны існуюць і ў замежных мовах. Мы ня будзем казаць аб правапісу такіх слоў, як *дзякуй,* якое таксама па пахаджэньні не зьяўляецца беларускім, як няможна казаць аб такіх словах расійскай мовы, як *мрамор* або польскае marmur, якія таксама паходзяць ад лацінскага кораню. Напісаньне гэтых слоў устанавілася гістарычна. Але для большасьці слоў у нас на Беларусі гістарычнай традыцыі яшчэ няма, але і пакласьціся на інтуіцыю, як кажа Тарашкевіч, і вырашаць кожны раз пытаньне аб напісаньні чужаземных слоў у тым ці іншым выпадку і думаць, як даўно гэтае слова ўжываецца ў беларускай мове, таксама няма магчымасьці. Хто-ж у нас павінен зрабіць тое, што ў іншых мовах зрабіла гісторыя? Зрабіць гэтае ў нас павінен які-небудзь компэтэнтны орган, як Інбелкульт або Мовазнаўчая Камісія. Інбелкульт павінен выдаць слоўнік чужаземных слоў, якія ўвайшлі са зьменамі ў беларускую мову, з такім напісаньнем, якое вымагаецца. Тое, што ў нас ня зроблена гістарычным шляхам, павінна зрабіць компэтэнтная ўстанова, і грамадзяне павінны будуць прытрымлівацца гэтага. Тыя словы, што ня ўвойдуць у такі слоўнікі, што будуць ужывацца толькі інтэлігенцыяй, бязумоўна патрэбна пісаць так, як яны пішуцца ў чужаземным напісаньні. Вось, памойму, найбольш конкрэтны выхад з гэтага становішча, бо ў напісаньні чужаземных слоў у нас поўная блытаніна. Калі гэтая прапанова ня будзе прызнана правільным выхадам з утворанага становішча, то я магу згадзіцца толькі з прапановаю т. Некрашэвіча, г. зн. дапусьціць аканьне ў чужаземных словах толькі адносна *а* і ні ў якім выпадку не адносна *э* або *е,* інакш з сучаснай блытаніны мы ніколі ня выйдзем.

Троська. Я выступаю таму, каб зьвярнуць увагу на адно зьявішча ў нашым пісьме. Мне здаецца, што гэтае зьявішча патрэбна будзе абгаварыць пры конкрэтнай апрацоўцы нашага правапісу. Заўважце, што ў нашай беларускай мове

няма ў іменьніках канчаткаў *ія* (ыя), *іе* (ые). Наша мова ўхіляецца ад іх падваеньнем ці іншым спосабам. Калі мы возьмем хаця-б слова *судзьдзя*, у стара-славянскай мове было *сѫдиꙗ*; таксама—*куцьця, надвор'е* і г. д.; магчыма прывесьці цэлы шэраг слоў, з якіх відаць, што ў беларускай мове мы заўсёды ўхіляемся *ія* (ыя), *іе* (ые). Калі мы возьмем чужаземныя словы, якія ўжываюцца ў нашай мове (асабліва з канчаткам *ыя* пасьля *ц*), напрыклад: *кампанія, канцылярыя, опэрацыя, рацыя* і г. д., то мы бачым, што ў народнай мове гэтае самае ўхіленьне ад канчатку *ыя* захоўваецца поўнасьцю; мы кажам: *кампаня, губэрня*, я не *кампанія, губэрнія*, напрыклад: „ён ня мае *рацы*, яму не зрабілі *опэрацы*" і г. д. Тут мы бачым, што народная мова ў чужаземных словах таксама ня прымае канчаткаў *ыя* (ія). Мне здаецца, што было-б зусім зразумела, калі-б мы гэтую асаблівасьць узаконілі ў мэтах набліжэньня літаратурнае мовы да народнае. Мне здаецца, што для гэтага ёсьць і падстава. Калі ёсьць такія пярэчаньні, што чужаземныя словы патрэбна захаваць у такім напісаньні, як яны ёсьць, то я падкрэсьліваю, што гэта ня так, бо кожны народ дадае да чужаземных слоў свае канчаткі; напрыклад, возьмем слова *біблія*. Калі мы возьмем іншыя мовы, нямецкую або францускую, то там гэтае слова мае свае канчаткі: die Bibel, la bible і г. д. Тое-ж самае ў словах *пропорция, гильдия* і г. д. Кожны народ дадае да яго ўласьцівы канчатак, і мне здаецца, што было-б зусім рацыянальна, калі-б мы дадалі да чужаземных слоў свае беларускія канчаткі. Я думаю, што калі мы ўзьнімаем пытаньне аб тым, каб правесьці аканьне ў чужаземных словах, г. зн., замест ненаціскнога *о*, пісаць *а*, і калі гэта не выклікае вялікіх спрэчак, то будзе зусім правільна і рацыянальна, калі мы ў зазначанай катэгорыі чужаземных слоў узаконім беларускія канчаткі, тым больш што гэта наблізіць нашую мову да народнае мовы.

Я хачу адзначыць яшчэ дзьве маленькія асаблівасьці. Ужо ўносіліся прапановы аб тым, каб зьнішчыць літару *ф*, бо гэта непатрэбная літара ў беларускай мове. Мне здаецца, што ў пытаньнях правапісу патрэбна сказаць, што ў беларускай мове і ў чужаземных словах літара *ф* адпадае і замяняецца або *хв* або *п, т* і г. д., у залежнасьці ад вымаўленьня.

Трэцяя асаблівасьць, якую патрэбна ўзаконіць у літаратурнай беларускай мове, гэта адносна цьвёрдага і мяккага *л* у сярэдзіне слоў. У нас лічылася-б няпісьменным, калі-б мы напісалі *пілнаваць, палцы* і г. д., у той час як мы ведаем, што ў народнай мове ўжываецца ў гэтых выпадках *л* цьвёрдае. Я ведаю, што гэтая асаблівасьць амаль што ўсюды ўжываецца, ня ведаю толькі, як у Віцебшчыне. Патрэбна гэтую асаблівасьць узаконіць, тым больш што калі мы возьмем і гістарычны бок, то гэтая асаблівасьць спатыкаецца ўва ўсіх помніках, пачынаючы з XVI стагодзьдзя.

Там запісаны цэлы шэраг слоў з цьвёрдым *л*.

Я мысьлю, што ў падобных выпадках ёсьць поўная падстава для таго, каб цьвёрдае *л* у падобных выпадках увесьці ў наш правапіс.

Ластоўскі. Кожная пісьменнасьць у пачатнай стадыі свайго разьвіцьця ці пры адраджэньні чэрпае гукі, формы слоў і звароты сказаў з крыніц народнай мовы, з слоўнай народнай творчасьці ці з папярэдніх пісьменных помнікаў свайго або нават чужога народу. Абагульняючы ўсе асобнасьці слоўных і пісьменных форм народнай мовы і творчасьці, пячатная або адроджаная пісьменнасьць стварае сваю граматыку, правілы, законы каторай, як узятыя з *жывой,* для данага моманту народнай мовы, бязумоўна павінны быць падпарадкаваны ўнутранаму зьместу, вокалізму і консанантызму апошняй. Карацей кажучы, усякая пісьменнасьць падпарадкуецца (правільней, *павінна* падпарадкавацца) фонэтычным і лёгічным асобнасьцям народнай мовы. На аснове гэтых асобнасьцяй пісьменнасьць стварае сваю граматыку, сынтакс і правапіс, якія павінны зьяўляцца правільным знадворным адбіцьцём ня толькі гукавых асобнасьцяй, слоўных форм і ўнутранага складу народнай мовы, але і гісторыі данага народу і яго пісьменнасьці. Тая пісьменнасьць, знадворныя формы якой (гукі слова, склад і правапіс) найбольш адпавядаюць *унутранаму* боку народнай мовы (зьместу і фонэтычным асобнасьцям), лічыцца самай ідэальнай. На жаль, мы ня бачым гэтай ідэальнай законнасьці ў разьвіцьці нашага сучаснага пісьменства. Прычын гэтаму многа, я не бяруся іх дасьледваць, але немалаважнай з іх зьяўляецца ўплыў на нацыянальную пісьменнасьць літаратурнай і афі-

цыяльнай мовы тэй дзяржавы, пад урадаваньнем якой знаходзіўся або знаходзіцца даны народ. Гэта прычына ярка адбілася на разьвіцьці нашага (крыўскага) нацыянальнага пісьменства.

Мы ведаем, што пісьменнасьць (славянская) прышла да нас адначасна з чужой вараска-хрысьціянскай уладай і ад самога свайго зародку пачынае абслугоўваць інтарэсы рэлігіі і дзяржавы. Царкоўна-славянская мова, як мова рэлігіі і дзяржавы, прымае ў вачох падбітага народу азнаку чагосьці вышэйшага, сьвятога, чаго ня мае права перайначыць або зьмяніць звычайны сьмяротны. Аднак-жа, ня гледзячы на такую пашану да славянскай граматы, з-пад пяра першых пісьменьнікаў-манахаў, якія дагэтуль ня зналі іншай мовы, апрача сваёй матчынай, пачынаюць натуральным парадкам, незаўважна для саміх пішучых, выходзіць ня толькі аддзельныя словы з крыўскімі формамі і асобнасьцямі, але нават цэлыя сказы. Прыкладам, у Астраміравым евангельлі (1056—1057 г.), Ізборніках Сьвятаслававых 1073 і 1076 г. г. і „Повесьці временных лет“ сустракаем такія асобнасьці крыўскай мовы: а) формы назоўнага і вінавальнага склонаў лічбы многай імён мужчынскага і жаночага родаў (*чядѣ, въдовицѣ, Кривичѣ, мужѣ, мечѣ, обручѣ, три воробиѣ, кораблѣ, манастырѣ, банѣ, овьцѣ, дѣвицѣ, вежѣ);* б) формы род. склону адзін. ліку імён жаночага роду (не мозѣте погубити Русьскыѣ землѣ, съберѣте пьшеницѣ); в) формы загаднага ладу дзеясловаў (не мозѣте, идѣте рьцѣте, живѣта, подвигнѣмся, сядѣте, потягнѣм, загребѣм); г) ужываньне мяккага *т* уперамешку з вымаганым тады баўгарскім правапісам цьвёрдым *т* (обрѣтае*ть*, вылѣзу*ть*, омываю*ть*, въливаю*ть*, въкушаю*ть*, вѣрую*ть*, слўжа*ть*, пращаю*ть*); д) цьвярдое *р* побач з вымаганым граматыкай мяккім (възем да*ры* при*де* къ Сьвятославу); е) аканьне (м*а*н*а*стырѣ, пр*а*щають, сядѣте). З слоў і выразаў заўважым такія (сустрэтыя ў „Повѣсти временныхъ лѣтъ“): възбързѣ (ўборзѣ)... другъ друга *сѣпихаху* въ *греблю*, и ту спровьрже животъ свои *зълѣ* (як цяпер гаворацъ у Слонімшчыне: „ён *зьле* скончыў сваё жыцьцё, *зьле* беднаму жыць на сьвеце)... У далейшым ходзе разьвіцьця нашага пісьменства славянскі правапіс паступова мяняецца пад уплывам вокалізму і консонантызму народнай мовы; славянскія формы слоў і звароты замяняюцца крыўскімі, а ўрэшце

пачынаюць зьмяншацца ў пісьменнасьці і царкоўна-славянскія словы, якія замяняюцца народнымі. К канцу XIV ст. эволюцыя гэта даходзіць да таго, што крыўская пісьменная мова ў Вял. Кн. Літоўскім становіцца мовай дзяржаўнай, царкоўнай, мовай навукі і мастацкай літаратуры, прычым чыстата, правільнасьць і правапіс яе, а таксама фонэтычныя асобнасьці к палове XVI ст. ўжо блізка зыходзяцца з асобнасьцямі *жывой* народнай мовы. У нашай пісьменнасьці XVI ст. асталіся немаль толькі асьвечаныя рэлігіяй і вякамі знадворныя азнакі ц.-славяншчыны—кірылаўскія літары, многія з якіх, па вымаганьні фонэтыкі, утрацілі сваё першапачатковае значэньне, займанае імі ў славянскай мове. Так, літара *ѣ*, якая ў ц.-слав. мове азначае мяккі гук е (ѣ), у Чэцьці 1489 г. і другіх помніках ужываецца ўжо, як найбольш падхадзячая літара з славянскай абэцэды для абазначэньня крыўскіх дыфтонгаў *іе, ые:* пуст*ѣ*те, твор*ѣ*те, говор*ѣ*те, помол*ѣ*теся; заместа абазначэньня ў царк.-слав. мове *у* дыфтонгам *оу,* апошні ў той-жа Чэцьці абазначае крыўскі дыфтонг *уо**): док*оу*ле, отт*оу*ле; літара *и* пасьля галосных прымае значэньне йоту, прыкл.: Жомо*и*тъского, Клавдѣ*и,* окрутны*и,* невъставичны*и,* имѣне*и,* выше*и* і г. пад. (Рачын.); аканьне, запачаткаванае першымі пісьменнымі помнікамі XI—XII ст., „з паловы і канца XV ст. зьяўляецца ўжо пануючым", а „у Чэцьці 1489 г. яно прадстаўляе звычайнае зьявішча: „пр*а*щать б*а*гата, в*я*сло, весел*я* і інш." Шыпячыя *ж, ч, ш,* а таксама *р* і *ц* з мяккіх па ц.-слав. пісоўні ў крыўскай пісьменнасьці ўжываюцца, як цьвёрдыя, дзеля чаго пасьля іх пішуцца ўжо цьвёрдыя галосныя, напр., у Чэцьці 1489 г. і „Летапісцы В. Кн. Літоўскага" (сьп. гр. Рачынскага) чытаем: *чы*стое, д*ры*жаху, к*ры*вавы, *Ры*му, п*ры*ити, *жы*вых, *цэ*сар, *цэ*рков і г. пад. Для абазначэньня звонкага (выбуховага) *г* у словах, узятых з чужаземнай мовы, прыдумана злучэньне дзьвёх літар *гк,* напрыклад: *кг*рунт, пар*кг*амен, Жи*кг*имонт, Ав*кг*уст, юр*кг*ельты, *кг*махи, *Кг*абрияловичъ, *Кг*идиминъ, Оль*кг*ирдъ, Я*кг*еила, зэ*кг*ар і г. п. Урэшце, славянскія канчаткі імён *ніе, тіе, ліе (*жела*ніе,* бра*тіе,* весе*ліе)* скарочваюцца ў *нье, тье, лье* (положе*нье,* нада*нье,* пи*тье),* а ў „Летапісцы В. Кн. Літоўскага" становяцца пануючымі крыўскія канчаткі *не, те, ле* (Креще*не,*

*) У апошнім з прамоўцам нельга згадзіцца. *Увага Рэд.*

еднан*е*, кнежен*е*, кровопролит*е*, з брат*е*ю, на ус*т*и, весэл*е*— весэл*е*м). Такім парадкам, правапіс нашых пісьменьнікаў дасягае значнай меры ідэальнага зблiжэньня з асобнасьцямі крыўскай фонэтыкі, зблiжэньня, якое толькі магчыма было перадаць, карыстаючыся кірылаўскай абэцэдай, у якой не знаходзіцца ўсіх літар для абазначэньня гукаў нашай мовы. Зусім магчыма, што нашы пісьменьнікі, сярод якіх у той час было ўжо многа людзей асьвечаных, прыдумалі-б і новыя літары *), адпавядаючыя орыгінальным гукам крыўскай мовы, каб з канца XVI ст. ня стаўся паварот да адраджэньня ц.-слав. мовы.

Славянскі Ўсход, немаль выключна праваслаўны, пад напорам рэформацыі і каталіцтва высоўвае ідэю роўнацэннасьці ц.-славяншчыны з лацінай, на якой у тыя часы пісаў, гаварыў і думаў увесь асьвечаны Захад. А дзеля таго, што ўсходняе славянства прадстаўляла сабой мозаіку розных дыялектаў, то гэтыя апошнія былі вытлумачаны, як „адзічэньне" і „апрасьценьне" першапачатковай адзінай і высокакультурнай кніжнай ц.-славяншчыны. І вось, у той час, калі на Захадзе пад уплывам рэформацыі адраджэньне сягала да жывых крыніц народнай мовы, то ў нас, наадварот, стаўся паварот да мёртвай ц.-славяншчыны, да скасаваньня жывых моваў на карысьць адналітнай кніжнай мовы. Паваротам на шляху гісторыі разьвіцьця нашай пісьменнасьці была граматыка, апрацаваная Мялеціем Сматрыцкім і выданая ў Еўі ў 1618 годзе. Граматыка гэта, узяўшы пад увагу ўплывы жывых моваў—крыўскай, украінскай, маскоўскай—на ц.-богаслужэбную пісьменнасьць, давала тэорыю „адраджэньня" нашай пісьменнасьці, навязваючы ёй граматычныя і лексычныя формы „агульнай" славяншчыны. Але бяда не ў самой тэорыі Сматрыцкага, а ў тым, што тэорыю гэту пастаноўлена было правесьці ў жыцьцё пры помачы школ, у якіх „простая" мова была ня толькі выкінута, але і забаронена вучням, якія павінны былі гаварыць паміж сабой мовамі навукі—грэцкай, лацінскай і ц.-славянскай. Гэтым разьвіцьцё

---

*) У гэтым кірунку быў ужо зроблены пачатак Ф. Скарынаю, у друкарнях якога надаваліся новыя вычварныя формы літарам для прыгоства, але далей магло стацца, што тая ці іншая форма літары паслужыла-б для абазначэньня тэй ці іншай фонэтычнай асобнасьці крыўскай мовы.

крыўскай пісьменнасьці ўжо ў сярэдзіне XVII ст. было спынена. Прыгожую мову пісьменных помнікаў XV-XVI ст. ст. заступае бяздарны кніжны жаргон, зусім няздатны да жыцьця. Панаваньне гэтага кніжнага жаргону на працягу каля 200 гадоў, а пазьней уплыў расійскай школы і граматнасьці навучылі цэлыя пакаленьні нашых прашчураў непашаны да роднай мовы з яе асобным жывым лексыконам і фонэтыкай, а пазьней вырабілі прывычку да знадворных азнак літаратурнай мовы—граматычных форм і літар. У выніку гэтых уплываў „культурныя“ слаі нашага грамадзянства ў XIX ст. сталі глядзець на народную мову, як на нейкую провінцыяльную адмену мовы, стрыманай у сваім разьвіцьці недахопам асьветы. Расійская ўлада (а цяпер і польская на захопленых ёю крыўскіх землях) прыводзіць гэты аргумант у апраўданьне свае дэнацыяналізатарскае політыкі.

Пад уплывам гэтай політыкі і падпарадкаванай ёй навукі ўзгадавана і наша цяперашняя адраджэнчая інтэлігенцыя, якая, уступіўшы на шлях адраджэньня крыўскай пісьменнасьці, пры ўсёй сваёй добрай волі, закаханьні і прыхільнасьці да роднай мовы, не змагла адразу вызваліцца ад схолястычнага кірунку мысьлі, выхаванай на пакланеньні перад літарай чужой кніжнай вучобы. Дзеля гэтага няма нічога дзіўнага, калі пісьменьнікі новага пэрыоду нашай літаратуры распачалі адраджэньне крыўскай пісьменнасьці з запазычаным лексыконам, формамі, моваскладам і літарамі. Нікому ня прышло ў галаву, што маскоўская абэцэда, паложаная ў аснову нашай граматыкі, узята з мёртвай славянскай мовы, і што літары яе ня могуць поўнасьцю перадаць гукаў і фонэтычных асобнасьцяй жывой і багатай формамі крыўскай народнай мовы.

Разгледзім паасобку тыя літары, якія не заўсёды адпавядаюць фонэтыцы крыўскай мовы. Літара *е* ў такіх словах, як *пень, дзень,* выгаварваецца аднолькава з маскоўскім *е,* але ў словах *сем, век, сена, вераценца, жанке* яна ўжо гучыць, як дыфтонг *ie͡*. Літара *э* ў словах *эй, гэты, шэры* адпавядае маскоўскай *э,* а ў словах *рэпа, рэдкі, панэ* яе ўжо няма, як чыстага гуку, а чуецца дыфтонг *ыэ͡*. *О* ў словах *вока, возера, сонца* чытаецца, як чысты гук, а ў словах *вол, конь, салодкі, горкі, родны* гучыць, як дыфтонг *уо͡*. *Ё* ў сло-

вах: *вёска, сёлы, вазёры* вымаўляецца, як *ьо*, а ў словах *мёд, лёд* ужо чуецца дыфтонг *ьуо*. Усе гэтыя дыфтонгі, перадаваныя на пісьме адзіночнымі літарамі маскоўскай абэцэды, могуць з бегам часу (у сілу прывычкі „чытаць, як напісана“*) адбіцца на фонэтыцы нашай мовы ў карысьць зблізкэньня яе з маскоўскай літаратурнай мовай. З другога боку, не адзначаючы на пісьме гэтых фонэтычных асобнасьцяй, мы часта робім незразумелымі формы і значэньне слоў. Возьмем, напрыклад, такі сказ: „Прывязі канём вады“. З напісаньня *канём* ня відаць, у якім склоне стаіць гэтае слова: ці ў творным адзіночнага ліку, ці ў давальным множнага, а праз гэта недакладным зьяўляецца і ўвесь сказ, бо няведама, ці трэба прывязьці вады пры помачы каня, ці для таго, каб напаіць коні. Бо калі мы хочам сказаць гэтую фразу ў першым значэньні, то яна напісана правільна, і літара *ё* ў слове *канём* гучыць чыста. А калі-ж мы гэтай фразай высказваем жаданьне даць канём вады, то тады павінны сказаць і напісаць не *канём*, а „каньуом“. Тое-ж самае мы ўбачым і ў наступных сказах, запісаных па цяперашняй граматыцы: „Гэта кніга напісана простым *мужыком*“. „*Каталіком* забаронена хадзіць у царкву“ і г. пад. Ня робіць таксама наш сучасны правапіс розьніцы паміж канчаткамі творнага і меснага склонаў адзіночнага ліку прымет, займеньнікаў і лічэбнікаў. Так, мы пішам „стар*ы*м—аб стар*ы*м, ма*і*м—на ма*і*м, адн*ы*м—пры адн*ы*м“, тады як у месным склоне, згодна большасьці лепшых фонэтычных запісаў крыўскіх этнографаў, трэба абазначаць дыфтонг *уо* (*юо*=*іуо*): аб стар*уо*м, на мал*уо*м, на ма*іуо*м, пры. адн*уо*м. У гэтым здарэньні варта адмежавацца ад польскага правапісу, у мес. склоне якога будзе star*y*m, moj*i*m, jedn*y*m, drug*i*m; літара *і* (*y*) стаіць бяз націску, а значыць зьяўляецца беглай і можа быць заменена любой галоснай, тады як у нашай мове гэты канчатак мае націск і дзеля гэтага вымагае сталай формы. Тое-ж самае трэба сказаць і аб аднолькавасьці ў нашым правапісу форм роднага і давальнага склонаў адзін. ліку некаторых займеньнікаў і лічэбнікаў жаночага роду. Р. *тэй*—Д. *тэй;* Р. *аднэй*—Д. *аднэй* (як і ў польскім правапісу (Р. ednej—Д. ednej), дзе *е*

*) А гэта якраз ёсьць абавязковае правіла фонэтычнай пісоўні, якая лічыцца ў нас існуючай (?!).

(э) беглыя). Каб унікнуць пярэчаньняў, скланеньні займеньнікаў і лічэбнікаў трэба падпарадкаваць зьменам прыметаў і адрозьніваць давальны склон ад роднага такім парадкам: Р. старой, малой—Д. стар*уой*, мал*уой*; Р. *той* (та*іе*)—Д. т*уой*; Р. адн*ой* (адна*іе*)—Д. адн*уой* і г. пад. Затым, у крыўскай мове ёсьць яшчэ адна самабытная старая форма іменаў, якую варта ўвесьці ў літаратурную мову [1]), але якую таксама ня можна перадаць без абазначэньня дыфтонгаў, бо бяз іх гэта форма траціць сваю вымову, а значыць—зьмест і цэннасьць. Гэта ёсьць форма назоўн., він. і кліч. склонаў іменаў муж. і жан. роду лічбы многай (пан*ыэ*, багатыр*ыэ*, мужык*іе*, жанк*іе*, дзяўк*іе*) і род. скл. адзіночнага ліку іменаў жан. р. (воз трав*ыэ*, ня купіў каз*ыэ* і інш. [2]). Такім парадкам, патрэба фонэтычнага правапісу вымагаецца ня толькі для правільнай перадачы гукаў, але нават зьместу і форм нашай мовы. Правілы-ж і законы, якім павінна падпарадкавацца абазначэньне ў нашым правапісу дыфтонгаў, ужо часткай распрацаваны дасьледчыкамі крыўскай мовы. Нам застаецца сабраць гэтыя досьледы, дапоўніць іх, аформіць, зрабіць з іх свае аканчальныя вывады для дапаўненьня і патрэбных зьмен нашай граматыкі.

З прыведзеных прыкладаў відаць, што наш цяперашні правапіс, які вытвараўся на асобнасьцях жывой народнай мовы і мае ў сваёй істоце кірунак фонэтычнага правапісу, усё-ж такі ня ўнік вялікіх фонэтычных адступленьняў ад народнай мовы, дзякуючы запазычанай абэцэдзе. Затое ў іншых выпадках гэтае імкненьне да фонэтычнай перадачы пераўвялічана. Гэта—ужываньне ў іменах падвойных мяккіх зычных на месцы царкоўна-славянскіх канчаткаў *ніе, тіе,*

[1]) Форма гэтая таксама прыдалася-б нам для адразьненьня значэньня слоў. Прыкладам, возьмем слова „палі". З яго напісаньня ня відаць, ці гэта ёсьць імя ад слова „поле", ці дзеяслоў загаднага ладу ад „паліць". Калі-ж напішам „пал*іе*", то стане ясным, што гэта—множ. лік імені, а „палі"—загадны лад дзеяслову. Або возьмем такі сказ: „Мазалі мазалі салам". Каб гэта стала адразу зразумелым, то трэба напісаць так: „Маза*ліе* мазалі салам". Або возьмем словы „ка́т*ы*" і „кат*ы*": паняцьце іх можна адрозьніць правапісам, калі слова „кат*ы*" ў значэньні жывёлы напішам так, як гаворыць народ—„ка́т*ыэ*".

[2]) Старажытныя нашы пісьменьнікі гэты дыфтонг абазначалі ня зусім адпавядаючай літарай „ѣ".

cie, лie, жie, дie („вучэ*ньне,* жы*цьцё,* вало*сьсе,* вясе*льле,* збо*жжа,* суд*зьдзя*" заместа славянскай формы „уче*нie,* жи*тie,* вла*сie,* весе*лie,* збо*жie,* су*дiя).* Проф. Е. Ф. Карскі („Обзоръ звуковъ и формъ бѣлорусской рѣчи". Масква, 1785 г., бал. 60, § 124) у гэтым падваеньні зычных не знаходзіць „двох яўных зычных гукаў, а толькі ўсіленую вымову аднаго. Гэтым тлумачыцца і ваганьне ў зборніках беларускіх песень паміж ужываньнем простай і падвоенай зычнай": у адных зборніках знаходзім „спачыва*ньне,* спасыла*ньне*", а ў другіх—„спачыва*не,* спасыла*не*". У запісах Федароўскага і Сержпутоўскага (якія лічацца найлепшымі) пераважаючай формай у гэтым выпадку зьяўляецца ўжываньне адзіночнай зычнай: здарэ*нё*, вясе*лё*, здарэ*не* і г. пад. Гэтая апошняя форма, зусім сходная з правапісам нашай старажытнай пісьменнасьці, зьяўляецца рацыянальнай, бо ў гістарычнай фонэтыцы не сустракаецца выпадкаў, каб прапаўшае зьмякчаючае *i (j)* замянялася гукамі *н, т, с, л, ж*).*

Незразумелым таксама зьяўляецца мякчэньне гукаў *з, с, ц,* перад мяккімі зычнымі *ь,* дзе гэтыя гукі мякчацца самі сабой па закону ўпадабленьня без ужываньня пасьля іх *ь,* напр., *зь*лез, *сь*мех, *ць*век, *ць*вёрды, *зь*дзек, *сь*вяты, *сь*ціслы, *зь*дзерці, *сь*церці, *сь*се (апошняе паходзіць ад съсати—сосать, дзе *с* зьяўляецца нават аацьвярдзеўшым пад уплывам *ъ* і *о)* і г. пад. Мякчэньне *з, с, ц* у гэтым здарэньні і бяз *ь* зьяўляецца фізычнай няўнікнёнасьцю, бо нашы органы мовы, выгаварваючы які-колечы гук, у той-жа самы момант падгатаўляюцца да вымовы наступаючага гуку. Гэтае мякчэньне паказаных гукаў ёсьць, пэўна, вынікам уплыву польскага правапісу з яго спэцыяльнымі асобнымі літарамі ć, ś, ź, якія ўжываюцца нават перад цьвёрдымі складамі (ćwiczenie, świerkać, święty, świronek, szczęście, szczęsliwość, źródło). Але ў словах zliczyć, zlitować się, zlizać, związać, zwić z—цьвёрдае, у той час як мы ў гэтых здарэньнях (пэўна, па аналёгіі з злучэньнямі *цьв, сьв)* пішам *зь*лічыць, *зь*літавацца, *зь*лізаць, *зь*вязаць, *зь*віць і г. д. Дапушчэньне ўплыву польскага правапісу ў гэтым здарэньні становіцца тым больш праўд-

*) У еванг. В. Цяпінскага (1580 г.) заўважваецца падваеньне *т* у словах: третьтего Мр. 8, 31, втретьтее Мф. 26, 44. *Увага рэд.*

ным, калі скіраваць увагу на мякчэньне *з, с, ц* якраз у тым-жа злучэньні *ćw, św (цьв, сьв),* у якім яго блізка выключна дапускае польскі правапіс *).

Затым, варта зьвярнуць увагу на запрапанаваныя граматыкай Б. Тарашкевіча формы лічэбнікаў *два* і *дзьве:* род—*двух, дзьвюх;* дав.—*двум, дзьвюм;* твор.—*двумя, дзьвюма,* мес.—*двух, дзьвюх.* Узятыя ў такім выглядзе, гэтыя формы зьяўляюцца вачавіднай пародыяй на формы расійскія. Па сваёй істоце гэты лічэбнік ёсьць формай старажытнага падвойнага ліку, і таму павінен зьмяняцца згодна яго законаў, якія адпавядаюць і крыўскім народным формам гэтага слова: дв*ох*—дзьв*ё*х, дв*ом*—дзьв*ё*м, дв*а*ма—дзьв*я*ма, дв*ох*—дзьв*ё*х. Тут *ё* і *я* (у жаночым родзе) паходзяць ад стара-славянскага *ѣ* (двѣма).

Далей, прызнаючы ў прынцыпе „поўнага аканьня“, запрапанаванага проектам „да рэформы беларускага правапісу“ паважанымі гр. гр. Антонам і Язэпам Лёсікамі, трэба зазначыць; што гэта бязвыключная „паўната аканьня“ пазбавіць нашую граматыку яўна выражаных народнай мовай форм ніякага роду, які мае свае асобныя родавыяканчаткі *(о, е)* у імёнах, прыметніках, займеньніках, лічэбніках і дзеясловах. Да гэтых часоў у нашым правапісу гэтыя канчаткі часам захоўваліся, а часам (пры аднолькавых умовах) пераходзілі ў канчаткі жаночага роду *(а, я).* Гэтак, у словах *поле, насеньне, здарэньне, скляпеньне; белае, прыгожае; першае, дваццатае; якое, каторае* і г. п. канчатак ніякага роду мы захоўвалі, хоць ён і ня мае націску, тады як у словах *„вока, вуха, палена, мора; яблыка* кацілася, *поле* зарунілася“ і г. п. названы канчатак пры тых-жа ўмовах ненаціскнутасьці ўжо прымае канчатак жаночага роду. Гэтая супярэчнасьць асабліва ярка і выразна выступае пры злучэньні ў адным сказе іменаў і дзеясловаў, прыкладам: „пол*е* зарасл*о* травой і закрасавал*а* краскамі“; „Войска прытамілася і прылягл*о* адпачыць“. Чаму да слоў *поле, войска* прыда-

*) Памякчэньне мяккім знакам зычных перад наступнымі мяккімі зычнымі ў нашых старых рукапісах спатыкаецца; напр., у еванг. В. Цяпінскага: сьлепых Мф. 15, 31, сьвіренъ Мф. 21, 33, у дьверей Мф. 24, 33, сесьти Мр. 8, 6 і да т. п. *Увага рэд.*

дзены дзеясловы жаночага роду побач з дзеясловамі сярэдняга роду? Ці ня лепш было-б напісаць: „пол*е* закрасавал*о*", войск*о* прытамілас*ё*", як гэта гаворыць народ і падаюць у сваіх запісах Федароўскі і Сержпутоўскі. Гэткая-ж супярэчнасьць узьнікае пры злучэньні ў адным сказе імёнаў з прыметамі (скарочанымі), якія азначаюць прыналежнасьць: „Бацькав*а* касьс*ё*; матчын*а* верацян*о*" і г. п., заместа—бацькав*о*, матчын*о*. Каб пазбыцца гэткай супярэчнасьці і пазбавіць мешаніны і блытаніны канчаткаў жаночага і ніякага роду, трэба ва ўсіх часьцінах мовы захаваць канчаткі сярэдняга роду *(о, е)* ня толькі пад націскам, але і без апошняга. Гэта будзе вялікай палёгкай вучням (асабліва з чужаземцаў) пры навучаньні нашай граматыцы.

Азначанае правіла варта аднесьці і да канчаткаў мужчынскага роду (у прыметах, займеньніках і лічэбніках), якія часта (бяз націску) таксама прымаюць адзнаку *(а)* жаночага роду. Прыкладам: „Купі майг*ó* добраг*о* (замест *„добрага")* саканя". „Прадай мне твайг*о* пярэстаг*о* (замест *пярэстага)* сабаку". У гэтым здарэньні канчатак *аго* слушна перадае з народнай мовы Федароўскі.

Прынцып фонэтычнасьці, а ўласна закон упадабленьня, ня варта распашыраць на складаныя словы ў тых выпадках, калі гэты закон пазбаўляе кораню аднаго з складаных слоў. Прыкладам, у лічэбніках: „адзінаццаць, дванаццаць, дваццаць, трыццаць" скарочанае „дзесяць" *(=дцаць)* абарачаецца пасьля ўпадабленьня ў *ццаць,* якое пры ўсім добрым жаданьні ніяк ня можна вывесьці ад слова *дзесяць.* Асабліва пагэтае *ццаць* выглядае недарэчнасьцю пры пытаньні аб падзеле, прыкладам, слова *дванаццаць* для пераносу з аднаго радку ў другі; па правілу аб разлучэньні аднолькавых зычных трэ' было-б падзяліць для пераносу гэтак: два-нац-цаць. Але тады невядома, што абазначае другая складная часьць *нац* і трэцяя *цаць.* Калі падзяліць гэтак: *два-на-ццаць,* то тады зноў такі зьяўляецца незразумелай трэцяя часьць. Дзеля гэтага варта пісаць: *дванадцаць, трынадцаць, дваддцаць, трыдцаць* і г. д.

Выклікае таксама супярэчнасьць фонэтычны запіс складаных дзеясловаў сярэдняга і ніякага стану ў неазначальнай форме і абвяшчальным ладзе: хваліц-ца, мыц-ца, баяц-ца,

сьмяяц-ца. Чым растлумачыць тут пераход зваротнага займеньніка *ся* (=сябе) у *ца?* Проф. Е. Карскі кажа, што гэта тлумачыцца ўпадабленьнем папярэдняга гуку наступнаму або наадварот—наступнага папярэдняму. Але тут ня бачым ні першага ні другога спосабу ўпадабленьня, бо, напрыклад, у слове „хваліц-*ца* (=хвалиць*ся),* заместа мяккага канчатку *ся,* атрымліваецца цьвёрды *ца (тса),* ня гледзячы на тое, што першая часьць гэтага дзеяслову *хваліць* канчаецца мяккімі гукамі. Асабліва гэтая супярэчнасьць выразна выступае, калі, побач са скарочнай формай *хваліцца,* ужываць поўную форму *хваліці-ся:* „Мы прысelі *ахалодацца* і вадзіцы *напіці-ся".* Тут *ахалодацца* і *напіціся* для таго, хто вучыцца граматыцы, па знадворным *выглядзе* прадстаўляюць дзьве розныя формы дзеясловаў, тады як гэтага ў істоце няма. А таму, *каб пагадзіць між сабой зьмест і форму слоў, трэба пры ўстанаўленьні правапісу кіравацца таксама прынцыпам нязьменнасьці часьцей у складаных словах.* У даным выпадку гэты прынцып падтрымліваецца і жывой народнай мовай, у якой ужываюцца яўна выражаныя канчаткі *цьсе* (=цься). Гэтак, у Федароўскага чытаем *Spuszczajećsie, nahrećsie* і г. п. У старадруках чытаем гэтыя канчаткі, як *ться, тся.*

Але гэтае пытаньне знаходзіцца ў залежнасьці ад блізкага да яго другога пытаньня: ці варта наагул у нашым правапісу мякчыць гук *т* гукам *ц* (=тс), складаныя часьці якога (*т*+*с*) аднолькавай мякчыні з гукам *т.* Прыкладам, слова „рабі*ть*" аднолькава гучыць у канцы з напісаньнем „рабіць=рабі*тсь*"; „*тя*бе"—чытаем, як „цябе (=*тс*ябе). *Цеканьне* ў даным выпадку зьяўляецца толькі фізычнай няўнікнёнасьцю, фонэтычная перадача якой выклікае супярэчнасьці ў напісаньні складаных дзеясловаў і парывае традыцыі са старажытнай пісьменнасьцю.

Дапускаючы з прынцыпу „пішы, як гаворыш" адзінае выключэньне для правапісу складаных лічэбнікаў і дзеясловаў,—дзеля паступовасьці ў гэтым прынцыпе і захаваньня гістарычнай традыцыі трэ' было-б абавязкова ўстанавіць у нашым правапісу абазначэньне асноўных (скажу нават—найгалоўнейшых) уласьцівасьцяй крыўскай мовы. Гэта—дыфтонгі *уо (юо=іоу), ыэ (іе),* да разгляду якіх і прыступім.

ДЫФТОНГІ *уо* (*юо*=*іоу*), *ыэ* (*іе*). Аднэй з галоўных уласьцівасьцяй крыўскай (беларускай) мовы зьяўляецца орыгінальная вымова ў імёнах і займеньніках тых галосных гукаў, якія ў расійскай мове чуюцца, як чыстыя *о, ё, ы, і*, а ў польскай—*о, ó, іо, іó, у, і*. Для прыкладу возьмем такія словы, як „мост, воск, вол, мёд, лёд, паны, валы, мяхі, дзяцюкі; ён, мой, твой, свой—мае, твае, свае. Калі-б напісаць гэтыя словы з захаваньнем крыўскага (беларускага) акцэнту, дык трэ' было-б пісаць так: „муост, вуоск, вуол, мюод (міуод), люод (ліуод), паныэ, валыэ, мяхіе, дзяцюкіе; юон (іуон), муой, твуой, свуой—маіе, тваіе, сваіе.

Першы дэфтонг—*уо* (*юо*—*іуо*) распашыраны ў мове па ўсёй этнографічнай Крывіі (Беларусі) і вымаўляецца ў імёнах і займеньніках у сярэдзіне слоў пад націскам, толькі не заўсёды павінен быць там, дзе пішацца расійскае *о (ё)*, бо, напрыклад, у словах „карова, салома, малако, мора, сьлёзы“ і г. п. крыўскае *о (ё)* гучыць таксама, як і ў расійскай мове (літаратурнай). Правіла, якое-б цьвёрда акрэсьлівала, калі трэба вымаўляць у словах *уо* (*юо*—*іуо*) і калі чыстае *о (ё)*, няма: аб гэтым добра ведае толькі прыродны крывіч або той з чужаземцаў, хто вучыўся-б нашай мове не па кніжцы, а па наслыху. Не памыліўся-б у гэтым выпадку і ліцьвін, бо ў літоўскай мове дыфтонг **uo** вымаўляецца таксама, як і ў нас.

Другі дыфтонг—*ые* (*іе*)—вымаўляецца *заўсёды* пад націскам у канчатках імёнаў і займеньнікаў назоўнага і вінавальнага склонаў лічбы многай, напрыклад: „Паныэ і маскаліе прапілі сваіе дварыэ і апаражнілі капшукіе ад грошай“. Гэты дыфтонг распашыраны ў мове крыўскага жыхарства, пачынаючы ад Пружан і далей на поўнач і ўсход праз Горадзеншчыну, і, датыкаючыся Навагорадка, Несьвіжа і Слуцку, пераходзіць вузкім паясом праз Чарнігаўшчыну ў усходнюю Смаленшчыну і праяўляецца ў Вяліскім і Вялікалуцкім паветах.

Цяпер, калі зьвернем увагу на тое, што з дыфтонгу *уо* (*юо*—*іуо*) у нашым правапісу пакінута *о*, г. зн. тая частка дыфтонгу, на якой чуецца пры гаворцы большы націск, то па аналёгіі варта было-б зрабіць тое-ж і з дыфтонгам

ые (іе), якія вымаўляюцца з большым націскам на *э (е)*. Такім чынам, калі ўжо пайшло на тое, каб кожнаму гуку ў нашай мове адпавядала толькі адна літара, то больш рацыі было-б пісаць „зьвярэ, ваўке", чым „зьвяры, ваўкі", бо *э (е)* у канцы слоў ня так ясна гучыць, як *ы (і)*, і таму лепш захоўвае ўласьцівасьць дыфтонгу *ыэ (іе)*. У займеньніках „мае, твае, свае" гэта ўжо зроблена, дык чаму-ж не пашырыць гэтага правіла і на імёны?

Наагул-жа ўніканьне ў нашым правапісу прыгожых і арыгінальных акцэнтных уласьцівасьцяй мовы спосабам замены данага дыфтонгу аднэй літарай расійскай абэцэды— зьявішча штучнае і надта шкоднае для захаваньня натуральнай чыстаты мове. Апрача таго, няяснае акцэнтаваньне дыфтонгаў стварае многа непаразуменьняў і труднасьцяй для тых, хто вучыцца мове з літаратуры, бо, акцэнтуючы арыгінальныя дыфтонгі асобнымі літарамі расійскай абэцэды, мы зробім са сваіх кніжных вучняў такіх беларусаў, якія будуць гаварыць пакрыўску, але з маскоўскім акцэнтам. А як цяжка вучыцца мове тады, калі напісанае не адпавядае таму, як трэба чытаць,—у гэтым, можа, праканаўся кожны, хто спрабаваў вучыцца (з кнігі) ангельскай мове, у якой словасклад у большасьці францускі і не адпавядае ангельскаму акцэнту і вымове. Для прыкладу возьмем хоць такія словы: пішацца—idol, чытаецца *айдл*—балван; station—стэйшн—месца; commission—камішн—даручэньне; reason—різн—прычына, слушнасьць і г. д. Такія-ж супярэчнасьці могуць быць і для таго (з чужаземцаў), хто возьмецца вучыцца крыўскай мове; напр., у слове *соль* павінен будзе чытаць *о*, як *уо*, а ў слове *вочы*, як чыстае *о*. Дык ня лепш было-б пісаць так, як гаворыцца? Праўда, што на пісаньне цалком дыфтонгаў трэ' было-б траціць час і, значыць, грошы, але на завучваньне таго, як і ў якім слове чытаць адну і тую-ж літару таксама трэба ня менш часу.

Дык урэшце-рэшт, каб захаваць прыгоства і арыгінальнасьць нашай мовы, каб унікнуць непаразуменьняў і труднасьцяй пры навучаньні яе, і каб ня ўхіліцца разам выгоднасьці ў абазначэньні кожнага гуку аднэй літарай,—варта было-б прыдумаць для дыфтонгаў *уо (юо—іуо), ыэ (іе)* асобныя літары.

Вышэйпаданымі недахватамі нашага правапісу, ведама-ж, ня вычарпаны ўсе спрэчнасьці нашай пісоўні, якая, маючы на мэце перадачу фонэтычных асобнасьцяй крыўскай мовы, у той самы час далёка не дасягае гэтай мэты. Наш правапіс дасягнуў толькі фонэтычнай перадачы *канчаткаў* слоў (прыкл.: прышо*ў*, зрабі*ў*, сядзе*ць*, спа*ць*, вало*ў*, кро*ў*, сьпі*цца*, сядзі*цца*). Але фонэтычная адменнасьць апошніх яшчэ не акрасьляе самабытнасьці нашай мовы ў сям'і славянскіх моваў. Самабытнасьць мовы акрасьляецца яе гукавымі асобнасьцямі ў *каранёх* слоў, а гэтыя асобнасьці якраз нашым правапісам не перадаюцца. Так, пішучы: „звон, поп, мёд, месяц, горкі, моцны, толькі, бойся, хлеб, грэць“,—мы перадаем гэтым правапісам гукавыя асобнасьці расійскай мовы, тады як у каранёх гэтых нашых слоў ясна чутны крыўскія дыфтонгі *уо* (*іуо*), *ыэ* (*іе*). У выніку гэтага наша старая і самабытная мова, дзякуючы сучаснай граматыцы і правапісу, якія зафіксавалі толькі асобнасьці *канчаткаў* слоў, а ў *каранёх* пакінулі расійскі правапіс,—выглядае провінцыяльным дыялектам расійскай мовы, а гэтае апошняе зьяўляецца перашкодай адраджэньню нашай пісьменнасьці. Бо як-жа можна гаварыць *аб адраджэньні* яе, калі з правапісу ня відаць, што наша пісьменнасьць калісьці знаходзілася на высокай ступені разьвіцьця з выпрацаванымі, згодна фонэтычным асобнасьцям *жывой* народнай мовы, формамі правапісу, сходнымі з *цяперашнімі* асобнасьцямі нашай мовы? Мы ведаем, што ня толькі ў слове, як зьмесьце народнай мысьлі, але і ў форме гэтага слова, у кожным паасобку гуку яго ці злучэньні гукаў—адбіваецца гісторыя народу. Дык трэба-ж дасягнуць таго, каб нашы словы, формы і гукі на пісьме былі адбіцьцём гісторыі нашай пісьменнасьці, гісторыі крыўскага, а не расійскага ці польскага народаў, сярод моваў якіх наша пісьменная мова выглядае цяпер, як толькі провінцыяльная адмена, або, як гаворыць Бессонаў, „промежутокъ и недоумокъ“. Каб пазбавіцца гэтых прадузятых поглядаў аб провінцыяльнай адменнасьці і „промежуточности“ нашай народнай і пісьменнай мовы, мы павінны пайсьці насустрач вымаганьняў ідэі крыўскага нацыянальнага адраджэньня і стварыць гістарычна-фонэтычны правапіс, у якім-бы адбівалася як гісторыя нашай багатай у

старажытнасьці пісьменнасьці, так лексычныя і фонэтычныя асобнасьці крыўскай мовы. Для нас гэта тым болей магчыма і патрэбна, калі прыняць пад увагу, што наша пісьменнасьць да паловы XVI стал. ў сваім правапісу ўжо перадае немаль усе гукавыя асобнасьці нашай *сучаснай* мовы.

Багдановіч А. Паважны сход! Я ня буду доўга затрымліваць вашае ўвагі, бо цалком далучаюся да думкі кол. Някрашэвіча, што тут у нас ужо многа гаварылася аб проекце бр. Лёсікаў. Нам цяпер ужо трэба з усяго тут казанага рабіць вывады. Праўда, гэтыя вывады яшчэ раней мяне зрабіў кол. Німчынаў, кажучы, што так званае поўнае аканьне і яканьне зьяўляецца проектам, які зусім не пабудаваны на фонэтычным прынцыпе. З апошнім, здаецца, згаджаюцца ўсе, нават аўтары проекту, як Антон Лёсік. А калі сам аўтар проекту згаджаецца з тым, што іх проект не адбівае фонэтычнага прынцыпу, і калі ўсе прамоўцы добра падкрэсьлілі гэта— значыць, нам патрэбна знайсьці які-небудзь выхад, пайсьці на які-небудзь компроміс. Сам-жа Антон Лёсік кажа, што нам трэба якім-небудзь спосабам запісаць няясны, рэдукаваны гук. І вось, па думцы кол. Німчынава, нібыта такім компромісам і зьяўляецца проект братоў Лёсікаў, якія прапануюць ува ўсіх выпадках праз літару *я* адзначаць ненаціскное *е*. Я з гэтым ніяк не магу згадзіцца, бо кожны компроміс павінен мець элемэнты ўступак. У проекце бр. Лёсікаў мы гэтага ня бачым. Тут усе віды аканьня азначаюцца адным спосабам: кожнае ненаціскное *е* пішацца праз *я*, не зважаючы на тое, што ў нас нават у так званым моцным аканьні мы не заўсёды пачуем у ненаціскных складох *я*. Значыць, ніякага компромісу ў гэтым проекце няма. І я лічу, што якраз найбольш компромісным зьяўляецца правапіс Тарашкевіча, бо Тарашкевіч у сваім правапісу імкнецца здаволіць усе тыпы аканьня. Я з правапісам Тарашкевіча адносна яканьня згаджаюся, хоць яго правіла з практычнага боку зьяўляецца досыць цяжкім для вывучэньня. І вось цяпер перад намі паўстае задача спросьціць правіла Тарашкевіча адносна ненаціскнога *е*. На мой погляд, зьмена павінна заключацца ў тым, каб выкінуць усе тыя адхіленьні, якія зьяўляюцца найбольш цяжкімі ў гэтым правіле, а найбольш цяжкім зьяўляецца напісаньне *я* ці *е* ў другім складзе перад націскам.

Гэта якраз пярэчыць і мэханізму пісаньня, бо прымушае кожнага заўважаць, ці ёсьць у першым складзе перад складам з націскам *а* ці *я* або іншыя галосныя. Значыць, гэта момант, найбольш цяжкі ў правапісу Тарашкевіча, і мне здаецца, што яго можна спросьціць тым, што заўсёды пісаць у гэтых выпадках *е*. Што датычыцца таго, што нібыта гэткай рэформай могуць быць нездаволены ўсе мясцовасьці Беларусі, то гэта пэўна ня так, бо апошні компроміс будзе найбольш практычны і лёгкі для школ, ды, урэшце, і самае пытаньне аб ім выклікана, галоўным чынам, практычнымі патрэбамі. Такім чынам, дапусьціўшы гэты компроміс, мы разам з тым пойдзем насустрач масам і палегчым навучаньне правапісу ў нашай школе. Мне здаецца, што аўтары самі адмовяцца ад свайго проекту, бо яны павінны былі ўжо ўпэўніцца, што фонэтычны прынцып нельга правесьці, а таму і няма ніякай патрэбы ісьці на крайнасьць, каб зноў выклікаць нездаваленьне мас, асабліва тых мясцовасьцяй, дзе няма так званага „моцнага аканьня“. А між тым компроміс—правіла Тарашкевіча—спрошчанае тым, што ў другім складзе перад складам з націскам патрэбна будзе пісаць заўсёды *е*, зробіць пісаньне вельмі лёгкім. Яно ня будзе пэўна фонэтычным напісаньнем, але ня будзе цяжкім з практычнага боку. Тут аўтары-дакладчыкі казалі, што ў словах *будзя, гуляя* ясна чуецца *я*, і напісаньне *е* бывае цяжка растлумачыць, чаму яно тут ужываецца. Я згодзен з тым, што ў значнай частцы дыялектаў у гэтых формах мы пачуем *я*, але напісаньне *е* ў такіх разох вельмі лёгка растлумачыць, калі мы маем побач формы з ясным вымаўленьнем *е* (пад націскам), як *ідзе, вядзе*. Кажуць, што на практыцы гэта вымагае ад вучня вялікай напружанасьці—гэта няправільна. Так можна толькі казаць для таго, каб падкрэсьліць неабходнасьць правесьці тое ці іншае сваё правіла.

Мачульскі. Я ўвесь час, глыбака паважаныя грамадзяне, хацеў, каб хто-небудзь на Конфэрэнцыі грунтоўна давёў, што фонэтычны прынцып ува ўсіх выпадках зьяўляецца найлепшым пры ўстанаўленьні правапісу беларускае мовы. У брошурах, якія былі выдадзены для Конфэрэнцыі, сказана, што фонэтычны прынцып магчыма прыняць цалком толькі для некаторых моваў. Але ёсьць такія мовы, у якіх поў-

насьцю праводзіць фонэтычны прынцып зьяўляецца немагчымым, як, напрыклад, француская мова. Калі мы возьмем дасьледаваньне францускай мовы, то пабачым, што пры ўвядзеньні фонэтычнага прынцыпу ў францускай мове патрэбна было-б па восем і больш слоў, якія паходзяць ад розных каранёў, адзначаць адным і тым-жа напісаньнем. Напрыклад, cent—сто, sang—кроў, sans—без, sens—сэнс і іншыя словы (sent, s'en), што маюць розныя значэньні, патрэбна было-б, згодна фонэтычнага прынцыпу, азначаць на пісьме адным словам *san*. Як бачыце, таварышы, такі прынцып напісаньня слоў прывёў-бы да надзвычайнай блытаніны, напрыклад, у слоўніку, дзе словы, як вядома, групуюцца, па магчымасьці, сем'ямі, родных слоў, якія паходзяць ад аднаго кораню, бо пры фонэтычным напісаньні слоў у францускай мове зусім губляецца іх гістарычны твар. Ці ня можа вынікнуць гэткая-ж мешаніна ў асобных выпадках у беларускай мове пры поўным правядзеньні фонэтычнага прынцыпу? У мяне, паўтараю, такое ўражаньне, што на Конфэрэнцыі ніхто не давёў, што фонэтычны прынцып ува ўсіх выпадках зьяўляецца найлепшым для беларускае мовы.

Сёньня ў сваім выступленьні т. Лёсік Антон між іншым сказаў: „Калі мы будзем пісаць *цяцярук,* і калі мы будзем таксама вымаўляць гэта слова, то гэта будзе непаразуменьнем“. Значыць т. Лёсік Антон лічыць, што пісаць мы будзем так, а вымаўляць інакш. Але не заўсёды так бывае, бо напісаньне таго ці іншага слова мае ўплыў і на вымаўленьне яго. Гэта бясспрэчна. Напрыклад, калі возьмем такія словы, як *зельле, насеньне* і інш., то што мы тут можам пабачыць? Мы бачым, што тут графіка робіць уплыў на вымаўленьне. Як вядома, тут ніякіх падвойных гукаў няма; тут проста працяглы гук, які ўмоўна, за адсутнасьцю значкоў, у нашым правапісу адзначаецца падвойнай літарай, і, апрача таго, паміж імі ставіцца мяккі знак. І вось у школах вучні, пад уплывам напісаньня, чытаюць гэтыя словы з перарывам на мяккім знаку—*зель-ле, насень-не,* між тым як тут маецца толькі адзін працяглы гук. Можна прывесьці шмат прыкладаў у пацьвярджэньне таго палажэньня, што напісаньне слова мае ўплыў і на вымаўленьне яго. Гэта з аднаго боку. З другога боку сёньня якраз Лёсік казаў аб тым, што ў большасьці

беларускіх дыялектаў распаўсюджана поўнае аканьне (і *яканьне),* але ня прывёў прыкладаў з гэтых дыялектаў. Магчыма, што пры далейшым разглядзе спрэчных правіл правапісу гэтае палажэньне Лёсікам будзе абаснавана. Па тых-жа працах, якія вышлі з друку, можна лічыць адваротнае, г. зн., што аканьне зьяўляецца ў большасьці гутарак, а калі ўзяць яканьне (умоўна кажучы, вядома), то яно не заўсёды пануе там, дзе назіраецца аканьне. І калі падлічыць тэрыторыяльна, то яканьне спатыкаецца ў меншасьці дыялектаў. Тыя дасьледаваньні, якія маюцца ў акадэміка Карскага, і тыя дасьледаваньні, якія вядуцца С. М. Некрашэвічам, праф. Бузуком і Воўк-Левановічам, даводзяць, што поўнага аканьня (і яканьня) у беларускіх дыялектах няма. Калі ўзяць тыя матар'ялы, якія зараз накіроўваюцца з усіх куткоў Беларусі ў Інбелкульт (некаторыя з іх я чытаў і рабіў у некаторых выпіскі), то з іх відаць, што ў беларускіх гутарках, бязумоўна, пануе аканьне. Яканьне ў большасьці запісаў адсутнічае. Вядома, гэтыя запісы нельга лічыць дакладнымі, бо яны не рабіліся спэцыялістамі-мовазнаўцамі, але ўсё-такі прывесьці гэта тут цікава. Я выбіраў запісы, якія рабіліся ня вельмі адукаванымі людзьмі, бо лічыў, што, магчыма, неадукаваныя людзі ўсё-такі будуць больш-менш адбіваць ясную гутарку, ня ведаючы добра правапісу. І ў гэтых матар'ялах мы ня можам знайсьці поўнага адбітку яканьня, а з гэтае прычыны я лічыў-бы, што тут патрэбна нам давесьці, што яканьне апіраецца на большасьць гутарак Беларусі. Грунтуючыся на тых дасьледаваньнях, якія маюцца ў нас аб беларускіх дыялектах, гэтае зьявішча ні ў якім выпадку нельга лічыць даведзеным.

Некрашэвіч. У сваім заключным слове мне мала чаго застаецца дадаць к майму дакладу: „Да рэформы беларусскага правапісу“. Блізка ўсе, што выступалі па гэтым пытаньні, у асноўным згодны са мной: проект А. і Я. Лёсікаў, як неналежна апрацаваны, запраўды нельга палажыць у аснову рэформы нашага правапісу.

Аднак, разгледзім, якія довады за проект Лёсікаў выставілі ў спрэчках прыхільнікі проекту. Тут мне прыходзіцца перш за ўсё сказаць аб прамове доц. Німчынава, які, здаецца, адзін выступаў за падтрыманьне проекту цалком. Цікава разгледзець, чым ўгрунтоўвае свае довады доц. Нім-

чынаў. Ён кажа, што на аснове народных гутарак нельга будаваць правапіс літаратурнай мовы, што народная мова— гэта цэлае мора гутарак,—то больш блізкіх да літаратурнай мовы, то больш далёкіх ад яе. А таму правапіс трэба будаваць на аснове літаратурнай мовы, на аснове літаратурнага вымаўленьня. І вось, у мэтах прастаты, Німчынаў знаходзіць, што проект Лёсікаў (шырокае яканьне) з посьпехам вырашае гэтую задачу.

Але ўсё гэта было-б добра, каб у нашай літаратурнай мове было шырокае яканьне. Тады чаму-ж бы не згадзіцца з проектам Лёсікаў і з довадамі за яго Німчынава. Аднак, у нашай літаратурнай вымове (можа, гэта доц. Німчынаву, як украінцу, невядома) шырокага (поўнага) яканьня няма. А таму, калі-б мы згадзіліся з поглядамі Німчынава, то мы гэтым-бы парушылі асноўны фонэтычны прынцып нашага правапісу, супроць чаго так востра выступаюць аўтары проекту, і з чым бязумоўна згодна ўсё наша грамадзянства.

Аднак, асноўная думка доц. Німчынава, што правапіс трэба будаваць на грунце літаратурнага вымаўленьня, заслугоўвае ўвагі, каб на ёй трохі спыніцца. У сваім дакладзе я не гаварыў аб сувязі правапісу з літаратурным вымаўленьнем, але што такая сувязь павінна быць, аб гэтым ня можа быць і гутаркі. Поўная адпаведнасьць правапісу да літаратурнага вымаўленьня—вось той ідэал, да якога мы ўсе імкнемся. Калі-ж гаварыць аб дапасаваньні нашага правапісу (правапісу Б. Тарашкевіча) да літаратурнага вымаўленьня, то трэба сказаць, што тут дапасаванасьць поўная. Наш правапіс з яго абмежаваным яканьнем і шырокім аканьнем у поўнай меры адпавядае літаратурнаму вымаўленьню. Ніякіх грунтоўных зьмен тут быць ня можа, бо іначай будзе неадпаведнасьць. Наша літаратурная мова, консолідаваўшы народныя гутаркі, вырасла ўжо ў сталы організм, які не патрабуе над сабой грунтоўных, накшталт шырокага яканьня, опэрацый. Зьмены ў ёй могуць быць толькі дробныя.

Па пытаньні аб правапісу мы чулі доўгую прамову В. Ластоўскага. Прамова бязумоўна цікавая, аднак, яна мае мала адносін да правапісу; гэта ў большасьці разгляд тых ці іншых форм нашай літаратурнай мовы, якое пытаньне не ўваходзіць у програму нашай Конфэрэнцыі. Закранутыя

Ластоўскім пытаньні патрабуюць першапачатковага разгляду ў Камісіі па ўстанаўленьні форм літаратурнай мовы, пасьля ўжо ў Правапіснай Камісіі.

Гаварылася тутака і аб іншых пытаньнях правапісу, якія ня былі закрануты ў дакладах; напр., Я. Троська высунуў пытаньне аб правапісу канчаткаў чужаземных слоў; гаварылася аб правапісу складаных слоў і інш. На мой погляд, каб не раскідацца, мы павінны абмяркоўваць толькі тыя пытаньні, якія высунуты дакладчыкамі, бо іначай мы ні да чога не дагаворымся. Бязумоўна, кожны з нас можа высунуць па некалькі правапісных пытаньняў, але ўсе такія пытаньні спачатку павінны абмяркоўвацца і апрацоўвацца ў поўнай правапіснай камісіі.

Значыць, сягодня мы павінны вырашыць конкрэтнае пытаньне—аб фонэтычным прынцыпе адносна галосных і зычных і іншыя больш дробныя пытаньні, якія былі высунуты дакладчыкамі.

Што да фонэтычнага прынцыпу галосных, то ён ніякіх спрэчак не выклікае. Яго мы ў правапісу пакідаем. Толькі павінны мы яго пакінуць не ў рэдакцыі Лёсікаў, а ў рэдакцыі Б. Тарашкевіча з тымі зьменамі, якія ўнесены былі ў дакладзе мною (адносна другога складу перад націскам), і з якімі зьменамі на пленуме Конфэрэнцыі згадзіўся Я. Лёсік.

Зусім іншая справа—фонэтычны прынцып правапісу зычных, якое пытаньне было высунута ў дакладзе Я. Лёсіка.

Гэтае пытаньне для мяне зусім новае. У Правапіснай Камісіі яно не абгаворвалася. Аб ім я ў першы раз пачуў толькі на Конфэрэнцыі. Думаю, што ў такім-жа стане знаходзяцца і іншыя члены Конфэрэнцыі. А таму я лічу, што пытаньне аб частковым пашырэньні фонэтычнага прынцыпу і на зычныя, як пытаньне не належна апрацаванае, павінна быць зьнята з програмы нашых пасяджэньняў.

Гаворачы аб фонэтычным прынцыпе галосных, мы ня можам абыйсьці вельмі балючага пытаньня ў нашым правапісу,—пытаньня аб правапісу ненаціскнога *о* ў чужаземных словах, якое прапануецца поўнасьцю пісаць праз *а*.

Адносна выключэньня мяккага знаку паміж падвойнымі галоснымі і пасьля мяккіх зычных, калі яны стаяць перад наступнымі мяккімі зычнымі, усьлед за аўтарамі про-

екту выказаліся доц. Німчынаў і проф. Бузук, знаходзячы гэткае выключэньне *ь* мэтазгодным, хоць большасьць прамоўцаў выказалася супроць падобнага выключэньня. Але мне здаецца, што і Німчынаў і Бузук, як украінцы, не ўлавілі характэрнай мяккасьці нашых сьвісьцячых гукаў, якія бязумоўна значна розьняцца і ад расійскага і ад украінскага вымаўленьня, дзе яны больш цьвёрдыя (звер, звір). А таму, калі яшчэ можна гаварыць аб выключэньні мяккага знаку паміж падвойнымі зычнымі, якія фактычна зьяўляюцца працяжнымі зычнымі, то ўжо няма ніякай падставы гаварыць аб выключэньні мяккага знаку ў другім выпадку, пасьля мяккіх зычных перад наступнымі мяккімі. Экономічны бок тут ня пры чым. Калі мяккі знак абходзіцца дорага, трэба гэткае абазначэньне замяніць другім спосабам. Але апошняе ўжо справа графікі.

Іншыя з запрапанаваных Лёсікамі пунктаў рэформы, апрача *й,* прыхільнікаў не знайшлі, а таму я аб іх гаварыць ня буду.

У канцы выкажу свой погляд на далейшую працу па рэформе нашага правапісу. Я лічу, што нам працу ўсё-такі трэба пачынаць з дасьледаваньня нашых гутарак. Пасьля нам трэба будзе апрацаваць падрабязны проект нашага правапісу, дзе запраўды знойдуць месца ўсе „спрэчныя“ пытаньні нашага правапісу. І толькі пасьля шырокіх водзываў аб гэтым проекце мы зможам канчаткова паставіць пытаньне аб рэформе нашага правапісу. Праца цяперашняй Конфэрэнцыі—гэта толькі першы этап на шляху да рэформы нашага правапісу.

Язэп Лёсік. Таварышы! Як на пленуме Конфэрэнцыі, так і тут гавораць аб беларускай дыялектолёгіі, а не аб беларускім правапісу. Гэта зусім няцікава, бо кожнаму вядома, што нашая мова, як і мова кожнага іншага народу, мае свае асобныя дыялекты. Калі ўжо гаварыць аб дыялектах, дык трэба высьветліць асаблівасьці таго дыялекту, які ляжыць у аснове нашай літаратурнай мовы. Але асаблівасьці гэтага дыялекту ўсім даўно вядомы; яны вызначаны Б. Тарашкевічам у яго прадмове да „Беларускае граматыкі для школ“. У аснове нашай літаратурнай мовы ляжыць той дыялект, што мае вялікае аканьне і цьвёрдае *р.* З гэтым ніхто не спра-

чаецца. Гэты дыялект ляжыць і ў аснове нашага правапісу. Значыць, гаварыць, што ў нас ёсьць дыялекты з дысыміляцыйным або з мерным аканьнем, пры рэформе правапісу зусім дарэмная трата часу.

Мы ўсе прымаем прынцыпы Тарашкевічаўскага правапісу; трэба толькі выправіць тыя недакладнасьці і труднасьці, якія робяць наш правапіс маладаступным шырокім народным масам і якія часам зьбіваюць з толку і нас, сталаграматных інтэлігентных людзей. Аб гэтых труднасьцях і недакладнасьцях я гаварыў у сваім дакладзе.

Трэба паслухаць, на што наракае нашая школа, нашае грамадзянства. Яны патрабуюць спрашчэньня правапісу, паказваючы, што ў нас аканьне перадаецца на пісьме надзвычайна хітра. Кажуць, што Тарашкевіч зрабіў мудра, абмежаваўшы нашае аканьне, а я скажу, што лішняе мудраваньне—дураваньне. Гэтае лішняе мудраваньне робіць наш правапіс больш цяжкім, як стары расійскі з букваю ѣ.

Спытайце ў настаўнікаў, і яны вам скажуць, што найгоршая бяда ў нашым правапісу—гэта тыя правілы, што абмяжоўваюць аканьне.

На Ўсебеларускай Літаратурна-Лінгвістычнай Конфэрэнцыі, што адбылася сёлета пры Белар. Дзярж. Унівэрсытэце, я чытаў свой проект рэформы беларускага правапісу. На Конфэрэнцыі былі настаўнікі з усіх куткоў Савецкае Беларусі. І што-ж? Не зважаючы на тое, што ўсе опонэнты выступалі проціў майго проекту, усё настаўніцтва пераважнаю большасьцю галасоў проціў 2-3 чалавек прыняло мой проект і вынесла адпаведную рэзолюцыю. Да гэтае рэзолюцыі прылучыліся потым Вышэйшыя Курсы Беларусазнаўства ў Менску, дзе вучацца настаўнікі таксама з усяе Савецкае Беларусі.

Вось гэтая рэзолюцыя:

„Усебеларуская Літаратурна-Лінгвістычная Конфэрэнцыя, скліканая БДУ з 20 па 24-ае верасьня 1926 году у сваім пасяджэньні 23-га верасьня, заслухаўшы даклад Я. Ю. Лёсіка на тэму аб рэформе беларускага правапісу і садаклад тав. Левановіча, ухваліла рэзолюцыю наступнага зьместу:

1) Конфэрэнцыя прызнае канечную і безадкладную патрэбу рэформы беларускага правапісу, каб зрабіць яго лёгкім, простым і даступным для школы і шырокіх працоўных

мас, бо цяперашні правапіс патрабуе шмат часу і энэргіі на навучэньне некаторых цяжкіх і непатрэбных правіл.

2) Дзеля гэтага Конфэрэнцыя лічыць патрэбным правясьці поўнасьцю фонэтычны прынцып у напісаньні галосных гукаў, маючы на ўвазе фонэтыку цэнтральнага дыялекту, які лёг у аснову літаратурнае мовы, аб якім Б. Тарашкевіч кажа, што гэты дыялект—„найбольш чыстая гутарка беларускае мовы, што мае цьвёрдае *р* і мяккае аканьне“. Адным са спосабаў для правядзеньня фонэтычнага напісаньня галосных зьяўляецца поўнае аканьне на пісьме.

3) Што да правапісу гукаў *у* і *і* нескладовых,—Конфэрэнцыя знаходзіць, што яны чуваць выразна і павінны пісацца толькі ў сярэдзіне і ў канцы слова, а калі гэтыя гукі стаяць асобна або ў пачатку слова, то для спрашчэньня правапісу павінны запісвацца *у* і *і* складовымі.

4) Што датычыцца зычных, то ў напісаньні іх пашырыць фонэтычны прынцып і дапусьціць азначэньне асыміляцыі звонкіх і глухіх у сярэдзіне слова, але не ў канцы слова.

5) Што датычыцца напісаньня чужаземных слоў, то Конфэрэнцыя знаходзіць, што гэта пытаньне стаіць ня так востра для школы і працоўных мас і пераносіць яго на разьвязаньне Акадэмічнае Конфэрэнцыі, якая адбудзецца ў лістападзе г. г.“.

А вось рэзолюцыя Вышэйшых Курсаў Беларусазнаўства:

„Протокол № 3 агульнага сходу студэнтаў Вышэйшых Курсаў Беларусазнаўства ад 15-га лістапада 1926 г.

Парадак дня:

1. Разгляд пытаньня па рэформе правапісу беларускае мовы.

2. Бягучыя справы.

Слухалі: 1. Разгляд пытаньня па рэформе правапісу беларускае мовы.

Пастанавілі: Займаўшыся ў пачатковых школах і сямілетках і праводзячы практычна вывучэньне існуючага правапісу беларускай мовы, мы ўпэўніліся, што правесьці рэформу правапісу беларускай мовы неабходна, бо, па існуючых прынцыпах бел. пісьма, памянёнае вывучаецца штучна бяз пэўнае паступовасьці, што складае асаблівую цяжкасьць па вывучэньні бел. мовы.

Азнаёміўшыся дэтальна з пропозыцыяй рэформы правапісу, агульны сход студэнтаў ВКБ выказвае сваю думку аб рэформе і цалком далучаецца да рэзолюцыі Ўсебеларускае Літаратурна-Лінгвістычнае Конфэрэнцыі ад 20-га верасьня 1926 г., якая пры гэтым далучаецца, дадаючы яшчэ неабходнасьць азначаць на пісьме літары *дж* і *дз* аднэй літарай з умоўным значком. Старшыня сходу *Бабковіч*, сэкрэтар *Арабей*.

За поўнае аканьне на пісьме таксама стаяць нашыя слаўныя пісьменьнікі Якуб Колас і Янка Купала, а Цішка Гартны праводзіў яго ў газэце „Дзяньніца“, якую ён рэдагаваў. Поўнае аканьне можна бачыць у артыкуле Ц. Гартнага, зьмешчаным у „Курсе белоруссоведения“.

Усе выступленьні процiў поўнага аканьня на пісьме, як і наагул процiў рэформы нашага правапісу, я аб‘ясьняю дзьвюма прычынамі: 1) людзі пасьпелі ўжо прывыкнуць да цяперашняга правапісу, 2) думаюць, што поўнае аканьне будзе „брыдка“ выглядаць. Я сам некалі саромеўся нават таго няпоўнага аканьня, што ўводзіў Тарашкевіч у сваім правапісу, і думаў: „Ну, як гэта можна пісаць—*бяда, дзяржава, лясы*, калі трэба пісаць: *беда, дзержава, лесы*. Гэты сорам выклікаўся прывычкаю да расійскага этымолёгічнага пісьма. Нашы сяляне, рабочыя, нашыя школьнікі, незнаёмыя з расійскім пісьмом, ня ведаюць гэтага сораму і запісваюць кожнае ненаціскное *е—о* літарамі *я—а*.

Прыпомнім, што казаў проф. Растаргуеў, калі выступаў процiў поўнага аканьня. Ён казаў: „Я решительно против того, чтобы писать „пяравярнуцца“. Чаму? А я скажу, што я „решительно против того“, каб пісаць „перавярнуцца“. Ці-ж гэта довады, ці-ж гэта аргумэнты? Чалавек навукі павінен мець і навуковыя довады, а ня голыя заяўленьні. Людзям не падабаецца поўнае аканьне, яно здаецца ім брыдкім, няпрыгожым, дык яны пачынаюць яго ўтрыраваць і высьмейваць. Але—даруйце—гэтак можна высьмеяць і кожнае пісьмо, напрыклад, расійскае, калі напісаньне слова мае шмат аднолькавых галосных: *голова, мороз, перевернуться*. Чым літары *е—о* лепшыя ці прыгажэйшыя за *я—а*—не разумею! Проф. Растаргуеву не выпадае аргумэнтаваць довадамі, прадыктаванымі асабістым густам; яму трэ‘ было даць навуко-

вае абаснаваньне, а не адмахвацца насьмешкамі, бо гэта ненавукова і нясур'ёзна.

Тут часта злоўжываюць словам „навука". Скажуць— навука, і ўсё пакрываецца туманам, у людзей апускаюцца галовы: што-ж? Навука процiў поўнага аканьня. Тым-жа часам і проф. Растаргуеў і іншыя кіруюцца тут не навукаю, а сваімі густамі, а часта сваімі асабістымі меркаваньнямі, бо ніякай навуковай падставы няма, каб баяцца поўнага аканьня на пісьме. Калі мы зрабілі адзін крок, калі мы кожнае ненацiскное *о* або *э* не саромеемся запісваць літараю *а,* то трэба запісваць і ненацiскное *е* літараю *я,* бо нашая літаратурная мова ня ведае ненацiскнога гуку *е,* як ня мае яна ненацiскных гукаў *о* і *э.*

Кажуць, што пры поўным аканьні будуць блутацца на пісьме розныя морфолёгічныя формы. Наіўная ўвага! Наш правапіс не баіцца зьмяшэньня гэтых форм на пісьме, як не баіцца яго жывая народная мова. Мы гаворым і пішам *мора, сэрца, кажа, рэжа, піша,* не зважаючы на тое, што ў гэтых словах на канцы быў некалі гук *э,* і не баючыся таго, што назоўны склон ад *мора, сэрца* супадае з родным склонам ад гэтых слоў—*мора, сэрца.* То чаму-ж ня пісаць нам: *поля, здарэньня; чытая, гуляя* замест—*поле, здарэньне; чытае, гуляе?* Так не гавораць? Няпраўда, там, дзе скажуць: *мора, сэрца, піша, кажа,* там скажуць і—*поля, здарэньня, чытая, гуляя* і г. далей.

Тут прабавалі аддзяліць аканьне ад яканьня. Але з навуковага боку ніякага яканьня няма. Яканьне—гэта проста тэхнічны, лінгвістычны тэрмін; больш нічога. Калі мы гаворым аб яканьні, то разумеем, што на пісьме будзе мяккі зычны, а за ім—літара *а.* У жывой мове розьніцы паміж аканьнем і яканьнем няма.

Старшыня: Спрэчкі па дакладах скончыліся. Мы толькі што заслухалі заключныя словы дакладчыкаў. Цяпер Прэзыдыум прапануе перайсьці да конкрэтных пунктаў рэформы і разглядзець іх у наступным парадку: 1) аканьне ў беларускіх словах; 2) аканьне ў чужаземных словах; 3) правапіс *ў* і *й;* 4) правапіс *ц, з, с, дз* перад мяккімі зычнымі і 5) правапіс роднага і меснага склонаў. Апрача таго, падымалася пытаньне аб пашырэньні фонэтычнага прынцыпу на зычныя,

аб выключэньні *ф* і аб правапісу канчаткаў чужаземных слоў на *ыя; ія.*

Першыя пяць пунктаў Прэзыдыум прапануе ўключыць у програму працы Камісіі, а калі хопіць часу, то разглядзець і апошнія пытаньні.

Некрашэвіч і Чаржынскі выказваюцца, каб апошнія тры правапісных пытаньні, пакольні яны ўзьніклі ў процэсе працы самой Конфэрэнцыі і першапачаткова не абмяркованы, у програму працы Камісіі ня ўключаць.

Старшыня: Пропозыцыю Прэзыдыуму стаўлю на галасаваньне. Хто за тое, каб уключыць у програму нашай працы агалошаныя мною першыя пяць правапісных пытаньняў? (Большасьць). Хто за тое, каб уключыць у нашу програму апошнія тры пытаньні: 1) аб пашырэньні фонэтычнага прынцыпу на зычныя, 2) аб выключэньні *ф* і 3) аб канчатках чужаземных слоў на *ыя, ія?* (Меншасьць).

Такім чынам, большасьцю галасоў прыняты першыя пяць пунктаў і адхілены апошнія тры.

Старшыня: У Прэзыдыум паступіла пропозыцыя абмежаваць прамоўцаў 5 мінутамі. Хто за пропозыцыю? (Большасьць).

Слова па першым пункце нашай програмы (аб аканьні) мае член Інбелкульту М. Байкоў.

Байкоў. Я хачу сказаць адносна аканьня з пункту погляду тых матар'ялаў, якія маюцца ў Слоўнікавай Камісіі. Я павінен сказаць, што ў гэтых матар'ялах ёсьць блытаніна, якая адпавядае тым спрэчкам, якія былі адносна поўнага і няпоўнага аканьня. Я кажу, што ёсьць матар'ялы, якія пацьвярджаюць пункт погляду т. т. Антона і Язэпа Лёсікаў, але ёсьць матар'ялы, якія супярэчаць іх прынцыпам. Возьмем, напрыклад, слоўнік Ціхінскага. Там мы чытаем „Wuczeńnia". Побач з гэтым у іншым месцы стаіць „Wuczeńne". Ён ня ведае, як пісаць: прыняць аканьне або яканьне. У тых картках, якія маюцца з месц, пішуць: *будзя, будзе.* Прыкмячаецца пераход *е* ня толькі ў *я,* а і ў *і.* У слоўніку Насовіча яканьне прыводзіцца толькі перад націскам. Той матар'ял, які ў мяне ёсьць пад рукою, пераконвае мяне ў тым, што магчыма Я. і А. Лёсікі часткова і правы, але пытаньне аб поўным аканьні я лічу цяпер ня высьветленым, і з боку

Акадэмічнае Конфэрэнцыі бязумоўна будзе няправільна, ненавукова і немэтодычна ўводзіць поўнае аканьне ў форме яканьня, як закон, у наш правапіс. Я лічу, што патрэбна пашырыць аканьне на *о* ў чужаземных словах, бо ў адносінах да чужаземных слоў няма сэнсу рабіць выключэньне. Што датыча яканьня, то мы можам выказаць пажаданьне аб тым, каб Фольклёрна-Дыялектолёгічная Камісія Інбелкульту ў бліжэйшы час зрабіла дакладнае дасьледаваньне беларускіх дыялектаў на падставе асобнай програмы, якая павінна высьветліць, наколькі распаўсюджаны пераход *е* ў *я* на беларускай тэрыторыі, і толькі пасьля гэтага дасьледаваньня можна прымаць тую ці іншую пастанову аб яканьні. Я думаю, што мая прапанова самая натуральная, бо яна вынікае з усіх тых спрэчак, якія разгарнуліся на Конфэрэнцыі і ў Правапіснай Камісіі.

Чаржынскі. Я лічу, што асноўным прынцыпам пабудаваньня правапісу наагул павінен быць прынцып: *ня мова існуе для правапісу, а правапіс—для мовы.* Гэта значыць, што ў сваіх правапісных пабудаваньнях трэба грунтавацца ў першую чаргу на фактах мовы, а не на мэтафізычных разважаньнях, чым займаюцца ўвесь час аўтары проекту новага (поўнага) аканьня ў бел. мове. Аўтары вельмі многа гаварылі аб тым, што іх падтрымліваюць курсы, настаўнікі, індывідуальныя і колектыўныя лісты і г. д. Але, зразумела, браць пад увагу сур'ёзна гэтыя „аргумэнты“ бадай ці варта, паколькі яны маюць характар выпадковы, „настраёвы“. Аўтары проекту, праўда, прабавалі абаперціся і на фактах мовы, на тых навуковых досьледах, якія існуюць цяпер. Але і гэта апора была аднабокай і тэндэнцыйнай. Як вядома, беларускую мову дасьледавалі ўсім вядомыя акадэмік Карскі, проф. Растаргуеў і інш. І я думаю, што калі мы гаворым аб аканьні ў правапісу, мы ў першую чаргу павінны зьвярнуцца да тых вывадаў, якія зроблены ў гэтым пытаньні гэтымі дасьледчыкамі адносна жывое беларускае мовы. Прывяду спраўку з прац акад. Карскага, якога аднабока цытавалі дакладчыкі, але перш хачу зьвярнуць увагу на наступнае: асноўнай прадпасылкай сваго проекту дакладчыкі лічаць, што безнаціскное *е* ва ўсіх выпадках у беларускай мове падлягае аканьню, і гэтую прадпасылку стараюцца ўгрунтаваць на

працах акад. Карскага, у той час як нічога падобнага ў досьледах гэтага вучонага мы не знаходзім. Вось што гаворыць акад. Карскі аб аканьні ў беларускай мове:

„Самый характер безударных гласных в разных местностях бывает различен: в одних более явственный, в других более глухой; в одних *о—е* ближе к *а—я*, в других—почти совпадают с *ы—и;* кое-где в известных слогах можно наблюдать и довольно явственное безударное *о—е*. Преобладающее белорусское произношение—сильное аканье... Но в некоторых местностях видим иное. Так, если провести линию, примерно, от Новозыбкова через Могилев, Борисов, Свенцяны, то в местности, лежащей к юго-западу, наблюдается умеренное аканье, состоящее в том, что в слогах, непосредственно следующих за ударяемыми, и во вторых от ударяемых к началу может быть почти явственное *о-е* (вось на чым грунтаваўся, т. т. дакладчыкі, Тарашкевіч, абмяжоўваючы ў сваім правапісу аканьне, а не на тых нібы традыцыях, аб якіх так пераканаўча гаварыў т. Лёсік). В местностях, прилегающих к Припяти и Нареву, аканье еще слабее... („Белорусская речь“, Петроград, 1918 г.).

А вось як гаворыць аб аканьні проф. Растаргуеў:

„Умеренное аканье: неударяемые *о—е* переходят в *а*, *ʻа (я)* только в слогах, предшествующих ударяемому, а в слогах, следующих за ударением, сохраняются... Умеренное аканье встречается в Виленской губ., за исключением северной и западной ее частей, населенных не белоруссами, в Слонимском уезде Гродненской губ., Новогрудском, Игуменском и отчасти Быховском уезде Могилевской губ.

...Слабое аканье характеризует, главным образом, южнобелорусские говоры... и встречается в южных частях Могилевской, Минской и Гродненской губ. („Курс Белоруссоведения“, стар. 207 и 208).

Аўтары новага проекту, адарваўшыся ад рачавістасьці, грунтуюцца на створаным імі законе, што ў беларускай мове кожнае ненаціскное *е* падлягае аканьню; з прыведзеных-жа вышэй цытат мы бачым, што гэта ня так, што адначасна з моцным аканьнем існуе ўмеркаванае і слабое аканьне, г. зн. што ў бел. мове не заўсёды *е* падлягае аканьню. А калі так, калі ў бел. мове існуюць такія полюсы, як моцнае і слабое

аканьне, то лёгічным зьяўляецца, каб не разьбіваць адзінасьці мовы, узяць некаторую сярэдзіну, г. зн. умеркаванае аканьне, на чым часткова і грунтаваўся Тарашкевіч. Калі-ж мы правядзем у нашым правапісу прынцып поўнага аканьня, то гэта будзе пагражаць адзінасьці бел. мовы, гэта адарве літаратурную мову ад жывых народных гутарак з умеркаваным і слабым аканьнем. Вось чаму я выказваюся супроць данага проекту.

Маленькая праўка. Увесну г. г. ў Сэкцыі Мовы і Літаратуры пры Інбелкульце гэты пункт у бел. правапісу разглядаўся, і была зроблена да яго наступная папраўка: правіла аб аканьні, формулёванае Тарашкевічам, застаецца з такой папраўкай: *е* падлягае аканьню толькі ў першым складзе перад націскам. У другім-жа складзе перад націскам *е* ня акае. Гэтая пастанова Сэкцыі была прынята пры вельмі актыўным падтрыманьні і з боку Я. Лёсіка.

Воўк-Левановіч. Правапіс не павінен імкнуцца да правядзеньня выключна фонэтычнага прынцыпу. Да фонэтычнага прынцыпу ён павінен імкнуцца ў тэй меры, у якой гэта неабходна для азначэньня *найбольш характэрных* рысаў нашае мовы. Але гэты прынцып не павінен праводзіцца да канца, каб не зацямніць морфолёгічных і сынтаксычных элемэнтаў нашае мовы. Апрача прынцыпу фонэтычнага, правапіс павінен прымаць пад увагу і этымолёгічную пабудову мовы, што ёсьць падабенства слоў па пахаджэньні ад аднаго кораню,—законы зьмен слова, г. зн. формы скланеньня і спражэньня.

Ясна, значыць, што правапіс у цэлым ня можа быць пабудаваны выключна на адным з гэтых прынцыпаў. Выключна на фонэтычным прынцыпе ён пабудаваны быць ня можа ўжо таму, што з-за няпэўнага, няяснага вымаўленьня ненаціскных галосных *а, о, е,* гэтыя апошнія гукі даюць у розных гутарках рознае слухавое ўражаньне; у складох перад націскам чуваць:

то як—бърада, гълава, бьрεгі, ньпатрэбны,
„ „ —барада, галава, берагі, непатрэбны,
„ „ —бырада, гылава, бірагі, ніпатрэбны,
„ „ —галава, барада, бярагі, няпатрэбны,
„ „ —гулува, злумаў, пупа, зяляна, бярагі,

то як—*голавá*, *бородá*, берэгí, *зеленá*,
„ „ —(у літаратурным вымаўленьні большасьці) *галава*, *барада* альбо *гαлава*, *бαрада*, *берагі*, *непат*рэбны.

У складох пасьля націску вымаўляюць то як:

пол*ɛ*, насеньн*ɛ*, сэрц*ɛ*,
то як—пол*е*, насеньн*е*, сэрц*э*,
„ „ —пол*я*, насеньн*я*, сэрц*а*,
„ „ —будз*ɛш*, піш*ɛш*, родна*ɛ*,
„ „ —будз*е*ш, пішэш, родна*е*,
„ „ —будз*і*ш, піш*ы*ш, хава*і*ш,
„ „ —будз*я*ш, піш*а*ш, родна*я* (ніякі род).

Да гэтага часу мы яшчэ дакладна не азначылі процантных адносін такога вымаўленьня, г. зн. якога характару вымаўленьне пераважае ў лічбах, але агульнае ўражаньне ад назіраньня над жывымі беларускімі гутаркамі і практыкай літаратурнага вымаўленьня гаворыць за тое, што пры моцным аканьні „яканьне“ ў нас слабое. У большасьці выпадкаў яснае *я* (а) чуваць толькі ў пераднаціскным складзе. Пасьля-ж націску і ў складох пераднаціскных, аддаленых ад націску к пачатку слова пераважае альбо няясны глухі *ɛ* альбо *е*, *і*—ясныя.

Калі-б імкнуцца да дакладнага азначэньня існуючага ў беларусаў вымаўленьня ненаціскных складоў, то патрэбна было-б азначаць шасьцю рознымі запісамі адно і тое-ж слова. А для гэтага патрэбна было-б у мэтах азначэньня гэтых рознастайных гукаў па іх рознай яснасьці ўвесьці літары *α*, *ɛ*, *ъ*, *ь*.

Між іншым, я прасачыў за вымаўленьнем т. Лёсіка і заўважыў, што наступныя словы ён вымаўляе так: *стенограма, Некрашэвіч, не хочыш, будзɛ, возьмем, разумееццα, ня хочуць, на тое, стараɛцца* і г. д.

Далей яшчэ адна заўвага: чаму ў канчатках мы пішам, *мора, кажам,* але *поле, чытаеш;* чаму на тэй-жа падставе, на якой пішам *мора* і *кажаш,* нельга пісаць і *поля, чытаяш, будзяш, разумеяш?* А вось чаму: гук *е* пасьля ацьвярдзелых і пасьля мяккіх зычных—розны. Асноўнае *е* пасьля ацьвярдзелых зычных, як у словах *мора, хачаш,* у значнай колькасьці беларускіх гутарак перайшло ў *а,* як і асноўнае *о.*

Прычына такога пераходу тая, што *е* пасьля ацьвяр-

дзеўшых зычных — гук сярэдняга роду, значыць, па месцы артыкуляцыі—бліжэйшы да *а*, суседні; таму ён лягчэй пераходзіць у *а*, чым гук *е*, пасьля мяккіх зычных. У апошнім палажэньні гук *е* зьяўляецца гукам ужо *пярэдняга раду* і, значыць, ня суседні з *а* (задняга раду). Таму і натуральна, што *я* (ʻа) на месцы *е* (пасьля мяккіх зычных) сустракаем значна радзей, чым *а* на месцы асноўнага *е* пасьля яцьвярдзеўшых зычных.

На падставе ўсяго вышэйсказанага, я і стаю на тым пункце погляду, што, пакінуўшы ў нашым правапісу моцнае аканьне па правілу Б. Тарашкевіча, яканьне трэба пакінуць толькі ў пераднаціскным складзе, у якім сэнсе я і выказаўся ў сваіх артыкулах, надрукаваных, як матарʻял да Конфэрэнцыі.

Некрашэвіч. Пачну з спраўкі. Я. Лёсік кажа, што аканьне і яканьне ў нашай мове—зьявы аднастайныя, і што калі мы прынялі поўнае аканьне, то мусім прыняць і поўнае яканьне. Як довад за аднастайнасьць гэтых процэсаў, прыводзілася выпіска з II т. „Белорусов“ Е. Карскага. Але А. Лёсік, прыводзячы выпіску з Е. Карскага, не дачытаў яе да канца. Каб ён чытаў усё, што піша аб гэтай зьяве Е. Карскі, то ён павінен-бы прачытаць наступнае: „В белорусских говорах с умеренным аканием случаев с *е* безударным больше, чем случаев с *о* безударным“, аб чым, між іншым, я гаварыў і ў сваім дакладзе. Значыць, выпіска А. Лёсіка з Карскага не адпавядае праўды таму, што гаворыць аб яканьні Е. Карскі.

Цяпер аб другой зьяве. Я. Лёсік знаходзіць, што зусім непасьлядоўна і нават неадпаведна законам беларускай мовы напісаньне *мокранькі, прыгожанькі* пры на напісаньнях *беленькі, сіненькі,* што ў адным выпадку (мокранькі) мы пасьля націску пішам *а,* а ў другім выпадку (беленькі)—*е.* Аднак, ніякай неадпаведнасьці законам беларускай мовы тут няма. У беларускай мове (аб гэтым можна прачытаць у II т. „Белорусов“ Карскага) пасьля шыпячых і цьвёрдага *р*—*е* перайшло ў *а.* Такім чынам, гэта фонэтычны закон беларускай мовы, і Б. Тарашкевіч добра (і навукова) зрабіў, што ўвёў гэтую зьяву ў свой правапіс.

Як довад за поўнае яканьне, Я. Лёсік спасылаецца на запатрабаваньне настаўнікаў; пры гэтым у сваім заключным слове ён прачытаў рэзолюцыі лінгвістычнай конфэрэнцыі пры

БДУ і настаўніцкіх курсаў. Ня знаю, чаму першую конфэрэнцыю назвалі „лінгвістычнай“, калі там, апрача Я. Лёсіка і Воўк-Левановіча, зусім ня было лінгвістаў. Былі толькі студэнты ды настаўнікі. Нават ня былі запрошаны на конфэрэнцыю тыя лінгвісты, якія стала жывуць у Менску. Зразумела, што Лёсік, як аўторытэтны настаўнік, мог на падобных нарадах праводзіць пажаданыя для яго рэзолюцыі. Але цану падобных рэзолюцый мы ведаем.

Як агульны закід сваім працiўнікам, Я. Лёсік кажа, што мы ня хочам рэформы, а таму і не згаджаемся з яго проектам. Тут Лёсік памыляецца,—мы ўсе хочам зрабіць рэформу нашага правапісу (дзеля гэтага мы і сабраліся), але рэформу мы павінны зрабіць сталую, а не скорасьпелую, каб з нас пасьля не сьмяяліся.

Гаворачы аб тых ці іншых зьменах у правапісу, мы не павінны ні на мінуту забываць таго, як на гэтыя зьмены глядзяць нашы навуковыя працаўнікі ў Заходняй Беларусі. Калі ўлетку гэтага году я ў Вільні на сходзе беларускіх навуковых працаўнікоў далажыў проект адносна яканьня А. і Я. Лёсікаў, то сход аднагалосна выказаўся супроць проекту. На маё запытаньне Б. Тарашкевічу, ці адпавядае праўдзе, што ён абмежаваў аканьне (яканьне) на аснове „доўгай практыкі нашага пісьменства“ (Граматыка. Прадмова), ці тут ён кіраваўся данымі беларускіх дыялектаў, то Б. Тарашкевіч сказаў, што ён бязумоўна абмежаваў яканьне, грунтуючыся на даных беларускай дыялектолёгіі, а не на практыцы нашага пісьменства, што было-б поўнай „ерундой“, каб ён будаваў сваю граматыку не на навуковых даных, а на практыцы нашага пісьменства.

Дзеля гэтага я лічу, што запрапанаваны Я. Лёсікам прынцып поўнага яканьня, у сілу выказаных раней меркаваньняў, патрэбна адхіліць. Для спрашчэньня правапісу прапаную: 1) у другім складзе перад націскам заўсёды пісаць *е;* 2) на адмоўныя словы *не; без,* калі яны стаяць асобна, яканьне не пашыраецца: 3) словы *няма, няхай* у адпаведнасьці з значнаю большасьцю народных гутарак пісаць *німа, ніхай.*

Бялькевіч Я. Паважаныя сябры Конфэрэнцыі! Браты Яз. і А. Лёсікі ў сваім проекце зьмены правапісу *е, я* грунтуюцца на прынцыпе фонэтыкі, на тым самым прынцыпе, на

якім грунтаваўся і Б. Тарашкевіч, калі ўкладаў граматыку беларускае мовы, і з гэтага боку нічога новага ня ўносяць. Новае ў гэтым проекце толькі тое, што, закідаючы Тарашкевічу адносна правапісу *е* ў пераднаціскных складох, Яз. і Ант. Лёсікі даводзяць патрэбу замены правіла, выражанага Тарашкевічам адносна *е (э)* ненаціскнога, такім правілам: „*е* не пад націскам заўсёды пераходзіць у *а*, а дзеля гэтага „нідзе ня трэба пісаць ненаціскнога *е*, як ня пішам *о, э*. Проект гэты Яз. Лёсік падмацоўвае тым, што, згодна яго назіраньням над беларускай моваю, нідзе *е* бяз націску ня ўжываецца, а доказ гэтаму той, што „дзеці на гэтае правіла робяць шмат памылак". Антон Лёсік абурваецца на Тарашкевіча за тое, што той дапускае „дзе-ні-дзе" адступленьні ад фонэтычнага прынцыпу, і таксама, як і Язэп Лёсік, прапануе поўны фонэтычны запіс галосных. Рэч слушная,—фонэтычны правапіс самы добры, бо тады, як кажа Яз. Лёсік, „вока будзе бачыць тое, што чуе вуха", але не заўсёды яго можна зьдзейсьніць у жыцьці. Як відаць, згаджаецца з гэтым і А. Лёсік, які ў супярэчнасьць сабе кажа: „Я сам вымаўляю *цібе, сібе*, але-ж пісаць трэба *цябе, сябе*". Чаму такая нявытрыманасьць? Чаму ня пісаць для вока тое, што чуе вуха? А таму, што паважаныя сябры самі добра разумеюць, што ў розных краінах існуюць розныя фонэтычныя зьмены мовы, і цалком на фонэтычным прынцыпе грунтавацца нельга. Тады А. Лёсік і кажа: „Ня лічэцеся з вымаўленьнем, а запісвайце па правілу—*е* пішацца толькі пад націскам, ненаціскное *е* заўсёды пераходзіць у *я*. Прыклады такія: „ц*е*цярук, п*е*равярнуўся, с*е*лянін, п*е*рамяніць, нявысьв*е*тл*е*на" неабходна пісаць: „ц*я*цярук, п*я*равярнуўся, с*я*лянін, п*я*рамяніць, нявысьв*я*тляна". Няма патрэбы глядзець, як вымаўляецца ў запраўднасьці, бо „я і сам вымаўляю: ц*і*цярук, п*і*равярнуўся, с*і*лянін і г. д."—кажа А. Лёсік. Тут я ўжо зусім перастаю разумець т. Лёсіка. Чаму-ж ён не патрабуе запісу іканьня, а толькі яканьня? Ён гэта тлумачыць тым, што большасьць насельніцтва Беларусі ўжывае поўнае аканьне (яканьне), і іканьне тут не павінна прымацца пад увагу. Само сабою разумеецца, што літаратурная мова павінна грунтавацца на дыялекце большасьці, але ўсё-ж такі яна павінна прымаць пад увагу ступень пашыранасьці розных гутарак мовы, каб такім чы-

нам уцягнуць іх у свой склад і гэтым пазбавіцца ад вялікае адарванасьці ад гутарак.

Паглядзім цяпер, насколькі верны погляд т. т. Лёсікаў, што ў беларускай мове пераважвае яканьне. Мне самому гутаркі беларускай мовы больш-менш вядомы, бо мне прышлося пабываць у розных мясцох Беларусі. Каб ня быць галаслоўным, дазвольце давесьці да вашага ведама, што гутарка Горадзеншчыны мне вядома вельмі добра, бо я там радзіўся і служыў у розных канцох яе да імпэрыялістычнай вайны. З 1917 па 1920 год я служыў у Віленшчыне, а з 1920 па 25 працаваў у Меншчыне; цяпер працую ў Калінінщчыне. Як бачыце, я Беларусь прайшоў ад заходняй яе краіны да ўсходняй, дзе мог пачуць вялікае і малое аканьне. Аднак, я нідзе не спаткаў такое аднастайнасьці (яканьня), аб якой нам гавораць браты Лёсікі. Поўнага аканьня ў пераважнасьці няма. У Слонімскім павеце Горадзеншчыны, а таксама на паўднёвай Случчыне пасьлянаціскное *а (я)* пераходзіць у *о (ё)*. Там скажуць *моро, полё, разьбіласё, згубіласё* (у ніяк. родзе). У Меншчыне—мор*а*, пол*е*, разьбіл*а*ся; у Калініншчыне—мор*а*, пол*е*, разьбіл*а*сь. Возьмем перадна-ціскное *е*. Той самы славуты „цяцярук“ у Горадзеншчыне, Віленшчыне і Меншчыне будзе *цецярук*, у Калініншчыне—*ціцірук*, але нідзе няма *цяцярука*. Прыведзеныя мною зараз прыклады яскрава паказваюць, што поўнага аканьня (яканьня) у гэтых мясцох няма, а значыць, і ўводзіць яго ў правапіс нельга.

Тав. А. Лёсік кажа, што трэба зьмяніць правапіс *е* ненацікснога і ўсюды пісаць *я*, хоць-бы з тае прычыны, што дзеці робяць шмат памылак супроць правіла Тарашкевіча. Для пэдагога гэта вельмі моцны аргумэнт. Але ці скажа т. Лёсік, што ўсе дзеці пасьля гэтае рэформы будуць пісаць правільна? Мне здаецца, што не, бо якраз тыя дзеці, што пішуць *цяпер* правільна, будуць *тады* памыляцца. Лёсік ня скажа, што ўсе дзеці робяць аднастайныя памылкі ва ўсіх канцох нашай краіны Беларусі. Я таксама гэтага не скажу, хоць практыку навучаньня дзяцей маю досыць сталую і, як бачылі, у розных канцох Беларусі. Верна, дзеці пакуль навучацца пісаць, робяць памылкі, яны і ня могуць не рабіць іх таму, што ёсьць *правілы* ў пісьме. Зьмянеце існуючае пра-

віла на новае—дзеці і тады будуць рабіць памылкі. Праступак закону ёсьць там, дзе ёсьць закон. Які-ж з гэтага выхад? Як зрабіць, каб дзеці рабілі менш памылак? Трэба не падганяць пад адну лінейку правапіс і ўсюды пісаць *я*—дзе трэба, дзе і ня трэба, а прыслухаўшыся да гутарак беларускае мовы, пабудаваць правіла так, каб яно ня было далёкім ні ад аднэй з гэтых гутарак. Мне здаецца, што правіла напісаньня *е* не пад націскам павінна быць зьменена супроць формулёўкі Тарашкевіча і выкладзена так: ненаціскное *е* ў першым складзе перад націскам пераходзіць у *я*—*сяло, селяне;* у другім і далейшых складох пішацца *е*—сенажаць (а не сянажаць), разьвесяліць (а не разьвясяліць), без дзіцяці (а не бяз дзіцяці) і г. д. Пасьля націску пішацца *е*—калосьсе, сяляне.

Такая формулёўка правапісу ненаціскнога *е* будзе лягчэйшаю для ўсваеньня яго дзяцьмі, бо ня трэба будзе лічыць складоў перад націскам і, самае галоўнае, пагодзіць усе гутаркі беларускае мовы.

Бузук. Пачынаючы сваю кароткую прамову, я папрасіў-бы т. Лёсіка ўважліва прыслухоўвацца да таго, што мы тут гаворым. Ён пачаў з таго, што няма розьніцы ў канчатках паміж *мора* і *поля.* Але тут гаварылася, што розьніца паміж *э* і *а* большая, як паміж *о* і *а,* і таму яканьне захапляе меншую тэрыторыю, параўнаўча з аканьнем. Дысыміляцыйнае аканьне, як вядома, вельмі пашырана, і яго таксама трэба было-б хоць часткова адбіць у правапісу. Т. Некрашэвіч зусім правільна гаварыў аб небясьпецы з боку Заходняй Беларусі, якая адносіцца няпрыхільна да проекту правапіснай рэформы Я. Лёсіка; дзеля гэтага наша рэформа мусіць пагадзіць нашы дыялекты.

Цяпер некалькі слоў адносна дысыміляцыйнага яканьня ў мове першатвораў Якуба Коласа *(вяду,* але *вела).* Гаварылася аб тым, што ў гэтым вінен рэдактар твораў Я. Коласа. Але дзіўна, што гэты рэдактар езьдзіў у розныя гарады (Вільню, Менск, Ленінград), дзе выдаваліся першадрукі Коласа. А калі нават у данай асаблівасьці правапісу і быў вінен рэдактар, трэба вызнаць яго добрым лінгвістам (Я. Лёсік: „Гэта павашаму“). Бязумоўна, поўнага аканьня (яканьня) нельга будзе адбіць у правапісу, і лёгкасьць засваеньня пра-

віла аб моцным аканьні вучнямі яшчэ не зьяўляецца довадам на карысьць яго.

Дамброўскі. Правапіс ня існуе для дыялектаў, каб зафіксаваць нейкую „сярэднюю дыялектычную“. Для дыялектаў існуе навуковая транскрыпцыя; а правапіс існуе, памойму, дзеля таго, каб разьвіваць адзіную мову. У часы першых прац Тарашкевіча ўзята ім нейкая сярэдняя дыялектычная, таму што тады ня было амаль што беларускіх школ і трэба было толькі стварыць гэтую адзіную беларускую мову. Зараз беларускіх школ ёсьць тысячы, і дзеля гэтага зараз магчыма разьвіваць адзіную беларускую мову на іншай падставе, чым сярэдняя дыялектычная, асабліва калі гэтая сярэдняя дыялектычная атрымалася вельмі штучная. Я мысьлю, што гэтакай падставай можа зьявіцца тое, што прапанаваў тав. Лёсік—ужываньне *а* і *я* для азначэньня ўсіх глухіх галосных, якія магчыма было-б азначаць праз альфа (α) ці эпсылён (ε), альбо а і я, але ў беларускай мове трэба гэта рабіць пры дапамоѕе *а* і *я,* паколькі гэтыя дзьве галосныя зьяўляюцца характэрнай асаблівасьцю беларускае мовы. Довад, што гэта пагражае падзелам адзінай беларускай мовы на заходня-беларускую і ўсходня-беларускую—гэты довад надта важкі. Але ён гаворыць за тое, каб *адлажыць* рэформу, а ніяк не прынцыпова супроць гэтае рэформы.

Мачульскі. Папярэдні тав. паўстаў супроць вывучэньня дыялектаў, супроць таго, што, як тут гаварылася і даводзілася, што правапіс тае або іншае мовы павінен абапірацца на вывучэньне яе дыялектаў. Я думаю, што далей паўтараць усё тое, што было сказана на Конфэрэнцыі і ў нашай Камісіі аб неабходнасьці вывучэньня дыялектаў для таго, каб унесьці тыя ці іншыя папраўкі ў наш правапіс, непатрэбна. Трэба толькі зазначыць, што стан вывучэньня нашых дыялектаў, магчыма, знаходзіцца яшчэ ў такой стадыі, што рэзультаты гэтага вывучэньня не для ўсіх відавочны. Ва ўсякім разе, ня ўсе яшчэ сходзяцца на адным пункце погляду, а гэта яскрава сьведчыць аб тым, што данае пытаньне яшчэ ня вывучана з дастатачнай поўнасьцю.

Дасьледчыкі, якія ў сучасны момант займаюцца гэтым пытаньнем, апіраючыся на вывучэньне фактычнага матар‘ялу

кажуць, што поўнага аканьня і „яканьня“ правесьці немагчыма. Тыя, хто стаіць за поўнае аканьне, апіраючыся таксама на свае дасьледаваньні, кажуць, што ў большасьці дыялектаў пануе неабмежаванае аканьне (і яканьне).

Калі я сягодня яшчэ раз праглядзеў некаторыя сьвежыя матар‘ялы, прысланыя ў Інбелкульт, я знайшоў, што мы ня можам адзначыць поўнага аканьня (яканьня). Прыхільнікі поўнага аканьня прыводзілі прыклады таго, што ў другім складзе перад націскам і нават далей заўважваецца напісаньне *а* і *я*. З прагледжаных мною сягодня матар‘ялаў я павінен падкрэсьліць, што ня толькі ў другім складзе перад націскам мы маем *е*, але ў некаторых мясцох і ў першым складзе, як *мене, цебе*. Некаторыя з гэтых матар‘ялаў былі прагледжаны мною сумесна з проф. Бузуком, які можа гэта пацьвердзіць.

Калі-ж апірацца не на большасьць дыялектаў, а на пануючы дыялект, які лёг у аснову літаратурнае мовы і якім карыстаецца большасьць пісьменьнікаў, то і ў гэтым пануючым дыялекце поўнага аканьня адзначыць ніякім чынам нельга. І ў творах Якуба Коласа, Янкі Купалы і Цішкі Гартнага, калі мы адтуль будзем рабіць выпіскі, мы ўбачым, што поўнае аканьне і яканьне там не праведзена. Вось чаму, прымаючы пад увагу сучаснае становішча нагляданьняў над беларускімі гутаркамі, я не магу выказацца за проект тых, хто хоча правесьці неабмежаванае аканьне ў нашым правапісу.

Антон Лёсік. Я застанаўлюся толькі на адным пункце проекту—ужываньні ненаціскнога *е* ў беларускай мове. Тарашкевіч, правапіс каторага падтрымлівалі большасьць членаў Конфэрэнцыі, ясна гаворыць, што ў беларускай мове гукі *е* (э) чуваць толькі пад націскам, значыць, не пад націскам чуваць заместа *е* другія гукі. У многіх выпадках ненаціскное *е* ў сваім правапісу Тарашкевіч замяніў літараю *я;* а ў другіх выпадках гэтае *е*, па Тарашкевічу, трэба азначаць на пісьме. Наш проект спрашчэньня правапісу прапануе ўсякае ненаціскное *е* на пісьме азначаць праз *я*, хоць-бы *е* вымаўлялася не як *я*, а як другія няясныя гукі, напр., як *і;* гэта значыць, калі ўжо і ў сучасным правапісу ненаціскное *е* на пісьме мы азначаем праз *я* ва многіх выпадках, то трэба гэта зрабіць і ў астатніх выпадках, у якіх мы цяпер пішам *е;* гэта было-б запраўдным спрашчэньнем правапісу. Вынікам з агранічэньня

аканьня зьявіліся трудныя правілы правапісу, для спрашчэньня якога склікана Конфэрэнцыя. Галоўная труднасьць беларускага правапісу заключаецца ў тым, што ўжываньне *е* залежыць ад націску. Паставіць-жа правільна націск у слове для вучняў вельмі трудна; нават студэнты Пэдтэхнікуму ня ўмеюць правільна паставіць націску. Калі гэта трудна зрабіць добра граматнаму чалавеку, то тым больш трудна гэта зрабіць вучням сямілетак.

Калі астанецца правіла ўжываньня *е* пасьля націску, з каторага ёсьць 14 выключэньняў, то ніякага спрашчэньня ня выйдзе, і труднасьці беларускага правапісу застануцца. Ужываньне *я* толькі ў першым складзе перад націскам ёсьць ня больш, як політычны ў справе спрашчэньня правапісу, але не разьвязаньне задачы, якая стаяла перад Конфэрэнцыяй. Значыць, такімі новымі правіламі мы ня зьнішчаем цяжкасьці беларускага правапісу, бо ў ім астаюцца правілы, па каторых ненаціскное *е* пішацца ў залежнасьці ад націску.

Язэп Лёсік. Тут таварышы зноў гавораць аб тым, што ў розных мясцох гавораць розна, што беларуская мова мае свае асобныя дыялекты. Гэта такая ісьціна, аб якой сьмешна нават гаварыць; ніхто не казаў, што наша мова складаецца з аднаго дыялекту. Я казаў і кажу, што беларуская літаратурная мова, г. зн., той беларускі дыялект, што ляжыць у аснове нашае кніжнае мовы, вызначаецца вялікім, або поўным аканьнем. Толькі хто з гэтым не згаджаецца, той павінен адкінуць усю граматыку Тарашкевіча, бо ўся яна пабудована якраз на гэтым дыялекце, і ўсе фонэтычныя, морфолёгічныя асаблівасьці гэтае гутаркі служаць нормамі для нашае літаратурнае мовы.

У прадмове да свае граматыкі Тарашкевіч піша: „У аснове яе (граматыкі) ляжыць найбольш характэрная і найбольш чыстая гутарка беларускае мовы, што мае цьвёрдае *р* і вялікае аканьне“. А далей дадае: „Але аканьне агранічана некаторымі разамі, да чаго прымушае нас доўгая практыка нашага пісьменства“.

Вось я і кажу, што ніякае „доўгае практыкі нашага пісьменства“ ў нас ня было, што гэтая практыка вельмі кароткая і вызначаецца шырокаю рознастайнасьцю ў сваім правапісу, бо да граматыкі Тарашкевіча ніякага правапісу ня было,

і кожны пісаў так, як хацеў, як яму здавалася лепш і прыгажэй, толькі ў практыцы „Нашае Нівы“ можна заўважыць сякія-такія нормы, прычым гэтыя нормы зусім нязгодныя з нормамі ў правапісу Тарашкевіча. „Наша Ніва“ дапускала ненаціскное *э,* што забараніў правапіс Тарашкевіча, давала большы прастор асыміляцыі зычных на пісьме і шмат чаго іншага. Гэтая газэта таксама аграпічала нашае аканьне, але рабіла гэта больш паступова за Тарашкевіча, напр., калі яна пісала: *чытае, сьпявае, гуляе* з ненаціскным *е* на канцы, то не рабіла выключэньня і для ненаціскнога *э* ў гэтых дзеяслоўных формах, пішучы *кажэ, рэжэ, пішэ* і г. д. Калі „Наша Ніва“ пісала: *лесавік, селянін, неспакойна* з ненаціскным *е* ў другім складзе перад націскам, то яна пісала і *чэлавек, шчэбятаць* і г. д. з ненаціскным *э* ў тым-жа складзе. Гэта было разумна, паступова і навукова, а Тарашкевіч усё гэта сьвядома пераблутаў і стаў запісваць адны і тыя граматычныя формы розным правапісам—то фонэтычным, то этымолёгічным.

Што да правапіснай практыкі ў іншых выданьнях, то яна яшчэ горшая для Тарашкевіча. Там пісалі або расійскім этымолёгічным пісьмом з яцямі і цьвёрдымі знакамі, або з поўным аканьнем. Для гэтага трэба паглядзець хоць-бы „Сыгнал“ Гаршына або газэты „Дзяньніца“, „Сьветач“ і „Вольная Беларусь“ з яе выданьнямі розных брошур і кніжак.

Значыць практыка даўнейшага нашага пісьменства ні да чога не прымушала Тарашкевіча. Гэта яго асабістая выгадка, выкліканая пагоняю за аграпічэньнем нашага аканьня. І ён столькі наагранічаў, што зрабіў наш правапіс шарадаю, ад якой стогне наша школа. Аб гэтым я яшчэ раз заяўляю, маючы доўгую практыку ў школах, як выкладчык беларускае мовы. І ня толькі школа,—часам стала граматныя людзі ня ведаюць, дзе пісаць *е,* а дзе *я,* і пішуць: *каеньне, баечнік* з *е* на месцы этымолёгічнага *я.* Або папрабуйце расталкаваць школьніку, чаму гэта ў словах *заяц, пояс, месяц, баячнік* *) і падобных трэба пісаць *я* пасьля націску, а ў словах: *восень, возера,* і іншых—*е?* Для гэтага трэба ведаць этымолёгію слова. Я разумею расійскі правапіс,—там гукі запісваюцца, зважаючы на этымолёгію слова, і галосныя гукі выясьняюцца

*) У слове *баечнік* кор. *бай,* суф. *ек (еч),* дзеля таго гэта слова павінна пісацца *баечнік.* *Увага Рэд.*

націскамі, а ў нашым правапісу ў адных разох трэба кіравацца фонэтыкаю, а ў другіх—этымолёгіяю слова. Гэта ня прынцып, а нейкая падвойная бухгальтэрыя! І гэтая падвойная бухгальтэрыя кайданамі вісіць на кожным правіле. Яшчэ адзін прыклад. Правапіс Тарашкевіча вучыць, што канчаткі залежных склонаў падлягаюць аканьню, а канчатак творнага склону адзін. ліку ў словах з мяккаю асноваю не пад націскам не падлягае аканьню — *гаем, краем, локцем, лапцем*. Чым гэта аб'ясьніць? Каб не зьмяшаць гэтае формы з формамі давальнага склону множнага ліку? Наіўная ўвага! Правапіс Тарашкевіча дапускае яшчэ і ня гэткія зьмяшэньні, і зусім слушна, бо калі жывая мова не баіцца гэтага зьмяшэньня, то няма ніякай падставы баяцца яго і на пісьме.

Час у мяне абмяжован. Я канчаю і кажу, што даводзіў і ў сваім дакладзе. Каб зрабіць наш правапіс простым, паступовым і *навуковым*, трэба адмовіцца ад абмежаваньня аканьня. Трэба прыняць поўнасьцю фонэтыку таго дыялекту беларускае мовы, які паложан нікім іншым, як самым Тарашкевічам у аснову нашае літаратурнае мовы. Пагадзіць на пісьме ўсе дыялекты нашае мовы, як некаторыя хочуць, нельга — гэта „бессмысленные мечтания". Кожная літаратурная мова грунтуецца на адным і толькі на адным дыялекце, іначай яна перастане быць літаратурнаю, г. зн. нарматыўнаю, для ўсіх абавязковаю і аднальковаю. Раз у аснове нашае літаратурнае мовы ляжыць дыялект з цьвёрдым *р* і вялікім аканьнем, то яго асаблівасьці трэба адбіваць і на пісьме. Такой фонэтыкі, якую праводзіць у сваім правапісу Тарашкевіч, у беларускай мове няма. Гэта фонэтыка штучная, суб'ектыўная, а значыць, беспадстаўная і ненавуковая.

Старшыня: Усе запісаныя прамоўцы выказаліся. У прэзыдыум паступіла некалькі пропозыцый, якія я буду ставіць на галасаваньне. Першай галасую пропозыцыю Я. Лёсіка: у беларускай мове галосныя *о (ё)—э (е)* чуваць і пішуцца толькі пад націскам; не пад націскам на месцы *о (ё)—э (е)* чуваць гукі няясныя, глухія, якія запісваюцца літарамі *а—я*. Хто за пропозыцыю Я. Лёсіка? (За пропозыцыю 7, супроць 15, устрымалася 3, адсутнічала 6). Такім чынам пропозыцыя Я. Лёсіка адхілена.

Наступнай галасую пропозыцыю С. Некрашэвіча: а) *е,*

калі яно стаіць у другім складзе перад націскам, не падлягае яканьню; б) *не* і *без*, калі яны стаяць асобна, таксама яканьню не падлягаюць. Хто за пропозыцыю С. Некрашэвіча? (За пропозыцыю 15, супроць 4, устрымалася 3, адсутнічала 7). Такім чынам пропозыцыя С. Некрашэвіча прынята.

Галасую апошнюю пропозыцыю С. Некрашэвіча: словы *„няма“*, *„няхай“* пішуцца „німа“, „ніхай“. Хто за другую пропозыцыю С. Некрашэвіча? (За 5, супроць 16, адсутнічала 8). Такім чынам другая пропозыцыя С. Некрашэвіча адхілена.

Згодна прынятага парадку, мы павінны прыступіць да абмеркаваньня пытаньня аб правапісу чужаземных слоў.

Лёсік. Тут уносіцца прапанова аб тым, каб разглядаць правапіс чужаземных слоў. Але з прычыны таго, што правапіс чужаземных слоў нідзе не абмяркоўваўся, я ўношу прапанову сягодня гэтага пытаньня не абмяркоўваць, а перадаць яго ў Правапісную Камісію пры Інбелкульце. Апрача таго, я маю такую заяву ў Прэзыдыум Правапіснай Камісіі (чытае):

У Правапісную Камісію Акадэмічнае Конфэрэнцыі.

Мы, ніжэйпадпісаныя члены Конфэрэнцыі, заяўляем, што папраўка да правапісу, прынятая Камісіяю адносна напісаньня літары *я* на месцы ненаціскнога *е* толькі ў першым складзе перад націскам і нязьменнае напісаньне *не* і *без*, супярэчыць законам беларускае мовы і нашаму фонэтычнаму напісаньню галосных.

Гэтая папраўка не спрашчае правапісу, а толькі сьцірае асаблівасьці беларускай мовы, што прымушае нас заявіць свой протэст. (Я. Лёсік, Якуб Колас, А. Лёсік, Янка Купала 20-XI. 1926 г. Менск).

Старшыня: Протэст ваш мы прымем да ведама і разам з іншымі матар‘яламі далучым да матар‘ялаў Камісіі. Што датыча да прапановы грам. Лёсіка аб тым, каб пытаньне аб аканьні ў чужаземных словах зьняць, то я дам яшчэ адно слова за, пасьля чаго прыступім да галасаваньня прапаноў.

Некрашэвіч. Я лічу, што аканьне ў чужаземных словах— пытаньне вельмі балючае, на Конфэрэнцыі яно разглядалася і, апрача таго, выстаўлена ў тэзісах па маім дакладзе; з гэтае прычыны правапіс чужаземных слоў бязумоўна неабходна разглядзець.

Старшыня. У парадак нашае працы мы ўключылі пытаньне аб аканьні ў чужаземных словах. Была прапанова грам. Лёсіка аб тым, каб гэтае пытаньне зьняць і перадаць для апрацоўкі ў Інбелкульт. За разгляд гэтага пытаньня выступаў Некрашэвіч; цяпер дазвольце галасаваць. Хто за тое, каб пытаньне аб аканьні ў чужаземных словах не разглядаць, і ўсе матар'ялы, якія маюцца, перадаць у Інбелкульт, будзьце ласкавы падняць рукі. (За—два галасы). Хто за тое, каб гэтае пытаньне разглядаць? (Большасьць. Прымаецца).

Тут запісаліся наступныя грамадзяне: Лёсік, Імшэньнік, Мялешка, Некрашэвіч і Чаржынскі. Слова мае грам. Лёсік.

Лёсік. Як раней я казаў, так і цяпер скажу, што ніхто з проектам правапісу ў чужаземных словах не выступаў. Нідзе гэтае пытаньне не разглядалася, і таму я знаходжу зусім беспадстаўным разглядаць яго сягодня тут на пасяджэньні, а прапаную мэханічна перанесьці ў Інбелкульт. Толькі таму, што тут была голая прапанова, я не знаходжу магчымым сягодня разглядаць гэтае пытаньне і выказваюся супроць.

Імшэньнік. Адносна аканьня ў чажаземных словах, паважаныя грамадзяне, я кіруюся брошурай Сьцяпана Некрашэвіча, якая была разаслана ўсім удзельнікам Конфэрэнцыі. Нэкрашэвіч у гэтай брошуры выказваецца за аканьне ў чужаземных словах, што ўвайшлі ў беларускую мову, прычым у брошуры маецца ўвага, што, па жаданьні аўтара, правапіс чужаземных слоў у гэтай брошуры вытрыманы згодна правіл аўтара. Аднак з гэтай брошуры мы бачым, што пашырыць аканьне на чужаземныя словы зусім немагчыма, і тыя, хто кіруецца правілам аб аканьні, „ноленс-воленс", робяць памылку супроць проекту Некрашэвіча. Калі возьмем гэтую брошуру, мы спаткаем слова „рэформоваць" праз *о*. На стар. 6 мы бачым напісана „організм"—таксама праз *о*. Далей напісана „контэкст" і г. д. Я зьвяраў гэтую брошуру з тым артыкулам, які быў зьмешчаны ў „Полымі", і мне здаецца, што гэтыя словы напэўна былі напісаны ў орыгінале Некрашэвіча, калі ён здаваў артыкул у друк.

Я ніяк не магу згадзіцца з пашырэньнем аканьня на чужаземныя словы па наступных прычынах: калі мы будзем пісаць чужаземныя словы праз *а* ў той час як яны ў адпа-

веднай мове пішуцца праз *о*, то гэтым зацямнім прыроду слова; напрыклад, лацінскае: *ла*кальны пры „локаліс“ і „лакаліс“. Тое-ж самае можна сказаць аб словах; „об‘ект і „аб‘ект“, „компэнсацыя“ і „кампэнсацыя“ і г. д.

Цяпер пяройдзем да грэцкіх слоў у беларускай мове. У слове „ортодоксія“ гук *о* чуваць ясна; калі-ж мы напішам „артадоксія“, то гэтым мы зацямнім прыроду гэтагя слова. Чужаземныя словы ва ўсіх мовах захоўваюць сваё першапачатковае пахаджэньне. Такім чынам у чужаземных словах неабходна заставіць такое напісаньне, якое спатыкаецца ў адпаведнай мове, з якой запазычана слова, інакш па слоўніку немагчыма будзе знайсьці кораня такога слова.

Мялешка. Паважаная Конфэрэнцыя! Я. Лёсік у сваёй прамове адзначыў наступнае: з прычыны таго, што ніхто з проектам аб правапісу чужаземных слоў не выступаў на Конфэрэнцыі, зусім ня варта разглядаць гэтае пытаньне, а яго патрэбна проста перадаць Інбелкультy. Мне здаецца, калі ніхто не рабіў аб правапісу чужаземных слоў спэцыяльнага дакладу, то гэта яшчэ ня значыць, што пытаньне не патрэбна ўздымаць. Справа ў тым, што па гэтым пытаньні маецца спэцыяльная брошура С. Некрашэвіча. Інбелкульт, калі выдаваў гэтую брошуру, меў на ўвазе разгляд гэтага пытаньня на Акадэмічнай Конфэрэнцыі. А калі гэта так, то ёсьць поўная магчымасьць разглядаць гэтае пытаньне, бо з брошурай усе больш-менш знаёмы.

Падругое, мне здаецца, што члены Конфэрэнцыі прадумалі гэтае пытаньне, прааналізавалі яго, калі яшчэ зьбіраліся ехаць сюды на Конфэрэнцыю. Такім чынам у кожнага ёсьць свой пункт погляду на гэтае пытаньне. Правапіс чужаземных слоў бязумоўна патрэбна разглядзець. Пытаньне гэтае надзвычайна важнае; яно ўносіць вялікую блытаніну ў наш правапіс. Я не магу згадзіцца з т. Імшэньнікам, які кажа, што нельга пашырыць аканьне на чужаземныя словы, бо тады яны згубяць сваю прыроду, дзеля гэтага патрэбна ўжываць чужаземныя словы ў такім выглядзе, як яны запазычаны з тае або іншае замежнае мовы. Праўда, мы да гэтага часу ў большасьці выпадкаў так і рабілі, але ў школе атрымалася вялікае непаразуменьне. Вучань добра ведае, што *о* і *э* пішуцца толькі пад націскам, а калі няма націску, то яны пераходзяць

у *а*. Калі ён чытае чужаземнае слова, дзе прынцып аканьня не захоўваецца, то робіць вялікую памылку: замест „*мо*тывы" кажа „*ма*тывы". Добра, калі вучань чытае ў школе, і настаўнік мае магчымасьць выправіць яго, але большасьць вучняў чытаюць дома, і такім чынам няма магчымасьці выпраўляць іх вымаўленьне.

Апрача таго, вучні надта цяжка разьбіраюцца, якое слова чужаземнае і якое нечужаземнае. Такім чынам, атрымоўваецца вялікая блытаніна, і мне здаецца, што, пашырыўшы аканьне на чужаземныя словы, мы гэтым прыроды слова ня зьменім, бо ні адзін народ не вымаўляе тое або іншае чужаземнае слова так, як вымаўляе яго адпаведны народ, ад якога слова запазычана. Бязумоўна, кожны народ вымаўляе чужаземныя словы згодна сваёй уласнай нацыянальнай акцэнтацыі, і паколькі гэта так, то бязумоўна трэба пашырыць аканьне на чужаземныя словы; аб зьмене прыроды слоў казаць не даводзіцца, бо мы разглядаем сэнс слоў не асобна, а ў контэксьце. Калі браць кожнае асобнае слова ў контэксьце, то мы заўсёды знойдзем сэнс і значэньне гэтага слова. Напрыклад, слова „каса" вядома, як каса для касьбы і як „каса"— валасы. Значэньне іх выяўляецца ў контэксьце. Таксама і з чужаземнымі словамі. Такім чынам, мне здаецца, што калі мы пашырым аканьне на чужаземныя словы, то ў далейшым тут ня будзе тэй блытаніны, якая была да гэтага часу, бо ў рабочай масы няма часу разабрацца, якое слова чужаземнае і якое нечужаземнае. І паколькі ў вучняў і ў масы няма такое падрыхтоўкі, то правапіс чужаземных слоў зьяўляецца асабліва цяжкім. Калі мы пашырым аканьне на чужаземныя словы, то ад гэтага будзе вялікая карысьць ня толькі нашаму грамадзянству, але і нашай школе.

Некрашэвіч. Тут раздаваліся галасы, што правапіс чужаземных слоў у сваім дакладзе я не належна высьветліў. З гэтым закідам я згаджаюся. Аднак, я лічыў, што члены Конфэрэнцыі знаёмы з правапісам *о* ў чужаземных словах па маёй брошуры: „Аб пашырэньні аканьня на чужаземныя словы", а таму і не належна застанаўліваўся ў дакладзе на гэтым пытаньні. Цяпер-жа, паколькі ёсьць заявы падрабязьней высьветліць правапіс чужаземнага *о*, дазвольце мне заняць вашу ўвагу гэтым пытаньнем.

Бадай ува ўсіх мовах пануе такі прынцып правапісу: чужаземныя словы пішуцца блізка да вымаўленьня і напісаньня таго народу, ад якога словы запазычаюцца. Вядома, тутака ёсьць многа ўхіленьняў: а) кожны народ мае свае артыкуляцыі і, запазычаючы слова ад іншай мовы, ён дапасоўвае яго да свайго прыроднага вымаўленьня. І калі мы, прыкладам, возьмем такое слова, як *дыван*, то вымаўленьне яго немцам і беларусам, дзякуючы ўласьцівым кожнаму народу артыкуляцыям, будзе рознае. Ухіленьні могуць быць утвораны па прычыне адсутнасьці ў мове тых ці іншых гукаў: напр., сярэдня-эўропейскага *l*, нямецкага *ü*, гартаннага *r* і г. д. Тады народ субстытуе гэтыя гукі, замяняе іх блізкімі сваімі гукамі. Урэшце, ухіленьні бываюць і таму, што кожны народ падстаўляе да чужаземных слоў свае канчаткі (у скланеньнях і спражэньнях) і суфіксы. Такім чынам, і адносна правапісу чужаземных слоў блізкасьць можа быць толькі адносная, паколькі гэта *не супярэчыць прыроднаму вымаўленьню народу*.

Разглядаючы конкрэтна, як пішуцца ў чужаземных мовах пры запазычаньні ненаціскныя склады з *о*, трэба сказаць, што такія склады пішуцца праз *о*. Ды яно і зразумела. Для гэтых моваў (з *этымолёгічным* правапісам) такія злучэньні натуральны, уласьцівы, бо яны адпавядаюць жывому вымаўленьню народу. Іншая рэч гэтыя злучэньні ў нашай мове (з *фонэтычным*, адносна галосных, правапісам). Тут ненаціскныя злучэньні з *о* будуць ненатуральныя, неўласьцівыя, бо ў народнай мове іх няма, для народнай мовы яны проста будуць дзікія. Беларуская мова ў ненаціскных складох ува ўсякім слове знае толькі *а*,—усё роўна, ці будзе гэта сваё слова, ці запазычанае чужое. Праўда, з гэтым прыхільнікі оканьня не спрачаюцца. Яны кажуць, што няхай народ у сваёй народнай мове і ўжывае ў чужаземных словах толькі *а*, але ў кніжнай, літаратурнай мове, якая прызначаецца для адукаваных людзей, трэба пісаць *о*. Тутака, як бачыце, беларускую мову падзяляюць на дзьве мовы—на мову народную і на мову кніжную (літаратурную). Вядома, тыя, хто дзеляць, за ўзор бяруць расійскую ці якую там іншую кніжную мову, вельмі далёкую ад жывой народнай мовы. Але з такімі поглядамі нам нельга згадзіцца. Мы ня толькі ня хочам падзя-

ляць нашу мову на якіясь там дзьве мовы,—на мову адукаваных людзей, панскую, і на мову простую, мужыцкую, а нават і думаць аб гэтым. Мы хочам, каб беларуская мова была адна. Мы павінны імкнуцца, каб простая мужыцкая мова разам з тым была і мовай кніжнай (літаратурнай). Нельга пры гэтым думаць, што беларуская мова будзе зьяўляцца якімсьці выключэньнем сярод іншых моваў. Даволі будзе сказаць аб сербскай народнай і літаратурнай мовах, якія супадаюць у аднэй мове. Гэтае адзінства народнай і кніжнай мовы павінна быць ідэалам пры разьвіцьці нашай мовы. Значыць, усё, што супярэчыць адзінству мовы, што падрывае яго, павіннна быць адкінута, як шкодная для нормальнага разьвіцьця мовы рэч. А паколькі оканьне ў чужаземных словах, супярэчачы жывому вымаўленьню, зьяўляецца аднэй з прычын, што параджаюць падобнае дзяленьне, дык яно таксама мусіць быць адкінута.

Некаторыя кажуць, што для беларуса ня цяжка вымавіць націскное *о*. Але гэтыя асобы ў большасьці судзяць па сабе: яны добра ведаюць расійскую, а можа і польскую ці якую іншую чужаземную мову, дзе *о* ў ненаціскных складох—злучэньне натуральнае. Не, па сабе тут судзіць нельга. Тут трэба паставіць сябе на месца школьніка, які, апроч сваёй роднай мовы, ніякай іншай ня ведае. І можна быць пэўным, што такія словы, як *конвульсія, коордынацыя,* ён будзе вымаўляць *канвульсія, каардынацыя*. На што-ж тады мы будзем ламаць сваім школьнікам языкі, каб яны навучаліся вымаўляць ненаціскное *о?* Мусіць, толькі хіба на тое, каб можна было фарсануць сваёй вучонасьцю? Бо любіла-ж расійская арыстократыя, што ўмела гаварыць пафранцуску, устаўляць француское насавое *n* і ў зрусіфікаваныя францускія словы, напр., *банк;* а пераймаючы іх гаворку, некаторыя нават вымаўлялі пафранцуску *н* і ў расійскіх словах, напр., *конка,* бо дзе-ж там звычайнаму сьмяротнаму разабрацца, якое тут слова будзе сваё, а якое—чужаземнае. Ня будзем-жа мы ім упадабляцца.

Некаторыя тут кажуць, што проста нейк брыдка пашыраць аканьне на некаторыя чужаземныя словы, як, напр., *ракако, сапрана,* і што ў гэтых словах мы абавязкова вымаўляем ненаціскное *о: рококо, сопрано*. Але, выбачайце, ваш

пакорлівы слуга скажа толькі *ракако, сапрана;* ды ня толькі гэтак вымаўляю я—гэтак вымаўляе бадай усё беларускае грамадзянства. Варта толькі прыслухацца.

Некаторыя знаходзяць, што чужаземныя словы таму трэба вымаўляць блізка да вымаўленьня таго народу, ад якога слова запазычаецца, бо ў гэтых выпадках лягчэй адзін народ зразумее другога. Але для кожнага зразумела, што гэты довад—адна недарэчнасьць. Па адных словах, ня ведаючы цалком мовы другога народу, нельга яшчэ згаварыцца. Каб разумець мову другога народу, трэба яе вывучыць, і вывучыць ня толькі лексыку, а галоўным чынам, граматыку мовы. Таксама, зразумела, што калі народ запазычае слова з іншае мовы, а гэта бывае тады, калі не хапае свайго патрэбнага слова, то народ не задаецца мэтай, што хтосьці яго ці ён каго можа лягчэй зразумець. Народ запазычае слова для таго, каб выразіць ім пэўную ідэю і праз гэта ўзбагаціць сваю мову, і калі запазычанае слова дапасуецца да вымаўленьня народу, то яно ўжо робіцца словам яго мовы. У гэтым і заключаецца процэс разьвіцьця мовы.

Ёсьць і такія, што кажуць: „Вымаўляй, як хочаш, а пішы, як трэба“ (гэта значыць так, як напісана слова ў чужаземных мовах), каб слова па сваім напісаньні адпавядала напісаньню ў чужаземнай мове. А чаму? Да таму, кажуць, што калі пашырыць аканьне на чужаземныя словы, то можа здарыцца, што два словы будуць мець аднакае напісаньне, напр., *антолёгія*—літаратурны тэрмін (цьветаслоў) і *онтолёгія*—філёзофскі тэрмін. Як-жа іх зразумець, калі напісаньні іх сальлюцца ў адным слове *анталёгія?* На гэта я адкажу значэньнямі нашага слова *баба.* Слова *баба* мае гэткія значэньні: 1) старая жанчына; 2) ступень сваяцтва; 3) павітуха; 4) мужчына, падобны па характары на жанчыну; 5) прылада ў млыне; 6) доўбня, якой забіваюць палі, і інш.; або—*бабка:* 1) у першых двух значэньнях; 2) вялікодная булка; 3) кавадла, на якім б'юць (кляпаюць) касу; 4) пастаўленая для прасушкі кучка снапоў і інш. Ня гледзячы на такую рознастайнасьць значэньняў слоў *баба* і *бабка,* мы добра разумеем значэньне кожнага слова, хоць яны маюць адно і тое-ж напісаньне (і вымаўленьне), бо значэньне кожнага слова выяўляецца толькі ў контэксьце, незалежна ад яго напісаньня.

Ды, урэшцэ, калі кіравацца запатрабаваньнем, што чужаземныя словы трэба пісаць так, як яны пішуцца ў мове таго народу, ад якога словы запазычаюцца, то ў гэтым выпадку чужаземныя словы трэ' было-б пісаць і адпаведнымі шрыфтамі: лацінскім, арабскім і да т. п., ад чаго, вядома, адмаўляюцца самі окаўцы.

Разгледзеўшы довады прыхільнікаў оканьня ў чужаземных словах, мы бачым, што 1) іх довады нягрунтоўныя і 2) што оканьне супярэчыць законам нормальнага разьвіцьця нашае мовы.

Цяпер застанаўлюся на самай галоўнай загане оканьня ў чужаземных словах; якія словы падлягаюць *оканьню,* а якія—*аканьню,* іншымі словамі (па тэрмінолёгіі окаўцаў), якія з запазычаных слоў зьяўляюцца кніжнымі, а якія—народнымі? Зрабіць падзел гэтых слоў—рэч проста немагчымая, а калі хто яго і зробіць, то выйдзе вельмі крыклівая штучнасьць, якая будзе залежаць ад погляду тэй ці тых асоб, што будуць рабіць гэткі падзел. Агульнай пагоджанасьці, чаго, вядома, патрабуе кожны правапіс, тут быць ня можа. Напр., словы *камуністы, камісар*—кніжныя ці народныя? Окаўцы кажуць, што народныя, бо народ іх ведае, а таму яны павінны пісацца праз *а*. А *камунізм, камуністычны, камунальны, камунікацыя, камісарыят, рэспубліка?* А гэта, кажуць,—словы кніжныя, а таму яны павінны пісацца праз *о*. Дзе-ж крытэры для такога падзелу? Адзін суб'ектывізм. Таму і зразумела, што ў нас пішуць *камітэт* і *комітэт, камісія* і *комісія, камісарыят* і *комісарыят* і г. д., нават іншы раз пішуць *о* там, дзе яно і непатрэбна; напр., у слове *галлюцынацыя* пасьля *г* пішуць *о*. Каб раз назаўсёды зазначыць, у якіх чужаземных словах трэба пісаць *а,* окаўцы знаходзяць патрэбным выдаць адпаведны слоўнік. Адносна ліку такіх чужаземных слоў, дзе пішацца *а,* гавораць розна: адны кажуць, што іх будзе некалькі дзесяткаў, іншыя—некалькі соцен, а некаторыя налічваюць і больш таго. Але згодзімся на мінуту, што такі слоўнік складзены і выпушчаны для шырокага карыстаньня ў сьвет. Будзе ў гэтым слоўніку ня менш 400—500 слоў. Значыць, каб умець граматна пісаць, трэба завучыць напамяць гэтыя 400—500 слоў (не насіць-жа заўсёды пры сабе слоўніка!). І тады ў нас выйдзе: „верно, редко, непременно, где, отменно,

вне, совсем“ і г. д.; словам, у нас будзе нешта падобнае да таго кашмарнага расійскага „яць“, проці якога лепшыя пэдагогі вялі барацьбу на працягу ста год і якое толькі зьмяла пролетарская рэволюцыя. Але ў нас справа з оканьнем будзе яшчэ горай. У той час як у расійскай мове лік слоў з „яць“ заставаўся адзін і той-жа, у нас лік чужаземных слоў з *о* будзе бясконца расьці, бо мова, як жывы організм, расьце і папаўняе свой лексыкон усё новымі і новымі словамі—сваімі і чужымі. Якіх-небудзь 7—8 год таму назад у нас зусім невядомы былі народнай мове словы *камуністы, савет* (окаўцы павінны пісаць *совет), камітэт;* цяпер-жа іх усюды ведаюць. Адсюль вынікае, што тэты слоўнік чужаземных слоў можна скласьці толькі на сягодняшні дзень. Праз год, праз тры гады, адным словам, па меры таго, як чужаземныя словы будуць рабіцца набыткам усяго беларускага народу, трэба будзе складаць новыя слоўнікі ці дапаўняць выданыя. Такім чынам, кожны граматны пабеларуску чалавек павінен або ўсё сваё жыцьцё вучыць беларускі правапіс або застацца бязграматным. Будзе, вядома, апошняе, бо дзе-ж там знойдзеш часу пры познай працы службовага чалавека, каб заглянуць у слоўнік! Недарэчнасьць такіх слоўнікаў зразумела кожнаму.

Урэшце, ёсьць яшчэ адна не малая загана оканьня—як адрозьніць пашыранае ў мове слова ад малапашыранага. Возьмем хоць-бы такое слова, як *пампаваць*. Для паўднёва-заходніх гутарак гэтае слова будзе пашыраным, і яго напішуць праз *а;* для паўночна-ўсходніх-жа гутарак, дзе гэткага слова няма, яно будзе непашыраным, і, пішучы яго, тут ніхто ня ўсумніцца напісаць яго праз *о,* як *конструкцыя, конглёмэрат* і да т. п. малапашыраныя ў мове словы. Скажуць, вядома, што трэба зазірнуць у слоўнік. Але кожнае зазіраньне каштуе часу, а ўсіх слоў у слоўніку не запомніш, асабліва праз якіх 30—50 год, калі гэткіх „спрэчных“ слоў можа набрацца некалькі тысяч. І выходзіць, што калі ня будзеш глядзець у слоўнік—будзеш рабіць памылкі; а калі будзеш глядзець у слоўнік—то будзеш марна траціць час, ня лічачы ўжо, вядома, таго, што ўсякі прыпынак перашкаджае мэханічнасьці пісьма, чаго добры правапіс заўсёды ўхіляецца.

Урэшце, я-б сказаў, што оканьне ў чужаземных словах

парушае наш асноўны фонэтычны прынцып правапісу галосных, а праз гэта псуе нашу мову і пазбаўляе яе *характэрнай* асаблівасьці.

Такім чынам, усякае ненаціскное **о** *ў чужаземных словах трэба пісаць праз* **а.** Калі-ж хто мае патрэбу ў асабліва дакладнай перадачы чужаземнага слова, то, вядома, ён можа, як выключэньне, дапусьціць і оканьне, узяўшы слова ў лапкі (стыль „рококо“), або нават напісаць гэтае слова лацінкай (forto, adagio).

Канчаючы агляд правапісу адносна ненаціскнога *о* ў чужаземных словах, застанаўлюся яшчэ на некаторых больш дробных пытаньнях, зьвязаных з правапісам гэтага гуку.

Сюды перш за ўсё падлягае правапіс ненаціскнога злучэньня лё (lo). Але паколькі *лё=льо,* г. зн. мяккаму *л (ль)+о,* то зразумела, што гэтае *о* ў злучэньні *лё* падлягае агульнаму правілу, і такім чынам трэба пісаць: *дыплямат, філязофія, аналягічны* і г. д. (а не *дыплёмат, філёзофія, аналёгічны).*

Сюды-ж падлягае і ненаціскное злучэньне ў чужаземных словах *іо,* якое мусіць пісацца праз *ія,* а пасьля цьвёрдых—*ыя*: *бібліятэка, фізыяномія* (а не *бібліотэка, фізыономія,* як пішуць окаўцы). Асобы, якія слаба ведаюць беларускі правапіс, якія, значыць, кіруюцца ўласным чуцьцём мовы, таксама пішуць: *бібліятэка, фізыяномія.* Значыць, злучэньне *іо* павінна пісацца праз *ія (ыя)* таму, што яно адпавядае нашаму жывому вымаўленьню.

Каб даць больш грунтоўную падставу гэтай зьяве, разгледзім наогул чужаземныя злучэньні *іа, іе (іэ), іо.* Злучэньне *іа* ў нас перадаецца праз *ія (іjа* або *ійа),* пасьля цьвёрдых зычных—праз *ыя (ыjа* або *ыйа).* Такім чынам, чужаземнае злучэньне *іа* ў нашай мове пасьля *і* разьвівае *j (й),* дзеля чаго мы пішам: *філія, нацыя (філійа, нацыйа).* Такі-ж *j (й)* разьвіваецца і ў злучэньні *іе (іэ): гігіена (гігійэна). Даніель (Данійэль), дыета (дыйэта),* бо *(іе) іэ=іjэ* або *ійэ;* а пасьля цьвёрдых зычных—*ыjэ* або *ыйэ.* Разьвіваецца ў нашай мове *j (й)* і ў злучэньні *іо* (але на пісьме *памылкова* не перадаецца: пішуць *легіон, бастыон),* бо *іо* (пад націскам)=*іо* або *ійо,* а пасьля цьвёрдых зычных — *ыjо* або *ыйо: міліён (мілійон), бастыён (бастыйон),* а не *міліон, бастыон.* Калі-ж чужаземнае

злучэньне *io* зьяўляецца ненаціскным, то яно падлягае агульнаму правілу аканьня. Такім чынам, трэба пісаць: *бібліятэка* (з *бібліjотэка), фізыяномія (фызыjономія)* і да т. п.

Што-ж датыча правапісу *е* ў чужаземных словах, то правапіс яго трэба пакінуць той, які цяпер існуе.

Урэшце я хацеў-бы адказаць майму опонэнту т. Імшэньніку, які мяне папракае за тое, што у маёй брошуры: „Аб пашырэньні аканьня на чужаземныя словы“ напісаньне ненаціскнога *о* ў чужаземных словах ня вытрымана і што, значыць, прапануючы пэўную правапісную норму, я на практыцы сам не магу з ёй справіцца. Гэткая заява т. Імшэньніка мяне вельмі дзівіць. Аб прычынах памылак у маёй брошуры я перад гэтым асабіста гаварыў т. Імшэньніку, і, выступаючы з прамовай, ён ведаў, што я корэкты брошуры ня чытаў, і што калі здарыліся памылкі, то тут вінават корэктар. Як т. Імшэньнік адважыўся пасьля такой заявы зрабіць мне закід, гэта справа яго тактыкі.

Чаржынскі. Кожны раз, калі мы дэбатуем проблему правапісу чужаземных слоў у беларускай мове, трэба наперад умаўляцца, аб якіх катэгорыях гэтых чужаземных слоў ідзе гутарка; інакш кажучы, патрэбна папярэдняя дыфэрэнцыяцыя паняцьця „чужаземныя словы“. Тым ня менш, дакладчыкі, што тут выступалі, такой дыфэрэнцыяцыі ня лічылі патрэбным рабіць. Наадварот, проблему напісаньня чужаземных слоў ставілі тут *агульна, да ўсіх чужаземных слоў,* нязьменна падмацоўваючы свае погляды на гэтае пытаньне і вывады, якія, паводле іх думкі, павінны выплываць адгэтуль, такімі чужаземнымі словамі, як *камісія, камітэт, камуніст.*

Зразумела, такая агульная пастаноўка пытаньня, з вывадамі ад некалькіх вышэйшых, популярнейшых чужаземных слоў на ўсе чужаземныя словы, ня вытрымлівае крытыкі. Калі я гавару аб правапісу чужаземных, то я думаю зусім не аб тых некалькіх словах, на якія нязьменна спасылаецца т. Некрашэвіч, я думаю аб тых многіх *дзесятках тысяч чужаземных* слоў, якія ў значнай сваёй долі ўжо ўвайшлі ў мастацка-навуковую літаратурную беларускую мову і з кожным годам усё больш і больш будуць наплываць туды. У вядомым слоўніку Чудзінава зарэгістравана 60.000 чужаземных слоў, што ўвайшлі ў расійскую мову. Мне здаецца, што гэ-

тага ня ўнікае і беларуская кніжная мова, паколькі для навуковых тэрмінаў будуць і ў нас ужывацца інтэрнацыянальна-чужаземныя словы-тэрміны.

І калі мы разьвязваем проблему напісаньня чужаземных слоў, мы павінны мець на ўвазе не адзінкі, не дзесяткі, ня сотні нават тых спопулярызаваных, у большай часьці абеларушаных слоў, якія бязумоўна ёсьць падстава падпарадкаваць правапісу беларускіх слоў, а *многія дзесяткі тысяч чыста кніжных, навуковых, тэхнічных інтэрнацыянальных слоў-тэрмінаў*.

Паважаная Конфэрэнцыя! Я лічу, што на падставе аднэй-дзьвёх соцен чужаземных слоў, популярных і пашыраных у жывой народнай мове, нельга навязваць прынцыпу аканьня да *ўсіх* чужаземных слоў. Тым больш, што напісаньне чужаземных слоў ня вычэрпваецца ніводным правапісам: чужаземныя словы скрозь і ўсюды запісваюцца на аснове літаратурных традыцый і іх інтэрнацыянальнасьці.

Кніжнае тэхнічнае слова, тэрмін, гэтая бясспрэчная і вельмі значная інтэрнацыянальная сувязь паміж народамі, носіць гэтыя рысы інтэрнацыянальнасьці не ў сваёй фонэтыцы, а ў сваім напісаньні. І я катэгорычна настойваю на тым, што няма падставы парушаць гэтую культурную інтэрнацыянальную сувязь у ўгоду толькі ўпрашчэнцкім тэндэнцыям у беларускім правапісу, тым больш што грамаце вучацца ня толькі і ня выключна па правапісу, але, і галоўным чынам, па слоўніку. Наша заданьне ня толькі формуляваць тыя ці іншыя правілы беларускага правапісу, але апрацаваць і выдаць ортографічны слоўнік, дзе знойдуць сабе месца ў пэўнай долі і чужаземныя словы. Некрашэвіч проціў такога слоўніка выстаўляе той закід, што немагчыма кожны раз заглядаць у слоўнік, пішучы тое ці іншае чужаземнае слова. А хіба-ж, т. Некрашэвіч, калі пішуць у рускай мове чужаземнае слова, то кожны раз заглядаюць у слоўнік? Морфолёгічнае пахаджэньне чужаземнага слова ня ўсе разумеюць, ужываючы ў пісьме яго. Пішуць на аснове літаратурнай практыкі, *гэтай практыкі* не заменіць нам ніякі правапіс.

Дзеля гэтага мая пропозыцыя наступная. Прынцыповая пастаноўка проблемы напісаньня чужаземных слоў у беларускай мове, даная Тарашкевічам, застаецца нязьменнай. Нам трэба

разьвязаць гэту проблему на гэтым прынцыповым грунце *практычна,* у гэтым уся труднасьць пытаньня. Да гэтага часу мы не маглі даць такога практычнага разьвязаньня (хаця спробы і рабіліся), бо мала над гэтым працавалі. Аднак, магчымасьці на гэта ёсьць. Працуе ў нас Слоўнікавая Камісія, сабраўшая ўжо да 200 тысяч картак-слоў. Гэтыя 200 тысяч картак, на мой погляд, і могуць быць базай для апрацаваньня ортографічнага слоўніку, асабліва яго чужаземна-слоўнай часткі. Тыя чужаземныя словы, што ўжывае поэзія, вёска, народ, якія запісаны ў гэтых картках якраз з пералічаных крыніц (поэзія, вёска, народ), можна пасьля ўсебаковай навуковай крытыкі падпарадкаваць аканьню. На ўсе іншыя, як давялося мне казаць вышэй, чужаземныя словы пашыраць аканьне абсолютна немагчыма, бо ніхто і ніякі правапіс ня прымусіць працаўніка навукі пісаць *а*стэалёгія замест—*о*стэолёгія і *а*зон замест—озон.

Старшыня: У Прэзыдыум паступіла тры пропозыцыі: 1) С. Некрашэвіча: кожнае чужаземнае ненацікное *о* ў беларускай мове передаецца на пісьме праз *а;* 2) Я. Лёсіка: правапіс чужаземных слоў у Камісіі не разглядаць, а перадаць для апрацаваньня ў Правапісную Камісію; 3) Чаржынскага: прынцыповая пастаноўка проблемы напісаньня чужаземных слоў прымаецца ў тэй формулёўцы, якую даў Тарашкевіч.

Стаўлю на галасаваньне пропозыцыю Некрашэвіча. Хто за пропозыцыю? (За—12, супроць—8, устрымалася—1, адсутнічае—9). Я лічу, што пры гэткіх умовах мы ня можам лічыць пропозыцыю Некрашэвіча прынятай абсолютна.

Растаргуеў. Я хацеў-бы зьвярнуць увагу на тую акалічнасьць, што адсутныя не павінны лічыцца. Калі мы лічылі сябе ў праве адчыніць гэты сход пры такім ліку членаў Камісіі, значыць гэтым мы прызналі, што ўсе пастановы Камісіі зьяўляюцца законнымі. Я лічу, што пастанова нашай Камісіі канчатковая, бо з прысутных 21 чал. за пропозыцыю галасавала 12, супроць—8.

Старшыня: Я кажу, што Прэзыдыум знаходзіць, што гэта пропозыцыя ня можа лічыцца абсолютна прынятай. Мы адмецім, што яна прынята пры 21 чал.

Растаргуеў. Пастаноўку пытаньня Прэзыдыумам я лічу няправільнай. Трэба лічыцца з тымі членамі Камісіі, якія за-

праўды прысутнічаюць на сходзе; пастановы мы выносім простаю большасьцю галасоў.

Некрашэвіч. Довады проф. Растаргуева я знаходжу грунтоўнымі. Ні аб якім тут „абсолютным прыняцьці“ не павінна быць і гутаркі.

Чаржынскі. Я лічу, што тут можа быць па данай рэзолюцыі такі выхад, што пропозыцыя прайшла пры наступных выніках галасаваньня: 12—за, 8—проці; фіксаваць, што яна прынята большасьцю Правапіснай Камісіі, я лічу беспадстаўным. І вось чаму...

Некрашэвіч (з месца). Аб гэтым ніхто і ня кажа. Што рэзолюцыя прынята большасьцю, за гэта гавораць вынікі галасаваньня.

Чаржынскі. Усе пастановы Правапіснай Камісіі ўчора прымаліся не такою большасьцю: там было 15 супроць 7, а сягодня 8 супроць 12, пры гэтым 9 чал. адсутнічае.

Старшыня: Дазвольце мне, як старшыні, знайсьці наступны выхад: мы прагаласуем іншыя пропозыцыі і тады скажам канчатковыя вывады. (Чытае пропозыцыю Я. Лёсіка).

Я. Лёсік. Я падтрымліваю прапанову старшыні, бо, папершае, пытаньне гэта ўсебакова не разглядалася і, падругое, само галасаваньне паказала, што гэтае пытаньне яшчэ не апрацавана ў належнай меры: яно яшчэ зьяўляецца цёмным, а таму я лічу зусім рацыянальным, калі яно будзе пярэдана ў Правапісную Камісію Інбелкульту.

Некрашэвіч. Па пытаньні аб правапісу чужаземных слоў у адносінах *о* наша Камісія галасаваньнем ужо выказала свой погляд. К чаму-ж цяпер ставіць процілеглую пропозыцыю? Такую пастаноўку пытаньня я лічу зусім няправільнай.

Голас (з месца). Пропозыцыя Я. Лёсіка галасавалася ў самым пачатку і была адхілена большасьцю галасоў. *(Галасы:* Правільна!).

Чаржынскі. У пачатку абгаварэньня гэтага пытаньня грам. Лёсік прапанаваў, каб дыскусіі па пытаньні аб правапісу чужаземных слоў у нашай Камісіі не адчыняць. Тады пропозыцыя яго была адхілена. Цяпер-жа Лёсік уносіць новую пропозыцыю, што гэтае пытаньне патрабуе дыскусіі і што яно павінна быць пярэдана ў Інбелкульт. Гэта зусім новая пропозыцыя, якая павінна быць прагаласавана.

Старшыня: Па пропозыцыі Лёсіка ўжо выказаліся за і супроць. Хто за пропозыцыю Лёсіка? (Проціў — 15, за — 6; рэшта адсутнічае).

Цяпер дазвольце зачытаць пропозыцыю т. Чаржынскага (чытае).

Некрашэвіч. Прэзыдыум зноў ставіць на галасаваньне процілеглую пропозыцыю тэй (першай), за якую галасавала большасьць членаў сходу. Я лічу, што Прэзыдыум няправільна вядзе сход. Супроць такой пастаноўкі пытаньня я рашуча протэстую. Пропозыцыя т. Чаржынскага павінна быць зьнята.

Старшыня: Пропозыцыю т. Чаржынскага галасую. Хто за пропозыцыю? (За—9, супроць—11, рэшта адсутнічае). Цяпер дазвольце абвясьціць вынікі галасаваньня. За рэзолюцыю гр. Некрашэвіча галасавала: за—12, супроць — 8; за рэзолюцыю гр. Лёсіка: за—6, супроць—15; за рэзолюцыю гр. Чаржынскага: за—9, супроць—11. Такім чынам, большасьць галасоў атрымала рэзолюцыя гр. Некрашэвіча.

Цяпер пераходзім да пытаньня аб правапісу нескладовых *і* і *у*. Слова мае Антон Лёсік.

Антон Лёсік. Усім вядома правіла Тарашкевіча аб ужываньні на пісьме скарочаных *ў* і *й;* яно формулёвана так: галосныя *у* і *і* дзеля складнасьці замяняюцца на *ў* і *й,* калі папярэдняе слова канчаецца галосным: было *ў* бацькі тры сыны; яна *ўжо* пайшла; ён яго *й* поіць і корміць; яна *йдзе*". На самым дзеле *і* можа скарачацца толькі ў такіх выпадках, *калі папярэдні галосны гук, разам з і, вымаўляецца адным выдыхам паветра;* напр., калі вымаўляем словы—„яна йдзе", то выходзіць гэта так: „ян*ай* дзе"; гэта значыць, гукі *а, і* вытварылі дыфтонг—*ай.* Папярэдні галосны гук, разам з *і,* можа вытварыць дыфтонгі—*ай, ой, уй* і г. д. толькі тады, калі мы гэтыя гукі вымаўляем адным выдыхам паветра; калі-ж мы вымаўляем папярэдні галосны гук асобна ад *і,* то дыфтонг не вытвараецца, і скарачэньня *і* ня можа быць. У мове ёсьць многа выпадкаў, калі нам прыходзіцца рабіць перапынак на слове, якое канчаецца на галосны гук, хоць пасьля гэтага слова няма ніякага знаку прыпынку; напр., у сказе: „Адны вочы і плачуць і сьмяюцца" мы робім паўзу на слове „вочы", так што *ы* вымаўляецца асобна ад наступнага гуку *і;* значыць, у такім выпадку дыфтонг *ый* не вытвараецца, і дзеля

таго ня будзе „скарочанага“ *і*. Звычайна мы робім паўзу на тым слове, якое стаіць перад словам з лёгічным націскам (у прыведзеным вышэй прыкладзе лёгічны націск падае на слова „і плачуць“). Калі мы ў даным прыкладзе гук *ы* ў слове „вочы“ вымавім адначасна з наступным гукам *і* („Адны вочый плачуць, і сьмяюцца“), то такое вымаўленьне будзе нявыразнае. Такую-ж самую фонэтычную зьяву можам бачыць і ў падобных прыкладах: „Павінную голаву і меч ня іме“. „На адным месцы і камень абрастае“. „Ён яго і корміць і поіць“ і др.

Можна знайсьці ў беларускай мове многа выпадкаў, калі мы робім паўзу на папярэднім перад *і* галосным гуку (у ўзятым прыкладзе на гуку *ы)* і калі папярэдні галосны з наступным *і* ня зьліваюцца ў адзін дыфтонг і дзеля таго *і* не скарачаецца, хоць стаіць пасьля галоснага гуку.

Апроч таго, *і* не скарачаецца яшчэ і ў наступных выпадках: 1) калі на *і* падае націск: *за ім, на іх, з імі* і пад.; 2) калі вытвараецца зьбег зычных, і гук *і* не „скарачаецца“ дзеля мілагучнасьці; напр.: *коні імчацца, на імгле* і пад.; хоць тут *і* стаіць пасьля галосных, але вымавіць: *коні ймчацца, на ймгле* вельмі трудна, бо вытварыўся зьбег трох зычных; дзеля мілагучнасьці ў такіх выпадках ня трэба скарачаць *і*.

Такіх выпадкаў, калі, паводле фонэтычных законаў, нельга скараціць *і,* хоць яно стаіць пасьля галоснага гуку, можна прывесьці многа.

Вось бяручы пад увагу ўсе выпадкі выключэньня з правіла Тарашкевіча на-конт скарачэньня *і,* я яшчэ ў прошлым годзе восеньню прабаваў напісаць правіла ўжываньня *і, й* пасьля галосных у беларускай мове. Гэтае правіла цяпер у мяне ў руках; яно складзена з двух пунктаў: калі ўжываецца *й* (нескладовае), а калі *і* (складовае); але з кожнага пункту ёсьць выключэньні; разумеецца, такім правілам на практыцы кіравацца вельмі трудна.

Адсюль трэба прыйсьці да заключэньня, што лепш будзе, калі асобнага і пачатковага ў слове *і* на пісьме нідзе ня будзем скарачаць. Праўда, пры вымаўленьні будуць выпадкі, калі *і* пасьля галосных „скароціцца“, але азначаць гэтага ў правілах ня трэба.

Такія значныя довады, як для ўжываньня нескарочанага *і,* трудна прывесьці для абаснаваньня таго, што на пісь-

ме лепш ніколі ня ўжываць „скарочанага“ *ў*. Праўда, ёсьць выпадкі, калі скарачаць *у* пасьля галосных ня трэба, каб ня вытварылася немілагучнае вымаўленьне, напр.: за ўрадам, пры ўхвале і пад. Апроч таго, *у*, як *і*, у вершах ужываецца то скарочанае, то нескарочанае, незалежна ад правіла Тарашкевіча, гэта значыць, скарачаецца там, дзе, паводле правіла, ня трэба скарачаць—і наадварот.

Калі мы на пісьме ня будзем азначаць скарочанага *у* пасьля галосных спачатку слова ці *у* асобнага, то гэтым не сатрэм уласьцівасьці беларускае мовы; бо скарочанае *у* вельмі выразна чуваць у сярэдзіне слоў і на канцы, напр.: *воўк, лаўка, конаўка* і пад.; *кроў, любоў, валоў, сталоў, ішоў, чытаў* і пад.

Уласьцівасьць беларускае мовы стане больш выразнаю, калі мы будзем пісаць „прышлі у хату“, чым „прышлі ў хату“, бо апошняе напісаньне набліжае беларускае выражэньне да расійскага „в хату“ *(ў* бліжэй да *в*, чым *у)*. Значыць, калі мы ня будзем на пісьме азначаць скарочанага асобнага і пачатковага ў слове *у*, то гэтым самым мы будзем падчыркваць выразную ўласьцівасьць беларускае мовы — ужываньне прыназоўніка *у* замест старога славянскага *в*, да якога набліжаецца беларускае *ў*.

Растаргуеў. Катэгорычна выказваюся супроць запрапанаванага проекту выключэньня нескладовых *у* і *і*, калі яны стаяць пасьля галоснай асобна або ў пачатку слова.

Старшыня: Ёсьць пропозыцыі спыніць спрэчкі. (Большасьцю галасоў спыняюцца). У Прэзыдыум паступіла наступная пропозыцыя А. Багдановіча: правапіс нескладовага *у* пакінуць у рэдакцыі Тарашкевіча. Выкінуць выключэньні, якія зрабіў Я. Лёсік у сваім правапісу. У чужаземных словах *ў* ня пісаць. *Ї*, калі яно стаіць асобна або на пачатку слова, заўсёды пішацца праз *і* (складовае).

Яшчэ ёсьць пропозыцыя Я. Лёсіка: *у* і *і*, калі яны стаяць асобна або на пачатку слова, заўсёды пішуцца праз *у*, *і* (складовыя).

Пропозыцыю А. Багдановіча галасую па частках. (Прымаецца). З прычыны таго, што час у нас надта абмежаваны, я галасаваць паіменна ня буду. (Прымаецца).

Стаўлю на галасаваньне першую частку пропозыцыі:

правапіс *у* заставіць у рэдакцыі Тарашкевіча (За—9; проці—4). Стаўлю на галасаваньне другую частку пропозыцыі: выкінуць выключэньні, якія ўнес у правапіс *у* Я. Лёсік (За—8, проці—3). Стаўлю на галасаваньне трэцюю частку прапановы: у чужаземных словах нескладовага *у (ў)* ня пісаць.

Некрашэвіч. Прапаную гэтае пытаньне зьняць і перадаць на вырашэньне ў Правапісную Камісію Інбелкульту.

Старшыня: Галасую пропозыцыю гр. Некрашэвіча (За—большасьць, проці—2). Стаўлю на галасаваньне апошнюю частку пропозыцыі А. Багдановіча: *і,* калі яно стаіць асобна або на пачатку слова, заўсёды пішацца праз *і.* (За—большасьць).

Такім чынам, прынята пропозыцыя А. Багдановіча з папраўкай Некрашэвіча. У зьвязку з гэтым пропозыцыя Я. Лёсіка адносна нескладовага *у* адпадае, а адносна нескладовага *і (й)* прымаецца.

Агляд беларускай літаратуры.

Асноўныя этапы разьвіцьця новай беларускай літаратуры

Старшыня: Слова для дакладу мае проф. Пятуховіч.

Пятуховіч. Высокапаважаная Конфэрэнцыя! Тэма майго дакладу—асноўныя этапы разьвіцьця новай беларускай літаратуры. Мая задача даць агульную характарыстыку літаратурнага процэсу на Беларусі.

На гэтай задачы я спыняюся вось чаму: гісторыя беларускай літаратуры—дысцыпліна маладая; яна пачала сыстэматычна разьвівацца толькі з утварэньнем Інстытуту Беларускай Культуры і Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту. На маю долю выпала высокая, але адначасна цяжкая і адказная задача пабудовы першага унівэрсытэцкага курсу гісторыі беларускай літаратуры. Я і хацеў-бы пазнаёміць высокапаважаную Конфэрэнцыю з агульнай схэмай і асноўнымі падставамі пабудовы гэтага курсу.

Першае пытаньне, якое паўстае ў сувязі з пастаўленай мною задачай,—гэта пытаньне аб падзеле гісторыі беларускай літаратуры на пэрыоды. Вядома, што проблема пэрыодызацыі зьяўляецца досыць складанай. Існуюць розныя прынцыпы падзелу гісторыі літаратуры на пэрыоды. Заўважваецца, напрыклад, так званы зьмешаны тып пэрыодызацыі: у аснову падзелу кладуцца розныя факты і гістарычна-культурнага і формальна-мастацкага парадку. Але паколькі пры дадзенай сыстэме адсутнічае адзінае fundamentum divisionis, яна супярэчыць элемэнтарным патрабаваньням лёгікі і асаблівай увагі не заслугоўвае. Больш цікавымі зьяўляюцца частыя тыпы пэрыодызаціі; яны будуюцца на розных прынцыпах. Адным з такіх прынцыпаў зьяўляецца прынцып аналістычны, або хронолёгічны. Паводлуг гэтага прынцыпу, у аснову падзелу кладуцца пэўныя хронолёгічныя адрэзкі (стагодзьдзі, дзесяцігодзьдзі і інш.). На такім прынцыпе будуюць свае агульныя курсы гісторыі літаратуры ў нямецкай навуцы Рыхард Мэйер, у расійскай—Энгельгардт і інш. Недахопам

гэтага прынцыпу зьяўляецца поўная ўмоўнасьць падзелу.

Другім прынцыпам пэрыодызацыі служыць гэтэрогенны прынцып, паводлуг якога ў аснову падзелу літаратурнага матар'ялу кладуцца фактары культурна-гістарычнага і соцыяльна-экономічнага парадку. На такім прынцыпе будуюць свае працы Вэнгэраў, Коган, Фрычэ і інш. Гэтэрогенны прынцып выклікае супярэчаньні. Паказваюць, што пры такім прынцыпе не абхапляюцца спэцыфічныя адзнакі літаратуры, як мастацкай творчасьці.

Зараз, як вядома, усё больш і больш узмацняецца формальна-мастацкі мэтод літаратурных досьледаў. Паралельна з гэтым высоўваецца аўтогенны прынцып пэрыодызацыі: у аснову падзелу кладуцца адзнакі літаратуры, як такой, адзнакі літаратурных форм і зьместу. Трэба сказаць, што аўтогенны прынцып усё больш і больш пашыраецца ў заходня-эўропейскай навуцы. Можна ўказаць, напрыклад, на працу Робэрта Рымана: „Das neunz ehnte Iahrhundert der deutschen Literatur". Робэрт Рыман будуе свой агульны агляд нямецкай літаратуры апошняга сталецьця на падставе аўтогеннага прынцыпу пэрыодызацыі. Ён намячае такія пэрыоды ў разьвіцьці нямецкай літаратуры дадзенай пары. Die Romantik, Der Pessimismus, Die politische Dichtung, Klassizismus und Realismus, Naturalismus und İmpessionismus. Гэткія загалоўкі ў працы Рымана гавораць самі за сябе. Аўтогеннага прынцыпу пэрыодызацыі трымаюцца ў сваіх працах таксама Бэрнгарт Фэр, В. Штамлер і інш. *).

З нашага пункту гледжаньня форма ў мастацкай творчасьці зьяўляецца соцыяльнай катэгорыяй; яна прадстаўляе сабою вытварэньне соцыяльна-экономічных фактараў. Свае вобразы, стылістычныя прыёмы кожны мастак, як вядома, чэрпае пераважна з акаляючай яго соцыяльнай дзейнасьці; сама композыцыя твору заўжды носіць на сабе адпячатку гэтай дзейнасьці: даўно заўважана, напрыклад, што ў умовах вясковай абстаноўкі пераважна ўтвараецца статычная форма композыцыі, у абстаноўцы гораду, наадварот, разьвіваецца форма дынамічная. Таксама форма мастацкіх твораў уяўляе сабой соцыяльную зьяву. Нам думаецца, з гэтай прычыны, што і пры пабудове агульнага курсу ў беларускай літара-

*) Синтетическое построение истории литературы. М. 1925., стар. 108.

туры, трэба ісьці ад базісу да надбудовы. Вось чаму наша схэма разьвіцьця новай беларускай літаратуры зьяўляецца схэмай соцыолёгічнай. Літаратурны процэс на Беларусі, з нашага пункту гледжаньня, у канчальным выніку азначаецца фактарамі соцыяльна-экономічнага і гістарычна-культурнага парадку.

Гісторыю беларускай літаратуры новага часу можна, думаецца нам, падзяліць на чатыры асноўныя пэрыоды:

1) Пэрыод прыгоннай гаспадаркі, які хронолёгічна ў агульных рысах супадае з першай паловай XIX стагодзьдзя.

2) Пэрыод ліквідацыі прыгоннай гаспадаркі, які падае, прыблізна, на другую палову зазначанага сталецьця.

3) Пэрыод рэволюцыі 1905—1906 г. г.

4) Сучаснае пісьменства, якое пераважна разьвіваецца пад знакам Чырвонага Кастрычніка.

Беларуская літаратура першага пэрыоду прыгоннай гаспадаркі мае свае пэўныя соцыяльна-экономічныя прадпасылкі.

Гэтыя прадпасылкі ўсім вядомы, мы напомнім іх толькі ў самых агульных рысах. Экономіка дадзенага часу характарызуецца панаваньнем форм натуральнай прыгоннай гаспадаркі; кіруючым станам зьяўляецца шляхта. Сялянства прадстаўляе з сябе об'ект бязьлітаснай эксплёатацыі. Знаходзячыся ў умовах такой эксплёатацыі, сялянства апускаецца амаль што да поўжывёліннага стану. Гістарычныя крыніцы таго часу малююць нам становішча сялянства ў жудасна смутных фарбах: сяляне жывіліся пераважна ня хлебам, а сурогатамі, жылі ў цёмных курных хатах, працавалі на пана звыш меры. Знаходзячыяся ў умовах такой бязьлітаснай эксплёатацыі, сялянства пачало фізычна выраджацца: мы заўважаем у дадзеную пару ня прырост насельніцтва, а наадварот, яго зьмяншэньне. Інстынкт самазахаваньня кідае селяніна на шлях адчыненай барацьбы, усё больш і больш павялічваюцца сялянскія бунты і паўстаньні. Агулам кажучы, соцыяльнае становішча сялянства таго часу ўяўляла сабою трагедыю і прытым часам трагедыю крывавую. У адносінах палітычна-нацыянальных Беларусь прадстаўляла сабою об'ект колёнізацыі або русіфыкацыі. Пэўна вытрыманай лініі ў расійскага самаўладзтва ня было: яго палітыка накіроўвалася ў бок узмацненьня то польскага, то расійскага элемэнту на

Беларусі. Беларусь перажывае стан культурнага заняпаду разам з тым занепадае і беларуская літаратура. Наша пісьменства ў прошлым, у XVI веку, якое мела такіх выдатных прадстаўнікоў, як Францішак Скарына, Васіль Цяпінскі, Сымон Будны і інш., цяпер, у пачатку XIX веку, уяўляе з сябе амаль што чысты аркуш. Але, ня гледзячы на такія знадворныя ўмовы, беларускі нацыянальны організм вызначаецца жывучасьцю. Беларускае сялянства ня губіць галоўнае адзнакі сваёй нацыянальнасьці: яно захоўвае сваю мову і сваю народную творчасьць. Скрозь вякі ўціску беларускі народ, як нейкі сьвяшчэнны скарб, пранёс амаль што незачэпленым гэтыя галоўныя рысы сваёй нацыянальнай фізыономіі. У дадзенай жывучасьці нацыянальнага організму заключаўся заклад паратунку. Беларускім народам пачынаюць цікавіцца як на Захадзе, так і на Ўсходзе. Гісторык У. Ігнатоўскі добра высьвятляе політычна-соцыяльныя падставы гэтае зацікаўленасьці. Ён паказвае нам, што Беларусь была аднолькава патрэбна і Польшчы і Расіі. На грунце такой чыста экономічнай і політычнай неабходнасьці, усё больш і больш узрастаюць інтарэсы да Беларусі з боку польскіх, і пазьней, з боку расійскіх вучоных. Першымі пачынаюць цікавіцца Беларусьсю польскія этнографы. Значную ролю ў процэсе абуджэньня зазначанай зацікаўленасьці да Беларусі адыграў Віленскі Унівэрсытэт. Гэты Унівэрсытэт, праўда, прадстаўляў сабою асяродак полёнізацыі беларускага краю, але адначасна ў яго напрамку былі некаторыя здаровыя элемэнты. У Віленскім Унівэрсытэце організоўваліся гурткі, у якіх выразна вызначаўся краязнаўчы ўхіл: гурткі цікавіліся беларускай мовай, беларускай народнасьцю, некаторыя з іх апрацоўвалі нават інструкцыі па зьбіраньні беларускіх народных твораў. Ад гэтай зацікаўленасьці беларускай народнасьцю і беларускай мовай быў толькі адзін крок да спроб утварэньня літаратуры на гэтай мове—і дадзены крок быў зроблен: у пачатку XIX стагодзьдзя беларускае пісьменства адраджаецца.

Што ўяўляла з сябе гэта новая беларуская літаратура эпохі прыгоннай гаспадаркі? Зьмест яе быў пераважна народніцкі; вёска, сялянства стаяць у цэнтры яе мастацкай апрацоўкі. Ідэолёгія гэтай літаратуры выразна шляхецкая. Адзнакамі шляхецтва служыць, папершае, гумар: пісьменьнікі

дадзенай пары часам любяць пасьмяяцца з селяніна, выставіць яго ў комічным ставовішчы. А самае галоўнае,—гэтыя пісьменьнікі хварэюць свайго роду социяльным дальтонізмам; яны не заўважваюць тэй трагедыі сялянскага становішча, якая разгарналася перад іх вачыма. Замест гэтай жудаснай грагедыі, яны ў сваіх творах абмалёўваюць прыкрую манерна-саладкаватую ідылію; социяльнае пытаньне прыкрываецца тут сухой маскай дыдактызму.

Больш рознастайнай зьяўляецца літаратура дадзенай пары ў адносінах формальна-мастацкіх. У гэтай галіне можна намеціць тры плыні: водгукі клясыцызму, сантымэнтальна-утопічнае народніцтва і романтычнае народніцтва.

Для разьвіцьця клясыцызму на Беларусі ня было спрыяючай глебы: тая арыстократычная культура, на глебе якой, як вядома, разьвіваўся клясыцызм, у нас была культурай польскай або расійскай. Высокія клясычныя жанры — трагедыя, поэма і інш.—у нас зусім адсутнічаюць. Далёкім рэхам клясыцызму ў беларускай літаратуры зьяўляюцца толькі дзьве жартліва-комічныя поэмы: „Энэіда навыварат“ і „Тарас на Парнасе“.

„Энэіда навыварат“ пабудавана ў дваістым пляне — мітолёгічным і рэальна-бытавым. Пад вэльмам мітолёгіі тут добра абмалёваны социяльна-клясавыя ўзаемаадносіны эпохі прыгоннай гаспадаркі; у поэме выступаюць перад намі прадстаўнікі буйной шляхты, прыганятыя і бедныя загнаныя беларускія сяляне. „Тарас на Парнасе“ дае выключна абразкі жыцьця заможнага сялянства—абразкі, ня тыповыя для эпохі прыгону; замест сялянскай беднасьці, тут абмалёўваецца багацьце і задавальненьне, перад намі праходзіць нейкі казачны край з малочнымі рэкамі і кісельнымі берагамі. Социяльная дзейнасьць тут праламляецца скрозь прызму шляхецкай сьвядомасьці; асаблівай социяльнай каштоўнасьці дадзены твор не ўяўляе.

Другім напрамкам эпохі прыгоннай гаспадаркі зьяўляецца сантымэнтальна-утопічнае народніцтва. Прыходзіцца констатаваць, што і для разьвіцьця гэтага напрамку ў нас ня было спрыяючай социяльнай глебы. На Беларусі адстутнічала цалком прамысловая буржуазія, тая кляса, на падставе якой узьнік, як вядома, сантымэнталізм у Заходняй Эўропе.

Вось чаму ў нас сантымэнтальны напрамак прымае надзвычайна вузкі характар; ён зьяўляецца ў нас у выглядзе сантымэнтальна-утопічнага народніцтва, зьяўляецца з значным спазьненьнем толькі ў сярэдзіне XIX стагодзьдзя.

Прадстаўніком сантымэнтальна-утопічнага народніцтва ў беларускай літаратуры служыць Дунін-Марцінкевіч. У Дуніна-Марцінкевіча мы знаходзім галоўныя адзнакі сантымэнталізму: у яго творчасьці вызначаецца пачуцьцёвасьць, свайго роду гіпэртрофія сэрца, ігра контрастаў, дыдактызм і павярхоўны оптымізм на рэлігійнай падставе; зло жыцьця для Дуніна-Марцінкевіча—гэта толькі мімалётныя цені на агульным сьветлым фоне дабра. Нават у галіне сюжэтнай композыцыі часам заўважваецца тут некаторае падабенства з сантымэнтальнымі творамі: „Гапон“ Дуніна-Марцінкевіча—гэта беларуская „памела“ ў мініятуры. Адначасна ў беларускага пісьменьніка выяўляецца вялікая ідэалізацыя жыцьця; ён старанна ўхіляецца ад суровай жыцьцёвай прозы. На авансцэну сваіх прасьцяцкіх вясковых гісторый ён высоўвае штучныя дэкорацыі, размалёваныя па гатоваму літаратурнаму шаблёну; сяляне ў яго творах—гэта нейкія вясёлыя пэйзане, якія скачуць, сьмяюцца і ня ведаюць амаль што суровай барацьбы за існаваньне. Адначасна ў Дуніна-Марцінкевіча заўважваецца і ідэалізацыя панства; паны выступаюць у яго ў ролі якіх-та дабрадзеяў і протэктараў сялянства. Узятая ў цэлым творчасьць Дуніна-Марцінкевіча прадстаўляе з сябе яскравы продукт дваровай культуры; паколькі ў нас гэта культура была мала зачэплена ўплывамі капіталізму, пастолькі і прыгоньніцкая сьвядомасьць вызначалася ў нас сваёй моцнасьцю. Гэта моцнасьць прыгоньніцкай сьвядомасьці асабліва яскрава выяўляецца, калі параўнаць, напрыклад, беларускую і расійскую літаратуру дадзенай пары. У Расіі ў гэты момант ужо яскрава адчуваліся ўплывы прамысловага капіталізму, прыгонная гаспадарка разбурвалася, і на глебе гэтага разбурэньня намячалася ўжо яскравая опозыцыя супроць паншчыны, якая выступае ў творах Грыгаровіча, Тургенева і інш. У беларускай літаратуры, дзякуючы своеасаблівым соцыяльна-экономічным умовам, не заўважваецца нават і найменьня на гэту опозыцыю.

Трэцім напрамкам у беларускай літаратуры дадзенай пары зьяўляецца романтычнае народніцтва. Романтызм, як вя-

дома, вынік на глебе дэклясаванай шляхты пад уплывам социяльна-палітычнай рэакцыі, якая зьявілася пасьля вялікай францускай рэволюцыі. У нас мелася гэта дэклясаваная шляхта, адчуваліся выразныя ўплывы агульна-эўропейскай рэакцыі. Такім чынам, можна констатаваць, што соцыяльна-палітычная глеба для разьвіцьця романтычнага напрамку да некаторай ступені мелася і ў нас, на Беларусі. Але, дзякуючы агульнаму культурнаму заняпаду, і романтычная плынь не магла ў гэты першы пэрыод новай беларускай літаратуры выявіцца ва ўсёй складанасьці свайго філёзофскага зьместу і ва ўсёй шырыні сваіх формальна-мастацкіх дасягненьняў. Замест шырокай літаратурнай плыні, у нас узьнікае толькі вузкая ручайка романтычнага народніцтва.

Вельмі трапнае азначэньне романтызму дае проф. Замоцін у сваёй вядомай дысэртацыі. Проф. Замоцін зазначае, што галоўнымі мотывамі романтызму, як ідэалістычнага сьветапогляду, зьяўляецца індывідуалізм, нацыяналізм і унівэрсалізм. Калі гэту схэму романтызму дапасаваць да беларускай літаратуры, то мы пабачым, што романтычны кірунак у нас меў вузкі характар. У беларускім романтызьме цалком адсутнічаюць мотывы індывідуалізму і філёзофскага унівэрсалізму; у ім выяўляецца толькі нацыяналізм, зацікаўленасьць беларускай народнасьцю. Беларускія романтыкі пачынаюць зьбіраць народныя творы, яны цікавяцца беларускай мовай і зьяўляюцца нашымі першымі этнографамі. Але трэба адзначыць, што ў літаратурнай дзейнасьці беларускіх романтыкаў заўважваюцца значныя супярэчнасьці: напр., пісьменьнік Рыпінскі цікавіцца беларускай народнасьцю, але гэта народнасьць не прадстаўляе для яго чагосьці самастойна каштоўнага; ідэалам для яго зьяўляецца канчатковая полёнізацыя Беларусі. Тая-ж самая супярэчнасьць заўважваецца і ў дзейнасьці Баршчэўскага. У дзейнасьці гэтага пісьменьніка, як зазначаў яшчэ Падбярэскі, выяўляецца плынь беларускага гофманізму; Баршчэўскі цікавіцца пераважна народнымі легендамі, яго вабіць да сябе народная фантастыка, усякая д'ябальшчына і інш. Але адначасна ў Баршчэўскага выяўляюцца скэптычна-іронічныя адносіны да галоўнага насільніка гэтай народнасьці—беларускага селяніна („Рабункі мужыкоў").

Трэці прадстаўнік беларускага романтызму Ян Чачот;

у яго мы знаходзім асаблівае замілаваньне да Беларусі. Ён заўважвае недахопы сялянскага жыцьця, але гэтыя недахопы, па яго поглядах, зьяўляюцца вынікам не социяльнага зла, але зла моральнага. Адсюль выцякае павярхоўны і надакучлівы дыдактызм Чачота. Селяніну, які фізычна выраджаўся, які ў той час жыў у цёмных, курных хатах, гэты філёнтроп радзіць устаўляць у вокны шкло і клапаціцца аб социяльнай гігіене. Як Чачот не разумее, што ў умовах паншчыны социяльная гігіена ўяўляла з сябе недарэчнасьць. Творы Яна Чачота паказваюць, што нават лепшыя прадстаўнікі беларускай літаратуры прыгоннай гаспадаркі ў першую чаргу абслугоўвалі інтарэсы сваёй клясы; у іх творах яскрава выяўляецца клясава-шляхецкая псыхолёгія: там, дзе патрэбны быў востры меч, які расьсек-бы адразу Гордыеў вузел социяльных супярэчнасьцяй, выстаўляюцца толькі дзіцячыя дроцікі павярхоўнага і надакучлівага дыдактызму.

Такім чынам, мы можам падвесьці агульныя вынікі беларускай літаратуры першага пэрыоду. Наша пісьменства гэтага часу ўяўляе з сябе яскравы продукт дваровай культуры, якая была мала зачэплена ўплывам прамысловага капіталізму; адсюль узьнікае сталасьць шляхецкай псыхолёгіі ў нашай літаратуры дадзенай пары. У адносінах формальна-мастацкіх заўважваецца некаторая адсталасьць літаратурных форм. Беларускія пісьменьнікі эпохі прыгоннай гаспадаркі зьяўляліся пераважна эпігонамі агульна-эўропейскіх напрамкаў.

Другі пэрыод разьвіцьця беларускай літаратуры—гэта пара ліквідацыі прыгоннай гаспадаркі. Социяльна-экономічнай прадпасылкай літаратуры дадзенай пары зьяўляецца разьвіцьцё ў нас прамысловага капіталізму. Гэта разьвіцьцё намячалася ў нас параўнальна ў слабой ступені, але ўсё-ж такі давала сябе адчуваць. Проф. Доўнар-Запольскі ў сваёй працы „Народное хозяйство Белоруссии“ прыводзіць адпаведныя лічбы, ён паказвае нам, як паступова ў нас, на Беларусі, расьлі розныя фабрычна-заводзкія прадпрыемствы.

Вынікам разьвіцьця прамысловага капіталізму была, як вядома, рэформа 19-га лютага. Але зрухі ў галіне социяльнай заўжды цягнуць за сабой і зрухі ў галіне псыхолёгічнай. У нас зьяўляецца псыхолёгія „каючагася шляхціча“, на сцэну

зьяўляецца розначынец, у нас разьвіваецца радыкальна-дэмократычнае народніцтва.

Літаратурнымі фактамі дадзенай пары зьяўляюцца драматычныя творы Дуніна-Марцінкевіча, дзейнасьць Францішка Багушэвіча і Янкі Лучыны. Дунін-Марцінкевіч у сваім творы „Пінская шляхта“ дае нам лёгкую сатыру на засьцянковую шляхту і адміністрацыйны ўціск царскага ўраду, але гэта сатыра вытрымана ў лёгкім усьмешлівым тоне. Больш сур‘ёзнай зьяўляецца комэдыя Дуніна-Марцінкевіча „Залёты“. Тут выяўляюцца некаторыя адзнакі распаду патрыярхальнай сям‘і, выступае ўжо асоба дзяцей у процілегласьць патрыярхальнаму дэспотызму бацькоў. Апроч таго, мастацкі зарысоўваецца фігура кулака, драпежніка, які ўзьнік на глебе распаду прыгоннай гаспадаркі. Найбольш выдатным прадстаўніком радыкальна-дэмократычнага народніцтва ў беларускай літаратуры зьяўляецца Францішак Багущэвіч. Творчасьць Францішка Багушэвіча прадстаўляе сабою заваротны момант у разьвіцьці новай беларускай літаратуры. У Францішка Багушэвіча мы знаходзім акрэсьленую ідэолёгію культурна-нацыянальнага і соцыяльнага адраджэньня Беларусі. У яго творчасьці нацыянальныя мотывы цесна злучаюцца з мотывамі соцыяльнымі. Фрацішак Багушэвіч выступае перад намі ў яскравай постаці народніка, які выхаваўся ў атмосфэры эпохі канца 60-ых і пачатку 70-ых гадоў. У поэзіі Францішка Багущэвіча выяўляюцца яскравыя адзнакі народніцтва дадзенай пары: сваю выключную ўвагу пясьняр спыняе на экономіцы, яго пераважна цікавіць соцыяльны стан беларускага селяніна; да палітычных пытаньняў Багушэвіч адносіцца з значным індыфэрэнтызмам: поэзія Багушэвіча гэта як-бы крывая люстра, у якой праламляюцца ўсе заганы буржуазна-лібэральных рэформ Аляксандра II. („У судзе“, „Быў у чыстцы“, „У вастрозе“, „Кепска будзе“). З народнікамі Францішка Багушэвіча яднае і свайго роду антыэстэтызм. Багушэвіч не аддаецца мяккім пяшчотным эмоцыям назіраньня прыроды, каханьня і інш.; яго душа як-бы ўвабрала ў сябе ўсю злосьць за пакрыўджанага нацыянальна і соцыяльна мужыка: схэма Багушэвіча была свайго роду схімай. Беларускі пясьняр—гэта не назіральнік, а суровы барацьбіт, які свой

падарунак музы вынес на шырокую гістарычную арэну, ахвяраваў яго роднаму народу і барацьбе за лепшую долю.

Формальна-мастацкія прыёмы ў творчасьці Багушэвіча цесна зьвязаны з народніцкай тэматыкай. Беларускі пясьняр у сваіх творах вельмі часта імкнецца паглядзець на зьявы жыцьця вачыма простага чалавека-селяніна. Адсюль у яго поэзіі ўзьнікае прыём задзіўленьня (остранения). Апроч таго, у поэзіі Францішка Багушэвіча выяўляецца плынь мастацкага фольклёрызму; беларускага песьняра цікавяць продукты народнай творчасьці; яго вабіць да сябе народная фантастыка, поэтыка Багушэвіча носіць на сабе выразныя адбіткі поэтыкі народнай творчасьці. Цікава адзначыць, што, нават, выкарыстоўваючы агульна-людзкія сужэты, Францішак Багушэвіч падпарадкавае іх народніцкай тэматыцы. Напрыклад, у апрацоўку фаустаўскай легенды рэлігійных прадстаўленьняў аб замагільным сьвеце Багушэвіч уносіць соцыяльныя мотывы. У балядзе Багушэвіча, напр., селянін прадае сваю душу д'яблу толькі з мэтай вызваліцца ад соцыяльных злыдняў. У сваім творы „Быў у чыстцы“ Францішак Багушэвіч робіць затрунную помсту прыгнятальнікам беларускага селяніна: ён у сваім чыстцы зьмяшчае паноў, ксяндзоў і іншых эксплёататтараў.

Да народніцкага напрамку належыць і мастацкая творчасьць Янкі Лучыны. У дадзенага песьняра мы ня знойдзем тэй напружнасьці соцыяльнага і нацыянальнага пафосу, ня знойдзем таго жоўчнага абурэньня супроць соцыяльнай крыўды, якія характарызуюць сабою творчасьць Францішка Багущэвіча, але затое дыапазон творчасьці Янкі Лучыны зьяўляецца больш шырокім: яму даступны больш мяккія і пяшчотныя эмоцыі назіраньня прыроды, ён ведае парыў у краіну мары, любіць рысаваць вобразы элегічныя і глыбака драматычныя. Разам з тым, у творчасьці Янкі Лучыны выяўляюцца пэўныя налёты псыхолёгізму; у вобразе старога лясьніка ён дае першую спробу зарысоўкі характару беларускага селяніна з яго ўпартасьцю і настойлівасьцю; Янку Лучыну цікавіць ня толькі знадворнае становішча селяніна, але цікавяць яго ўнутраныя перажываньні—думкі, пачуцьці („Што думае Янка, вязучы дровы ў горад“).

Трэці пэрыод у разьвіцьці новай беларускай літаратуры бярэ свой пачатак у рэволюцыі 1905-1906 году. Фактары гэ-

тай рэвалюцыі вядомы: узмацненьне ў нас капіталізму і ў сувязі з гэтым неразьвязанасьць аграрнага пытаньня, вастрата рабочага пытаньня ў беларускіх мястэчках і гарадох і, нарэшце, нацыянальны уціск, — вось тыя галоўныя прычыны, якія выклікалі рэвалюцыйную буру на Беларусі. Буралом першай рэвалюцыі глыбака ўскалыхнуў беларускае народнае мора. На паверхні гэтага мора зьяўляецца шмат талентаў і самародкаў. Свае песьні гэтыя народныя поэты-самародкі складаюць пад аднастайны шум рабочага варштату альбо пад шырокія і вольныя песьні жаўранка на палетку бацькаўскае нівы.

Рэвалюцыя дала агульныя тэмы гэтым песьням. У атмосфэры рэвалюцыі, як вядома, утварылася так званая нашаніўская ідэолёгія, якая па сваёй сутнасьці зводзілася да позыцыі нацыянал-дэмократызму. Гэта ідэолёгія становіць сабою падставу літаратурнай творчасьці данай пары.

Грунтоўнай тэмай зьяўляецца ў песьняроў-нашаніўцаў тэма бацькаўшчыны, вызваленьне яе ад нацыянальнага і соцыяльнага уціску. Заўважваецца пры гэтым і некаторая дваістасьць настрояў, агульная для песьняроў зазначанай пары. З аднаго боку яны, як-бы концэнтруючы ў сваіх творах энэргію беларускіх працоўных мас, выяўляюць агромністую волю да жыцьця, веру ў будучыню, бадзёрасьць. Аснова гэтай бадзёрасьці—сувязь з працоўнымі масамі, сувязь з роднай глебай, ад дотыку да якой беларускія песьняры, як старажытны Антэй, атрымоўваюць сваю моц і сілу. Але з другога боку, на творчасьці нашаніўцаў адбіваецца ўплыў цяжкай палітычнай рэакцыі, якая на руінах першай рэвалюцыі спраўляла свой крывавы банкет. Вось чаму песьняры-нашаніўцы адыходзяць часам ад гэтай смутнай рачавістасьці ў глыб прошласьці, якая прадстаўляецца ім у романтычным асьвятленьні, альбо ў глыбіню сваіх асабістых перажываньняў: у творчасьці песьняроў-нашаніўцаў выяўляюцца налёты смутку і гамлетызму. Асабліва яскрава гэтая дваістасьць настрояў зазначаецца ў творчасьці беларускай поэтэсы Цёткі. У яе раньніх вершаваных творах выяўляецца рэвалюцыйны пафос, грымяць пяруны рэвалюцыі, а ў пазьнейшых творах, асабліва ў мастацкай прозе, зьяўляюцца ўжо пажоўклыя асеньнія лісты рэзыньяцыі і скаргі. Гордая арліца, узьмятнуўшы сваімі кры-

ламі ў блакітную высь рэволюцыйнага ідэалу, нарэшце пераварочваецца ў нудную чайку, якая стогне і енчыць перад бурай. Таксама і Алесь Гарун выступае перад намі ў смутнай постаці Гамлета. Яму не даюць супакою так званыя праклятыя пытаньні; яго цікавіць, адкуль чалавек, для чаго ён жыве; былы эс-эр і барацьбіт часам скачваецца ў тхлань містыкі ў духу нэоплятонізму (верш „Нязнаны госьць").

Так, у творчасьці нашаніўцаў выяўляюцца дзьве плыні: прыняцьце жыцьця, барацьба за паляпшэньне яго форм і адначасна ўцяканьне ад жыцьця.

Пры агульных настроях пісьменьнікі-нашаніўцы выяўляюць і свой асаблівы мастацкі твар; у кожнага з іх ёсьць свая творчая домінанта. Найбольш выдатнымі прадстаўнікамі нашаніўскай літаратуры зьяўляюцца ў гэты час Янка Купала, Якуб Колас, Зьмітрок Бядуля. Янка Купала—гэта народны трыбун, прарок соцыяльнай рэволюцыі, які прадбачыць нямінучую крывавую разьвязку соцыяльных супярэчнасьцяй, які вуснамі невядомага кліча ўсіх на вялікі сход рэволюцыі, дзе будзе важыцца лёс мільёнаў людзей. Але адначасна Янка Купала—тонкі мастак душэўных колізій, дысонансаў, абмалёўваючы рознастайныя нюансы індывідуальных перажываньняў. У яго творчасьці выяўляюцца ўсе вядомыя нам віды лірыкі: лірыка беспасярэдняга пачуцьця, лірыка рэфлексіі, задумленьня і лірыка адушаўленьня, захапленьня высокімі грамадзкімі ідэаламі.

Якуб Колас—глыбака нацыянальны беларускі поэта. У сваёй творчасьці ён дае шырокую тыпізацыю беларускай прыроды, побыту і псыхолёгіі. Органічна зьвязаны пясьняр з сялянскай гушчай; адсюль жыцьцё і псыхолёгія яе знайшлі ў яго творчасьці найбольш шырокую абмалёўку. Яго поэма „Новая Зямля"—гэта твор epochen machend; гэта одысэя беларускай літаратуры, дзе абхоплена ўсё жыцьцё беларускага селяніна ад калыскі да труны, дзе рэальныя малюнкі рачавістасьці агорнуты надзвычайна прыгожым і пяшчотным лірызмам аўтара. Пясьняр як-бы валадае цудоўным жазлом, пад ударамі якога з бясплоднай скалы шэрай будзённасьці выцякаюць сьвежыя і чыстыя, як крышталь, крыніцы поэзіі; падчас грубыя кавалкі жыцьця пясьняр узводзіць у дыямэнт стварэньня.

Характэрнай адзнакай творчасьці Зьмітрака Бядулі зьяўляецца тонкае злучэньне рэалізму і романтызму. Пісьменьнік глыбака прасякае ў трагедыю сялянскага жыцьця з яго цемрай і беднасьцю і, як-бы ўзварушаны гэтай трагедыяй, шукае паратунку ў сваіх марах, у эстэтызьме. Тады для яго Беларусь—казачны край, дзе кожны крок абвеяны казкай сівой.

Мае свае тэмы ў мастацкай творчасьці і вядомы беларускі крытык Максім Гарэцкі. Улюбёны гэрой яго мастацкіх апавяданьняў—гэта інтэлігент, які вышаў з народнай сялянскай асярэдзіны і ў сваёй душы моцна адчувае „родныя карэньні сялянскай псыхолёгіі“.

Ужо накінутыя намі абеглыя штрыхі паказваюць, што беларуская літаратура нашаніўскага пэрыоду вызначалася ідэёвым багацьцем свайго зьместу. Гэтаму тэматычнаму багацьцю адпавядае і высокая мастацкасьць формы. Пануючым напрамкам у беларускай літаратуры данай пары зьяўляецца рэалізм; беларускія песьняры ў сваіх творах даюць нам шырокія малюнкі вакольнага жыцьця, але, побач з рэалізмам, адчуваюцца некаторыя ўплывы і іншых напрамкаў. Напрыклад, драма Янкі Купалы „Раскіданае гняздо“ прадстаўляе сабою тыповую драму настрою. Выяўляецца ў беларускіх песьняроў-нашаніўцаў і выразны ўплыў поэтыкі сымболізму: яны любяцрьры саваць нам сымболічныя вобразы, імкнуцца зблізіць поэзію з музыкай, і г. д.

Асаблівай рознастайнасьцю з боку формальнага вызначаецца творчасьць Максіма Багдановіча. Гэта пясьняр хараства. Сваё літаратурнае profession de foi ён выяўляе ў творы „Апокрыф“, дзе ім зазначаецца: „Добра быць коласам, а яшчэ лепш быць васільком“, і гэтыя пахучыя васількі чыстай поэзіі пясьняр шчодрай рукой рассыпае на старонках сваіх твораў; ён паказвае нам, што на беларускай мове, якая доўгі час лічылася „мужыцкай і хамскай“, можна ўтвараць чароўныя сонэты, трыолеты, рондо, октавы, тэрцыны, пэнтамэтры і інш.

Чацьверты пэрыод у разьвіцьці беларускай літаратуры—гэта пэрыод сучаснага пісьменства, якое разьвіваецца пераважна пад знакам Чырвонага Кастрычніка. Пісьменьнікі старэйшага нашаніўскага пакаленьня паступова робяцца песьнярамі сучаснасьці. Так, напрыклад, Янка Купала ў сваім „Без-

назоўным“ сьпявае радасны гімн пролетарскай рэволюцыі. Рэволюцыя істотна зьмяняе сыстэму сьветаадчуваньня Якуба Коласа; у яго творчасьці цені смутку і пэсымізму ўступаюць месца сьвятлу, бадзёрасьці і радасьці. Барцом рэволюцыі робіцца і Зьмітрок Бядуля ў сваім „Бураломе“.

У сучаснай літаратуры яскрава выступае плынь пролетарскай поэзіі, якая асабліва выразна вызначаецца ў творчасьці Цішкі Гартнага. Цішка Гартны — пясьняр працы і змаганьня. Мотыў барацьбы прымае ў яго розностайныя формы. Ён, напрыклад, трапна абмалёўвае ўнутраную барацьбу: псыхіка чалавека для пісьменьніка—гэта пераважна арэна ўнутраных колізій; трапна зарысоўвае Цішка Гартны барацьбу індывідууму з акаляючай асярэдзінай, але асабліва мастацкі абмалёўваецца ім барацьба мас за ідэалы рэволюцыі. У поэты ёсьць свая пролетарская эстэтыка; самыя высокія формы хараства ён бачыць у дынаміцы рэволюцыі, усхваляючы яе ўрачыстасьць. Буйным літаратурным фактам сучаснасьці зьяўляецца роман Цішкі Гартнага „Сокі цаліны“. Яго значэньне заключаецца ў тым, што гэта першы роман у нашай літаратуры; апроч таго, мае твор і шырокае ідэёвае значэньне; у ім выяўляюцца новыя для нашага пісьменства мотывы урбанізму. З душнай атмосфэры местачковага мяшчанства аўтар у другой квадры свайго роману выводзіць нас на шырокі простор буйнага прамысловага цэнтру, абмалёўваючы нам змаганьне рабочых мас за сваё соцыяльнае вызваленьне.

На фоне сучаснай беларускай літаратуры выдзяляецца аб‘яднаньне маладых беларускіх поэтаў і пісьменьнікаў „Маладняк“. У маладнякоўцаў ёсьць свае тэмы; у іх заўважваецца асабліва блізкі падыход да сучаснасьці; яны абмалёўваюць сутычкі новага і старога быту, псыхолёгічныя зрухі, што ўзьніклі пад уплывам рэволюцыі; рэволюцыйная романтыка Зарэцкага злучаецца тут з вострай, часам натуралістычнай сатырай. Асабліва з маладнякоўцаў выдзяляецца малады пясьняр Міхась Чарот, які здабыў сабе шырокую вядомасьць сваёй розностайнай лірыкай, прыгожымі і ідэёва вытрыманымі поэмамі і высака-мастацкімі апавяданьнямі. Яго поэма „Босыя на вогнішчы“, якая абмалёўвае нам рытм рэволюцыі на Беларусі, прадстаўляе сабою выдатны твор сучаснасьці.

У апошнія часы, зусім нядаўна, організавалася новае аб‘-

ядnаньне беларускіх поэтаў „Узвышша“, у склад якога ўвайшла частка маладнякоўцаў і некаторыя старэйшыя беларускія поэты. Але як самастойная літаратурная організацыя, „Узвышша“ пакуль што яшчэ ня выявіла свайго твару.

На падставе вышэйпаданага можна зрабіць наступныя вывады:

1) Разьвіцьцё беларускай новай літаратуры прадстаўляе ў сваёй паступовасьці тры концэнтрычныя колы. Спачатку гэтая літаратура мела вузка-клясавы шляхецкі характар, потым у творчасьці нашаніўцаў яна, становячыся пераважна сялянскай, набывае нацыянальнае значэньне; нарэшце, у апошні пэрыод наша літаратура ўступае паступова на шлях інтэрнацыяналізму і разам з тым распрацоўкі агульналюдзкіх мотываў.

2) Беларуская літаратура прадстаўляе сабою органічную зьяву, што ўзьнікла на асновах народнай творчасьці; адсюль асабліва выдзяляецца ў ёй плынь мастацкага фольклёрызму.

3) Пры пануючым рэалістычным напрамку беларуская літаратура ўбірае ў сябе і іншыя формальна-мастацкія напрамкі.

Старшыня: Слова для дакладу: „Нашаніўскі пэрыод у беларускай літаратуры“ мае доцэнт Максім Іван. Гарэцкі.

М. Гарэцкі. Паважаныя таварышы і колегі! Пасьля дакладу М. Н. Пятуховіча мне застаецца толькі ў пэўнай меры дэталізаваць агляд нашае літаратуры. Я спынюся на агульнай характарыстыцы так званага „нашаніўскага“ пэрыоду, ці нацыянал-адраджанізму (па выразу, уведзеным т. Бабарэкам) і зраблю вывады адносна пэрыоду пасьля-кастрычнікавага.

Ужо папярэдні дакладчык сказаў, што гісторыя беларускай літаратуры ёсьць яшчэ маладая навуковая дысцыпліна. Як стаіць справа ў нас на Беларусі наогул з літаратуразнаўствам? Яно ў нас пастаўлена слаба. Але ўжо зьяўляюцца працы вучоных беларусаў і вучоных, якія працуюць на грунце беларускай навукі (проф. Замоцін, Вазьнясенскі, Барычэўскі і інш.). Калі мы прыглядзімся да крытыкі ў агульным абхваце літаратуразнаўства, дык мы павінны сьцьвердзіць, што крытыка ў нас слаба разьвіта. Але апошнім часам ужо пачынае разьвівацца самастойная беларуская крытыка. Я звярочваю ўвагу на разьвіцьцё крытыкі марксыцкай, асабліва

патрэбнай для правільнага літаратурнага разьвіцьця. Гісторыя літаратуры—самая самастойная частка нашага літаратуразнаўства. Над гісторыяй беларускай літаратуры цяпер шмат працуюць нашыя беларускія вучоныя і ў першую чаргу проф. Пятуховіч і Ў. Дзяржынскі.

Якімі мэтодамі мы карыстаемся ў Беларусі? Проф. Пятуховіч ужо казаў аб гэтым. Я толькі адзначу, што ў нас на Беларусі до апошняга часу ў нашай гісторыі літаратуры быў падыход ідэалістычны і матэрыялістычны. Ідэалістычны падыход дазваляў казаць так, напрыклад, што беларускія шляхецкія пісьменьнікі пісалі „в силу естественного влечения писать на родном языке“. Нас такое тлумачэньне літаратурнае зьявы, як зьявы социяльнай, цяпер не здавальняе, тым болей што роднаю моваю для гэтых пісьменьнікаў была болей мова польская, чым беларуская. І вось цяпер ёсьць другі падыход, падыход матар'ялістычны, які тлумачыць нам гэтую зьяву зусім правільна. Я павінен таксама сказаць, што гісторыя Беларусі наогул дасьледавана мала. Гісторыкі беларускае літаратуры ня могуць карыстацца гатовымі матар'яламі гісторыкаў-соцыолёгаў. Тут толькі адно выключэньне, гэта кніжка проф. Ігнатоўскага—„Гісторыя Беларусі XIX і XX ст. ст.“ Вы бачыце, якія цяжкасьці мы маем пры вывучэньні нашае гісторыі літаратуры.

Цяпер, калі-б мы хацелі пачаць аналізаваць нашую літаратуру за апошні час, дык мы бязумоўна павінны разглядзець той пэрыод, які прывёў нас да пасьлякастрычнікавага пэрыоду.

Нацыянал-адраджэнцкі характар гэтага літаратурнага пэрыоду выяўляецца ў ідэалізацыі культурна-нацыянальнага беларускага адраджэньня ў любові да Беларусі, да яе культуры, быту, прыроды і г. д.

Сялянскі характар нашаніўскай творчасьці выяўляецца ў сялянскіх імкненьнях аўтараў, у іх індывідуалізьме, блізкасьці да прыроды, у перажываньнях, зьвязаных са зьявамі ў прыродзе, у мімавольнай ідэалізацыі сялянскае працы, у вялікай прывязанасьці да свайго роднага кутка, да таго кавалку зямелькі, дзе жылі і спачываюць дзяды.

Галоўнымі тэмамі нашаніўцаў былі агульна-рэволюцыйныя, соцыяльна-бытавыя, нацыянальна-бытавыя і зьвязаныя

з асабістымі перажываньнямі аўтараў. Тут можна знайсьці жыцьцё вёскі, настаўніцтва, вучнёўскай моладзі, зрэдку—жыцьцё местачковых рамесьнікаў. Тут можна знайсьці палітычную лірыку. Тут можна знайсьці заклік да змаганьня. Ёсьць у нашаніўцаў і горач безнадзейнасьці, хоць і ня дужа часта. Гэтая вялікая горач залежала ад таго, што народ беларускі, які складаецца галоўным чынам з сялянскіх мас, надта цяжка было ўсьвядоміць нацыянальна і наогул соцыяльна. Беларускія палітычныя партыі мелі справу з сялянствам, і вось пасьля рэволюцыі 1905 году ў некаторых беларускіх пісьменьнікаў заўважваецца расчараваньне адносна ўсьведамленьня сялянскіх мас; гэтае расчараваньне даходзіць часам да такой безнадзейнасьці, якая прывяла Сяргея Палуяна да самагубства. Тэмы свае бяруць яны і з мінулага Беларусі, прычым характэрна, што Янка Купала, малюючы ў нашаніўскім тоне гэтае мінулае Беларусі, з аднаго боку, як-бы наўмысьля ідэалізуе яго, як, напрыклад, у вершы „Над Нёмнам“, а з другога—піша „Курган“, страшны протэст супроць князёў, супроць зьдзеку над працоўнымі беларускімі масамі, Чаму гэта так? Таму, што нашаніўцы, малюючы мінулае Беларусі, хацелі прывесьці масы да нацыянальнае самасьвядомасьці. З другога боку, яны хацелі ўсьвядоміць беларускія масы соцыяльна, хацелі паказаць праўдзівае жыцьцё даўняга часу. Ці трэба казаць, што мы, апрача таго, знаходзім у нашаніўскай поэзіі любоўную лірыку, прыродаапісальную лірыку і г. д. Але нават у лірыцы каханьня тыповы нашанівец пастараецца правесьці ідэі нацыянал-адраджанізму, зьвязанага з экономічным адраджэньнем.

Калі мы паглядзім на формальна-мастацкі бок нашаніўства, то можна сказаць, што ён стаіць у залежнасьці ад агульных соцыяльна-экономічных прычын. Творы нашаніўцаў яшчэ невялікія, таму што вялікіх твораў не маглі пісаць рабочыя і сяляне. Асобнай літаратурнай школы або кірунку няма, як сказаў проф. Пятуховіч. Але ўсе нашаніўцы пішуць свае творы ў здаровым рэалізьме, на глебе народнае творчасьці. Аднак, яны высака паднімаліся над агульным прымітывізмам народнай творчасьці.

На беларускую мову нашаніўцы глядзелі так, што яна павінна ахапіць усе зьявы жыцьця (вышэйшая адукацыя,

дзяржаўнае дзелаводства, тэхнічныя тэрміны і г. д.). Зразумела, што ў той час яны ня мелі тэй дапамогі з боку самога жыцьця, якую маем мы цяпер у БССР у разьвіцьці беларускае літаратурнае мовы, калі беларусізуецца Унівэрсытэт, Сельска-Гаспадарчая Акадэмія, шырокую працу разгарнуў Інбелкульт, беларусізуюцца ўсе дзяржаўныя ўстановы і ўся перадавая частка інтэлігенцыі заўсёды і ўсюды гаворыць выключна на беларускай мове. У залежнасьці ад свайго погляду на мову, нашаніўцы і стараліся разьвіваць багацьце і гібкасьць беларускае літаратурнае мовы, але знаходзіліся яны з гэтага боку ў вельмі цяжкіх умовах.

Соцыяльны склад нашаніўскіх поэтаў і пісьменьнікаў паказвае, што большасьць іх была з працоўных мас, галоўным чынам, з сялянства малазямельнага і безьзямельнага, з местачковых і гарадзкіх рамесьнікаў і чорнарабочых. Заможная частка сялянства асабліва ахвотна паддавалася русіфікацыі і полёнізацыі і амаль не дала ідэолёгаў у нашаніўскай творчасьці. Школьная адукацыя нашаніўцаў зазвычай надта малая. Школы былі соцыяльна і нацыянальна варожыя беларусу-бедняку. Для масы сялянства былі адчынены спэцыяльныя школы-царкоўна-прыходзкія. Сялянства мусіла вучыцца ў гэтых школах, таму што толькі гэтыя школы і былі яму даступны.

Першыя крокі самастойнага жыцьця ў нашаніўцаў прыпалі на час рэволюцыі 1905 году. Пры гэтым трэба адзначыць, што пасьля рэволюцыйнага ўздыму жыцьцё пераходзіць у страшэнную рэакцыю, у якой нашаніўцы і павінны былі апынуцца. Надзеі, што праз школу можна было палепшыць сваё экономічнае становішча, разьбіваліся. Ня было грошай, каб дапамагчы бацьку; ён і далей хадзіў у лапцёх, як і тады, калі сын быў нявучоны. Усе яны чакалі новай рэволюцыі, але ніхто не ведаў, калі яна прыдзе. І ня было моцных экономічных організацый, якія-б падтрымалі пісьменьніка. І вось патроху разьвіваецца пэсымізм, буйнымі кветкамі расьце індывідуалізм, які мае глыбокае карэньне і ў сялянскім па хаджэньні аўтара. Узмацняецца, такім чынам, ідэалістычны сьветагляд. Соцыялізм у іх афарбоўваецца ўсё болей у нацыянальныя колеры.

Частка нашаніўскіх поэтаў і пісьменьнікаў жыве і творыць і пасьля Кастрычніка.

Агульную характарыстыку сучаснага стану беларускае літаратуры найлепей пачынаць з аналізу літаратурнага разьвіцьця ва ўсесаюзным маштабе. Тут ёсьць шмат агульнага, толькі заўсёды трэба дадаваць пункт: нацыянальнае пытаньне, нацыянальная культура. Я дазволю сабе спыніцца на рэзолюцыі, прынятай Комуністычнай партыяй у галіне мастацкай літаратуры. Мы бачым, што, у сувязі з агульным уздымам экономічных сіл, разьвіваецца і вялікая літаратурная продукцыя ў нашых савецкіх умовах. Мы бачым, што клясавае змаганьне, ня, спыняючыся наогул, ня спыняецца і на літаратурным фронце. У клясавай грамадзе няма нэўтральнага мастацтва. Але што да зьместу твораў, дык крытэры ў пролетарыяту мог быць выпрацаваны раней—і ён ёсьць, а што да формы мастацкіх твораў, дык тут крытэрыя мы пакуль што ня маем. Наша эпоха свайго стылю яшчэ не знайшла. І вось у нас, нават у нашых самых рэволюцыйных літаратурных аб'яднаньнях, як „Маладняк" і „Ўзвышша", ёсьць розныя формы, ёсьць розныя погляды на форму.

У беларускай літаратуры пасьлякастрычнікавага пэрыоду найперш няма тэй адналітнасьці пісьменьнікаў, якая была раней. Пісьменьнікі рэзка падзяляюцца на „старэйшых і маладзейшых". Старэйшыя перамагаюць у форме, а маладзейшыя перамагаюць у ідэолёгіі. Але я маю адвагу заявіць, і думаю, што мае таварышы з ліку старэйшых са мною згодзяцца, што маладыя пісьменьнікі пачынаюць перамагаць і ў форме, бо яны шукаюць новых форм, а старэйшыя пісьменьнікі ў гэтым кірунку робяць значна меней. Ніхто другі, як наш маладняк (сябры організацый „Маладняк" і „Ўзвышша"), прынёс у нашую новую поэзію вэрлібр (вольныя вершы), а таксама і іншыя формальна-мастацкія дасягненьні, што добра разгледзеў у сваіх атртыкулах поэта і малады вучоны т. Дубоўка.

Праз увесь гэты час у літаратуры адбіваюцца нацыяналадраджэнцкія настроі, з аднаго боку, і пролетарская ідэолёгія—з другога боку. Але я таксама цьвёрда скажу, што ў БССР пасьля 1921-22 г. няма такога беларускага пісьменьніка, які-б ня імкнуўся да выяўленьня пролетарскай ідэолёгіі, таму што толькі пролетарская літаратура зьяўляецца цяпер рэволюцыйным фактарам. Да 1922 г. дзеля окупацыі, разрух

і г. д. некаторыя беларускія пісьменьнікі наогул не маглі пісаць, а дзеля прычын ідэолёгічнага парадку, як я ўважаю, ім ня пісалася на савецкія тэмы. Вось тут і трэба ўспомніць аб пункце: нацыянальнае пытаньне, нацыянальная культура. Мы ўсе ўжываем выраз „нацыянальная культура". Для некаторых гэта зьяўляецца лёзунгам, але-ж лёзунг „нацыянальная культура"—ёсьць лёзунг буржуазны і толькі ў пэўных умовах гэты лёзунг дае імпэт да рэволюцыйнага змаганьня. Інакш кажучы, мы разумеем пад нашай нацыянальнай культурай культуру пролетарыяту, сялянскае беднаты, культуру працоўных мас ва ўсім сьвеце, але тымчасам толькі на нацыянальнай мове, у нас на Беларусі—на беларускай мове. Трэба сказаць, што многія з нашаніўцаў перажывалі крызіс у нацыянальным пытаньні, як перажываў яго і я сам. Асабліва балючым быў гэты крызіс тады, калі прыходзілася чуць, што чым болей беларусы на ўсходзе абрусеюць, а на захадзе апалячацца, то тым бліжэй яны будуць да інтэрнацыяналу. Компартыя, Савецкая ўлада, занятыя крывавым змаганьнем на многіх франтох, не маглі спачатку выдзеліць належнае ўвагі на культурнае будаўніцтва. Але як толькі прышла магчымасьць, дык зараз нацыянальнае пытаньне на Беларусі знаходзіць сваё належнае разьвязаньне і пачынаецца шырокае культурнае беларускае будаўніцтва ў савецкіх умовах.

Калі мы прыгледзімся да творчасьці Янкі Купалы, дык мы ўбачым, што ён спаткаў Кастрычнікавую рэволюцыю з вялікім уздымам рэволюцыйнага пачуцьця. Ён дае жменю вершаў, напісаных у 1918 годзе ў надзвычайна прыгожай форме (сонэты ў „Спадчыне"), дзе мы бачым, як ён радуецца, што прышла гэтая рэволюцыя. Але, праўда, ён яшчэ ня мае ў належнай меры клясавага падыходу. Потым, яшчэ за Керанскім, ставіцца пытаньне аб нацыянальнай культуры на Беларусі. Янка Купала адчувае і бачыць, што многае тое, на што трэба было спадзявацца, не спраўджаецца. Былі такія выпадкі, калі жаданьне гаварыць пабеларуску зьвязвалася з агульным абвінавачаньнем у контр-рэволюцыі. Янка Купала пэўны час маўчыць або піша вершы, у якіх адбіваецца ідэолёгічная хваравітасьць. У 1922 г., калі пачынаецца культурнае будаўніцтва ў Савецкай Беларусі ў новых умовах, Янка

Купала піша сваю комэдыю „Тутэйшыя“, у якой ён праводзіць ідэі беларусізацыі, але ў якой няма гэроізму эпохі, і я думаю—ня толькі таму, што ў гэтым жанры ён ня можа быць, бо Янка Купала браў тую форму, якая была патрэбна да зьместу. У 1924 годзе з далучэньнем да БССР усходняе Беларусі Янка Купала зноў гарыць полымем творчасьці. Злосьць яго супроць ворагаў нацыянальнай беларускай культуры зьмяншаецца, і ён піша нізку вершаў „Безназоўнае“. Там у прадмове мы чытаем:

О так, я пролетар!
Яшчэ учора раб пакутны,
Сягоньня я зямлі ўладар
І над царамі цар магутны.
Мне бацькаўшчынай цэлы сьвет,
Ад родных ніў я адвярнуўся,—
Адно... ня збыў яшчэ ўсіх бед:
Мне сьняцца сны аб Беларусі.

Вось у гэтых 8-мі радкох мы бачым Янку Купалу, мы бачым усю нацыянальна-адраджэнцкую беларускую інтэлігенцыю.

Калі пераходзім да Якуба Коласа, дваццацігодні юбілей творчасьці якога мы сёлета спраўляем, дык найперш трэба зазначыць, што ён піша праз увесь час з тым ці іншым імпэтам. Але жыцьцё на чужыне ў немагчыма цяжкіх умовах не дае яму як сьлед разгарнуць свае творчыя здольнасьці. І толькі, калі з дапамогаю Савецкае ўлады, ён у 1921 годзе пераяжджае на Беларусь і далучаецца да актыўнага культурнага будаўніцтва на Беларусі, дык пачынае пісаць надзвычайна многа. Сьпярша ён хапаецца дапісаць старыя творы („Новая зямля“, „Сымон Музыка“), на якіх ужо адбіваецца пасьлякастрычнікавы настрой аўтара, потым піша новыя творы з эпохі рэволюцыі 1905 г. („У Палескай глушы“, „Забастоўшчыкі“) і ад іх пераходзіць на тэмы савецкія.

Ён малюе пералом у настроі сялянства (зборнік „На рубяжы“), пералом у настроях інтэлігенцыі („Пракурор“ і інш.) і нарэшце дае быт савецкай вучнёўскай моладзі („На парозе“, „За парогам“).

Зьмітрок Бядуля мае вялікія заслугі ў тым, што ён загадваў літаратурным аддзелам „Савецкай Беларусі“ у той

цяжкі час, калі ідэолёгічна вытрыманага матар'ялу амаль ня было, а трэба было на старонках газэты даваць яго. Зьмітрок Бядуля выхоўваў наш літаратурны маладняк і разам з тым сам выхоўваў у сабе і выяўляў у мастацкай творчасьці пролетарскую ідэолёгію.

Цішка Гартны мог сябе выявіць толькі пасьля Кастрычніка. На жаль, у сваім романе „Сокі цаліны", асабліва ў другой частцы, напісанай якраз пасьля Кастрычніка і значна лепшай з мастацкага боку, чым першая частка, мы яшчэ ня маем таго, што нам цяпер асабліва патрэбна. Рыгор Нязвычны, гэрой роману, рабочы-рэволюцыянэр, мае ў сваім характары такія асаблівасьці, на якіх ня варта было-б асабліва спыняць увагу нашай сучаснай вучнёўскай моладзі.

„Маладняк" і „Ўзвышша"—вось наша праўдзівая рэволюцыйная сучаснасьць, вось наша вабная будучыня. Бязумоўна, „Маладняк" і „Ўзвышша" ў цэлым даюць якраз тое, што цяпер патрэбна для беларускай культуры—пролетарскай у зьмесьце, нацыянальнай у форме.

З боку ідэолёгічнага зьместу асабліва патрэбна адзначыць высака-мастацкія поэмы і лірычныя вершы Міхася Чарота („Босыя на вогнішчы", Марына" і інш.).

І ўсе нашыя маладыя пісьменьнікі пасьлякастрычнікавага пэрыоду ідуць тым-жа шляхам, даючы мастацкія творы, цікавыя з боку формы і сувязі свайго зьместу з сучасньсцю, у якім кірунку яны ўсё больш і больш разьвіваюцца (У. Дубоўка, Кузьма Чорны, Крапіва, Я. Пушча, А. Дудар, М. Зарэцкі, Александровіч і інш.).

Разьвіваецца і маладая марксыцкая крытыка (А. Бабарэка і інш.).

Яшчэ зазначу, што ў справе мастацкасьці некаторых літаратурных твораў гэтага часу („Песьні працы і змаганьня" Ц. Гартнага, „Буралом" „З. Бядулі, некаторыя вершы „Маладняка") можа сьледаваць прыкладу Плеханава ў аналізе мастацкасьці твораў расійскіх народнікаў. І як Некрасава сучасная моладзь хацела ставіць вышэй за Пушкіна, так і ў нас цяпер часам нешта падобнае бывае. Зазначаючы гэта, я ўсё-ж цьвёрда стаю на высокай мастацкасьці нашай пасьлякастрычнікавай літаратуры, біручы яе агулам,

Дасьледваньне беларускай літаратуры XIX ст. да 1863 г.

(З дакладу доктара Юз. Голомбэка. Даклад стэнографічна не запісаны).

Дунін-Марцінкевіч пачаў пісаць свае творы на беларускай мове. Сантымэнталізм складае галоўныя асаблівасьці яго твораў. Гумарыстыкі—высьмейваньня людзей—у творах Марцінкевіча не заўважаецца. Разьвіцьцё літаратурных форм ідзе побач з утварэньнем літаратурнае мовы.

Першую беларускую граматыку дае Ян Чачот; у зборніку „Piesionki wieśniacze“—адбіты творы гэтае эпохі пасьля перапынку ад XVII веку.

Романтызм спрыяе разьвіцьцю беларускае культуры. Працы Марцінкевіча былі больш напісаны на польскай мове, чымся на беларускай.

У літаратуры беларускай была вялікая пярэрва, але-ж і ў польскай літаратуры была падобная. Поэта Ляскоўскі пісаў на беларускія тэмы, якія адбівалі імкненьне да бацькаўшчыны Беларусі.

Нельга разглядаць тагочасную беларускую літаратуру бяз сувязі з літаратурай польскай. Трэба адзначыць сувязь польскай літаратуры з генэзісам літаратуры беларускай. Этнографічныя імкненьні таксама маюць вялікае значэньне („Шчароўскія дажынкі“, „Купальле“). Амаль што ўсе беларускія поэты пісалі і папольску. Нават у поэтаў чыста польскіх знаходзяцца беларускія мотывы—„Дзяды“ Міцкевіча, „Улас“ Сыракомлі.

Яшчэ за колькі гадоў да „Сялянкі“ была спроба Я. Чачота пісаць пабеларуску.

Разуменьне школы беларускай у літаратуры польскай можа быць пашырана аж да Ожэшковай „на працягу 80 гадоў“.

Новая драма пачынаецца толькі з 1846 году („Сялянка“ Марцінкевіча). Ян Чачот у 1819 годзе на імянінах Міцкевіча даў дыялёг пабеларуску. Ёсьць яшчэ размова селяніна, што гаворыць пабеларуску ў сцэнічных творах Славацкага ў 1843 годзе. „Шчароўскія дажынкі“ трэба разглядаць, як довад сымпатыі да простага народу. Гэты довад ёсьць і ў

вершыку да „Пачцівых беларусоу“. Цікавы ўвагі Марцінкевіча аб беларускай поэзіі—полеміка з крытыкамі, якія яму рабілі закіды, што ён піша пабеларуску; гэтак крытык Скібіцкі разважаў, што на простай мове немажліва выказаць глыбокія пачуцьці.

Вядучы барацьбу за літаратуру ў беларускай мове (гэта бараніў і Сыракомля), Марцінкевіч даў адказ на гэта вельмі дакладна.

Калі мы зьвернем увагу на „Пінскую шляхту“, дык убачым, што зьмест яе выяўляе нешта супольнае з польскаю і расійскаю літаратурай („Рэвізор“ Гогаля). Гэта каштоўная комэдыя—адзін з лепшых яго твораў. „Залёты“ таксама. Тут творыцца многа сытуацый, як і ў Мольера. Магчыма, што Марцінкевіч карыстаўся польскім перакладам Мольера і комэдыямі Фэдры.

Ці можна гаварыць аб Марцінкевічу, ня прыймаючы пад увагу польскую літаратуру? Папольску ён пісаў шляхецкія „гавэнды“, або гутаркі, пабеларуску--пасторалі з сялянскага быту, што ўжо складае значную каштоўнасьць. Марцінкевіч, як і іншыя пісьменьнікі, што пісалі папольску, можа лічыцца беларускім пісьменьнікам.

Галоўным напрамкам літаратуры таго часу можна назваць романтызм, а яшчэ лепш—сантымэнталізм. Каштоўныя прыклады яго рысаў спатыкаем у літаратурных абразох з іншых адраджоных народаў: сербаў, баўгараў. Разглядаючы гэтае пытаньне, карысна было-б даць монографіі аб Марцінкевічу, аб Чачоце, Барщчэўскім, Рыпінскім; тады-б мы мелі поўнае адбіцьцё таго часу.

Ёсьць яшчэ некаторыя дробныя ўвагі, але, гаворачы з памяці, мне цяжка гэта зрабіць, а таму даю гэта не падрабязна, а ў агульных рысах.

Старшыня: Слова для дакладу: „Поэтычнае мастацтва навейшае беларускае літаратуры“ мае грамадз. А. Н. Вазьнясенскі.

Вазьнясенскі. Навука аб літаратуры, як асобная самастойная дысцыпліна аб слоўным мастацтве, незалежна ад яе нацыянальных разьдзяленьняў, перажыла доўгі і цяжкі пэрыод свайго разьвіцьця. У яе гісторыі за гэтую пару прайшлі часы клясычнай старажытнасьці, эпоха сярэдніх

вякоў і новы час. За гэты пэрыод, аднак, навука аб літаратуры ня выканала тэй навуковай, конкрэтнай задачы, якую яна сабе ставіла. У сучасны момант усё больш і больш аказваецца ўсьвядомленай тая думка, што пабудаваць гісторыю літаратуры не ўдалося. Тут ня месца гаварыць аб мотывах, якія прымусілі прысьці да такога сумнага выніку. Але менавіта гэты вынік прымусіў навуковую думку радыкальна перабудаваць мэтодолёгію навукі аб літаратуры і імкнуцца да конструяваньня яе на іншых тэорэтычных асновах. Яна выходзіць цяпер з таго стану, што літаратурным фактам, які падлягае вывучэньню, зьяўляецца не мастацкі твор у яго цэлым выглядзе, гэты складаны і шматгранны організм, а толькі асобныя часткі, асобныя мастацкія актыўнасьці, з якіх складаецца поэтычная творчасьць. Выходзячы з гэтага, нашая навука ў сучасны момант зварачае вялікую ўвагу на вывучэньне самога твору, на яго апісаньне, высоўваючы ў сфэры гэтага вывучэньня мэты і задачы высокага навуковага інтарэсу.

Між іншым, да гэтага часу ў агульным выніку навуковая думка сконцэнтравалася на тым, што можна назваць тлумачэньнем твору і яго асаблівасьцяй. На шляху да выпаўненьня гэтых, калі можна сказаць, новых імкненьняў наша навука будуе сваю мэтодолёгію, сваю лёгіку, якая паказвае ёй выходныя пункты, шляхі, сродкі і канчатковыя мэты. У гэтым кірунку яе навуковая лёгіка аказваецца аднакавай і адзінай для ўсякай літаратуры, незалежна ад яе прыналежнасьці да тэй ці другой нацыянальнай групы. Мэтодолёгія вывучэньня поэтычнай творчасьці, як слоўнага мастацтва, аказваецца агульным для літаратур славянскіх, романа-германскіх, ангельска-саксонскіх і г. д.

Сярод іх беларуская мастацкая літаратура, якая займае роўнапраўнае месца, падпарадкуецца тым-жа агульным мэтодолёгічным заданьням, якія выпрацоўвае адзіная навука аб літаратуры.

Але зьяўляецца пытаньне, што літаратура кожнай пэўнай нацыі мае свае асаблівасьці, ёй толькі прыналежныя, якія так ці інакш адбіваюцца і на характары самой навукі аб ёй. Гэтую абставіну навуковая гістарычна-літаратурная думка прадугледжвае. Параўнаўча нядаўна была высунута

думка аб неабходнасьці этнолёгічнага напрамку ў гісторыі літаратуры, якое базуецца на вывучэньні генэолёгічных і пляменных асаблівасьцяй, якія знайшлі сваё адбіцьцё ў слоўным мастацтве. Асновапаложнікам гэтага этнолёгічнага мэтоду зьяўляецца проф. Аўгуст Заўэр, які выклаў програму яго ў ректарскай прамове, што была зроблена ў Празе ў 1907 г. пад назваю: „Literaturgeschichte und Volkskunde“ (Гісторыя літаратуры і народазнаўства). Яго пасьлядоўцам, які прыстасаваў ў гэты мэтод на практыцы, зьяўляецца проф. Язэп Надлер, які ўжо ў наш час (з 1912—1918 г.) выпусьціў трохтомную працу: „Literaturgeschichte der deutschen Stämme und Landschaften“. (Гісторыя літаратуры нямецкіх плямён і краін). З пункту гледжаньня гэтых вучоных, літаратура кожнай нацыі мае свае асаблівасьці, што належаць толькі да яе. Зразумела, што яны ўласьцівы і беларускай літаратуры. Але вызначэньне гэтых асаблівасьцяй у навуковых адносінах прадстаўляе задачу вялікай цяжкасьці, бо яно мае на ўвазе параўнаўчае вывучэньне ўжо навукова-дасьледаванага і апісанага мастацкага матар'ялу, чаго мы ў галіне беларускай і іншых літаратур ня маем. Тым ня менш, мне думаецца, што агульныя асаблівасьці, якія характарызуюць беларускую літаратуру, як літаратуру нацыянальную, і якія адрозьніваюць яе ад іншых славянскіх літаратур, можна адзначыць і цяпер.

У якасьці такой агульнай асаблівасьці беларускай літаратуры, як літаратуры самастойнай, на наш погляд, зьяўляецца тое, што яна дае ў сваёй творчасьці сынтэз двух галоўных напрамкаў літаратуры наогул, у яе поўным абхопе, гэта стылю клясычнага і романтычнага.

Проблема двох стыляў ня новая, яна была намечана яшчэ ў канцы XVIII сталецьця. Раньнім проблематыкам яе быў Шылер, які выразіў яе ў словах:—поэзія „наіўная“ і „сантымэнтальная“. Пасьля яна ня раз была прадметам разгляду і кожны раз атрымлівала розныя тэрмінолёгічныя азначэньні. У нашыя дні да яе зноў вярнуўся Ос. Шпэнглер, які выразіў яе ў процістаўленьні двох тыпаў людзей „аполёністычнага“ і „фаустычнага“. Мы захаваем у нашым вывучэньні назву: стыль клясычны і романтычны.

У сваёй філёзофскай сутнасьці гэтыя напрамкі зьяўляюцца тымі асноўнымі відамі поэтычнага мэтаімкненьня, якое

ставіць сабе слоўнае мастацтва ў яго агульным выглядзе. Зразумела, што ў межах гэтых стыляў маюцца і больш прыватныя мастацкія задачы, якія ўласьцівы творчасьці асобных пісьменьнікаў, належачы да асобных іх твораў ці асобных частак твораў. У даным выпадку мы гаворым толькі аб гэтых двох мастацкіх імкненьнях у іх агульным выглядзе.

У аснове стылю першага парадку—стылю клясычнага—ляжыць тое, што можна назваць словамі—пластычнасьць і маляўнічасьць. Гэтыя ўласьцівасьці характарызуюць усе зьявы поэтыкі—яе мастацкай фонэтыкі, стылю і композыцыі.

Для поэты-клясыка мастацкі твор ёсьць зьява слоўнага мастацтва, што будуецца, як мастацкі прыгожы будынак, які ў сваім будаўніцтве падлягае вядомым законам. Асноўныя запатрабаваньні гэтых законаў накіроўваюцца да таго, каб мастацкі твор, што ўтвараецца з матар'яльных даных знадворнага сьвету, меў унутраную роўнаважнасьць і лёгічнае заканчэньне. Дзеля гэтага клясычнаму стылю ўласьціва сьвядомасьць і халодная разважнасьць у выбары фонэтычных і стылістычных сродкаў поэтычнай творчасьці. Поэта-клясык выбірае лёгічна пэўныя мэтры, рытмы і рыфмы; у той-жа час ён ужывае акрэсьленыя, ясна разьлічаныя выразы, якія даюць слоўным вобразам мастацкую жывасьць і цэльнасьць. Ён ужывае словы з усёю паўнатою іх лёгічнага і матар'яльнага зьместу. Злучэньне слоў у тыя ці іншыя стылістычныя катэгорыі таксама асноўваецца на імкненьні к пукатасьці і выразнасьці. Сюжэтная композыцыя будуецца з аднаго боку на аснове яснага, выразнага і фізычна адчувальнага падзелу ўсяго твору на часткі, а з другога на злучэньні ў адзінае мастацкае цэлае пры дапамозе стройнай мастацкай тэолёгіі.

Романтычная творчасьць ідзе іншымі шляхамі, чым клясычнае мастацтва, і ўжывае мастацкія сродкі другога характару і віду. Поэта-романтык цікавіцца перш за ўсё і больш за ўсё сваімі ўласнымі перажываньнямі. Знадворны сьвет для яго аддаляецца на задні плян. Для абрысоўкі сваёй душы, сваіх эмоцыянальных настрояў мастак романтычнага складу шукае і адпаведных адбіваючых сродкаў. Уласьцівасьці яго мастацкага об'екту адпавядае і характар

мастацкай формы, якая адрозьніваецца большай рознастайнасьцю і глыбокаю эмоцыянальнасьцю. Тыповаю рысаю для романтычнага стылю зьяўляецца эмоцыянальнасьць, настрой, г. зн. смутныя лірычныя перажываньні поэты, якія не паддаюцца пэўнаму азначэньню. Лёгічны сэнс слоў губіць сваю яснасьць і падпадае пад эмоцыянальнае зацямненьне. Словы толькі намякаюць на агульнае значэньне іх. Яны паўтараюцца групамі з аднакім лёгічным зьместам, які афарбаваны агульным эмоцыянальным настроем усяго вырашэньня. З гэтай галоўнай асаблівасьці романтычнага мастацтва выплывае і яго асноўны прынцып—паўторнасьць, якая пашырае сваю дзейнасьць на асобныя гукі, словы, стыль і цэлыя композыцыйныя формаваньні (асонансы, алітэрацыі, пытаньні, звароткі, выкліканьні, паўтарэньні, паралелізмы і г. д.). Паўторнасьць тых ці іншых мастацкіх зьявішчаў твору і робіць уражаньне эмоцыянальнай кондэнсацыі і лірычнага згушчэньня ўражаньняў.

Калі мы цяпер зьвернемся да разгляду мастацкіх фактаў навейшай беларускай літаратуры, то тут мы знойдзем поўнае пацьвярджэньне высунутага намі тэзісу.

Возьмем перш за ўсё творчасьць Максіма Багдановіча, аднаго з самых выдатных пісьменьнікаў навейшай беларускай літаратуры. Разгледзім спачатку яго зьмест, тэматыку. Мотывы яго творчасьці маюць у сабе матар'ял дваякага роду—з аднаго боку рэальны, конкрэтны, плястычны—гэта мотывы соцыяльныя, бытавыя і прыроды, а з другога боку,—эмоцыянальны, псыхолёгічны, абстрактны—мотывы псыхолёгічныя, філёзофскія, літаратурныя.

Калі мы разгледзім больш конкрэтна хаця-б тэмы гэтых мотываў, то і тут знойдзем уласьцівасьці двох асноўных стыляў. Так, у мотывах соцыяльных ён датычыцца тэм нядолі і гора беларускага народу, гаворыць аб беларускай працаўніцы, адарванай ад роднага асяродку для працы на прадстаўніка другое клясы, прызывае асобу, соцыяльна прыгнечаную, да барацьбы за вызваленьне і г. д.; словам тэмы глыбака рэальныя і, калі можна так выказацца, плястычныя. Тое самае мы знаходзім і ў мотывах бытавых, якія рысуюць быт вёскі і места. Такім-жа чынам, тэмы прыроды абхапляюць самыя розныя конкрэтныя зьявы сьвету,

які абкружае нас. Калі ён, прыкладам, гаворыць аб блакітным небе, то гэта не романтычны блакіт, які дасягаўся поэтамі-романтыкамі інтуітыўна і служыў сымболем іх містычных настрояў, але тое, якраз, блакітнае неба, якое мы бачым заўсёды і да якога мы так прызвычаіліся.

Зусім іншае мы знаходзім у мотывах другога роду. Так, у мотывах псыхолёгічных мастак вызначае свой духоўны настрой, зьмяняючы на розныя лады адно дамінуючае пачуцьцё, якое можна назваць романтычным сумам. Пытаньні філёзофскага характару абхопліваюць гэткія тэмы, як пытаньне аб пахаджэньні жыцьця, яго сэнсе, аб марнасьці яго, аб яго шляхох і г. д. Тэмы літаратурнай уласьцівасьці датычацца процэсу мастацкай творчасьці, поэтычнага захапленьня— „агню поэзіі“, уласьцівасьцяй формы поэзіі, лёсу поэты і г. д. Ва ўсіх гэтых тэмах і мотывах вельмі ясна адчуваецца настрой романтычнай поэзіі.

Калі мы паглядзім цяпер, якім чынам увесь гэты мастацкі матар‘ял, конкрэтны і абстрактны, аформляецца, г. зн., якая форма яго, то і ў гэтай галіне мы знойдзем прызнакі тых-жа самых двох напрамкаў.

Найбольш пашыраным прыёмам раскладу тэматычнага матар‘ялу сказваецца яго падзел у межах вершаў на дзьве часткі, прычым звычайнай схэмай у такіх выпадках зьяўляецца наступнае—у першай частцы вершаў—тэмы і мотывы знадворнага сьвету, у другой—настроі ўнутранага псыхолёгічнага парадку. Такі плян распарадку тэматычнага матар‘ялу пануе ў творчасьці Максіма Багдановіча. Большасьць яго вершаў па такой, менавіта, композыцыйнай схэме, прычым „разьмеры“ мастацкага матар‘ялу першага і другога парадку аказваюцца рознымі і абхопліваюць у кожным асобным творы розную колькасьць строф і пэрыодаў. Аднак агульны прынцып разьмеркаваньня ўсяго тэматычнага матар‘ялу на дзьве часткі—па схэме паралелізму—вобразы знадворнага сьвету і тэмы ўласных перажываньняў мастака, усюды захоўваюцца. У якасьці ілюстрацыі можна прывесьці наступнае:

Вечар на захадзе ў попеле тушыць
Кучу чырвоных кавалкаў вугля;
Ціха ўсё; вецер лістка не зварушыць,

Не скалыхнуцца ні траукай паля;
Цёмныя цені даўжэй у лагчыне,
Птушкі прыстаўшай марудней палёт;
Сумна плыве маладзік бледна-сіні
Ў небе вячэрнім, зялёным, як лёд;
Іскрацца зорак сьняжынкі маркотна,
Збожжа пакрылася шызай расой...
Кіньма-жа думкі аб долі гаротнай,
Хоць-бы на момант спачынем душой!..

Тут пераважнай аказваецца „эпічная“ частка, а заключнай—лірычная. Але сярод вершаў Максіма Багдановіча маюцца і такія, у якіх мастацкі матар'ял знаходзіцца ў адваротным парадку, г. зн. мотывы знадворнага сьвету ўрэзаны і складаюць толькі ўводзіны, пачын вершу, а тэмы настрояў запаўняюць рэшту твору. Так у вершах „Разрытая магіла“:

Дробны дождж сячэ, ліецца;
Вецер злосна ў хату рвецца,
У полі стогнам аддаецца,
Стукне ў дзьверы і ў акно;
Сэрца беднае заб'ецца
І адразу скалыхнецца
Ўсё, што згінула даўно,
Ўспомніць сэрца, што любіла,
Ўспомніць моладасьць і сілу,
Ўсё, што згінула і ўплыла,
Ўсё успомніць, як у сьне,—
Бачу: сэрца не забыла,
Што жыцьцё у ім згубіла...
І разрытаю магілай
Вее сумна на мяне.

апісаньне прыроды займае толькі адзін пэрыод у васьмірадковай строфе; другі пэрыод тэй-жа строфы, а таксама ўся другая строфа запоўнены зьместам псыхолёгічнай уласьцівасьці.

Маюцца і розныя варыянты ў разьмеркаваньні гэтага тэматычнага матар'ялу, якія, аднак, выказваюць уласьцівасьці тых самых двох стыляў.

У сфэры стылю мастака мы можам адзначыць тыя-ж

самыя нагляданьні. Мы ня будзем гаварыць аб такіх стылістычных зьявах романтычнага стылю, як пытаньні, звароткі, паўтарэньні і інш.; яны гавораць самі за сябе. Мы зьвернемся, калі так можна сказаць, да „нэйтральных“ прыналежнасьцяй стылю, якія характэрны для абодвух напрамкаў, скажам гэткіх, як параўнаньне, то і ў гэтай галіне знойдзем матар‘ял, які пацьвярджае нашую асноўную думку.

Сярод іх у Максіма Багдановіча вызначаецца, як дзьве розныя групы—параўнаньні схаваныя, сэнсавыя і параўнаньні яўныя, выражаныя сталымі, характэрнымі для іх граматычнымі катэгорыямі.

Параўнаньні першага раду ў адносінах свайго знадворнага граматычнага аблічча ня маюць пэўнай формы, якая падкрэсьлівала-б менавіта момант процістаўленьня двох розных вобразаў, з прычыны гэтага іх паясьняючая роля вельмі невялікая. Пераважная большасьць сэнсовых параўнаньняў чыста эмоцыяльнага характару; у іх вобраз зьмяшчаецца на першым месцы, а прадмет параўнаньня на другім. Гэтым тлумачыцца і тое, што поэта, побач з сэнсовым параўненьнем, ужывае і другое—яўнае параўнаньне для паясьненьня тэй-жа думкі, якая ёсьць у першым. Другімі словамі, поэта адначасна ставіць два параўнаньні, адно падкрэсьлівае эмоцыянальнасьць мовы, другое—яе конкрэтнасьць, пластычнасьць. Так у вершах „Сонэт“, у яго першай строфе, М. Багдановіч дае нам цэлы малюнак таго, як жменька засохлага насеньня, якая праляжала „колькі тысяч год“ „між пяскоў эгіпецкай зьмлі“ „пад хвалямі сінеючага Ніла“ захоўвае свае жыцьцёвыя сілы:

...жыцьцёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясеньняй збожжа на ральлі...

У другой строфе тых-жа вершаў ён гаворыць:

„Вось сымболь твой, забыты краю родны!“

Поэта верыць, што і дух народны, падобна зернятам, не засьне бясплодна, але „ўперад рынецца“, г. зн. па аналёгіі з папярэднім вобразам ён таксама прачнецца і буйна ўскалосіцца, як зерняты. Але поэта адчувае недахват паясьняючых уласьцівасьцяй першага вобразу і ўжывае другое параўнаньне, каб выказаць тую-ж думку аб прабуджэньні і

вельмі шпаркім росьце народнага духу, аднак бярэ гэтае параўнаньне ў граматычна яўным выглядзе; ён гаворыць:

...ўперад рынецца, маўляў, крыніца,
Каторая магутна, гучна мкне,
Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца.

Тое-ж можна заўважыць і ў ужываньні другога „нэйтральнага“ прыёму стылю, менавіта, эпітэтаў. Сярод іх яўна выдзяляюцца, як дзьве домінуючыя іх групы, эпітэты зрокавыя і псыхолёгічныя.

Першыя складаюць самую шматлікую іх групу і перадаюць уласьцівасьці прадметаў, усю паўнату фарбаў і колераў, якімі поэта малюе акружаючы сьвет. Гэта сьведчыць аб плястычнасьці, яскрава рэалістычным характары яго стылю; сюды можна аднесьці, напрыклад, такія: срэбныя сеці, жоўтыя пяскі, сіневатых зорак, белы лунь, чорнай рызай, сіняю вышшу і другія.

Другую значную групу, як адзначвалася, складаюць эпітэты псыхолёгічныя, такія як—сумны, маркотны лясун, змрочнай, заснуўшай зямлёй, сумным гукам, вецер буйны, панурыя людзі, халодным вершам і г. д. Яны характарызуюць ужо другую ўласьцівасьць яго твораў, менавіта, іх эмоцыянальнасьць. Гэтая ўласьцівасьць альбо зьмешваецца з плястычнасьцю іх альбо складае самастойную велічыню, якая афарбоўвае сабою ўвесь твор. Прычым, калі зрокавыя эпітэты зьяўляюцца сродкам адбіцьця знадворнага сьвету, то эпітэты псыхолёгічныя ўжываюцца для адбіцьця ўласных унутраных і наогул душэўных перажываньняў. У якасьці ілюстрацыі таго, як разьмяркоўваюцца эпітэты тэй і другой групы, мы разгледзім такія вершы М. Багдановіча, якія маюць у сабе, з аднаго боку, адбіцьцё таго ці іншага вакольнага мотыву, а з другога,—і ўласныя адносіны поэты да яго, якія знашлі сваё выражэньне ў пэўных поэтычных вобразах. Мы возьмем вершы: „Сэрца ные, сэрца кроіцца ад болю“, у якім адзначаныя моманты—уласны настрой мастака і знадворны сьвет зьяўляюцца відавочнымі. У гэтых вершах наступныя эпітэты: цеснай хаты; чыстым полі; нуда нямая; песьні звонкай салаўінай; вецер буйны. З іх першыя два зрокавыя; нуда нямая—эмоцыянальны і апошнія — акустычныя, гукавыя. Эпітэт эмоцыянальны, як відаць з прыведзенага, знаходзіцца пры

слове нуда, якое і ўжываецца ў поэты для выражэньня яго ўласных настрояў. Між тым як эпітэты другога роду—зрокавыя і гукавыя ідуць побач з прадметамі з сьвету знадворнага ў адносінах да мастака: хаты, палі, песьні, вецер.

Тыя-ж ўласьцівасьці абодвух мастацкіх напрамкаў мы знаходзім і ў другіх зьявах стылю.

Наяўнасьць стыхій плястычнай і эмоцыянальнай адбіваецца і на зьявах композыцыі *фонэтычнай.*

Наяўнасьць вобразаў плястычных падкрэсьліваецца рытміка-мэтрычнай уласьцівасьцямі вершаў Максіма Багдановіча. Значная большасьць іх напісана разьмерам рэчытатыўнымямбічным альбо хорэічным, у якіх націск роўнамерна чаргуецца праз адзін ненаціскны склад. Гэтыя разьмеры з рэчытатыўнаю плаўнасьцю і роўнамерным спакоем перадаюць „апавядальнасьць“ рознастайных мотываў—соцыяльных, бытавых, мотываў прыроды і г. д. Гэта—разьмер „апавядальнага“ вершаваньня, у якім уласнае „я“ мастака не выдзяляецца ў рэзкай пукатай форме.

Але часам поэта парушае рэчытатыўнасьць разьмеру і „апавядальнасьць“ выкладу living рознымі комбінаванымі прыёмамі ў карыстаньні тымі ці іншымі мэтрамі, уносячы гэтым большую лірычнасьць у сваё апавяданьне.

Вынікам такога менавіта комбінаваньня мэтру і зьяўляецца, з аднаго боку, яго пэўнасьць, выразнасьць і пукатасьць, а з другога боку жывасьць, пераліўчатасьць, усхваляваньне. Калі разьмеры рэчытатыўныя можна параўнаваць з плыньню ракі па сенажаці, па роўным рэчышчы з спакойнаю і роўнаю плыньню, то разьмеры комбінаваныя скарэй сымболізуюць горную раку, якая цячэ па каменьнях з галосным гурчаньнем, часам пераліваючыся праз вялікія парашкоды з вялікім шумам. Гэтыя гукі пераліваў, што паўтараюцца з вядомым разьмеркаваньнем, выдзяляюць больш ясна рытмічнае цячэньне стылю*).

Калі мы цяпер зьвернемся да творчасьці другога выдатнага поэты ў навейшай беларускай літаратуры Янкі Купалы, то і там сустракаем тыя-ж асаблівасьці.

*) Больш падрабязна аб розных зьявішчах у творчасьці Максіма Багдановіча композыцыі сюжэтнай, стылістычнай і фонэтычнай гл. нашу працу „Поэтыка М. Багдановіча“. Коўна, 1926 г.

Так, яго поэмы „Курган“, „За што“, „Магіла льва“, „Бандароўна“ маюць зусім конкрэтны зьмест бытавой і соцыяльнай уласьцівасьці, прычым у дзьвюх астатніх гэты зьмест мае гістарычны характар. Між тым, як поэмы: „Забытая скрыпка“ і „На куцьцю“ зьмяшчаюць у сабе значную долю фантастычных мотываў, набліжаючы іх з гэтае прычыны да твораў баляднага тыпу.

Характар гэтага матар‘ялу адпаведным парадкам адбіваецца і на *мастацкай манеры* пісьменьніка. Так, поэма „На куцьцю“ распачынаецца вялікім малюнкам, які мае ўяўны характар і на фоне якога разьвінаецца дзеяньне.

На небе зоры ўжо мігцяць,
На полі срыбны сьнег іскрыцца;
На бел-сьвет дзівы выпраўляць
Пляцецца ночка-чараўніцца.

Глуш абнялася з цішынёй
І спавівае ўсё у чары,
Паўзуць і сеюць шорах свой
Старым парадкам цені-мары.

Вылазе з цемры бледны звод.
Глядзіць сьліўнём на долы, горы,
І тут і там пускае ў ход
Свае нямые загаворы.

І тут і тамка свой прыгон
Распасьцірае царства ночы;
Салодкі сон, магільны сон
Сьмяецца сьвету ўсяму ў вочы,..

Адцягненасьць гэтага вобразу мае вялікія разьмеры. Увесь малюнак носіць фантастычны, баечны характар: ноч у ўяўленьні поэты выступае, як чараўніца, якая паказвае свае цуды і пускае ў ход свае загаворы.

Наадварот, малюнак у поэме: „Курган“, які служыць фонам, носіць ужо больш рэальны характар, хаця і ён абрысаваны ў пераносных выразах:

Паміж пустак, балот Беларускай зямлі,
На ўзьбярэжжы ракі шумнацечнай
Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі,
Ўдзірванелы курган векавечны.

Дуб гальлё распусьціў каранасты над ім;
Сухазельле у грудзі ўпілося;
Вецер стогне над ім уздыханьнем глухім,—
Аб мінуўшчыне ў жальбах галосе.
На купальле там птушка садзіцца, пяе,
У Піліпаўку воўк нема вые,
Сонца днём распускае там косы свае,
Ночкай зоры глядзяць залатыя.
Хмары неба ўсьцілалі мо‘ тысячу раз,
Пяруны білі з краю да краю.—
Ён стаіць—гэта памяць людзкая—паказ...

Тыя-ж асаблівасьці мы знаходзім і ў манеры абрысоўкі гэрояў гэтых поэм. Гусьляр у поэме „Курган“ малюецца, як адпаведна народнаму баяну, у рысах романтычна-фантастычных, якія прыбліжваюць яго да гэрояў байкі, што часткова напамінаюць мітычнага песьняра клясычнай старажытнасьці Орфэя:

Ўвакруг гэтай душы дудара-званар
Казак дзіўных злажылась ня мала.
Кажуць, толькі як выйдае і ўдара як ён
Па струнах з неадступнаю песьняй,—
Сон зьлятае з павек, болю цішыцца стогн,
Ня шумяць ясакары, чарэсьні;
Пушча-лес ня шуміць, белка, лось не бяжыць,
Салавей-птушка ў той час сьціхае;
Паміж вольхаў рака, як што дзень, ня бурліць;
Паплаўкі рыба-плотка хапае.
Прытаіцца да моху русалка, лясун;
Каня вечнага „піць“ не заводзе;
Пад звон-песьню жывучых гусьляравых струн
Для ўсіх папараць-кветка ўзыходзе.

Баярын у поэме „Магіла льва“ наадварот характарызуецца словамі аўтара ў выразах і красках зусім конкрэтных:

Баярын тамка быў багаты
Яшчэ лятамі малады,
Да сваявольства быў заўзяты,
Па свойму час губляў з нуды.

Усюды броіў самазбродам
Тварыў закон свой і свой суд
Над абнядоленым народам
Што збыць ня меў сіл сваіх пут...

Сюжэтнае афармленьне тэматычнага матар'ялу паказаных поэм таксама зьмяшчае ў сабе ўласьцівасьці тых-жа двух мастацкіх імкненьняў. Пераважным аказваецца момант апавядальны, эпічны. Ён абыймае сабою значную частку мотываў, якія ўваходзяць у склад поэм; абставіны і ход дзеяньня, характарыстыка дзеючых асоб—усё гэта агорнута ў эпічную форму. Рух апавяданьня ў гэтай частцы поэм носіць павольны, паступовы характар. У сваім апавяданьні аўтар паступова пераходзіць ад апісаньня аднаго жанру фактаў да другога ў іх паступовым хронолёгічным ходзе аднаго за другім. У гэтым выпадку поэмы бліжэй да гэроічных клясычных эпопей, чым да поэм романтычных ці лірычных, якія маюць іншы, больш рухавы, усхваляваны і менш паступовы тэмп выкладаньня.

Звычайна кожны твор пачынаецца тым ці іншым „уводным" мотывам, які цесна зьвязаны з наступным выкладаньнем. Усьлед за ўводзінамі, пачынам поэмы—ідзе пачатак дзеяньня—апісаньне фабулы твору. Заключная частка поэм, іх дасказ, які складае самастойную компонэму сюжэтнага пабудаваньня, у ідэйных адносінах таксама беспасярэдна прылягае да агульнага зьместу твораў, працягваючы адзіную непарыўную ніць выкладу. Так, напрыклад, у поэме „Магіла льва" ўводзіны зьмяшчаюць у сабе разважаньне поэты аб лёсе народнага паданьня ў жыцьці народу, а фабула яе апісвае адно з такіх паданьняў, менавіта паданьне аб Машэку, паданьне аб тым, як на яго магіле вырасла места Магілеў, як каля яго высіцца гара: яе Машэкавай завуць. Дасказ поэмы зьмяшчаючы ў сабе апісаньне прыроды, ідэёва зьвязаны з агульным зьместам, бо ў гэтым малюнку даецца конкрэтны вобраз тэй-жа Машэкавай гары.

І ціха, ціха на гары тэй
Чарнеюць пліты і крыжы,
То летнім сонейкам сагрэты,
То зьзябшы ўзімку ў маразы і г. д.

Такім чынам, асноўныя часткі сжэтнага пабудаваньня—

зачын, апісаньне дзеяньня і дасказ, прадстаўляюць сабою хронолёгічна паступовы малюнак, у якім асобныя часткі ідуць адна за другою ў строгай прагматычнасьці, як часовай, так і лёгічнай.

Але ў межах эпічнага апавяданьня маюцца такога роду элемэнты, якія, не парушаючы цэласьці твораў, характарызуюць аднак ужо іншыя ўласьцівасьці іх. Гэта прысутнасьць у поэмах стыхіі лірычнай і драматычнай. Тая і другая ўносяць у апавяданьне момант эмоцыянальнага ўсхваляваньня і ўсласнай зацікаўленасьці аўтара.

Лірызм апавяданьня выступае на сцэну ў тых выпадках, калі асобныя моманты дзеяньня поэм дасягаюць свайго найвышэйшага разьвіцьця і вялікай напружанасьці.

У гэтых выпадках лірычная манера апавяданьня служыць адным з сродкаў іх слоўнага выражэньня.

Асабліва характэрныя рысы лірызму ў поэме „Бандароўна“, дзе яны паказаны ў большай колькасьці выпадкаў, чым у другіх творах.

Такі выпадак лірычнай зацікаўленасьці аўтара выступае, напрыклад, тады, калі пан Патоцкі прыходзіць у карчму і калі становішча абвострываецца, бо

...найболей к Бандароўне
Ён прыстаў абрыдна;
Цалаваць, абняці хоча,
Ажно глянуць стыдна.

У гэты момант поэта праяўляе вялікую зацікаўленасьць лёсам сваіх гэрояў і, зварочваючыся да Патоцкага, лірычна кліча:

Асьцярожна, пан Канеўскі!
Будзе ліха, будзе,
Не забудзься, што сумленьне
Ёсьць і ў простым людзе! і др.

У некаторых выпадках лірызм апісаньня аказваецца настолькі неабходным, што ён замяняе сабою другую стыхію—драматычную. Па ходу дзеяньня чытач чакае, што на пытаньні аднаго з гэрояў будзе адказваць другі; іншымі словамі, поэта павінен перайсьці да размовы, г. зн. да драматычнай манеры апавяданьня, але, дзякуючы тэй-жа ўласнай зацікаўленасьці да сваіх пэрсонажаў, ён нечакана пераходзіць да лірычнай.

У тэй-жа поэме Патоцкі, зварочваючыся да Бандароўны, якую прывялі ў яго пакой, задае ёй пытаньне:

Ну, што воліш сабе выбраць,
Пышная паненка:
Ці ў бяседзе засядаці
Вось пад гэтай сьценкай
І са мною піць, гуляці,
Ночкі каратаці?
Ці навекі косьці парыць
У зямельцы-маці?

Заместа гэроіні ў гэты рашучы момант яе жыцьця адказвае сам мастак:

Не такую, ясны пане,
Бачыш прад сабою,
Што захоча чэсьць і славу
Прадаваць з табою...
Не прадасьць яна дзявоцтва,
Як ты, пан, сумленьня;
Твае ўгрозы ёй нястрашны,
Нястрашна цярпеньне...

Што датычыцца размоўнай формы апавяданьня, то яна ўводзіцца мастаком таксама ў пэўных выпадках. Яна выступае, калі эпічнае апавяданьне даходзіць да апавяданьня аб выпадках, якія маюць значную ўнутраную напружанасьць. Звычайна размова пачынаецца, калі адбываецца спатканьне гэрояў, соцыяльна і псыхолёгічна рознародных і варожых адзін да аднаго. У гэтых выпадках яна выяўляецца ў маласлоўнай, але яскравай маляўнічай форме. Яна ўзмацняе драматычную відавочнасьць сцэны і рухае разьвіцьцё ранейшых здарэньняў з большым імпэтам, чым апавяданьне эпічнае.

Напрыклад, у тэй-жа поэме „Бандароўна“ размоўная форма пачынаецца ў адзін з найбольш сільных момантаў дзеяньня. Патоцкі дабіваецца таго, каб гэроіня зьвярнула на яго ўвагу, але тая б‘е яго па твары.

Загарэліся вочы ў пана, і ён
Выгражае кулакамі
Ўсёй казачай браці,
гаворыць: Усе адказ дасьцё мне зараз —
Дачка, бацька, маці!

Банкетуючыя казакі яму адказваюць:

Асьцярожна, ясны пане,
З грозьбамі сваімі...

Гэтыя рысы лірызму і драматызму, якія ўносяць у апаваданьне стыхію ўсхваляваньня і эмоцыянальнай напружанасьці, зьяўляюцца характэрнымі рысамі поэмы романтычнага складу. Іх наяўнасьць у творах Янкі Купалы сьведчыць аб прысутнасьці ў іх прыкмет стылю романтычнага.

Стыль тых-жа твораў Янкі Купалы з боку характару і ўласьцівасьцяй маляўнічых сродкаў пацьвярджае і дапаўняе тыя спасьцярогі, якія намячаюцца ў межах сюжэтнага пабудаваньня поэм, іх композыцыі. У гэтых адносінах паміж стылем і пабудовай поэм вызначаецца поўная роўналежнасьць, хаця ў агульным падрахунку лікавая перавага належыць стылістычным зьявам романтычнай уласьцівасьці.

Ня спыняючыся на гэткіх прыналежнасьцях стылю, як пытаньні і клічныя сказы, якія характэрны для эмоцыянальнай мовы ў межах тых-жа „нэйтральных“ сродкаў, у ім прыходзіцца констатаваць тыя-ж дзьве асноўныя мастацкія стыхіі.

Так, агульная ўласьцівасьць эпітэтаў у пералічаных творах, што асабліва кідаецца ў вочы, гэта іх адцягненасьць. Яны ўзяты з сьвету альбо зусім адцягненых разуменьняў, якія недаступны нашаму разуменьню ў конкрэтнай форме, альбо з кругу зьявішчаў унутранай псыхолёгічнай уласьцівасьці, але зьяў таксама мала азначаных у сваім рэальным выяўленьні. Эпітэты гэтага роду складаюць самую шматлікую іх групу. Але па сваім характары гэтая адцягненасьць вобразаў не аднародна. У адных выпадках яна носіць безадносны характар. Гэткай менавіта ўласьцівасьці эпітэты мастак ужывае кожны раз, калі ён хоча выразіць крайнюю ступень тэй ці іншай якасьці прадмету; напрыклад: весьцяй дзіўных, у беспрасьветнай векаў мгле, бязьмернай дабраты, ненаглядненькай дзяўчыне, непамернай вайны, красой сьвятою і г. д.

Другая група эпітэтаў гэтага роду носіць менш адцягнены характар. Яны зьмяшчаюць у сабе ўяўленьне аб некаторай частцы элемэнтаў матар'яльнай уласьцівасьці. Іх зьмест вызывае ў думцы ўспрыймаючага вобразы конкрэтнага сьвету, хаця яны і ня маюць у сваім абрысе яскравай дакладнасьці і пэўнай вызначанасьці; напр., гэткія эпітэты: разбой-

нік страшны, натуру залатую, пуцінамі крывымі, горкай долі, у муках страшных, дзіцячы думкі, грэшную русалку і др.

Усе гэтыя эпітэты адцягненага парадку мастак ужывае для мэты эмоцыянальнай уласьцівасьці. Не ўладаючы фізычна адчувальнай матар'яльнасьцю, яны вызываюць толькі вобразнасьць неазначаную, туманную, запоўненую толькі эмоцыянальным зьместам.

Значна меншую групу складаюць эпітэты конкрэтныя, якія даюць яснае ўяўленьне аб матар'яльнасьці вобразаў, імі выражаных; напр.: гладзьдзью сіняю, цёмнай далі, белы грудзі, кроў чырвону, чорны бровы і г. д.

Сярод другіх зьявішчаў стылю, асабліва, параўнаньняў, мы спатыкаем тыя-ж асаблівасьці ў іх прыродзе і ў выкананьні імі мастацкіх заданьняў, якія сьведчаць аб наяўнасьці двох галоўных кірункаў*).

Мастацкая творчасьць трэйцяга выдатнага мастака навейшай беларускай літаратуры Якуба Коласа мае ў сабе тыя багатыя даныя мастацкай уласьцівасьці, якія пацьвярджаюць нашае асноўнае палажэньне.

Абодвы жанры яго творчасьці—і лірыка і эпіка—будуюцца ім на аснове гармонійнага злучэньня прыкмет стылю романтычнага і клясычнага. І гэты мастацкі сынтэз, як і ў папярэдніх выпадках, распрасьціраецца на композыцыйную пабудову ўсіх відаў—фонэтычнай, стылістычнай і сюжэтнай.

Нават у межах мастацкай прозы, у яго расказах і апавяданьнях, якія, як вядома, носяць глыбака рэальны характар, што часамі пераходзіць у плястычна-адчувальны натуралізм—нават і тут мы можам адзначыць наяўнасьць элемэнтаў процілеглага стылю — стылю мовы эмоцыянальнай. Тут асабліва рэзка кідаюцца ў вочы тыя лірычныя адхіленьні, якія ўліваюцца часамі ў яго спакойнае эпічнае апавяданьне. Яны менавіта парушаюць павольную эпічнасьць расказаў, уносячы ў яе лірычную ўсхваляванасьць, якая прымушае чытача, ужо трохі зморанага спакоем апавяданьня, ажывіцца і перажыць рад настрояў эмоцыянальнага парадку. У такім якраз мастацкім злучэньні, ці дакладней—чаргаваньні мовы плястычнай

*) Падрабязна аб стылістычных і композыцыйных зьявах у поэмах Янкі Купалы гаворыцца ў нашай рабоце: „Поэмы Янкі Купалы“ (Сюжэтнае пабудаваньне і стыль—„Узвышша“. 1927, № 1).

і эмоцыянальнай і заключаецца здольнасьць мастака. Такога роду адхіленьні можна адзначыць, напрыклад, у апавяданьні „Палеская глуш“, асабліва ў лірычных апісаньнях яе прыроды; напрыклад, аўтар піша: „Ёсьць штось нязвычайна прыгожае ў прывольных старасьвецкіх шляхох Беларусі. Шырокай размашыста пралягаюць яны ад вёскі да вёскі, ад мястэчак да гарадоў, злучаючы паветы, губэрні і цэлыя краіны. Кольkі хараства, і чароўнага прывабу ў сініх іх далях!.. Эх, шляхі, родныя шляхі! Хто перакажа нам вашы казкі, разгадае думкі...“

Альбо ў зборніку „На прасторах жыцьця“ мы знаходзім такія-ж мастацка-лірычныя апісаньні прыроды; напр., у расказе „На прасторы жыцьця“ мы чытаем гэткія радкі: „Эх, і слаўныя гэтыя летнія ночы! Здаецца, дзеля таго толькі і сходзяць яны на зямлю, каб паказаць, што ў цёмнай цішыні і поэзія і хараство... Эх, ночы, хмельныя летнія ночы!..

Зборнік „Родныя зьявы“ проста адчыняецца адным глыбака-лірычным расказам „Думкі ў дарозе“ і г. д.

Асабліва рэльефна абедзьве адзначаныя стыхіі выступаюць у яго двух эпічных творах—у поэмах: „Сымон Музыка“ і „Новая Зямля“. Першая з іх зьяўляецца тыпічным творам стылю романтычнага, а другая—клясычнага.

Ужо самая *тэма* першай з паказаных поэм—тэма аб поэтычным мастацтве, уплеценая ў гісторыю аб адным таленавітым музыканце Сымоне, гаворыць за тое, што гэты твор глыбака романтычны. Вядома, з якім замілаваньнем і настойлівасьцю романтычная поэзія культывавала пытаньні гэтага парадку. Поэта і яго поэзія—гэта тэма асабліва аблюбёная ёю.

Тэматычнае разьвіцьцё гэтага мотыву аб поэзіі таксама даецца ў такім выглядзе, які аказваецца характэрным для романтызму. З аднаго боку высака ўталенаваны Сымон, а з другога,—вакольныя абставіны, у якіх яго мала разумеюць і зусім ня цэняць яго здольнасьцяй. Гэтае проціпастаўленьне так жыва напамінае вядомую антытэзу романтычнай поэзіі—поэта і натаўп, які складае тэму цэлай чарады твораў у межах літаратуры эўропейскай.

Таксама дзеяньне, якое зьвязана з асобаю галоўнага гэроя твору, прадстаўляецца ў форме, характэрнай для поэмы

рамантычнага складу. Сымон на працягу ўсяго апавяданьня знаходзіцца ў стане пастаяннага туляньня па розных месцах Беларусі. Спачатку мы бачым Сымона ў яго бацькаўскай хаце; пасьля ён адыходзіць з яе і, вандруючы са сваёю скрыпкаю, спатыкаецца спачатку з дзедам жабраком; пасьля яны ўдвох зьяўляюцца на хутары, дзе музыкант спатыкаецца з чулаю і далікатнаю Ганнаю, дзе ён перажывае першыя зоры абуджанага пачуцьця каханьня; далей ён пападае ў карчму ў лапы хітрага Шлёмы; затым ідзе новае спатканьне яго з Ганнаю, пасьля чаго ён апынуўся ў палацы ў князя, потым у хаце лясьніка Данілы і нарэшце ён зноў ідзе да Ганны. Гэты мотыў туляньня галоўнага гэроя зьяўляецца таксама вельмі характэрным і тыповым для твораў рамантычнага стылю.

Гэтыя галоўныя тэматычныя цэнтры ў поэме Якуба Коласа—поэта і натаўп, туляньне гэроя—міжвольна вызываюць для параўнаньня тыя вядомыя цыклі рамантычных поэм, якія маюцца ў літаратуры. У памяці самі сабою выступаюць „усходнія поэмы“ Байрона, „паўднёвыя поэмы“ Пушкіна, нямецкія поэмы гэтак званай старэйшай групы рамантыкаў—Тіка, Новаліса, Вакенродэра і др. У іх мы знаходзім у тэй ці іншай комбінацыі, тыя-ж характэрныя тэмы, якія зьяўляюцца асноўнымі для поэмы „Сымон Музыка“. Зразумела, мы далёкі ад тэй думкі, што ў даным выпадку мы маем тыя ці іншыя ўплывы з боку пералічаных твораў рамантычнага тыпу. Прыводзячы гэтае агульнае параўнаньне, мы хочам толькі адзначыць наяўнасьць *азначанай літаратурнай традыцыі* ў творах Якуба Коласа, якая ў сваю чаргу лішні раз падкрэсьлівае прысутнасьць у гэтым творы прыкмет адзначанага характару, г. зн. уласьлівасьці рамантычнага стылю.

Ня менш тыповыя прыкметы тэй-ж мастацкай стыхіі і ў галіне композыцыйнага аформленьня тэматычнага матар‘ялу гэтай поэмы. Яе сюжэтная пабудова ў агульным падраху́нку праведзена па тым пляне, які зьяўляецца найбольш характэрным для рамантычных поэм паказаных цыкляў. Гэта роўналежнасьць у адносінах формальных частак твораў зноў гаворыць аб сьледаваньні нашага мастака імкненьням таго-ж літаратурнага кірунку.

Поэма адчыняецца глыбака лірычным уступам, які звы-

чайна складае неабходную прыналежнасьць кожнага твору ў гэтым родзе.

Ад роднае зямлі, ад гоману бароў,
Ад казак вечароў,
Ад песень дудароў,
Ад сьветлых воблікаў закінутых дзяцей,
Ад шолаху начэй,
Ад тысячы ніцей...
Зьбіраўся скарб, струменіўся няспынна,
Вясёлкавым ірдзеньнем мне сьпяваў,
І выхаду шукаў
Адбітак розных зьяў.
У словах-вобразах, у песьнях вольна-плынных
І гэты скарб, пазычаны, адбіты,
У сэрцы перажыты
І росамі абмыты
Дзяньніц маіх, дзяньніц маіх мінулых,
Для вас, душою чулых,
Як дўуг, як дар,
Дае пясьняр.

Гэткія-ж уступныя строфы маюцца і перад асобнымі часткамі поэмы; іх усяго ў творы пяць і кожная з іх пачынаецца з такога ўводнага пачатку. Па сваім зьмесьце гэтыя ўступы featureнага характару. Часьцей за ўсё, як гэта можна наогул наглядаць у романтычнай поэме, ролю такіх уводных частак маюць апісаньні прыроды. Тое-ж маем мы і ў поэме Я. Коласа. Так, першая частка яго твору пачынаецца вершамі:

На галіне
Пры даліне
Ліст на дрэве марна гіне:
Ліст зялёны, ды ўмірае.
Ліпа, матухна старая,
Ой, сыночка свайго скіне,—
Ён пахілы,
Ён нямілы,
У сям'і ня мае сілы:
Тым нялюбы, што адметны,
І браты з ім няпрыветны—
Мусіць лёс такі пастылы...

Такога-ж прыродаапісальнага характару і ўводзіны апошніх частак поэмы. Толькі пачатак трэцяга разьдзелу некалькі выдзяляецца сярод другіх характарам свайго зьместу; у ім аўтар дае шырокі простор сваім нацыянальна-лірычным пачуцьцям, апранаючы іх у высака патэтычныя формы.

О, край родны, край прыгожы!
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей у сьвеце белым
Гэтых сьветлых берагоў...
Гэтых гмахаў безгранічных
Балатоў тваіх, азёр...
Край мой родны! дзе-ж у сьвеце
Край другі такі знайсьці—і г. д.

Уступныя вершы такога роду граюць ролю прадмовы к твору або да яго частак, выконваючы пры гэтым пэўныя мастацкія задачы. Як гэта прынята ў романтычнай поэме, гэткія ўводныя строфы звычайна зьмяшчаюць у сабе паказаньне на асноўную думку ці на агульны характар наступнага зьместу або яго асобных разьдзелаў. Такую-ж ролю яны граюць і ў поэме Якуба Коласа.

Першы агульны ўступ для ўсяго твору зьмяшчае ў сабе пералічэньне тых рознастайных крыніц адкуль быў сабраны мастацкі матар'ял для твору; гэта тыя менавіта крыніцы, якімі жывілася романтычная поэзія. Далей гэты матар'ял, як падкрэсьлівае поэта, пражыты сэрцам мастака; ён атрымаў, значыць, глыбака лірычны характар, у якім знайшлі свой адбітак уласныя настроі аўтара; гэтая рыска зьяўляецца зноў характэрнай для мастацкіх імкненьняў поэтаў-романтыкаў. Такім чынам, у агульным падрахунку, ужо гэтыя ўводзіны даюць асноўныя абрысы таго ўнутранага абліку, які мае ўвесь твор; яны падкрэсьліваюць з самага пачатку прысутнасьць вядомых прызнакаў романтычнага стылю.

Гэткую ролю выконваюць і наступныя ўводныя строфы. Яны таксама заключаюць у сабе, як у мініятуры, тыя ці іншыя паказаньні на наступны зьмест поэмы. Прыведзеныя ўводзіны першай часткі даюць сымболічна-вобразны малюнак сумнага ўдзелу зялёнага лістка, які знаходзіцца ў самай цеснай сувязі з далейшым зьместам поэмы; яны якраз і даюць конкрэтны вобраз гэтага сымболю, рысуючы сумны стан

Сымона сярод сваіх родных, ад якіх ён у канцы канцоў адыходзіць.

Уводзіны к трэцяй частцы таксама мастацкі растлумачваюцца ў далейшым зьмесьце твору. Нацыянальныя сымпатыі аўтара к роднаму народу, афарбаваныя пэўнымі соцыяльнымі фарбамі, яго глыбокае спачуваньне да простага абяздоленага люду, да яго асобных прадстаўнікоў, якія адзінока падымаюцца з агульнай масы, дзякуючы сваім здольнасьцям, — усе гэтыя складаныя адчуваньні мастака, якія выказаны ім у ўводзінах, знаходзяць сваё рэальнае ажыцьцяўленьне ў асобых абразкох поэмы. Тое заапекаваньне, якое аказвае Сымону парабак Яўхім, а потым дзед Даніла, заапекаваньне, якое аснована перш за ўсё на соцыяльным сваяцтве гэрояў, служыць вядомым малюнкам для настрояў аўтара, якія зьмешчаны ім у ўводзінах.

Прадмовы апошніх частак займаюць, прыкладна, такое-ж становішча, якое маюць і толькі што разгледжаныя. Агульнае мастацкае значэньне іх знаходзіцца ў тым, што яны ўтвараюць вядомую эмоцыянальную зацікаўленасьць у чытача і служаць для яго вядомым імпульсам да далейшага азнаямленьня з творам.

Мы апісалі толькі адну рыску композыцыйнай пабудовы поэмы, характэрную для романтычных твораў гэтага жанру; паказалі тую менавіта рыску, якая знаходзіцца на першым пляне і кідаецца ў вочы перш усяго. У гэтай-жа сфэры формальна-композыцыйных зьявішчаў поэмы маецца цэлы рад другіх, столькі-ж тыповых для данага стылю.

Адзначаючы композыцыйныя прыкметы романтычнай стыхіі, мы павінны ў той-жа час паказаць, што ў данай галіне маюцца элемэнты і процілежнага стылю—стылю клясычнага. Сярод многіх прыкмет гэтага роду асабліва выразна выдзяляецца адзін — гэта хронолёгічна паступовае, лёгічна пасьлядоўнае разьвіцьцё самога дзеяньня поэмы, якая напамінае менавіта тое, якое зьяўляецца неабходнаю прыналежнасьцю гэроічнай поэмы клясычнага тыпу. У творы Якуба Коласа дзеяньне адчыняецца малюнкам пражываньня Сымона ў сваіх бацькоў; далей ідзе яго адыход з бацькаўскага дому і яго туляньне, якое ідзе ў вядомай паступовасьці адно за другім. Звычайным-жа

прыёмам разьмеркаваньня асобных частак дзеяньня ў поэме романтычнага складу аказваецца выдзяленьне іх у выглядзе асобных самастойных вялічынь з адным мастацка-вяршынным дзеяньнем у асяродку; маруднасьць руху і паступовасьць пераходаў зусім адсутнічаюць. Між тым, якраз паступовасьць разьвіцьця дзеяньня ў гэтай поэме наўмысьля падкрэсьліваецца мастаком. Ён расьсякае адзінае здарэньне на дзьве часткі, з якіх адно ён адносіць к канцу вядомай часткі поэмы, а другою пачынае наступны яе разьдзел. Так, трэцяя частка даканчваецца малюнкам чулага вобразу расставаньня Сымона з Ганнаю; гэроіня зварочваецца да каханага ёю музыканта:

Ну, то хоць на разьвітаньне
Паіграй, Сымонка, мне,
Каб мінута расставаньня
Нам казала аб вясьне...

Наступная чацьвертая частка, пасля традыцыйных уводзін, адчыняецца працягам размовы паміж гэроямі. Ганна зварочваецца да Сымона, гаворыць:

Ну, мой мілы! хоць і цяжка...
Што-ж? бывай здароў! прашчай! і г. д.

У агульным падрахунку, такім чынам, аказваецца, што і ў гэтым сваім творы Якуб Колас імкнецца да вядомага сынтэзу двох розных стыляў—романтычнага і клясычнага, к вядомаму чаргаваньню іх асноўных мастацкіх імкненьняў. У гэтым заключаецца высокае мастацтва мастака.

Другая названая намі поэма „Новая Зямля“ зьяўляецца глыбака рэальным творам, які адбівае ўсе прыкметы стыхіі клясычнай. Гэты твор зьяўляецца свайго роду сямейнай хронікай, якая расказвае аб жыцьці лясьніка Міхала з усімі яго даволі простымі пэрыпэтыямі. Гэтае жыцьцё па неабходнасьці праходзіць у вядомай стычнасьці з вакольным асяродкам: у зьвязку з гэтым знадворныя абставіны знаходзяць пад пяром мастака шырокае мастацкае апісаньне. Увесь тэматычны зьмест яго праведзены ў глыбака рэальных танох.

Але і тут на фоне шырокага рэалізму, які паўстае перад чытачом ва ўсёй яго яскравасьці і плястычнасьці, маюцца асобныя астраўкі, на якіх выступаюць і прыналежнасьці другога кірунку—стылю романтычнага. У гэтых адносі-

нах асабліва выразна выдзяляюцца тыя ж лірычныя ўстаўк аўтара, якімі ён опэруе, як адзначалася вышэй, у сваёй мастацкай прозе. Самы пачатак поэмы адчыняецца глыбака лірычнымі вершамі:

Мой родны кут, як ты мне мілы!
Забыць цябе ня маю сілы і г. д.

Такімі-ж лірычнымі строфамі поэма і канчаецца. Астатні разьдзел (XXX)—„Сьмерць Міхала“ выкананы асабліва высокім лірычным настроем; яго апошнія заключныя вершы пераходзяць нават у песенны лад:

У полі, полі
Пры дарожачцы
Пахіліўся крыж
Над магілаю.

Беглі сьцежачкі
Ў сьвет шырокенькі,
Прывялі-ж яны
К тэй магіланцы!.. і г. д.

Далей такога-ж роду адхіленьне мы спатыкаем і ў асобных частках твору. Так, разьдзел (VI) „Каля зямлянкі“ таксама мае ў якасьці пачатку лірычнае разважаньне аўтара, якое ўстанаўляе ўнутраную эмоцыянальную сувязь паміж творам і яго чытачом; поэта гаворыць:

Я буду рады, калі ўдасца
Маім знаёмым ў вашай ласцы
Хоць на кароценькі часочак
Заняць хоць цесьненькі куточак... і г. д.

Такой-жа ўласьціваcьці ўводзіны к разьдзелу (XII) „Сэсія“; у ім мастак гаворыць, зварочваючыся да чытача:

У інтарэсах асьвятленьня
Яшчэ нязьнікшага зьяўленьня
Ня шкодна-б сьвятам, вольным часам
Схадзіць на сэсію з Міхасем...

Такім чынам, як у першай сваёй поэме, так і ў другой Якуб Колас дае гармонічна-мастацкі сынтэз двох асноўных мастацкіх імкненьняў слоўнага мастацтва. Але, як відаць ужо з папярэдняга абгляду, данага ў самым агульным і ўрыўкавым відзе ў межах поэтычнага абагульненьня асобных элемэнтаў гэтых стыхій, яны разьмяркоўваюцца няроўнамерна; у першай поэме—„Сымон Музыка“—стыль романтычны ў яго разнастайных формах перавышае клясычны; а ў другой поэме—„Новая Зямля“,—наадварот, перавышаючым аказваецца клясычны стыль.

Такія-ж конкрэтныя прыклады для пацьвярджэньня нашай думкі можна прывесьці з нагляданьня над творчасьцю і іншых пісьменьнікаў навейшай беларускай літаратуры.

Але мы адзначылі толькі агульныя асновы і з іх толькі *некаторыя* для пацьвярджэньня высунутага намі тэзісу. Можна значна паглыбіць наш аналіз, і ён адчыніць нам горызонты вялікага інтарэсу. Але работа такога парадку патрабуе значнага месца; яна натуральна зьмяняецца ў дасьледаваньне спэцыяльнага характару. Ва ўсякім выпадку гэты шлях, шлях сынтэзу двух асноўных мастацкіх імкненьняў слоўнага мастацтва, па якім ідзе разьвіцьцё навейшай беларускай літаратуры, сьведчыць аб тым, што яна знаходзіцца ў адносінах свайго поэтычнага мастацтва на правільным і здаровым шляху. У сучасны момант адно з номолёгічных абагульненьняў, якія вызначаюцца ў навуцы аб літаратуры, гаворыць аб тым, што толькі тыя пісьменьнікі жывуць у памяці патомства і забясьпечваюць сабе пастаянную славу, якія будавалі сваю творчасьць на падставе такого якраз сынтэзу.

Усе выдатныя мастакі сусьветнай літаратуры—Дантэ, Шэкспір, Байрон, Гётэ і др., а таксама пісьменьнікі расійскай літаратуры, такія, як Пушкін, Гоголь, Лермонтаў, Тургенеў, Талстой, Дастаеўскі і г. д., выходзілі ў сваёй літаратурна-мастацкай дзейнасьці з абагульненьня тых мастацкіх каштоўнасьцяй, якія складаюць уласнасьць і стылю клясычнага і стылю романтычнага. У гэтых адносінах навейшая беларуская літаратура аказваецца асабліва шчасьліваю, бо яна мае мажлівасьць улічыць той доўгі досьлед, які быў зроблены літаратураю ў яе агульным маштабе, і цяпер ідзе па шляху ўжо вывераным і пэўным. Дзеля гэтага яна мае вялікую будучыню.

ЛІТАРАТУРНАЯ КАМІСІЯ.

Старшыня проф. *Замоцін;* нам. проф. *Пятуховіч;* сэкратары: проф. *Гарчынскі* і *Жылка.*

Старшыня: Мы ўжо ўмовіліся наконт парадку нашае працы: спачатку мы абгаворваем даклады, заслуханыя на пленарным пасяджэньні, а потым ужо робім вывады з нашых

дыскусій. Я-б прасіў зараз гаварыць галоўным, чынам, аб дакладах, а пасьля ўжо мы пяройдзем да другой, рэзолюцыйнай, часткі.

Дубоўка. Наколькі я зразумеў, даклады ў нас на Акадэмічнай Конфэрэнцыі былі пастаўлены з мэтаю чыста інформацыйнаю. Гэтым тлумачыцца той факт, што спрэчкі ня былі адчынены на Конфэрэнцыі, а перададзены ў Камісію. Значыць, выказвацца тут асабліва ня прыдзецца, а затым я і абмяжуюся толькі некаторымі пытаньнямі да дакладчыкаў.

Дык вось я хацеў-бы задаць проф. Пятуховічу такое пытаньне: як ён уяўляе сабе беларускае літаратурнае аб'яднаньне „Ўзвышша", якое вылучылася з „Маладняку", у якое ўвайшоў пісьменьнік Бядуля, што ня быў у „Маладняку"? Чаму профэсар заяўляе, што гэтае аб'яднаньне ня выявіла свайго твару? Што ён разумее пад тварам організацыі? Калі ён пад гэтым разумее ўсё тое, што напісана пісьменьнікам за вядомы пэрыод, дык мне здаецца, што якраз твар у новай організацыі ёсьць.

Цяпер пытаньне проф. Вазьнясенскаму. Наколькі я зразумеў яго, ён казаў, што беларусы ня нацыя, а пляменная група. Калі гэта так, дык мне хацелася-б знаць, як ён гэта разумее. Ва ўсякім выпадку я ведаю, што беларусы лічаць сябе народам і іх усе так разумеюць.

Таксама цікава, што азначае ў проф. Вазьнясенскага выраз, што „беларуская літаратура можа гардзіцца тым, што на яе долю выпала задача позна пачаць сваё разьвіцьцё, затым што цяперака яна ў сувязі з гэтым можа карыстацца дасягненьнямі суседніх народаў". Мне здаецца, што беларуская літаратура пачала разьвівацца даўно; быў у ёй перапынак гвалтоўны, які на доўгі час затрымаў паступовае разьвіцьцё беларускай літаратуры. Затрыманьне гэтае прыходзіцца ацэньваць, як зло, дзякаваць тутака няма за што. Цікава, чаму гэта ніхто не паказаў на сувязь беларускай мастацкай літаратуры з народнай творчасьцю. Аднымі было адзначана, што беларуская літаратура знаходзілася пад уплывам польскай (тутака трэба адзначыць і вельмі цікавы даклад проф. Голомбэка, у якім ён даў паказаньні на новы, невядомы ў нас, фактычны матар'ял), другія казалі, што яна знаходзілася пад уплывам расійскай, але ніхто не адзначыў, што беларуская

літаратура ў сваім разьвіцьці і адраджэньні пераважна грунтавалася на беларускай народнай творчасьці, а ніяк не на ўплыве літаратур іншых народаў. Паасобныя выпадкі не зьяўляюцца правілам. Уплыў народнае поэтыкі можна знайсьці ў творчасьці Янкі Купалы і інш. Калі ўзяць Багдановіча, дык ён якраз прадстаўляе выключэньне; калі ўзяць маладых пісьменьнікаў, дык хоць у іх і знойдуць уплыў расійскай або ўкраінскай літаратуры, дык гэта не зьяўляецца вельмі характэрным для ўсёй беларускай літаратуры.

Пажадана, каб Прэзыдыум Конфэрэнцыі запраўды пастараўся больш дакладна інформаваць дэлегатаў Конфэрэнцыі аб сучасным стане беларускай літаратуры. Бо аб стане яе да Кастрычнікавай рэволюцыі або за першыя гады ўсякі можа азнаёміцца па друкаваных матар'ялах, а аб сучасным пэрыодзе матар'ялы не надрукаваны, а затым дэлегаты могуць атрымаць няпоўнаеўражаньне.

Чаржынскі. Я папрашу ў паважанай Конфэрэнцыі прабачэньня за тое, што, быць можа, я буду паўтараць тое, аб чым гаварылася да маёй прысутнасьці. Але ўнікнуць гэтага я ня маю магчымасьці, паколькі я ня ведаю, аб чым гаварылі папярэднія прамоўцы.

Я хацеў-бы зрабіць некалькі ўваг па сёнешніх дакладах. Я пачну з апошняга дакладчыка, паважанага профэсара Дзяржаўнага Унівэрсытэту Вазьнясенскага. Даклад проф. Вазьнясенскага меў, галоўным чынам, агульна-мэтодолёгічны характар, характар унівэрсальны, без спэцыфічнага падыходу да спэцыфічных зьяў беларускай літаратуры. Але разам з тым проф. Вазьнясенскі ў выніку сваіх мэтодолёгічных пабудоў зрабіў некалькі вывадаў і адносна беларускай літаратуры. Першы вывад: беларуская літаратура шчасьліва, што яна навукова не распрацоўвалася да самага апошняга часу і такім чынам ухілілася ад тых ненавуковых тлумачэньняў, якія мелі месца ў іншых літаратурах.

Для мяне вельмі дзіўна бачыць шчасьце літаратуры ў тым, што яна да апошніх гадоў ня была об'ектам навуковай распрацоўкі, чакаючы найноўшых мэтодолёгічных дасягненьняў. Ясна, што калі так ставіць пытаньне, дык трэба было-б і цяперака яшчэ пачакаць з навуковай распрацоўкай нашай літаратуры, бо, быць можа, праз некалькі гадоў навуковыя мэ-

тоды яшчэ больш угрунтуюцца. Побач з гэтым вывадам проф. Вазьнясенскі зрабіў і другі: разьвіваючы сваю схэму аб клясычным і романтычным стылі ў беларускай літаратуры, ён адзначыў, што беларуская літаратура шчасьліва, пачаўшы разьвівацца ў XIX і XX ст., г. зн., у эпоху, калі гэтыя стылі клясычнай і романтычнай літаратуры былі багата распрацаваны ў іншых літаратурах. І вось беларуская літаратура, спакойна прачакаўшы XVIII і XIX ст., у XX ст. жне гатовы ўраджай, сынтэзуючы гэтыя дасягненьні. І ў гэтым яе шчасьце. Мяне вельмі дзівіць такі мэтодолёгічны падыход. Быць можа, каб беларуская літаратура прачакала яшчэ сто год, дык яна мела-б мажлівасьць сынтэзаваць тры стылі!

Вось два моманты, якія я ня мог абыйсьці па дакладу проф. Вазьнясенскага. Базумоўна, з гэтым абсолютна нельга згадзіцца. Я зацьвярджаю, што найбольшае няшчасьце беларускай літаратуры ўласна ў тым, што да гэтага часу яна навукова не вывучалася і няма нават спроб да яе вывучэньня. Найбольшае няшчасьце беларускай літаратуры ўласна ў тым, што яна перажыла вялікі разрыў літаратурных традыцый на працягу XVII, цэлага XVIII і часткова XIX сталецьця. У XIX ст. ў эўропейскай літаратуры мы бачым надзвычайны росквіт. Гэта ў некаторай меры залатая пара ў разьвіцьці заходня-эўропейскай літаратуры. Проф.-жа Вазьнясенскі сьцьвярджае, быццам Беларусь і шчасьліва тым, што міма яе пранеслася гэтая залатая пара. Я з гэтым згадзіцца не магу.

Цяперака некаторыя заўвагі да даволі вялікага рэфэрату проф. Пятуховіча. Рэфэрат проф. Пятуховіча меў надзвычайна агульную пабудову. Ясна, што гаварыць на працягу аднэй гадзіны аб беларускай літаратуры, аб літаратуры XIX і XX ст.-- рэч цяжкая і няўдзячная для навуковага працаўніка, бо гаварыць аб такім вялікім пэрыодзе прыходзіцца толькі агульна і схэматычна. І проф. Пятуховіч гэтую схэматычнасьць і агульнасьць, на мой погляд, давёў у сваім рэфэраце да самага канца. Схэматычнасьць адчувалася з самага пачатку. Мы ведаем, што ў літаратурнай навуцы існуе надзвычайная тэндэнцыя да схэматызацыі. Ёсьць старыя літаратурныя схэмы, шаблёны, табліцы, да якіх ёсьць нахіл падганяць літаратурныя факты. Усім вядома, напр., такая схэма: клясыцызм, сантымэнталізм, романтызм, рэалізм і г. д. Гэтая агульная схэма,

пабудаваная пераважна на літаратурным разьвіцьці заходня-эўропейскіх літаратур, гэтая самая схэма ў проф. Пятуховіча была дакладна вытрымана і дапасавана да беларускай літаратуры. Праўда, проф. Пятуховіч у пачатку свайго рэфэрату сказаў, быццам мэтодолёгічна пры дасьледаваньні беларускай літаратуры ён прытрымліваецца такога погляду, што ў пачатку аналізуецца соцыяльна-палітычны базіс, а на падставе соцыяльна-палітычнага базісу будуецца азначаная палітычная тэорыя, схэма і г. д. І такі аналіз у сваім дакладзе проф. Пятуховіч праводзіў, я-б сказаў, даволі ўлада. Бязумоўна, соцыяльна-палітычны базіс у беларускай гісторыі пачатку XIX ст., першай паловы XIX ст. быў даволі конкрэтна выкладзены ім у рэфэраце. Думалася, што цяперака, на падставе гэтага, ён разгорне карціну разьвіцьця нашай літаратуры, бо мне думаецца, што якраз дасьледаваньне гісторыі літаратуры ляжыць не ў выяўленьні толькі соцыяльна-палітычнага базісу, на якім яна разьвіваецца, бо гэта справа другой навуковай галіны, а ў выяўленьні літаратурнай поэтыкі, літаратурных прыёмаў і стыляў, якія ўтвараюцца на тэй або іншай соцыяльна-палітычнай базе. Вось гэты ўласна момант, момант выяўленьня літаратурных прыёмаў, стылю, мне здаецца, проф. Пятуховіч у сваім рэфэраце мінуў; ён гэтага не зрабіў адносна беларускай літаратуры пачатку XIX ст., ні адносна беларускай літаратуры эпохі паншчыны, ні адносна сучаснай беларускай літаратуры. Можа гэта трэба тлумачыць абмежаванасьцю часу, але ва ўсякім выпадку, ня выяўлены асноўныя рысы поэтыкі гэтых кругабегаў.

Проф. Пятуховіч пры пэрыодызацыі беларускай літаратуры гэтага часу прытрымліваўся падзелу беларускай літаратуры на чатыры кругабегі: эпоха літаратуры паншчыны, эпоха ліквідацыі паншчыны, нашаніўская літаратура і пасьлякастрычнікавы пэрыод літаратуры. З такім падзелам у некаторай меры можна было-б згадзіцца, тым больш што падзел пабудаваны на фактах соцыяльна-палітычнай гісторыі. Паколькі ў нашай гісторыі такія пэрыоды былі, як пэрыод паншчыны, пэрыод рэволюцыі 1905 г. і Кастрычнікавай рэволюцыі, ясна, што супроць такой пэрыодызацыі гісторыі нельга нічога сказаць. Але калі робім падзел па пэрыодах нашай літаратуры, дык пры гэтым падзеле цікава было-б кі-

равацца ня выключна гэтымі політычнымі фактарамі, але і некаторымі, я-б сказаў літаратурнымі або поэтычнымі, тэндэнцыямі, што панавалі ў тую ці іншую эпоху. І вось, на жаль, аб гэтых літаратурных прыёмах ў беларускай поэзіі, што адпавядалі кожнай эпосе, мне чуць не давялося. Эпоха прыгоннай літаратуры характэрызуецца, быццам, клясыцызмам і прыводзяцца прыклады: „Энэіда навыварат" і „Тарас на Парнасе". Я ніяк не магу згадзіцца, што ў „Энэідзе навыварат" трэба бачыць рысы клясычнае школы. Калі зьяўляецца гэты твор? Ён зьяўляецца ў эпоху, калі ў Заходняй Эўропе ў літаратурным жыцьці ідзе барацьба паміж клясыцызмам і романтыкай. І вось на рубяжы XVIII—XIX ст. ст. зьяўляецца „Энэіда навыварат". Першае, што кідаецца ў вочы ў „Энэідзе навыварат", гэта тое, што гэты твор накіраваны супроць клясыцызму, твор, у якім адсутнічаюць прыёмы клясычнае школы. І затым, я думаю, што на „Энэіду навыварат" трэба глядзець, як на першую ластаўку барацьбы романтыкі з клясыцызмам на беларускім грунце. „Энэіда навыварат" ёсьць продукт барацьбы романтыкі з клясыцызмам, на яе толькі і можа быць такі погляд. Клясыцызм на беларускім грунце быццам вычэрпваецца гэтым творам. Я-б сказаў, што калі нават „Энэіду навыварат" і залічыць у лік клясычных твораў, дык усё-ткі на падставе аднаго твору будаваць цэлы кірунак клясыцызму на беларускім грунце няма падставы.

Клясыцызм, як бачыце, усё-ж як-небудзь зьвязаны з некаторымі адзіночнымі фактамі ў беларускай літаратуры. З гэтым яшчэ поўбяды.

Пераходзім да сантымэнталізму і романтызму. Сантымэнталізм і романтызм узьніклі і разьвіліся ў літаратурным жыцьці Заходняй Эўропы. Але гэтыя разуменьні ў літаратурнай навуцы не асьветлены. Тэрмін романтызм, а часткова і сантымэнталізм—гэта ёсьць нават не рабочая гіпотэза, гэта ёсьць тэрмін з абсолютна няясным зьместам нават у адносінах да заходня-эўропейскіх літаратур, на грунце якіх ён зьявіўся.

Проф. Пятуховіч вольна опэруе гэтымі няяснымі тэрмінамі, дасьледуючы беларускую літаратуру. Сантымэнталізм на беларускім літаратурным грунце ілюструецца тутака тво-

рамі В. Марцінкевіча. Романтыка, выпярэджваючы, паводле проф. Пятуховіча, сантымэнталізм, зьвязваецца з першаю чвэрткаю XIX ст. і прадстаўляецца ў нашай літаратуры такімі пісьменьнікамі, як Баршчэўскі, Рыпінскі, Чачот. Я-б сказаў, што тут ёсьць проста жаданьне падвесьці літаратуру пад схэму. Бязумоўна, гэтыя тры пісьменьнікі з літаратурнага пункту гледжаньня ў аспэкце беларускай літаратуры могуць быць аднесены да якога-хаця літаратурнага кірунку,—настолькі нязначны іх мастацка-літаратурныя дасягненьні. І калі яны да гэтага часу займаюць у дасьледаваньнях па беларускай літаратуры так шмат месца, як пісьменьнікі, дык гэта трэба тлумачыць уласна жаданьнем пабудаваць романтычную школу ў беларускай літаратуры, бо як без яе абыйсьціся! Была-ж яна ў іншых эўропейскіх літаратурах таго часу! І наогул, ці ёсьць даволі падстаў адносіць гэтых пісьменьнікаў да беларускай літаратуры? Памойму, Міцкевіч зьяўляецца непараўнальна больш беларускім пісьменьнікам, чым, напр., Баршчэўскі Міцкевіч у сваіх творах адбіў Беларусь з усіх бакоў, ён свой найлепшы твор „Пан Тадэуш“ пачынае гімнам Беларусі. І аднак, ніхто з нас ня лічыць Міцкевіча беларускім поэтам, затым што ўсе мы памятаем, што поэзія, літаратурнае мастацтва — ёсьць мастацтва, матар‘ялам якога перш за ўсё зьяўляецца слова, і паколькі Міцкевіч тварыў з польскага слоўнага матар‘ялу, дык, будзь ён хоць тры разы выяўнікам нацыянальнага быту Беларусі, мы ня можам далучыць яго да беларускай літаратуры. Скажу больш: ва ўсякім выпадку ёсьць большы сэнс лічыць Міцкевіча беларускім поэтам, чым Баршчэўскага, Рыпінскага і Чачота. Фактычна, калі мы возьмем хаця-б таго-ж Баршчэўскага, дык мы ўбачым, што ён апрацаваў сэрыю новэль на аснове беларускай народнай поэзіі, апрацаваў літаратурна на польскай мове; на беларускай мове да нас дайшлі яго два нязначныя вершыкі, якія з мастацкага боку—проста дробязь. І я лічу, што калі мы ўсё-ж гаворым аб Баршчэўскім, Чачоце, Рыпінскім і на гэтых трох „кітох“ стараемся зрабіць вывад, што вось і ў нас быў пэрыод романтыкі, дык гэта ёсьць проста жаданьне падмацаваць сваю схэму, што, бач, спачатку быў клясыцызм, за ім павінен быў ісьці сантымэнталізм, але ў нас ён трохі пераскочыў, пераскочыў праз романтызм; для сантымэнталізму мы маем Мар-

цінкевіча, для романтыкі мы маем трох адзначаных вышэй пісьменьнікаў—і ўсё ў парадку.

Аб сантымэнталізьме Марцінкевіча можна было-б паспрачацца. Паўтараю, нам трэба памятаць, што Марцінкевіч тварыў у эпоху, калі ўсё-такі сантымэнталізм у літаратурах, вядомых Марцінкевічу блізка (польскай і расійскай), ужо адыходзіў у гісторыю. З другога боку, варта толькі праналізаваць драматургію Марцінкевіча—тую самую „Пінскую шляхту". Якая рыса ў „Пінскай шляхце" ёсьць, якая-б уласна сьведчыла, што Марцінкевіч сантымэнталісты? Узяць „Гапона". Ён, як сказаў проф. Пятуховіч, ёсьць выключна продукт дваровай культуры. Ці зусім гэта так? Апрача дробнага шляхецтва самога аўтара ў сэнсе ідэолёгіі, у „Гапоне" мы бачым пераважна малюнак беларускай прыгнечнай вёскі ў яе ўзаемаадносінах з дваром, і ва ўсякім выпадку, цэнтр вагі ў гэтым творы, бязўмоўна, ня ў культуры двара, таму што культура двара ў палове XIX сталецьця была культурай зусім чужой Беларусі; гэта была ўжо культура польская пераважна. Паўтараю, у гэтым самым „Гапоне" я бачу ня выключна дваровую культуру, таксама як скэптычна гляджу на рысы таго сантымэнталізму, які надаюць гэтаму твору. Адзначу тутака адзін цікавы момант: Марцінкевіч у сваіх творах скарыстоўвае вельмі шмат беларускага фольклёру. „Гапон", „Вечарніцы" і інш.—гэта ёсьць творы, напалову склееныя з народнай беларускай творчасьці. І, кажучы аб сантымэнталізьме пісьменьніка, я мысьлю, што проф. Пятуховічу трэба было-б зрабіць вывад і ў гэты бок, а ўласна, што народная творчасьць наша, тая багатая творчасьць, якая скарыстана Марцінкевічам, носіць рысы сантымэнталізму. Я з гэтым ні ў якай меры ня згодзен.

Такім чынам, калі мы ўжываем тэрміны: романтызм, сантымэнталізм, рэалізм і г. д., дык гэтыя тэрміны ў адносінах да беларускай літаратуры можна ўжыць толькі пасьля навуковага вывучэньня, пасьля дасьледаваньня самых літаратурных твораў. Я павінен адзначыць, што гісторыя беларускай літаратуры разьвівалася зусім іншым шляхам, чым разьвівалася літаратура ў тых нацый, якія ўласна стварылі або на літаратурным грунце якіх вырасьлі гэтыя літаратурныя кірункі. Фактычна беларуская літаратура ў поўным сэнсе

гэтага слова пасьля свайго вялікага заняпаду адрадзілася ўпяршыню толькі з Марцінкевіча. Марцінкевіч—першы вялікі беларускі пісьменьнік і да яго можна гаварыць аб беларускай літаратуры толькі як аб перадпасылцы і надаваць ёй ярлыкі літаратурных школ няма, памойму, выстарчаючых падстаў.

Возьмем канец XIX і пачатак XX веку. У XX веку наогул мы бачым у літаратурным жыцьці Заходняй Эўропы вельмі цікавую эпоху. У гэты час шмат якія літаратуры перажываюць ужо ўчарашні дзень свайго кульмінацыйнага разьвіцьця, а беларуская літаратура ў гэты час толькі яшчэ пачынае разгортвацца. Тутака завязваецца надзвычайна цікавы вузел у сэнсе літаратурных тэндэнцый, літаратурных прыёмаў і г. д., разблытаць які справа навукі—і справа цяжкая. І вось у гэтым вузьле, калі ў нас на невялікім працягу канца XIX і пачатку XX ст. ўтвараецца беларуская літаратура ў поўным сэнсе гэтага слова, літаратура, папярэджаная некалькі дзесяцілецьцямі Марцінкевічам, утвараецца такая стракатая сытуацыя, у якой, калі мы будзем разьмяшчаць па гэтым шаблёну—сантымэнталізм, романтызм і розныя іншыя „ізмы“,—дык вельмі і вельмі лёгка заблытацца. У гэтай схэматызацыі можна дайсьці да таго, каб Багушэвіча ставіць у аналёгію з Дантэ, як гэта зрабіў у сваім дакладзе проф. Пятуховіч, аналізуючы верш „Быў у чыстцы“. Такая аналёгія чыста штучная. Невялікі верш „Быў у чыстцы“, пабудаваны на народнай фабуле з народнай беларускай поэзіі, ставіцца ў сувязь з клясычным творам Дантэ. Гэта паказвае ўсю мэтодолёгічную схэму літаратурнае пабудовы проф. Пятуховіча.

Некалькі слоў адносна „Нашаніўскай“ поэзіі. Проф. Пятуховіч па традыцыі дзеліць яе эмоцыянальнасьць на два віды: момант оптымістычны і момант пэсымістычны. Такі погляд на эмоцыянальнасьць гэтай поэзіі—погляд стары. У нашай навуцы гэты погляд паўтараецца ў працы Карскага і проф. Ігнатоўскага ў яго „Гісторыі Беларусі“, падручніках Гарэцкага, у рэфэраце проф. Пятуховіча. Я на гэтым моманце спынюся. Калі мы будзем аналізаваць беларускую літаратуру выключна на соцыяльна-палітычнай базе, праходзячы міма самых літаратурных твораў, дык была-б некаторая падстава сказаць, што пэсымізм павінен прасякаць усю „наша-

ніўскую“ поэзію. Але калі мы ў першую чаргу будзем выходзіць з аналізу самых літаратурных твораў, дык зробім у некаторай меры іншыя вывады. Я маю сьмеласьць сказаць, што погляд, быццам пэсымізм прасякае ўсю „нашаніўскую“ літаратуру,—ёсьць погляд традыцыйны, але, тым ня менш, памылковы. Я скажу, што ў пачатку XX веку ў Эўропе ня было больш оптымістычнае літаратуры, чым літаратура беларуская. Ĭ ў іншых літаратурах было больш пэсымізму, чым у беларускай літаратуры. Тутака ёсьць некаторае непаразуменьне ў паняцьцях пэсымізму. У беларускай літаратуры мы спатыкалі рэальныя малюнкі грамадзкага жыцьця і быту Беларусі; гэтыя рэальныя малюнкі ня былі пэсымістычны па настроі, а разгортваліся на чорным фоне. Гэта ёсьць рэалізм, а не пэсымізм. Я мысьлю, што пара ўжо пераглядзець гэты погляд, якога ў нас па традыцыі прытрымліваюцца да цяперашняга часу. Зразумела, калі гаварыць аб беларускай літаратуры, дык трэба-б было гаварыць пераважна аб літаратуры за апошнія гады. На жаль, дзякуючы таму, што дакладчык спыніўся на літаратуры XIX в., дык і іншыя выступаўшыя, таксама, як я, спыняліся на гэтым больш, чым на сучаснай літаратуры. Самае цікавае месца ў нашай літаратуры—гэта нашы дні. Аб іх не гаварылі дакладчыкі, а затым, на жаль, прайшлі міма іх і опонэнты.

Жылуновіч. Я пачну з таго, на чым спыніўся тав. Чаржынскі, а менавіта, што мы, часта гаворачы аб гістарычным разьвіцьці беларускае літаратуры, мала зьвяртаем увагі на зусім асаблівыя ўмовы, у якіх ішло гэтае разьвіцьцё. Не падкрэсьліваецца, а калі падкрэсьліваецца, то мімаходам, што галоўную ролю ў разьвіцьці і замацаваньні гэтага разьвіцьця беларускае літаратуры пранёс на сабе беларускі селянін, беларускі рамесьнік. Яны ў той час бачылі ў суседніх культурах сродкі для свайго нацыянальнага прыгнечаньня, і сваё нацыянальнае вызваленьне бачылі ў некаторай часьці ў адраджэньні сваёй беларускай культуры. Выпускаючы гэта з воку, мы губім асноўны базіс для пабудовы нашых досьледаў аб гісторыі беларускае літаратуры.

З гэтага боку маюцца абмылкі ў проф. Пятуховіча пры яго разглядзе пытаньня аб падзеле на пэрыоды гісторыі беларускае літаратуры і пры характарыстыцы пісьменьнікаў

Марцінкевіча і Багушэвіча. Першае, памойму, зусім няправільна даводзіць адсутнасьць сантымэнталізму ў Марцінкевіча з прычыны тагочаснае прамысловае адсталасьці Беларусі. Памойму, дзякуючы вось гэткім умовам, творчасьць Марцінкевіча была цалкам прасычана масьляным сантымэнталізмам, без малейшага падкрэсьліваньня клясавых момантаў.

Ды гэта ня дзіва. Марцінкевіч быў шляхціцам: атрымаў адпаведнае выхаваньне і меў падыход да беларускага сялянства з пункту гледжаньня настаўніка моралаў, добрага радцы, спагадніка з налётам шляхецкае добрачыннасьці. І калі мы спынімся на яго літаратурных творах, то ўбачым, што яны цалкам і спрэс прасякнуты мяшчанскім сантымэнталізмам ды пачуцьцём бацкаўскае „спагады“ к меншым братом. Уплываў тагочаснае расійскае народніцкае літаратуры Марцінкевіч не адчуваў, і яна на яго не зрабіла заметнага ўражаньня, калі судзіць аб гэтым па яго беларускіх творах. Ад бітак жыцьця беларускае вёскі ў творах Марцінкевіча абмяжоўваецца вузкаю самотаю. І досыць дзіўным робіцца, як, адкуль і чым былі навеяны Марцінкевічу думкі і настрой у час пісаньня ім вершу „Вясна, лета перапала“; у гэтым адзіным вершы ён дапусьціў выразны намёк на соцыяльную крыўду ў пабудове людзкае грамады. Урэшце, мне здаецца, што Марцінкевіч не зьяўляецца тыповым прадстаўніком беларускае літаратуры; фактычна ён удзяліў ёй часьцінку свае ўвагі, між іншым, пастолькі, паколькі нельга было ў той час так ці іначай не чапаць селяніна. І яго творы ў беларускай літаратуры маюць не асаблівую каштоўнасьць.

Іншы падыход трэба мець да Ф. Багушэвіча. Калі па сваім соцыяльным стане ён мала розьніцца ад свайго папярэдніка, то самыя ўмовы і абставіны, у якіх ён складаў сваё сьветаразуменьне, дух часу, насычаны электрычнасьцю рэволюцыйнасьці, надалі яму іншых мотываў і выпукнілі перад ім соцыяльна-клясавыя моманты. Творы Багушэвіча амаль не цалком адбіваюць у сабе соцыяльныя супярэчнасьці; яны куды мацней падкрэсьліваюць прыгнечанасьць сялянства, чым гэта адмячалася ў той час у расійскай літаратуры.

Таксама і ў сэнсе мастацкасьці і з боку дасканальнасьці формы і складу Ф. Багушэвіч на многа апярэдзіў Марцін-

кевіча. І тут зусім нельга згадзіцца з Пятуховічам, які кажа што „абодва пісьменьнікі ўбогі ў сваіх пісаньнях і ў форме гэтага пісаньня“.

Далей я-б хацеў спыніцца на гістарычных пэрыодах у разьвіцьці беларускае літаратуры. Чамусьці проф. Пятуховіч якраз правёў мяжу падзелу праз 1905 г. З майго боку гэта недакладна. Мы ведаем, што гаспадарчае разьвіцьцё Расіі ўжо пры жыцьці Ф. Багушэвіча і Яна Няслухоўскага атрымала нахіл у бок адбудовы фабрычна-заводзкае прамысловасьці. Шпаркім пэнтам ішло нараджэньне клясы прамысловае біржуазіі і рабочых. Расла і ідэолёгія нацыянал-дэмократызму, ад якога не вызвалялася рэволюцыяваная да эсэраўшчыны народніцтва. Шырокія колы розначыннай інтэлігенцыі былі захоплены романтызмам дэмократычнага ладу Расіі. Найболей гэты настрой захапіў студэнцтва. І вось мотывы Багушэвіча і Я. Няслухоўскага, крыху абмодэрнізаваныя, сталі пашыраць новыя беларускія пісьменьнікі, як К. Каганец, часткаю Ядігін Ш. ды інш. Па зьместу сваіх ідэй, па напрамку ў сваёй творчасьці апошнія ніяк ня розьніліся ад сваіх папярэднікаў. Псыхолёгія іх, соцыяльны стан і сьветапогляды былі тыя-ж самыя, як і ў Багушэвіча.

Я-б сказаў, што і першыя творы нашых народных пісьменьнікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа выпалі ў пэрыод, які адносіцца да папярэдняга таму, які ўзьняў сабою 1905 год. Апошні рэволюцыйны пэрыод, пэрыод нашаніўскага рэнэсансу, супадае з 1910-1911 г. г. З гэтага часу ўваходзіць у беларускую літаратуру новае пакаленьне пісьменьнікаў у складзе М. Багдановіча, Ц. Гартнага, А. Гаруна, З. Бядулі, С. Палуяна, Ф. Шантыра, М. Гарэцкага і інш. Гэтыя пісьменьнікі ўносяць у беларускую літаратуру спэктар рознастайных мотываў, пачынаючы ад модэрністычных (М. Багдановіч) і канчаючы рэволюцыйна-пролетарскім (Ц. Гартны, Ф. Шантыр, Хв. Чарнушэвіч, А. Гарун). Адпаведна збагачаецца і фармальны бок творчасьці.

Гэтаму зьявішчу далі штурхача ідэі рэволюцыі 1905 году ў галіне нацыянальнай, толькі к моманту 1910-1911 г. г., знайшоўшы мажлівасьць ажыцьцявіць свой уплыў на ўмовы жыцьця. Пад націскам гэтых умоў вышлі на арэну нацыянальна-рэволюцыйнага змаганьня шырокія гушчы народнае (ся-

лянскае ды рабочае) інтэлігенцыі; апошняя была кадрам беларускіх чытачоў, а таксама і рэгулятарам ідэёвых напрамкаў у беларускіх пісьменьнікаў.

Што-ж датычыць характарыстыкі проф. Пятуховічам настраёвага боку нашаніўскае пары, то і тут я маю з ім разыходзіны. На мінорнасьць тонаў у творчасьці Ал. Гаруна і Цёткі ўплывалі не экономічна-політычныя абставіны, пад якімі гэтыя пісьменьнікі-рэволюцыянэры не маглі ўгінацца, а іх індывідуальныя прычыны, бач, стан іх здароў'я. Ї Цётка і А. Гарун, пацярпеўшы ад угону царскага ўраду (Цётка была ў эміграцыі, А. Гарун у высылцы ў Сібіры), нажылі сухоты. Ї калі перад імі паўстала пытаньне аб жыцьці і сьмерці, яны ўдаліся ў пэсымізм. У часы нормальнага стану абодва пісьменьнікі мелі бадзёры, завучы настрой.

Далей я зачаплю справаздачу т. Гарэцкага. Апошні пэўна, меў намер зрабіць дасканалы агляд беларускай літаратуры пад ухілам социяльнага мэтоду. Запраўды-ж з гэтага атрымалася няўдала прачытаная лекцыя па політграмаце. Т. Гарэцкі ў гэтай лекцыі хацеў паправіць сваю „Гісторыю беларускае літаратуры“, уставіўшы яе на марксыцкі фундамэнт, але ня здолеў належна і дыялектычна зрабіць вывады. Гэтак, у некаторых мясцох свайго дакладу ён супярэчыць нават з т. Плехановым, адным з вялікіх марксыцкіх тэорэтыкаў. Таксама т. Гарэцкі, хочачы падмацаваць свой марксыцкі мэтод прыкладамі з нашаніўскага пэрыоду, падвёў усіх пісьменьнікаў пад рубрыку „нудачы“ і незалежнікі. Гэта ўжо занадата „памарксыцку“. Т. Чаржынскі ў сваёй прамове адкінуў падобныя замахі да голаслоўнасьці. Нашаніўскі пэрыод бязумоўна і фактычна ёсьць адным з бліскучых пэрыодаў жыцьцёвасьці і грамадзянскага натхненьня ў гісторыі беларускай літаратуры.

Сьледам, як-бы ў разьвіцьцё сваіх новых поглядаў т. Гарэцкі даводзіць, што зараз наша маладая літаратура выраўнялася з эўропейскаю, а ранейшая (разумей) была нічога ня вартай. Дзеля прыкладу я падкажу на Янку Купалу і на яго збор вершаў „Шляхам жыцьця“. Ці не складаюць яны найпякнейшых і найдасканальнейшых твораў, якія па сваёй мастацкасьці апераджаюць эўропейскую літаратуру? Ня здарма на іх была зьвернута ўвага і чэскай, і польскай, і ўкра-

інскай крытыкі, і ня здарма расійскія песьняры В. Брюсаў, Корынфскі, Белаусаў рабілі пераклады на расійскую мову з гэтага зборніку Янкавых твораў.

У мяне ёсьць яшчэ некаторыя заўвагі, але за бракам часу я, на жаль, не магу на іх спыніцца.

Язэп Пушча. Я ня крытык і ня гісторык літаратуры, а ўсяго малады поэта, загэтым доўга гаварыць ня буду, абмяжуюся ўсяго некаторымі ўвагамі, якія будуць насіць характар запытаньняў.

Перш за ўсё я хацеў-бы запытацца ў проф. Пятуховіча аб аднэй цытаце, якую ён прыводзіў у сваім дакладзе. Цытата гэтая ўзята з вершу Янкі Купалы „Ворагам Беларушчыны“. Яе проф. Пятуховіч прывёў у такой рэдакцыі:

К свабодзе, роўнасьці, *братэрству*
Мы працярэбім сабе сьлед!
І будзе ўнукаў панаваньне
Там, дзе сягоньня плача дзед!

тады як у Янкі Купалы ва ўсіх аўтэнтыках тэкст такі:

К свабодзе, роўнасьці і *знаньню* і г. д.
. . . .

Мне зусім незразумела ў даным выпадку падмена слоў проф. Пятуховічам.

Далей у дакладзе констатавалася такое пялажэньне: вясковая поэзія па сваёй прыродзе больш статычная, чым гарадзкая. Мне думаецца, што статычнасьць ці дынамічнасьць поэзіі больш, а можа і галоўным чынам, залежыць ад таго, якая зьява зьяўляецца яе мастацкім увасабленьнем і да якой літаратурнай школы належыць поэта, а не ад таго, вясковая яна ці гарадзкая. Калі мы возьмем вясковы верш А. Гаруна „Завіруха“, дык калі прачытаем усю гарадзкую беларускую поэзію, то большай дынамікі вершу мы ня знойдзем.

У дакладзе была пушчана і такая „крылатая“ думка: „Узвышша“ яшчэ ня выявіла свайго твару“. А таму проф. Пятуховіч знайшоў магчымым і творчасьць узвышаўцаў абыйсьці, амаль, маўчаньнем. Але-ж у рачавітасьці яно ня так. Шмат з узвышаўцаў, ужо здолелі заняць сваёю творчасьцю выразна акрэсьленую позыцыю ў разьвіцьці беларускай мастацкай літаратуры за апошнія гады. Я адчуваю, што

проф. Пятуховіч можа на гэта даць такі адказ: усё гэта ўзвышаўцамі створана яшчэ да юрыдычнага афармленьня „Ўзвышша“. Няхай яно і так, але-ж гэта імі створана, а ня іншымі за іх; яно памойму за імі павінна і лічыцца, як наогул літаратурная творчасьць кожнага поэты лічыцца за ім-жа. У даным пытаньні, мне здаецца, проф. Пятуховіч быў ня зусім об‘ектыўным.

Пад канец свайго дакладу проф. Пятуховіч адзначыў, што з новых літаратурных школ у беларускай поэзіі апошніх гадоў знайшлі сабе водгук—футурызм і імажынізм,—прычым, хто зьяўляецца прадстаўніком імажынізму, было ізноўжа абойдзена маўчаньнем,—тады як прадстаўніком футурызму быў названы поэта А. Александровіч. Мне хочацца коратка супыніцца на гэтым ня ўгрунтованым палажэньні проф. Пятуховіча, паставіўшы такія запытаньні:

а) У чым выявілася абурэньне А. Александровіча супроць старых дасягненьняў мастацтва.

б) У якіх вершах А. Александровіча проф. Пятуховіч знайшоў яскрава выяўленую поэтыку футурызму,—асабліва з так званым яе „заумным языком“?

в) Усё-ж пажадана ў заключным слове пачуць, у якой форме і імажынізм выявіўся на беларускай глебе і хто з поэтаў зьяўляецца яго прадстаўніком?

Амаль ва ўсіх дакладах гучэла такая „прарочая“ думка: што ёсьць надзея, што беларуская літаратура ўвойдзе ў склад сусьветнай літаратуры. Дзякаваць, што хоць у дакладчыкаў ёсьць гэтая надзея. Мне-ж здаецца, што беларуская літаратура ўжо ўвайшла ў склад сусьветнай літаратуры,—толькі адна бяда, што сусьветная літаратура яе ня ведае па розных прычынах. Папершае няма з яе перакладаў на чужаземныя мовы, падругое няма грунтоўнага навуковага яе дасьледаваньня.

Я хацеў-бы яшчэ задаць пытаньне нашаму гісторыку літаратуры М. Гарэцкаму. Ён зазначыў у сваім дакладзе, што ў сучасны момант нараджаецца дробная буржуазія і адпаведна гэтаму адбываецца дыфэрэнцыяцыя і сярод пісьменьнікаў. Пажадана, каб ён у заключным слове зазначыў, у якой ступені зьяўляецца гэтая дыфэрэнцыяцыя характэрнай для

беларускіх пісьменьнікаў, і хто з іх у сваёй творчасьці адбіў дробна-буржуазныя настроі і імкненьні?

Вось тыя невялічкія запытаньні, якія я хацеў паставіць дакладчыкам.

Жылуновіч. На гэты раз я хацеў-бы заўважыць аб трох момантах, якія выявіліся ў ранейшых і сёньнешніх спрэчках аб дакладах па гісторыі беларускае літаратуры. Паперашае, гэта ўсё-ж аб „нашаніўскім шовінізьме“ М. Гарэцкага. Дзіўлюся, што ў М. Гарэцкага знашлося сьмеласьці аб гэтым казаць, ня маючы на тое жадных падстаў. Няхай ён не забывае, што кіраўніцтва „Нашай Ніваю“ цалком знаходзілася ў руках соцыял-дэмократаў, як: А. Навіна, Ян Луцкевіч, А. Бурбіс і інш., і вялікая большасьць пісьменьнікаў нашаніўцаў таксама належалі да гэтае партыі, як-та: Ц. Гартны, С. Палуян, Ф. Шантыр, А. Гурло, Хв. Чарнушэвіч, Я. Лёсік і да нargшых соцыялістычных партый—А. Гарун, Л.-Лобік, Л. Гмырак і інш. Як-та магло стацца, як-бы яны былі шовіністамі ў час, калі ўвесь беларускі рух укладаўся выключна ў рамкі рэволюцыйнасьці. Гэта тайна тав. М. Гарэцкага, у якога наогул много цудоўных асабістасьцяй у падыходзе і да кожнага пісьменьніка і да кожнае зьявы ў гісторыі беларускае літаратуры.

Да прыкладу—яго адносіны да М. Багдановіча: чамусьці М. Гарэцкі лічыць, што М. Багдановіч зьяўляецца найвыдатнейшым беларускім пісьменьнікам, які характарызуе беларускую літаратуру. Як довад за гэта, т. Гарэцкі апіраецца толькі на мастацкасьць М. Багдановіча. Мне думаецца, наадварот, што М. Багдановіч выключны пісьменьнік, мала зьвязаны з істотаю беларускае літаратурнае рачавістасьці. Не адкідаючы яго здольнасьці, усё-ж трэба заўважыць, што М. Багдановіч унёс у беларускую літаратуру імпрэсыяністычныя ўплывы і ідэолёгічны струмень ад тагочаснай заняпалай расійскай літаратуры. М. Багдановіч ня меў сувязі з Беларусьсю, мала быў знаёмы з соцыяльна-палітычнымі плянамі беларускай гуамадзкасьці і, нават, слаба ведаў беларускую мову. Усё гэта зрабіла так, што ён быў сам па сабе, а беларуская літаратура сама па сабе.

І, нарэшце, некалькі заўваг адносна думак М. Гарэцкага аб гэрою майго роману „Сокі цаліны“—Рыгору. Па

М. Гарэцкаму гэта ня тыповы рабочы; гэткіх рабочых, нібы, у Беларусі ня было: беласкія раборучыя былі ў той час (гэта ў 1913-14 г. г.) цёмнымі, несьвядомымі, забітымі. Вось дык дагаварыўся М. Гарэцкі. Скажу сьмела, што ён у такім разе зусім ня ведае беларускіх рабочых, якія да рэволюцыі 1917 г. складалі сабой авангард у політычным руху. Беларускія рабочыя па сваёй політычнай сьвядомасьці ішлі многа наперадзе ад рабочых фабрычных цэнтраў Расіі. Дазьвольце мне знаць гэта, як рабочаму, што вынес сярод беларускіх рабочых розных беларускіх гарадоў і мястэчак пяць год працы. Рыгор—тыповы беларускі перадавік-рабочы 1913-14 г. г. А бачыць ваду ў асобах роману таму, што яны аднакава гавораць, памойму недарэчнасьць. Агульнасьць мовы і сказаў заўсёды зьяўляецца ў пераважнай большасьці людзей данай нацыі, данага стану і данага ўзроўню сьвядомасьці, якія гавораць данай мовай. Толькі людзі з ненормальнасьцямі іначай, асаблівей ад іншых гавораць. І памойму, галоўная адзнака кожнага гэроя складаецца ў яго ўнутраным складзе—настроі, сьветапоглядзе, імкненьнях ды інш.—і ў яго надворным выглядзе. А гэта ў маім романе, калі і не дасканала, то большменш добра выканана.

М. Гарэцкі. На заўвагу т. Дубоўкі скажу, што аб творчасьці апошніх гадоў я ня мог сказаць болей дзеля каротkасьці данага мне часу.

На запытаньне т. Пушчы скажу, што дробна-буржуазныя настроі часам яшчэ адбіваюцца на творчасьці ўсіх нас патроху, бо ня можам мы адразу перарадзіцца і выяўляць 100%-ную пролетарскую ідэолёгію. Але мы ў значнай меры гарантаваны ад пашырэньня такіх твораў, бо ў БССР няма буржуазіі, якая-б чытала пабеларуску, і няма таго выдавецтва, якое-б друкавала іх.

На заўвагу т. Жылуновіча, што мой даклад быў няўдалай лекцыяй політграматы, ад якой рабілася яму сорамна, нічога не магу сказаць, бо т. Жылуновіч не паказаў на фактах, у чым была гэтая няўдаласьць.

На яго заўвагу, што я нават адвяргаў „самога“ Плеханава, скажу, што або т. Жылуновіч не дачуў, або я ня зусім дакладна сформуляваў сваю думку, або тут проста нейкае непаразуменьне. Аб Плеханаве я сказаў у сувязі з тым мес-

цам у дакладзе проф. Пятуховіча, дзе гаварылася аб анты-эстэтызьме твораў Багушэвіча. Я сказаў, што можна *сьледаваць* Плеханаву і пры разглядзе з боку мастацкасьці некаторых нашых сучасных твораў, але ўсё-ж такі можам знаходзіць пры гэтым мастацкае значэньне гэтых твораў *для нашага часу.* Магчыма, што непаразуменьне стварылася дзеля няўдалай конструкцыі маёй фразы. Меў я на ўвазе „Песьні працы і змаганьня“ Ц. Гартнага, „Буралом“ З. Бядулі-Ясакара і некаторыя творы маладзейшых поэтаў і пісьменьнікаў.

На другую заўвагу т. Жылуновіча скажу, што я не хацеў ні „бараніць“ нашаніўцаў, ні „выкрэсьліваць“ іх з гісторыі літаратуры. Я казаў тое, што лічыў патрэбным сказаць, каб зразумець нацыянал-адраджанізм і яго сувязь з пасьлякастрычнікавым пэрыодам. Канец свайго дакладу я скамечыў таму, што не разьлічыў часу, бо зазвычай кажу вельмі хутка, а тут казаў павольна, па просьбе стэнографістак. Таму я і не пасьпеў сказаць пра „маладзейшых“, столькі, колькі сказалася пра „старэйшых“.

На заўвагу т. Жылуновіча, што пакрыўдзіў Рыгора Нязвычнага з роману „Сокі Цаліны“ ізноў скажу, што Цішка Гартны, як мне здаецца, не дае ў романе мастацкіх тыпізацый, а сьпісвае з натуры; і калі натура тыповая, тады выходзіць добра, а не—дык і не. У романе бязумоўна ёсьць лішнія асобы і няма вельмі патрэбных асоб.

Вазьнясенскі. Я адкажу сваім опонэнтам у парадку іх выступленьняў. Я адзначыў у сваім дакладзе, што выстаўлены мною тэзіс я мог-бы зацьвердзіць прыкладамі з творчасьці ня толькі паказаных мною аўтараў—Янкі Купалы і Максіма Багдановіча, але таксама і іншых прадстаўнікоў найноўшай беларускай літаратуры: Ц. Гартнага. М. Чарота і інш. Я не рабіў гэтага дзеля браку часу, я не паказаў усіх фактычных даных нават з названых двох пісьменьнікаў; узятая мною тэма вельмі шырокая па сваім абхваце і зьмесьце.

Маё паказаньне ў дакладзе на тое, што найноўшая беларуская літаратура знаходзіцца ў шчасьлівым стане, выклікала пярэчаньні з боку Дубоўкі і Чаржынскага, якія ўбачылі ў гэтым якоесь паніжэньне беларускай літаратуры. Гэта

асноўваецца на неразуменьні таго, што я сказаў у сваім дакладзе. Я адзначыў наступнае. У сучасны момант робіцца ўсё больш і больш усьвядомленай думка, што тая канцовая задача, якую ставіла сабе навука аб літаратуры, ня выканана; гісторыі літаратуры пабудаваць не ўдалося. Выходзячы з гэтага, нашая навука імкнецца радыкальна перабудаваць свае мэтодолёгічныя позыцыі і пабудаваць сваё веданьне на падставе позытыўных фактычных даных. Гэта ёй удаецца, і яна паступова набліжаецца да таго, каб стаць запраўднай навукай. Найноўшая беларуская літаратура да гэтага часу амаль што ня была прадметам навуковага вывучэньня з боку дасьледчыкаў, і цяперака, становячыся об'ектам навуковага дасьледаваньня ў той уласна момант, калі наша навука запраўды становіцца навукай, яна натуральна знаходзіцца ў больш шчасьлівым стане, чым літаратуры іншых народаў, што былі прадметам няўдалага вывучэньня гісторыі літаратуры. У сэнсе мастацкім найноўшая беларуская літаратура шчасьлівая ў тых адносінах, што яна можа ўлічыць мастацкі досьлед іншых літаратур і найсьці па тым уласна шляху разьвіцьця, які зьяўляецца найбольш жыцьцяздольным. У абодвых выпадках нічога паніжаючага стан беларускай літаратуры няма.

На пярэчаньні, што я штучна накладваў сваю мэтодолёгічную схэму на творчасьць беларускіх пісьменьнікаў, дзякуючы чаму беларуская літаратура здалася чымсь штучным, што скінулася проста з неба, я павінен сказаць наступнае. Я ўласна будаваў свой даклад, як і наогул будую сваё вывучэньне літаратуры, такім чынам, што імкнуся тыя або іншыя тэорэтычныя тэзы вывесьці з аналізу твораў пісьменьнікаў. Так я рабіў і ў даным выпадку. Тое, што я даў у сваім дакладзе, складае першы момант навукі аб літаратуры, а ўласна, эстэтычны аналіз твораў. Але само сабой зразумела, неабходна і гісторыка-социолёгічнае тлумачэньне вынікаў гэтай аналізуючай працы, неабходна тое, што Плеханаў зваў перакладам твору з мовы мастацтва на мову социолёгіі. Тады будзе зусім відавочна, што найноўшая беларуская літаратура знаходзіцца ў цеснай сувязі з адпаведным социяльна-гістарычным атачэньнем. Гэтага другога пытаньня я не датыкаўся, бо аб ім гаварылі іншыя дакладчыкі; я з прычыны недахвату часу спыніцца на ім ня мог.

Пятуховіч. (Заключнее слова). Перш чым адказваць сваім опонэнтам, я хацеў-бы зра-біць некалькі ўваг па поваду іншых дакладаў.

У дакладзе М. І. Гарэцкага маюцца некаторыя палажэньні, з якімі я не магу згадзіцца. Паважаны дакладчык зазначае, што нашаніўская літаратура мела сялянскі характар, але вядома, што ў нашаніўскі пэрыод была досыць выразнай і плынь шляхецкая (Ядвігнін Ш., Каганец і інш.). Спрэчнай прадстаўляецца мне і думка т. Гарэцкага аб тым, што „малодшыя пісьменьнікі перагналі старэйшых у адносінах формы". І ў старэйшых пісьменьнікаў маюцца вялікія дасягненьні ў галіне формальна-мастацкай („Сымон Музыка" Якуба Коласа, „Урачыстасьць" Цішкі Гартнага і інш.). Не магу згадзіцца я і з ацэнкай, якую робіць дакладчык вобразу Рыгора Нязвычнага ў романе „Сокі цаліны"; нам прадстаўляецца, што рэволюцыйная сьвядомасьць, пафос барацьбы, упартасьць у барацьбе— гэтыя і ім падобныя істотныя рысы Рыгора Нязвычнага зьяўляюцца тыповымі рысамі рабочага тэй пары.

Па поваду вельмі цікавага і грунтоўнага дакладу проф. А. М. Вазьнясенскага ў мяне ўзьнікла адно запытаньне. Шаноўны дакладчык констатуе элемэнты клясычнага і романтычнага стылю ў беларускай літаратуры, але самыя паняцьці „клясычны і романтычны" стыль зьяўляюцца тут настолькі шырокімі, што пад іх можна падвесьці творчасьць любога поэты і пісьменьніка; яшчэ ў старажытнасьці зазначалася, што мастацтва гэта ёсьць „homo additus naturae" (чалавек даданы да прыроды); у творчасьці кожнага мастака ў тэй ці іншай пропорцыі ёсьць элемэнты об'ектыўныя і суб'ектыўныя, значыць ёсьць элемэнты клясычнага і романтычнага стылю. Узяты дакладчыкам тэзіс, вынікаючы з самай псыхолёгіі творчасьці, такім чынам, сьцірае індывідуальнасьць мастака і мала апраўдвае марудны і падрабязговы аналіз: сынтэтычны вывад зьяўляецца тут ужо наперад дадзеным палажэньнем.

Цяпер пераходжу да адказаў маім опонэнтам.

Папершае, *увагі Язэпа Пушчы.*

1) Павінен прызнаць, што ў перадачы цытаты з вершу

„Ворагам Беларушчыны“ Янкі Купалы мной дапушчана запраўды памылка: слова „знаньню“ заменена словам „братэрству“. Памылка тлумачыцца тым, што ўвесь даклад рабіўся мной вусна і цытата прыводзілася па памяці; пры такіх умовах лёгка магла ўтварыцца асоцыяцыя паміж заклікам Купалы і лёзунгам францускай рэволюцыі—„свабода, роўнасць, братэрства“, адкуль Купалай узяты толькі два першыя паняцьці, а трэцяе заменена паняцьцем „знаньне“.

2) Гаворачы аб статычнасьці вясковай і дынамічнасьці гарадзкой творчасьці, я меў на ўвазе сюжэтную композыцыю: у першым выпадку пераважваюць статычныя, а ў другім выпадку дынамічныя (выбуховыя) мотывы. Каб пераканацца ў справядлівасьці гэтага агульна-вядомага палажэньня, досыць параўнаць, напрыклад, творчасьць сучасных нова-сялянскіх і пролетарскіх поэтаў.

3) Адноса „Ўзвышша“ мною літаральна сказана наступнае: „Узвышша“, як *самостойная літаратурная організацыя*, да гэтай пары пакуль што ня выявіла свайго твару“. Запраўды, „Узвышша“ ня выдала яшчэ ніводнага зборніка, альманаха або чаго-небудзь падобнага; пляцформа гэтага аб‘яднаньня мне невядома; некаторыя з сяброў „Узвышша“ праўда, маюць выдатныя творы, але гэтыя творы напісаны імі да ўступленьня ў новае аб‘яднаньне і не характарызуюць напрамку астатняга. Паколькі я ў сваім агульным дакладзе спыняўся выключна на абмалёўцы шырокіх плыняй у беларускай літаратуры, я ня меў мажлівасьці абхапіць усіх поэтаў і пісьменьнікаў.

4) У творчасьці Александровіча няма „абурэньня супроць старых дасягненьняў мастацтва“, як няма і „заумнага языка“, але дарэмна Язэп Пушча лічыць, што гэтымі адзнакамі вычэрпваецца сутнасьць футурызму, як шырокай літаратурнай плыні: „заумная“ мова, напрыклад, характэрна толькі для футурызму раньняга пэрыоду (Хлебнікаў, Кручаных). Футурызм мае і іншыя істотныя адзнакі: імкненьне адбіць дынаміку сучаснага гораду, грубыя мэтафоры, пабудаваныя на далёкіх асоцыяцыях, гіпэрболічнасьць, словатворчасьць і г. д. Гэтыя адзнакі мы знаходзім і ў творчасьці Александровіча; ён пераважна пясьняр гораду, які імкнецца адбіць яго рытм, яму ўласьцівы мэтафоры, пабудаваныя на далё-

кіх асоцыяцыях („Блудніцай бегае сонца ля сьцен“); ён у гіпэрболічным запале самому сонцу гавора „лепш ня сунься са мной на нажы“ і г. д. Але, улічваючы гэткія некаторыя налёты футурызму ў поэзіі Александровіча, я далёкі ад таго, каб прызнаваць яго тыповым прадстаўніком данага напрамку: я толькі гаварыў аб некаторых элемэнтах футурызму ў творчасьці беларускага поэты.

Што да імажынізму, то гаворачы аб яго адбітках у беларускай поэзіі, я меў на ўвазе, галоўным чынам, творчасьць самога опонэнта. І Язэп Пушча лічыць, што галоўная сутнасьць поэзіі — вобраз; адсюль у яго ўтвараецца пагоня за вобразам, а гэтая пагоня ў сваю чаргу цягне за сабою штучнасьць і хадульнасьць вобразаў—адзнакі, якія асабліва выяўляюцца ў зборніку „Раніца рыкае“, дзе ўжо самая назва ґаворыць за сябе.

5) Нездаволены прогнозам аб тым, што беларуская літаратура зойме сваё пачэснае месьца ў сусьветнай літаратуры, імкнучыся давесьці думку аб сусьветным значэньні яе ў цяперашнім, опонэнт сам упадае ў лёгічную супярэчнасьць: спачатку ён гаворыць: што „беларуская літаратура ўжо ўвайшла ў склад сусьветнай літаратуры“, а потым зараз-жа сам ён скардзіцца „толькі на адну бяду“, што „сусьветная літаратура яе ня ведае па розных прычынах“.

Далей *увагі тав. Дубоўкі.*

1) Адносна „Ўзвышша“ я ўжо адказаў Язэпу Пушчы; тут ня буду паўтарацца.

2) Другая ўвага т. Дубоўкі, зьвернутая да ўсіх дакладчыкаў і, значыць, да мяне, у адносінах да майго дакладу прадстаўляе сабою непаразуменьне. Сябра Дубоўка гавора: „ніхто (з дакладчыкаў) не адзначыў што беларуская літаратура ў сваім разьвіцьці і адраджэньні пераважна грунтавалася на беларускай народнай творчасьці“. Паміж тым я ў сваім дакладзе констатаваў шырокую плынь мастацкага фольклёрызму ў беларускай літаратуры; у сваіх вывадах я яшчэ раз падкрэсьліў органічнасьць роста нашай літаратуры, зазначыўшы, што яна ўзьнікла і пашыралася на карэньнях народнай творчасьці.

Потым ідуць *увагі т. Чаржынскага.*

Прыёмы полемікі т. Чаржынскага мне добра вядомы; і

трэба аддаць яму справядлівасьць, ён застаўся пэўным сабе— і на гэты раз сваe прыёмы вытрымаў да канца.

1. Папершае, опонэнт скажае мае думкі і прыпісвае мне тое, чаго я зусім не гаварыў, менавіта:

а) Я ўвесь час гаварыў толькі аб некаторых слабых водгуках клясыцызму ў беларускай літаратуры, гаварыў аб сантымэнтальна-утопічным і романтычным *народніцтве* ў ёй.

Паміж тым, т. Чаржынскі ўвесь час імкнецца „разьбіць“ нібыта маё палажэньне аб клясыцызьме, сантымэнталізьме і романтызьме, як сталых напрамках у беларускай літаратуры,— прыпісваецца мне тое, што я сам абвяргаю ў сваім дакладзе, зазначаючы, што вышэйпамянёныя напрамкі не маглі выявіцца на беларускай глебе і мы толькі маем слабыя і далёкія іх водгукі.

б) Опонэнт зазначае: „на падставе аднаго твору („Энэіда на выварат“) гаварыць аб зьяўленьні клясыцызму на беларускім грунце ня вярта“. Я-ж гаварыў аб водгуках клясыцызму на падставе не аднаго, а двух твораў („Энэіда на выварат“ і „Тарас на парнасе“).

в) Не згаджаючыся з маёй характарыстыкай Дуніна-Марцінкевіча, тав. Чаржынскі з пафосам ставіць пытаньне: якая рыса ў „Пінскай шляхце“ ёсьць, якая-б уласна сьведчыла, што Дунін-Марцінкевіч сантымэнталісты?“ Паміж тым я ў сваім дакладзе выразна падкрэсьліў дваістасьць беларускага пісьменьніка, адзначыў, што рысы сантымэнтальна-утопічнага народніцтва ўласьцівы толькі ранейшым творам— вершаваным апавяданьням Дуніна-Марцінкевіча, а яго драматычныя творы пазьнейшага часу („Пінская шляхта“, „Залёты“) больш вытраманы ўжо ў рэалістычнай манеры.

г) Мой опонэнт прадоўжвае далей: „узяць „Гапона“. Ён, як сказаў проф. Пятуховіч, ёсьць продукт дваровай культуры. А што ўрэшце ў „Гапона“ ёсьць дваровага?“—Папершае не адзін „Гапон“, а ўся творчасьць Дуніна-Марцінкевіча ў цэлым характарызавалася мной, як выразны продукт дваровай культуры. Падругое,—і самае галоўнае—і сам опонэнт, упадаючы ў супярэчнасьць з сабой констатуе ў „Гапоне“ галоўную адзнаку дваровай культуры—шляхецкую ідэолёгію аўтара; тав. Чаржынскі зазначае: „Я ў ім („Гапоне“) дваровага нічога ня бычу, *апрача дробнага шляхецтва самога аўтара*“.

Вось гэтае шляхецтва аўтара і ёсьць галоўная адзнака дваровай культуры; адсюль ужо вынікаюць усе іншыя рысы творчасьці Дуніна-Марцінкевіча: ідэалізацыя панства, узаемаадносіны яго з сялянствам і г. д., што зазначалася мною ў дакладзе.

д) Опонэнт далей прыпісвае мне, нібыта я „стаўлю Багушэвіча ў аналёгію з Дантэ“. Ніякай аналёгіі па сутнасьці паміж творчасьцю таго і другога поэты мною не праводзілася і не магло быць праведзена. Я толькі выказаў думку аб тым, што беларускі поэта, выкарыстоўваючы агульна-людзкія сюжэты, падпарадквае іх сваёй народніцкай тэматыцы: у якасьці прыкладу я прывёў „баляду“ Багушэвіча, якая грунтуецца на фаўстаўскай легендзе аб продажы чалавекам сваёй душы д‘яблу, і твор „Быў у чыстцы“, дзе выкарыстаны каталіцкія рэлігійныя прадстаўленьні аб замагільным сьвеце, на якіх грунтуецца даўгая літаратура „відзеньняў“ і ў сваю чаргу сусьветны твор Дантэ. Мной зазначана было, што, беручы гэтыя агульна-людзкія сюжэты, беларускі поэта дае ім орыгінальную, народніцка-соцыяльную трактоўку.

Так мой опонэнт заўжды ўтварае ад сябе які-небудзь „тэзіс“, прыпісвае яго мне і потым ужо „разьбівае“—позыцыя надзвычайна выгодная! Але такія прыёмы полемікі я застаўляю на сумленьні тав. Чаржынскага.

2. Тав. Чаржынскі далей ставіць мне ў віну нібыта апушчэньне таго, што фактычна ў мяне маецца. Опонэнт зазначае: „момант выяўленьня літаратурных прыёмаў, стылю, мне здаецца проф. Пятуховіч у сваім рэфэраце мінуў“. Паміж тым я гаварыў аб формальна-мастацкіх напрамках беларускай літаратуры эпохі прыгоннай гаспадаркі, гаварыў аб поэтыцы Багущэвіча, мастацкіх плынях у найноўшай літаратуры (рэалізм, сымболізм, драма настрою, імажынізм, футурызм і інш.). Праўда, у цэнтры маёй увагі стаяла тэматыка, але і форма ўсё-ж такі ня была мной абмінута, як тое цьвердзіць тав. Чаржынскі.

3. Тав. Чаржынскі, робячы абвяржэньні супроць маёй спробы зьвязаць літаратурны процэс на Беларусі з агульным літаратурным процэсам, ня лічыць патрэбным разабраць мае фактычныя довады, якімі я ўвесь час падмацоўваю сваю спробу. Так, напрыклад, гаворачы аб водгуках клясыцызму

ў беларускай літаратуры, я ўказваю на элемэнты антычнай мітолёгіі ў творах, якія прадстаўляюць сабою адбітак гэтых водгукаў; характарызуючы далей Дуніна-Марцінкевіча, як прадстаўніка сантымэнтальна-утопічнага народніцтва, я ўказваю на цэлы шэраг рысаў, якія збліжаюць творчасьць беларускага пісьменьніка з творчасьцю сантымэнталістаў (гіпэртрофія сэрца, пачуцьцёвасьць, даходзячая да сьлязьлівасьці, оптымізм на рэлігійнай падставе, прыём ігры контрастаў, надыдактызм і г. д.); таксама гаворачы аб романтычным народніцтве, я прыводжу фактычныя довады, якія пацьвярджаюць збліжэньне мною ў некаторых адносінах прадстаўнікоў гэтага напрамку з романтызмам (романтычны нацыяналізм, які выявіўся ў замілаваньні да народнай творчасьці, мовы і г. д.). Ніводнага з гэтых довадаў мой опонэнт не абвяргае, бо іх нельга абвергнуць—яны грунтуюцца на фактах, ясных для кожнага бесстароньняга дасьледчыка. Досыць сказаць, напрыклад, што сантымэнталізм у творчасьці Дуніна-Марцнікевіча быў падкрэсьлены і проф. Голомбэкам у яго дакладзе; Варшаўскі профэсар і я, зусім, зразумела, незалежна адзін ад другога, прышлі да аднолькавых вывадаў. І толькі тав. Чаржынскі ня хоча прызнаваць гэтых вывадаў. Чаму так? Тав. Чаржынскаму хочацца адстаяць самастойнасьць і поўную орыгінальнасьць беларускай літаратуры; запраўды, клясыцызм, сантымэнталізм і романтызм былі ў заходня-эўропейскіх і іншых славянскіх літаратурах, а па думцы тав. Чаржынскага „гісторыя беларускай літаратуры разьвівалася зусім іншым шляхам“; такім чынам опонэнтам уваскрашаецца свайго роду старая славянафільская тэндэнцыя. І ў запале свайго „кваснага патрыотызму“, працяты імкненьнем давесьці, што беларуская літаратура не падобна да другіх літаратур, тав. Чаржынскі дагаварваецца да парадоксу. Полемізуючы ня толькі са мною, але і з акадэмікам Карскім, проф. Ігнатоўскім, крытыкам Гарэцкім па пытаньні аб настроях пэсымізму ў беларускай літаратуры, адмаўляючы гэтыя настроі, тав. Чаржынскі з вялікім захапленьнем зазначае: „я маю сьмеласьць сказаць, што погляд быццам пэсымізм прасякае ўсю нашаніўскую літаратуру ёсьць погляд традыцыйны, але тым ня менш памылковы. Я скажу, што ў пачатку XX-га сталецьця ў Эўропе ня было больш оптымістычнай літаратуры, як літа-

ратура беларуская“. Для ўсякага, хоць колькі-небудзь знаёмага з беларускай літаратурай, парадоксальнасьць гэтага палажэньня настолькі відавочна, што спыняцца на яго абвяржэньні—гэта значыць толькі дарма марнаваць час.

Апроч парадоксаў, у сваёй полеміцы тав. Чаржынскі высоўвае і іншыя няправільныя палажэньні. Па яго думцы спрэчным і няясным зьяўляецца ня толькі тэрмін „романтызм“, але нават і „сантымэнталізм“. Пасьля прац Весялоўскага аб Жукоўскім, Сіпоўскага аб Карамзіне, Кажэўнікава аб філёзофскіх асновах гэтага напрамку і інш., тэрмін „сантымэнталізм“ можа лічыць спрэчным толькі аматар спрэчак у імя самых спрэчак, аматар розных софізмаў.

Да рэчы сказаць, што і гэты астатні прыём утварэньня софізмаў таксама не абмінуты тав. Чаржынскім. Опонэнт робіць „адкрыцьце“—імкнецца давесьці, што „частка раўняецца цэламу“.

Ім указваецца, што Марцінкевіч у сваёй творчасьці „скарыстоўвае вельмі шмат беларускага фольклёру“. І мной таксама была зазначана плынь мастацкага фольклёрызму ў творах Дуніна-Марцінкевіча; указаньне тав. Чаржынскага па сутнасьці правільнае, хоць, праўда, ён і тут ня можа абыйсьціся без уласьцівай яму гіпэрболічнасьці; ім зазначаецца, што „Гапон“ і „Вечарніцы“ і інш. гэта ёсьць творы напалову склееныя з народнай творчасьці“; запраўды-ж народная творчасьць займае ў Дуніна-Марцінкевіча значна меншую частку. Але справа ня ў гэтым. Рэч у тым, што з правільнага ў асноўных рысах палажэньня аб плыні мастацкага фольклёрызму ў творчасьці Дуніна-Марцінкевіча опонэнт робіць зусім нечаканы вывад; ім так прадоўжаецца яго думка: „І кажучы аб сантымэнталізьме пісьменьніка, зазначае ён, я мысьлю, што трэба зрабіць вывад і ў гэты бок, а ўласна, што народная творчасьць наша, напрыклад, такая багатая творчасьць, якая скарыстана Марцінкевічам, носіць рысы сантымэнталізму“. Я, грэшны чалавек, усё-ж такі прытрымліваюся старой аксіомы, што „цэлае больш сваёй часткі“. І ў даным выпадку цэлае—творчасьць Дуніна-Марцінкевіча,—можа мець такія элемэнты, якіх ня мае адзін з інгрыдыентаў гэтага цэлага.

Нарэшце, *увагі тав. Жылуновіча.*

1) Тав. Жылуновіч зазначае, што я нібыта даводжу адсутнасьць сантымэнталізму ў Марцінкевіча. Наадварот, я даводзіў прысутнасьць некаторых рысаў сантымэнталізму ў беларускага пісьменьніка. Тут нейкае непаразуменьне.

2) Далей тав. Жылуновіч прыпісвае мне думку аб тым, што творчасьць Багушэвіча зьяўляецца ўбогай. Наадварот, я вельмі высака стаўлю Багушэвіча і ў ідэёвых і формальна-мастацкіх адносінах. Аб гэтым я гаварыў у дакладзе, аб гэтым сьведчыць і мой надрукаваны ў працах БДУ досьлед аб творчасьці Багушэвіча.

3) Не магу я згадзіцца з думкай тав. Жылуновіча аб тым, што пэрыод нашаніўскага рэнэсансу, як ён зазначае, супадае з 1910-1911 г. г. Вытокі гэтага рэнэсансу пачынаюцца выразна ўжо з рэволюцыі 1905 году, калі ўтвараецца нашаніўская ідэолёгія і калі пачынаецца творчасьць выдатных прадстаўнікоў зазначанага пэрыоду (Янка Купала, Якуб Колас, Цётка і інш.).

4) Тав. Жылуновіч мінорнасьць таноў у творчасьці Алеся Гаруна і Цёткі імкнецца растлумачыць фактарам біолёгічным (сухоты); не адмаўляючы значэньня і гэтага фактару, я ўсё-ж такі на першы плян высоўваю фактар соцыяльна-экономічны.

Абагульняючы ўсё вышэйсказанае, я магу зазначыць наступнае.

Амаль што ўсе абвяржэньні накіраваны былі супроць прыватных палажэньняў майго дакладу. Галоўная-ж мэта дакладу заключалася ў тым, каб даць соцыолёгічную схэму разьвіцьця новай беларускай літаратуры, паколькі такая схэма яшчэ нікім не дадзена. І гэта соцыолёгічная схэма, пабудаваная мною, засталася непарушанай. Нават тав. Чаржынскі прызнае, што „соцыолёгічны аналіз у сваім дакладзе проф. Пятуховіч праводзіў даволі ўдала“. Вядома ўсім, што соцыолёгічны мэтод прыводзіць да найбольш грунтоўных і об'ектыўных вывадаў.

Замоцін (старшыня). Паважаныя таварышы! З праслуханых дакладаў па літаратуры і дапаўненьняў і заўваг да іх, якія былі зроблены ў парадку дыскусіі мы, маючы разыходжаньне ў некаторых паасобных дэталях, можам аднак зрабіць агульны вывад аб высокай культурнай вартасьці беларускай мастацкай літаратуры. Гэтая вартасьць павінна

быць, мне здаецца, устаноўлена ў двух адносінах: у мясцовым беларускім, паколькі беларуская мастацкая літаратура зьяўляецца фактарам уласна беларускай культуры, беларускага нацыянальнага адраджэньня і разьвіцьця, і ў адносінах агульна-людзкіх, паколькі яна ўносіць свой скарб, зьмест у агульна-людзкую культуру, і асабліва паколькі яна служыць мэтам социяльнага абнаўленьня жыцьця.

Гэтую культурную вартасьць беларускай мастацкай літаратуры прызнаюць ня толькі беларусы, але і не беларусы. Мы, што прыехалі сюды для навуковай працы, мы, што выхаваліся на ўзорах расійскай і заходня-эўропейскай літаратур, мы аднак добра ведаем, што беларуская мастацкая літаратура павінна ўступіць у кола эўропейскіх літаратур і наогул літаратур іншых культурных старон, дзе яна бясспрэчна знойдзе сабе ганаровае месца.

Але, паважаныя таварышы, гэтая культурная вартасьць, якую мы зараз яшчэ і яшчэ раз констатуем, гэтая вартасьць ня толькі нас радуе,—яна нас і абавязвае.

Яна абавязвае нас да пляновага навуковага вывучэньня свайго матар'ялу. Я гавару зараз галоўным чынам датычна першых двох дакладаў—проф. Пятуховіча і Гарэцкага. Абодва даклады прадстаўлялі ў агульных рысах накіданую соцыолёгічную схэму агляду беларускай мастацкай літаратуры XIX-XX сталецьцяў.

Я не пярэчу па сутнасьці супроць соцыолёгічнага мэтоду, які ў іх ужыты. Я сам у сваіх навуковых працах карыстаюся гэтым мэтодам. Я не пярэчу па сутнасьці і супроць зьместу самых дакладаў. Але я лічу патрэбным сказаць аб тым уражаньні, якое на мяне зрабілі гэтыя даклады і—больш дакладна—сказаць аб тых думках, якія яны ў мяне выклікалі.

Слухаючы гэтыя даклады, я зразумеў, што і соцыолёгічны мэтод, мэтод даволі чытэльны і, здавалася-б, зусім даступны ў сэнсе свайго ажыцьцяўленьня, прыкладваецца да беларускай літаратуры ня зусім угрунтавана, без належна падрыхтаванага навуковага апарату, без выстарчаючага аналізу ўласна літаратурнага матар'ялу.

Соцыолёгічны мэтод вельмі добра можа паказаць сувязь данага твору з эпохай, ён можа выявіць тэматыку аўтара

на падставе даных соцыяльна-культурных адносін, ён можа паказаць ідэолёгію аўтара з сувязі яго з соцыяльным атачэньнем,—але ўсё гэта ён можа зрабіць пасьля папярэдняга фактычнага падбору і вывучэньня матар'ялаў эпохі, літаратурных кірункаў, твораў таго ці іншага аўтара. Мала таго, галіна ўласна мастацка-літаратурнай тэхнікі, літаратурнай манеры, стылю, ня зразу паддаецца соцыолёгічнаму тлумачэньню, а толькі пасьля папярэдняга формальна-мастацкага аналізу.

Я, адным словам, хачу сказаць, што соцыолёгічны мэтод у поўным навуковым абхваце і такім шырокім прылажэньні, як гэта мы наглядалі ў праслуханых дакладах, ня можа даць моцных вывадаў для вывучэньня беларускай літаратуры. Такі шырокі абхват годны, быць можа, для агульна-даступных нарысаў літаратуры або для школьных падручнікаў—і толькі.

Я лічу, што для вывучэньня беларускае літаратуры соцыолёгічным мэтодам неабходна вялікая папярэдняя праца і затым я прапанаваў-бы ў рэзолюцыйную частку нашае дыскусіі па літаратурных дакладах унесьці такія пункты:

1) неабходнасьць зьбіраньня і філёлёгічнага вывучэньня тэксту твораў беларускай мастацкай літаратуры,

2) неабходнасьць формальна-мастацкага дасьледаваньня твораў беларускай мастацкай літаратуры,

3) неабходнасьць монографічнага вывучэньня беларускай літаратуры па эпохах, кірунках і паасобных пісьменьніках, пачынаючы з старой літаратуры і народнай творчасьці.

Разам з тым, констатуючы высокае культурнае значэньне беларускай мастацкай літаратуры, нельга не зьвярнуць увагі на тое, што гэта яе культурнае значэньне павінна да некаторай ступені быць корэктывам і ў рэформе беларускага правапісу. Беларуская мастацкая літаратура, у якой мастацкае слова зварочвае на сябе асаблівую ўвагу сваёю ўвязкаю з жывой мовай, сваім багацьцем карцінных і эмоцыянальных стылёвых сродкаў, сьведчыць аб тым, што беларуская мова, захавала жывую сувязь ня толькі з народнаю моваю і народна-поэтычным стылем, але і з тым моўным бокам (у фонэтыцы, морфолёгіі, лексыцы, фразэолёгіі), які ў значнай ступені страчаны іншымі славянскімі мовамі. Гэта

абавязвае ў рэформе правапісу ўстрымліваецца ад крайняга, скрознага, так кажучы, правядзеньня фонэтычнага прынцыпу, бо пры надмерным скарыстаньні гэтага прынцыпу беларуская мастацкая мова страціла-б да некаторай ступені свой гістарычны твар, якім трэба даражыць таксама, як вялікай культурнай вартасьцю.

Цяпер прапаную для апрацаваньня агульнай рэзолюцыі па заслуханых дакладах і спрэчках выбраць падкамісію з 5 асоб. Маецца прапанова ў склад гэтай падкамісіі ўвесьці наступных членаў Камісіі: 1) Замоціна, 2) Пятуховіча, 3) Жылуновіча, 4) Чаржынскага і 5) Бабарэку. (Прымаецца).

Заключнае пасяджэньне Акадэмічнай Конфэрэнцыі і рэзолюцыі.

Старшыня (Ігнатоўскі). Дазвольце, паважаныя таварышы, адчыніць наша апошняе пасяджэньне Конфэрэнцыі.

У нас у програме Конфэрэнцыі значыцца даклад т. Цьвяткова на тэму: „Некалькі слоў аб беларускім элемэнце ў польскай лексыцы“. Аднак, Прэзыдыум, выходзячы з таго, што даклад т. Цьвяткова зьяўляецца інформацыйным, а таксама з таго, што праца над асноўнымі пытаньнямі Конфэрэнцыі надта зацягнулася, не знаходзіць магчымым паставіць гэты даклад і просіць Конфэрэнцыю зьняць яго. Гэты даклад без зачытваньня яго тут можа быць надрукаваны ў тым зборніку прац Конфэрэнцыі, які мы будзем выдаваць.

Ці будуць з боку Конфэрэнцыі пярэчаньні па гэтым пытаньні? (Няма).

Цяпер пяройдзем да справаздач Камісій аб працы апошніх. Пачнем з Літаратурнай Камісіі. Слова мае старшыня Літаратурнае Камісіі проф. Замоцін.

Замоцін. Паважаныя таварышы! На пленарных пасяджэньнях Конфэрэнцыі былі заслуханы 4 даклады аб беларускай літаратуры—проф. Пятуховіча, Максіма Іванавіча Гарэцкага, доц. Вазьнясенскага і докт. Голомбэка. Гэтыя даклады сягодня надрукаваны (у скарочаным выглядзе) „Савецкай Беларусі“. Дыскусію па гэтых дакладах, якая была прысьвечана галоўным чынам агульным аглядам беларускае літаратуры, яе схэматызацыі, пэрыодызацыі і ацэнцы ў агульных рысах па гэтых дакладах, мелася на ўвазе весьці ў Літаратурнай Камісіі. Літаратурная Камісія, старшыняваньне ў якой было даручана мне, мела тры пасяджэньні. На гэтых пасяджэньнях Літаратурнай Камісіі ў дыскусіі па заслуханых дакладах прынялі ўдзел наступныя члены Конфэрэнцыі і ўдзельнікі яе: Жылуновіч, Чаржынскі, Мялешка, Замоцін, Дубоўка, Плашчынскі і Пятуховіч. У прамовах паказаных асоб выказаны быў шэраг заўваг адносна агляду беларускае літаратуры, адносна пабудовы яе схэмы, яе пэрыодызацыі,

ацэнкі асобных кірункаў і асобных пісьменьнікаў. Між іншым выказваліся некаторыя заўвагі таксама і адносна далейшага вывучэньня беларускае літаратуры. Пасьля прамоў асобных опонэнтаў былі сказаны заключныя словы аўтарамі даклядаў, г. зн. проф. Пятуховічам, Гарэцкім і Вазьнясенскім. На жаль, докт. Голомбэк адсутнічаў на другім пасяджэньні, і такім чынам выказвацца па яго каштоўным дакладу, а таксама заслухаць заключнае слова яго нам не давялося. Потым Літаратурная Камісія выдзяліла з свайго складу падкамісію з 5 асоб для апрацаваньня рэзолюцыі. Проект запрапанаванай падкамісіяй рэзолюцыі абгаворваўся ў Літаратурнай Камісіі і прыняты за выключэньнем аднаго члена, які не згадзіўся з першымі двума пунктамі (т. Дубоўка), у наступным відзе:

1. Заслуханыя на пленарных пасяджэньнях даклады па беларускай літаратуры і абгаварэньне гэтых дакладаў у Літаратурнай Камісіі ўсебакова асьвятлілі беларускую мастацкую літаратуру ў адносінах яе высокай культурнай каштоўнасьці як для беларускай, так і для агульналюдзкай культуры.

2. Гэтае агульналюдзкае значэньне беларускай мастацкай літаратуры асабліва пачынае ўсьведамляцца цяпер, калі яна вышла ўжо з рамак чыста нацыянальных і атрымоўвае права на ўвагу да сябе і на сваё распаўсюджаньне за межамі Белурусі аднолькава з іншымі эўропейскімі літаратурамі.

3. Адмечаны рост, разьвіцьцё і значэньне беларуская мастацкая літаратура набыла, дзякуючы Кастрычнікавай рэволюцыі, якая дала шырокія магчымасьці дзяржаўнага, эконо-мічна-політычнага і нацыянальнага будаўніцтва Савецкай Беларусі.

4. Узятая ў сваім цэлым, як культурная каштоўнасьць высокага значэньня, беларуская мастацкая літаратура абавязвае да ўсебаковага і пляновага вывучэньня сваіх матар‘ялаў.

5. Паміж тым ў процэсе дыскусіі па дакладах яшчэ раз з усёй яскравасьцю выясьнілася, што беларуская мастацкая літаратура да цяперашняга часу мала яшчэ закранута ў адносінах навуковага яе дасьледаваньня.

6. Самыя агульныя агляды гісторыі беларускай літаратуры і першыя спробы яе навуковага дасьледаваньня, пры

ўсёй агульнай вытрыманасьці соцыолёгічнага мэтоду, які ў іх выкарыстоўваецца, ня могуць быць здавальняюча ўгрунтаваны з прычыны параўнальна нязначнай папярэдняй навуковай падрыхтоўкі матар'ялу.

7. З прычыны гэтага камісія, як вывад з дыскусіі, лічыць неабходным устанавіць наступныя моманты ў навуковай працы над беларускай літаратурай на бліжэйшы час:

а) Зьбіраньне ўсіх патрэбных для асьвятленьня творчасьці паасобных беларускіх пісьменьнікаў матар'ялаў як уласна літаратурных, гэтак сама і матар'ялаў соцыяльна-культурнага зьместу.

б) Філёгёгічнае абсьледаваньне тэксту літаратурных твораў у мэтах навуковага выданьня іх поўнага збору па паасообных аўтарах.

в) Паступовае і дэтальнае правядзеньне ў адносінах да матар'ялу літаратурных твораў як соцыолёгічнага, гэтак і формальна-мастацкага мэтоду, паколькі апошні зьяўляецца падсобным для пабудовы сталай соцыолёгічнай схэмы гісторыі беларускай літаратуры.

г) Топографічнае вывучэньне паасобных эпох народнай творчасьці як старажытнай, гэтак і новай літаратуры, яе кірункаў і паасобных пісьменьнікаў на падставе папярэдняга філёлёгічнага абсьледваньня данага літаратурнага матар'ялу і дэтальнага дапасаваньня да яго соцыолёгічнага і формальнага мастацкага мэтоду.

8. Дзеля выкананьня гэтых тыпаў навуковай працы неабходна заснаваньне спэцыяльнага навукова-дасьледчага Інстытуту па вывучэньні гісторыі беларускай літаратуры.

Старшыня: Якія ў каго заўвагі?

Чаржынскі. Я прапаную ў п. 1-м: заместа слоў „усебакова высьветлілі" напісаць: „Дакладна констатавалі высокую культурную каштоўнасьць беларускае мастацкае літаратуры".

Цішка Гартны. Я лічу, што ў рэзолюцыі добра сказана, і даклады і спрэчкі добра высьветлілі гэтае пытаньне з боку мастацкай каштоўнасьці беларускае літаратуры, а таму я лічу патрэбным заставіць так, як напісана ў рэзолюцыі.

Старшыня: Галасую; хто за тое, каб заставіць так, як

ёсьць (большасьць). Такім чынам прапанова Чаржынскага адхіляецца.

Слова для дакладу аб працы графічнай Камісіі мае т. Дамброўскі.

Дамброўскі. Камісія па рэформе азбукі мела тры пасяджэньні. Галоўныя тэмы, якія разьбіраліся—гэта літары для азначэньня гукаў *дз* і *дж*, увядзеньне *j* і азначэньне мяккіх зычных. Па гэтых пытаньнях прыняты былі наступныя пастановы:

1) Аб увядзеньні ў азбуку асобных значкоў для афрыкатаў *дз* і *дж*. Для ўсебаковага абмеркаваньня гэтага пытаньня была выдзелена асобная падкамісія, якая ў выніку сваёй працы ўхваліла напісаньне для *дз*—ђ і для *дж*—ћ па ніжэйпаданых мотывах:

а) Літары ђ і ћ зьяўляюцца вельмі лёгкімі для ўсваеньня, простымі па сваёй конструкцыі, розьняцца ад усіх іншых літар беларускага альфабэту і вельмі прыгодныя для скорага пісьма. Маленькія літары вельмі падобны да вялікіх, дзеля чаго зусім палягчаецца іх усваеньне.

б) У друкарнях вельмі лёгка атрымаць літары ђ і ћ шляхам нязначнага відазьмену літар ѣ (перавернутага).

в) На фонэтычную блізасьць *дз* і *дж* ёсьць яснае паказаньне ў першай частцы гэтых знакаў, зусім аднолькавай. Узрыўны элемэнт абодвых гукаў азначаны аднолькава.

г) У абодвых выпадках для кожнага афрыкатнага гуку ўводзіцца адна літара.

Калі пытаньне аб увядзеньні новых значкоў для афрыкатаў *дз*, *дж* ставілася на пайменнае галасаваньне, то выказалася: за астаўленьне *дз*—*дж*: за—1; супроць—17. За сэрбскія значкі (проект Растаргуева): за—10; супроць—8. За дыякрэтычныя значкі (проект Я. Лёсіка): за—4; супроць—14. За лігатуру: за—5; супроць—11.

2) Аб увядзеньні *j* пры пайменным галасаваньні выказалася: за ўвядзеньне *j* у пачатку складу перад галоснымі: за—19; супроць—3. За ўвядзеньне *j* у канцы складу пасьля галосных: за—19; супроць—3. Даводзіцца да ведама, што за ўвядзеньне *j* выказаліся Б. Тарашкевіч, А. Луцкевіч, Дварчанін, Я. Станкевіч. У зьвязку з гэтай пастановай літара *й* з беларускай азбукі выключаецца.

3) У сувязі з увядзеньнем у беларускую азбуку *j* было пастаўлена пытаньне аб выключэньні з азбукі *я, е* (або *э*), *ё, ю*. За выключэньне пры галасаваньні выказалася—5, супроц—11. Такім чынам літары *я, е, ё, ю* для азначэньня мяккасьці зычных застаўлены.

Старшыня: Слова мае старшыня Правапіснае Камісіі гр-н Езавітаў.

Езавітаў. Паважаныя грамадзяне! Да працы Правапіснае Камісіі з боку членаў Конфэрэнцыі была праяўлена, як гэта відаць з пасяджэньняў, вялікая зацікаўленасьць. Гэта відаць хаця-б з таго, што ў склад Правапіснае Камісіі запісалася 30 чалавек.

Аднак, дзякуючы тэй акалічнасьці, што аднačасова працавалі ўсе тры Камісіі Конфэрэнцыі, апошняе адбівалася на складзе Правапіснае Камісіі, і некаторыя члены яе ў час пасяджэньня прымушаны былі выходзіць у іншыя Камісіі і зноў варочацца, уносячы адну прапанову ў аднэй Камісіі і другую—у другой. З гэтае прычыны ў Камісіі фактычна працавала ня больш 20—25 чалавек.

Правапісная Камісія мела 4 пасяджэньні і прапрацавала агулам 10 гадзін. Матар'ялы, якія былі прапанованы Камісіі для распрацоўкі, былі занадта вялікія для таго, каб у працягу гэтых 10 гадзін магчыма было іх усе распрацаваць, тым больш, што пытаньне правапісу вельмі спрэчнае, і ў Камісіі амаль не па кожным пытаньні члены разьбіваліся на два лягеры, якія ўвесь час вымагалі галасаваньня. У Камісіі выказаліся ўсе члены Конфэрэнцыі, якія ня мелі магчымасьці зрабіць гэта на пленарным пасяджэньні Конфэрэнцыі.

Заслухаўшы агульныя спрэчкі, абмяняўшыся думкамі па пытаньнях, узьнятых у дакладах, што былі зроблены на пленуме Конфэрэнцыі, Камісія паставіла сабе для разгляду галоўнейшыя пытаньні правапісу. Больш дробныя пытаньні былі адкладзены пад канец. Абмеркаваць іх мелася на ўвазе, калі хопіць часу.

Галоўныя пытаньні, што былі пастаўлены ў Камісіі, былі наступныя: 1) аканьне ў беларускіх словах; 2) аканьне ў чужаземных словах; 3) правапіс нескладовых *у* і *й;* 4) правапіс зычных—*с, ц, дж, дз* перад мяккімі зычнымі; 5) пра-

вапіс канчаткаў меснага і роднага склонаў. Камісія на сваіх пасяджэньнях пасьпела разглядзець і вырашыць першыя тры пытаньні, а апошнія два засталіся нявырашанымі.

Па пытаньні аб аканьні было прапанована некалькі рэзолюцый. Першая рэзолюцыя была прапанована гр. Лёсікам: у беларускай мове галосныя *о (ё)—э (е)* чуваць і пішуцца толькі пад націскам; не пад націскам на месцы *о (ё)—э (е)* чуваць гукі няясныя, глухія, якія запісваюцца літарамі *а—я*.

Гэтая прапанова большасьці галасоў Камісіі не сабрала і была адхілена 15 галасамі супроць—7; рэшта ўстрымалася.

Другая прапанова была Некрашэвіча, такога зьместу: у правіла правапісу Тарашкевіча аб аканьні ўнесьці наступныя корэктывы: а) другі склад перад націскам не падлягае аканьню; б) *не* і *без,* калі яны стаяць асобна, не падлягаюць аканьню. Гэтая прапанова прынята большасьцю—14 супроць—7; рэшта ўстрымалася.

Потым аб аканьні была ўнесена Некрашэвічам прапанова аб тым, каб словы „няма“ і „няхай“ пісаць праз *і* г. зн. пісаць „н*і*ма“, „н*і*хай“. Гэтая прапанова была адхілена 15 чал. супроць 5; рэшта ўстрымалася.

Па пытаньні аб аканьні ў чужаземных словах Некрашэвічам была прапанована такая рэзолюцыя: кожнае чужаземнае ненаціскное *о* ў беларускай мове перадаецца на пісьме праз *а*. Гэтая прапанова пры галасаваньні дала наступныя вынікі: за—12, супроць—8; рэшта ўстрымалася.

Потым была ўнесена прапанова гр. Лёсіка па тым-жа пытаньні такога зьместу: з прычыны таго, што правапіс чужаземных слоў недастатачна распрацаваны, Правапісная Камісія Конфэрэнцыі перадае гэтае пытаньне для апрацаваньня ў Правапісную Камісію Інбелкульту. За гэтую рэзолюцыю галасавала 6 чал. пры 15 супроць рэзолюцыі Лёсіка.

Апошняю галасавалася наступная рэзолюцыя, прапанаваная грам. Чаржынскім: прынцыповая пастаноўка проблемы напісаньня чужаземных слоў адносна аканьня прымаецца ў такой формулёўцы, якую даў Б. Тарашкевіч. Практычна яно выяўляецца так: аканьню падлягаюць тыя словы, якія запісаны ў матар‘ялах Слоўнікавай Камісіі; апрача таго,

аканьню таксама падлягаюць некаторыя словы з тэрмінолёгічных зборнікаў. Канчатковую працу Правапісная Камісія даручае Правапіснай Камісіі Інбелкульту. За рэзолюцыю Чаржынскага галасавала—9 і супроць—11 чалавек.

Да рэзолюцыі Чаржынскага далучаецца і дэлегат Латвійскага Унівэрсытэту гр. Блесэ, які ня быў запісаны ў Правапісную Камісію, і такім чынам яго думка занесена, як асобная, у протокол.

Проці аканьня ў чужаземных словах выказаўся таксама грам. А. Сержпутоўскі.

Па трэйцім пытаньні адносна правапісу нескладовых *у* і *й* былі прапанованы рэзолюцыі Я. Лёсікам і грам. А. Багдановічам.

Пропозыцыя Я. Лёсіка была наступная: *у* і *і,* калі яны стаяць асобна або на пачатку слова, заўсёды пішуцца праз *у, і* (складовыя).

Пропозыцыя А. Багдановіча: а) правапіс нескладовага *у* заставіць у рэдакцыі Б. Тарашкевіча. (За—9, проці—4); б) выкінуць выключэньні, якія ўнёс у правапіс нескладовага *у* Я. Лёсік (За—8, проці—3); в) *і,* калі яно стаіць асобна або на пачатку складу, заўсёды пішацца праз *і*. (За—больщасьць); г) нескладовага *у* ў чужаземных словах ня пісаць. Грам. Некрашэвіч унёс пропозыцыю апошняе пытаньне перадаць на вырашэньне Правапіснай Камісіі Інбелкульту, што і прынята большасьцю членаў Камісіі (Супроць—2).

У сувязі з прыняцьцем пропозыцый А. Багдановіча прапанованая рэзолюцыя Я. Лёсіка ў часьці адносна правапісу *ў* адпала.

Што датыча агульнага характару працы Камісіі, то яна ўвесь час адбывалася ў атмосфэры асабліва павышанага настрою членаў Камісіі. Апошняе тлумачыцца перш за ўсё важнасьцю пастаўленых пытаньняў і вялікай адказнасьцю за іх вырашэньне, а падругое рэзкім падзелам поглядаў членаў Камісіі на пастаўленыя для вырашэньня Камісіі пытаньні. Прыходзілася кожную дэталь усебакова абмяркоўваць за і проці, на што было патрачана шмат часу. Апошнім тлумачыцца тое, што Правапісная Камісія за 10 гадз. сваёй працы не змагла вырашыць усіх пастаўленых ёй пытаньняў. Засталіся нявырашанымі: 1) правапіс сьвісьцячых *з, ц, с, дз* пе-

рад мяккімі зычнымі і 2) канчаткі меснага і роднага склонаў адзін. л. Праўда, і гэтыя пытаньні, як відаць з прамоў, былі падрабязна абгавораны, аднак яны не галасаваліся. Камісія мела на ўвазе канчаткова вырашыць іх перад пачаткам нашага пасяджэньня, аднак, за бракам часу, пасяджэньне Правапіснай Камісіі не адбылося і, такім чынам, два апошнія пытаньні перадаюцца ў Правапісную Камісію Інбелкульту. У гэтую-ж Камісію перадаецца і ўвесь той матар'ял, які апрацаваны і прыняты нашай Камісіяй, а таксама ўсе тыя асобныя погляды і заўвагі, што былі выказаны членамі Правапіснай Камісіі.

Старшыня: Якія заўвагі будуць да справаздачы Правапіснай Камісіі? (Няма).

Справаздачы Камісій скончаны. У Прэзыдыум Конфэрэнцыі паступіў проект агульнай рэзолюцыі аб працы Конфэрэнцыі і яе Камісій. Дазьвольце мне яго зачытаць (чытае):

„Скліканая Інстытутам Беларускае Культуры ў справе рэформы беларускага правапісу і азбукі Першая Акадэмічная Конфэрэнцыя, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі навукі ад вышэйшых навуковых і пэдагогічных установ БССР і СССР, а таксама запрошаныя навуковыя спэцыялісты заграпічных Унівэрсытэтаў, заслухаўшы і абмеркаваўшы як зробленыя па агульным дасьледваньні беларускай мовы і літаратуры даклады, гэтак і па спэцыяльных пытаньнях правапісу і азбуцы, зазначае:

а) у сувязі з агульным культурным уздымам БССР беларуская навука і літаратура дасягнулі значнага росквіту;

б) дзяржаўнасьць беларускай мовы вымагае яе далейшага глыбокага дасьледаваньня і апрацаваньня;

в) дзякуючы навуковаму дасьледаваньню і апрацаваньню беларуская мова ўваходзіць у сям'ю славянскіх моваў, як самастойны і роўнапраўны яе член;

г) пасьпешнае разьвіцьцё беларускай навукі вымагае цеснай сувязі яе як з навукай СССР, гэтак і з заходня-эўропейскай;

д) важныя ў культурным жыцьці кожнага народу пытаньні правапісу і азбукі ў беларускіх умовах набываюць асаблівую важнасьць і падлягаюць далейшаму ўсебаковаму дасьледаваньню і апрацаваньню.

А таму Першая Акадэмічная Конфэрэнцыя ўхваляе:

1) у далейшым узмацніць і паглыбіць працу, якую праводзіць Інстытут Беларускай Культуры па дасьледаваньні беларускай мовы і літаратуры;

2) устанавіць цесную сувязь Інстытуту Беларускае Культуры як з адпаведнымі ўстановамі і прадстаўнікамі навукі СССР, гэтак і з заходня-эўрапейскімі;

3) прыняць да ведама і дасьледаваньня ў далейшай працы Аддзелу Мовы і Літаратуры Інбелкульту даклады і ўсе прынятыя пастановы Правапіснай, Азбучнай і Літаратурнай Камісій Конфэрэнцыі, а таксама заявы як груп членаў Конфэрэнцыі, так і паасобныя погляды яе членаў, і неразгледжаныя за бракам часу правапісныя пытаньні;

4) даручыць Інбелкульту выдаць усе працы Акадэмічнай Конфэрэнцыі і яе Камісій асобным зборнікам".

Рэзолюцыю стаўлю на галасаваньне. Хто за прыняцьце рэзолюцыі ў цэлым? (Аднагалосна). Хто мае зрабіць якія дадаткі або ўвагі? (Няма). Значыць, рэзолюцыю лічу прынятай. (Воплескі).

Паважаныя члены Конфэрэнцыі!

Праца Конфэрэнцыі скончылася. Бязумоўна, калі-б мы мелі магчымасьць працягнуць працу Конфэрэнцыі на некалькі дзён, мы зрабілі-б значна больш. Мы-б скончылі некаторыя з тых пытаньняў, якія засталіся ня зусім вырашанымі. Тым ня менш трэба вызначыць, што за тыдзень нашай працы зроблена шмат. Зараз яшчэ трудна зрабіць падсумаваньне, але ясна, што для Савецкай Беларусі праца Конфэрэнцыі прынесла вялікую карысьць і дала задавальненьне шырокім працоўным масам.

Мы ўсе працавалі з вялікай напружанасьцю, не пакладаючы рук. Пасьля працы Конфэрэнцыі ў портфэлях Сэкратарыяту засталося шмат пастаноў, прамоў, паасобных думак і іншых матар'ялаў, якія займуць шмат друкаваных аркушоў. Гэта, шаноўныя члены Конфэрэнцыі, ёсьць вялікі і каштоўны ўклад у нашую навуку аб беларускай мове і літаратуры. Мы не забылі беларускай мовы, чаго баяўся Багушэвіч. Наш рабоча-сялянскі народ творыць мову, навука працуе над ёю.

Мне здаецца, што праца Конфэрэнцыі будзе мець значэньне ня толькі для вывучэньня беларускай мовы і літаратуры. Конфэрэнцыя падняла і вырашыла цэлы шэраг такіх пытаньняў, што маюць адносіны да нявывучаных яшчэ моваў і літаратур тых народаў, якія раней не маглі разьвіваць іх, бо яны знаходзіліся ў „турме народаў“. Я запэўнены, што друкованым зборнікам прац нашай Акадэмічнай Конфэрэнцыі будуць цікавіцца ўсе такія народы. Яны знойдуць у ім цікавыя матар'ялы і для сваіх моваў і літаратуры.

Мы павінны вызначыць вялікую зацікаўленасьць працамі Конфэрэнцыі з боку шырокіх рабоча-сялянскіх мас Беларусі. Нашы пасяджэньні заўсёды мелі шмат гасьцей, асабліва вечарамі. Госьці прыймалі ўдзел у Конфэрэнцыі падачаю запісак і ўваг у Прэзыдыум. Некаторыя з іх прасілі нават слова. Газэты нашы, у якіх апісвалася дэтальна праца Конфэрэнцыі, чыталіся нарасхват і пасьля прачытаньня хаваліся ў прыватных бібліотэчках. Цікавіліся Конфэрэнцыяй організацыі, установы і навуковыя працаўнікі як Саюзу ССР, так і заграніцы, аб чым сьведчаць прысланыя адусюль прывітаньні і заўвагі. Многія выдатныя вучоныя, каторыя не змаглі прыехаць у Менск на Конфэрэнцыю, прыслалі нам у прывітальных лістох вельмі коштоўныя навуковыя ўвагі па пытаньнях беларускага правапісу і азбукі.

З задавальненьнем павінен я вызначыць зацікаўленасьць паважаных прыежджых членаў Конфэрэнцыі нашаю савецкаю культурнай працаю, аб чым сьведчыць агляд імі нашых культурна-асьветных і навуковых устаноў. Мы ня ведаем, якое ўражаньне засталося ў іх пасьля агляду. Мы ведаем толькі адно, што з поўнаю шчырасьцю мы адчынялі для знаёмства дзьверы нашых устаноў. Бязумоўна, шмат яшчэ ёсьць у нас

недахопаў і недаглядаў, але мы бодра ідзем па шляху соцыялістычнага буданіцтва пад кіраўніцтвам Компартыі і Савецкай ўлады. Мы глыбака верым, што пабудуем яскравую будучыну.

Мы рады адзначыць, што Савецкая Беларусь у першы раз выступіла на міжнароднай навуковай арэне, і цяпер ужо завязаны моцныя сувязі з навуковымі і культурнымі працаўнікамі Заходняй Эўропы і зарубежнага беларускага насельніцтва. Мы прыложым усе сілы, каб гэтыя сувязі захаваць і ўзмацніць. На Конфэрэрцыі мы мелі прадстаўнікоў рускай, нямецкай, польскай, украінскай, беларускай, латвійскай, літоўскай і чэха-славацкай навукі. Падзяка ўсім ім за іх працу на Конфэрэнцыі, за дапамогу нашаму культурнаму будаўніцтву.

Конфэрэнцыя сваімі працамі ўзмацніла навуковую падмуроўку Інстытуту Беларускай Культуры і павялічыла яго навуковыя матар'ялы. Інстытут—установа маладая. Ён сабраў тым ня менш многа навуковых сіл і матар'ялаў. Праца Конфэрэнцыі яшчэ больш дапаможа яго разьвіцьцю.

Адначасна з працамі Конфэрэнцыі ў Савеце Народных Камісараў Беларусі быў разгледжаны і зацьверджаны статут новай выдатнай навукова-дасьледчай установы. Я разумею Дасьледчы Інстытут па сельскай і лясной гаспадрцы імя нашага правадыра Леніна. Гэты Інстытут заменіць сабою існуючую пры Інстытуце Беларускай Культуры Сэкцыю сельскай і лясной гаспадаркі, пашырыць і паглыбіць яе працу. Сягодня, зачыняючы Акадэмічную Конфэрэнцыю, я не магу не адзначыць гэтага вялікага дасягненьня ў нашым Савецкім будаўніцтве.

Яшчэ раз ад імя Інстытуту Беларускае Культуры горача вітаю прыежджых і тутэйшых членаў Конфэрэнцыі і гасьцей. Дзякую за тыя каштоўныя навуковыя ўклады, якія яны ўлажылі ў навуковы багаж, можа покуль што і ня вельмі вялікі, Інбелкульту.

Няхай жыве навука і культура рабоча-сялянскай Савецкай Беларусі!

Няхай жыве культурная сувязь паміж асобнымі рэспублікамі Саюзу ССР і паміж СССР і замежнымі дзяржавамі.

Чэсьць і падзяка дэлегатам Конфэрэнцыі.

Фасмэр. Учора ў вечары я атрымаў ліст ад проф. Бодуэн-дэ-Куртэнэ, які выказвае яшчэ раз свой жаль, што ня мог прыехаць на Конфэрэнцыю і просіць паведаміць Прэзыдыум Інбелкульту, што апрача прычын, паказаных у яго лісьце, што фактычна прымусілі яго адмовіцца ад паездкі сюды, ён яшчэ ня мог быць тутака і з прычыны хваробы. Бодуэн-дэ-Куртэне даволі падрабязна апісвае стан свайго здароўя і паказвае на неабходнасьць штодзенна зварачацца да доктара.

Старшыня: Можа дазволіце мне ад імя Конфэрэнцыі перадаць нашае прывітаньне праз проф. Фасмэра паважанаму нашаму дэлегату, шаноўнаму проф. Бодуэн-дэ-Куртэнэ, якога ён магчыма пабачыць асабіста. (Воплескі).

Фасмэр. Я асабіста, на жаль, не пабачу яго, але ў лісьце магу перадаць.

Старшыня: Мы вельмі просім паважанага члена Конфэрэнцыі Голомбэка перадаць нашае прывітаньне Бодуэн-дэ-Куртэнэ. (Воплескі).

Яшчэ раз ад імя Інбелкульту я выказваю гарачае прывітаньне і шчырую падзяку нашым гасьцям і ўсім членам Конфэрэнцыі за тыя каштоўныя ўклады, якія яны ўнесьлі ў беларускую навуку ў час нашай Конфэрэнцыі.

Чэсьць і падзяка дэлегатам нашае Конфэрэнцыі. (Воплескі).

Фасмэр. Мне хацелася з свайго боку выказаць Інстытуту Беларускае Культуру сваю падзяку за той прыём, які мы тут знайшлі, а таксама за запрашэньне прыняць удзел у Конфэрэнцыі. Гэтае запрашэньне дало мне магчымасьць значна лепш, чым раней, азнаёміцца з многімі праявамі беларускае культуры, і між іншым, з моваю. Я шкадую, што ня быў здавальняюча падрыхтаваны да тэй працы, якая мяне тут чакала. Аднак, ня гледзячы на ўсю нездавальняючую падрыхтоўку, я прыняў гэтае запрашэньне, кіруючыся галоўным чынам тым, што мой прыезд сюды быў першым выпадакам, пасьля нямецкай окупацыі, зьяўленьня прадстаўніка нямецкае навукі на тэрыторіі Беларусі. Тут, між іншым, я пабачыў, што нямецкі народ сваёй окупацыяй зрабіў менш шкоды, чым другія народы, што нямецкая окупацыя была разумней, чым

окупацыі ў іншых мясцох у часы вайны. Маё зьяўленьне тут, як прадстаўніка нямецкае навукі знайшло самы гасьцінны прыём. Цяпер я спадзяюся, што разам з гэтай Конфэрэнцыяй установяцца нашы навуковыя зносіны, у чым з абодвух бакоў адчуваецца патрэба, што зносіны беларускай навукі з нямецкай будуць асабліва карысны для першай. Разам з тым гэтыя зносіны будуць карысны і для нямецкай навукі, якая адчувае вялікую патрэбу ў тых інформацыях, што могуць выходзіць ад Інстытуту Беларускае Культуры.

Дазвольце яшчэ раз падзякаваць Вас за той гасьцінны прыём, які я знайшоў тут і спадзявацца, што нашая сувязь, на гэтым ня скончыцца, што яна будзе працягвацца і ўзмацняцца.

Блесэ. Выносячы глыбокую падзяку Інстытуту Беларускае Культуры за яго ласкавае запрашэньне, павінен паўтарыць тое, аб чым я ўжо меў гонар ня раз заяўляць, а менавіта: я вельмі абрадаваны тым, што я бачыў тут на Беларусі. Я павінен тут констатаваць вялікія дасягненьні Беларусі ў розных галінах культуры. Праўда, мая праца на Конфэрэнцыі была, магчыма, не асабліва актыўнай. У гэтым сэнсе, я павінен сказаць тое самае, што і проф. Фасмэр, але я думаю, што і мая прысутнасьць тут прынясе мне вялікую карысьць. Зьвярнуўшыся, я бязумоўна, пастараюся растлумачыць і даць весткі аб Беларусі, якія я тут пасьпеў набраць. Хоць мы і суседзі, але тое, што робіцца на Беларусі, нам было зусім невядома, і дзеля гэтага погляды некаторых колаў нашае грамадзкасьці на становішча Беларусі далёка не адпавядалі запраўднасьці. Я думаю, што цяпер мне ўдасца растлумачыць маім супляменьнікам запраўднае становішча справы і думаю, што гэта таксама паслужыць справе зносін на карысьць абодвух народаў.

Яшчэ раз дзякую Інстытут Беларускае Культуры за запрашэньне і выказваю пажаданьне, каб праца якая распачата так пасьпяхова Інстытутам Беларускае Культуры, ня спынялася і прывяла Інстытут да большых дасягненьняў у галіне падняцьця культуры беларускага народу.

Старшыня: Дазьвольце, паважаныя члены Конфэрэнцыі, яшчэ раз падзякаваць за Вашу працу і пажадаць далейшай сувязі, якая-б узмацніла нашы навуковыя культурныя дасягненьні. На гэтым дазвольце нашую Конфэрэнцыю лічыць зачыненай. (Воплескі).

Конфэрэнцыя зачыняецца сьпевам Інтэрнацыяналу.

Дадаткі.

Л. Цьвяткоў.

Некалькі слоў аб беларускім элемэнце ў польскай лексыцы.

Паміж суседнімі народамі часта бывае абмен словамі, гэтак сама як і абмен паняцьцямі і рэчамі.

Польшча, Беларусь, Украіна і Маскоўская дзяржава яшчэ ў даўнейшыя часы мелі асабліва частыя зносіны паміж сабою.

Як вынік гэтых зносін, адзін народ рабіў на другі ўплыў сваёю лексыкаю. У сваім дакладзе я і хочу разглядзець гэты ўплыў у тэй яго частцы, якая тычыцца ўплыву беларускай лексыкі на польскую.

Крыніцамі для разгляду закранутай мною тэмы зьяўляюцца пераважна слоўнікі.

Польскіх слоўнікаў мы маем шмат. Не гаворачы ўжо аб чатырохмоўным слоўніку 1532 году, ёсьць, напрыклад, вельмі паважная крыніца „Слоўнік польскае мовы“ Ліндэ. (Варшава 1807—1814, а другое выданьне—Львоў 1854—1860), ёсьць колектыўная праца Здановіча, Шышкі ды іншых, выданая ў Вільні Оргельбрандам у 1861 годзе. Няма часу тут гаварыць аб Мронговіусе, Мюльлеру, Бартошэвічу, Дуброўскім, Потоцкім ды шматмоўным слоўніку, выданым падчас нямецкае окупацыі. Але бясспрэчна заслугоўвае нашае поўнае ўвагі „Слоўнік польскае мовы“, уложаны пад рэдакцыяю Карловіча, Крынскага і Недзьведзкага (пасьля сьмерці Карловіча і выхаду Крынскага са складу рэдакцыі—іх заступіў Казімер Круль).

Гэты слоўнік пачаў выходзіць з 1898 году, а канчаецца толькі цяпер. Гэта, запраўды, надзвычайна каштоўная крыніца, дзе ня толькі поўнасьцю выкарыстаны ўсе чыста папярэднія слоўнікі, але даецца агромністая колькасьць і зусім новага матар‘ялу.

Спэцыяльна прадмету, які нас цяпер цікавіць, прысьвечаны кніжка Аляксандра Валіцкага ды, часткова, праца Аляксандра Лэнтоўскага.

Апошняя кніжка (аб чыстаце польскае мовы ў нашым краі надрукавана ў 1915 годзе).

Адзначаецца яна ня толькі сваёю агульнадаступнасьцю для шырокіх мас чытачоў, але, на вялікі жаль, яшчэ і надзвычайнаю ды зусім непатрэбнаю рэзкасьцю выразаў, надта полемічным тонам. Прымае яна пад увагу ня толькі беларусізмы, але таксама і іншыя барбарызмы. У канцы даецца слоўнік з тлумачэньнямі.

Карыстацца гэтаю працаю можна з пэўнаю асьцярожнасьцю, бо ў ёй не заўсёды вытрыманы чыста навуковы, об‘ектыўны падыход да справы (у выніку вышэйпамянёнае прычыны). Таму мы больш увагі будзем зварочваць на паказаньні об‘ектыўных крыніц (слоўнік Карловіча і г. п.).

Матар‘ял мы разьмяркуем паводле фонэтычных адзнак.

Галосныя гукі.

Юсы.

ѫ даваў у польскай мове пры даўжыні галоснага элемэнту *ą* (*o* насовое), а пры яго кароткасьці *ę*. Як вядома, на польскай глебе зьявіліся новыя ўмовы даўжыні галосных.

У чэхаў у залежнасьці ад праславянскай інтонацыі зьяўляецца або дыфтонг *ou*, або проста *u*. Нешта падобнае (*u* доўгае ды *u* кароткае) ёсьць і ў славакаў; усходнія славяне ды сэрбы маюць *u*, славенцы—*o*, а баўгары—глухі галосны гук.

Чэскі дыфтонг вышаў з доўгага *u*; гэта даводзіць нам як гісторыя самое чэскае мовы, таксама і сучасныя факты славацкае мовы.

ѧ даў у палякаў пры даўжыні *ą* (*o* насовае) з папярэдняю мяккасьцю, а пры кароткасьці—*ę*, таксама з папярэдняю мяккасьцю.

У славакаў—*a* памякчальнае доўгае ды кароткае, а ў чэхаў—некалькі іншыя вынікі, дзякуючы некаторым працэсам звужэньня галосных гукаў у пэўных умовах ды інш. У кашубаў мы ў ѧ маем ужо нешта іншае, ня тое, што ў палякаў. У сэрбаў, баўгараў, македонцаў, славенцаў ѧ даў *e*, у славян усходніх—*a* з папярэдняю мяккасьцю (зразумела, калі не адбылося пазьнейшае зацьвярдзеньне зычнага гуку). У некаторых македонскіх гутарках ѧ і ѫ даюць часам комплекс: галосны гук+насовы зычны поўнага ўтварэньня.

Польскае kuczek і дыялектычнае польскае kucza запазычаны ад усходніх славян. Гэтыя словы сваім *cz* выдаюць сваё пахаджэньне, бо *куча* азначае нешта накіданае так, што ўтвараюцца *куты*, а не роўналежныя лініі.

Старазаконнае яўрэйскае сьвята завецца папольску Kuczki: шалаш, нешта зробленае з матар‘ялаў, пастаўленых пад кутом, а не роўналежна.

Сэрба-хорвацкае kuća вымаўляецца даволі падобна да таго, што можна было-б выразіць напісаньнем *куця*, або *кучя*). Стара-славянскае *кѫшта* (крыху падобна да таго, што можна было-б напісаць *коншта)*, словенскае *коча* ды інш. могуць служыць нам для параўнаньня, але запазычаны вышэйпамянёныя польскія словы ў славян усходніх; Карловіч паказвае адносна kuczek і kucza—на беларусаў.

Мы ня можам сказаць з пэўнасьцю, ці замест польскіх wnęk, wnęczka, prawnęk, prawnęczka (ёсьць гэта ў Станіслава Остроўскага, Марціна Бельскага ды ў Кракаўскіх судовых актах да 1423 году)—сучасныя wnuk, wnuczka, prawnuk, prawnuczka зьявіліся пад беларускім уплывам, таксама duby smalone маглі быць узяты і з нейкае іншае славянскае мовы.

У слоўніку Карловіча ёсьць дыялектычныя польскія словы duha, huska ды шмат падобных, але вырашыць пытаньне аб пахаджэньні слова можна тады, калі маецца нейкая вельмі характэрная рыса, а лёс *о* насовага і звонкага заднянёбнага гуку быў аднолькавы, напрыклад, у славакаў і беларусаў ды ўкраінцаў.

Абмінем таксама літаратурнае польскае слова sumienie і дыялектычныя sustaw, sukrowica і sutuł (у сэнсе „горб“—паказанае ў Лэнтоўскага), а таксама paskudny, kupalnik, huśla (старапольскае) ды шмат іншых—і пераходзім да юса малога.

У сваёй кніжцы „Błędy nasze“ Лэнтоўскі адзначае слова raby, якое (гаворыць аўтар), хоць і рэдка,—ужываецца ўсё-такі і ў літаратурнай польскай мове ў сэнсе „васпаваты“, „з рабым тварам“. Гэтае слова бясспрэчна беларускае, бо мае характэрнае для нашай мовы цьвёрдае *r*.

Яшчэ цікавейшым трэба лічыць польскае слова każemiak—*гарбар*. Мы чакалі-б *skóromiąk ці, мо, *kožomiąk, але тут бачым нават захаваньне беларускага аканьня.

Слова kniaź ды вытворныя ад яго словы ужываюцца нават у літаратуры якраз адносна літоўска-беларускіх князёў,—значыцца, ёсьць падстава лічыць гэта запазычаньнем з нашае мовы.

Плаўна-чыстыя комплексы.

*tort, *tolt, *tert, *telt далі ў паўднёвых слявян, а таксама і ў чэхаў і славакаў перастаноўку з *а* і з *ѣ*, у палякаў і ў лужычан—перастаноўку з захаваньнем *о* і *е*, у кашубаў нават бывае часам і адсутнасьць перастаноўкі, у ўсходніх славян—заўсёды поўнагалосьсе, гэта значыць: *torot, tołot, teret, telet.*

У палякаў ёсьць літаратурнае слова błahy. Можна думаць, што гэта слова царкоўна-славянскае, ужытае ў адваротным, іронічным сэнсе (усё роўна, як часам расійцы кажуць: „блажен муж“). Дайсьці да заходніх славян яно магло праз беларусаў, у якіх яно мае якраз такі-ж самы сэнс.

Слоў з усходня-славянскім поўнагалосьсем у палякаў нават у літаратурнай мове ня мала. Але бясспрэчна беларускім трэба лічыць слова czaromcha, якое нават выціснула з ужытку чыста-польскае trzemcha: аканьне ды цьвёрдае *r* разьвязваюць пытаньне канчаткова.

Адзначым таксама дыялектычнае польскае czerot у сэнсе *чарот.*

Плаўна-глухія комплексы.

Плаўна-глухія комплексы маглі мець глухі элемэнт перад плаўным і пасьля яго. У польскай мове плаўна-глухія комплексы з гукам *ъ* і з гукам *ь* асноўна-славянскімі далі даволі рознастайныя вынікі. Калі ў асноўна-славянскай мове глухі галосны гук стаяў пасьля плаўнага, дык мы маем або (звычайнае і бяз суседзтва з плаўнымі гукамі) праясьненьне *ъ* у *е* непамякчальнае, а *ь* у *е* памякчальнае, або зьнікненьне глухога: krew, krwi, chrzest, chrz(s)tu, dreszcz, drżeć, płeć, płci, klekotać і г. д. Можна было-б нават сказаць, што тут няма комплексу, паважнага ў фонэтычных адносінах, бо тое-самае будзе ў палякаў і бяз суседзтва плаўнага гуку—sen, snu, dzień, dnia і г. д.

Але ў некаторых мовах, напрыклад у сэрбскай,—тое асноўна-славянскае гуказлучэньне, з якога ўтварылася польскае re ў словах тыпу krew, дае аднолькавыя вынікі, як і злучэньне ў словах тыпу польскага targ. У сэрбаў мы знаходзім *крв, трг* (хоць бываюць і выключэньні). Мы бачым у сэрбаў складовае *r* у абедзьвюх катэгорыях выпадкаў; заўважым, што і *l* складовае (якое захавалася ў чакаўцаў, а ў іншых гутарках дало *u*)—атрымалася ня выключна толькі ў злучэньнях: глухі галосны+плаўны зычны.

У расійскай, беларускай, а таксама і ў украінскай мове праясьненьне *ъ* у *о,* а *ь* у *е* ў моцным становішчы зьяўляецца агульным правілам *сон, дзень* (бяз плаўных). Але тыя злучэньні, дзе ў асноўнай славянскай мове глухі галосны стаяў пасьля плаўнага зычнага, далі ў беларускіх і ўкраінскіх гутарках комплекс: *плаўны+ы: крыві, дрыжэць, грымнуць, глытаць, блыха.* Гэта асабліва часта бывала бяз націску. У польскай мове гэтая граніца ня сьцерлася—і адносна *ър, ъл, ьр, ьл* ёсьць некалькі правіл.

З погляду не асноўна-славянскае, а польскае мовы, найлепш сказаць так: комплексы з *r* цьвёрдым далі *ar,* тое самае і з *r* зацьвярдзелым, бо мяккае *r* цьвярдзела перад цьвёрдымі ł, n, t, d, s, z, тады як комплексы з *r* мяккім незацьвярдзелым далі ў старапольскай мове irz або ir, а ў навапольскай—ierz, або ier. Такім чынам мы знаходзім: targ, kark, sarna, czarny, martwy, twardy, naparstek і г. д., але wierzba, czerpać, sierp (і sierzp), wierzch і г. д.

З *ъl* ды *ьl* справа яшчэ больш складаная. Рознастайнасьць рэфлексаў, як паказаў Фортунатаў, залежыць у польскай мове ня толькі ад таго, што было ў праслав.—*ъ* ці *ь*, а яшчэ і ад вымаўленьня l, якое магло быць мяккім і цьвёрдым (ł).

Вельмі часта мы бачым eł: wełna, pełny, chełm, zgielk, часам знаходзім il: wilk, milczeć, але часта бывае і łu: dług, tłusty, słup; ёсьць і oł: mowa (з *mołwa), mówić (з *mółwić); пасьля шыпячых зычных гэтак бывае заўсёды: czółno, żółty, żółw і г. п.). Пры зьбегу зычных магчымы і перастаноўкі: słońce замест *sołńce.

Калі мы ў комплексе з *r* знаходзім у палякаў вынік— *ier*, або ў комплексе з *l* бачым *oł* (можа, з далейшым пераходам у *ół*), дык усходня-славянскае запазычаньне нельга давесьці, бо і ў расійцаў, напрыклад, мы маем: *серп, молвить*. Значыцца, калі-б гэтыя ды ім подобныя словы былі нават запазычаны ў усходніх славян, дык і на чыста-польскай глебе, ўсё роўна павінна было-б утварыцца тое-ж самае.

Але калі мы маем у палякаў слова, напрыклад, з усходня-славянскім *or*, або з беларускім *ły*, дык тут справа ўжо пэўная, бо ў палякаў органічна гэта паўстаць не магло. У польскай мове поруч з нормальнымі czart, parć або part (тоўстае палатно), partać „ткаць“, gardzić „пагарджаць“ мы знаходзім czort, portki, hordowid (расьліна), але няма пэўнасьці, ці належаць гэтыя словы да беларусаў, ці да іншых народаў усходня-славянскага пахаджэньня.

Таксама і sukrowica бяспрэчна ўсходня-славянскае слова (su, а ня są, ды і праясьненьне галоснага на ўсходня-славянскі лад), але беларускасьць гэтага слова нічым не даведзена, як і польскага дыялектычнага droszcz (поруч з літаратурным dreszcz)—дрыжыкі.

Што тычыцца да дыялектычнага польскага слова małanka, зьмешчаннага ў слоўніку Карловіча, дык гэта наша, чыста беларускае слова.

Аканьне ў націскным складзе трэба тлумачыць наступным спосабам: былі дублеты мóланка ды малóнка з іх контамінацыі ўтварылася сучаснае малáнка.

На слове *маланка* варта некалькі спыніцца яшчэ вось дзеля якое прычыны. Тут мы маем зьяву, якую некаторыя вучоныя завуць „другім“, або „глухім“ поўнагалосьсем.

Тут мы знаходзім нешта падобнае да расійскіх літаратурных: *пóлон, чёрен, верёвка,* ды паўночных дыялектычных *столоб* і *верёх* (замест літаратурных: *столб* і *верх*).

У старажытных рукапісах сустракаецца слова *мълънии*, у расійскіх дыялектах мы бачым *мóлонья*. Такім парадкам слова małanka наводзіць нас на некаторыя цікавыя думкі.

Асноўна-славянскія ъ і ь.

Паколькі гэтыя гукі ня зьніклі, яны давалі наступныя вынікі (апроч выпадкаў, дзе былі злучэньні з плаўнымі). У сэрба-харватаў—*а;* у баўгараў—ъ большаю часткаю захоўваўся, ь праясьняўся ў *е;* у палякаў ь даваў *е* зьмякчальнае

(таксама і *ъ,* калі знаходзіўся пасьля *g* і *к),* а ў рэшце выпадкаў *ъ* даваў *е* незьмякчальнае; у чэхаў глухія галосныя таксама давалі *е;* усходнія славяне праясьнялі *ъ* у *о,* а *ь* у *е;* славакі ды некаторыя дыялекты паўднёвага славянства маюць тую-ж самую зьяву.

Такім парадкам чужаславянскае слова, папаўшы ў Польшчу, магло выявіць сябе, калі яно мела асноўна-славянскі *ъ;* з *ь*-жа справа бывала няясная (зразумела, апроч сэрбскіх слоў).

Польскае sobór бясспрэчна слова не сваё, а запазычанае. Яно ўжываецца ў сэнсе „сход царкоўнікаў“. Папольску павінна быць zbór. Пахаджэньне слова sobór ня зусім ясна. Магчыма, што гэта царкоўна-славянскае слова, якое, праходзячы праз усходняе славянства ў Польшчу, набыло ўсходняславянскае праясьненьне гуку *ъ* (хаця мы ведаем выпадкі такога праясьненьня і ў дыялектах старое баўгарскае мовы). Спэцыяльна беларускіх рысаў мы ў гэтым слове не заўважаем.

Дыялектычнае польскае dziadok (поруч са звычайным dziadek)—слова бязумоўна беларускае. Нават dzia—у першым і другім слове—не адно і тое самае. Dziadok—гэта наша „дзядок“ з яканьнем у перадналіскным складзе, а ў чыста-польскім dziadek—асноўна-славянскі *ѣ* даў *ia,* г. зн. ′а, у выніку свайго пашырэньня ў польскай мове перад цьвёрдым зубным гукам. Dziadek прыводзіцца ў слоўніку Карловіча ў якасьці чыста-польскага літаратурнага, а dziadok—у якасьці дыялектычнага слова.

Лёс асноўна-славянскага е.

Агульна-славянскае (або асноўна-славянскае) *е* захавалася ва ўсіх славянскіх народаў—у адных у выглядзе *е* вельмі зьмякчальнага (беларускага, расійскага, польскага) у іншых—у выглядзе *е* незьмякчальнага.

У розных слав. мовах гук *е* падупаў розным зьменам. У палякаў, у беларусаў, у расійцаў і ў украінцаў заўважаецца разьвіцьцё лябіялізацыі гэтага гуку, інакш сказаць,—часты пераход націскнога *е* ў ′*о.* У кожнай з зазначаных моваў свае ўмовы пераходу *е* ў ′*о.* Вывучэньне граніц паасобных зьяў, аб неабходнасьці якога пішуць столькі ў апошні час (Ніч, Младэнаў, Сабалеўскі, Gilliéron і Edmont, Бузук), ясна паказвае, што яны не супадаюць; ні з воднай з іншых ізоглёсаў не супадае і граніца лябіялізацыі *е.*

Пераход *е* у, ′*о* (г. зн. у *о* з мяккасьцю папярэдняга зычнага) здараецца пры наступных умовах.

У ўкраінцаў *е* (як спрадвечнае, так і тое, што паходзіць з асноўна-славянскага *ь*) пашыраецца ў *о,* калі знаходзіцца пасьля шыпячых не перад мяккім зычным гукам таго

самага слова; ад націску ўкраінскае пашырэньне не залежыць. Таму з асноўна-ўсходня-славянскіх: **шьлкъ, *жена́, *чело́, *чьловѣкъ* атрымаліся ўкраінскія *шовк, жона, чоло, чоловік*.

У палякаў—*е* спрадвечнае (ня тое, што паходзіць ад гуку *ь*) пашыраецца перад r, ł, n, d, t, z, s, якія знаходзяцца ў непасрэдным з ім суседзтве ў тым-жа самым слове,—залежнасьці ад націску ня відаць. Адным словам —умовы тыя-ж самыя, што і адносна пашырэньня гуку *ѣ*.

Прыкладамі могуць служыць словы: žona, czoło, zbiór, wiodę, plotę, wiozłem, niosłem, żołądek, piorunowy, miodowy, miotany, żonaty, gąsior, kościół*.

У беларусаў пашырэньне *е* ў *'о* мае і цяпер яшчэ вялікія разьмеры, хоць аканьне (і яканьне), як мне здаецца, і затушавала ў значнай меры гэтую зьяву.

Цяпер пабеларуску мы маем пераход *е* ў *ё* толькі ў націскным складзе (тагды як у паўночных расійцаў ёканьне не абмежавана націскным складам).

Трэба яшчэ заўважыць, што беларускай мове (ня так, як расійскай) зусім не ўласьціва лябіялізацыя *е* перад шыпячымі гукамі—гавораць: *нясеш, адзежа*.

У расійскай мове (апроч паўночных гутарак) ёсьць гаворкі з аканьнем і яканьнем і гаворкі з аканьнем ды іканьнем. Такую рознастайнасьць мы заўважаем і ў беларусаў. Тым часам у паўночных расійцаў, якія окаюць, як і ўкраінцы (мы ведаем, што і большасьць славян наогул ня мае фонэтычных аканьня ды яканьня)—гавораць, напрыклад, *жона, бёру, берёгу* і г. д. з пашырэньнем пераднаціскнога *е* ў *ё*. В. А. Багародзіцкі і А. А. Шахматаў даюць прыклады паўночна-расійскага пашырэньня гуку *е* нават і ў пасьлянаціскных складох.

Такім парадкам ёсьць пэўная пропорцыянальнасьць: чым больш разьвіта зьмякчанасьць зычных гукаў, тым мацнейшае і ёканьне (паколькі яно не затушавана наступнымі фонэтычнымі зьявамі). У ўкраінцаў з іх слаба пашыранаю зьмякчанасьцю і ёканьне (уласьціва кажучы—*о* пасьля шыпячых)—зьява ўсё-ткі даволі абмежаваная, у паўночных славян ёканьне—зьява вельмі пашыраная, а на самай поўначы—надзвычайна частая.

У мовах беларускай і расійскай ёканьне бывае ня толькі ў словах з спрадвечным *е*, але і ў словах з *е* новым,

---

*) У плаўна глухіх комплексах мы ўжо бачылі *oł* ці *ół* пасьля шыпячых там, дзе, напрыклад, у царкоўна-славянскіх старадаўніх помніках ёсьць *ь* у злучэньні з *л*: czółno, żółty, żółw. Але гэта—зьява, хоць і роўналежная, ды ўсё-ткі-ж асобнага парадку.

якое паўстала з агульна-славянскага *ь*, або было ўстаўлена дзеля мілагучнасьці.

Такім парадкам мы маем ня толькі: *цёплы, сёмы, мёд*, але і *лён* і *дзён* (родны склон множнага ліку ад слова *дзень)*, і нават *Зьміцёр, хіцёр* (тагды як у сэрбаў мы знаходзім: *хитар, Петар* з цьвёрдым *т*, бо ўстаўны галосны гук бывае ў іх так-жа сама заўсёды незьмякчальны, як і рэфлекс даўнейшага *ь)*. Тое-ж самае, што ў нас, ёсьць і ў расійцаў: *тёплый, мёд* і *хитёр* і *лён* ды інш.

Украінскае лён Р. Т. Брандт лічыць не органічным, але пераймальным. У ўкраінцаў *е* з спрадвечнага *ь* пашыраецца, як і *е* з спрадвечнага *е*, але мы ўжо бачылі, якою ўмоваю абмежавана даная зьява для гэтых гукаў.

У польскай мове ёсьць словы з няправільным пашырэньнем. Czaromcha бясспрэчна запазычана палякамі ў беларусаў. Тут і поўнагалосьсе, і аканьне, і *r* зацьвярдзелае, і незаконнае ў польскай мове пашырэньне галоснага перад губным гукам.

Szczoka—слова, бязумоўна, усходня-славянскага паходжэньня.

Паміж польскім dziób і беларускім дзяўбаць, або дзёўбаць існуе бясспрэчна нейкая сувязь. Трэба аднак-жа мець на ўвазе і стара-славянскае ѕобати—дзёўбаць.

Тагды паміж dziób і ѕобати можна было-б бачыць сувязь тыпу чаргаваньня *(е, о)*, хоць далёка больш характэрнымі зьяўляюцца тыя выпадкі, дзе ў іменьніку ёсьць *о*, а ў дзеяслове *е* (грэцкае phero, phoros, стара-славянскае съ-бєрѫ съ-бо́ръ). Аднак ѕобати—дзеяслоў адыменны, як грэцкае phoreo і ст.-сл. носити.

Дыялёктычнае польскае ziobro (пры звычайным żebro), таксама, як і ożóg, źrobek, poziom, poziomy, ziomek мне здаюцца ня зусім яснымі. Тое самае трэба сказаць і адносна слова dzionek (дзянёк).

Аканьне.

Розьніца ў вымаўленьні паміж націскнымі ды ненаціскнымі складамі не ва ўсіх славянскіх мовах аднолькова значная. Нават у дыялектах аднае і тае-ж самае мовы можа быць у гэтым сэнсе вялікая нязгода. Напрыклад, у паўночна-расійскіх гутарках розьніца ў вымаўленьні паміж націскнымі ды ненаціскнымі складамі зусім не такая вялікая, як у іншых расійскіх гаворках.

Моць выдыханьня нават і ў паўночных расійскіх гутарках разьмяркоўваецца паміж націскнымі ды ненаціскнымі складамі, бязумоўна, ня зусім роўнамерна. З іншых славянск. моваў сваім адрозьненьнем націскных галосных ад ненаціскных набліжаюцца да рас. і блрс. моваў толькі славенская (гл. Шах-

матава „Русск. и словенск. аканье“ (Сборн. ст., посвящ. Фортунатову, 1902).

Калі ненаціскныя склады вельмі слабыя, дык робіцца тое, што вядома ў навуцы пад назваю „рэдукцыі“ ненаціскных галосных гукаў.

У колькасным стасунку (у стасунку да колькасьці часу, патрэбнага для вымаўленьня) рэдукаваны гук зьяўляецца кароткім, а ў якасным стасунку—глухім, г. зн.—нявыразным, няясным.

Пры гэтым лёгка можа здарыцца артыкуляцыя, блізкая да так званага адносна-індыфэрэнтнага становішча органаў мовы, якое бывае тады, калі мы яшчэ толькі зьбіраемся гаварыць.

А гэтае адносна-індыфэрэнтнае становішча ў пэўнай меры падобна да артыкуляцыі гуку *а*.

Таму некаторыя галосныя гукі, дзякуючы рэдукцыі, робяцца падобнымі да няяснага, нявыразнага *а*. Можа быць і другі від рэдукцыі, калі ненаціскны галосны гук робіць ужо іншае акустычнае ўражаньне, але для нас цяпер важна як раз аканьне (вымаўленьне ненаціскнога *о*, амаль што як *а*, і вымаўленьне ненаціскнога *е*, амаль што як *я*). Гэтая зьява ўласьціва беларускай мове, а ў некаторых яе гаворках аканьне (разумеем пад ім і яканьне) пашырана асабліва моцна.

Галоўным чынам уласна аканьне і перашкаджае некарым дасьледчыкам беларускае мовы прыняць надзвычайна цікавую тэорыю А. А. Шахматава аб удзеле заходня-славянскіх элемэнтаў у формаваньні беларускага народу.

Заходнія славяне, запраўды, не рэдукуюць ненаціскных галосных гукаў. Але, калі прыняць пад увагу магчымасьць вельмі значнае колькаснае перавагі тых інгрэдыентаў, якія акалі, над тымі, якія окалі, дык беларускае аканьне ня будзе ў супярэчнасьці з тэорыяю акадэміка А. А. Шахматава.

Палякам не ўласьціва рэдукцыя, а значыцца, і аканьне. Ненаціскныя і націскныя склады адрозьніваюцца ў іх параўнаўча мала (што, паміж іншым, дапамагала, як вядома, і значнаму нават пераважнаму разьвіцьцю сылябічнага вершаваньня ў польскім пясьнярстве).

Запраўднае аканьне ў палякаў здараецца (як гэта ясна з вышэйсказанага) толькі ў запазычаных словах. Словы гэтыя пераважна беларускія.

Некаторыя прыклады з аканьнем мы цяпер і разгледзім.

Такіх выпадкаў, як польскае дыялектычнае czamu адзначанае ў слоўніку Карловіча, мы чапаць ня будзем, бо гэта—галіна морфолёгіі, але не лексыколёгіі.

Мы ўжо гаварылі аб слове małanka, якое, бязумоўна,

зьяўляецца ня чым іншым, як беларускім „маланка“. Таксама было ўжо сказана аб беларускім пахаджэньні слоў kažemiak і czaromcha.

Бязумоўна беларускаго пахаджэньня слова harczyca (ёсьць і gorczyca)—расьліна, якая палацінску называецца sinapis.

Польскае дыялектычнае слова harować „цяжка працаваць“, „рабіць з вялікаю натугаю, з напружаньнем усіх сіл“, „мучыцца над цяжкаю працаю“, „клапаціцца“, „змагацца з лёсам“, „галець“, „мадзець“—ёсьць, здаецца, ня што іншае, як беларускае „гараваць“.

Ёсьць і дзеяслоўнае імя назоўнае harowanie—параўнайма нашае слова „гараваньне“.

Польскае kałamaszka „невялічкі вазочак“ ёсьць запазычанае палякамі беларускае слова *каламажка*. Украінскае *колимага* і паўночна-расійскае *колымага* маюць *о* ў першым складзе. Дзеля гэтага мы павінны ў даным выпадку бачыць прыклад аканьня.

Для расьліны lycopodium clavatum ёсьць польскія дыялектычныя назвы: dzieraza і dzierazna. Гэтыя словы могуць быць прыкладамі і на поўнагалосьсе.

Слоўнік Карловіча дае нам і kaczerka *качарга,* і kaczareźnik *качарэжнік,* але можна думаць, што гэтыя словы ўзяты ўжо з пераходных польска-беларускіх гутарак польскімі аўтарамі, якія назіралі быт гэтае пераходнае зоны.

Слова manastyr мне здаецца няпэўным прыкладам аканьня (у сэрбаў няма аканьня, а ёсьць ўсё-ткі *манастир* і *намастир,*—апошнее, магчыма, не бяз уплыву з боку турэцкага namaz *малітва).*

Слова karszun дыялектычнае; яно фонэтычна супадае з нашым „каршун“, але, калі тут быў даўней плаўна-глухі комплекс, дык у палякаў і сваё ўласнае слова павінна было-б мець тую-ж самую фонэтычную афарбоўку.

Ёсьць і яшчэ нямала слоў як-быццам з аканьнем, але я браў толькі тыя, якія вельмі блізка нагадваюць нашыя беларускія выразы, ды пры гэтым ня маюць яшчэ іншага, больш зручнага тлумачэньня, чымся запазычаньне ў нас.

Зычныя гукі. Пярэднянёбныя зычныя.

Пярэднянёбныя фрыкатыўныя гукі маюць ў славян шмат рознастайнасьці.

Найперш мы разгледзім рэфлексы асноўна-інда-эўрапейскага комплексу *dj* (пад ётам мы ўмовімся разумець яшчэ і гук *i* нескладовае), а таксама і рэфлексы комплексу *tj* ды злучэньня *kt*, калі гэтае злучэньне знаходзіцца перад галоснымі пярэдняга раду.

Tj і *kt* (апошняе толькі перад галоснымі гукамі пярэд-

няга раду)—далі: у старадаўняй-царкоўна-славянскай ды баўгарскай мовах злучэньне *шт*, у македонцаў—*к* вельмі *мяккое*, у сэрба-хараватаў—гук, выражаны ў харвацкай азбуцы напісаньнем *ć* (нешта сярэдняе паміж вельмі мяккім *ц* і вельмі мяккім *ч*); у славенцаў і ўсходніх славян—гук *ч* (які ў расійцаў у большай часьці гутарак зьяўляецца напоўмяккім); у чэхаў ды палякаў—*ц* (лацінскаю графікаю, зразумела,—*c*)—гук зусім зацьвярдзелы.

Асноўна-інда-эўропейскаму *dj* адпавядаюць: стара-царкоўна-славянскае ды баўгарскае *жд*, македонскае *г* вельмі мяккое; у сэрбаў і часьці харватаў—гук, які паводле польскае графікі можна было-б выражаць злучэньнем *dź*, г. зн. вельмі мяккая афрыката, нешта сярэдняе паміж вельмі мяккімі *дз* і *дж* (пры зьлітым вымаўленьні выбуховага і фрыкатыўнага элемэнтаў); у другой часткі харватаў і ў славенцаў—*j*, у ўсходніх славян часьцей—*ж*, а радзей—*дж*.

Такім парадкам мы знаходзім стара-царкоўна-славянскія ды баўгарскія *свѣшта, межда*, усх.-слав. ды славенскае *свѣча*, славенска-харвацкае meja, беларуская *мяжа* (але хаджу, гляджу), сэрбска-харвацкае sveća (i svijeća), сэрбскае (у польскай транскрыпцыі) medzia, македонскія *свекя, мегя*, польскія świeca, miedza, чэскія svice, meze.

Беларускі ўплыў найбольш заўважаецца ў польскай мове ў іменьнях па бацьку (patronymica).

Возьмем стара-славянскае *львишть* малады леў, дзяцёнак льва, харвацкае kraljević,—ім адпавядаюць нашыя іменьні па бацьку ды прозьвішчы з характэрным канчаткам — *іч* (гэта ёсьць і ў іншых усходніх славян; таксама гэты канчатак гучыць і ў славенцаў).

У польскай мове органічнае *ic* (паводле нашай графікі гэта пісалася-б —іц) сустракаецца радзей, чымся запазычаны ў нас канчатак—*icz (іч)*.

Ёсьць словы szlachcic, dziedzic, kasztelanic, starościc, podkomorzyc, podstolic, łowczyc, podczaszyc ды інш.

Але orlicz, orłowicz=*арляня, малады арол*, miecznikowicz, cześnikowicz, panicz, cesarzewicz, carewicz, królewicz і, што найцікавейшае—новаўтвораныя словы з сэнсам: „асоба, адданая якой-небудзь справе“ (напрыклад, karjerowicz=кар‘ерысты=расійскаму „карьерист“)—маюць не *ic*, а *icz*.

Разгледзім цяпер слова pieczara—пячэра (папольску часьцей ужываецца jaskinia).

Слова гэтае магло быць запазычана палякамі ў усходніх славян. Профэсар Р. Т. Брандт лічыць *печера* ўсходнеславянскім словам, на падставе галоўным чынам старажытных помнікаў.

Чыста польскімі формамі трэба лічыць piecora (глыбо-

кая яма ў рацэ там, дзе рака заварочваецца) і piecorka або piecórka (пячурка).

Можна думаць вось як: усходня-славянскае слова, найбольш праўдападобна—беларуская *пячэра, пячора,* перайшоўшы да палякаў, крыху зьмянілася пад уплывам з боку такіх слоў, як moczara—у выніку чаго і ўтварылася pieczara.

У слоўніку Дуброўскага ёсьць гуž „рыжаваты“, тады як назва грыба „рыжыка“ мае нормальную польскую фонэтычную афарбоўку—rydz.

Мы маем яшчэ некалькі падобных прыкладаў, у якіх аднак-жа фонэтычныя дублеты не адрозьніваюцца паводле сэнсу адзін ад аднаго: грыб „смарчок“—smardz і smarž, „засаўка“—wrzeciądz і wrzeciąž. Гук ž замест *dz* зьявіўся, напэўна, пад уплывам нейкіх усходня-славянскіх слоў.

Апроч чыста польскага nędza, якое перайшло і да беларусаў (нэндза—убоства) ёсьць у польскай мове з сэнсам: „цэразьмернае высіленьне, праца над сілы, ліха, ліхая гадзіна“—слова nuža; ёсьць нават і nužda, дзе žd бясспрэчна запазычана з царкоўна-славянскае мовы, праўдападобна—не без пасрэдніцтва ўсходніх славян.

Польскае hožy найлепш зьбліжаць з словам godny, таксама, як і нашыя „прыгожы“ ды „прыгодны“ павінны быць збліжаны. Калі так, дык hožy можна лічыць словам узятым у беларусаў (карэнь god—у палякаў у злучэньні з *j* даў-бы godz, а ня hož).

Элевае зьмякчэньне.

Губныя зычныя гукі: б, п, в, м, знаходзячыся беспасрэдна перад асноўна-славянскім *j,* ня прымаюць дадатковага *л* у заходніх славян і ў баўгар; у ранейшай баўгарскай мове l epenthet. існавала; у іншых славян мы бачым дадатковае *л:* сэрба-харвацкаму ды славенскаму zemlja, беларускаму *зямля,* расійскаму *земля* адпавядаюць чэскае zeme, польскае ziemia, баўгарскае літаратурнае *земя.*

Словы: hołobla, kapla, kropla, hodowla, niemowlę і. г. п.—некаторыя дасьледчыкі гатовы тлумачыць усходня-славянскім уплывам.

Упрошчаньне злучэньняў дл і тл.

Польская мова, як і іншыя заходня-славянскія, захоўвае гэтыя злучэньні бяз зьмены, тады як у іншых славян (калі ня браць пад увагу некаторых дыялектычных фактаў славенскае мовы)—у гэтых комплексах выкідаюцца *д* і *т.*

Дзеля гэтага тыя выпадкі ў польскай мове, калі гэтыя гукі выкідаюцца, трэба тлумачыць чужаславянскім уплывам.

Пасошны падатак завецца папольску ня толькі poradlne але і poralne, таксама поруч з нормальным rydełko „мор-

дачка“ ёсьць і ryłko. Расьліна „сінільнік“ у польскіх дыялектах завецца siniło (хоць мы чакалі-б *sinidło). Калі слова zagarlić „задавіць“, „задушыць“, мае генэтычную сувязь з gardło ды з нашым „горла“ (сувязь сэмасыялёгічная, блізкасьць у сэнсе выразна адчуваецца)—дык можна было-б тут бачыць уплыў з боку нашае мовы. Адпаведнае слова ў нас гучэла-б* *загарліць* (вытворнае ад „горла“), а *g* у палякаў зьявілася-б замест *h* ужо ў выніку наступнае полёнізацыі гэтага слова.

Зацьвярдзеньне мяккога r.

Як ужо было сказана, паўночная частка славянства мае большае разьвіцьцё мяккасьці зычных гукаў, чымся гэта заўважаецца на паўдні.

У беларусаў зацьвярдзелі шыпячыя гукі ды гук *r*, а ў сэрбаў мы апроч цьвёрдых шыпячых *ш, ж, ч, дж* ды гуку *р* (лац. *r*), знаходзім яшчэ шмат іншых зацьвярдзелых зычных.

У палякаў *r* мяккое першапачаткова, мусіць, дало *rj*, пасьля—зьлітае-злучэньне *rž*, якое і цяпер захоўваюць у вымаўленьні чэхі, тады як у сучаснай літаратурнай польскай мове, хоць пішуць *rz*, але вымаўляюць *ž* бяз *r*.

Побач з нормальным польскім burza „бура“ мы знаходзім у мэтафорычным сэнсе слова bura „нагонка“, „рэзкая вымова“. Слова raby ёсьць ня што іншае, як нашае „рабы“.

Мы ўжо адзначалі словы czaromcha, harować (ёсьць у дыялектах і hore „гора“, „бяда“, „ліха“), czerot, kaczereźnik. Ёсьць наогул шмат прыкладаў з зацьвярдзелым *r:* hrymnąć „грымнуць“, staryk „пэўная птушка“, dureń, brechać, bredzić, але, паколькі перад асноўна-славянскім *i* ды перад *e* гук *r*, як і іншыя зычныя, цьвярдзеў і ў украінскай мове, мы не адважваемся выказацца станоўча адносна ўсіх гэтых выпадкаў.

Таксама словы gawruk, gawryło, horelica, odryna не захавалі гэтак выразнае фонэтычнае афарбоўкі, каб можна было канчаткова выразшыць пытаньне аб іх. Адносіны паміж словам drań „дрэнь“ і дзеясловам drzeć, па значэньні аднолькавым з расійскім *драть* і з нашым *дзерці*—мне здаюцца ня зусім яснымі.

Поруч з нормальнымі польскімі канчаткамі *arz* (gospodarz) ды *orz* (piskorz) мы знаходзім *ar* ды *or:* hospodar, рэдка hosudar, huślar, suchar, osokor, znachor, (тады як у расійцаў мы бачым: государь, сухарь, осокорь, але гусляр з *r* цьвёрдым, што можна тлумачыць запазычаньнем у нас, падобна як і слова „столяр“ ды інш.).

Лёс асноўна-славянскага л.

У некаторых выпадках *л* давала ў беларусаў і ўкраін-

цаў гук *у* нескладовае (ў). Вокалізацыя *л* сустракаецца яшчэ і ў сэрбскай мове, але думаецца, што беспасрэднай сувязі паміж гэтымі зьявамі няма.

У слове грэка-лацінскага пахаджэньня *хаўтуры* мы маем прыклад правядзеньна беларускага фонэтычнага закону нават у запазычаньні. Яно пасьля перайшло і ў некаторыя польскія гутаркі. У Карловіча мы чытаем: Gdzie chautury, to ja dziad, gdzie wesele, to ja swat. Ёсьць і chawturnik ў сэнсе *старац, жабрак.*

Фрыкатыўнае г (h).

Гэты гук пануе ў чэхаў, славакаў, верхніх лужычан, беларусаў, украінцаў і паўднёвых расійцаў. У рэшты славянства пераважае ґ выбуховае *(g);* такім чынам у паўднёвых славян (апроч рэдкіх фактаў славенскае мовы) гуку *h* зусім няма ў вымаўленьні—і гэты знак, пішучы лацінкаю, ужываюць замест кірылаўскага *х*.

Дзеля вялікае пашыраньсьці гуку *h* у славян, мы лічым беларускімі запазычанымі словамі ў польскай мове выключна тыя, што наогул маюць у нас пашырэньне, (а ня толькі адзначаюцца гэтым гукам).

Hłuzdy, hłum, hłumić адпавядаюць гэтай умове, тады як harmata, harenda, hanyž (аніс), як словы неславянскія мы лепш абмінем.

Акцэнтуацыя.

З правіла аб аднамясцовым польскім націску на перадапошнім складзе ёсьць некаторыя выключэньні. У дысэртацыі Рамана Тодаравіча Брандта „Начертание славянской акцентологии“, Пецярбург 1880 г., мы знаходзім паказаньне, што словы ogółem (пішуць і ogułem; слова ogół—сэміцкага пахаджэньня і, здаецца, значыць у сэмітаў „круг“, „кола“, „куля“, „гала“) і okolica могуць у польскай мове адсоўваць націск на адзін склад бліжэй да пачатку слова. Аднак у нас гавораць: агýлам, хаця, праўда: (в)акòліца. Таму беларускі ўплыў— і прытым толькі адносна слова okolica трэба лічыць магчымым (хоць усё-ткі небясспрэчным).

Амаль што кожную фонэтычную зьяву мы разглядзелі паасобку; разважаючы бесстаронна, мы павінны зазначыць, што набіраецца ўжо цяпер пэўная колькасьць выпадкаў бясспрэчнага беларускага ўплыву на польскую лексыку. Заўважаецца і адваротны ўплыў—з боку польскае мовы на беларускую, але гэта павінна ўжо быць тэмаю паасобнае працы.

Якія адносіны могуць мець падобныя досьледы да мэты нашае Конфэрэнцыі—да ўпарадкаваньня нашага правапісу?

Як вядома, асабліва цяжка разьвязваецца пытаньне аб правапісе запазычаных слоў.

Разглядаючы запазычаныя палякамі беларускія словы,

мы можам заўважыць, што, напрыклад, неўласьцівае палякам аканьне запазычалася далёка не заўсёды. З другога боку трэба адзначыць, што ў большай частцы выпадкаў слова полёнізавалася даволі слаба.

Адным словам, адбываўся пэўны компроміс. Паколькі можна думаць, што тут мы маем справу з выяўленьнем у польскай мове агульнага моўнага закону,—для нас можа быць цікавае гэтае назіраньне.

Апроч таго, абмен словамі паміж нацыямі зьяўляецца шчасьлівым вяшчуном таго даволі яшчэ далёкага, але канечна неабходнага моманту, калі ўсё чалавецтва будзе аб'яднана адзінаю, магутнаю, надзвычайна высокаю культураю. А выдатнаю пачынальніцаю імкненьняў да гэтае вялікае эпохі зьяўляецца якраз Высокапаважная Конфэрэнцыя.

Правописні ціхи поділу памяток староруского письменства.

Коли вважати правопись староруского памятника головним показчиком його національно-територіяльної приналежности, то повноголос і заміна носових чистими у, ю, а, я, та тут і там ж, ч замість первісних старославянских жд, шт, свідчитимуть за східно-славянску територію походження памятника, без огляду на національну приналежність писця. Тим-то: перегнѫвъ—Остр. Ев.; вредеши, черепла—Зборн. Свят. 1073; соромаживоу, борошьно—Збор. Свят. 1076; прихожѫ, рожьство, щоужемь—Остр. Ев.; жажа, прѣже—Збор Свят. 1073; рожства—Тур. Ев. і всі випадки типу водоу, могоу, ı-азикъ, начала, чадо є перш усього доказом східнославянскої редакції даного памятника староруского письменства.

Для південнозахідно руских памяток письменства, себ-то з національно-мовної території України, дуже важними являються прояви міни ѣ—и (=і), та ъı—и. На явищу українскої звучні ѣ=і розвинуто було за Соболевским теорію похідного (вторичного) ѣ з довгого закритого е зразку: оучитѣль, камѣнь(ı-є), вь нѣмь, на сѣмь (камьни) з первісних: оучитель, камень, немь, семь. І дійсно поскільки українці говорять—камінь, на нім, на сім камени, постільки теорія ся скрізь оправдувалася. Але коли довелося виправдувати законами української мови появи Добрилова Євангелія 1164 р.: боудѣть, възьмѣть, приимѣть, приидѣть, ґлѣть, дѣлатѣль, оучитѣль, рівноважні з ремѣнь, вь нѣмь, знамѣньı-а, камѣнь, оучѣньı-є, то ясно ставало, що немає такої говірки па всему просторови сучасної України, яка знала-би крім—ремінь, учіння—ще й будіть, возьміть (3 sing. praes.), ділатіль, учітіль.

Тим-то доводиться означити Добрилово Єванг. та Виголексинский зборник памятниками не з „вторичним ѣ“ рускоукраїнскої говіркої території, тільки із звичайною заміною е=ѣ, характерною для північноруської говірної области. Одночасно-ж належить ствердити, що міна ы=и у найстаршим памятках староруского письменства, особливо в зборниках Святослава 1073 і 1076, як також і міна ѣ=и (і) є тільки повторенням оригінального староболгарского правопису, що знав її поруч з иншими особливостями сеї говірки, помітної і в рукописови Київа 1073 р. (гл. І. Свєнціцкого: Нариси з історії укр. мови ст. 25—6).

На користь західноруської мовної области, себ-то сьогодні Білоруси, належить на основі даних правопису зачислити Житиı-є Саввы освященнöго XIII в., Типографське Євангелиı-є № 5, Статі поч. XIV в. додані до Галицкого Єванг. 1144 р. і Поликарпове Євангеліє 1307 р. До такого виснівку, против Колесси—Dialektologische Merkmale (Arch. f. sl. Phil. XVIII). Соболевского—Очерки ст. 34—9, веде розгляд рівночасної появи міни ѣ—е, е—о, оу—в, яблыко (ж. Саввы освщ.) і щюдръ блажонъ, аньгюлъ (Тип. Ев. № 5); прид тобою, пригрѣшѣны-є, приподобныи, трѣть, ı-єтюръ, агафонгела, зеодѣı-єва, фофилакта (Святці Гал. Єв. 1144 р.). На границю Псковскої і Смоленскої землі належить поставити Поликарпове Євангеліє 1307 р. з його—ѣниı-є, -ѣль, -ѣн-, міною: ѣ—є, ѣ—и, у—в, приставним в, та ц—ч, з—ж.

Іларион Свєнціцкий.

Львів, 10 падолиста 1926 р.

ПРОТОКОЛ

пасяджэньняў Беларускае Акадэмічнае Конфэрэнцыі па рэформе правапісу і азбукі.

I. Урачыстае адчыненьне ў будынку Клюбу Карла Маркса 14 лістапада 1926 г. а 19 гадз.

Адчыняе Конфэрэнцыю Старшыня Інстытуту Беларускае Культуры У. М. Ігнатоўскі, які ў уступнай прамове сказаў аб значэньні Конфэрэнцыі для беларускае культуры і аб конкрэтных заданьнях, якія павінна вырашыць Конфэрэнцыя.

Для кіраваньня працай Конфэрэнцыі абраны прэзыдыум у складзе 5 чалавек: У. Ігнатоўскі (старшыня Інбелкульту), А. Смоліч (Нам. Старшыні Інбелкульту), А. Цьвікевіч (Навуковы Сэкратар Інбелкульту), С. Некрашэвіч (старшыня Аддзелу Мовы і Літаратуры Інбелкульту) і Я. Лёсік (правадзейны член Аддзелу Мовы і Літаратуры). Сэкратарыят Конфэрэнцыі абраны ў складзе 3 асоб: Л. Цьвяткова, Я. Троські і В. Мачульскага. У прэзыдыум запрашаецца і Народны Камісар Асьветы тав. Баліцкі.

З прывітаньнем ад Ураду БССР і з дакладам ад імя НКА выступіў Народны Камісар Асьветы т. А. В. Баліцкі. Пасьля з прывітаньнямі Конфэрэнцыі выступалі: рэктар Беларускага Комуністычнага Унівэрсытэту т. В. І. Гэльтман, рэктар Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту проф. В. І. Пічэта, прадстаўнік Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў Беларусі доцэнт В. Д. Дружчыц, рэктар Літоўскага Дзяржаўнага Унівэрсытэту проф. Біржышка (палітоўску і парасійску), Латвійскій пясьняр Ян Райніс (палатыску і парасійску), прадстаўнік Бэрлінскага Унівэрсытэту, проф. М. Фасмэр (панямецку і парасійску), профэсар Варшаўскага Унівэрсытэту Ю. Голомбэк (папольску), доцэнт Латвійскага Дзяржаўнага Унівэрсытэту Е. Блесэ (палатыску і парасійску), доцэнт Харкаўскага Унівэрсытэту Німчынаў (паўкраінску), профэсар Маскоўскага Унівэрсытэту Растаргуеў (парасійску), рэдактар Ковенскага Беларускага часопісу „Крывіч“ Ул. Ластоўскі, прадстаўнік Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Латвіі К. Езавітаў, прадстаўнік Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Літве Галавінскі, рэдактар праскага часопісу „Прамень“ пясьняр Ул. Жылка, прадстаўнік Т-ва Культурнай Сувязі з замежнымі краінамі А. Цьвікевіч.

Зноў выступіў з адказным словам на прывітаньні т. Ігнатоўскі.

Слова для агалашэньня лістоўных і тэлеграфічных прывітаньняў бярэ Намесьнік Старшыні Інбелкультy А. А. Смоліч.

1) з Слуцку—ад Старшыні Цэнтральнаго Выканаўчага Камітэту БССР Чарвякова.

2) ад Старшыні Савету Народных Камісараў БССР Я. Адамовіча.

3) з Дзьвінску—ад мясцовай Дзяржаўнай Беларускай гімназіі—дырэктар Сахараў.

4) з Масквы—ад імя Ўсесаюзнага Таварыства культурнай сувязі з замежнымі краінамі. Старшыня Каменева.

5) з Вільні—ад Антона Луцкевіча.

6) з Дзьвінску—ад мясцовых організацый выбаршчыкаў і ад настаўніцтва „Прасьвета“ і „Хатка“.

7) з Львова—ад імя Таварыства імя Шаўчэнкі.

8) з Варшавы—ад імя Віленскага Навуковага Таварыства—прадстаўнік яго Б. Тарашкевіч.

9) з Вільні—ад імя Таварыства Беларускай Школы Заходняе Беларусі—яго Старшыня Астроўскі.

10) ад профэсара Кіеўскага Інстытуту Народнае Асьветы Грунскага.

11) з Ленінграду—ад члена Акадэміі Навук СССР профэсара Б. М. Ляпунова.

12) з Масквы—ад профэсара Д. Ушакова.

13) з Масквы—ад імя Таварыства Палітычных Эмігрантаў Заходняе Беларусі.

14) з Горы-Горак—ад імя Навуковага Таварыства па вывучэньні Беларусі.

15) ад імя свайго і профэсароў Лося з Кракава і Сьвяніцкага і Студынскага з Львова—Ульлянаў.

16) з Горы-Горак—ад імя Горацкага аддзяленьня сэкцыі навуковых працаўнікоў Беларусі.

17) з Масквы—ад імя Наркамасьветы РСФСР—Народны Камісар Асьветы Луначарскі.

18) з Прагі Чэскае—ад імя Беларускага (Крывіцкага) Культурнага Таварыства.

19) з Полацку—ад імя Полацкае Акруговае Конфэрэнцыі вясковых працаўнікоў асьветы.

20) з Масквы—ад кіраўніка спраў СНК СССР Гарбунова і Загадчыка Аддзелу Апублікаваньня законаў Бяляева.

21) з Харкава—ад імя сходу лектароў украінскае мовы, мовазнаўцаў і настаўнікаў горада Харкава, якія сабраліся дзеля абгаварэньня проекту ўкраінскага правапісу.

22) з Мазыра—ад імя Мазырскага Пэдагогічнага Тэхнікуму.

23) з Масквы—ад імя Савету Нацыянальных Меншасьцяй.

З агульным абурэньнем было заслухана тое месца ў тэ-

леграме культурных дзеячоў Заходняе Беларусі, дзе гаворыцца аб забароне ім польскім урадам прыезду ў Менск.

З адказным словам на прывітаньні выступаў Старшыня т. Ігнатоўскі.

У канцы сходу была абвешчана і прынята праграма пасяджэньняў Конфэрэнцыі.

Сэкратары: *Л. Цьвяткоў.*
Я. Троська.
В. Мачульскі.

Першае пасяджэньне.

(15 лістапада; пачалося а 10 гадзіне, скончылася а 15 гадз. ў будынку клюбу К. Маркса).

Адчыняе пасяджэньне Старшыня Інбелкульту т. Ігнатоўскі.

Намесьнік Старшыні Інбелкульту А. А. Смоліч зачытаў прывітаньне ад Нацыянальнага Украінскага Музэю ў Львове, пасьля—ліст профэсара Кіеўскага Унівэрсытэту Я. К. Тімчэнкі з падзякаю за запрашэньне на Конфэрэнцыю і прывітаньнем.

Апроч таго, т. Смоліч паведаміў Конфэрэнцыю аб тым, што профэсар Львоўскага Унівэрсытэту Іларыён Сьвянціцкі надаслаў свой пісьмовы даклад „Правописны цихі поділу памяток старо-руского письменства“.

Дэлегат ад беларусаў у Латвіі—рэдактар газэты „Голас Беларуса“ К. Езавітаў выступіў з прапановай Конфэрэнцыі вынесьці протэст супроць нацыянальнага і культурнага ўціску беларусаў пад польскай окупацыяй.

Рэдактар часоп. „Крывіч“ (у Літве) В. Ластоўскі ад імя беларускіх дэлегатаў з Літвы заяўляе, што прадстаўнікі беларускай меншасьці ў Літве поўнасьцю далучаюцца да прапановы грам. Езавітава.

Пісьменьнік Якуб Колас прапануе паслаць прывітаньне культурным і навуковым работнікам Заходняе Беларусі і выказаць жаль з прычыны таго, што польская ўлада не дала ім дазволу прыбыць на навуковую Конфэрэнцыю.

Слова бярэ намесьнік старшыні ІБК т. Смоліч, які зачытвае проект тэлеграмы прадстаўнікам Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні і Таварыства Беларускае школы ў Вільні. Тэлеграма Конфэрэнцыяй прымаецца пад гучныя вопleскі.

Пасьля ставіцца даклад старшыні Аддзелу Мовы і Літаратуры ІБК С. М. Некрашэвіча: „Сучасны стан вывучэньня беларускае мовы“.

Па дакладу С. Некрашэвіча выступалі наступныя асобы: проф. Фасмэр, доцэнт Німчынаў, т. Імшэньнік, доцэнт БДУ Сербаў.

Пасьля заключнага слова дакладчыка С. М. Некрашэвіча і ўхваленьня яго дакладу слова для дакладу на тэму „Становішча беларускае мовы сярод іншых славянскіх моваў" дадзена было профэсару БДУ Бузуку.

Па дакладу П. Бузука выказваліся: проф. Фасмэр, доцэнт БДУ Воўк-Левановіч і доцэнт Німчынаў.

А 15 гадзіне быў агалошаны перапынак.

Сэкратары: *Л. Цьвяткоў.*
Я. Троська.
В. Мачульскі.

———

Другое пасяджэньне.

(15 лістапада ад 18 да 23 гадз. у клюбе К. Маркса).

Старшыня А. А. Смоліч.

Працяг спрэчак па дакладу П. Бузука; у спрэчках выказваліся: проф. Фасмэр, выкладчык БДУ Л. М. Цьвяткоў, доцэнт БДУ Я. В. Воўк-Левановіч.

Потым проф. Бузук сказаў сваё заключнае слова— пасьля чаго быў агалошаны перапынак на 8 хвілін.

Даклад проф. Бузука і заключнае слова былі зроблены пабеларуску, а рэзюмэ панямецку.

Наступным быў заслуханы даклад Я. Лёсіка: „Да рэформы беларускае азбукі. Спрэчкі па дакладзе дзеля позьняга часу былі перанесены на наступнае пасяджэньне.

Прынята пропозыцыя Старшыні Конфэрэнцыі аб утварэньні Камісій па пытаньнях азбукі, правапісу і літаратуры.

Сэкратары: *Л. Цьвяткоў.*
Я. Троська.
В. Мачульскі.

———

Трэйцяе пасяджэньне.

(16 лістапада ад 11½ да 15 гадз. у клюбе Карла Маркса).

Старшыня Ў. Ігнатоўскі.

Пасяджэньне адчыняецца зачытваньнем прывітальнай тэлеграмы ад Паўнамоцнага Прадстаўніцтва СССР у Польшчы.

Наступным ставіцца даклад проф. Растаргуева: „Да рэформы беларускае азбукі". Пасьля дакладу доцэнт Я. Лёсік

бярэ слова для дадатковае заўвагі да прачытанага ім на папярэднім пасяджэньні дакладу на тую-ж самую тэму (дадаткі адносна літараў—г (ґ).

Па дакладах доц. Я. Лёсіка і проф. Растаргуева аб рэформе азбукі выступалі: Ул. Дзяржынскі і С. М. Некрашэвіч.

Для даведкі браў слова доц. Я. Лёсік.

Пасьля даведкі Я. Лёсіка выступалі па дакладах аб рэформе азбукі: У. Ластоўскі, проф. Фасмер і т. Жылуновіч.

У праграму заняткаў Конфэрэнцыі ўключаны дадатковыя даклады: д-ра Язэпа Голомбэка: „Дасьледваньне беларускай літаратуры XIX в. да 1863 г.“ і Вазьнясенскага: „Поэтычнае мастацтва навейшай беларускай літаратуры“.

Сэкратары: *Л. Цьвяткоў.*
Я. Троська.
В. Мачульскі.

Чацьвертае пасяджэньне.

(16 лістапада ад 18—21 гадз. у клюбе К. Маркса).

Старшыня А. Смоліч.

Працяг спрэчак па дакладах аб рэформе азбукі доц. Я. Лёсіка і проф. Растаргуева. У спрэчках выступалі: проф. Бузук, Я. Бялькевіч, доц. Німчынаў (апошні выказаўся за захаваньне літараў *ы, э, я, ю, е, ё* ў цяперашнім іх ужываньні і даводзіў, што *г* у сэнсе лацінскага *ґ*, а таксама і знакі для афрыкат *дз, дж* трэба абавязкова ўвесьці ў беларускую азбуку).

Пасьля гэтага былі заключныя словы дакладчыкаў проф. Растаргуева і доц. Лёсіка.

Агульны сход Конфэрэнцыі ўхваліў даручыць Азбучнай Камісіі канчатковую апрацоўку проекту аб рэформе азбукі...

Проект у апрацаваным выглядзе павінен быць прадстаўлены пленуму на разгляд.

Сэкратары: *Л. Цьвяткоў.*
Я. Троська.
В. Мачульскі.

Пятае пасяджэньне.

(17 лістапада ад 10½—15 гадз. у клюбе К. Маркса).

Старшыня Ў. Ігнатоўскі.

Зачытваюцца прывітальныя тэлеграмы ад Саўнаркому СССР, Алены Курыла, ад імя Ўсесаюзнага Таварыства Куль-

турнай Сувязі з замежнымі краінамі. Прывітаньне Конфэрэнцыі ад Беларускае Акадэміі Сельскае і Лясное Гаспадаркі выказвае доц. Акадэміі Г. Гарэцкі.

Даклад доц. Я. Лёсіка „Да рэформы беларускага правапісу“ і Старшыні Аддзелу Мовы і Літаратуры С. М. Некрашэвіча на тую-ж тэму.

Па дакладах Я. Лёсіка і С. М. Некрашэвіча выступалі: доц. Я. В. Воўк-Левановіч, Я. Ю. Лёсік, проф. П. А. Растаргуеў, Мялешка і проф. П. А. Бузук.

Працяг спрэчак і канчатковая апрацоўка проекту аб рэформе правапісу былі перанесены ў Камісіі з тым, каб проект у канчатковым выглядзе быў прадстаўлены Пленуму на разгляд.

Вызначаюцца Прэзыдыумы і кіраўнікі камісій і адчыняецца запіс членаў Конфэрэнцыі, якія жадаюць прыняць удзел у камісійных працах.

Сэкратары: *Л. Цьвяткоў.*
Я. Троська.
В. Мачульскі.

Шостае пасяджэньне.

(18 лістапада ад 11 г.—15 гадз. у клюбе К. Маркса),

Старшыня Ў. Ігнатоўскі.

Зачытваюцца прывітальныя тэлеграмы ад проф. Яўгена Ляцкага з Прагі, ад Праскага Беларускага Культурнага Таварыства імя Францішка Скарыны.

Пасьля былі заслуханы даклады па вывучэньні беларускай літаратуры: проф. М. М. Пятуховіча: „Асноўныя этапы разьвіцьця новае беларускае літаратуры“, доц. М. Гарэцкага: „Нацыянальны адраджанізм і пасьлякастрычнікавы пэрыод“, доктара Яз. Голомбэка: „Дасьледваньне беларускай літаратуры XIX в.—да 1863 г.“ і даклад проф. А. М. Вазьнясенскага „Поэтычнае мастацтва ў беларускай літаратуры“.

Сэкратары: *Л. Цьвяткоў.*
Я. Троська.
В. Мачульскі.

Сёмае (заключнае) пасяджэньне.

(20 лістапада, ад 18—23 гадз. ў залі Інбелкульту).

Старшыня Ў. Ігнатоўскі.

Прынята прапанова Старшыні Ігнатоўскага, каб не заслухоўваць дакладу Цьвяткова, а надрукаваць яго ў зборніку прац Конфэрэнцыі.

Пасьля былі заслуханы справаздачы і рэзолюцыі паасобных камісій: 1) Літаратурнай (дакл. проф. Замоцін), 2) Азбучнай (дакл. Дамброўскі) і 3) Правапіснай (дакл. К. Езавітаў).

У выніку заслуханых справаздач і рэзолюцый была прынята агульная рэзолюцыя аб працы Конфэрэнцыі.

Пасьля былі зачытаны прывітальныя тэлеграмы ад Савету Нацменшасьцяй пры Наркамасьвеце РСФСР і ад Мазырскага Пэдагогічнага Тэхнікуму.

Проф. Фасмэр паведамляе Конфэрэнцыю аб лісьце проф. Бодуэн-дэ-Куртэнэ, які яшчэ раз выказвае жаль, што па прычыне хваробы ня мог прыехаць на Конфэрэнцыю.

Старшыня Конфэрэнцыі прапануе праз проф. Фасмэра і доктара Голомбэка перадаць прывітаньне проф. Бодуэн-дэ-Куртэнэ.

Далей у заключным слове старшыня Конфэрэнцыі проф. Ігнатоўскі падкрэсьліў карысныя вынікі і вялікае значэньне працы Акадэмічнае Конфэрэнцыі і выказаў падзяку ўсім удзельнікам у гэтай працы.

З адказнымі словамі выступалі проф. Фасмэр і доц. Блесэ.

Апошняе пасяджэньне зачыняецца сьпевам Беларускай Марсэльезы.

Сэкратары: *Л. Цьвяткоў.*
Я. Трoська.
В. Мачульскі.

СЬПІС

членаў Акадэмічнае Конфэрэнцыі.

1. Акулік А.—Дырэктар Аршанскага Пэдтэхнікуму.
2. Аршанскі Б.—Правадзейны член Інбелкульту.
3. Бабарэка А.—поэта, прадстаўнік літаратурнае групы „Ўзвышша“.
4. Багдановіч Ан.—Доцэнт Беларускага Унівэрсытэту.
5. Багдановіч Г.—Доцэнт Віцебскага Вэтэрынарнага Інстытуту.
6. Байкоў М.—Навуковы сэкратар Слоўнікавай Камісіі Інбелкульту.
7. Баліцкі А.—Народны Камісар Асьветы БССР.
8. Барычэўскі Я.—Доцэнт Беларускага Унівэрсытэту.
9. Біржышка М.—проф., рэктар Літоўскага Унівэрсытэту ў Коўне. Літва.
10. Блесэ Е.—Доцэнт Латвійскага Унівэрсытэту ў Рызе. Латвія.
11. Бузук П.—Проф. Беларускага Унівэрсытэту.
12. Бялуга М.—Правадзейны член Інбелкульту.

13. Бялькевіч Я.—Дырэктар Амсьціслаўскага Пэдтэхнікуму.
14. Вазьнясенскі А.—Доцэнт Беларускага Унівэрсытэту.
15. Валасевіч П.—Нам. Народнага Камісара Асьветы БССР.
16. Віткоўскі—Доцэнт Беларускага Комуністычнага Унівэрсытэту.
17. Воўк-Левановіч В.—Доцэнт Беларускага Унівэрсытэту.
18. Галавінскі А.—Старшыня Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Коўне. Літва.
19. Гарбацэвіч В.—Настаўнік Магілеўскага Пэдтэхнікуму.
20. Гарэцкі М.—Доцэнт Гарэцкай с.-г. Акадэміі.
21. Гарчынскі П.—Доцэнт Ленінградзкага Унівэрсытэту.
22. Голомбэк Ю.—Доцэнт Варшаўскага Унівэрсытэту.
23. Грамыка М.—Правадзейны член Інбелкульту.
24. Гурло А.—Навуковы Сэкратар Тэрмінолёгічнай Камісіі Інбелкульту.
25. Гэльтман С.—Рэктар Беларускага Комуністычнага Унівэрсытэту.
26. Дамброўскі М.—Дырэктар польскага Пэдтэхнікуму ў Менску.
27. Дружчыц В.—Доц. Беларускага Унівэрсытэту.
28. Дубоўка Ўл.—прадстаўнік літаратурнай організацыі „Ўзвышша“.
29. Езавітаў К.—Рэдактар газ. „Голас Беларуса“ ў Рызе. Латвія.
30. Жылка Ўл.—Рэдактар часоп. „Прамень“ у Празе. Чэха-Славакія.
31. Жылуновіч Д. (Цішка Гартны)—Беларускі пісьменьнік.
32. Замоцін Ів.—Проф. Беларускага Унівэрсытэту.
33. Ігнатоўскі Ўс.—Проф., Старшыня Інбелкульту.
34. Імшэньнік Т.—Дырэктар Рагачэўскага Пэдтэхнікуму.
35. Каранеўскі Я.—Правадзейны член Інбелкульту, намесьнік старш.
36. Катовіч С.—Настаўнік 3-й Віцебскай 9-гадовай школы.
37. Краскоўскі Ів.—Правадзейны член Інбелкульту.
38. Кудзелька М.—Правадзейны член Інбелкульту.
39. Лазарэвіч Ю. — Прадстаўнік белсэкцыі Смаленскага „Губоно“.
40. Ластоўскі В.—Рэдактар беларускага часопісу „Крывіч“ у Коўне.
41. Лёсік А.—настаўнік Менскага Пэдтэхнікуму.
42. Лёсік Яз.—Правадзейны член Інбелкульту.
43. Лобач Я.—Настаўнік Барысаўскага Пэдтэхнікуму.
44. Луцэвіч Я. (Янка Купала)—Народны поэта БССР.
45. Мачульскі В.—Навуковы супрацоўнік Інбелкульту.
46. Міцкевіч Я. (Якуб Колас)—Народны поэта БССР.

47. Мялешка С.—настаўнік Полацкага Пэдтэхнікуму.
48. Некрашэвіч С.—Правадзейны член Інбелкульту.
49. Німчынаў К.—Доцэнт Харкаўскага Інстытуту Народнай Асьветы.
50. Пігулеўскі В.—Дырэктар Беларускай гімназіі ў Люцыне. Латвія.
51. Пічэта Ўл.—Проф., Рэктар Беларускага Унівэрсытэту.
52. Плаўнік С. (Бядуля)—Беларускі пісьменьнік.
53. Плашчынскі Я.—Сэкратар Літаратурнай Камісіі Інбелкультy.
54. Пятуховіч М.—Проф. Беларускага Унівэрсытэту.
55. Райніс Ян—Латвійскі народны поэта.
56. Растаргуеў П.—Проф. Маскоўскага Унівэрсытэту.
57. Сабалеўскі З.—настаўнік Чырвона-Бярэскага Тэхнікуму.
58. Самковіч Я.—настаўнік Менскага Рабфаку.
59. Сербаў І.—Навуковы супрацоўнік Інбелкульту.
60. Сержпутоўскі А. — Правадзейны член Інбелкульту. Ленінград.
61. Смоліч А.—Проф., Правадзейны член Інбелкульту.
62. Сянкевіч А.—Доц. Беларускага Комуністычнага Унівэрсытэту.
63. Троська Я.—Рэдактар час. „Асьвета".
64. Фасмэр М.—Проф. Бэрлінскага Унівэрсытэту. Нямеччына.
65. Цьвікевіч А.—Навуковы сэкратар Інбелкульту.
66. Цьвяткоў Л.—Доцэнт Беларускага Унівэрсытэту.
67. Чаржынскі У.—Доцэнт Беларускага Комуністычнага Унівэрсытэту.
68. Шлюбскі А. — Навуковы сэкратар Дыялектолёгічнай Камісіі Інбелькульту.
69. Эпімах-Шыпіла Б.—Правадзейны член Інбелкульту.

Склад Камісіі па рэформе азбукі.

1) А. Сержпутоўскі, 2) Э. Блесэ, 3) А. Багдановіч, 4) Г. Багдановіч, 5) С. Мялешка, 6) Ю. Гаўрук, 7) М. Біржышка, 8) М. Грамыка, 9) В. Ластоўскі, 10) М. Фасмэр, 11) П. Растаргуеў, 12) А. Шлюбскі, 13) Лазарэвіч, 14) Т. Імшэньнік, 15) К. Езавітаў, 16) П. Бузук, 17) П. Гарчынскі, 18) С. Некрашэвіч, 19) А. Галавінскі, 20) І. Сербаў, 21) К. Німчынаў, 22) В. Пігулеўскі, 23) В. Мачульскі, 24) Я. Лёсік, 25) У. Чаржынскі.

Склад Камісіі па рэформе правапісу.

1) Г. Багдановіч, 2) С. Мялешка, 3) А. Лёсік, 4) А. Багдановіч, 5) Я. Самковіч, 6) С. Гэльтман, 7) М. Фасмэр, 8) П. Растаргуеў, 9) Акулік, 10) Я. Бялькевіч, 11) П. Бузук, 12) І. Сербаў, 13) С. Некрашэвіч, 14) Якуб Колас, 15) В. Ластоўскі, 16) В. Гарбацэвіч, 17) К. Німчынаў, 18) Я. Лёсік, 19) В. Мачульскі, 20) Я. Троська, 21) Ул. Чаржынскі, 22) М. Байкоў, 23) К. Езавітаў, 24) Т. Імшэньнік, 25) Б. Эпімах-Шыпіла, 26) А. Сержпутоўскі, 27) Я. Воўк-Левановіч, 28) Янка Купала, 29) Я. Лобач, 30) З. Сабалеўскі.

Склад Літаратурнай Камісіі.

1) А. Сянькевіч, 2) М. Грамыка, 3) В. Ластоўскі, 4) П. Гарчынскі, 5) Д. Жылуновіч, 6) А. Бабарэка, 7) Я. Плашчынскі, 8) А. Гурло, 9) К. Езавітаў, 10) У. Ігнатоўскі, 11) М. Фасмэр, 12) Я. Колас, 13) М. Біржышка, 14) А. Галавінскі, 15) Б. Гарбацэвіч, 16) В. Пігулеўскі, 17) Ян Райніс, 18) В. Мачульскі, 19) Ул. Жылка, 20) Ів. Краскоўскі.

Пайменны паказчык паданых галасоў за прынятыя і адхіленыя рэзолюцыі Правапіснай Камісіі*).

За рэзолюцыю Я. Лёсіка аб поўным аканьні (стар. 292) галасавалі: А. Лёсік, Міцкевіч (Я. Колас), Я. Лёсік, Луцэвіч (Я. Купала), Сабалеўскі, Німчынаў, Троська (з папраўкай: пры ўмове замены рэдукаванага *е* асобным значком). Супроць рэзолюцыі галасавалі: Багдановіч А., Мялешка, Багдановіч Г., Самковіч, Растаргуеў, Акулік, Бялькевіч, Бузук, Некрашэвіч, Мачульскі, Воўк-Левановіч, Чаржынскі, Езавітаў, Імшэньнік, Лобач. Устрымаліся: Байкоў.

За рэзолюцыю С. Некрашэвіча аб непашырэньні аканьня на другі склад перад націскам (стар. 293) галасавалі: Багдановіч А., Мялешка, Багдановіч Г., Растаргуеў, Акулік, Бялькевіч, Бузук, Некрашэвіч, Мачульскі, Воўк-Левановіч, Чаржынскі, Езавітаў, Лобач, Імшэньнік, Самковіч. Супроць рэзолюцыі галасавалі: А. Лёсік, Міцкевіч, Я. Лёсік, Троська. Устрымаліся: Байкоў, Німчынаў, Сабалеўскі.

За рэзолюцыю С. Некрашэвіча аб правапісе *не, без* (стар. 293) галасавалі: Багдановіч А., Багдановіч Г., Растаргуеў, Акулік, Бузук, Некрашэвіч, Німчынаў, Мачульскі, Воўк-Левановіч, Чаржынскі, Езавітаў, Байкоў, Імшеньнік

*) У Азбучнай Камісіі галасаваньне па рэзолюцыях таксама адбывалася пайменна, аднак па матар'ялах апошняй Камісіі цяжка разабраць, хто запраўды галасаваў за і хто супроць. Бясспрэчным зьяўляецца толькі агульны лік галасоў.

(подпіс 14-га члена напісаны нячытэльна). Супроць галасавалі: Мялешка, Лёсік А., Міцкевіч (Колас), Лёсік Я., Троська, Сабалеўскі (подпіс 7-га члена напісаны нявыразна). Устрымаліся: Лобач.

За рэзолюцыю С. Некрашэвіча аб правапісе слоў *няма, няхай* (стар. 293) галасавалі: Я. Колас, Некрашэвіч, Троська, Езавітаў, Чаржынскі. Супроць рэзолюцыі галасавалі: Багдановіч А., Мялешка, Лёсік А., Багдановіч Г., Растаргуеў, Акулік, Бялькевіч, Бузук, Німчынаў, Лёсік Я., Воўк-Левановіч, Байкоў, Сабалеўскі, Імшэньнік, Лобач, Гарчынскі.

За рэзолюцыю С. Некрашэвіча аб правапісе чужаземнага ненаціскнога *о* (стар. 305) галасавалі: Мялешка, Растаргуеў, Акулік, Бялькевіч, Сербаў, Некрашэвіч, Мачульскі, Троська, Езавітаў, Байкоў, Эпімах-Шыпіла, (подпіс 12-га члена нявыразны). Супроць рэзолюцыі галасавалі: Багдановіч А., Лёсік А., Багдановіч Г., Самковіч, Колас, Лёсік Я., Сабалеўскі, Імшэньнік. Устрымаліся: Бузук.

За рэзолюцыю Я. Лёсіка (стар. 307) галасавалі: Лёсік А., Самковіч, Лёсік Я., Езавітаў, Імшэньнік, Колас. Супроць рэзолюцыі: Багдановіч А., Мялешка, Багдановіч Г., Растаргуеў, Акулік, Бялькевіч, Бузук, Сербаў, Некрашэвіч, Мачульскі, Троська, Чаржынскі, Сержпутоўскі, Купала, Сабалеўскі.

За рэзолюцыю Чаржынскага (стар. 307) галасавалі: Багдановіч А., Лёсік А., Багдановіч Г., Колас, Лёсік Я., Чаржынскі, Езавітаў, Імшэньнік, Сержпутоўскі. Супроць рэзолюцыі галасавалі: Мялешка, Растаргуеў, Акулік, Бялькевіч, Бузук, Сербаў, Некрашэвіч, Троська, Байкоў, Сержпутоўскі, Эпімах-Шыпіла.

У Прэзыдыум Акадэмічнае Конфэрэнцыі.

Графічная Камісія Першае Беларускае Акадэмічнае Конфэрэнцыі пастанавіла ўвесьці ў беларускую кірылічную азбуку літару *j*, адначасна пакідаючы ў гэтай азбуцы літары *я, е, ю*. Мы, ніжэйпадпісаныя ўдзельнікі Конфэрэнцыі нязгодны з такім разьвязаньнем пытаньня:

1) Ул. Чаржынскі, 2) І. Самковіч, 3) К. Езавітаў, 4) С. Мялешка, 5) О. Воўк-Левановіч, 6) Я. Бялькевіч, 7) Пігулеўскі, 8) Ластоўскі, 9) А. Гурло, 10) Зьм. Сабалеўскі, 11) Багдановіч, 12) А. Багдановіч, 13) Ул. Дубоўка, 14) М. Байкоў (лічу наагул, што пры разглядзе пытаньняў графікі ў Камісіі не заўважваюцца інтарэсы беларускай масы, для якой *j* зьяўляецца зусім чужым знакам), 15) Шлюбскі, 16) З. Бядуля, 17) А. Бабарэка, 18) М. Гарэцкі, 19) Я. Купала (з тае прычыны, што застаецца *я, ю, ё,* лічу непатрэбным уводзіць *j*), 20) Я. Коляс (уводзячы *j*, я лічу патрэбным выкінуць і *я, ю, ё*), 21) С. Некрашэвіч, 22) Піотуховіч.

ЗЬМЕСТ.

Урачыстае адчыненьне Акадэмічнай Конфэренцыі.

Стар.

Уступнае слова проф. Ігнатоўскага 1
Даклад Камісара Нар. Асьветы Баліцкага . . . 11
Прывітальнае слова т. Гэльтмана 19
" " проф. Пічэты 20
" " " Дружчыца 21
" " " Біржышкі 22
" " Яна Райніса . , . . . 23
" " проф. Фасмэра 25
" " " Голомбэка 25
" " доц. Блесэ 26
" " проф. Растаргуева 27
" " доц. Німчынава 29
" " гр. Ластоўскага 29
" " " Езавітава 30
" " " Галавінскага 30
" " " Жылкі 31
" " А. Цьвікевіча 31
" " доц. Гарчынскага 32
" " " Гарэцкага 32
Прывітальныя тэлеграмы 34
" лісты 38
Програма пасяджэньняў Конфэрэнцыі 45
Протэст супроць забароны делегатам ад заходняй Беларусі выехаць на Конфэрэнцыю 46

Сучасны стан вывучэньня беларускай мовы.

Даклад С. Некрашэвіча 48
Прамова Фасмэра 70
" Некрашэвіча 71
" Фасмэра 72
" Німчынава 72
" Імшэньніка 72
" Сербава 72
Заключнае слова Некрашэвіча 73

Становішча беларускай мовы сярод іншых славянскіх моваў.

Даклад П. Бузука 75
Прамова Фасмэра 89

Стар.
Прамова Воўк-Левановіча 90
„ Німчынава 96
„ Цьвяткова 104
„ Воўк-Левановіча 106
Заключнае слова Бузука 109
Рэзюмэ (панямецку) 113

Да рэформы беларускай азбукі.

Даклад Я. Лёсіка 115
„ П. Растаргуева 124
Прамова Чаржынскага 131
„ Некрашэвіча і ліст акад. Ляпунова . . . 136
Прамова Ластоўскага 144
„ Фасмэра 154
„ Жылуновіча 155
„ Бузука 157
„ Бялькевіча 160
Заключнае слова Растаргуева 165
„ „ Я. Лёсіка 171
Графічная Камісія 175

Да рэформы беларускага правапісу.

Даклад Я. Лёсіка 183
„ С. Некрашэвіча 208
Прамова Воўк-Левановіча 220
„ Антона Лёсіка 223
„ Растаргуева 226
„ Мялешкі 228
„ Бузука 231

Правапісная Камісія.

Прамова Німчынава 233
„ Воўк-Левановіча 238
„ А. Лёсіка 244
„ Мялешкі 247
„ Багдановіча Г. 249
„ Троські 251
„ Матача 253
„ Мачульскага 268
Заключнае слова Некрашэвіча 270
„ „ Я. Лёсіка 273
Прамова Байкова 278
„ Чаржынскага 279
„ Воўк-Левановіча 281
„ Некрашэвіча 283
„ Бялькевіча 284
„ Бузука 287
„ Дамброўскага 288

Стар.

Прамова Мачульскага 288
" А. Лёсіка 289
" Я. Лёсіка 290
" Імшэньнік 294
" Мялешкі 295
" Некрашэвіча 296
" Чаржынскага 303
" А Лёсіка 307

Агляд беларускай літаратуры.

Даклад Пятуховіча 311
" М. Гарэцкага 325
З дакладу докт. Ю. Голомбэка 333
Даклад Вазьнясенскага 334

Літаратурная Камісія.

Прамова Дубоўкі 359
" Чаржынскага 360
" Жылуновіча 367
" Я. Пушчы 371
" Жылуновіча 373
Закл. слова Гарэцкага 374
" " Вазьнясенскага 375
" " Пятуховіча 377
" " Замоціна 384

Заключнае пасяджэньнё Акадэмічнай Конфэрэнцыі і рэзолюцыі.

Справаздача Літаратурнай Камісіі (Замоцін) . . 388
" Графічнай Камісіі (Дамброўскі) . . 391
" Правапіснай Камісіі (Езавітаў) . . . 892
Агульная рэзолюцыя аб працы Конфэрэнцыі . . 395
Заключная прамова Ігнатоўскага 396
Прамова Фасмэра 399
" Блесэ 400

Дадаткі.

Л. Цьвяткоў. Некалькі слоў аб беларускім элемэнце ў польскай лексыцы 403
І. Свєнціцкий. Правописні ціхи поділу памяток старарускoго письменства 417
Протокол пасяджэньняў Конфэрэнцыі 419
Сьпіс членаў Конфэрэнцыі 425
Склад Камісій Конфэрэнцыі 427
Пайменны паказчык паданых галасоў у Прав. Кам. . 428
Заява членаў Конфэрэнцыі ў сувязі з увядзеньнем *j* . 429

Заўважаныя памылкі друку.

Стар.	Строчка зьверху	Строчка зьнізу	Напісана:	Павінна быць:
XVII	5	—	Mesnk	Miensk
—	16	—	er	der
12	9	—	1924	1914
20	—	3	новую мову	новыя ўмовы
91	—	1	языковых	моўных
98	—	16	sławistyczny	slawistyczny
99	21	—	dotyczących sie polszyzny	dotyczących się polszczyzny
100	9	—	w ięszykach	w iężykach
133	—	15	дыякрэтычных	дыякрытычных
136	—	—	иностранных	в иностранных
144	—	16	Ластоўскі	Матач
166	—	13	лояльна	лёгічна
175	11	—	графичнай	графічная
197	—	15	дзяравянный	дзяравянець
206	6	—	марфолёгія	морфалёгія
„	—	—	манолёг	моналёг
„	—	—	географія	геаграфія
„	7	—	тэолёг	тэалёг
218	—	1	сабай	сабой
224	—	2	касаетая	касается
247	17	—	часаца	часацца
282	—	3	хачаш	хочаш
283	1	—	роду	раду
313	—	3	колёнізацыя	полёнізацыя
„	—	11	Знаходзячыяся	Знаходзячыся
315	6	—	грагедыі	трагедыі
317	—	3	насільніка	насіцеля
323	—	18	любяцрь	любяць
335	—	11	агульным	агульнай
337	—	9	тэолёгіі	тэлеолёгіі
346	—	1	сжэтнага	сюжэтнага
362	10	—	ўлада	ўдала
369	18	—	Ядігін	Ядвігін
374	2	—	раборучыя	рабочыя
377	8	—	Ядвігнін	Ядвігін
388	6	—	неколькі	некалькі
389	—	16	Белурусі	Беларусі
395	—	14	азбуцы	азбукі
407	—	19	зьмешчаннага	зьмешчанага

Выданьні Аддзелу Мовы і Літаратуры.

1. Беларуская Навуковая Тэрмінолёгія. Вып. I—XII.
2. *С. Некрашэвіч.* Да пытаньня аб укладаньні слоўніка жывой беларускай мовы.
3. Матар'ялы да Акадэмічнае Конфэрэнцыі па рэформе правапісу і азбукі. Вып. I—IX.
4. *Растаргуеў.* Говоры восточных уездов Гомельской губернии в их современном состоянии.
4. *Яго-ж.* Северско-белорусские говоры.
6. Проф. *П. Бузук.* Да характарыстыкі паўночна-беларускіх дыялектаў. Гутаркі Невельскага і Вяліскага паветаў.
7. *А. Полевой.* О языке населения Новозыбковского уезда Гомельской губ.
8. *А. Сержпутовский.* Отчет о поездке в Гомельскую губернию в 1926 г.
9. *Яго-ж.* Зборнік беларускіх народных казак.
10. Творы М. Багдановіча. Т. I.
11. *С. Некрашэвіч* і *П. Бузук.* Програма для вывучэньня беларускіх гаворак.
12. *М. Касьпяровіч.* Віцебскі краёвы слоўнік.
13. *М. Гарэцкі.* Песьні з вёскі Багацькаўкі б. Горацкага пав. (Друкуецца).
14. Зборнік Аддзелу Мовы і Літаратуры. (Друкуецца).
